Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь

Установа адукацыі
«Полацкі дзяржаўны універсітэт»

# СУЧАСНАЯ БЕЛАРУСКАЯ ЛІТАРАТУРНАЯ МОВА

ВУЧЭБНА-МЕТАДЫЧНЫ КОМПЛЕКС

для студэнтаў спецыяльнасці 1-02 03 07-01
«Англійская мова. Беларуская мова і літаратура»

Складанне і агульная рэдакцыя
С.М. Лясовіч

Наваполацк, 2009

**УДК**
**ББК**
**С**

РЭЦЭНЗЕНТЫ:
Ю.М. Бабіч , кандыдат філалагічных навук,
дацэнт кафедры беларускага мовазнаўства УА «ВДУ імя П. Машэрава»;
В.Э. Зіманскі, кандыдат філалагічных навук,
дацэнт кафедры беларускага мовазнаўства УА «ВДУ імя П. Машэрава»

Рэкамендаваны да выдання Саветам гісторыка-філалагічнага факультэта

**С** **Сучасная беларуская мова.** Вучэбна-метадычны комплекс для студэнтаў спецыяльнасці 1-02 03 07-01 «Англійская мова. Беларуская мова і літаратура» / Склад. і агул. рэд. С.М. Лясовіч. – Наваполацк: УА «ПДУ», 2009. – с.

Вучэбна-метадычны комплекс уключае ў сябе курс лекцый па такіх раздзелах сучаснай беларускай мовы, як лексікалогія, лексікаграфія, фразеалогія, фразеаграфія, графіка, арфаграфія, фанетыка, фаналогія, марфеміка, словаўтварэнне, марфалогія. Пададзены парады да правядзення практычных заняткаў; пытанні для самастойнай працы студэнтаў; слоўнік паняццяў да кожнай тэмы і спіс асноўнай і дадатковай літаратуры па дысцыпліне.

Прызначаны для выкладчыкаў і студэнтаў філалагічных спецыяльнасцяў ВНУ, настаўнікаў і вучняў сярэдніх спецыяльных устаноў, спецыялістаў.

**УДК**
**ББК**

**ISBN**

© УА «ПДУ», 2009
**© Лясовіч С.М., склад., 2009**

# УВОДЗІНЫ

Курс «Сучасная беларуская мова» выступае абавязковым кампанентам у цыкле вучэбных дысцыплін і адыгрывае істотную ролю ў падрыхтоўцы прафесійных філолагаў.

Вучэбна-метадычны комплекс па дысцыпліне «Сучасная беларуская мова» падрыхтаваны ў адпаведнасці з патрабаваннямі тыпавой праграмы[1] і прызначаны для студэнтаў-філолагаў, што вывучаюць беларускую і замежную мовы.

Мэта вывучэння курса – паглыбленне і сістэматызацыя ведаў па беларускай мове, атрыманых у школе, фарміраванне навыкаў самастойнай працы, разуменне функцыянавання лінгвістычных адзінак як сістэмы і прымяненне тэарэтычных ведаў на практыцы, засваенне неабходных лінгвістычных паняццяў, пашырэнне мовазнаўчай дасведчанасці студэнтаў.

Вучэбна-метадычны комплекс утрымлівае лекцыйны матэрыял па праграмных тэмах, пытанні для яго паспяховага замацавання, слоўнік асноўных лінгвістычных паняццяў для засваення, парады да правядзення практычных заняткаў, спіс літаратуры для аналізу. Матэрыялам да правядзення практычных заняткаў з'яўляецца выданне «Сучасная беларуская літаратурная мова: Практ. заняткі: Вучэб. дапам. / Н.В. Гаўрош, М.Ц. Кавалёва, Л.А. Кацапаў і інш. – 3-е выд., дапрац. і дапоўн. – Мн.: Выш. шк., 1995». Менавіта з яго прапанаваны практыкаванні для замацавання тэарэтычных ведаў па тэмах.

Згодна з вучэбным планам, на выкладанне курса сучаснай беларускай мовы адводзіцца 380 гадзін (120 лекцыйных і 260 практычных). Раздзелы сучаснай беларускай мовы, прадстаўленыя ў вучэбна-метадычным комплексе, вывучаюцца студэнтамі на працягу трох курсаў. На першым курсе ў 2 семестры вывучаюцца раздзелы лексікалогія, фразеалогія, лексікаграфія, фразеаграфія (18 гадзін лекцыйных і 50 – практычных). На другім курсе ў 3 семестры вывучаюцца раздзелы фанетыка, фаналогія, арфаэпія (18 гадзін лекцыйных і 36 – практычных); у 4 семестры – графіка, арфаграфія, марфеміка, словаўтварэнне (18 гадзін лекцыйных і 34 – практычных). На працягу трэцяга курса вывучаецца раздзел марфалогія (48 гадзін лекцыйных і 84 – практычных). Тэарэтычны матэрыял сістэмна апісвае абазначаныя ў праграме пытанні,

1 Сучасная беларуская мова : тыпавая вучэбная праграма для ВНУ па спец.: 1-02 03 07 Замежная мова (з указаннем мовы). Дадатковая спецыяльнасць (1-02 03 07-01 Замежная мова (з указаннем мовы). Беларуская мова і літаратура); 1-02 03 04 Руская мова і літаратура. Дадатковая спецыяльнасць (1 02 03 04-01 Руская мова і літаратура. Беларуская мова і літаратура) / Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь, Вучэбна-метадычнае аб'яднанне ВНУ Рэспублікі Беларусь па педагагічнай адукацыі ; уклад. І. Л. Бурак ; рэц. А. М. Астапчук. – Мінск : РІВШ , 2008. – 31 с.

для больш падрабязнага вывучэння якіх прапаноўваецца дадатковая літаратура па тэме, што таксама пасадзейнічае пашырэнню філалагічнага кругагляду студэнтаў.

## Спіс асноўнай літаратуры па курсе «Сучасная беларуская мова»


1. Беларуская граматыка: у 2-х ч. Ч.1. – Мн., 1985.
2. Беларуская мова: фанетыка. Арфаэпія. Графіка. Арфаграфія. Лексікалогія. Фразеалогія. Марфемная будова слова і словаўтварэнне. Марфалогія: падручнік для навучэнцаў педагагічных вучылішчаў / [Я. М. Адамовіч і інш.]. – Мінск: Вышэйшая школа, 1992.
3. Беларуская мова. Энцыклапедыя. – Мн., 1994.
4. Бурак Л.І. Сучасная беларуская мова. – Мн., 1985.
5. Граматыка беларускай мовы: У 2-х т. Т.1. Марфалогія. – Мн., 1962.
1. Камароўскі Я.М. Сучасная беларуская мова: Фанетыка і фаналогія. Арфаэпія. Графіка. Арфаграфія: Вучэб. дапам. / Пад. рэд. праф. Л.М. Шакуна. – Мн., 1985.
6. Кароткая граматыка беларускай мовы. У 2 ч. Ч. 1. Фаналогія. Марфаналогія. Марфалогія / навук. Рэд. А.А. Лукашанец. – Мн: Беларус. Навука, 2007.
7. Лепешаў І.Я. Сучасная беларуская літаратурная мова: спрэчныя пытанні: Дапаможнік / І.Я.Лепешаў. – Гродна: ГрДУ, 2002.
8. Марфалогія: Вучэб. дапам. / Н.В. Гаўрош, М.Ц. Кавалёва, Н.М. Нямковіч і інш.; Пад агульн. рэд. праф. М.С. Яўневіча. – Мн.: Выд. Ул.М. Скарун, 1997.
9. Плотнікаў Б.А. Беларуская мова: Лінгвіст. кампендыум / Б.А. Плотнікаў, Л.А. Антанюк. – Мн.: Интерпрессервис: Кн. дом, 2003.
10. Плотнікаў Б.А. Агульнае мовазнаўства. – Мн., 1994.
11. Сучасная беларуская літаратурная мова: Лексікалогія, Фанетыка. Арфаграфія. 3-е выд. – Мн., 1993.
12. Сучасная беларуская літаратурная мова: Уводзіны. Лексікалогія. Фразеалогія. Лексікаграфія. Фразеаграфія. Фанетыка. Арфаэпія. Графіка. Арфаграфія: Вучэб. дапаможнік для студэнтаў філал. фак. выш. навуч. устаноў / М.Ц. Кавалёва, А.К. Юрэвіч, Ф.М. Янкоўскі і інш. – Мн.: Выш. шк., 1993.
13. Сучасная беларуская мова: Фанетыка. Арфаэпія. Графіка. Арфаграфія. Лексікалогія. Фразеалогія: Метад. дапам. для студэнтаў спец. П.04.02.00 / Гродз. дзярж. ун-т імя Я.Купалы. – Гродна: ГрДУ, 1996.
14. Сцяцко П.У. Уводзіны ў мовазнаўства: Дапаможнік. – Гродна: ГрДУ, 2001.
15. Сямешка Л.І. Беларуская мова: Уводз. у навуку аб мове. Фанетыка. Арфаэпія. Графіка. Арфаграфія: Вучэб. дапам. – Мн.: Сучас. слова, 1999.
16. Сямешка Л.І. і інш. Курс беларускай мовы: Падручнік / Л.І. Сямешка, І.Р. Шкраба, З.І. Бадзевіч. – Мн.: Універсітэцкае, 1996.
17. Шакун Л.М. Гісторыя беларускай літаратурнай мовы. – Мн., 1984.
18. Шуба П.П. Лекцыі па беларускай марфалогіі. – Мн.: Выд. БДУ, 1975.
19. Шуба П.П. Марфалогія ўсходнеславянскіх моў. – Мн., 1973.
20. Шуба П.П. Сучасная беларуская мова: Марфаналогія. Марфалогія. Мн., 1987.
21. Юргелевіч Д.Я. Курс сучаснай беларускай мовы з гістарычнымі каментарыямі. – Мн., 1974.
22. Янкоўскі Ф.М. Беларуская мова. – Мн., 1978.
23. Янкоўскі Ф.М. Гістарычная граматыка беларускай мовы.– Мн., 1989.

## МОДУЛЬ 1
## «ЛЕКСІКАЛОГІЯ»

## 1. Схема блок-сістэмы вывучэння тэарэтычнага матэрыялу

| № | Тэма лекцыйных заняткаў | Колькасць гадзін |
|---|---|---|
| 1. | Формы беларускай нацыянальнай мовы. Сістэма функцыянальных стыляў літаратурнай мовы. | 2 |
| 2. | Слова як асноўная матэрыяльна і граматычна аформленая, семантычна цэласная адзінка мовы. Тыпы лексічных значэнняў. Мнагазначнасць слова. | 2 |
| 3. | Амонімы, іх тыпы. Прычыны ўзнікнення амонімаў. Крытэрыі размежавання аманіміі і мнагазначнасці. | 2 |
| 4. | Сінонімы, іх тыпы ў залежнасці ад ступені, характару семантычнага падабенства і стылістычных уласцівасцей. Сінанімічны рад. Семантычныя і стылістычныя функцыі сінонімаў. | 2 |
| 5. | Антонімы. Паронімы. Слоўнікавая паранімія і кантэкстуальная паранамазія. | 2 |
| 6. | Дыферэнцыяцыя слоўнікавага складу: паводле паходжання, паводле наяўнасці – адсутнасці гістарычнай перспектывы, паводле сферы ўжывання, паводле эмацыянальна-экспрэсіўнай афарбоўкі. | 2 |

## 2. Асновы навукова-тэарэтычных ведаў па модулі

**Слоўнік паняццяў для засваення:** дыялектная мова, літаратурная мова, моўная норма, арфаэпічныя нормы, арфаграфічныя нормы, лексічныя нормы, граматычныя нормы, стылістычныя нормы, пунктуацыйныя нормы, лексікалогія, апісальная (сінхранічная) лексікалогія, гістарычная (дыяхранічная) лексікалогія, параўнальная лексікалогія, семантыка, анамасіялогія, этымалогія, дыялекталогія, лексіка, слова, словаўжыванне, паняцце, словаформа, лексічнае значэнне слова, граматычнае значэнне слова, паняцце, лексема, нематываваныя значэнні, матываваныя значэнні, прамое значэнне слова, пераноснае значэнне слова, свабоднае значэнне, несвабоднае значэнне, фразеалагічна звязанае значэнне, сінтаксічна абумоўленае значэнне, канструктыўна абмежаванае лексічнае значэнне, адназначныя (монасемантычныя) словы, мнагазначнасць (полісемія), вытворна-прамое значэнне, вытворна-пераноснае значэнне, метафара, метанімія, сінекдаха, аманімія, амонімы, поўныя амонімы, няпоўныя амонімы, амафоны, амографы, амаформы, сінанімія, сінонімы, лексічныя сінонімы, семантычныя (ідэаграфічныя) сінонімы, стылістычныя сінонімы, семантыка-стылістычныя сінонімы, абсалютныя сінонімы (лексічныя дублеты), сінтаксічныя сінонімы, марфалагічныя сінонімы, узуальныя сінонімы, кантэкстуальныя сінонімы, сінанімічны рад, дамінанта сінанімічнага рада, эўфемізмы, антанімія, энантыясемія, антонімы поўныя, няпоўныя (частковыя), кантэкстуальныя, антаніміка, паранімія, паронімы, паранамазія, агульнаславянскія словы, усходнеславянскія словы, уласнабеларускія словы, спрадвечна беларуская лексіка, запазычанні, актыўная лексіка,

пасіўная лексіка, гістарызмы, архаізмы, неалагізмы, агульнаўжывальная лексіка, словы абмежаванага ўжытку, дыялектная лексіка, спецыяльная лексіка, тэрмін, тэрміналогія, тэрміналагізацыя, дэтэрміналагізацыя, прафесіяналізмы, жаргон, арго, стыль мовы, нейтральная (міжстылёвая) лексіка, кніжная лексіка, гутарковая лексіка, прастамоўныя словы.

## 2.1. Формы беларускай нацыянальнай мовы. Сістэма функцыянальных стыляў літаратурнай мовы.

Пры напісанні раздзела быў выкарыстаны матэрыял падручніка «Сямешка Л.І. і інш. Курс беларускай мовы: Падручнік / Л.І. Сямешка, І.Р. Шкраба, З.І. Бадзевіч. – Мн.: Універсітэцкае, 1996. – 654 с.»

Як і іншыя нацыянальныя мовы, беларуская мова існуе ў дзвюх формах: дыялектнай і літаратурнай.

**Дыялектная мова** – гэта сукупнасць мясцовых гаворак, што бытуюць (у вуснай форме) на тэрыторыі Беларусі. На сучасным этапе дыялекты не развіваюцца, а пастунова разбураюцца. Перавага аддаецца вышэйшай форме нацыянальнай мовы – літаратурнай мове. Мясцовыя гаворкі на аснове свайго падабенства аб'ядноўваюцца ў тэрытарыяльныя дыялекты, якія ў сукупнасці ўтвараюць дыялектную мову. На дыялекталагічных картах можна ўбачыць два процiпастаўленыя адзін аднаму дыялекты: паўночна-ўсходні і паўднёва-заходні. Гэтыя дыялекты раздзяляюцца паласой пераходных, або сярэднебеларускіх, гаворак, што знаходзяцца абапал лініі Ашмяны – Мінск – Бабруйск – Гомель. Сярэднебеларускія гаворкі спалучаюць некаторыя рысы паўночна-ўсходняга і паўднёва-заходняга дыялектаў, а таксама маюць і свае спецыфічныя асаблівасці, што дае падставу выдзяляць іх у асобную міждыялектную групу. Два дыялекты з міждыялектнай пераходнай групай гаворак складаюць асноўны масіў сучаснай беларускай дыялектнай мовы. Акрамя гэтага, у склад сучаснай беларускай дыялектнай мовы ўваходзіць яшчэ адасобленая група заходнепалескіх, ці брэсцка-пінскіх, гаворак. Яны значна адрозніваюцца ад усіх іншых гаворак асноўнага беларускага дыялектнага масіву.

Такім чынам, два дыялекты і пазадыялектная група гаворак – аснова сучаснай беларускай дыялектнай мовы.

Кожны беларускі дыялект мае свае спецыфічныя асаблівасці. Асноўныя адрозненні паўночна-усходняга і паўднёва-заходняга дыялекта адлюстраваны ў табліцы.

| Паўночна-ўсходні дыялект | Паўднёва-заходні дыялект |
|---|---|
| характар вымаўлення галосных і зычных гукаў | |
| Вɨда, зімля (дысімілятыўнае аканне) | вада, зямля (недысімілятыўнае аканне) |

| | |
|---|---|
| сена, ліпа (супадзенне этымалагічных [о], [а], у [а]) | сено, ліпа (адрозненне этымалагічных [о] і [а]) |
| лес, хлеб (былы ѣ супаў з *е*) | ліес, хліеб (на месцы ѣ – дыфтонг) |
| буряк, ріка (наяўнасць [р']) | бурак, рака (зацвярдзелы [р]) |
| збожжа, насенне (падаўжэнне зычных) | збож'е ці збожа (адсутнасць падаўжэння) |
| граматычныя формы | |
| сцяной, мяжой, зямлёй,(Т., адз, л.) | сцяною, мяжою, зямлёю |
| вокны, вёдры (Н., мн. л.) | вокна, вёдра |
| садам, палям (Д., мн. л.) | садом, палём |
| (у) садах, палях (М., мн. л.) | (у) садох, палёх |
| вучуць, гаворуць | вучаць, гавораць |
| бярэць, нясець; берацё, несяцё | бярэ, нясе; бераце, несяце |

Сярэднебеларускія пераходныя гаворкі маюць асаблівасці і таго і другога дыялекту, але разам з тым ёсць і свае, адметныя рысы, напрыклад, адсутнасць мяккага [ц'] у 3-й асобе дзеясловаў II спражэння *(ходзя, робя, гавора),* вымаўленне [о] на месцы [а] перад [ў] *(проўда, казоў)* і інш.

Даволі спецыфічнымі рысамі характарызуюцца брэсцка-пінскія (ці заходнепалескія) гаворкі. Яны істотна адрозніваюцца ад усіх іншых гаворак асноўнага масіву беларускай дыялектнай мовы. У іх многа агульнага з украінскай мовай, што дае падставы вучоным называць Палессе своеасаблівым этнакультурна-моўным мастом паміж беларускім і ўкраінскім народамі. Так, палескай групе гаворак уласціва оканне *(вода, нога),* цвёрдыя зычныя на месцы мяккіх *(вэчор, зыма*), вымаўленне [і] на месцы ѣ *(ліс, хліб)*; спалучэнне [мн'] перад [а]: *мнята, мнясо;* канчатак *-ові* ў Д. і М. склонах *(братові, сынові)*; інфінітыў на *-ты (ходыты, купыты);* зычны [л] у дзеясловах 3-й асобы мн. ліку з асновай на губны *(лоўлять, куплять)* і інш.

Увогуле, Палессе, якое знаходзіцца амаль у самым цэнтры славянскага свету, на памежжы трох славянскіх народаў, дзе ў старажытнасці ішло актыўнае ўзаемадзеянне славян і балтаў, у лінгвістычным плане з'яўляецца адной з самых архаічных дыялектных зон. Палескія гаворкі ў найбольшай ступені захоўваюць памяць пра былую блізкасць з іншымі славянскімі мовамі.

Беларускія дыялекты і асобныя гаворкі ўнутры іх адрозніваюцца

таксама лексікай, словаўтварэннем. Аднак, нягледзячы на ўсе гэтыя адрозненні, агульных элементаў у іх значна больш. Таму наяўнасць тэрытарыяльных дыялектаў не парушае адзінства беларускай нацыянальнай мовы.

Тэрытарыяльныя дыялекты – гэта самыя старажытныя моўныя адзінствы, нават больш старыя, чым сама беларуская мова. У дапісьмовы перыяд дыялекты былі адзінай формай зносін.

Сацыяльны прагрэс разбураў вузкія рамкі феадальнай гаспадаркі. Пашыраўся капіталістычны рынак, людзі наладжвалі больш цесныя палітычныя эканамічныя, культурныя сувязі, значыць – і моўныя кантакты паміж сабой. А гэта патрабавала універсалізацыі сродку сувязі, вяло да паступовага фарміравання на базе асобных дыялектаў і гаворак адзінай нацыянальнай мовы.

У наш час новыя дыялекты не толькі не ўтвараюцца, але паступова сціраюцца адрозненні паміж тымі, што існуюць. Тым не менш дыялекты яшчэ жывуць. Яны – апора і аснова нацыянальнай мовы. Гэта – моўныя сродкі, выпрацаваныя і адшліфаваныя на працягу стагоддзяў нашымі папярэднікамі. Для нацыянальнай мовы яны – скарбніца, якую мы павінны захоўваць і берагчы.

А калі браць у сусветным маштабе, то ўвогуле тэрытарыяльныя дыялекты – адна з самых пашыраных на нашай планеце форм існавання мовы. З усіх 3 тыс. моў на Зямлі толькі 300 маюць пісьменнасць (гэта значыць, з'яўляюцца літаратурнымі), але большасць пісьмовых моў існуюць у дзвюх разнавіднасцях – літаратурнай і дыялектнай. Таму зразумела, што значная частка чалавецтва карыстаецца дыялектнай мовай.

Літаратурная мова – унармаваная, агульнапрынятая і абавязковая для ўсіх членаў грамадства. Існуе ў вуснай і пісьмовай разнавіднасцях, мае разгалінаваную сістэму стыляў.

У параўнанні з іншымі славянскімі мовамі літаратурная мова беларускага народа мае многа адметнага ў сваім развіцці. Па-першае, нацыянальны (больш чым двухвекавы) уціск замарудзіў фарміраванне нацыянальнай мовы беларусаў, у тым ліку і яе вышэйшай формы – літаратурнай мовы. Таму беларуская літаратурная мова адна з самых маладых сярод славянскіх моў. Яе фарміраванне прыходзіцца на XIX – пачатак XX ст. Па-другое, у адрозненне ад большасці ранніх літаратурных моў, што складваліся на аснове папярэдніх кніжных традыцый і паступова збліжаліся з народнымі гаворкамі, засвойваючы з іх толькі асобныя неабходныя моўныя рысы, новая беларуская літаратурная мова цалкам «вырастала» з народных гаворак. Яна не магла аперціся на традыцыі старабеларускай пісьменнасці, бо яны на працягу двухвекавой забароны да гэтага часу былі ўжо забытыя.

Генетычна сучасная літаратурная мова грунтуецца на гаворках цэнтральнай часткі Беларусі, але ў працэсе развіцця яна сінтэзавала найбольш характэрныя для большасці беларускіх гаворак рысы і таму не супадае цалкам з якім-небудзь тэрытарыяльным дыялектам, г. зн. мае **наддыялектны характар**.

На працягу некалькіх пакаленняў літаратурная мова апрацоўвалася майстрамі беларускай літаратуры. Сёння беларуская літаратурная мова – гэта вышэйшая, унармаваная, стылістычна разгалінаваная форма нацыянальнай мовы, якая выступае ў вуснай і пісьмовай разнавіднасцях.

Наяўнасць нормы – істотная асаблівасць літаратурнай мовы, якая адрознівае яе ад дыялектнай. Пад **нормай** разумеюць выпрацаваныя грамадствам і пісьмова замацаваныя ў нарматыўных слоўніках, даведніках, граматыках (ці, інакш,– кадыфікаваныя) узоры, правілы, якім падпарадкоўваюцца вымаўленне і напісанне слоў, выбар слоў, ужыванне граматычных форм, пабудова словазлучэнняў і сказаў. Кадыфікаваная, узаконеная норма з'яўляецца абавязковай для ўсіх носьбітаў літаратурнай мовы.

Сістэму норм літаратурнай мовы складаюць:

арфаэпічныя – правільнае вымаўленне гукаў і правільная пастаноўка націску;

арфаграфічныя – перадача вуснай мовы на пісьме ў адпаведнасці з пэўнымі правіламі;

лексічныя – ужыванне слоў ва ўласцівых ім значэннях і правільнае спалучэнне слоў па сэнсе;

граматычныя – правільнае ўжыванне форм слоў і правільная пабудова сказаў;

стылістычныя – выкарыстанне моўных сродкаў у адпаведнасці з выбраным стылем;

пунктуацыйныя – правільная пастаноўка знакаў прыпынку.

Літаратурная норма не з'яўляецца нерухомай. З развіццём літаратурнай мовы часткова змяняецца і норма. Сама моўная эвалюцыя прадугледжвае суіснаванне элементаў старой і новай якасці таму ў межах нормы дапускаюцца варыянты. Напрыклад, як варыянты ў беларускай мове ёсць такія формы: *дадзім і дамо, вадой і вадою, форм* і *формаў* і інш. Праз нейкі час адны з гэтых формаў могуць устарэць і выйсці з ужывання.

шсьмовая

Спецыфіка літаратурнай мовы выяўляецца і ў тым, што яна існуе ў дзвюх разнавіднасцях – вуснай і пісьмовай (дыялектная мова – толькі ў вуснай). Гэта дзве раўнапраўныя формы рэалізацыі літаратурнай мовы, кожная з якіх мае сваю сферу выкарыстання. Вусна-гутарковая разнаві-

днасць літаратурнай мовы ўжываецца ў вусных зносінах паміж людзьмі. У ёй пераважаюць простыя канструкцыі, няпоўныя і незакончаныя сказы. Важнае значэнне ў вуснай мове мае інтанацыя, міміка, жэстыкуляцыя. Пісьмова-кніжная мова, як правіла, характарызуецца шырокім ужываннем развітых, ускладненых канструкцый. Носьбіты літаратурнай мовы звычайна валодаюць абедзвюма яе формамі і карыстаюцца імі ў залежнасці ад патрэб моўных зносін.

Наступная значная адметнасць літаратурнай мовы – здольнасць выконваць у сферы зносін, камунікацыі самыя розныя функцыі: абслугоўваць неафіцыйныя зносіны паміж людзьмі, а таксама ў сферы навукі, афіцыйна-справавой, у сродках масавай інфармацыі. Дыялектная мова выконвае адну функцыю: забяспечвае зносіны пэўнага тэрытарыяльна абмежаванага кола людзей на бытавым ўзроўні. Здольнасць літаратурнай мовы выконваць розныя функцыі – гэта вынік развіцця ў ёй адпаведных моўных сродкаў. Вучоныя называюць гэту з'яву развіццём стыляў.

Вусная літаратурная мова мае адзін стыль – размоўна-гутарковы, а пісьмовая – тры стылі: публіцыстычны, навуковы і афіцыйна-справавы. Часам у сістэму стыляў уключаюць і мову мастацкай літаратуры, ці мастацкі стыль. Аднак гэта своеасаблівая форма літаратурнай мовы якая прадугледжвае не толькі камунікатыўныя, але і эстэтычныя мэты. Таму мастацкі стыль можа выкарыстоўваць у якасці вобразна-выяўленчых сродкаў элементы ўсіх стыляў і нават пазалітаратурныя моўныя сродкі (дыялектызмы, жарганізмы, прастамоўе і інш.

Кожны функцыянальны стыль абслугоўвае пэўную сферу зносін. Кожная сфера зносін мае свае мэты: камунікатыўныя, пазнавальныя, агітацыйна-прапагандысцкія, мастацка-эстэтычныя і інш. У адпаведнасці з гэтым кожны са стыляў мае спецыфічныя наборы слоў і выразаў, адрозніваецца ступенню экспрэсіўнасці, выразнасці розных сродкаў і інш.

Па сутнасці, авалоданне літаратурным маўленнем на ўзроўні стварэння тэксту, у якім не парушаны спецыфічныя рысы таго ці іншага стылю,– гэта канчатковая мэта вывучэння мовы.

## 2.2. Лексікалогія як раздзел мовазнаўства

Пры напісанні раздзела быў выкарыстаны матэрыял энцыклапедычнага даведніка «Беларуская мова: Энцыкл. / Беларус. Энцыкл.; Пад рэд. А.Я. Міхневіча; Рэдкал.: Б.І. Сачанка (гал. рэд.) і інш. – Мн., 1994. – 655 с.».

**Лексіка** (ад грэч. *lexikós* які адносіцца да слова) – гэта ўвесь слоўнік (слоўнікавы склад), сукупнасць слоў пэўнай мовы. Лексікай называюць не толькі слоўнік мовы таго ці іншага народа, але і сукупнасць слоў, якія ўжываюцца ў творчасці асобнага пісьменніка (лексіка У. Караткеві-

ча), у асобным творы (лексіка рамана У. Караткевіча «Нельга забыць»), у пэўнай гаворцы (дыялектная лексіка і інш.).

Раздзел мовазнаўства, які вывучае лексіку, называецца **лексікалогіяй**. Лексіка – не механічная сукупнасць слоў, а сістэма суадносных і ўзаемазвязаных элементаў. Таму ў задачы лексікалогіі ўваходзіць вывучэнне і сістэматызацыя слоўнікавага складу, шляхоў развіцця слоў і іх значэнняў, вывучэнне паходжання слоў, вызначэнне сферы іх ужывання. Да галоўных праблем лексікалогіі звычайна адносяцца месца слова сярод іншых адзінак мовы, лексічнага значэння і лексіка-семантычнай сістэмы мовы, значэння і паняцця, суадносін і ўзаемадзеяння лексічнага і граматычнага значэнняў у слове, спосабаў тлумачэння значэння, аманіміі і сінаніміі і інш. У апошні час да пералічаных далучыліся задачы вывучэння спалучальнасці і частотнасці лексічных адзінак, пытанні семантычнай дэрывацыі, праблемы лексічнай сістэмнасці, патрэба ў ідэаграфічных апісаннях беларускай лексікі і інш.

Навука пра слоўнікавы склад мовы аб'ядноўвае некалькі галін. Агульная лексікалогія разглядае самыя важныя праблемы кожнай нацыянальнай мовы. Прыватная лексікалогія вывучае лексіку канкрэтнай мовы. **Апісальная лексікалогія** даследуе слоўнік пэўнай мовы ў дакладна вызначаных храналагічных межах, яе называюць яшчэ **сінхранічная**. Звычайна, тэрмін ужываецца ў адносінах вывучэння слоўнікавага складу сучаснай мовы. **Гістарычная лексікалогія** вывучае развіццё слоўніка ў гістарычным плане, яе называюць яшчэ **дыяхранічнай**. Апісальная лексікалогія і гістарычная цесна звязаны паміж сабой: звесткі з гісторыі фарміравання лексікі дапамагаюць правільна вызначаць законы развіцця слоўнікавага складу, яго фарміраванне. **Параўнальная (супастаўляльная)** лексікалогія вывучае лексіку дзвюх і больш моў адначасова.

Лексікалогія цесна звязана з іншымі раздзеламі мовазнаўства, якія вывучаюць розныя аспекты слова: семасіялогіяй, анамасіялогіяй, этымалогіяй, стылістыкай, дыялекталогіяй, фразеалогіяй, лексікаграфіяй, сацыялінгвістыкай, псіхалінгвістыкай.

**Семасіялогія**, або **семантыка** вывучае пытанні, звязаныя са значэннем слова (мнагазначнасць слова, аманімію, сінанімію, антанімію), і змены значэнняў слова. У першым выпадку семасіялогія ўключаецца ў апісальную лексікалогію, а ў другім – у гістарычную лексікалогію. **Анамасіялогія** вывучае спосабы абазначэння і называння прадметаў і з'яў. **Этымалогія** з’яўляецца адгалінаваннем гістарычнай лексікалогіі і высвятляе паходжанне слоў. **Стылістыка** вывучае спосабы выкарыстання моўных сродкаў у залежнасці ад характару, умоў і мэты выказвання. **Дыялекталогія** займаецца вывучэннем тэрытарыяльных гаворак, у тым

ліку іх слоўнікавага складу. **Фразеалогія** вывучае ўстойлівыя выразы – іх узнікненне, значэнне і класіфікацыю. Устойлівыя выразы выступаюць як цэласныя моўныя адзінкі, аналагічныя словам – лексічным адзінкам. На гэтай падставе фразеалогія як навука зближаецца з лексікалогіяй, невыпадкова фразеалагізмы доўгі час вывучаліся ў курсе лексікалогіі. **Лексікаграфія** вывучае тэарэтычныя асновы стварэння слоўнікаў розных тыпаў, распрацоўвае практыку складання слоўнікаў. **Сацыялінгвістыка** навука, якая даследуе праблемы, звязаныя з сацыяльнай прыродай мовы, яе грамадскімі функцыямі і ўздзеяннем сацыяльных фактараў на мову. **Псіхалінгвістыка** вывучае мову як феномен псіхікі, маўленчую дзейнасць чалавека.

У курсе сучаснай беларускай мовы вывучаецца апісальная лексікалогія. Яна дае сінхронную характарыстыку лексікі ў цэлым, аднак у некаторых выпадках абавязкова закранае з'явы дыяхраніі (паходжанне слоў, змены ў іх значэнні). Такім чынам, прадметам лексікалогіі з'яўляецца лексічная сістэма, слоўнікавы склад мовы і асобнае слова як важная адзінка гэтага складу.

### 2.3. Слова як адзінка мовы

Пры напісанні раздзела быў выкарыстаны матэрыял энцыклапедычнага даведніка «Беларуская мова: Энцыкл. / Беларус. Энцыкл.; Пад рэд. А.Я. Міхневіча; Рэдкал.: Б.І. Сачанка (гал. рэд.) і інш. – Мн., 1994. – 655 с.».

**Слова** – асноўная намінатыўная адзінка, якая служыць у мове для ўтварэння сказаў з мэтай перадачы інфармацыі.

Калі разглядаць як зыходную адзінку мовы сказ, то словы з'яўляюцца тымі яго галоўнымі часткамі, з дапамогай якіх мы вылучаем у сваёй свядомасці паняцці, абазначаем іх і аб'ядноўваем у межах гэтай больш буйной адзінкі мовы – сказе. Але ў любым выпадку мы ўяўляем слова як своеасаблівую вось, вакол якой упарадкоўваецца і працуе ўвесь механізм нашай мовы. Сапраўды, больш дробныя за словы адзінкі мовы (фанемы, склады, марфемы) вылучаюцца менавіта ў складзе слова, а больш буйныя (словазлучэнні, сказы) утвараюцца са слоў. Але ў некаторых мовах, напрыклад інкарпаруючых (чукоцкая, ніўхская, мовы паўночнаамерыканскіх індзейцаў, у якіх адным гукавым комплексам афармляецца цэлы сказ). Таму даць агульнае для ўсіх моў азначэнне слова немагчыма.

Больш рацыянальным з'яўляецца характарыстыка і апісанне слова ў межах адной мовы ці групы роднасных моў. У сучасным мовазнаўстве ў сувязі з даволі паслядоўным размежаваннем мовы і маўлення вылучаюць і адпаведныя гэтым з'явам адзінкі. На лексічным узроўні вылучаецца **слова**, ці лексема, як моўная адзінка, якой у маўленні адпавядае словаўжыванне. Усе словы належаць да абстрактных абагульненых

адзінак, кожная з якіх рэалізуецца ў маўленні цэлым шэрагам сваіх варыянтаў, ці словаўжыванняў. Апошнія прадстаўляюць тую канкрэтнасць, якую мы ўспрымаем сваімі органамі пачуццяў (слыхам, зрокам). Гэта канкрэтнасць паддаецца ў большасці выпадкаў пэўным азначэнням, таму што выражаецца матэрыяльна ў выглядзе гукаў (у вусным маўленні) ці літар і іх сукупнасцей (на пісьме). У адносінах да пісьма **словаўжыванне** вызначаецца звычайна як літара ці сукупнасць літар, якія знаходзяцца паміж двума прагаламі (прагалам і знакам прыпынку, знакамі прыпынку) радка тэксту. Адпаведна ў вусным маўленні словаўжываннем з'яўляецца гук ці сукупнасць гукаў, паміж якімі магчымы паўзы і нельга ўставіць іншыя гукі. Прыведзеныя азначэнні словаўжывання, зразумела, не з'яўляюцца вычарпальнымі, таму што тут улічваецца толькі фармальны бок адзінкі маўлення. Тым не менш для падзелу тэксту на словаўжыванні, на зыходныя намінатыўныя адзінкі такі падыход даволі шырока выкарыстоўваецца ў мовазнаўстве, у прыватнасці ў прыкладной лінгвістыцы. Значыць, у любым тэксце налічваецца столькі словаўжыванняў, колькі ў ім асобных літар і іх сукупнасцей, размешчаных паміж інтэрваламі тэксту. Прамежкавай адзінкай паміж словаўжываннем і словам з'яўляецца словаформа, якая аб'ядноўвае ў сваім складзе аднолькавыя словаўжыванні, якія ва ўсім супадаюць. Словаформы з адным і тым жа коранем і супадаючымі граматычным і лексічным значэннямі аб'ядноўваюцца ў больш буйныя і абстрактныя адзінкі – словы.

Але ў маўленні сустракаецца даволі шмат прыкладаў, якія не дазваляюць вырашаць вечную для мовазнаўства праблему слова. Да такіх прыкладаў належаць несупадаючыя, або суплетыўныя, формы слоў (параўнайце: *чалавек – людзі, я – мы, ён – яго* і г. д.), розныя словаўтваральныя формы (параўнайце: *стол – столік, хата – хаціна* і г. д.), а таксама шматлікія выпадкі полісеміі слова, якую не заўсёды проста адрозніць ад аманіміі. Словаўжыванні прадстаўлены ў пісьмовых тэкстах і ў вусным маўленні, а словы ў шматлікіх філалагічных (перакладных, тлумачальных, арфаграфічных і інш.) слоўніках.

Слова разглядаецца і вывучаецца моваведамі з розных пунктаў погляду. Да яго можна падыходзіць і як да адносна самастойнай адзінкі, і як да элемента моўнай сістэмы. Нашай свядомасці словы дапамагаюць вылучаць у знешняй рэчаіснасці адпаведныя прадметы, дзеянні, прыкметы, з'явы, абазначаць і абагульняць іх праз адпаведныя паняцці і адначасова даволі тонка іх чляніць. Слова (галоўная намінатыўная і структурная адзінка мовы) суадносіцца з асноўнай катэгорыяй мыслення – паняццем. Праз паняцце слова звязваецца са знешняй рэчаіснасцю і тым самым выконвае сваю намінатыўную функцыю. У аснове значэння

практычна ўсіх знамянальных слоў ляжыць паняцце, у якім абагульнена адлюстроўваюцца адпаведныя прадметы і з'явы навакольнага свету. У любым выпадку слова і паняцце – катэгорыі ўзаемазалежныя, і сутнасць іх немагчыма вызначыць адно без аднаго. Арганічныя сувязі паміж імі выразна праяўляюцца ў імкненні слова як мага дакладней і паўней увасобіць у сабе адпаведнае паняцце. Эфектыўнасць нашага маўлення непасрэдна залежыць ад таго, наколькі ўдала мы выказваем свае паняцці словамі.

Зразумела, слова не служыць адзінай формай выражэння паняццяў, якія ўвасабляюцца і ў розных няслоўных знаках (параўнайце: малюнкі, схемы, формулы, музычныя ноты і інш.). Але падобныя знакі характэрны толькі для выражэння спецыфічных паняццяў, а словы здольны перадаваць думкі аб самых розных сферах жыцця і дзейнасці чалавека. Словы гнутка прыстасоўваюцца да адпаведных катэгорый мыслення.

У мове параўнальна невялікая колькасць слоў дзякуючы таму, што слова можа называць паняцце (усіх зайцаў мы называем адным словам, а не кожнага асобна). **Паняцце** – гэта вынік адлюстравання і абагульнення ў свядомасці чалавека істотных прымет і ўласцівасцей асобных прадметаў і з’яў рэчаіснасці.

Не называюць паняццяў службовыя словы (прыназоўнікі, злучнікі, часціцы), выклічнікі і займеннікі. Яны выражаюць пачуцці, адносіны. Уласныя імёны і прозвішчы людзей хоць і выконваюць намінатыўную функцыю, але не называюць паняццяў.

Паняцці ўзнікаюць і выпрацоўваюцца пры дапамозе слоў. Значэнне і слова – катэгорыі лінгвістычныя, паняцце – катэгорыя лагічная, сувязь паміж імі самая цесная.

Слова ў мове выконвае шэраг функцый. Да ліку асноўных можна аднесці: 1) узнаўленне ў маўленні лексічнай адзінкі, яе актуалізацыя, 2) камунікатыўная – служыць сродкам зносін і паведамлення, 3) намінатыўная – служыць найменнем прадмета, 4) эстэтычная – служыць сродкам мастацкай выразнасці.

У слове вылучаюць два бакі: план выражэння, ці знешняя форма, і план зместу, ці значэнне, унутраны бок слова. Гучанне слова – гэта яго знешні бок, форма. Значэнне слова – гэта суаднесенасць яго гукавой абалонкі з пэўным прадметам ці з’явай рэчаіснасці, унутраны бок, змест.

Форма і змест слова знаходзяцца ў непарыўным адзінстве. Сувязь паміж гэтымі бакамі ў пэўны перыяд існавання мовы можа быць матываванай, калі адчуваецца прымета, што ляжыць у аснове назвы (*парэчкі, смуродкі, дзярач, галень*) і нематываванай (*зіма, белы, століь, даць*).

Самастойнае слова заўсёды мае рэальны змест, які звычайна назы-

ваюць яго лексічным значэннем. **Лексічнае значэнне слова** – гэта яго суаднесенасць з тымі ці іншымі з’явамі або прадметамі рэчаіснасці, характарызуе кожнае асобнае слова, адрознівае змест кожнага слова ад іншых слоў. Але кожнае самастойнае слова па граматычных законах мовы можа ўступаць у розныя адносіны з іншымі словамі, яно мае не толькі лексічнае, але і граматычныя значэнні. **Граматычнае значэнне** – гэта тыя агульныя значэнні, якія ўласцівы розным разрадам слоў у мове і на аснове якіх гэтыя разрады вылучаюцца. Граматычныя значэнні выражаюцца пры дапамозе канчаткаў, націску, суфіксаў, прыставак. Лексічнае і граматычнае значэнне ў слове цесна звязаны паміж сабой. Са зменай лексічнага значэння адбываюцца змены ў граматычнай характарыстыцы (*залаты гадзіннік, залаты характар*). Слова бытуе ў выглядзе набору **словаформ**, што супадаюць па лексічным значэнні, а адрозніваюцца граматычнымі. Такое мноства словаформаў называецца **лексемай**.

### 2.4. Асноўныя тыпы лексічных значэнняў слова

Пры напісанні раздзела быў выкарыстаны матэрыял дапаможніка «Лепешаў І.Я. Сучасная беларуская літаратурная мова: спрэчныя пытанні: Дапаможнік / І.Я.Лепешаў. Гродна: ГрДУ, 2002. – 207 с.».

Лексічныя значэнні паводле агульных прымет, спецыфічных уласцівасцей могуць быць аб'яднаны ў пэўныя тыпы. Такімі агульнымі прыметамі, пакладзенымі ў аснову класіфікацыі, выступаюць семантычная матываванасць, сувязь назвы з прадметам, лексіка-граматычная спалучальнасць.

Паводле семантычнай матываванасці вылучаюць два тыпы значэнняў: матываваныя і нематываваныя. **Нематываваныя значэнні** характэрны для невытворных слоў, якія складаюцца толькі з кораня або кораня і канчатка (*дуб, зямля*), а **матываваныя значэнні** ўласцівыя словам, што ўзніклі на базе невытворных (і вытворных) пры дапамозе суфіксаў, прыставак ці складання асноў (*дубовы, пазямельны, землямер*). Назоўнік лес выступае як нематываваная назва: сучасным носьбітам мовы незразумела, чаму нашы далёкія продкі менавіта гэтым гукавым комплексам абазначылі 'масіў зямлі, зарослы дрэвамі'. А матыў узнікнення шматлікіх утварэнняў на базе слова *лес* (іх больш як 150) цалкам зразумелы і выразна ўсведамляецца: *ляснік, леснічоўка, лесавік, лесаахоўны, лесапасадачны, лесаруб, лесахімік, палясоўшчык, лясны, падлесак, узлесак, пералесак, залесіць, леснікаваць* і інш. Пры вытлумачэнні сэнсу гэтых і іншых слоў абавязкова і непазбежна выкарыстоўваецца матывавальная частка *лес*: *лясны* – 'які мае адносіны да лесу', ляснік – 'даглядчык, вартаўнік лесу'.

Што датычыцца мнагазначных слоў, то тут матывацыя мае зусім іншы характар і не залежыць ад марфемнага складу слова, ад наяўнасці

ці адсутнасці прыстаўкі або суфікса. Напрыклад, у слове *дуб* першае значэнне 'буйное лісцевае дрэва з моцнай драўнінай' нематываванае, а іншыя значэнні 'драўніна гэтага дрэва', 'высокі, моцны чалавек' павінны кваліфікавацца як матываваныя.

Паводле сувязі назвы з прадметам звычайна ў падручніках вылучаюцца два тыпы лексічных значэнняў: прамое і пераноснае. Калі слова аднaзначнае, то яно заўсёды мае толькі **прамое значэнне**, г. зн. такое, якое прама, непасрэдна, без прамежкавых сувязяў звязана з пэўным прадметам, дзеяннем, з'явай, якасцю і інш. Гэта значэнне менш за ўсё залежыць ад кантэксту, яно з’яўляецца як бы семантычным цэнтрам, ядром усіх іншых значэнняў у слове; яго называюць яшчэ асноўным, першасным.

У мнагазначных жа словах, апрача прамога (яго яшчэ называюць асноўным, першасным, зыходным), вылучаюць і пераноснае ці **пераносныя значэнні**, якія ўзнікаюць на аснове агульнасці прымет. Словы з такім значэннем называюць прадмет, з’яву, прымету, дзеянне не непасрэдна, а праз параўнанні, асацыяцыі, што ўзнікаюць у свядомасці чалавека. Гэтыя значэнні канкрэтна выяўляюцца ў кантэксце. Тыя пераносныя значэнні, у якія ўключаецца экспрэсіўна-эмацыянальная прымета, маюць у слоўніках прымету *перан.* Але ж значэнні слоў, што ўзнікаюць як пераносныя, з цягам часу могуць страчваць гэтую якасць. Пры частым ужыванні пераноснае значэнне становіцца прывычным, семантычная двухпланавасць яго сціраецца, яно становіцца адным з асноўных прамых значэнняў. Таму, апрача прамога значэння, вылучаюцца вытворна-намінатыўныя значэнні з двума падтыпамі: **вытворна-прамымі** і **вытворна-пераноснымі**. Вытворна-прамыя значэнні хоць і склаліся на аснове падабенства, але сёння не ўспрымаюцца як пераносныя, у іх няма экспрэсіўна-эмацыянальнага адцення. У вытворна-пераносных значэннях заўсёды пераважае экспрэсіўна-эмацыянальная прымета; напрыклад, у другім значэнні назоўніка *выток* 'пачатак чаго-небудзь': *вытокі культуры*.

Што да класіфікацыі значэнняў слова паводле яго лексіка-граматычнай спалучальнасці з іншымі словамі, то тут усе значэнні падзяляюцца на свабодныя і несвабодныя, а сярод несвабодных у сваю чаргу, у залежнасці ад таго, з чым звязана спалучальная абмежаванасць, вылучаюцца тры тыпы значэнняў. Праблема свабодных і несвабодных значэнняў упершыню ў мовазнаўстве была пастаўлена і вырашана В.У. Вінаградавым, які звязаў яе з «фразавым акружэннем» і сэнсавай структурай слова. Па ступені лексічнай спалучальнасці слова з кантэкстам вылучаюцца, паводле В.У. Вінаградава, такія тыпы лексічных значэнняў, як свабоднае намінатыўнае, фразеалагічна звязанае, сінтаксічна абумоўленае. Асобна разглядаецца канструктыўна абмежаванае значэнне, якое бывае ўласціва

і свабодным намінатыўным, але і фразеалагічна звязаным і функцыянальна-сінтаксічна абмежаваным значэнням слова.

Словы са **свабодным значэннем** адносна шырока, свабодна спалучаюцца з іншымі словамі. Свабода спалучэння слоў адносная, бо кожнае слова можа спалучацца з большай ці меншай колькасцю слоў, але не з любымі. Усе прамыя значэнні з'яўляюцца адначасова і свабоднымі.

Лексічная спалучальнасць слоў з **несвабодным значэннем** абмежаваная. Сярод іх вылучаюцца дзве групы слоў – фразеалагічна звязаныя і сінтаксічна абумоўленыя. **Фразеалагічна звязанае** – гэта такое значэнне, якое раскрываецца ў спалучэнні пэўнага слова з вузка абмежаваным устойлівым колам лексем (інакш – у фразеалагічных спалучэннях). Устойлівае кола слоў, якія забяспечваюць рэалізацыю такіх значэнняў, звычайна невялікае, нярэдка можа быць толькі адно слова: *торны – шлях, дарога, расквасіць – твар, нос*. Слова з несвабодным значэннем у такіх спалучэннях звычайна лёгка замяняецца сінонімам – словам са свабодным значэннем.

Калі слова мнагазначнае, то адны яго значэнні могуць быць свабодныя, а другія фразеалагічна звязаныя. Так, у ТСБМ (т. 2, с. 328) слова *закляты* мае два значэнні: 1) 'такі, на якога накладзена заклящце; пракляты' – свабоднае, 2) 'непрымірымы, вечны' – фразеалагічна звязанае, якое рэалізуецца ў спалучэнні з назоўнікам *вораг*.

**Сінтаксічна абумоўленае** – такое лексічнае значэнне, якое слова можа набываць у кантэксце, выконваючы функцыю, не ўласцівую яму пры ўжыванні з прамым значэннем. Напрыклад, у ролі выказніка ці адасобленага прыдатка некаторыя словы (*авечка, мядзведзь, бервяно, галубка, зязюлька* і інш.) набываюць сінтаксічна абумоўленае значэнне. Напр.: *авечка* – няхітры чалавек, якога можна падмануць: *«Не прадстаўнік паліцыі, а **авечка** ты дурная»* (Лыньк.).

Словы з сінтаксічна абумоўленым значэннем не толькі называюць прадметы, але і маюць экспрэсіўна-эмацыянальную характарыстыку – станоўчую ці адмоўную. Пераважная большасць слоў, якія маюць фразеалагічна звязанае ці сінтаксічна абумоўленае значэнне, мае таксама і прамое значэнне.

Сярод слоў з несвабодным значэннем ёсць такія, якія выступаюць у ролі слоў-сказаў (*шкада, безумоўна, бясспрэчна, так, але* і інш.), іх значэнне толькі сінтаксічна абумоўленае.

**Канструктыўна абмежаваным** называецца такое лексічнае значэнне, якое рэалізуецца толькі ў строга акрэсленай канструкцыі. Яно характарызуецца прадметна-сэнсавай непаўнатой яго раскрыцця ў формах самога слова: поўнасцю яно рэалізуецца толькі ва ўласцівай яму сінтаксічнай канструкцыі. Напрыклад, трохзначнае слова *град* не можа

праявіць адно са сваіх значэнняў 'мноства чаго-небудзь', не дапоўніўшыся залежным неадушаўлёным назоўнікам у родным склоне: *град кпінаў, насмешак, выстралаў, узнагарод* і г. д. Дзеяслоў *падлашчыцца* рэалізуе сваё значэнне 'ліслівасцю дабіцца прыхільнасці, ласкі' толькі ў канструкцыі *падлашчыцца д а к а г о (да бацькі, да настаўніка* і інш.).

Тыпы лексічных значэнняў можна прадставіць наступным чынам:

<table>
<tr><th colspan="9">Тыпы лексічных значэнняў</th></tr>
<tr><td colspan="3">Па сувязі назвы з прадметам</td><td colspan="2">Па семантычнай матываванасці</td><td colspan="4">Па спалучальнасці</td></tr>
<tr><td rowspan="2">Прамое, намінатыўнае</td><td rowspan="2">Вытворна-прамое</td><td rowspan="2">Вытворна-пераноснае</td><td rowspan="2">Нематываванае</td><td rowspan="2">Матываванае</td><td rowspan="2">Свабоднае</td><td colspan="3">Несвабодныя</td></tr>
<tr><td>Фразеалагічна звязанае</td><td>Сінтаксічна абумоўленае</td><td>Канструктыўна абмежаванае</td></tr>
</table>

### 2.5. Мнагазначнасць слова

Пры напісанні раздзела быў выкарыстаны матэрыял энцыклапедычнага даведніка «Беларуская мова: Энцыкл. / Беларус. Энцыкл.; Пад рэд. А.Я. Міхневіча; Рэдкал.: Б.І. Сачанка (гал. рэд.) і інш. – Мн., 1994. – 655 с.».

У мове ёсць словы, якія маюць толькі адно значэнне, яны ў кантэксце абазначаюць той самы прадмет, прымету, дзеянне і г.д. Такія словы называюцца **адназначнымі**, або **монасемантычнымі**: *хмыз, цітла, самалёт, цукат* і інш.

Многія словы маюць некалькі значэнняў, іх называюць **мнагазначнымі**, або **полісемічнымі** (**полісемантамі**). Наяўнасць у слове некалькіх значэнняў, якія сэнсава звязаны паміж сабой і ўзніклі ў выніку развіцця асноўнага значэння называецца **мнагазначнасцю**, або **полісеміяй**. Значэнні мнагазначнага слова грунтуюцца на асноўным значэнні.

Некалькі значэнняў маюць звычайна тыя словы, якія існуюць даўно і часта ўжываюцца ў моўнай практыцы: *гаварыць, бачыць, ісці, куцця, высокі*. Значэнні полісемантычнага слова рэалізуюцца ў кантэксце.

У момант узнікнення слова заўсёды адназначнае. Слова становіцца мнагазначным тады, калі якая-небудзь назва прадмета, з’явы пераносіцца на іншы прадмет, з’яву, калі яны маюць нейкія агульныя рысы, што дазваляе іх параўноўваць і супастаўляць між сабой. У такім выпадку адно слова адначасова ўжываецца ў якасці назвы некалькіх прадметаў, з’яў. На падставе асацыятыўнай сувязі ўзніклі, напрыклад, такія новыя значэнні: *льецца вада – льецца гаворка, цвёрды грунт, цвёрды адказ*.

Такія значэнні называюцца пераноснымі.

Суадносіны паміж прамым і пераносным значэннямі мнагазначнага слова з цягам часу мяняюцца. Пераносныя значэнні могуць пашырацца і зусім выцесніць прамое: *смага – 'агонь', сорак – 'звязка з сарака сабаліных скурак'.* Значэнні мнагазначнага слова з'яднаны агульнай семантычнай залежнасцю, якая і робіць іх значэннямі менавіта аднаго слова: *трыо: 1) Музычны твор для трох выканаўцаў (музыкантаў, спевакоў, танцораў) з самастойнымі партыямі для кожнага; 2) Ансамбль з трох выканаўцаў такога твору.* Агульны семантычны кампанент, які аб'ядноўвае прыведзеныя значэнні, – 'цэлае, што складаецца з трох частак'.

Калі ланцужок сэнсавай залежнасці паміж значэннямі рвецца, то яны выступаюць ужо як самастойныя асобныя словы-амонімы: *жура-вель – 'балотная птушка з доўгімі нагамі' і 'прыстасаванне пры калодзежы'.*

У залежнасці ад прыкметы, пакладзенай у аснову пераносу назваў, адрозніваюць тры асноўныя спосабы развіцця новых значэнняў: метафара, метанімія, сінекдаха.

**Метафара** (ад грэч. *metaphora* 'перанясенне') – перанос назвы з аднаго аб'екта рэчаіснасці на другі на аснове якога-небудзь падабенства іх прымет. Гэта найбольш жывая і прадуктыўная разнавіднасць полісеміі.

Перанос можа ўзнікаць на падабенстве формы: *іголка* (кравецкая, на хвоі), *званочак* (памяншальнае ад 'звон', кветка); *колеру*: свінцовая (куля, хмара), *залатая* (рэч, восень); функцыі: *крыло* (птушкі, самалёта); на аснове размяшчэння (часцей за ўсё часткі ў адносінах да цэлага): *хвост* (жывёлы, калоны).

Метафары можна падзяліць на агульнамоўныя, або метафары-назвы, і вобразныя. **Агульнамоўныя** метафары перасталі ўжывацца як вобразныя пераносныя значэнні слоў. Такія метафары часта называюць прывычнымі (В.С. Ахманава называе іх яшчэ сцёртымі, мёртвымі, акамянелымі). Яны ўтварыліся ў выніку пераносу, але зараз з'яўляюцца прамымі назвамі прадметаў, з'яў, дзеянняў, прымет: *аснова слова, корань слова, носік чайніка, ножка стала, гадзіннік ідзе.*

У вобразных метафарах суіснуюць два планы – прамая намінацыя і вобразнае найменне, заснаванае на параўнальнай характарыстыцы: *сухар* – 'нячулы чалавек', *камень* – 'душэўны цяжар, гора', *штамп* – 'агульнаўжывальны, збіты моўны ўзор'. У слоўніку такія значэнні падаюцца з паметай *перан.*

**Метанімія** (ад грэч. *metōnytia* перайменаванне) – замена адной назвы прадмета, з'явы другой назвай на аснове сумежнасці. Можа пераносіцца:

– назва формы на тое, што змяшчаецца. Напрыклад, словы *аўдыто-*

*рыя, клас, завод, фабрыка, дом, школа, універсітэт* і інш. могуць называць не толькі памяшканне, але і групу, калектыў людзей. У словах назвах посуду метанімічнасць развілася на аснове сувязі паміж формай і змесцівам: *з'еў талерку (супу), выпіў шклянку (соку)*;

– назва дзеяння на яго вынік: *у час дыктоўкі, праверыць дыктоўкі;*
– назва матэрыялу на выраб з яго: *спартсмены заваявалі золата, выстава крышталю;*
– назва дзеяння на месца, дзе адбываецца гэтае дзеянне: *пераход вуліцы, падземны пераход, хуткі пераезд, чыгуначны пераезд;*
– назва аб'екта ведаў на галіну ведаў: *граматыка – граматычны лад мовы і навука аб граматычным ладзе;*
– імя аўтара на яго творы: *чытаць Купалу, чытаць Коласа;*
– назва прадмета на таго, хто валодае ім: *тэнар – высокі мужчынскі голас (лірычны тэнар) і спявак з гэтым голасам (вядомы тэнар).*

Разнавіднасць метаніміі – **сінекдаха** (ад грэч. *sinekdochē* – суаднознасць) – перанясенне паводле колькаснай прыметы, калі назва цэлага выкарыстоўваецца для абазначэння яго часткі або наадварот. Пры гэтым утвараецца прадметная пара, члены якой знаходзяцца ў пэўных колькасных адносінах. Можна адзначыць некалькі выпадкаў такіх адносін:

– адзіночны лік можа ўжывацца замест множнага і наадварот: *Гуляла, шалела подла інтэрвенцыя, **француз**, **англічанін** путы ўскласці меўся.* (Куп.); *Якія толькі стагоддзі цябе не хрысцілі ў сваіх **Дняпрах**, а ты язычнікам так і застаўся. Човен.* (Барад.)
– назвы частак цела чалавека ўжываюцца са значэннем чалавек: *У сям'і пяць ратоў*; галава са значэннем «жывёла»: *У статку 120 галоў;*
– назва адзення ўжываецца замест назвы чалавека, гэтыя сінекдахі заўсёды індывідуальна-аўтарскія: *Блакітныя спадніцы весяліліся;*
– ужыванне ўласных імёнаў у значэнні агульных назоўнікаў: *Працы ў зорках – акіян бязмерны, важна, што мы здолелі пачаць. Сотні новых **Юрыяў** і **Германаў** у калысках ярасна крычаць.* (Панч.)

Значна радзей сустракаюцца сінекдахі, у якіх назва цэлага ўжываецца са значэннем часткі, г.зн. робіцца перанос цэлага на частку: *Край калхідскі сёння ў славе, і палескі краявід зменім мы, балоты сплавім, тут, брат, тысчы **Калхід**!* (Панч.) У гэтым выпадку звычайна назва родавага (агульнага) паняцця пераносіцца на відавое (прыватнае) паняцце: дзічка (груша) – дзічка (плод грушы).

Полісемія – адзін з важных шляхоў развіцця і ўдасканалення лексіка-семантычнай сістэмы мовы. Узнікшы і замацаваўшыся ў маўленчай практыцы, новыя значэнні слова ўзбагачаюць мову, служаць крыніцай вобразнасці.

## 2.6. Лексічныя моўныя апазіцыі

Пры напісанні раздзела быў выкарыстаны матэрыял энцыклапедычнага даведніка «Беларуская мова: Энцыкл. / Беларус. Энцыкл.; Пад рэд. А.Я. Міхневіча; Рэдкал.: Б.І. Сачанка (гал. рэд.) і інш. – Мн., 1994. – 655 с.».

### 2.6.1. Апазіцыі фармальнай тоеснасці. Амонімы

**Амонімы** – (ад грэч. *homos* – аднолькавы, *onima* – імя) – словы, якія аднолькава гучаць, але маюць рознае значэнне. З'ява поўнага гукавога супадзення розных па значэнні слоў называецца **аманіміяй**.

Усе словы-амонімы падзяляюцца на тыпы. **Лексічныя** амонімы – словы адной часціны мовы, якія супадаюць гучаннем і напісаннем або ва ўсіх уласцівых ім формах, або толькі часткова. Паводле гэтага іх падзяляюць на дзве разнавіднасці: поўныя і частковыя (няпоўныя). **Поўныя** амонімы супадаюць ва ўсіх граматычных формах. Напрыклад, *поўнач* – 'напрамак свету' і 'сярэдзіна ночы', *заранка* – 'ранішняя або вячэрняя зорка' і 'птушка'. **Няпоўныя** амонімы супадаюць гучаннем і напісаннем не ва ўсіх уласцівых ім граматычных формах. Розныя канчаткі ў родным склоне маюць словы *рабіннік* – 'зараснікі рабіны' і 'птушка', *байка* – 'мастацкі твор', 'вопратка' і 'тканіна'. Апошняе не мае формы множнага ліку. *Настойваць* – 'патрабаваць' і 'рабіць настойку' – першае слова непераходны дзеяслоў, другое – пераходны.

Трэба адрозніваць лексічныя амонімы ад амаформаў, амафонаў і амографаў. **Амаформы** (марфалагічныя амонімы) супадаюць гучаннем і напісаннем у адной ці некалькіх формах той самай або розных часцін мовы: *палю, палі* (агарод і ў печы – ад *палоць* і ад *паліць*), *лячу* (ад *ляцець* і ад *лячыць*). Амаформы ў межах розных часцін мовы сустракаюцца значна часцей: *кліч* (назоўнік і дзеяслоў), *шыю*, *ліпкі* і г. д. Амаформы ўтвараюцца і ў выніку пераходу адной часціны мовы ў другую: *вясной* (назоўнік і прыслоўе), *раніцай*. Некаторыя амаформы, што ўзніклі такім шляхам, аднолькава скланяюцца. Асабліва гэта датычыцца назоўнікаў – субстантываваных прыметнікаў: *марожанае* (*мяса*) і *з'есці марожанае*, *рабочы з фабрыкі, рабочы дзень*.

**Амафоны** (фанетычныя амонімы) – словы, якія аднолькава гучаць, але па-рознаму пішуцца: *грыб – грып, мог – мох, код – кот, казка – каска, раман – Раман.* Яны ўзнікаюць пры аглушэнні звонкіх зычных на канцы ці ў сярэдзіне слоў, а таксама ў выпадках супадзення гучання ўласнага і агульнага назоўніка. Амафоны з'яўляюцца амонімамі толькі ў вуснай мове.

**Амографы** – словы, якія пішуцца аднолькава, але вымаўляюцца па-рознаму, маюць націск на розных складах: ту′га – туга′, са′мы – самы′,

кра/ты – краты/, му/ка – мука/. Амографы з'яўляюцца амонімамі толькі ў пісьмовай мове.

Лексічныя амонімы, амаформы, амафоны, амографы нярэдка выкарыстоўваюцца як стылістычны сродак, а таксама як сродак стварэння каламбураў: *Кава/лі зброю кавалі/, каб іх кара/лі каралі/* (В.).

Акрамя амонімаў, што існуюць у адной мове, ёсць яшчэ міжмоўныя амонімы – словы, якія амаль цалкам супадаюць па гучанні ў дзвюх мовах: рус. *диван* 'прадмет мяккай мэблі' – бел. *дыван* 'тканы, звычайна варсісты выраб для ўпрыгожвання сцен, засцілання падлогі'; *лист* 'адзіноч. лік да 'листья' – *ліст* 'пісьмо'.

Амонімы ўзнікаюць у мове па розных прычынах у выніку разнастайных працэсаў. Можна вылучыць наступныя шляхі ўзнікнення амонімаў:

– у выніку ўтварэння новых слоў і формаў пры дапамозе прыставак і суфіксаў. Напрыклад, пры дапамозе прыстаўкі ***с-*** утварыліся амонімы *сплаўляць* ад розных каранёў *плаваць і плавіць*. Пры дапамозе суфікса ***-ав-*** словы *кармавы* ад *корм і карма*. Некаторыя ўтварыліся шляхам складання, абрэвіяцыі: *камбат – камандзір батарэі, камандзір батальёна*, *КП – камандны пункт, кантрольны пункт*.

– У выніку фанетычных і марфалагічных працэсаў: *слаць (пасылаць)* ад *сълати* і *(рассцілаць)* ад *стълати*.

– У выніку супадзення гучання, напісання і формаўтварэння беларускага слова і запазычанага: *тур* – 'дзікая жывёла' і 'частка спаборніцтва' (ад фр. *tour*); *бор* – 'лес', 'хімічны элемент' (ад лац. *borax*) і 'стальны свердзел' (ад ням. *Bohr*).

– У выніку выпадковага супадзення запазычаных слоў з розных моў: *блок* ад фр. 'палітычнае пагадненне' і ад англ. 'прыстасаванне падымаць груз'.

– У выніку запазычання двух слоў з адной мовы: *нота* ад лац. у музыцы і ў дыпламатыі, *матыў* ад фр. 'мелодыя' і 'прычына, довад'.

– Распад полісеміі. Адно са значэнняў мнагазначнага слова можа згубіць унутраную сувязь з астатнімі значэннямі і стаць асобным словам. Часам сувязь з мнагазначным словам яшчэ можа адчувацца але вельмі слаба. Так узніклі амонімы: *пяро* – 'гусінае і пісьмовая прылада', *ліст* 'на дрэве' і 'аркуш', *каса* – 'водмель', 'прычоска', 'прылада'.

Амонімы трэба адрозніваць ад мнагазначных слоў. У мнагазначным слове заўсёды захоўваецца адзінства значэнняў, нягледзячы на семантычную разнастайнасць гэтага слова, усе значэнні маюць агульную сему, што іх звязвае. Амонімы не маюць такой сэнсавай сувязі. Значэнні мнагазначнага слова падаюцца ў адным слоўнікавым артыкуле, а амонімы – як асобныя слоўнікавыя артыкулы. Адрозніваюць аманімію ад

полісеміі рознымі спосабамі:

1) **Семантычны** спосаб: падбор сінонімаў. Калі падабраныя сінонімы семантычна блізкія, то перад намі мнагазначнае слова; калі паміж імі нічога агульнага ў семантыцы няма, то словы гэтыя амонімы. Напрыклад, сінонімы да слова *тушыць* у словазлучэннях: *тушыць лямпу – задзімаць, гасіць*; *тушыць гнеў – уціхамірваць, утаймоўваць; тушыць мяса – пячы.* Сінонімы ў першых двух словазлучэннях аб'яднаны агульным значэннем 'перапыняць працэс гарэння', таму слова выступае тут як мнагазначнае. Слова *пячы* семантычна не звязана са згаданымі сінонімамі, таму ў апошнім словазлучэнні *тушыць* – амонім.

2) **Словаўтваральны** спосаб. Напрыклад, да слова *такт* – у музыцы – утвараецца прыметнік *тактавы*, а ад *такт* – 'пачуццё меры' – *тактоўны*, што сведчыць пра аманімічнасць лексем.

3) **Сінтагматычны**: выкарыстанне спалучальнасці слова. Слова *байка* 'мастацкі твор' можа спалучацца са словамі *прачытаць, прадэкламаваць, расказаць, змястоўная,* а *байка* – тканіна – з імі не спалучаецца, ужываецца з іншымі – *пашыць, раскраіць, памыць, адпрасаваць, цёплая.*

Аднак паказаныя прыёмы не заўсёды дапамагаюць выявіць словы-амонімы. У такім выпадку варта высветліць этымалогію слова.

### 2.6.2. Апазіцыі семантычнай тоеснасці. Сінонімы

З’яву поўнага ці частковага супадзення значэнняў моўных адзінак называюць **сінаніміяй**. Сінанімічнымі могуць быць словы, фразеалагізмы, марфемы, словаўтваральныя мадэлі, сінтаксічныя канструкцыі.

**Лексічныя сінонімы** – гэта блізказначныя словы і выразы, якія абазначаюць адно паняцце, але адрозніваюцца адценнямі значэння або стылістычнай афарбоўкай, а таксама спалучэннем з іншымі словамі. Сярод лексічных сінонімаў вылучаюцца пэўныя групы.

Сінонімы, якія выражаюць розныя сэнсавыя адценні значэння, называюцца **семантычнымі**, або **ідэаграфічнымі**. Гэта словы агульнаўжывальныя, нейтральныя: *навек – незваротна, невядомы – нязнаны.*

Сінонімы, якія адрозніваюцца толькі стылістычнай афарбоўкай называюцца **стылістычнымі**. Тое ці іншае слова вызначаюць як стылістычна афарбаваны сінонім у параўнанні з адпаведным стылістычна нейтральным словам: *памыліцца – збіцца, прамахнуцца, спатыкнуцца; зорка – знічка.* Стылістычныя сінонімы могуць адрознівацца актыўнасцю ўжывання ў сучаснай літаратурнай мове – архаізмы (*раць, аэраплан*), сферай ужывання – спецыяльныя словы, дыялектныя, жаргонныя (жаўтуха – гепатыт, гаварыць – зюкаць, глупства – туфта).

Стылістычнымі сінонімамі з’яўляюцца запазычаныя словы і раўназначныя ім беларускія: *недахоп – дэфект, уражанне – эфект, велічыня – маштаб.* Запазычаныя выкарыстоўваюцца ў навуковым стылі.

Да стылістычных сінонімаў належаць **эўфемізмы** – словы і спалучэнні слоў, якія ўжываюцца для замены слоў і выразаў, што гучаць груба або выклікаюць непажаданыя і непрыемныя эмоцыі: *смярдзець – дрэнна пахнуць, памерці – заснуць, пайсці на той свет, хлусіць – памыляцца.*

Найбольш ужывальныя ў сучаснай мове сінонімы, якія адрозніваюцца адначасова і значэннем, і стылістычнай афарбоўкай – **семантыка-стылістычныя**: *хадзіць – совацца, шлындаць, ісці – цягнуцца, спаць – кімарыць.*

Сінонімы, якія не адрозніваюцца ні адценнямі значэння, ні стылістычнай афарбоўкай – **абсалютныя сінонімы (лексічныя дублеты)**: *арфаграфія – правапіс, намінатыўны – назыўны, дэфіс – злучок.* Сінонімы гэтага тыпу ўзніклі як паралельныя тэрміналагічныя назвы.

**Сінтаксічныя** сінонімы – гэта канструкцыі аднародныя з пункту погляду структурна-сэнсавага і функцыянальнага, але адметныя семантычнымі адценнямі (у межах агульнага іх значэння) і стылістычнай афарбоўкай: *пайсці да рэчкі – пайсці пад рэчку, пайсці ў бок рэчкі, пайсці ў напрамку рэчкі.* Асноўным крытэрыем вызначэння сінанімічнасці тут большасць вучоных прызнаюць узаемазамяняльнасць канструкцый.

**Марфалагічныя** сінонімы – сінанімічныя формы слоў: *грудзьмі – грудзямі, найлепшы – самы лепшы, ветрык – вятрыска.*

Паміж большасцю слоў, якія ўтвараюць рады семантычных або стылістычных сінонімаў, сінанімічныя адносіны склаліся даўно. Такія сінонімы выкарыстоўваюцца ў мове як вядомыя, гатовыя, традыцыйныя і называюцца **моўнымі, узуальнымі**, уключаюцца ў спецыяльныя слоўнікі.

У мастацкай літаратуры, публіцыстыцы, гутарковай мове могуць сінанімізавацца лексічныя адзінкі, якія збліжаюцца сэнсава толькі ў пэўным кантэксце. Гэта сінонімы маўлення, або **кантэкстуальныя**, аўтарскія, аказіянальныя: *Далёка кацілася, тупала, цокала, шоргала рэха.* (Някляеў). Кантэкстуальная сінаніміка грунтуецца пераважна на збліжэнні выразаў з прамым і пераносным значэннем.

Да аднаго слова звычайна можна падабраць некалькі сінонімаў. Група слоў, аб'яднаных сінанімічнымі адносінамі ўтварае **сінанімічны рад**: *балота – твань, багна, дрыгва, багавінне, імшара, многа – шмат, багата.* У кожным сінанімічным радзе звычайна вылучаецца адно слова, якое выражае паняцце, агульнае для ўсіх слоў гэтага рада. Такое слова называецца асноўным або **дамінантай**. Яно стылістычна нейтральнае і найбольш ужывальнае.

Сінанімічныя сродкі літаратурнай мовы абагачаюцца рознымі спосабамі: 1) словамі з пераносным значэннем: *водбліск – зайчык, негасцінна – холадна, краявід – малюнак, гаварыць – малоць*; 2) дыялектнымі

словамі: *вейка – мігаўка, балота – алёс, маланка – бліскаўка*; 3) фразеалагізмамі: *прыгожая – умытая расіцаю, хітры – лісам падшыты, блізка – рукою падаць*; 4) устарэлымі словамі, сэнсава ідэнтычнымі сучасным назвам: *канікулы – вакацыі, май – травень, буквар – лемантар, паляванне – ловы*; 5) шляхам намінацыі прадметаў і з'яў рэчаіснасці словамі сваёй мовы і запазычанымі: *краявід – пейзаж, сугучнасць – гармонія, падарожжа – ваяж.*

У паўсядзённым маўленні сінонімы выконваюць такія функцыі як замяшчэнне, удакладненне, ацэнка, функцыя стылявой арганізацыі тэксту.

### 2.6.3. Апазіцыі семантычнай процілегласці. Антонімы.

**Антонімы** (грэч. *anti* 'супраць', *onyma* 'імя') – пары слоў з процілеглым значэннем. Яны выражаюць суадносныя паняцці, што належаць да аднаго шэрагу з'яў аб'ектыўнай рэчаіснасці, якія ў лексіцы перадаюцца праз адну тэматычную групу: *мір – вайна, святло – цемра, белы – чорны, рана – позна, цёпла – халодна*. Семантычная процілегласць, проціпастаўленасць у маўленні і ёсць **антанімія**. Сукупнасць антонімаў мовы, а таксама раздзел лексікалогіі, які вывучае антонімы, называецца **антанімікай**.

Антанімічныя пары належаць да адной часціны мовы. Антонімамі бываюць часцей тыя словы, што перадаюць якасную прымету, якая можа ўзрастаць ці ўбываць і даходзіць да процілеглага, або ўласцівасць (*хуткі – павольны*), процілегла накіраваныя дзеянні (*апусціцца – падняцца*), прасторавыя і часавыя адносіны (*верх – ніз, рана – позна*), стан (*хвароба – здароўе*), колькасныя адносіны (*многа – мала*), ацэнку (*прыгожы – страшны*). Не маюць антонімаў словы з канкрэтным значэннем (*шафа, бяроза, стадыён*), вузкаспецыяльныя тэрміны (*афікс, пігмент*), уласныя імёны (*Васіль, Нёман*), лічэбнікі (*два, чатыры*), займеннікі і службовыя словы, хаця антанімічныя адносіны могуць устанаўлівацца паміж некаторымі прыназоўнікамі з прасторавым значэннем.

Па сваёй структуры антонімы дзеляцца на аднакарэнныя і рознакарэнныя: *замкнуць – адамкнуць, гуманны – антыгуманны, прыемна – непрыемна, можна – нельга*. Аднакарэнным антонімам процілеглае значэнне надаюць словаўтваральныя фарманты.

У адрозненне ад сінонімаў з іх здольнасцю ўтвараць незамкнёныя рады, у якія звычайна ўваходзяць больш чым два словы, антонімы аб'ядноўваюцца часцей за ўсё ў замкнёныя пары: *жыццё – смерць; высокі – нізкі, далёка – блізка*. Зрэдку антанімічны рад можа складацца з трох слоў, прычым у такім разе два з іх аднакаранёвыя: *праўда – хлусня, няпраўда; дужы – слабы, нядужы; кепска – добра, някепска.*

Адно і тое ж слова можа ўтвараць некалькі пар антонімаў, што абу-

моўлена яго мнагазначнасцю: *блізкі – далёкі (лес), блізкі – чужы (чалавек), блізкая – непадобная (тэма).*

Антонімы бываюць поўныя, няпоўныя (частковыя) і кантэкстуальныя. **Поўныя антонімы** адрозніваюцца ўсімі сваімі значэннямі: *будаваць – разбураць.* **Частковыя антонімы** маюць няпоўную сэнсавую процілегласць і супастаўляюцца па адным або некалькіх значэннях. Так, слова *радасць* толькі ў значэнні 'пачуццё вялікай асалоды, задаволенасці' супрацьпастаўляецца слову *смутак* у сэнсе 'пачуццё суму, маркоты, жалю'.

Сэнсавая процілегласць слоў **кантэкстуальных антонімаў** успрымаецца толькі ў пэўнай сітуацыі моўных зносін: *І **радасць** – ніякая радасць, а **горыч**, І **песня** – ніякая песня, а **скарга**, І **страва** – ніякая страва, а **камень**, І **брага** – ніякая брага, а **слёзы**, І **сонца** – ніякае сонца, а **крыга**, – Калі ты на свеце ўсім гэтым Не маеш з кім падзяліцца* (М.Т.)

Некаторыя мнагазначныя словы сумяшчаюць у сваёй сэнсавай структуры два супрацьлеглыя, антанімічныя значэнні. Такая ўнутрыслоўная антанімія называецца **энантыясеміяй**. Слова *разумнік* у першым з пададзеных ніжэй сказаў рэалізуе значэнне 'разумны, разважлівы чалавек', у другім 'дурань ці той, хто любіць разумнічаць, лічыць сябе разумнейшым за іншых': *Адзін дурань можа задаць столькі пытанняў, на якія не адкажуць сто **разумнікаў*** (І.Н.); *Разумных бараноў наогул жа нямнога, а гэты дык дурней дурнога... Калі няма **разумніка** другога, пабіцца каб удвух, дык ён разгоніцца ды ў сцену бух!* (Крап.).

Энантыясемія сустракаецца і сярод фразеалагізмаў: *далей некуды* – гэта і 'лепш не можа быць', і 'горш не можа быць'. У некаторых выпадках суіснаванне антанімічных значэнняў абумоўліваецца кантэкстам. Ужываючыся ў адмоўных сказах, выраз можа атрымліваць супрацьлеглае значэнне. Параўнайце два значэнні ('заўсёды' і 'ніколі') у фразеалагізме *як свет светам*: *Як свет светам чалавека цягне туды, дзе на свет прыйшоў* (Ян.); *Такое не здаралася, відаць, як свет светам* (Б.).

Антонімы – важныя лексічныя і стылістычныя сродкі мовы. На аснове антонімаў будуецца антытэза: ***Бяда і радасць*** *побач ходзяць вечна, Людзей ратуе толькі чалавечнасць* (Панч.). Звычайна пры разглядзе стылістычных функцый антонімаў побач з такім мастацкім прыёмам, як антытэза, называюць і аксюмаран (ад грэч. *oxymoron* дасціпна-недарэчнае). На думку І. Лепешава, ён мае толькі ўскосную сувязь з антаніміяй, пры якой заўсёды супрацьпастаўляюцца словы адной часціны мовы. Аксюмаран жа як фігура маўлення засноўваецца на наўмысным спалучэнні двух слоў неаднолькавай часціны мовы, якія выражаюць лагічна неспалучальныя паняцці і ўзаемна выключаюць адно аднаго. Гэта, як правіла, прыметнікава-назоўнікавая канструкцыя: *горкая радасць, белая варона,*

*гучная цішыня, жывыя нябожчыкі*. Паміж кампанентамі гэтых аксюмаранных канструкцый няма антанімічных адносін, таму сцвярджэнні, што аксюмаран засноўваецца на выкарыстанні антонімаў, з'ява антаніміі ляжыць у аснове аксюмарана, неапраўданыя.

### 2.6.4. Фармальна-семантычныя апазіцыі. Паронімы.

**Паранімія** – гэта частковае супадзенне па гучанні слоў, якія адрозніваюцца паміж сабой значэннем *(генеральны – генеральскі, жняя – жняярка)*.

**Паронімы** (ад грэч. *para* 'побач', каля + *onyma* 'імя') – найчасцей аднакарэнныя словы, якія маюць марфемнае і гукавое падабенства, але выражаюць розныя сэнсавыя паняцці: *адрасат* 'той, каму адрасавана паштовае адпраўленне' – *адрасант* 'той, хто пасылае паштовае адпраўленне'; *балотны* 'які мае адносіны да балота, уласцівы балоту' – балоцісты 'у якім шмат балот, гразкі, багністы'; *дыпламат* 'службовая асоба, упаўнаважаная ўрадам для зносін, перагавораў з замежнымі дзяржавамі' – *дыпламант* 'удзельнік конкурсу, узнагароджаны дыпломам'.

У беларускай мове сустракаюцца такія словы не толькі парамі, але і па тры ці нават чатыры ў адным радзе: *асабісты – асаблівы – асабовы; адзінкавы – адзіночны – адзінокі – адзіны* і інш. Паранімічныя адносіны ўзнікаюць найчасцей паміж назоўнікамі, прыметнікамі, радзей – паміж дзеясловамі. Паронімы найчасцей адносяцца да адной часціны мовы, аднаго граматычнага роду (і трывання, калі гэта дзеясловы ці іх формы).

Кампаненты кожнай паранімічнай пары суадносяцца паміж сабой як паралельныя адзінкі, гэта значыць сугучныя марфалагічныя ўтварэнні, якія адрозніваюцца як сэнсам, так і формай: *буксаваць – буксіраваць, ступа – ступня; цікавы – цікаўны.*

Значэнні паронімаў не супадаюць: не перасякаюцца (як у сінонімах), не проціпастаўляюцца (як у антонімах), іх знешні выгляд не аднолькавы (як у амонімах). Кожны з паронімаў з'яўляецца функцыянальна самастойным, можа мець сінонімы, антонімы, ніколі не можа быць заменены ў тэксце другім кампанентам паранімічнай пары без парушэння сэнсу выказвання.

Некаторыя вучоныя адрозніваюць поўныя і няпоўныя паронімы. Да **поўных (абсалютных)** паронімаў адносяць звычайна сугучныя аднакарэнныя словы з розным значэннем, якія належаць да адной часціны мовы, маюць націск на адным і тым жа складзе: *чарнець* 'станавіцца чорным, чарнейшым' – *чарніць* 'рабіць што-небудзь чорным, чарнейшым'.

Сугучнасць слоў нельга разглядаць як вынік выпадковага збліжэння па гучанні. Як адна з асноўных прыкмет паронімаў, яна характарызуецца і месцам націску. Аднамеснасць націску ў абодвух кампанентах паранімічнай пары лічыцца адной з абавязковых прыкмет поўных паронімаў. Месца націску ў паронімах адрознівае іх ад іншых катэгорый

слоў, у прыватнасці ад сінонімаў і фанетычных варыянтаў слова. Па той прычыне, што ў паронімах часта націск стаіць на адным і тым жа складзе, сціраецца індывідуальнасць значэння кожнага з сугучных слоў *(малаважкі – малаважны, дрэўка – дрэўца, пілаванне – пілавінне).* Гэта і прыводзіць да ненаўмыснага іх змешвання. Асабліва часта выпадкі змешвання паронімаў можна назіраць у вуснай мове.

**Няпоўныя** (ці **частковыя**) паронімы вельмі часта адрозніваюцца націскам, што часта прыводзіць да парушэння сугучнасці. Параўнаем *дымны* 'дымная галавешка, дымнае неба' – *дымавы* 'дымавая шашка'; *дажджавы* 'дажджавая вада' – *дажджлівы* 'дажджлівая восень'; *белізна – бялізна.*

У лінгвістычнай літаратуры ёсць і больш шырокае разуменне паронімаў: да іх адносяць не толькі аднакарэнныя словы, але і няроднасныя паводле марфалагічнага складу словы, якія маюць выпадковае гукавое падабенства *(амплуа – ампула, эфект – афект).*

Пры недастатковым валоданні мовай адбываецца памылковае словаўтварэнне *(дажджавая восень* замест *дажджлівая; дымная шашка* замест *дымавая і* інш.). Такія памылкі сустракаюцца нават на старонках газет, у публіцыстычных і мастацкіх творах. Адзначаныя выпадкі недакладнага ўжывання сугучных слоў адносяцца да моўных памылак.

Змешванне паронімаў адбываецца па многіх прычынах: у выніку збліжэння рэалій, якія абазначаюцца гэтымі словамі *(дно – днішча);* агульнасці сферы ўжывання паняццяў, дзеянняў, якасцей, якія называюць паронімы *(лоцман – боцман, апагей – перыгей);* узнікненне памылкі магчыма і пры неразмяжоўванні стылёвай прыналежнасці слоў: часам назіраецца збліжэнне кніжных спецыяльных слоў з размоўнымі *(антынонія – антымонія);* у выніку неразмежавання малазнаёмых носьбітам мовы паранімічных слоў, ужыванне іх асобамі, якія недастаткова добра валодаюць багаццямі роднай мовы, дрэнна ведаюць семантыку слоў *(экскаватар – эскалатар, ампір – вампір* і інш.).

Выяўленне і вывучэнне паронімаў – адна з неабходных умоў павышэння культуры вуснай і пісьмовай мовы.

Паранімію трэба адрозніваць ад **паранамазіі** (грэч. *para* 'каля' + *onimázo* 'называю'), стылістычнага прыёму збліжэння рознакарэнных слоў, якія маюць знешняе гукавое падабенства: *Сінявокі* ***прашчур*** *Сяброўку юную гукаў. І рэха, быццам камень з* ***прашчы*** *У Нёмнаў падала рукаў* (Барад.). З'яву паранамазіі часта выкарыстоўваюць для стварэння каламбураў, сатырычных твораў.

### 2.7. Дыферэнцыяцыя слоўнікавага складу

Пры напісанні раздзела быў выкарыстаны матэрыял падручніка «Беларуская мова. У 2 ч. Ч. 1. Фанетыка. Арфаэпія. Графіка. Арфаграфія.

Лексікалогія. Фразеалогія. Марфемная будова слова і словаўтварэнне. Марфалогія: Падручнік / Я.М. Адамовіч, Л.А. Акаловіч, Г.Ф. Андарала і інш.: Пад агул. рэд. Л.М. Грыгор'евай. – 4-е выд., перапрац. і дап. – Мн.: Выш. шк., 2001. – 318 с.».

### 2.7.1. Лексіка беларускай мовы паводле паходжання

Розныя словы ўзнікалі на розных этапах развіцця мовы. Адны дайшлі да нас з часу агульнаславянскага адзінства, другія належаць да агульнаўсходнеславянскага перыяду, трэція (уласнабеларускія) узніклі ў эпоху фарміравання мовы беларускай народнасці і нацыі. Усе яны складаюць аснову сучаснай лексікі і называюцца спрадвечна беларускімі, бо яны існуюць у беларускай мове даўно, спрадвеку.

**Агульнаславянскія** словы існавалі ў мове старажытных славян да VI – VII ст., перайшлі ў спадчыну да ўсходніх і паўднёвых славянскіх плямён і цяпер ужываюцца ў большасці сучасных славянскіх моў, напрыклад: *бор, лес, дуб, ліпа, клён, ліст, кара, сук, корань, мак, авёс, гарох, пшаніца, ячмень, матыка, чаўнок, ткаць, каваць, кідаць, варона, верабей, салавей, квас, кісель, сапа, сыр, лета, зіма, ноч, год, месяц, буйны, вясёлы, вялікі, адзін* і інш.

**Усходнеславянскія** словы ўзніклі ўжо ў мове ўсходніх славян у VI – XIV ст. і з'яўляюцца агульнымі для беларусаў, рускіх і ўкраінцаў, але не ўжываюцца ў мове заходніх і паўднёвых славян: *пляменнік, галка, каршун, кошка, снягір, вяроўка, бойкі, буры, зоркі, карычневы, цёмны, харошы, бурліць, брадзіць, кіпяціць, калупаць, калыхнуць, рухнуць, сорак, дзевяноста, сягоння, пасля, цяпер* і шмат іншых.

**Уласнабеларускія** словы пачалі ўзнікаць з XIII – XIVст. у перыяд самастойнага існавання беларускай мовы на базе мясцовых гаворак, а таксама ад агульнаславянскіх і ўсходнеславянскіх каранёў: *адвячорак, адкуль, адсюль, адтуль, адпаведны, адпачываць, адтуліна, азярына, амаль, амшалы, анігадкі, анічуць, апанаваць, апошні, апрануць, араты, ацеслівы, вясляр, жыхар, зломак, каліва, малацьбіт, спадчына, дапаможнік, практыкаванне, навучэнец* і шэраг іншых.

Акрамя спрадвечна беларускай лексікі, у нашай мове ёсць словы, **запазычаныя** з іншых моў. Яны праніклі ў беларускую мову рознымі шляхамі і ў розны час пры гандлева-эканамічных, палітычных, навуковых, культурных сувязях беларускага народа з суседнімі і несуседнімі народамі і краінамі. Запазычванне адбываецца ў выніку цесных моўных узаемасувязей двума шляхамі: вусным – пры непасрэдных моўных зносінах з іншымі народамі і пісьмовым – праз кнігі, афіцыйныя дакументы, пры перакладах з чужых моў. Адны з запазычаных слоў трапілі ў беларускую мову непасрэдна з іншых моў, другія ж прыйшлі праз суседнія мовы – рускую, польскую або ўкраінскую.

Неабходна адрозніваць два тыпы запазычанняў: 1) з блізкароднасных славянскіх моў і 2) з неславянскіх моў.

У беларускай мове ёсць **славянскія запазычанні**: з польскай *(слодыч, маёнтак, тлусты, пагарда, братэрскі)* і праз польскую з нямецкай *(ганак, гатунак, гвалт, гетман, дратва, дрот* і інш.); з рускай *(абавязацельства, аплот, бальшавік, дзекабрыст, зводка, подзвіг, раскладушка, саюз, савет),* з украінскай *(варэнікі, хлебароб)* і праз украінскую з цюркскіх *(кавун, гайдамак).*

**Неславянскія запазычанні**: з літоўскай: *венцер, гірса, дойлід, дзірван, ёўня, клуня, лоўж, пуня, сііран, рэзгіны, сцірта, шуло;* з татарскай: *арда, аер, базар, аркан, барсук, буланы, буран, бурда, гарбуз, кандалы;* з грэчаскай: *аксаміт, арыфметыка, матэматыка, бібліятэка, космас, кіт, кедр, кіпарыс, Аляксандр, Андрэй, Дзмітрый, Леанід, Мацвей, Пётр,Соф 'я, Фёдар, Філіп;* з лацінскай: *алей, апарат, аратар, арнамент, арэнда, астраномія, аўтар, акт, атэстат, гумар, водар,воцат, гонар, колер, Валянцін, Віктар, Клара, Канстанцін, Максім, Раман, Павел;* з нямецкай: *абзац, аканом, архіў, бутэрброд, бухта, гальштук, гаўбіца, гаўптвахта, бухгалтар, гросмайстар, дах, друк, каўнер, кнот, курорт, ланцуг, шрот, цэгла;* з французскай: *батон, бензін, басейн, бліндаж, метро, пантон, кафэ;* з англійскай: *байкот, лідэр, докер, браўнінг, баксёр;* з галандскай: *ватэрпас, гавань, матрос, лоцман, шлюпка;* з італьянскай: *лібрэта, піяніна, тэнар, віла, газета, вермішэль, макароны;* з іспанскай: *кастаньеты, каньён, кафетэрый;* з венгерскай: *гайдук, гуляш, гусар, бекеша;* з фінскай, комі: *морж, нерпа, пельмені, пурга, тундра;* з японскай: *дзюдо, кімано, рыкша, тайфун.*

Асобную групу сярод запазычанняў складаюць інтэрнацыянальныя словы. **Інтэрнацыяналізмы** – гэта міжнародныя словы, запазычаныя пераважна з класічных старажытных грэчаскай і лацінскай моў. Інтэрнацыянальнымі лічацца агульнавядомыя грамадска-палітычныя, эканамічныя, тэхнічныя, навуковыя тэрміны: *цывілізацыя, сацыялізм, партыя, рэвалюцыя, мітынг, канстытуцыя, камуніст, банк, крэдыт, працэнт, індустрыя, экспарт, аграхімія, біяфізіка, гісторыя, культура, касманаўтыка, магнітафон, тэлевізар, трактар, аўтамабіль.*

Значная частка запазычаных слоў пастунова асвоілася беларусамі, увайшла ў склад агульнаўжывальнай лексікі і перастала ўспрымацца як іншамоўная лексіка, напрыклад: *агрэст* (з італ.), *агурок* (з грэч.), *базар* (з цюрк.), *бручка* (з ням.), *булён* (з франц.), *бульба* (з лац.) і інш. Асваенне чужых слоў ішло па законах беларускай фанетыкі і арфаэпіі, арфаграфіі і марфалогіі (аканне, зацвярдзеласць шыпячых і [р], працяжнасць [γ], аглушэнне і азванчэнне зычных, часткова дзеканне і цеканне, змена роду і ліку назоўнікаў і інш.). Асваенню падлягалі даўно запазычаныя словы,

што прыйшлі ў літаратурную мову праз вусную і ўжываюцца ў штодзённым жыцці; не асвойваюцца пазнейшыя запазычанні, якія ўвайшлі праз пісьмовую мову.

Аднак шматлікія словы іншамоўнага паходжання ў беларускай мове захоўваюць пэўныя фанетыка-марфалагічныя асаблівасці, па якіх можна вызначыць запазычанае слова і нават меркаваць, з якой менавіта мовы яно прыйшло.

Асноўныя прыметы запазычаных слоў наступныя:

1) наяўнасць у слове гука [ф]*: фарба, шафа, фасоля, Фёдар,Соф'я;*

2) пачатковыя ***э, о*** і непрыставачнае ***а****: эра, Эма, ода, опера, атака, Аляксей;*

3) спалучэнні ***ге, ке, хе*** ў корані: *агент, кельма, схема, Яўген*;

4) спалучэнні ***бю, вю, кю, мю, пю, фю*** ў корані: *бюро, рэвю, кювет, капюшон, камюніке, фюзеляж;*

5) спалучэнні двух галосных у корані: *аул, ідэал, дуэт, гуаш*;

6) цвёрдасць зычных ***д*** і ***т*** *у* спалучэннях ***дэ, ды, тэ, ты****: дэтэктыў, дывідэнд, дыфтэрыя, дыван, дысцыпліна, медыцына, Атэла, Адэса, тыгр;*

7) прыстаўкі ***а-, ант(ы)-, архі-, контр-, рэ-, дэ-, дыс-, амфі-****: амаральны, антыцыклон, архіважны, контрмера, рэфармацыя, дэгазацыя, дыспрапорцыя, амфітэатр;*

8) суфіксы ***-ізм (-ызм), -іст (-ыст), -ір (-ыр)*** і інш.: *арганізм, сацыяліст, капіраваць.*

Запазычаная лексіка ўзбагачае слоўнікавы склад мовы, выкарыстоўваецца ў навуцы, культуры, публіцыстыцы, справаводстве. Сама па сабе з'ява запазычвання слоў непазбежная і неабходная. Але нельга ўжываць запазычаныя словы без патрэбы. Сярод запазычаных можна вылучыць асобна **варварызмы** (ад грэч. *barbarismos*) – словы не да канца асвоеныя мовай, часцей з-за цяжкасці граматычнага асваення. Звычайна варварызмы выкарыстоўваюцца пры апісанні чужаземных звычаяў, побыту, нораваў, для стварэння мясцовага каларыту: *бай, бек, паранджа, янычар.*

Звесткі пра паходжанне і значэнне запазычаных слоў даюцца ў «Слоўніку іншамоўных слоў» А.М. Булыкі (1993, 1999), а таксама ў шматтомным этымалагічным слоўніку беларускай мовы.

### 2.7.2. Актыўная і пасіўная лексіка. Новыя і ўстарэлыя словы

Лексіку беларускай мовы паводле наяўнасці – адсутнасці гістарычнай перспектывы можна разглядаць як актыўную і пасіўную, неалагізмы і ўстарэлыя словы. З развіццём грамадства, навукі, тэхнікі, культуры паступова змяняецца і ўдасканальваецца лексіка беларускай мовы. Час ад часу ўзнікаюць новыя словы ці новыя значэнні некаторых слоў, а асо-

бныя словы старэюць і выходзяць з актыўнага агульнанароднага ўжывання, пераходзяць у пасіўны слоўнікавы запас. Уся лексіка мовы паводле рэдкага ці частага ўжывання падзяляецца на пасіўную і актыўную.

**Актыўная** лексіка – гэта ўсе сучасныя вядомыя і зразумелыя нам словы, якія не маюць адзнак устарэласці ці навізны: *зямля, паветра, айчына, людзі, журавель, вясёлы, дзве, ён, казаць.*

**Пасіўная** лексіка – гэта рэдкаўжывальныя словы, якія маюць адценне ўстарэласці (гістарызмы і архаізмы) або навізны (неалагізмы).

**Гістарызмы** – гэта словы-назвы прадметаў, з'яў, паняццяў, якія перасталі існаваць у сувязі са зменамі ў грамадскім жыцці, эканоміцы, культуры, навуцы, тэхніцы і побыце людзей: *князь, паншчына, жаўнер, курніца, саха, кварта, гарнец, грош, нэп, нарком, СССР, БССР.*

**Архаізмы** (грэч. *archaios* – старажытны) – гэта ўстарэлыя назвы рэчаў, з'яў, што існуюць і цяпер. Да архаізмаў ёсць у сучаснай мове сінанімічныя словы актыўнага ўжывання: *аснач – плытагон, атрамант – чарніла, гута – шклозавод, мястэчка – пасёлак гарадскога тыпу.*

Устарэлыя словы (гістарызмы і архаізмы) ужываюцца абмежавана. Яны сустракаюцца ў падручніках і навуковых працах па гісторыі, у творах мастацкай літаратуры пра мінулае, дзе перадаюць адпаведную гістарычную эпоху і мову тагачасных герояў. Некаторыя архаізмы ўжываюцца ў мове пісьменнікаў, журналістаў, лектараў, юрыстаў для надання ёй урачыстасці, прыўзнятасці: *раць* (уст., паэт.) – *армія, войска; стырно* (уст., высок.) – *руль* або для выражэння насмешкі, асуджэння ў вершах, байках, фельетонах і інш.: *перст – палец, чало – лоб: Як тыкаў важна перст у карту! (К-с). Дай пудзілу памяло, сваю шапку – на чало*! (М.Т.)

**Неалагізмы** (грэч. *neos* – новы, *logos* – слова) – гэта новыя словы або новыя значэнні вядомых слоў, якія зусім нядаўна ўзніклі, маюць адценне навізны, нязвыкласці і не ўвайшлі ў актыўны слоўнікавы запас: *аэраджып, аўтабум, венераход, зарнічнік, стэрэакіназала.* З часам, замацаваўшыся ў мове, набыўшы шырокае ўжыванне, неалагізмы пераходзяць з пасіўнай у актыўную лексіку (*калгас, сельсавет, выканкам, прафбюро, прафорг, завочнік, святар*). Апошнімі гадамі з'явілася шэраг сучасных запазычаных неалагізмаў: *брокер, ваўчар, дылер, лізінг, брыфінг, кансэнсус, менеджэр, пейджар, спікер, трылер, спонсар*. Ад неалагізмаў неабходна адрозніваць **аўтарскія наватворы**; гэта індывідуальныя неалагізмы, створаныя асобнымі пісьменнікамі: *І гул* ***маланкагромны*** *ўзняў ракету ў неба.* (М. Т.) *Растуць на радзіме маёй* ***небасяжныя*** *дрэвы.* (М. Т.) *За мір усюды ўстаў народ, каб не крануў ніводнай хаты агонь* ***звышатамных*** *грымот.* (Вял.) Аўтарскія наватворы ўзнікаюць і існуюць звычайна ў творы аднаго пісьменніка, у слоўніках літаратурнай

мовы не падаюцца; значэнне ж іх раскрываецца самім кантэкстам.

### 2.7.3. Лексіка беларускай мовы паводле сферы ўжывання

Уся лексіка беларускай нацыянальнай мовы паводле ўжывання падзяляецца на дзве вялікія групы – агульнаўжывальная лексіка і лексіка абмежаванага ўжытку. Да **агульнаўжывальнай** лексікі адносяцца словы, якія не абмежаваны ва ўжыванні, могуць выкарыстоўвацца ва ўсіх моўных стылях і складаюць устойлівую аснову сучаснай беларускай мовы: *гай, дом, цудоўны, вуліца, рухацца* і інш. Другая група – **словы абмежаванага ўжытку**. Адны з іх ужываюцца толькі на пэўнай тэрыторыі, іншыя – у мове людзей пэўнай прафесіі, спецыяльнасці. У залежнасці ад гэтага вылучаецца дыялектная (абласная), спецыяльная (прафесійна-тэрміналагічная) і жаргонная лексіка.

Да **дыялектнай** лексікі адносяць словы, што ўжываюць на пэўнай тэрыторыі. Напрыклад, у беларускіх гаворках сустракаем розныя назвы вясёлкі: *весялуха, перавясёлка, радаўніца, радуга, тэнча, цмок, дажджуха, красуля*. У кожнай гаворцы большая частка слоў агульнаўжывальныя. Тая частка лексікі гаворкі, якая адрозніваецца ад літаратурнай, складае дыялектную абласную лексіку. Дыялектныя словы прынята называць **дыялектызмамі**. Вылучаюць дыялектызмы лексічныя, семантычныя, фанетычныя, граматычныя, словаўтваральныя.

**Лексічныя** дыялектызмы – словы, якія не ўжываюцца ў літаратурнай мове, адрозніваюцца асновамі. Сярод лексічных дыялектызмаў вылучаюцца дзве групы: уласналексічныя і этнагарафічныя. **Уласналексічныя** дыялектызмы – назвы з’яў, для абазначэння якіх у літаратурнай мове ўжываюцца словы з іншай асновай, гэта мясцовыя назвы агульнавядомых рэчаў і з’яў: *картопля – бульба, пасталы – лапці, барыла – бочка, суздром – разам, цёнгле – заўсёды*. **Этнграфічныя** – мясцовыя назвы мясцовых з’яў. Яны не маюць адпаведнікаў у літаратурнай мове. Яны пераважна называюць прадметы, характэрныя для побыту, гаспадаркі пэўнай мясцовасці. Напрыклад, у лексіцы Палесся ўжываюцца такія словы: *баняк* – пасудзіна на 40 л. для малака, *кучомка* – мужчынская зімовая з аўчыны шапка з вострым верхам, *лівец* – безрукаўка, пашытая на ваце і пакрытая зверху сукном.

**Семантычныя** дыялектызмы – агульнанародныя словы, якія ўжываюцца ў пэўнай мясцовасці з іншым значэннем, чым у літаратурнай мове: *чайка* – 'рыбацкая лодка-пласкадонка', *гуска* – 'белая лілея', *чалавек* – 'муж', *пушыцца* – 'дзьмуцца'. **Фанетычныя** дыялектызмы – адлюстроўваюць якую-небудзь фанетычную асаблівасць пэўнай гаворкі, напрыклад вымаўленне ***о*** у апошнім ненаціскным складзе: *балото, яечко, гарачаго*; замену гука ***ы*** пасля губных гукам ***у***: *забуў, вукапаць, вурасло*; замену гука ***ф – п, х, т, хв***: *пасоля, кохта, хунт, штрап,*

*хвабрычны.* **Граматычныя** дыялектызмы – перадаюць граматычныя асаблівасці дыялекту (гаворкі). У некаторых паўднёва-заходніх гаворках вядомы спецыфічныя формы складанага будучага часу: *хадзіцьму, карміцьму, карміцьмеш*; дзеясловы 1 спр. 3-й асобы адзіночнага ліку заканчваюцца на ***-ць***: *жывець, ідзець, гадуіць, кажыць*; дзеясловы 2 спр. з націскам на аснове ў 3-й асобе адзіночнага ліку ўжываюцца без -ць: *ходзя, кося, гамоня*; ужываецца постфікс ***-са*** ў зваротных дзеясловах: *смяяліса, апрануўса, мыюса.* **Словаўтваральныя** дыялектызмы – словы, якія адрозніваюцца ад адпаведных літаратурных словаўтваральнымі сродкамі: *настольніца – настольнік, вобуй – абутак, сонечка – сонейка, хавалка – хованкі.*

Некаторыя словы дыялектнай лексікі пранікаюць у літаратурную мову, становяцца агульнароднымі: *весніцы, выспа, бруіцца.* У мове мастацкіх твораў дыялектызмы звычайна выкарыстоўваюцца для стварэння мясцовага каларыту, як сродак моўнай характарыстыкі персанажаў.

Да **спецыяльнай** лексікі адносяць словы, якія ўжываюць і разумеюць людзі пэўнай спецыяльнасці. Сярод спецыяльнай лексікі вылучаюцца тэрміналагічныя і прафесійныя словы.

Кожная навука, прафесія мае свае тэрміны. **Тэрмін** (лац. *terminus* 'мяжа') – гэта слова ці словазлучэнне, якое дакладна абазначае навуковае, тэхнічнае, сельскагаспадарчае і іншыя паняцці. Сукупнасць тэрмінаў пэўнай навукі або прафесіі называецца **тэрміналогіяй**.

Звычайна тэрмін з’яўляецца адзінай назвай паняцця. Адрозніваецца ад іншых слоў тым, што адзначаны ў межах пэўнай тэрміналогіі: *дактыль, рыфма, антытэза.* За межамі пэўнай тэрміналогіі слова можа мець і іншыя значэнні: *інкубацыя* ў медыцынскай тэрміналогіі – 'скрыты перыяд хваробы', у сельскагаспадарчай – 'вывядзенне свойскіх птушак у інкубатары'; *блакада* – у вайсковай – 'акружэнне праціўніка з мэтай адрэзаць яго ад асноўных сіл', у медыцыне – 'спецыяльны метад лячэння', у палітычнай – 'сістэма мерапрыемстваў з мэтай ізаляваць якую-небудзь дзяржаву'. Часам ужываюцца мнагазначныя тэрміны і ў межах адной якой-небудзь навукі: *словаўтварэнне, абзац.* Ідэальная тэрміналогія не павінна мець мнагазначных тэрмінаў.

Тэрміны бываюць агульназразумелыя і вузкаспецыяльныя. **Агульназразумелыя** ўваходзяць у мову агульнанароднай мовы. Сэнс іх вядомы і неспецыялісту: *назоўнік, ангіна, вадарод, пазваночныя, сянаж, камбікорм.* Большасць тэрмінаў **вузкаспецыяльныя**: іх разумеюць і ўжываюць толькі спецыялісты: *суфіксоіды, люмінафоры* (рэчывы, якія выклікаюць свячэнне), *гідрагенізацыя* (рэакцыя далучэння вадарода да рэчыва). Такія словы пазначаюцца ў слоўніках або агульнай паметай *спец.* (*зарыбіць* (спец.) Запусціць у вадаём рыбу для размнажэння), або

канкрэтнай паметай, якая ўказвае на выкарыстанне тэрміна ў адпаведнай галіне навукі, тэхнікі, эканомікі (*анат., архіт., геагр., заал., літ., мед., муз., с.-г., хім., эк., юр.*). Вузкаспецыяльныя тэрміны могуць стаць агульназразумелымі, гэтаму садзейнічае распаўсюджанне навуковых і тэхнічных ведаў сярод народа. Значнае месца ў тэрміналогіі займаюць іншамоўныя словы. Грэчаскія і лацінскія тэрміны ўжываюцца ва ўсіх навуках. Тэрмінамі могуць быць і словазлучэнні: *іменны выказнік, пабочнае слова, кантрольны пункт, манапалістычны капітал.*

У мове адбываецца працэс **тэрміналагізацыі** вядомых слоў: слова пераасэнсоўваецца, у выніку чаго ўзнікае другасная тэрміналагічная назва: *шыйка* ў тэхніцы – 'прамежкавая частка вала машыны', *цела* ў артылерыі – 'ствол гарматы'. Шырокае распаўсюджанне навукова-тэхнічнай тэрміналогіі прыводзіць да адваротнага працэсу – **дэтэрміналагізацыі**: тэрмін набывае і іншае значэнне. Сталі агульнаўжывальнымі тэрміны: *сюжэт, дуэт, паняцце, канцэрт, рэакцыя*. Многія з такіх слоў у агульнанародным ужыванні набылі іншае значэнне ў выніку метафарызацыі: *кантакт, эпідэмія*. Тэрміны часцей ужываюцца ў навуковай і тэхнічнай літаратуры, у мастацкай літаратуры – абмежавана.

**Прафесійная лексіка (прафесіяналізмы)** – словы, якія выкарыстоўваюцца людзьмі пэўнай прафесіі. Прафесіяналізмы блізкія да тэрмінаў. Розніца паміж імі ў тым, што тэрмін выключна афіцыйная, узаконеная ў пэўнай галіне навукі, прамысловасці назва якога-небудзь паняцця, а прафесіяналізм – слова, распаўсюджанае пераважна ў гутарковай мове сярод людзей пэўнай прафесіі, спецыяльнасці. Прафесіяналізмы характарызуюцца дыферэнцыяцыяй у абазначэнні спецыяльных паняццяў, прадметаў, дзеянняў, сродкаў, якія не маюць назваў у агульнанароднай мове. Звычайна прафесіяналізмы суіснуюць з тэрмінамі, але ёсць віды дзейнасці, дзе прафесіяналізмы пераважаюць (у мове палітыкаў, цесляроў, краўцоў, друкароў, рыбаловаў, паляўнічых): *вуза, раёўня (пчал.), ваба, вабік, вабільшчык (паляўн.), цвікля, фастрыгаваць (кравецк.), перадкі, заднікі (шавецк.).*

**Жаргон (**ад фр. *jargon* – умоўная гаворка) – гэта сукупнасць лексічных асаблівасцей якога-небудзь вузкага кола людзей, аб’яднаных агульнымі інтарэсамі, сумесным дзеяннем і г.д. Большасць жаргоннай лексікі – экспрэсіўна-афарбаваныя словы: *пара* – 'адзнака «2»', *продкі* – 'бацькі', *прыкід* – 'адзенне' і інш. Разнавіднасць жаргона – **арго** – гэта лексіка групы людзей, што па нейкіх прычынах засакрэчваюць сваю мову. Спецыяльным наборам аргатычных слоў карысталіся шаптуны і знахары.

### 2.7.4. Лексіка беларускай мовы паводле стылістычнай дыферэнцыяцыі

Сучасная беларуская літаратурная мова ў яе вуснай і пісьмовай фо-

рмах выпрацавала пэўныя прыёмы ўжывання моўных сродкаў з улікам абставін, мэт і задач выказвання. Гэта звязана з існаваннем стыляў літаратурнай мовы, вывучэннем якіх займаецца стылістыка.

**Стыль мовы** – гэта сукупнасць прыёмаў адбору і выкарыстання моўных сродкаў у залежнасці ад характару і зместу выказвання, з улікам таго, дзе, калі, для чаго і каму выказваецца думка. У адпаведнасці з гэтым вылучаюць шэсць асноўных функцыянальных стыляў: службова-справавы (функцыя паведамлення), навуковы (функцыя паведамлення і тлумачэння), публіцыстычны (функцыя паведамлення і ўздзеяння), мастацкі (функцыя пачуццёвага ўздзеяння мастацкімі вобразамі), гутарковы (функцыя абмену думкамі) і набажэнскі.

У кожным стылі ёсць частка слоў, якія могуць выкарыстоўвацца ў любым стылі. Гэта **нейтральная (міжстылёвая)** лексіка: *дом, нож, столь, галава, раніца, навальніца, паўднёвы, беларускі, ветлівы; паважаць, рабіць; добра, радасна,* усе лічэбнікі, значная частка займеннікаў (*я, ты, што, які*), большасць прыназоўнікаў, злучнікаў і часціц (*у, на, па, праз; і, а, каб; нават, ж*). На фоне нейтральных слоў асабліва прыкметна супрацьпастаўляюцца два стылістычныя пласты лексікі – кніжны і гутарковы.

**Кніжная** лексіка – гэта словы і выразы, якія выкарыстоўваюцца звычайна ў службова-справавым, навуковым, публіцыстычным стылях і амаль не ўжываюцца ў штодзённай бытавой гутарцы: *камюніке, ратыфікацыя, аналіз, сінтэз, класіфікацыя, рэзюме, абстракцыя, суверэнітэт, шматпартыйнасць, прыватызацыя, мір, дэмакратыя.*

**Гутарковая** лексіка ўжываецца пераважна ў гутарковым стылі – штодзённай неафіцыйнай мове двух ці больш суразмоўцаў. У гэтым стылі вылучаюцца словы, якія выражаюць дадатковую ацэнку, станоўчыя ці адмоўныя адносіны суразмоўцы да прадмета гутаркі (выказваецца адабрэнне або неадабрэнне, ласкальнасць, жартаўлівасць, іронія, знявага або пагарда): *буслянка, тэпаць, клыпаць, вадахлёб, цяльпук, цюхцяй, прайдзісвет, шыбаваць, збольшага, інакшы, нештачка.* Такая вобразна-пачуццёвая ацэначнасць гутарковай лексікі заключаецца ў лексічных значэннях саміх гутарковых слоў (параўн.: *гаршкалеп* (разм., жарт.) і *ганчар* (нейтр.), *сцяміць* (разм., адабр.) і *скеміць* (нейтр.), *ветрагон* (разм., неадабр.), *брында* (разм., зневаж.), *до* (разм.) і *досыць* (нейтр.) або надаецца памяншальнымі ці павелічальнымі суфіксамі: *здароўечка* (ласк. да нейтр. *здароўе), карапузік* (разм., жарт.), *зямелька, зямліца; дамок, даміна; конік, каняка; ветрык, вятруга; доўгенькі, даўжэзны).*

У межах гутарковай лексікі вылучаюцца **прастамоўныя** словы, якія служаць для адмоўнай характарыстыкі людзей, з'яў. Гэта зніжаныя, грубаватыя словы: *абібок* (пагард.), *дрыхнуць* (груб.), *жмінда* (пагард.),

*адроддзе* (зневаж.), *чаўпці* (пагард.), *мазгаўня* (груб.). Самыя грубыя, абразлівыя, вульгарна-лаянкавыя словы прастамоўнай лексікі застаюцца па-за межамі літаратурнай мовы.

Асобнае месца ў мове займае мастацкі стыль – стыль мастацкай літаратуры, які вызначаецца выразнай мастацкай вобразнасцю, пачуццёвасцю, абгрунтаваным выкарыстаннем кніжнай і гутарковай лексікі, шырокім ужываннем пераносных значэнняў слова, лексічным і сінтаксічным багаццем.

У мастацкім стылі (пераважна ў вершаваных творах) сустракаюцца паэтычныя словы, якія вызначаюцца асаблівай лірычнасцю, узнёсласцю і ўрачыстасцю: *веснаход, ветразь, веснавей, віцязь, адвечны, белапенны, дыямент, пясняр,* а таксама народна-паэтычныя, што прыйшлі ў літаратурную мову з вуснай народнай творчасці: *красная дзяўчыначка, долечка, долюхна, жыцейка, залатаверхі, зямліца, заранічка, рэчанька.* Блізкія да паэтычных і высокія словы, якія характэрны для ўзвышана-ўзнёслай, урачыстай мовы ў мастацкім (у паэзіі) або публіцыстычным стылі: *асяніць, благаславіць, валадар, выбраннік, дачка народа, доблесны, птах, ратны, свяшчэнны.*

Вызначыць прыналежнасць слова да таго ці іншага стылю дапамагаюць слоўнікі. У іх часта даюцца стылістычныя паметы, якія ўказваюць на адпаведны стылістычны пласт лексікі (*кніжн.* – кніжнае слова, *высок.* – высокае, *паэт.* – паэтычнае, *нар.-паэт.* – народна-паэтычнае, *разм.* – размоўнае, *праст.* – прастамоўнае), сферу ўжывання слова (*уст.* – устарэлае, *гіст.* – гістарычнае, *спец.* – спецыяльнае, *абл.* – абласное, мясцовае, *царк.* – царкоўнае, *царк.-кніжн.* – царкоўна-кніжнае, *рэл.* – рэлігійнае), яго эмацыянальна-экспрэсіўную ацэнку (*ласк.* – ласкальнае, *жарт.* – жартаўлівае, *неадабр.* – неадабральнае, *іран.* – іранічнае, *асудж.* – асуджальнае, *пагард.* – пагардлівае, *груб.* – грубае, *лаянк.* – лаянкавае і інш.).

У сучаснай беларускай літаратурнай мове адбываюцца ўзаемадзеянне і ўзаемапранікненне стыляў. Пры ўмелым і трапным адборы нават самыя спецыфічныя словы аднаго стылю могуць ужывацца ў іншым. З пашырэннем адукацыі кніжныя словы пастунова замацоўваюцца ў гутарковым стылі, а гутарковыя словы ў іншых стылях, што звязана з агульным імкненнем да збліжэння літаратурнай мовы з народнай.

### 3. Пытанні да асноўнага тэарэтычнага матэрыялу

1. У якіх формах існуе беларуская нацыянальная мова?
2. Якія дыялекты і гаворкі складаюць аснову дыялектнай мовы?
3. Якія дыялекты ляглі ў аснову беларускай нацыянальнай мовы?
4. Якія асноўныя адзнакі літаратурнай мовы?

5. Чым адрозніваюцца граматычнае і лексічнае значэнне слова?
6. Як фарміруюцца паняцці? Ці могуць лексічныя значэнні супадаць з паняццямі?
7. Чаму аднаму і таму ж значэнню слова людзі даюць розныя вытлумачэнні?
8. Як у семантыцы можа праяўляцца нацыянальная спецыфіка мовы?
9. Ці ўсе словы могуць развіваць пераносныя значэнні? Ад чаго гэта залежыць?
10. Што абазначае разрыў сувязі паміж значэннямі мнагазначнага слова?
11. Чаму для ўзнікнення новага значэння важна замацаванне яго ў агульнамоўнай практыцы?
12. Ці могуць метафарычныя значэнні з цягам часу губляць сваю вобразнасць? Прывядзіце прыклады.
13. Чым адрозніваюцца метафара, метанімія, сінекдаха? Прывядзіце прыклады.
14. Як размяжоўваюцца ў тлумачальных слоўніках амонімы і мнагазначныя словы?
15. Якія прычыны абумоўліваюць узнікненне амонімаў?
16. Якія тыпы амонімаў існуюць у мове?
17. У якіх выпадках ужыванне амонімаў прыводзіць да двухсэнсоўнасці?
18. Якімі фактарамі падтрымліваецца існаванне паронімаў у мове?
19. Чым адрозніваюцца паронімы і лексічныя амонімы?
20. Якія паронімы пераважаюць у лексіцы славянскага паходжання (каранёвыя ці афіксальныя)? У запазычанай лексіцы?
21. Чым дамінанта сінанімічнага рада адрозніваецца ад іншых яго членаў?
22. Як сінанімія звязана з мнагазначнасцю?
23. Ці могуць быць сінонімамі аднакаранёвыя словы?
24. Ці могуць быць сінонімамі словы розных часцін мовы?
25. Ці могуць уступаць у сінанімічныя адносіны службовыя словы?
26. У чым вартасць сінонімаў для мастака слова?
27. Чаму антанімічнае проціпастаўленне не намінатыўнае, а лагічнае?
28. Чым растлумачыць наяўнасць некалькіх антонімаў да аднаго слова?
29. Чаму больш за ўсё антонімаў у якасных прыметнікаў і якасных прыслоўяў?
30. Чаму для вызначэння слова як усходнеславянскага трэба ўлічваць не толькі прыметы гукавой агульнасці яго ў беларускай, рускай і ўкраінскай мовах, але і значэнне?

31. Якія мовы трэба параўноўваць, каб высветліць да якога пласта спрадвечна беларускай лексікі належыць тое ці іншае слова?
32. Чым адрозніваюцца паняцці спрадвечна беларуская і ўласнабеларуская лексіка?
33. Ці з'яўляюцца ўласнабеларускія словы ў цяперашні час?
34. Чым тлумачыцца рост запазычанняў у беларускім лексіконе?
35. Чаму ў розныя перыяды развіцця мовы працэнт запазычаных слоў розны?
36. З якіх моў магчыма прамое запазычванне ў беларускую мову, з якіх – непрамое?
37. У чым заключаецца працэс асваення запазычанай лексікі? Ці адрозніваюцца частатой ужывання асвоеныя і неасвоеныя словы?
38. Якія прыметы запазычаных слоў можна назваць?
39. Ці можа дыялектызм стаць агульнаўжывальным словам? Якія для гэтага неабходныя ўмовы?
40. Якія тыпы дыялектызмаў часцей выходзяць за межы лексікі абмежаванага ўжытку? Чаму?
41. Што ўваходзіць у паняцце «спецыяльная лексіка»?
42. Чым адрозніваюцца тэрміны і прафесіяналізмы?
43. Якія групы лексікі абмежаванага ўжытку могуць стаць выяўленчым сродкам у мастацкім творы?
44. Якія групы слоў уваходзяць у склад пасіўнага слоўніка мовы?
45. Якія разрады слоў вылучаюцца сярод устарэлай лексікі?
46. Чым адрозніваюцца архаізмы і гістарызмы?
47. Чым адрозніваюцца неалагізмы агульнанароднай мовы і індывідуальна-аўтарскія?
48. Чым вызначаецца пэўны стыль мовы? Якія стылі можаце назваць?
49. Якая лексіка выкарыстоўваецца ў межах пэўнага стылю?

## 4. Матэрыялы да практычных аўдыторных і самастойных заняткаў

### 4.1. Схема блок-сістэмы практычных заняткаў

| № | Тэма практычных заняткаў | Колькасць гадзін |
|---|---|---|
| 1. | Беларуская мова як найважнейшы элемент нацыянальнай культуры. Асноўныя этапы яе развіцця. Беларуская літаратурная мова, яе прыметы. Формы беларускай нацыянальнай мовы. | 2 |
| 2. | Слова як асноўная матэрыяльна і граматычна аформленая, семантычна цэласная адзінка мовы. | 2 |
| 3. | Лексічнае і граматычнае значэнне слова, іх узаемаабумоўленасць. Тыпы лексічных значэнняў. | 2 |

| | | |
|---|---|---|
| 4. | Мнагазначнасць слова. Сутнасць полісеміі. Прамыя (асноўныя) і пераносныя (вытворныя) значэнні, дынаміка іх узаемаадносін. | 2 |
| 5. | Метафарычныя, метанімічныя і сінекдахічныя сувязі значэнняў мнагазначнага слова. | 2 |
| 6. | Амонімы, іх тыпы. Прычыны ўзнікнення амонімаў. | 2 |
| 7. | Крытэрыі размежавання аманіміі і мнагазначнасці. | 2 |
| 8. | Сінонімы, іх тыпы ў залежнасці ад ступені, характару семантычнага падабенства і стылістычных уласцівасцей. | 2 |
| 9. | Сінанімічны рад, дамінанта сінанімічнага рада. Семантычныя і стылістычныя функцыі сінонімаў. | 2 |
| 10. | Антонімы і іх тыпы. Выкарыстанне антонімаў у мове. | 2 |
| 11. | Паронімы. Словаўтваральная і сэнсавая суадноснасць як крытэрый вызначэння паранімії. Слоўнікавая паранімія і кантэкстуальная паранамазія. | 2 |
| 12. | Дыферэнцыяцыя слоўнікавага складу паводле паходжання. Уласнабеларуская лексіка. Запазычаная лексіка. Прыметы запазычаных слоў, іх асваенне. | 2 |
| 13 | Дыферэнцыяцыя слоўнікавага складу паводле наяўнасці – адсутнасці гістарычнай перспектывы. Устарэлая лексіка. Неалагізмы. | 2 |
| 14 | Дыферэнцыяцыя слоўнікавага складу паводле сферы ўжывання. Агульнаўжывальная лексіка. Лексіка абмежаванага ўжытку. | 2 |
| 15. | Дыферэнцыяцыя слоўнікавага складу паводле эмацыянальна-экспрэсіўнай афарбоўкі. Міжстылёвая (нейтральная) і стылістычна афарбаваная лексіка (кніжная, гутарковая). | 2 |

### 4.2. Практыкаванні для засваення тэарэтычных ведаў па модулі

Да заняткаў 1 выконваюцца практыкаванні 3-9, 13, 17.
Да заняткаў 2 выконваюцца 19, 21-23.
Да заняткаў 3 выконваюцца практыкаванні 24, 26, 28.
Да заняткаў 4 выконваюцца практыкаванні 25, 27, 52.
Да заняткаў 5 выконваюцца практыкаванні 29, 30, 31, 51.
Да заняткаў 6 выконваюцца практыкаванні 33, 34, 36.
Да заняткаў 7 выконваюцца практыкаванні 32, 35, 37.
Да заняткаў 8 выконваюцца практыкаванні 43-45, 47, 48.
Да заняткаў 9 выконваюцца практыкаванні 41, 42, 46, 49, 50.
Да заняткаў 10 выконваюцца практыкаванні 53, 54.
Да заняткаў 11 выконваюцца практыкаванні 38-40.
Да заняткаў 12 выконваюцца практыкаванні 55-62.
Да заняткаў 13 выконваюцца практыкаванні 74-78.
Да заняткаў 14 выконваюцца практыкаванні 69-73.
Да заняткаў 15 выконваюцца практыкаванні 63-68, 79.

## 5. Дадатковая літаратура па модулі


1. Абабурка М.В. Беларускае слова і яго вывучэнне. – Мн.: Выш. шк., 1986.
2. Абабурка М.В. Стылістычна абмежаваныя словы ў мове беларускай мастацкай літаратуры. – Мн.: Вышэйш. шк., 1981.
3. Анічэнка У.В. Гістарычная лексікалогія ўсходнеславянскіх моў: Вучэб. Дапаможнік: [Для філал.фак.па спец."Мовы народаў СССР"]. – Гомель: ГДУ, 1978.
4. Антанюк Л.А. Беларуская мова: спецыяльная лексіка: Курс лекцый / Л.А. Антанюк, Б.А. Плотнікаў. – Мн.: Акад. кіравання пры Прэзідэнце Беларусі, 2003.
5. Гістарычная лексікалогія беларускай мовы. – Мн.: Навука і тэхніка, 1970.
6. Крукоўскі Н.І. Рускі лексічны ўплыў на сучасную беларускую літаратурную мову / Рэд. А.І. Жураўскі. – Мн.: Выд-ва Акад. навук Бел. ССР, 1958.
7. Лексікалогія сучаснай беларускай літаратурнай мовы / АН Беларусі, Ін-т мовазнаўства імя Я. Коласа; А.Я. Баханькоў, В.П. Лемцюгова, Г.Ф. Вештарт і інш.; Пад рэд. А.Я. Баханькова. – Мн.: Навука і тэхніка, 1994.
8. Сучасная беларуская мова: Лексікалогія. Фразеалогія / В.П. Красней, У.М. Лазоўскі, І.М. Шчарбакова. – Мн.: Універсітэцкае, 1984.
9. Тэорыя і практыка беларускай тэрміналогіі / Г.У. Арашонкава, А.М. Булыка, У.В. Люшчік, А.І. Падлужны. – Мн.: Бел. навука, 1999.

МОДУЛЬ 2
**«ФРАЗЕАЛОГІЯ»**

## 1. Схема блок-сістэмы вывучэння тэарэтычнага матэрыялу

| № | Тэма лекцыйных заняткаў | Колькасць гадзін |
|---|---|---|
| 1. | Фразеалогія як лінгвістычная дысцыпліна. Прадмет вывучэння і задачы фразеалогіі.<br>Паняцце фразеалагічнага звароту. Спецыфіка і характэрныя прыметы: узнаўляльнасць, кампанентны склад, структурная фіксаванасць, цэласнасць семантыкі. | 2 |
| 2. | Класіфікацыі фразеалагічных зваротаў: суадносіны фразеалагізмаў з часцінамі мовы; структурныя тыпы фразеалагічных зваротаў; стылістычная класіфікацыя фразеалагізмаў. Варыянтнасць фразеалагічных адзінак, іх мнагазначнасць, сінанімічнасць, аманімічнасць. | 2 |

## 2. Асновы навукова-тэарэтычных ведаў па модулі

**Слоўнік паняццяў для засваення:** фразеалогія, фразеалагізм, фразеалагічныя зрашчэнні, фразеалагічныя адзінствы, фразеалагічныя злучэнні, фразеалагічныя выразы, варыянтнасць фразеалагізмаў, лексічныя фразеалагічныя варыянты, марфалагічныя варыянты фразеалагізмаў, словаўтваральныя варыянты фразеалагізмаў, фанетычныя варыянты фразеалагізмаў, акцэнтныя варыянты фразеалагізмаў, канструктыўна-колькасныя варыянты фразеалагізмаў, фразеалагічныя сінонімы, фразеалагічныя калькі, фразеалагічныя паўкалькі.

Пры напісанні раздзела быў выкарыстаны матэрыял вучэбнага дапаможніка «Лепешаў І.Я. Фразеалогія сучаснай беларускай мовы: Вучэб. дапам. для філал. фак. ВНУ. – Мн.: Выш. шк., 1998. – 271 с.».

### 2.1. Фразеалогія як раздзел мовазнаўства

**Фразеалогія** (ад грэч. *phrasis* – выраз, зварот, *logos* – вучэнне) – раздзел мовазнаўства, які вывучае семантычныя, граматычныя і стылістычныя асаблівасці фразеалагізмаў. Тэрмін «фразеалогія» ўжываецца і са значэннем 'сукупнасць фразеалагічных адзінак пэўнай мовы або пэўнага аўтара, твора, перыяду і інш.'. Як і ў іншых мовах, у беларускай мове нароўні з лексічным існуе фразеалагічны склад, які налічвае каля 6000 устойлівых выразаў з непадзельным, цэласным сэнсам – фразеалагізмаў. У фразеалогіі як асобным раздзеле мовазнаўства фразеалагізмы разглядаюцца як пэўная сістэма суадносных і ўзаемазвязаных моўных адзінак.

Фразеалогія – адна з маладых галін лінгвістыкі. Фразеалагізмы,

пад рознымі назвамі працяглы час сцісла разглядаліся ў межах лексікалогіі. У аб'ём фразеалогіі ўключаліся не толькі фразеалагізмы, але і прыказкі, прымаўкі, устойлівыя параўнанні, крылатыя выслоўі, афарызмы. Фразеалогія як новая галіна беларускага мовазнаўства пачала складвацца ў 50-60 гг. XX ст. (працы А.М. Базыленкі, Ф.М. Янкоўскага, А.С. Аксамітава, І.Я. Лепешава і інш.)

Прадметам фразеалогіі як раздзела мовазнаўства з'яўляецца даследаванне прыроды і катэгарыяльных прыкмет фразеалагізмаў, іх семантычных, граматычных і стылістычных асаблівасцей. Катэгарыяльнымі прыкметамі фразеалагічнай адзінкі з'яўляюцца яе намінатыўнае і граматычнае значэнні і кампанентны склад. Задача фразеалогіі – вывучэнне формы рэалізацыі фразеалагічных адзінак у мове і характару іх абмежаванняў у параўнанні са свабоднымі спалучэннямі слоў, сістэмныя сувязі паміж фразеалагізмамі.

У фразеалогіі рэалізуюцца катэгорыі вобразнасці, метафарычны код мовы. Як сродкі вобразна-мастацкага адлюстравання знешняга і ўнутранага жыцця фразеалагічныя адзінкі ўвабралі ў сябе міфалагічныя, рэлігійныя, этычныя ўяўленні народа розных часоў.

## 2.2. Фразеалагізм як моўная адзінка і яго прыметы

Фразеалагізм – гэта ўстойлівая, узнаўляльная, не менш як двухкампанентная моўная адзінка, якая спалучаецца са словамі свабоднага ўжывання і мае цэласнае значэнне, не роўнае суме значэнняў яе кампанентаў (калі іх разглядаць на ўзроўні слоў).

Як і словы, фразеалагізмы называюць пэўныя паняцці, але адрозніваюцца ад слоў перш за ўсё тым, што ў абсалютнай большасці выступаюць як трапныя, выразныя сродкі выказвання думак і пачуццяў. Фразеалагізмы, як і словы, – істотны састаўны кампанент мовы.

Адна з прымет фразеалагізмаў – гэта іх **устойлівасць**, або пастаянства замацаванага за імі зместу, кампанентнага складу і структуры. Тут варта, аднак, зрабіць агаворку. Калі змест і структура фразеалагізмаў заўсёды ўстойлівыя, нязменныя, то кампанентны склад амаль трэцяй часткі фразеалагізмаў можа змяняцца, у выніку чаго пэўны выраз функцыянуе ў дзвюх, а то і больш разнавіднасцях – варыянтах. Напрыклад, выраз *абвесці вакол пальца* можа ўжывацца з аднолькавым значэннем 'спрытна ашукаць каго-небудзь' і ў такіх варыянтах: *абкруціць вакол пальца, абвесці кругам пальца, абкруціць кругом пальца.*

**Узнаўляльнасць** – гэта рэгулярная паўтаральнасць, выкарыстанне фразеалагізма як гатовай цэласнай адзінкі. У адрозненне ад свабодных словазлучэнняў, кожнае з якіх у часе зносін складаецца з асобных слоў, фразеалагізмы не ствараюцца ў працэсе маўлення, а выхопліваюцца з памяці ў гатовым выглядзе з пастаянным зместам і нязменнай структурай.

Паняцце «ўзнаўляльнасць» іншы раз абсалютызуецца ў якасці ледзь не асноўнай адзнакі фразеалагізмаў. Аднак узнаўляюцца не толькі фразеалагізмы, а і кожнае асобнае слова, а таксама разнастайныя шматкампанентныя ўтварэнні: састаўныя тэрміны *(паўночны полюс, філалагічны факультэт),* апісальныя звароты *(здаваць экзамены, мець жаданне),* крылатыя выразы *(мне сняцца сны аб Беларусі),* прыказкі *(груган гругану вока не выдзеўбе),* іншыя словазлучэнні накшталт *праліўны дождж, закляты вораг.*

Фразеалагізм **складаецца не менш як з двух кампанентаў**. Мінімальнымі адзінкамі ў фразеалогіі лічацца выразы, утвораныя па мадэлі «прыназоўнік + назоўнік»: *на вачах, пад бокам, на мазі, на носе, у рукі, з рукі* і г. д. Многія фразеалагізмы маюць структуру шматкампанентнага сказа: *зуб на зуб не пападае* (у каго), *матчына малако на губах не абсохла* (у каго), *як карова языком злізала* (каго, што), *паказаць як барсук сваіх дзяцей гладзіць, чуць звон ды не ведаць дзе ён* і інш.

Будучы структурным элементам сказа, яго «будаўнічым матэрыялам», фразеалагізм **спалучаецца са словамі свабоднага ўжывання**, выступае ў ролі якога-небудзь члена сказа, звязваецца з іншымі членамі сказа сувяззю дапасавання або кіравання, прымыкання. Напрыклад, у сказе *Было ранняе бабіна лета* (Чарн.) выраз *бабіна лета* выконвае сінтаксічную ролю дзейніка, да якога дапасуюцца азначэнне *ранняе* і выказнік *было.* Толькі амаль усе выклічнікавыя *(авохці мне, вось табе і маеш)* і мадальная *(няўрокам кажучы, што называецца)* выразы сінтаксічна не звязваюцца са словамі свабоднага ўжывання і членамі сказа не з'яўляюцца. Выклічнікавыя фразеалагізмы звычайна выступаюць у якасці нерасчлянёнага сказа, а мадальныя – як пабочныя канструкцыі.

Галоўная, вызначальная прымета фразеалагізма – яго **семантычная цэласнасць**, унутранае сэнсавае адзінства, нераскладальнае на асобныя значэнні кампанентаў. І гэтым фразеалагізмы карэнным чынам адрозніваюцца ад свабодных словазлучэнняў, састаўных тэрмінаў, апісальных зваротаў і іншых устойлівых спалучэнняў.

Семантычная цэласнасць уласцівая як нематываваным фразеалагізмам (тыпу *вадзіць за нос, на чым свет стаіць* 'вельмі моцна'), так і матываваным (тыпу *гладзіць па галоўцы* 'патураць каму-небудзь, хвалячы і адабраючы яго'). У гэтай сувязі варта зрабіць адну істотную заўвагу: наўрадці можна згадзіцца з пашыраным у беларускай навуковай і навучальнай літаратуры сцвярджэннем, што цэласнае значэнне матываванага выразу (адзінства) можа быць выведзена з пераносных значэнняў слоў, якія ўваходзяць у склад гэтага выразу.

Матываваныя выразы (адзінствы) узніклі ў выніку пераасэнсавання адпаведных свабодных словазлучэнняў, але не кожнага слова паасобку

(што вельмі важна мецьна ўвазе), а ўсяго словазлучэння ў цэлым, г. зн. на сінтаксічным узроўні. У фразеалагічным адзінстве яго цэласнае значэнне звязана з разуменнем унутранага вобразнага стрыжня і абсалютна нераскладальнае на асобныя лексічныя значэнні кампанентаў.

## 2.3. Класіфікацыі фразеалагічных зваротаў

Нягледзячы на фармальную, сэнсавую, функцыянальную і іншую разнастайнасць, паміж фразеалагізмамі выяўляюцца трывалыя сістэмныя сувязі, і самі гэтыя моўныя адзінкі паддаюцца сістэматызацыі, падзелу на групы, тыпы, разрады. Існуюць такія класіфікацыі фразеалагізмаў: этымалагічная, семантычная, семантыка-граматычная, стылістычная, структурная і інш.

У сучаснай беларускай мове ў залежнасці ад агульнага значэння, аднолькавага набору граматычных катэгорый і аднатыпных форм выражэння фразеалагічныя адзінкі суадносяцца з рознымі часцінамі мовы і аб'ядноўваюцца ў **семантыка-граматычныя разрады**: назоўнікавыя *(журавель у небе, зачараванае кола, апошняе слова, зялёнае святло),* дзеяслоўныя *(абуць у лапці* каго, *тлуміць галаву* каму, *паказаць саву смаленую* каму, *свет завязаць* каму), прыметнікавыя *(голы як бізун, аршын з шапкай, на сёмым небе)*, прыслоўныя *(на злом галавы, хоць гвалт крычы, як нямазанае кола, душа ў душу),* мадальныя (*трэба думаць, лёгка сказаць, адным словам*) выклічнікавыя *(бадай цябе чорт, каб цябе качкі стапталі, каб цябе сарочка не чапала).* Суадносячы фразеалагізм з пэўнай часцінай мовы карыстаюцца трыма паказчыкамі: семантычным, марфалагічным і сінтаксічным. Але ёсць частка фразеалагізмаў, несуадносных з часцінамі мовы: *вочы адкрываюцца* (у каго, каму) – 'хто-небудзь, вызваліўшыся ад памылковых поглядаў, пазнае сапраўдны сэнс чаго-небудзь'. Ні ў сэнсавых, ні ў марфалагічных адносінах нельга супаставіць гэты фразеалагізм з якой-небудзь часцінай мовы.

**Семантычная** класіфікацыя – найважнейшая ў фразеалогіі, бо на яе аснове сістэматызуецца ўвесь фразеалагічны матэрыял, аб'ядноўваюцца ў фразеалагічны склад моўныя адзінкі з цэласным значэннем і пакідаюцца за межамі фразеалогіі ўстойлівыя словазлучэнні, пазбаўленыя семантычнай цэласнасці. Упершыню падзел фразеалагізмаў на ступені іх сэнсавай спаянасці, па семантычнай злітнасці іх кампанентаў быў зроблены В.У. Вінаградавым. Фразеалагізмы падзелены ім на тры тыпы: фразеалагічныя зрашчэнні, фразеалагічныя адзінствы і фразеалагічныя злучэнні.

**Фразеалагічныя зрашчэнні** В.У. Вінаградаў характарызуе як семантычна непадзельныя ўстойлівыя словазлучэнні, значэнне якіх зусім не залежыць ад значэнняў лексічнага складу і іх кампанентаў: *бібікі біць* 'гультаяваць, марнаваць час', *чортам падшыты* 'непаседлівы, вяртлявы'.

Зрашчэнні – гэта нематываваныя, бязвобразныя фразеалагізмы, якія патрабуюць этымалагічнага аналізу, высвятлення матываў іх узнікнення. Напрыклад, сучасны носьбіт мовы не бачыць ніякай матываванай сувязі паміж выразам *на ўсе застаўкі* і яго значэннем 'спаўна, як толькі можна (рабіць што-небудзь)': *Націсні там на ўсе застаўкі* (К. Чорны). А між тым на пачатку свайго жыцця гэты фразеалагізм усведамляўся як матываваны і вобразны, бо звязваўся з аналагічным свабодным словазлучэннем, дзе *застаўкі* – 'шчыты для затрымання вады, якая падае на кола вадзянога млына'. Так з цягам часу былыя адзінствы папаўняюць разрад зрашчэнняў.

Што да **фразеалагічных адзінстваў**, то гэта семантычна непадзельныя устойлівыя слоўныя комплексы, цэласнасць якіх матывавана словамі-кампанентамі, што ўваходзяць у іх склад. Значэнне цэлага тут нераскладальнае на асобныя лексічныя значэнні кампанентаў. У фразеалагічным адзінстве словы падпарадкаваны злітнасці агульнага вобраза або ўнутранай цэласнасці агульнага значэння: *налажыць галавой* 'прапасці, загінуць', *мелка плаваць* 'не мець дастатковых здольнасцей, сіл, ведаў у якой-небудзь справе', 'займаць нязначнае службовае або грамадскае становішча'.

**Фразеалагічныя злучэнні** – гэта ўстойлівыя словазлучэнні, у якіх адно слова мае звычайнае, самастойнае, свабоднае значэнне, а другое – несвабоднае значэнне, якое выяўляецца толькі ў спалучэнні з адным ці некалькімі строга акрэсленымі словамі. Напрыклад, прыметнік *кароткая* рэалізуе сваё несвабоднае значэнне 'кепская' толькі тады, калі ўступае ў кантакт з назоўнікам *памяць.* Параўн. таксама: *праліўны* (дождж), *закадычны* (сябар), *расквасіць* (нос, твар), *прасёлачная* (дарога). У фразеалагічным злучэнні яго састаўныя часткі ўспрымаюцца як асобныя словы, кожнае са сваім лексічным значэннем. Словы з фразеалагічна звязаным значэннем, у адрозненне ад фразеалагічных кампанентаў, захоўваюць усе адзнакі слова: маюць пэўнае лексічнае значэнне, выконваюць назыўную функцыю, выступаюць у ролі асобнага члена сказа.

Б.А. Ларын і І.Я. Лепешаў выказалі думку, што мэтазгодна уключаць у фразеалогію толькі зрашчэнні і адзінствы, г. зн. выразы з цэласным сэнсам. У такім разе ў фразеалогіі аб'ядноўваюцца аднародныя адзінкі, а сама навука аб фразеалагізмах прымае стройны характар.

Некаторыя фразеолагі (М.М. Шанскі) вылучаюць з фразеалагічных адзінак яшчэ так званыя **фразеалагічныя выразы**, якія складаюцца са слоў са свабодным значэннем (у іх складзе няма слоў з фразеалагічна звязаным значэннем, як у фразеалагічных злучэннях) і з'яўляюцца семантычна члянімымі. Але ў адрозненне ад свабодных спалучэнняў слоў яны не ствараюцца нанава тым, хто іх вымаўляе, а ўзнаўляюцца (бяруцца

з памяці цалкам) такім спосабам, як і асобныя словы або фразеалагізмы, раўназначныя слову. Напрыклад, *на чыім возе едзеш, таму і песню спявай, асадзі назад, не ўсё тое золата, што блішчыць.*

Фразеалагізмы можна падзяліць з боку іх **функцыянальна-стылявой афарбоўкі** на дзве групы: функцыянальна замацаваныя за пэўнымі стылямі і функцыянальна не замацаваныя за асобным стылем. У першай групе вылучаюцца кніжныя, размоўныя і прастамоўныя фразеалагізмы. **Кніжныя** фразеалагізмы выкарыстоўваюцца ў публіцыстычным, навуковым і мастацкім стылях, маюць ярка выяўленую афарбоўку кніжнасці. Сярод кніжных фразеалагізмаў ёсць запазычанні з царкоўнаславянскай і рускай моў, гэта калькі ці паўкалькі з іншых моў: *альфа і амега, кануць у лету, дамоклаў меч, яблык разладу, вежа са слановай косці* і інш.

**Размоўныя** фразеалагізмы (самая шматлікая група) адносяць да стылістычна зніжаных моўных сродкаў. Іх ужыванне паказвае на неафіцыйнасць адносін паміж суразмоўцамі, надае маўленню натуральнасць, прастату і непасрэднасць. Размоўныя фразеалагізмы выкарыстоўваюцца ў бытавых зносінах, літаратурна-гутарковым маўленні і ў мастацкай літаратуры: *браць быка за рага, белая варона, закідаць вуду, табаку важыць, хадзіць на задніх лапках, да сівых валасоў* і інш.

**Прастамоўныя** фразеалагізмы належаць да найбольш зніжанай часткі фразеалагічнага фонду. Яны рэалізуюцца ў вусным маўленні, а таксама ў мастацкай літаратуры, але звычайна ў мове персанажаў і надзелены адмоўнай ацэначнасцю: *блёкату наеўся, бяльмо на воку, як аблупленага, як баран на новыя вароты, хоць кол на галаве чашы* і інш.

Функцыянальна-стылявая афарбоўка зменлівая і рухомая, што абумоўлена гістарычнай зменлівасцю мовы, грамадскай пераацэнкай таго ці іншага выразу, пашырэннем або звужэннем межаў яго функцыянавання. У гэтай сувязі кожны перыяд моўнага развіцця існуе шэраг пераходных, прамежкавых з'яў, якія варта называць **функцыянальна не замацаванымі фразеалагізмамі**. Яны не павінны ацэньвацца як міжстылявыя і нейтральныя, бо не пазбаўленыя экспрэсіўна-ацэначнай афарбоўкі.

**Паводле сваёй структуры** фразеалагізмы суадносяцца са словазлучэннем (*абіваць парогі, белая варона*), сказам (*мядзведзь на вуха наступіў, на чым свет стаіць*) і спалучэннем слоў (*не ў галаве, і жук і жаба*). Не заўсёды лёгка вызначыць, да якой структурнай разнавіднасці належыць пэўны выраз. Цяжкасці ўзнікаюць пры структурнай характарыстыцы кампаратыўных фразеалагізмаў, якія паходзяць з параўнальных зваротаў са злучнікам *як*. Калі астатнія кампаненты (апрача як) звязваюцца сувяззю дапасавання, кіравання ці прымыкання са стрыжнёвым кампанентам, то перад намі фразеалагізм са структурай словазлучэння: *як*

*апошняе ў печ усыпаўшы, як вады ў рот набраўшы, як з крыжа зняты, як асінавы ліст*. Калі ж фразеалагізм усведамляецца як генетычна параўнальная даданая частка, у якой выказнік апушчаны, бо ён агульны з выказнікам галоўнай часткі, то гэта фразеалагізм са структурай параўнальнага даданага сказа з апушчаным выказнікам: расці *як гарох пры дарозе*, крывіцца *як серада на пятніцу*, выскачыць *як піліп з канапель*. Знешнім паказчыкам такіх фразеалагізмаў-сказаў з'яўляецца наяўнасць у іх складзе назоўнікавага кампанента-дзейніка ў форме назоўнага склону і кампанента, сінтаксічна не звязанага з кампанентам-дзейнікам.

Паводле паходжання фразеалагізмы падзяляюцца на: 1) спрадвечна беларускія: а) агульнаславянскія (*бабіна лета, закрануць за жывое, з галавы да пят*); б) агульнаўсходнеславянскія (*агарод гарадзіць, за царом гарохам, ламаць коп'і*); в) уласнабеларускія (*на горкі яблык, цыганскае сонца, на ваду брахаць*); 2) запазычаныя з іншых моў (з царкоўнаславянскай – *альфа і амега, блудны сын*, з рускай – *рыльца ў пушку, баш на баш*, з польскай – *даць дыхту, збіваць з тропу*, з лацінскай – *альма-матэр, персона нон грата* і інш.); 3) **калькі** – своеасаблівыя копіі іншамоўных выразаў, у якіх кожны кампанент перакладзены на нашу мову сэнсавым адпаведнікам (*як на іголках* – з ням., *браць быка за рогі* – з ісп.); 4) **паўкалькі** – гэта частковы пераклад, часткова запазычанне з іншай мовы (*перайсці рубікон, кінуць камень*).

## 2.4. Мнагазначнасць, варыянтнасць, сінанімічнасць, антанімічнасць і аманімічнасць фразеалагізмаў

З'ява полісеміі ўласцівая як словам, так і фразеалагізмам, але яе пашыранасць, спосабы развіцця новых значэнняў і іншыя асаблівасці неаднолькавыя ў лексіцы і фразеалогіі.

Пераважная большасць полісемантычных фразеалагізмаў, у адрозненне ад слоў, характарызуецца стылістычнай аднароднасцю, маналітнасцю іх стылістычнага значэння, тая ці іншая канатацыя звычайна ахоплівае ўсе іх значэнні. Усе 6 значэнняў фразеалагізма *разяўляць рот* маюць адценне неадабрэння і з'яўляюцца прастамоўнымі.

У лексічным складзе мовы няма і не можа быць ніводнага мнагазначнага слова, якое б складалася толькі з пераносных значэнняў. А ў фразеалогіі ўсе прыватныя значэнні полісемантычнага выразу даволі часта бываюць вобразнымі, пераноснымі. Праўда, гэта адносіцца толькі фразеалагічных адзінстваў – выразаў з жывой унутранай формай. Развіццё новага значэння ў такіх фразеалагізмах адбываецца ў выніку паўторнай метафарызацыі таго самага свабоднага словазлучэння, на аснове якога склалася першае значэнне гэтага фразеалагізма.

Што да фразеалагічных зрашчэнняў, то мнагазначнасць развіваецца

іншымі спосабамі. Адзін з іх – пераасэнсаванне першага значэння фразеалагізма. У такім разе другое ці другія значэнні складваюцца на базе першага, назва якога пераносіцца на іншыя сферы паняццяў. Фразеалагізм *бабіна лета* мае 4 значэнні. На аснове яго першага значэння ('ранняя восень з яснымі цёплымі днямі') у выніку метанімічнага пераносу развілося другое значэнне ('серабрыстае павуцінне, што плыве над зямлёй у дні бабінага лета'). Вынікам метафарычнага пераносу з актуалізацыяй патэнцыяльных сем ('нібыта зноў лета вярнулася') сталі яшчэ два значэнні: 'астра новабельгійская' (расліна, якая цвіце да глыбокай восені) і 'час прыліву новых сіл творчай энергіі або ўзнікненне кахання ў пажылыя гады'.

Існуе цэлы шэраг моўных паказчыкаў фразеалагічнай полісеміі. Згадаем некалькі з іх.

1. Адно значэнне дастасоўваецца да асобы, а другое – не да асобы. Так, у фразеалагізме *траянскі конь* адно значэнне – 'чалавек, які са здрадніцкімі намерамі дамагаецца чыйго-небудзь даверу, выдае сябе не за таго кім з'яўляецца на самай справе', а другое 'ашуканства, хітры падман'.

2. Адно значэнне абазначае канкрэтны прадмет, а другое – абстрактны: *аўгіевы стайні* – 'запушчанае памяшканне' і 'поўнае бязладдзе'.

3. Аб'ектнаму акружэнню мнагазначных фразеалагізмаў (дзеяслоўных, прыслоўных, а таксама несуадносных са словам) уласцівыя і іншыя абавязковыя кантэкстуальныя сувязі (не толькі кіравання, але дапасавання і прымыкання). Гэтыя сувязі неаднолькавыя ў кожным значэнні, чым і выяўляецца асобнасць, самастойнасць прыватных значэнняў. Вось некалькі прыкладаў з паказам у дужках аб'ектнага акружэння, характэрнага для розных значэнняў у дзеяслоўных, прыслоўных і несуадносных фразеалагізмах: *есці хлеб* (з чаго – чый), *перакідаць мост* (да чаго – куды, да чаго – паміж кім, паміж чым), *на манер* (які, чый – каго, чаго, якога), *пад маркай* (чаго, якой – каго), *жывога месца не засталося* (на кім – у чым, дзе), *і печкі і лаўкі* (каму – у каго з кім).

4. Прыватныя значэнні полісемантычнага фразеалагізма часта адрозніваюцца па стылістычнай афарбоўцы. Так, пяцізначны фразеалагізм *на ўвесь рост* не мае стылістычнага адзінства, яго значэнні разыходзяцца ў функцыянальна-стылявых адносінах: два значэнні – кніжныя, тры – функцыянальна не замацаваныя. Іншы раз стылістычнае расслаенне мнагазначнага фразеалагізма ахоплівае толькі экспрэсіўна-ацэначную афарбоўку, але не пашыраецца на функцыянальна-стылявое адзінства. Часам адно значэнне (напрыклад, у фразеалагізме *першай гільдыі)* ужываецца з адценнем адабрэння, а другое – з адценнем неадабрэння.

5. Абмежаваная сінанімія таксама можа быць паказчыкам мнага-

значнасці. Адно значэнне ў фразеалагізма можа мець сінонімы, а другое іх не мае. Трохзначны фразеалагізм *кульгаць на абедзве нагі* толькі ў трэцім значэнні ('вельмі дрэнны') уступае ў сінанімічныя адносіны з іншымі фразеалагізмамі.

6. Як крытэрый размежавання значэнняў выступае і абмежаваная антанімія. Яна ахоплівае не ўсе значэнні фразеалагізма, а толькі адно з іх. Напрыклад, у двухзначным фразеалагізме *хвастом накрыцца* адно яго значэнне ('не выканаць абяцанага') мае антонім *трымаць сваё слова*. Пры размежаванні фразеалагічнай полісеміі ўлічваюцца ўсе магчымыя крытэрыі.

**Аманімія** ў цэлым не тыповая для фразеалогіі. Калі ў лексікалогіі нямала крытэрыяў, якія дазваляюць размежаваць полісемантычныя і аманімічныя словы, то ў фразеалогіі зрабіць гэта вельмі цяжка. У фразеалагічных слоўніках або наогул не вылучаюць амонімаў, або кваліфікуюць як амонімы толькі адзінкавыя выразы.

У навуковай і навукова-метадычнай літаратуры фразеалагічныя амонімы звычайна характарызуюцца як выразы, якія аднолькава гучаць, але абазначаюць розныя паняцці і маюць розныя значэнні. У такім разе пад гэту дэфініцыю падпадаюць не толькі аманімічныя, але і ўсе мнагазначныя фразеалагізмы, бо ў іх таксама кожнае значэнне адрозніваецца адно ад другога і абазначае зусім іншыя паняцці.

Нярэдка амонімамі лічаць мнагазначныя фразеалагізмы, калі яны маюць неаднолькавыя катэгарыяльныя значэнні, напрыклад, назоўнікавае і прыметнікавае. Так, разглядаюць як два амонімы выраз *лоб у лоб*, адно значэнне якога прыслоўнае 'насустрач адзін аднаму', а другое – прыметнікавае 'зусім аднолькавыя сілай і ростам'. Пытанне размежавання аманімічных і полісемантычных фразеалагізмаў патрабуе далейшых тэарэтычных і практычных пошукаў.

У галіне фразеалогіі даволі часта назіраецца такая з'ява, як **варыянтнасць**, або здольнасць аднаго і таго ж фразеалагізма выступаць у дзвюх, а то і болей разнавіднасцях, узаемазамяняльных у любым кантэксце.

Ёсць моўныя паказчыкі, якія дазваляюць адрозніць варыянтнасць ад сінаніміі.

1. Крытэрыем адрознення варыянтаў ад сінонімаў з'яўляецца непарушнасць унутранай формы фразеалагізма з пераменным складам кампанентаў. Напрыклад, у дзвюх разнавіднасцях фразеалагізма *пападаць пальцам у неба* і *трапляць пальцам у неба* нязменна захоўваецца першапачатковы, этымалагічны вобраз, таму гэта варыянты аднаго фразеалагізма. Зусім іншае назіраем пры супастаўленні выразаў *браць за горла* (каго) і *браць за жабры* (каго). Хоць яны маюць гранічна блізкае значэн-

не 'сілай прымушаць да чаго-небудзь', але кожнаму з іх уласціва свая непаўторная ўнутраная форма.

2. Экспрэсіўна-ацэначная афарбоўка варыянтаў аднаго фразеалагізма заўсёды аднолькавая. З тоесным адценнем неадабрэння функцыянуюць, напрыклад, варыянты *дурыць (тлуміць, марочыць, чмуціць, чмурыць) галаву* (каму).

3. Варыянты аднаго і таго ж фразеалагізма заўсёды аднатыпныя па функцыянальнай замацаванасці за пэўным стылем. Напрыклад, варыянты *гнуць спіну і гнуць горб* – размоўныя, *дулю з маслам, кукіш з маслам, фігу з маслам* – прастамоўныя, *закрываць вочы* (на што) *і заплюшчваць вочы* (на што) – функцыянальна не замацаваныя. Фразеалагічныя сінонімы могуць быць аднатыпнымі і неаднатыпнымі.

4. Варыянты аднаго фразеалагізма не адрозніваюцца паміж сабой якімі-небудзь сэнсавымі ці стылістычнымі адценнямі, таму заўсёды ўзаемазамяняльныя ў любых кантэкстах. Фразеалагізмы-сінонімы таксама могуць замяняць адзін аднаго, але толькі пры ўмове, калі яны стылістычна сумяшчальныя.

5. Розныя варыянтныя відазмяненні фразеалагізма (лексічныя, марфалагічныя, словаўтваральныя і інш.*)* заўсёды адбываюцца ў рамках адной і той жа сінтаксічнай канструкцыі. Калі фразеалагізмы, тоесныя ў сэнсавых і стылістычных адносінах, маюць неаднолькавую сінтаксічную структуру, то гэта ўжо не варыянты, а сінонімы. Як свабодныя словазлучэнні тыпу *васьмігадовы хлопчык – хлопчык васьмі гадоў, ісці дарогай – ісці па дарозе* слушна лічацца сінтаксічнымі сінонімамі, так і фразеалагізмы тыпу *бочка з порахам – парахавая бочка, вылазіць бокам і вылазіць праз бок, карона з галавы не спадзе* (у каго, каму) – *карона не спадзе* (з каго), *рассыпацца драбней маку рассыпацца <дробным> макам* павінны кваліфікавацца не як варыянты, а як рознаструктурныя фразеалагічныя сінонімы.

6. Калі мнагазначны фразеалагізм мае пераменны склад кампанентаў ва ўсіх сваіх значэннях, то перад намі з'ява варыянтнасці. Калі ж у адных значэннях фразеалагізм здольны вар'іравацца, а ў другіх замена аднаго кампанента другім не адбываецца, то мы маем справу ўжо не з варыянтнасцю, а з сінаніміяй.

Нярэдка межы паміж варыянтамі і сінонімамі хісткія і рухомыя. У такіх выпадках, калі цяжка вызначыць, ці з'яўляюцца пэўныя звароты варыянтамі адной фразеалагічнай адзінкі або выступаюць як сінонімы, пытанне вырашаецца на карысць сінаніміі.

Як відаць са сказанага, **варыянты** – гэта дзве і больш агульнамоўныя, сэнсавыя і стылістычна раўназначныя разнавіднасці фразеалагізма.

У залежнасці ад таго, што змяняецца ў фразеалагізме: увесь кампа-

нент ці толькі яго фармальны бок вылучаюцца 5 тыпаў варыянтнасці. Найбольш пашыраны тып – **лексічныя варыянты**, г.зн. слоўна-кампанентныя разнавіднасці фразеалагізма. Пераменнымі кампанентамі ў лексічных варыянтах звычайна выступаюць словы, якія па-за межамі фразеалагізма з'яўляюцца тоеснымі ці блізкімі ў сэнсавых адносінах або аб'ядноўваюцца паводле асацыятыўных прымет і ўваходзяць у адно семантычнае поле: *кавалак (кусок) хлеба, з усёй сілы (моцы), ведаць (знаць сваё месца)* і інш. У некаторых фразеалагізмах могуць вар'іравацца два кампаненты.

**Марфалагічныя варыянты** – гэта разнавіднасці склонавых, лікавых і іншых формаў аднаго з фразеалагічных кампанентаў: *браць з боем (-ю), порах (-у) не выдумляць, даваць здачы (у), заламаць асінку (-аю), араць дарогі (-у), браць на язык (-і), вастрыць вушы (вуха), вяроўкі (-у) віць, вока гарыць (вочы гараць), вочы ў вочы (вока ў вока), у вус (-ы)* і інш. Як марфалагічныя варыянты выступаюць поўная і кароткая формы прыметнікавых і дзеепрыметнікавых кампанентаў у некаторых фразеалагізмах: *з макава (е) зерне, повен (поўны) рот. свет не мілы (міл), вока набіта (-е), вароты пірагамі падпёрты (-я)* і інш.

**Словаўтваральныя варыянты** адрозніваюцца адзін ад аднаго словаўтваральнай структурай (суфіксамі ці прыстаўкай) аднаго з фразеалагічных кампанентаў: *падмазаць пяты (пяткі), ні за панюх (нюх) табакі, адкрываць (раскрываць) вочы, выцягнуць (працягнуць) ногі, грушы (грушкі) на вярбе, даваць (задаваць) драла, танцаваць ад печы (печкі), адчыняць (расчыняць) акно ў свет* і г. д.

**Фанетычныя варыянты** – гэта разнавіднасці, якія адрозніваюцца адна ад другой якім-небудзь гукам, нязначнымі асаблівасцямі ў агаласоўцы аднаго з кампанентаў: *шэрая (шарая) гадзіна, каліф (халіф) на час, на сваёй скуры (шкуры), жваць (жаваць) жвачку, львіны (ільвіны) зеў, іерыхонская (ерыхонская) труба.*

**Акцэнтныя варыянты** адрозніваюцца месцам націску ў адным з кампанентаў: *за́тычка ( затычка) ва ўсе дзіркі, на ла́скавым (ласкавым) хлебе, пляскаць (пляска́ць) языком.* У іншых выпадках дваякі націск вядзе і да фанетычных змяненняў (а таксама арфаграфічных), у выніку чаго ўзнікаюць варыянты, якія можна назваць акцэнтна-фанетычнымі: *абіваць бакі (бокі), хоць воўкам (ваўком) вый, гладзіць супраць (супроць) шэрсці, ісці ўгору (угару) і інш.*

Замена аднаго слова-кампанента другім, а таксама вар'іраванні іншага характару заўсёды адбываюцца, як ужо гаварылася, у межах адной і той жа сінтаксічнай канструкцыі. Выключэнне складаюць фразеалагізмы з факультатыўнымі кампанентамі ў іх складзе, здольныя ўжывацца то ў поўным, то ў скарочаным выглядзе. Такія варыянты (тыпу:

*рассыпацца <дробным> макам малочныя рэкі <з кісельнымі берагамі>, кум каралю <і сват міністру>)* найбольш правамерна называць **канструктыўна-колькаснымі** (а не эліпсаванымі ці рэдукаванымі, як іх нярэдка называюць), бо, скажам, варыянты *малочныя рэкі і малочныя рэкі з кісельнымі берагамі* адрозніваюцца адзін ад аднаго сваёй канструкцыяй і колькасцю кампанентаў. Адзін з гэтых варыянтаў выкарыстоўваецца ў сваёй поўнай, нескарочанай форме, а другі – у эліпсаваным, рэдукаваным выглядзе (і толькі гэты другі можна называць эліпсаваным – пры параўнанні з першым).

У канструктыўна-колькасных варыянтах найчасцей прапускаюцца займеннікавыя кампаненты *свой, самы, сабе, усе, ты* і інш.: *несці <свой> крыж, браць у <свае> рукі, па <самыя> вушы* і інш. Можна згадаць прыклады са скарачэннямі іншага характару: *браць <блізка> да сэрца, ні бэ ні мэ<ні кукарэку>, <браць> ногі за пояс, лыжка дзёгцю <у бочцы мёду>.*

У значнай частцы фразеалагізмаў спалучаюцца дзве і больш разнавіднасці вар'іравання. Гэта камбінаваныя варыянты. Напрыклад, у фразеалагізме *мароз па скуры (спіне, целе) <прабягае, ходзіць, дзярэ>* ёсць лексічная і канструктыўна-колькасная варыянтнасць, у фразеалагізме *валасы (волас) становяцца (падымаюцца, устаюць) дыбам (дуба, дыба, дубка)* – марфалагічная, лексічная і словаўтваральная.

**Фразеалагічныя сінонімы** абазначаюць адно і тое ж паняцце, маюць тоеснае ці гранічна блізкае значэнне, належаць да аднаго семантыка-граматычнага тыпу, звычайна адрозніваюцца адзін ад другога адценнямі значэння, стылістычнай афарбоўкай і іншымі адметнымі адзнакамі: *выходзіць у людзі, выходзіць на арбіту, выбівацца ў людзі, ісці ўгору, ісці ў людзі, далёка пайсці, прабіваць сабе дарогу, пракладаць сабе дарогу, працярэбліваць сабе шлях* (куды). Усе гэтыя дзеяслоўныя фразеалагізмы ўжываюцца з агульным значэннем 'дабівацца высокага становішча ў жыцці'. Фразеалагізмы ж *выбівацца ў людзі, прабіваць сабе дарогу, працярэбліваць сабе шлях* маюць дадатковае сэнсавае адценне 'настойлівымі намаганнямі', а фразеалагізм *выходзіць на арбіту* ўтрымлівае адценне 'станавіцца прыкметным, вядомым'. Фразеалагізмам *далёка пайсці і прабіваць сабе дарогу* уласціва афарбоўка адабрэння, а выразы *выходзіць на арбіту, ісці ўгору* надзелены ацэначнай рухомасцю і могуць ужывацца з адценнем то адабрэння, то неадабрэння. *Прабіваць сабе дарогу, пракладаць сабе дарогу, працярэбліваць сабе шлях* функцыянальна не замацаваныя фразеалагізмы, астатнія – размоўныя.

У якасці дамінанты (стрыжнёвага, апорнага выразу) сінанімічнага рада звычайна выступае найбольш ужывальны фразеалагізм, які мае шырокую кантэкстуальную спалучальнасць і, што асабліва важна, здольны

больш-менш свабодна замяшчаць у кантэксце іншыя сінанімічныя выразы.

**Антанімія ў фразеалогіі** – значна радзейшая з'ява, чым сінанімія. Фразеалагізмы-антонімы – гэта выразы з палярна супрацьлеглым значэннем. Фразеалагізмы выступаюць як антонімы толькі пры ўмове, што яны маюць як супрацьлеглае значэнне, так і аднолькавую спалучальнасць са словамі свабоднага ўжывання. Напрыклад, антонімы *ў вочы* і *за вочы* рэалізуюць свае значэнні пры дзеясловах маўлення (*казаць, гаварыць, хваліць, лаяць* і г.д.). Фразеалагізм *поўныя косці* абазначае «вельмі многа», а *з жабіны прыгаршчы* – «вельмі мала», аднак гэта не антонімы, бо першы ўжываецца пры дзеяслове-суправаджальніку *злосці* і характарызуе злога, запальчывага чалавека, а другі спалучаецца з назоўнікамі (у родным склоне) *шчасця, здароўя, радасці* і пад.

Не з'яўляюцца антонімамі выразы, якія могуць ужывацца то з часціцай *не*, то без яе (*не прыходзіць у галаву і прыходзіць у галаву, не па душы і па душы, не з рукі і з рукі*), бо гэта часціца не ўваходзіць у іх кампанентны склад і выконвае сваю функцыю адмаўлення, як і пры ўжыванні са словамі (пайду – не пайду, мой – не мой). У адзінкавых выпадках часціца *не* можа быць кампанентам пэўнага фразеалагізма, які, аднак, ужываецца (з супрацьлеглым значэннем) і без гэтай часціцы. У ФСБМ гэта паказана так: загаловачны фразеалагізм падаецца як адмоўная канструкцыя (з часціцай *не*), а пасля ў гэтым жа слоўнікавым артыкуле прыводзіцца і сцвярджальная канструкцыя з сэнсавай паметай «з супрацьлеглым значэннем»: *у цемя не біты – у цемя біты, не ў сваёй талерцы – у сваёй талерцы* і г.д.

### 3. Пытанні да асноўнага тэарэтычнага матэрыялу

1. Раскрыйце сэнс тэрміна «фразеалогія».
2. Што з'яўляецца прадметам фразеалогіі?
3. У чым складаецца задача фразеалогіі?
4. Дайце азначэнне фразеалагізма.
5. Якія абавязковыя прыметы фразеалагізма?
6. Чым фразеалагізмы адрозніваюцца ад слоў і чым падобныя да іх?
7. Што маецца на ўвазе пад устойлівасцю фразеалагізмаў?
8. На якія семантыка-граматычныя разрады падзяляюцца фразеалагізмы?
9. На якія групы падзяляюцца фразеалагізмы з боку іх функцыянальна-стылявой афарбоўкі?
10. На якія групы падзяляюцца фразеалагізмы паводле сваёй структуры?
11. На якія групы падзяляюцца фразеалагізмы паводле паходжання?

12. Ці праяўляюцца ў фразеалогіі з'явы сінаніміі, антаніміі, мнагазначнасці? Прывядзіце прыклады.
13. У чым адметнасці мнагазначнасці фразеалагізмаў у адрозненні ад слоў?
14. Якія моўныя паказчыкі фразеалагічнай полісеміі можна назваць?
15. Што можна сказаць пра праяўленне аманіміі ў фразеалогіі?
16. Што такое фразеалагічная варыянтнасць?
17. Якія тыпы варыянтнасці фразеалагізмаў існуюць?
18. Якія моўныя паказчыкі дазваляюць адрозніць варыянтнасць ад сінаніміі?
19. Ахарактарызуйце паняцце фразеалагічных сінонімаў.
20. Якія фразеалагічныя выразы не з'яўляюцца антонімамі?

## 4. Матэрыялы да практычных аўдыторных і самастойных заняткаў

### 4.1. Схема блок-сістэмы практычных заняткаў

| № | Тэма практычных заняткаў | Колькасць гадзін |
|---|---|---|
| 1. | Паняцце фразеалагічнага звароту. Спецыфіка і характэрныя прыметы: узнаўляльнасць, кампанентны склад, структурная фіксаванасць, цэласнасць семантыкі. Непранікальнасць структуры і вобразнасць значэння як факультатыўная прымета фразеалагічнага звароту. | 2 |
| 2. | Суадносіны фразеалагізмаў з часцінамі мовы. Паказчыкі катэгарыяльнага значэння фразеалагізмаў. Субстантыўныя, дзеяслоўныя, ад'ектыўныя, прыслоўныя, выклічнікавыя фразеалагізмы. | 2 |
| 3. | Структурныя тыпы фразеалагічных зваротаў. Фразеалагізмы, адпаведныя сказу, фразеалагізмы, адпаведныя спалучэнню слоў. | 2 |
| 4. | Варыянтнасць фразеалагічных адзінак, іх мнагазначнасць, сінанімічнасць, аманімічнасць. | 2 |
| 5. | Класіфікацыя фразеалагічных зваротаў паводле семантычнай злітнасці кампанентаў: фразеалагічныя зрашчэнні, адзінствы і спалучэнні. Крытэрыі іх. размежавання. | 2 |
| 6. | Стылістычная класіфікацыя фразеалагізмаў. Міжстылёвыя фразеалагізмы. Размоўна-гутарковыя і кніжныя фразеалагізмы, дыяпазон іх экспрэсіўна-стылістычнай афарбоўкі, сфера ўжывання. | 2 |
| 7. | Крыніцы паходжання беларускіх фразеалагізмаў. Прыказкі і прымаўкі. Крылатыя словы і афарызмы. Перыфразы. | 2 |

### 4.2. Практыкаванні для засваення тэарэтычных ведаў па модулі

Да заняткаў 1 выконваюцца практыкаванні 81-85, 131.
Да заняткаў 2 выконваюцца практыкаванні 86, 87, 106-108.
Да заняткаў 3 выконваюцца практыкаванні 104, 105, 109, 118, 132, 133.
Да заняткаў 4 выконваюцца практыкаванні 88-101.

Да заняткаў 5 выконваюцца практыкаванні 102, 103, 115, 117, 134.
Да заняткаў 6 выконваюцца практыкаванні 110-112, 128-130.
Да заняткаў 7 выконваюцца практыкаванні 113, 119-127.

## 5. Дадатковая літаратура па модулі


1. Аксамітаў А.С. Беларуская фразеалогія. – Мн.: Вышэйш.шк., 1978.
2. Даніловіч М.А. Беларуская дыялектная фразеалогія і яе лексічная аснова: Манаграфія. – Гродна: ГрДУ, 2003.
3. Лепешаў І.Я. Праблемы фразеалагічнай стылістыкі і фразеалагічнай нормы. – Мн.: Навука і тэхніка, 1984.
4. Лепешаў І.Я. Фразеалогія сучаснай беларускай мовы: Вучэб. дапам. для студэнтаў філал. фак. ВНУ. – Мн.: Выш. шк., 1998.
5. Лепешаў І.Я. Чаму мы так гаворым: Даведнік. – Гродна: ГрДУ, 2003.
6. Садоўская А.С. Фразеалагізмы-спалучэнні ў сучаснай беларускай мове: Манаграфія. – Гродна: ГрДУ, 2003.
7. Якшук Л.М. Назоўнікавыя фразеалагізмы ў сучаснай беларускай літаратурнай мове: дапаможнік па курсу "Сучасная беларуская мова" для студэнтаў спецыяльнасці 1-21 05 01 – Беларуская філалогія. – Гродна: ГрДУ, 2008.
8. Янкоўскі Ф.М. Беларуская фразеалогія. – Мн.: Нар. асвета, 1981.
9. Янкоўскі Ф.М. Беларуская фразеалогія: Фразеалагізмы, іх значэнне, ужыванне / Рэд. М. Яўневіч, А. Баханькоў. – Мн.: Вышэйш.шк., 1968.

## МОДУЛЬ 3
## «ЛЕКСІКАГРАФІЯ І ФРАЗЕАГРАФІЯ»

### 1. Схема блок-сістэмы вывучэння тэарэтычнага матэрыялу

| № | Тэма лекцыйных заняткаў | Колькасць гадзін |
|---|---|---|
| 1. | Лексікаграфія і фразеаграфія беларускай мовы. Класіфікацыя слоўнікаў беларускай мовы паводле навуковых задач, спосабу апісання слоў, нарматыўнасці. З гісторыі беларускай лексікаграфіі. | 1 |
| 2. | Будова слоўнікавага артыкула ў энцыклапедычных і лінгвістычных слоўніках. Сістэма граматычных і стылістычных памет. Будова фразеаграфічнага артыкула. | 1 |

### 2. Асновы навукова-тэарэтычных ведаў па модулі

Пры напісанні раздзела быў выкарыстаны матэрыял дапаможніка «Сцяцко П.У. Уводзіны ў мовазнаўства: Дапаможнік. – Гродна: ГрДУ, 2001. – 231 с.».

**Слоўнік паняццяў для засваення:** лексікаграфія, слоўнік, лінгвістычныя слоўнікі, нелінгвістычныя слоўнікі фразеаграфія, рэестр, загалоўкавае слова (вакабула), слоўнікавы артыкул, нарматыўныя слоўнікі, дэфініцыя.

### 2.1. Лексікаграфія як навука

**Лексікаграфія** (грэц. *lexicon* 'слоўнік' і *grapho* 'пішу') – галіна мовазнаўства, у якой вывучаецца тэорыя і практыка складання слоўнікаў: прынцыпы адбору слоў у слоўнікі розных тыпаў, вызначэнне будовы слоўнікаў, структуры іх слоўнікавых артыкулаў, сістэма паметаў, месца ілюстрацыйнага матэрыялу ды інш. Неабходнасць складання слоўнікаў абумоўлена як практычнымі, так і навуковымі задачамі: сабраць па магчымасці ўсю лексіку і апісаць значэнне кожнай лексічнай адзінкі, высветліць гісторыю слоў, іх словаўтваральную і марфемную структуру, ступень актыўнасці ў выкарыстанні, пазначыць нарматыўнасць гукавога і графічнага аблічча слова і г.д.

Тэрмін «лексікаграфія» выкарыстоўваецца і са значэннямі: а) усе наяўныя слоўнікі. *Беларуская лексікаграфія папоўнілася новымі даведнікамі*; б) сам працэс складання слоўнікаў. *Займацца школьнай лексікаграфіяй*.

**Слоўнік** – гэта склад слоў пэўнай мовы ці яе адгалінаванняў (народных гаворак, мовы пісьменніка і г.д.), а таксама кніга з гэтымі словамі.

Фразеалагізмы як моўныя адзінкі апісваюцца ў спецыяльных даведніках – фразеалагічных слоўніках. Раздзел мовазнаўства, які займаецца

тэорыяй і практыкай складання гэтых слоўнікаў, а таксама іх апісаннем і характарыстыкай, называецца **фразеаграфіяй**.

Паміж фразеалогіяй і фразеаграфіяй існуюць цесныя сувязі. Фразеалагічныя слоўнікі складаюцца на аснове тых дасягненняў, якія мае сучасная фразеалогія, і ў сваю чаргу даюць ёй праверaны, сістэматызаваны матэрыял для яе далейшых даследаванняў.

Усе слоўнікі можна класіфікаваць паводле наступных крытэрыяў:

1) у залежнасці ад навуковых задач;

2) у залежнасці ад характару сістэматызаванага матэрыялу;

3) паводле нарматыўнасці.

У залежнасці ад навуковых задач слоўнікі падзяляюцца на два асноўныя тыпы: 1) лінгвістычныя слоўнікі (лексіконы) і 2) нелінгвістычныя слоўнікі (энцыклапедычныя). У **лінгвістычных** слоўніках аб'ектам апісання выступае слова: яго значэнне, паходжанне, граматычныя адзнакі, утварэнне, правапіс і г.д.

**Нелінгвістычныя** слоўнікі – гэта слоўнікі паняццяў, абазначаных словамі: у іх падаюцца звесткі пра тыя ці іншыя рэаліі і паняцці, гістарычныя падзеі, вучоных, дзеячаў культуры і г.д. Нелінгвістычныя слоўнікі – гэта пераважна **энцыклапедычныя** даведнікі (грэц. *encyklopaideia* – 'кола ведаў'). Адрозненне лінгвістычных і энцыклапедычных слоўнікаў выразна выяўляецца пры параўнанні ў іх тых самых слоўнікавых артыкулаў, напрыклад:

*Абклад,-а*, м. Аздоба пераплёту царкоўных кніг ці паверхні абразоў у сярэдневяковым мастацтве (Тлумачальны слоўнік беларускай мовы. Том. 1 А – В – Мн., 1977. С. 51).

*Абклад*, аздоба пераплёту евангелля, кніг ці паверхні абразоў у сярэдневяковым мастацтве. Звычайна рабілася з золата або серабра, арнаментавалася чаканкай, філігранню, чарненнем па серабры, эмалямі, упрыгожвалася каштоўнымі камянямі. Вядомы беларускі сярэбраны абклад Лаўрышаўскага евангелля 14 ст. У 17 ст. абклад рабілі беларускія майстры, якія працавалі ў Залатой і Сярэбранай палатах Маскоўскага Крамля (гл. Аружэйная палата), – Максім Сямёнаў (Куцень), Фёдар Мікулаў і інш. (Беларуская Савецкая Энцыклапедыя. Т. 1. А – Афіна. Мн., 1969. С. 24). Да гэтага артыкула падаецца і здымак з надпісам: «Абклад Лаўрышаўскага евангелля».

Як бачым, у энцыклапедычным даведніку пры слове «абклад» няма ні граматычнай, ні іншых лінгвістычных паметаў, затое тут падаецца гісторыя і падрабязнае апісанне гэтай рэаліі, імёны людзей, якія рабілі гэтую рэч; даецца здымак абклада. Пры іншых артыкулах у энцыклапедыях змяшчаюцца схемы, малюнкі, табліцы, карты, якія дапамагаюць даць поўнае ўяўленне пра тую ці іншую рэалію. У беларускай лексікаграфіі

прыкладамі такіх даведнікаў ёсць 12-томавая «Беларуская Савецкая Энцыклапедыя» (1969–1975) і новая, 18-томавая «Беларуская Энцыклапедыя» (1997–2004).

У залежнасці ад характару сістэматызаванага матэрыялу і лінгвістычныя і нелінгвістычныя слоўнікі падзяляюцца на **агульныя (універсальныя)** і **спецыяльная** – галіновыя і тэрміналагічныя. Акрамя вышэй названых агульных энцыклапедычных даведнікаў, выдаюцца і **галіновыя**, прысвечаныя асобным галінам ведаў – медыцыне, літаратуразнаўстве, этнаграфіі, прыродзе і г.д.: «Беларуская мова: Энцыклапедыя» (1994), 5-томавая «Энцыклапедыя літаратуры і мастацтва Беларусі» (1984–1987), «Мысліцелі і асветнікі Беларусі: Энцыклапедычны даведнік» (1995) і інш.

Да слоўнікаў тэрмінаў, напрыклад, належыць мовазнаўчы даведнік П.У. Сцяцко, М.Ф. Гуліцкі, Л.А. Антанюк. «Слоўнік лінгвістычных тэрмінаў» (1990). Гэтыя слоўнікі могуць быць і дзвюхмоўнымі і шматмоўнымі. Напрыклад, шматмоўны «Словарь лингвистических терминов» В.С. Ахманавай (1966). Ёсць таксама ўніверсальныя слоўнікі, якія сумяшчаюць рысы і тлумачальных, і энцыклапедычных слоўнікаў. Напрыклад, слоўнікі Ляруса (імя выдаўца гэтых слоўнікаў) – Вялікі Лярус, Малы Лярус, англійскія слоўнікі Вебстэра. З улікам абсягу слоўнікі бываюць **вялікія** (акадэмічныя) і **малыя** (аднатомавыя, двух- ці трохтомавыя).

## 2.2. Віды лінгвістычных слоўнікаў

Лінгвістычныя слоўнікі, якія выкарыстоўваюць матэрыялы адной ці некалькіх (найчасцей дзвюх) моваў, падзяляюцца на аднамоўныя і дзвюхмоўныя (радзей шматмоўныя). У **аднамоўных** слоўніках для характарыстыкі лексікі пэўнай мовы выкарыстоўваюцца словы той самай мовы, у **дзвюхмоўных** (шматмоўных) слоўніках словы дзвюх (ці болей) моваў. У асноўным гэта **перакладныя** слоўнікі, дзе словы аднае мовы тлумачацца, апісваюцца шляхам перакладу на іншую мову (іншыя мовы): «Русско-белорусский словарь» пад рэдакцыяй Я. Коласа, К. Крапівы, П. Глебкі (1953), «Беларуска-рускі слоўнік» пад рэдакцыяй К. Крапівы (1962) і яго перавыданні, «Еўраслоўнік» Л. Баршчэўскага (2008) на 28 мовах.

Найбольш пашыраныя і разнастайныя аднамоўныя слоўнікі, якія паводле свайго лексічнага матэрыялу, спосабаў яго апісання і мэтанакіраванасці падзяляюцца на розныя віды: тлумачальныя, арфаграфічныя, арфаэпічныя, марфемныя, словаўтваральныя, гістарычныя, этымалагічныя, слоўнікі іншамоўных слоў, фразеалагічныя, слоўнікі сінонімаў, слоўнікі антонімаў, слоўнікі паронімаў, слоўнікі дыялектнай лексікі, адваротныя (інверсійныя) слоўнікі ды іншыя. Кожны слоўнік мае тры аба-

вязковыя элементы: рэестр слоўніка, загалоўкавае слова і слоўнікавы артыкул. **Рэестр** (лац. *regestrum* – 'унесенае, запісанае') – гэта спіс, пералік слоў, якія разглядаюцца ў слоўніку; ён бывае розны ў розных відах слоўніка, напрыклад, у арфаэпічным і арфаграфічным ці слоўніку сінонімаў і антонімаў. **Загалоўкавае слова** гэта слова, якім пачынаецца слоўнікавы артыкул, яно ў лінгвістыцы называецца таксама **вакабула** (лац. *vocabulum* – 'слова'). **Слоўнікавы артыкул** – гэта загалоўкавае слова разам з усімі звесткамі, якія падаюцца пра яго ў слоўніку. Ён займае асобны абзац ці некалькі абзацаў у слоўніках розных тыпаў. Самы кароткі слоўнікавы артыкул звычайна ў арфаграфічным і арфаэпічным слоўніках. Найбольш элементаў мае слоўнікавы артыкул у тлумачальным слоўніку (да сямі).

Слоўнікі літаратурнай мовы, складзеныя ў адпаведнасці з заканадаўча замацаванымі нормамі вымаўлення, правапісу, словазмянення называюцца **нарматыўнымі**. Тэрмін «**ненарматыўныя** слоўнікі» выкарыстоўваецца як агульная назва слоўнікаў, якія фіксуюць некадыфікаваныя моўныя з'явы, што існуюць па-за межамі літаратурнай мовы (дыялектныя слоўнікі, слоўнікі жарганізмаў).

**Тлумачальны слоўнік** – гэта аднамоўны слоўнік, у якім даецца тлумачэнне значэнняў слоў (і ўстойлівых спалучэнняў) пэўнай мовы сродкамі той самай мовы, паказваюцца граматычныя, стылістычныя і іншыя адзнакі слова.

Разгледзім падрабязна гэтыя элементы, бо тлумачальны слоўнік – найлепшы дарадца студэнту і настаўніку, вучню і ўсім, хто цікавіцца словам, яго значэннем і выкарыстаннем у мове.

1) Загалоўкавае слова: першы і абавязковы элемент усякага віду слоўніка; вылучаны тоўстым шрыфтам, мае націск (у двух- і шматскладовым слове) і падаецца з абзаца як пачатак слоўнікавага артыкула. Размяшчэнне загалоўкавых слоў звычайна ідзе паводле алфавіту слоў (**алфавітныя** слоўнікі) ці каранёў слова (**алфавітна-гнездавыя слоўнікі**). Найбольш пашыраныя ў наш час **алфавітныя** слоўнікі. У **адваротных (інверсійных)** слоўніках улічваецца алфавітны парадак не пачатку, а канца слова.

2) **Граматычная характарыстыка** слова: называецца часціна мовы, акрамя назоўніка (тут паказваецца яго род: м. – мужчынскі, ж. – жаночы, н. – ніякі) і дзеяслова (падаюцца абазначэнні трывання: зак. – закончанае і незак. – незакончанае); паказваюцца граматычныя формы слоў: канчаткі назоўніка ў родным склоне адзіночнага ліку (а часам і іншых), родавыя канчаткі прыметнікаў і дзеепрыметнікаў, парадкавых лічэбнікаў, некаторых займеннікаў, канчаткі дзеясловаў у 1-й, 2-й і 3-й асобе адз.л., а часам і множнага.

3) **Стылістычная характарыстыка** слова: падаюцца (скарочана) паметы, якія паказваюць на сферу стылістычнага выкарыстання слова (нейтральныя словы паметаў не маюць): *разм*. (размоўнае) – слова выкарыстоўваецца ў гутарковай мове (напр. балбатаць); *кніжн*. (кніжнае) – слова ўласцівае кніжнаму стылю; *абл*. (абласное) – дыялектнае слова (якое выкарыстоўваецца ў мастацкай літаратуры); *высок*. (высокае) – слова з адценнем прыўзнятасці, урачыстасці; *спец*. (спецыяльнае) – слова пэўнай спецыяльнасці; *паэт*. (паэтычнае) – слова, уласцівае паэтычнай мове; *уст*. (устарэлае); *груб*. (грубае), *пагард*. (пагардлівае); *зневаж*. (зневажальнае); *ласк*. (ласкальнае); *экспр*. (экспрэсіўнае) ды іншыя.

4) **Сэнсавая характарыстыка слова**: паказваюцца ўсе значэнні слова (абазначаюцца арабскімі лічбамі – 1, 2, 3, 4 і г.д.) і яго семантычныя адценні (яны аддзеленыя знакам //) Амонімы падаюцца з арабскімі лічбамі, што размяшчаюцца верхнім індэксам побач са словам (Бор$^1$, Бор$^2$). На першае месца выносіцца найбольш пашыранае значэнне, далей ідуць менш актыўныя ў выкарыстанні семантычныя варыянты.

5) **Ілюстрацыі** – тыповыя спалучэнні слоў або цытаты з твораў; яны выяўляюць тыповую спалучальнасць слоў, дапамагаюць больш поўна ўсвядоміць семантыку слова, яго нарматыўнасць (хто з аўтарытэтных майстроў слова карыстаецца гэтым словам).

6) **Тэрміналагічныя і фразеалагічныя спалучэнні**. Яны падаюцца асобным абзацам пасля знака О і знака ромба ◊. У канцы слоўнікавага артыкула пасля тлумачэння семантыкі рэестравага слова паказваецца значэнне гэтых спалучэнняў.

Напрыклад:

Дошка...

О. Мемарыяльная дошка – дошка, якая служыць для ўвекавечання памяці пра якую-небудзь асобу або падзею.

◊ Ад дошкі да дошкі – ад пачатку да канца, усё, нічога не прапускаючы (прачытаць і пад.).

7) **Этымалагічная даведка** – паказ, з якой мовы прыйшло слова, яго значэнне і матываванасць. Напрыклад:

Бельведэр

[Іт. Belvedere 'прыгожы від'].

Бенефіс

[Ад фр. bénéfice 'прыбытак, карысць']

Разгледзім падрабязна спосабы тлумачэння лексічнага значэння слова, яго сэнсавую характарыстыку. Найбольш пашыраныя з іх наступныя: а) апісанне зместу паняцця (прадмета) праз выяўленне яго адметных рысаў, інакш **дэфініцыя** (лац. *definitio* – азначэнне). Напрыклад: *судак* – каштоўная прамысловая рыба сямейства акунёвых; *суддзя* – слу-

жбовая асоба ў органах суда, якая выносіць прысуд па судовай справе; б) падбор сінонімаў, напрыклад: *суверэнны – незалежны, самастойны*; в) падбор антонімаў, напрыклад: *плыткі* супрацьлегл. *глыбокі*; г) словаўтваральнае тлумачэнне – паказваецца суаднесенасць вытворнага слова з тым, ад якога яно ўтварылася, напрыклад: *студэнтка* – жаночая форма да *студэнт*; *струганне* – дзеянне паводле дзеяслова *стругаць*; д) спасылка на іншае слова, якое ўжо тлумачылася, напрыклад: *флексія* – тое, што і *канчатак*.

Часта пры тлумачэнні значэння слова выкарыстоўваюцца адразу некалькі спосабаў, іх спалучэнне; гэта **камбінаванае тлумачэнне**. Напрыклад: *Суверэнны...* 2. Які валодае суверэнітэтам, незалежны, самастойны.

Рэгулярнымі пры тлумачэнні семантыкі слова выступаюць дэфініцыя, падбор сінонімаў і словаўтваральнае тлумачэнне.

Тлумачальныя слоўнікі падзяляюцца на аднатомавыя і шматтомавыя (акадэмічныя). Напрыклад аднатомавы «Тлумачальны слоўнік беларускай літаратурнай мовы» (1996) і 5-томавы (шасцікнігавы) «Тлумачальны слоўнік беларускай мовы» (Мн., 1977–1984). Ад нарматыўных тлумачальных слоўнікаў, дзе падаюцца словы літаратурнай мовы, адрозніваюцца **дыялектныя** слоўнікі (інакш **абласныя, краёвыя**), у якіх падаюцца рэгіянальныя словы, уласцівыя пэўнай гаворцы ці дыялекту. Нярэдка гэта засведчана ў самой назве слоўніка: «Краёвы слоўнік усходняй Магілёўшчыны» І. Бялькевіча (1970), «Дыялектны слоўнік (з гаворак Зэльвеншчыны)» П. Сцяцко (1970), «Слоўнік рэгіянальнай лексікі Гродзеншчыны» (1999).

Акрамя тлумачальных (літаратурных і дыялектных) слоўнікаў, ёсць чыста дастасоўныя слоўнікі: **арфаграфічныя** – у іх падаюцца словы і словаформы, якія складаюць пэўную цяжкасць у правапісе (І.У. Кандраценя «Арфаграфічны слоўнік беларускай мовы» (2009); **арфаэпічныя** – словы і словаформы з магчымымі цяжкасцямі ў вымаўленні; **сінанімічныя** сінанімічныя шэрагі слоў з іх адрозненнямі (М.К. Клышка Слоўнік сінонімаў і блізказначных слоў. (1976.); **антанімічныя** – антанімічныя пары слоў; **фразеалагічныя** – тлумачацца значэнні фразеалагізмаў; **марфемныя** слоўнікі – паказваецца марфемная структура слоў; **словаўтваральныя** – падаюцца вытворныя словы, што ўваходзяць у словаўтваральнае гняздо, і паказваюцца ўсе словаўтваральныя ступені пры ўтварэнні гэтых слоў. Або паказваюцца спосабы і сродкі ўтварэння кожнага асобнага слова, што падаюцца ў алфавітнай паслядоўнасці ў словаўтваральным даведніку (А.М. Бардовіч, М.М. Круталевіч, А.А. Лукашанец «Словаўтваральны слоўнік беларускай мовы» (2000).

**Гістарычныя** слоўнікі падаюць словы (і іх тлумачэнне) з пісьмо-

вых помнікаў. **Этымалагічныя** слоўнікі высвятляюць паходжанне і першасную форму, матываванасць слоў: «Этымалагічны слоўнік беларускай мовы» і інш.

**Тапанімічныя** слоўнікі сістэматызуюць і апісваюць уласныя геаграфічныя назвы. Прыкладам іх ёсць слоўнікі назваў населеных пунктаў усіх вобласцяў Беларусі Я.Н. Рапановіча. Існуюць таксама слоўнікі паронімаў, паралексаў: «Белорусско-русский паралексический словарь-справочник» (1985); слоўнікі запазычанай лексікі: «Слоўнік іншамоўных слоў» А.М. Булыкі (1993) і яго 2-томавае выданне (1999).

Фразеалагічныя слоўнікі бываюць аднамоўныя і двухмоўныя ці, радзей, шматмоўныя (перакладныя): С. Санько «Малы беларуска-рускі слоўнік прыказак, прымавак і фразем» (1991); Л. Корсак, Л. Марціновіч «Англа-беларускі слоўнік параўнальнага тыпу». Сярод аднамоўных адрозніваюць паводле іх прызначэння тлумачальныя, этымалагічныя, слоўнікі фразеалагічных сінонімаў, слоўнікі фразеалагічных антонімаў, фразеалагічныя слоўнікі мовы пісьменніка: І. Лепешаў «Фразеалагічны слоўнік беларускай мовы». Т. 1-2. (1993) і яго больш грунтоўнае выданне «Слоўнік фразеалагізмаў». Т. 1-2. (2008). І. Лепешаў «Этымалагічны слоўнік фразеалагізмаў» (1993). Паводле крыніц матэрыялу бываюць фразеалагічныя слоўнікі літаратурнай мовы, народнай мовы і асобных гаворак: І. Лепешаў «З народнай фразеалогіі: Дыферэнцыяльны слоўнік» (1991); Г. Юрчанка «І коціцца валіцца» (1972).

У апошні час сярод лексіколагаў пашыраецца думка аб стварэнні Машыннага фонду беларускай мовы, які будзе змяшчаць усе звесткі з практычнай і тэарэтычнай лексікаграфіі, а таксама неабходную інфармацыю з суседніх лінгвістычных дысцыплін – лексікалогіі, фразеалогіі, дыялекталогіі, тэрміналогіі, анамастыкі і інш.

### 3. Пытанні да асноўнага тэарэтычнага матэрыялу

1. Раскрыйце змест тэрміна «лексікаграфія».
2. Паводле якіх крытэрыяў можна класіфікаваць слоўнікі?
3. Чым абумоўлены падзел слоўнікаў на энцыклапедычныя і лінгвістычныя?
4. Якія віды лінгвістычных слоўнікаў вылучаюцца?
5. Якая спецыялізацыя характэрна для арфаграфічнага, дыялектнага, фразеалагічнага, тэрміналагічнага слоўнікаў?
6. У чым падабенства тэрміналагічнага слоўніка і слоўніка энцыклапедычнага характару?
7. У чым падабенства і адрозненне лексікаграфіі і фразеаграфіі?
8. Што складае спецыфіку нарматыўных і «ненарматыўных» слоўнікаў?

9. Якія абавязковыя элементы структуры мае кожны слоўнік?
10. Якія вядомы спосабы тлумачэння лексічнага значэння слова?

## 4. Матэрыялы да практычных аўдыторных і самастойных заняткаў

### 4.1. Схема блок-сістэмы практычных заняткаў

| № | Тэма практычных заняткаў | Колькасць гадзін |
|---|---|---|
| 1. | Класіфікацыя слоўнікаў беларускай мовы паводле навуковых задач, спосабу апісання слоў, нарматыўнасці. Энцыклапедычныя слоўнікі, лінгвістычныя слоўнікі. Будова слоўнікавага артыкула ў энцыклапедычных і лінгвістычных слоўніках. Сістэма граматычных і стылістычных памет. Фарміраванне лексікаграфічнай тэрміналогіі. | 2 |
| 2. | Беларускія фразеалагічныя даведнікі. Будова фразеаграфічнага артыкула. | 2 |
| 3. | Абагульняльныя заняткі па лексікалогіі, фразеалогіі, лексікаграфіі і фразеаграфіі. | 2 |

### 4.2. Практыкаванні для засваення тэарэтычных ведаў па модулі

Да заняткаў 1 выконваюцца практыкаванні 136-139, 141-152.
Да заняткаў 2 выконваюцца практыкаванні 157-162.
Да заняткаў 3 выконваюцца практыкаванні 140, 142, 153-155, 163-167.

## 5. Дадатковая літаратура па модулі


1. Аксамітаў А.С. Прыказкі і прымаўкі: Тлумач. слоўн. бел. прыказак і прымавак з арх., каф. збораў, рэдкіх выд. XIX і XX стст. – Мн.: Бел. навука, 2002.
2. Анамастычны слоўнік твораў Якуба Коласа. / АН БССР, І-т мовазнаўства імя Я.Коласа. – Мн.: Навука і тэхніка, 1990.
3. Арашонкава Г.У. Слоўнік цяжкасцей беларускай мовы: правапіс, вымаўленне, націск, словазмяненне, словаўжыванне: каля 10 тысяч слоў / Арашонкава Г.У., Лемцюгова В.П. – Мінск: Радыёла-плюс, 2005.
4. Арашонкава Г.У., Лемцюгова В.П. Кіраванне ў беларускай і рускай мовах: Слоўнік-даведнік./ Пад рэд. М.В. Бірылы, А.І. Падлужнага; Рэц. А.П. Груцо. – Мн.: Вышэйш. шк., 1991.
5. Арфаграфічны слоўнік: [каля 30 тысяч слоў сучаснай беларускай мовы: правапіс, словазмяненне, вымаўленне / складальнік Н.С. Лявер. – Мінск: Парадокс, 2006.
6. Бардовіч А.М. Школьны словаўтваральны слоўнік беларускай мовы / А.М. Бардовіч, М.М. Круталевіч, А.А. Лукашанец. – Мінск: Аверсэв, 2006.
7. Бардовіч А.М., Шакун Л.М. Марфемны слоўнік беларускай мовы. 2-е выд. – Мн.: Выш. шк., 1989.
8. Беларускія прыказкі, прымаўкі, фразеалагізмы: Зборнік / Склаў Ф. Янкоўскі. – Мн.: Беларус. навука, 2004.
9. Бірыла М.В. Слоўнік націску ў беларускай мове: каля 5500 слоў. – Мінск:

Народная асвета, 1992.
10. Булыка А.М. Слоўнік іншамоўных слоў: [Каля 25 тыс. слоў і тэрмінаў: У 2 т. – Мн.: Бел. Энцыкл., 1999.
11. Гаўрош Н.В. Слоўнік эпітэтаў беларускай мовы. – Мн.: Выш. шк., 1998.
12. Гістарычны слоўнік беларускай мовы. Вып. 1-22. – Мн.: Навука і тэхніка, 1982-2006.
13. Грабчнков С.М. Межязыковые омонимы и паронимы. – Мн., 1980.
14. Грабчыкаў С.М. Слоўнік паронімаў беларускай мовы. – Мн.: Нар. асвета, 1994.
15. Граматычны слоўнік дзеяслова / Нацыянальная акадэмія навук Беларусі, Інстытут мовазнаўства імя Я. Коласа. – Мінск: Беларуская навука, 2007.
16. Граматычны слоўнік назоўніка: А – Я / Нацыянальная акадэмія навук Беларусі, Інстытут мовы і літаратуры імя Я. Коласа і Я. Купалы. – Мінск: Беларуская навука, 2008.
17. Даніловіч М.А. Слоўнік дыялектнай фразеалогіі Гродзеншчыны. – Гродна: ГрДУ, 2000.
18. Клышка М.К. Слоўнік сінонімаў і блізказначных слоў. – Мн.: Беларус. навука, 2005.
19. Лазоўскі У.М. Слоўнік антонімаў беларускай мовы: Канкрэтныя выпадкі ўжывання. – Мн.: Універсітэцкае, 1994.
20. Лепешаў І.Я. Слоўнік беларускіх прыказак / І.Я.Лепешаў, М.А.Якалцэвіч. – Мн.: Бел. навука, 2002.
21. Лепешаў І.Я. Слоўнік фразеалагізмаў. У 2 т. – Мн.: Беларус. Энцыклапедыя імя П. Броўкі, 2008.
22. Лепешаў І.Я. Этымалагічны слоўнік фразеалагізмаў. – Мінск: Беларус. Энцыкл., 2004.
23. Малажай Г.М. Беларуская перыфраза. – Мн.: Выш. шк., 1974.
24. Насовіч І.І. Слоўнік беларускай мовы. – Мн., 1983.
25. Прыгодзіч М.Р. Пішам без памылак: Разам, асобна, праз дэфіс: Слоўнік-даведнік / М.Р. Прыгодзіч. – Мн.: ТАА "Paradox", 2002.
26. Руска-беларускі слоўнік. Т. 1-3. – Мн.: Беларус. Энцыкл. Імя П. Броўкі, 1994.
27. Санько З. Малы беларуска-рускі слоўнік прыказак, прымавак і фразем. – Мн., 1991.
28. Слово и словарь: сборник научных трудов по лексикографии / Министерство образования Республики Беларусь, Учреждение образования "Гродненский государственный университет им. Я. Купалы". – Гродно: ГрГУ, 2007.
29. Слоўнік беларускай мовы: Арфаграфія. Арфаэпія. Акцэнтуацыя. Словазмяненне. / Г.У.Арашонкава і інш. – Мінск: Беларуская савецкая энцыклапедыя імя Петруся Броўкі, 1987.
30. Старычонак В.Дз. Слоўнік амонімаў беларускай мовы. – Мн.: Вышэйш. шк., 1991.
31. Сцяцко П.У., Гуліцкі М.Ф., Антанюк Л.А. Слоўнік лінгвістычных тэрмінаў. – Мн.: Вышэйш. шк., 1990.
32. Тлумачальны слоўнік беларускай літаратурнай мовы. Больш за 65 000 слоў. / Пад. рэд. М.Р. Судніка, М.Н. Крыўко. – Мн.: БелЭн, 1996.
33. Тлумачальны слоўнік беларускай мовы. Т. 1-5. – Мн.: Беларуская Савецкая Энцыклапедыя, 1977-1984.
34. Фразеалагічны слоўнік мовы твораў Я. Коласа: Звыш 6000 слоўнікавых арт. /

АН Беларусі, Ін-т мовазнаўства імя Я. Коласа. – Мн.: Навука і тэхніка, 1993.
35. Шкраба І., Шкраба Р. Крынічнае слова: Беларускія прыказкі і прымаўкі. – Мн.: Мастац. літ. 1987.
36. Шуба П.П. Тлумачальны слоўнік беларускіх прыназоўнікаў. – Мн.: Нар. асвета, 1993.
37. Этымалагічны слоўнік беларускай мовы. Т. 1-8. – Мн.: Навука і тэхніка, 1978-1993.
38. Янкоўскі Ф.М. Беларуская фразеалогія: фразеалагізмы, іх значэнне, ужыванне. – Мн.: Вышэйш. шк., 1968.

## МОДУЛЬ 4
## «ФАНЕТЫКА, ФАНАЛОГІЯ, АРФАЭПІЯ»

### 1. Схема блок-сістэмы вывучэння тэарэтычнага матэрыялу

| № | Тэма лекцыйных заняткаў | Колькасць гадзін |
|---|---|---|
| 1. | Фанетыка і фаналогія, іх узаемадачыненне. Гук і фанема. Фанемны рад. Паняцце аб фанетычным чляненні моўнай плыні. Асноўныя фанетычныя адзінкі. | 2 |
| 2. | Гукі мовы. Аспекты вывучэння гукаў: артыкуляцыйны, акустычны, перцэптыўны, функцыянальны. Спосабы класіфікацыі гукаў. Паняцце аб артыкуляцыйнай і акустычнай класіфікацыі гукаў. | 2 |
| 3. | Артыкуляцыйная класіфікацыя зычных: падзел іх на групы паводле ўдзелу голасу і шуму, месца і спосабу ўтварэння, адсутнасці ці наяўнасці дадатковай артыкуляцыі (палаталізацыі). | 2 |
| 4. | Артыкуляцыйная класіфікацыя галосных гукаў. Галосныя лабіялізаваныя і нелабіялізаваныя. Галосныя верхняга, сярэдняга і ніжняга пад'ёму. Галосныя пярэдняга, сярэдняга і задняга рада. | 2 |
| 5. | Склад як фанетычная адзінка. Розныя тэорыі склада: экспіраторная, санорная, тэорыя мускульнага напружання. Тыпы складоў. | 2 |
| 6. | Фанетычная прырода націску. Розныя тыпы націску. Акустычная характарыстыка беларускага націску. Рознамясцовасць, рухомасць слоўнага націску. Асноўны і пабочны націск у складаных словах. Праклітыкі і энклітыкі. Функцыі тактавага, лагічнага націску. | 2 |
| 7. | Пазіцыйныя чаргаванні гукаў як вынік фанетычных працэсаў. Гістарычныя чаргаванні гукаў. | 2 |
| 8. | Прадмет арфаэпіі. Арфаэпія як правілы рэалізацыі фанетычнай сістэмы. Практычнае значэнне арфаэпіі.<br>Арфаэпічная норма. З гісторыі фарміравання арфаэпічных нормаў беларускай мовы. | 2 |
| 9. | Арфаэпічная норма і культура маўлення. Прычыны адхіленняў ад літаратурных нормаў. Кадыфікацыя арфаэпічных нормаў сучаснай беларускай літаратурнай мовы. | 2 |

### 2. Асновы навукова-тэарэтычных ведаў па модулі

**Слоўнік паняццяў для засваення**: фанетыка, фаналогія, гук, фанеміка, фанема, моцная (незалежная) пазіцыя, слабая (залежная) пазіцыя, дыферэнцыйныя прыметы фанемы, інтэгральныя прыметы фанемы, фанемны рад, варыянт фанемы, варыяцыі фанемы, алафон, марфанема, гукавы закон, сегментныя фанетычныя адзінкі, лінейныя фанетычныя адзінкі, суперсегментныя фанетычныя адзінкі, фраза, маўленчы такт, фанетычнае (акцэнтавае) слова, клітыка, праклітыка, энклітыка, склад, націск, палаталізацыя, мяккія зычныя, палаталізаваны гук, палатальны гук, цвёрдыя зычныя,

велярызацыя, велярызаваны гук, санорныя зычныя, Шумныя зычныя, звонкія зычныя, глухія зычныя, зацвярдзелыя гукі, губныя гукі, губна-губныя (білабіяльныя) гукі, губна-зубныя (лабія-дэнтальныя) гукі, язычныя гукі, пярэднеязычныя гукі, сярэднеязычныя гукі, заднеязычныя гукі, змычныя (выбухныя) гукі, шчылінныя (шчылінна-працяжныя) гукі, фрыкатыўныя гукі, змычна-шчылінныя гукі (афрыкаты), змычна-праходныя зычныя гукі, насавыя (назальныя) гукі, бакавыя (латэральныя) гукі, вібранты (дрыжачыя) гукі, лабіялізаваныя галосныя гукі, камбінаторнымі змены, экскурсія, рэкурсія, акамадацыя, дысіміляцыя, прагрэсіўнае ўздзеянне, рэгрэсіўнае ўздзеянне, пазіцыйныя змены гукаў, кантракцыя, дыярэза, эпентэза, рэдукцыя, колькасная рэдукцыя, якасная рэдукцыя, поўная рэдукцыя, асіміляцыя, поўная асіміляцыя, няпоўная асіміляцыя, кантактавая асіміляцыя, дыстактавая асіміляцыя, прагрэсіўная асіміляцыя, рэгрэсіўная асіміляцыя, пратэза, вакалічная пратэза, кансанантавая пратэза, чаргаванне, бегласць галосных, націск, акцэнталогія.

## 2.1. Фанетыка і фаналогія як раздзелы мовазнаўства

Пры напісанні раздзела быў выкарыстаны матэрыял энцыклапедычнага даведніка «Беларуская мова: Энцыкл. / Беларус. Энцыкл.; Пад рэд. А.Я. Міхневіча; Рэдкал.: Б.І. Сачанка (гал. рэд.) і інш. – Мн., 1994. – 655 с.».

**Фанетыка** (ад грэч. *phōnē* – 'гук', *phōnētikos* – 'гукавы') – раздзел мовазнаўства, які вывучае гукавыя сродкі мовы. Да іх адносяцца гукі мовы, склады, націск, інтанацыя. Тэрмінам «фанетыка» называюць і сам гукавы лад мовы.

Аб'ектам фанетыкі, у адрозненне ад іншых раздзелаў мовазнаўства, з'яўляюцца адзінкі, прырода якіх матэрыяльная, таму фанетыка даследуе не толькі моўную функцыю, але і матэрыяльны бок свайго аб'екта: работу органаў маўленчага апарата, акустычныя характарыстыкі гукаў і асаблівасці ўспрымання іх носьбітамі мовы.

У адпаведнасці з гэтым адрозніваюць: **функцыянальную** фанетыку, або **фаналогію**, у цэнтры ўвагі якой функцыянальна-моўны аспект гукаў, іх роля ў мове як сродку зносін; **артыкуляторную** фанетыку, якая асвятляе пытанні ўтварэння гукаў мовы; акустычную фанетыку, якая даследуе фізічную прыроду гукаў; **перцэптыўную** фанетыку, што вывучае гукі з пункту погляду ўспрымання іх носьбітамі мовы. Усе чатыры аспекты вывучэння гукавой матэрыі цесна звязаны паміж сабой і ўзаемна абумоўлены: гукі мовы пэўным чынам функцыянуюць у мове і функцыянальна адрозніваюцца таму, што яны маюць адпаведныя акустычныя якасці, якія ў сваю чаргу ствараюцца органамі маўлення чалавека і залежаць ад іх дзейнасці ў час гаварэння. Суб'ектыўныя вобразы гукаў узнікаюць у свядомасці чалавека таксама на аснове аб'ектыўных характарыстык гукавой хвалі.

У залежнасці ад задач вывучэння гукавой матэрыі адрозніваюць фанетыку агульную, прыватную (сінхронную і дыяхронную) і параўна-

льную. Прадметам **агульнай фанетыкі** з'яўляецца тое агульнае, што складае гукавы бок усіх моў. Агульная фанетыка вывучае будову маўленчага апарата чалавека, на матэрыяле розных моў вызначае прыроду гукаў і агульныя прынцыпы члянення гукавой плыні на пэўныя адрэзкі, выяўляе заканамернасці спалучэння гукаў і ўзаемаўплыву суседніх гукаў, прыроду склада, фанетычную арганізацыю слова, інтанацыйныя сродкі мовы.

**Прыватная фанетыка** разглядае ўсе гэтыя праблемы ў адносінах да канкрэтнай мовы. Яна можа быць апісальнай (сінхроннай) і гістарычнай (дыяхроннай). **Апісальная фанетыка** даследуе гукавы лад канкрэтнай мовы ў сінхронным плане, на пэўным этапе яе развіцця. Звычайна аб'ектам апісання з'яўляецца сучасны стан мовы, а прадметам гістарычнай фанетыкі – гукавы лад пэўнай мовы ў яго развіцці. **Гістарычная фанетыка** даследуе змены фанетычных адзінак у розныя эпохі, тлумачыць, як адбываліся гэтыя змены, якія гукавыя адзінкі былі ў мове раней і чым яны замяняліся пазней. Звесткі гістарычнай фанетыкі даюць важны матэрыял для разумення пэўных фанетычных з'яў на сучасным этапе.

**Параўнальная** фанетыка займаецца параўнальным вывучэннем гукавых сістэм дзвюх або некалькіх моў. Яна выяўляе падабенства і адрозненні ў гэтых мовах паводле складу гукаў, змен гукаў у моўнай плыні і інш. і тым самым вызначае спецыфіку гукавога ладу розных моў.

Паколькі гукавыя адзінкі – з'ява акустыка-фізіялагічная, то пры іх вывучэнні фанетыка карыстаецца метадамі, якія прымяняюцца ў акустыцы і фізіялогіі. Як і гэтыя навукі, сучасная фанетыка выкарыстоўвае спецыяльныя тэхнічныя сродкі і разнастайныя прыёмы інструментальнага назірання, якія прынята называць эксперыментальна-фанетычнымі метадамі вывучэння. Да іх адносяцца: **палатаграфія** – фіксацыя месца кантакту языка з паднябеннем у час артыкуляцыі; **кінафотаздымка** рухаў губ, якія маюць істотнае значэнне для характарыстыкі гукаў; **рэнтгеназдымка** маўленчага апарата ў час артыкуляцыі; **асцылаграфія**, якая дазваляе вызначыць працягласць, частату, інтэнсіўнасць гука; **спектраграфія**, якая дае агульны акустычны малюнак гука. Фанетыка выкарыстоўвае таксама разнастайныя метады вывучэння ўспрымання тых ці іншых гукавых з'яў носьбітамі мовы, што з'яўляецца важным для іх фаналагічнай інтэрпрэтацыі.

**Фаналогія** – галіна мовазнаўства, якая вывучае гукавы лад мовы у яго функцыянальным аспекце. У такім разе фанетыка разглядаецца як галіна мовазнаўства, што вывучае маўленне ў яго фізічным, акустычна-артыкуляцыйным аспекце. У цэнтры ўвагі фаналогіі як навуковай дысцыпліны – праблема тоеснасці фанемы як мінімальнай сэнсаадрозніва-

льнай адзінкі гукавога ладу мовы. Так, фаналогія вызначае прыкметы, якія складаюць змест фанемы, высвятляе суадносіны, з аднаго боку, паміж фанемай і гукамі, у якіх яна рэалізуецца ў моўнай плыні, а з другога боку, з марфемай, словам. У задачы фаналогіі ўваходзіць таксама вызначэнне колькаснага складу фанем у мове выяўленне сувязей, што існуюць паміж асобнымі фанемамі і іх групамі, інакш кажучы, устанаўленне сістэмы фанем.

## 2.2. Гук і фанема

Пры напісанні раздзела быў выкарыстаны матэрыял дапаможніка «Сцяцко П.У. Уводзіны ў мовазнаўства: Дапаможнік. – Гродна: ГрДУ, 2001. – 231 с.».

Гукі мовы – гэта сам спосаб існавання мовы, яе матэрыялізацыя, матэрыяльныя сродкі, з якіх будуюцца моўныя адзінкі. **Гук мовы** (маўлення) найдрабнейшая адзінка мовы, якая ўтвараецца органамі маўленчага апарата чалавека і служыць матэрыяльнай асновай для ўтварэння марфемаў і слоў. Гукі мовы вывучаюцца не толькі з артыкуляцыйнага і акустычнага боку, што з'яўляецца аб'ектам фанетыкі, але і з боку іх функцыі ў мове як сродкаў распазнавання і адрознення марфемаў і слоў, што ёсць аб'ектам асобнай галіны фаналогіі – **фанемікі**. У фанеміцы гукі вывучаюцца з уласна-лінгвістычнага боку іх ролі ў мове як матэрыяльных адзінак, з якіх складаюцца марфемы і словы і з дапамогаю якіх яны адрозніваюцца. Так, каранёвыя марфемы (а ў нашым выпадку і словы) *дом, дым, дам, дум* маюць розныя галосныя: [о], [ы], [а], [у], яны і адрозніваюць абалонкі гэтых моўных адзінак.

Аднак не ўсе гукі, якія мы чуем у маўленні, выконваюць такую функцыю. Напрыклад, у сказе *Зноў гры[п].* апошняе слова мае канцавы гук [п], які няздатны тут адрозніць розныя паняцці: 'расліна' і 'хвароба'. Або ў словазлучэнні *новая ка[с]ка*, дзе гук [с] таксама не адрознівае паняцці 'засцерагальны галаўны ўбор' і 'літаратурны твор'. З улікам згаданага будзем мець, да прыкладу, не адзін гук [а], а шмат іх. Розныя маўленчыя экзэмпляры гэтага [а] будуць выступаць і залежна ад пазіцыі яго ў словах 1) па адносінах да суседніх зычных гукаў: паміж цвёрдымі зычнымі [а] (дам), пасля мяккага зычнага [˙а] (сяду), перад мяккім [а˙] (даме) ці паміж мяккімі зычнымі [ä] (мяць); 2) па адносінах да націску ў слове: пад націскам [а] (сад), не пад націскам [ъ] (як у рускамоўным маўленні) [дамъ]. Але ўсе згаданыя «а» аб'ядноўваюцца ў адзін гукатып <а>, які і адрознівае гукавыя абалонкі слоў, а праз іх і самі словы.

**Фанема** (грэц. *phonema* – 'гук, голас') – гэта найменшая (мінімальная) гукавая сэнсаадрознівальная адзінка, якая не можа падзяляцца на больш дробныя адзінкі, яна служыць для распазнавання і адрознення марфемаў (у склад якіх яна ўваходзіць), а праз іх і для распазнавання і ад-

рознення слоў. Так, дыфтонгі, якія складаюцца з двух гукаў у межах аднаго склада (на пісьме гэта абазначаецца дзвюма літарамі), рэпрэзентуюць сабой адну фанему. Акрамя таго, нятоеснасць фанемы і гука выяўляецца і ў тым, што дзве фанемы могуць рэалізавацца ў адным гуку. Напрыклад, <д> і <с> у слове *гарадскі* гучаць як адзін гук [ц]: гара[ц]кі; а фанема-прыстаўка <з> і каранёвая фанема <ж> у слове *зжаць* гучаць як адзін доўгі гук [жж]: [жжац']. Фанема можа рэалізавацца і ў нулявым гуку, як у каранёвых марфемах словаў *сон – сну, пень – пня*.

Фанема сама па сабе значэння не мае і з сэнсаваадрозніваннем звязваецца толькі ўскосна. Яна выконвае дзве асноўныя функцыі: 1) перцэпцыйную (лац. *perceptio* 'успрыманне') – функцыю распазнавання: успрымання слыхам, зрокам; 2) сігніфікацыйную (лац. *significatio* 'абазначэнне') – функцыю адрознівання марфемаў і слоў.

У «Кароткай граматыцы беларускай мовы» (2007) згадваецца, што беларускай мове ўласцівы наступныя фанемы: *<п>, <п'>, <б>, <б'>, <м>, <м'>, <ф>, <ф'>, <в>, <в'>, <й>, <т>, <ц'>, <д>, <дз'>, <дз>, <с>, <с'>, <з>, <з'>, <н>, <н'>, <л>, <л'>, <ц>, <ш>, <ж>, <ч>, <дж>, <р>, <г>, <г'>, <х>, <к>, <к'>, <а>, <о>, <е>, <у>, <і>,* а таксама факультатыўная фанема *<g>* (г выбухны), якая сустракаецца ў словах іншамоўнага паходжання і мае тэндэнцыю да замены фанемай *<γ>* (г фрыкатыўны).

Кожная фанема – гэта набор пазіцыйна незалежных адзнакаў, інакш канстытуцыйных. Гэтымі адзнакамі адна фанема адрозніваецца ад іншых. Так, фанема <з> мае такія адзнакі: кансанантнасць (лац. *consonans, consonantis* 'зычны гук'), шумнасць, звонкасць, фрыкатыўнасць, цвёрдасць, пярэднеязычнасць.

Асобныя фанемы існуюць у мове толькі таму, што яны маюць свае адметныя адзнакі, якія адрозніваюць іх адна ад адной, г. зн. знаходзяцца паміж сабой у апазіцыі (супрацьпастаўленні). Напрыклад, <ж> і <ш> у апазіцыі «звонкасць / глухасць». Прыметы, якімі адрозніваюцца між сабою фанемы, называюцца **дыферэнцыйнымі** (лац. *differentio* 'адрозненне'). Прыметы, супольныя для некалькіх фанемаў і няздатныя іх адрозніваць, называюцца **інтэгральнымі** (лац. *integer* 'цэлы, некрануты'). Як у фанемах <ж> і <ш> супольныя прыметы: кансанантнасць, цвёрдасць, шумнасць, фрыкатыўнасць, альвеалярнасць. Менавіта дыферэнцыйныя прыметы дазваляюць фанемам выконваць сігніфікацыйную функцыю.

Фанемы ў маўленні рэалізуюцца ў сваіх варыянтах і варыяцыях у залежнасці ад пазіцыі ў слове. Адрозніваюць дзве пазіцыі: 1) **моцная (незалежная)** пазіцыя – такая, у якой гук вымаўляецца так ці амаль так, як ізаляваная гукавая адзінка; 2) **слабая (залежная)** пазіцыя – такая, у якой адбываецца прыстасаванне гука да іншых або замена яго іншым гу-

кам. Для галосных моцная пазіцыя – націскное становішча, слабая – ненаціскное, для зычных (шумных) моцная пазіцыя – становішча перад галоснымі ці санорнымі зычнымі, слабая – становішча звонкіх у канцы слова перад паўзай і перад глухімі, для глухіх – становішча перад звонкімі. У моцнай пазіцыі фанемы выразна адрозніваюцца і здатныя адрозніваць гукавыя абалонкі марфемаў, а праз іх і словы.

У слабай пазіцыі фанема губляе пэўную дыферэнцыйную адзнаку (гэтая адзнака нейтралізуецца), у выніку чаго супадае з іншай фанемай, а таму становіцца няздатнай быць сэнсаадрознівальнай моўнай адзінкай. Напрыклад, у слове *коды* (гарадоў) фанема <*д*> знаходзіцца ў моцнай пазіцыі (перад галосным), а ў форме адзіночнага ліку – *код* яна апынулася ў канцы слова, дзе ў беларускай мове не можа быць звонкіх зычных, і звонкая фанема <*д*> рэалізавалася ў гуку [т]: [кот]. Узніклі амафоны двух слоў: код (горада) і кот (чорны). Значыць, фанема <*д*> у слабай пазіцыі страціла сваю сігніфікацыйную функцыю і ператварылася ў свой варыянт [т]. Чаргаванне фанемы ў моцнай пазіцыі з эквівалентнымі ёй у слабай утвараюць **фанемны рад**.

**Варыянт фанемы** – такое відазмяненне, пры якім фанема ў сваім гучанні супадае з іншай. **Варыяцыі фанемы** – гэта нязначныя відазмяненні, пры якіх фанема не губляе сваёй якасці, не супадае з іншай. Напрыклад, фанема <*а*> у каранёвай дзеяслоўнай марфеме *сад-* можа відазмяняцца ў словах *сяду, садзіць, сядзець* у [˙а], [а˙], [ä], але гэтыя відазмяненні не парушаюць фанемы <*а*>, якая рэалізуецца тут у трох варыяцыях. Варыяцыі фанемы найчасцей узнікаюць у выніку акамадацыі галосных. Гукавыя рэалізацыі фанемы называюцца **алафонамі** (грэц. *allos* 'іншы' і *phone* 'гук').

Самастойнымі фанемамі трэба лічыць тыя тыповыя гукі, якія, ужываючыся ў аднолькавай пазіцыі, змяняюць значэнне слова, а калі яны не прыводзяць да зменаў значэння, то лічыць іх самастойнымі фанемамі нельга. Напрыклад, у словах *кот, рот, год* першыя зычныя выступаюць фанемамі <*к*>*,* <*р*>*,* <*г*>*,* бо яны адрозніваюць гукавыя абалонкі розных слоў. А вось markрознае вымаўленне [g]анак і [γ]анак не вядзе да змены сэнсу. Значыць, выбухное і працяжнае вымаўленне першага гука складае толькі варыянты фанемы <*г*>.

Фанема ў межах пэўнай марфемы (часцей кораня) можа чаргавацца як у словах *рука, ручка, (у) руцэ*; у такім разе апошняя зычная выступае ў розных сваіх відазмяненнях: к/ч, к/ц. Гэты шэраг чаргавальных фанемаў у складзе адной марфемы абазначаюць тэрмінам **марфанема**. Значыць, у нашым выпадку выступаюць марфанемы к/ч і к/ц, або к/ч/ц.

Змена гукаў паводле адпаведных правілаў называецца **гукавым законам**. Гукавы закон выяўляецца ў формуле гукавых пераходаў. Так, у

беларускай мове галосныя [о], [э], апынуўшыся ў ненаціскных складах, пераходзяць у гук [а]: *соль саліць, шэсць шасці, вёсны вясна*. Такім чынам, гукавым законам у галіне вакалізму беларускай мовы ёсць аканне (і яканне).

У галіне зычных такім рэгулярным гукавым законам выступае пераход звонкіх зычных у глухія ў абсалютным канцы слова, рэгрэсіўная асіміляцыя звонкіх і глухіх, калі звонкія зычныя, апынуўшыся перад глухімі, пераходзяць у глухія (*ка[з]аць ка[с]ка*), а глухія перад звонкімі у звонкія (*ка[с]іць ка[з]ба*). Гэтыя жывыя фанетычныя законы называюць законамі функцыянавання мовы.

### 2.3. Фанетычны падзел маўленчай плыні

Пры напісанні раздзела быў выкарыстаны матэрыял дапаможніка «Сцяцко П.У. Уводзіны ў мовазнаўства: Дапаможнік. – Гродна: ГрДУ, 2001. – 231 с.».

Фанетычнае вывучэнне гукавых сродкаў прадугледжвае выяўленне асноўных адзінак, апісанне іх фанетычных уласцівасцей і правіл ужывання ў мове. Асноўныя фанетычныя адзінкі падзяляюцца на **сегментныя**, або **лінейныя**,– гук, склад, фанетычнае слова, сінтагма, ці такт, фраза, якія вылучаюцца на аснове лінейнага члянення (сегментацыі) моўнай плыні, і **суперсегментныя**, або прасадычныя,– націск, інтанацыя, якія як бы накладваюцца на сегментныя адзінкі і служаць сродкам стварэння іх цэласнасці. Так, адзінства фразы ствараецца інтанацыяй, адзінства сінтагмы – інтанацыйным цэнтрам, адзінства фанетычнага слова – слоўным націскам, складовай рытмікай.

**Фраза** (франц. *phrase*, ад грэц. *phrasos* 'выраз, зварот мовы') – найбольшая фанетычная адзінка, якая вымаўляецца з закончанай інтанацыяй і размяжоўваецца працяглымі паўзамі (на пісьме яны абазначаюцца дзвюма паралельнымі рыскамі (//). Фраза можа супадаць са сказам ці часткай яго або некалькімі сказамі: *Люблю наш край, старонку гэту, дзе я радзілася, расла, дзе першы раз пазнала шчасце, слязу нядолі праліла //* (К.Б.). *Вечарэла. // З балот пацягнула цёплай вільгаццю //* (К-с).

**Маўленчы такт** – частка фразы, вымаўленая без прыпынку, без закончанай інтанацыі і аддзеленая непрацяглай паўзай (на пісьме яна абазначаюцца адной рыскай (/). Так, у згаданым вышэй сказе будзем мець наступныя такты: *Люблю наш край / старонку гэту / дзе я радзілася / расла / дзе першы раз пазнала шчасце / слязу нядолі праліла //*

**Фанетычнае (акцэнтавае) слова** – частка маўленчага такта з адным націскам; яно найчасцей супадае з асобным словам – лексічнай адзінкай. Аднак службовыя словы, не маючы свайго націску, прымыкаюць да самастойных, утвараючы адно акцэнтавае слова: *пад акном [падакном], усё ж [ус'о-ш]*. У межах акцэнтавага слова ненаціскныя словы

кампаненты (звычайна службовыя словы) называюць **клітыкамі**. Калі клітыка знаходзіцца перад націскным словам, яе называюць **праклітыкай** (грэц. *proklino* 'нахіляюся наперад'): *да нас, у яго, пад намі*, а калі пасля націскнога слова – **энклітыкай** (грэц. *enklino* 'схіляюся'): *прынёс бы, як жа*. Клітыкамі могуць быць і паўназначныя словы: *тры-дні , дзеты*. З часам клітыкі могуць стаць часткай лексічнага слова, яго марфемай: *падчас*.

Пытанне пра фанетычныя адзінкі маўлення і пра іх колькасць і існасць вырашаецца па-рознаму. Адны аўтары называюць фразу, маўленчы такт (ён атаясамліваецца з фанетычным словам), склад і гук (А. Рэфармацкі), іншыя характарызуюць толькі склад, акцэнтавае слова і такт, які называюць **сінтагмай** (інтанацыйна непадзельная адзінка маўленчай плыні, у сярэдзіне сінтагмы няма паўзаў).

**Склад** – гэтая найменшая адзінка маўленчай плыні: вымаўляючы словы, мы падзяляем іх не на гукі, а на склады: *поў-нач, да-мы, да-ра-гі.*

**Націск** – гэта вылучэнне фанетычным спосабам той ці іншай гукавой адзінкі ў межах адзінкі больш высокага ўзроўню.

**Інтанацыя** (лац. *intonare* 'гучна вымаўляць') – сукупнасць фанетычных сродкаў, якія служаць для афармлення фразы і асобных яе частак як адзінага цэлага, а таксама для больш дакладнай перадачы думак і пачуццяў асобы, якая гаворыць. Фанетычнымі сродкамі выражэння інтанацыі з'яўляюцца: 1) мелодыка (рух асноўнага тона голасу, яго павышэнне або паніжэнне), 2) інтэнсіўнасць (узмацненне і аслабленне вымаўлення, яго выразнасць), тэмп (хуткасць маўлення), тэмбр (эмацыйна-экспрэсійная афарбоўка маўлення), паўзы.

### 2.4. Гукі мовы і аспекты іх вывучэння

Пры напісанні раздзела быў выкарыстаны матэрыял дапаможніка «Сцяцко П.У. Уводзіны ў мовазнаўства: Дапаможнік. – Гродна: ГрДУ, 2001. – 231 с.».

Гукі мовы (маўлення) вывучаюцца з трох бакоў (аспектаў): 1) акустычнага (фізічнага, слыхавога), 2) артыкуляцыйнага (фізіялагічнага з боку ўдзелу органаў маўлення), 3) функцыянальнага (лінгвістычнага – ролі (функцыі) гукаў у мове для пабудовы адзінак больш высокага яруса і адрознення іх), перцэптыўнага (з пункту погляду ўспрымання гукаў носьбітамі мовы).

**Акустыка гукаў маўлення**. Тут разглядаюцца гукі як вынік вагання галасавых звязак (побач з работай іншых органаў маўленчага апарату). Галасавыя звязкі могуць вагацца рытмічна і нерытмічна; у выніку рытмічных ваганняў узнікае голас (галосныя гукі), нерытмічных – шум (глухія зычныя). Шум і голас могуць аб'ядноўвацца, тады ўзнікаюць санорныя гукі (голас пераважае) ці звонкія шумныя (пераважае шум).

Гукі адрозніваюцца між сабою вышынёю, сілай, працягласцю і тэмбрам. **Вышыня гуку** залежыць ад частаты ваганняў у секунду: больш ваганняў – вышэйшы гук, менш ваганняў – ніжэйшы гук. Частата ваганняў вызначаецца даўжынёю і напружаннем галасавых звязак. Калі галасавыя звязкі карацейшыя (як у жанчыны і дзіцяці), то напружанасць іх і частата іх ваганняў большая, таму і гук вышэйшы. Вышыня гукаў вымяраецца ў герцах – адно ваганне ў секунду (Гц). Не ўсе гукі ўспрымае чалавек, а толькі тыя, што маюць частату 16 20000 Гц. Ніжэйшыя за 16 Гц гукі (інфрагукі) і вышэйшыя за 20000 Гц (ультрагукі) чалавекам не ўспрымаюцца. Кажаны, лісы, сабакі ўльтрагукі ўспрымаюць.

**Сіла (інтэнсіўнасць) гуку** вызначаецца размахам (амплітудай) ваганняў: пры большай амплітудзе – гук мацнейшы, пры меншай – слабейшы. Сіла гуку вымяраецца ў дэцыбелах (дБ). Побач з сілай гуку разглядаюць і яго гучнасць, якая залежыць не толькі ад напружання хвалі, але і ад вышыні: гукі аднолькавай сілы, рознай вышыні ўспрымаюцца як гукі рознай гучнасці. Сіла гуку вельмі важная для выразнасці ў перадачы і ўспрыняцці маўлення, пры вызначэнні тыпу націску.

**Даўжыня (працягласць) гуку** вызначаецца часам яго вымаўлення і вымяраецца ў мілісекундах (тысячных долях секунды, мс). Так, па працягласці (даўжыні) націскныя галосныя больш доўгія за ненаціскныя ў беларускай, рускай, украінскай мове, а ў чэшскай – галосныя пад націскам могуць і не быць доўгімі (доўгія і кароткія галосныя тут адрозніваюць розныя словы).

**Тэмбр гуку** – адна з найбольш важных адметнасцяў гуку, асаблівая яго якасць, гукавая афарбоўка, яго індывідуальны «званочак» (фр. *timbre* – 'званочак'). Паводле тэмбру адрозніваюцца галасы людзей, вымаўленне імі тых самых гукаў, гучанне розных інструментаў і г.д. А ствараюць тэмбр суадносіны асноўнага і пабочнага тонаў. Асноўны тон узнікае ў выніку ваганняў галасавых звязак, пабочныя тоны – у поласці рота, носа і глоткі. Пабочныя тоны называюць **абертонамі** (ням. *Oberton* 'верхні тон'), яны больш высокія за тон, бо маюць больш высокую частату ваганняў. Накладанне на асноўны тон абертонаў стварае складаны гук з яго індывідуальнай афарбоўкай. Тэмбр гуку залежыць ад рэзанансавай характарыстыкі – пабочных тонаў, якія ствараюцца ў рэзанатары (поласці рота, носа, глоткі). Аб'ём і форма рэзанатара змяняецца пры руху языка, мяккага паднябення, губ, адсюль і змены ў пабочных тонах, якія надаюць адмысловую характарыстыку гуку.

## 2.5. Класіфікацыя гукаў маўлення і яе прынцыпы

Пры напісанні раздзела быў выкарыстаны матэрыял дапаможніка «Сцяцко П.У. Уводзіны ў мовазнаўства: Дапаможнік. – Гродна: ГрДУ, 2001. – 231 с.».

### 2.5.1 Зычныя гукі і прынцыпы іх класіфікацыі

Зычных гукаў у беларускай мове 39. Гэта гукі несвабоднага ўтварэння, з моцным струменем выдыхаемага паветра, звычайна нескладаўтваральныя. Пры іх класіфікацыі ўлічваюцца наступныя прынцыпы: I – палаталізацыя, II – танальнасць, III – месца ўтварэння, IV – спосаб утварэння, V – працягласць.

I. Паводле наяўнасці ці адсутнасці **палаталізацыі** зычныя бываюць мяккія і цвёрдыя. **Мяккія зычныя** – гукі, якія, акрамя сваёй асноўнай артыкуляцыі, маюць і дадатковую – палаталізацыю, калі сярэдняя частка спінкі языка паднятая да цвёрдага паднябення (у выніку гэтага змяняецца форма ротавага рэзанатара і павышаецца тон і шум гука); гэтую дадатковую артыкуляцыю часам называюць ётавай артыкуляцыяй, або «і»-падобнай (падобнай да вымаўлення гукаў [j], [i]).

Гукі, якім уласцівая палаталізацыя, называюцца **палаталізаванымі**, або **мяккімі** (дакладней – **памякчонымі**). А гук [j] – толькі мяккі (таму яго называюць **палатальным**), бо мяккасць – гэта яго асноўная артыкуляцыя.

**Цвёрдыя зычныя** – гукі, пры вымаўленні якіх, акрамя асноўнай, ёсць дадатковая артыкуляцыя – велярызацыя: задняя частка спінкі языка падымаецца да мяккага паднябення (у выніку тон і шум рэзка зніжаюцца). Зычныя, якім уласцівая велярызацыя, называюцца цвёрдымі, або **велярызаванымі**. Гукі [ж], [дж], [р], [ч], [ш], [ц] (не ўтвораны з [т]) не маюць адпаведных мяккіх, яны **зацвярдзелыя**. Большасць цвёрдых і мяккіх зычных складаюць пары.

II. Паводе **танальнасці** (ступені гучнасці) зычныя падзяляюцца на дзве групы: санорныя і шумныя. 1) **Санорныя** зычныя ўтвараюцца з перавагай голасу над шумам, акустычна яны больш блізкія да галосных. Гэтая блізкасць выяўляецца ў наступным: а) санорныя не аглушаюцца на канцы слова і перад глухімі; б) глухія зычныя перад імі не азванчаюцца, а застаюцца нязменнымі, як і перад галоснымі; в) санорныя не маюць сабе парных глухіх. Санорных гукаў 11: [р], [м], [м'], [н], [н'], [л],[л'], [й], [ў], [в], [в'].

2) **Шумныя зычныя** – гэта: а) гукі, які складаюцца з шуму і голасу з перавагай шуму – **звонкія**; б) гукі, якія не маюць у сваім складзе голасу, а толькі шум **– глухія**. Большасць звонкіх і глухіх утвараюць пары па звонкасці глухасці:

[з], [з'], [д], [б], [б'], [дз], [дз'], [дж], [г], [г'], [ж], [γ], [γ']

[с],[с'], [т], [п], [п'], [ц], [ц'], [ч], [к], [к'], [ш], [х], [х'], [ф], [ф'].

III. Паводле **ўдзелу органаў вымаўлення і месца ўтварэння** (інакш – артыкуляцыі актыўнага органа маўлення) зычныя падзяляюцца на: 1) губныя, 2) язычныя.

**Губныя** ўтвараюцца: а) шляхам зблiжэння нiжняй губы з верхняй i iмгненным размыканні: [б], [б'], [м], [м'], [п], [п'], [ў] называюцца **губна-губнымі**, або **білабіяльнымі** (лац. *bi(s)* 'двойчы' і *labialis* 'губны'). Гукі, утвораныя пры зблiжэннi нiжняй губы з верхнiмi зубамi; называюцца **губна-зубнымi**, або **лабiя-дэнтальнымi** (лац. *labium* 'губа' i *dentis* 'зуб'): [в], [в'], [ф], [ф'].

**Язычныя** ўтвараюцца пры актыўнай артыкуляцыі языка яго адпаведнай часткі, у сувязі з чым іх падзяляюць на пярэднеязычныя, сярэднеязычныя і заднеязычныя.

**Пярэднеязычныя** ўтвараюцца збліжэннем або змыканнем пярэдняй часткі і кончыка языка з зубамі, зубамі і альвеоламі ці альвеоламі. Асабліва рухомы тут кончык языка, ён можа займаць featureрознае становішча ў адносінах да пасіўных органаў ротавай поласці – зубоў (верхніх і ніжніх), альвеолаў і паднябення: [з], [з'], [с], [с'], [ц], [ц'],[дз], [дз'], [ж], [ш], [ч], [дж], [л], [л'], [р], [д], [т].

Пры вымаўленні гукі [ж], [ш], [ч], [дж] набываюць шыпячае адценне, таму іх называюць **шыпячымі**. Зычныя [з], [з'], [с], [с'], [ц], [ц'],[дз], [дз'] набываюць свісцячае адценне і называюцца **свісцячымі**.

**Сярэднеязычныя** ўтвараюцца збліжэннем сярэдняй часткі языка з цвёрдым паднябеннем; такім у беларускай і рускай мовах ёсць гук [j]. З улікам пасіўнага маўленчага органа – паднябення (цвёрдага) іх называюць сярэднепаднябеннымі, або **палатальнымі** (лац. *palatum* 'паднябенне').

**Заднеязычныя** вымаўляюцца пры збліжэнні або змыканні задняй часткі спінкі языка з мяккім паднябеннем. Гэта гукі [г], [г'], [к'], [к], [х'], [х], [γ], [γ'].

IV. Паводле **спосабу ўтварэння** зычныя бываюць: а) змычна-выбухныя, б) шчылінна-працяжныя, в) змычна-шчылінныя (злітыя, афрыкаты); г) змычна-праходныя, д) вібранты. Пры характарыстыцы зычных паводле спосабу ўтварэння ўлічваецца як іх артыкуляцыйная адметнасць (змыканне органаў маўлення ці набліжэнне іх адзін да аднаго, утвараючы шчыліну), так і акустычная (слыхавое ўражанне).

**Змычныя (выбухныя)** ўтвараюцца пры поўным змыканні органаў маўлення і імгненным разрыве змычкі, у выніку чаго ўзнікае выбух. Гэта [б], [б'], [д], [т] [п], [п'], [к], [к'], [г], [г'].

**Шчылінныя (шчылінна-працяжныя)** гукі ўтвараюцца пры набліжэнні актыўнага органа маўлення да пасіўнага; праз утвораную імі шчыліну праходзіць паветра, трэцца аб яе сценкі; гэтыя гукі можна працяжна вымавіць, таму іх называюць працяжнымі (у адрозненне ад імгненных), а таксама **фрыкатыўнымі** (лац. *fricare* 'церці'). Гэта гукі [в], [в'], [ф], [ф'], [з], [з'], [ў], [j], [ж], [ш], [с], [с'], [γ], [γ'], [х], [х'].

**Змычна-шчылінныя** гукі (**афрыкаты** ад лац. *affricata* 'прыцёртая') утвараюцца складанай артыкуляцыяй: спачатку органы маўлення змыкаюцца, а затым плаўна размыкаюцца, утвараючы шчыліну, праз якую праходзіць выдыханае паветра, тручыся аб яе сценкі. Гэтыя складанай артыкуляцыі гукі маюць змычную пачатковую фазу (экскурсію) і шчылінную канцавую фазу (рэкурсію); яны складаюцца з двух гукаў, злітых у адзін, на што паказвае і літарнае абазначэнне некаторых з іх у беларускай, польскай і іншых мовах. Аднак гэтыя злітыя гукі маюць артыкуляцыю аднаго гука, а не двух: [дз], [дз'], [дж], [ц], [ц'], [ч].

**Змычна-праходныя** зычныя – гукі, пры ўтварэнні якіх адны органы маўлення змыкаюцца, а іншыя ўтвараюць праход для струменю паветра; выдыханае паветра можа разрываць змыканыя органы і праходзіць у поласць носа, як пры вымаўленні гукаў [м], [м'], [н], [н'], або не разрываць іх, свабодна праходзячы па баках языка, як пры ўтварэнні гукаў [л], [л']. У адпаведнасці з артыкуляцыяй гэтыя гукі называюцца **насавымі**, або **назальнымі** (лац. *nazalis* насавы) ці **бакавымі**, або **латэральнымі** (лац. *lateralis* 'бакавы'). Бакавыя называюць таксама **ротавымі** (утвараюцца ў поласці рота, а не носа).

**Вібранты (дрыжачыя)** (лац. *vibrans, vibrantis* 'дрыготкі') – зычныя гукі, якія ўзнікаюць як вынік вібрацыі артыкуляцыйнага органа (пярэдняй часткі спінкі языка або увулы (язычка). Да вібрантаў належыць [р].

### 2.5.2. Артыкуляцыйная класіфікацыя галосных

Асноўнай артыкуляцыйнай асаблівасцю галосных, у адрозненне ад зычных, з'яўляюцца адсутнасць перашкоды на шляху выдыхаемага паветра, слабы паветраны струмень і абавязковая работа галасавых звязак.

Дзякуючы рытмічным ваганням галасавых звязак утвараецца музычны тон, голас. Музычны тон суправаджаецца абертонамі, або дадатковымі тонамі. Змяненне аб'ёму і формы рэзанатараў у выніку рухаў языка і рознага становішча губ выклікае змяненне абертонаў, якія надаюць кожнаму галоснаму своеасаблівы тэмбр. Гэтым і абумоўліваецца адрозненне паміж галоснымі.

Такім чынам, класіфікацыя галосных праводзіцца ў залежнасці ад артыкуляцыі губ і языка.

Паводле артыкуляцыі губ галосныя падзяляюцца на лабіялізаваныя і нелабіялізаваныя. Пры вымаўленні **лабіялізаваных** галосных губы зближаюцца, акругляюцца і крыху выцягваюцца ўперад, павялічваючы тым самым ротавы рэзанатар. Гэта надае гукам спецыфічную губную афарбоўку: *[о], [у]*. Пры ўтварэнні **нелабіялізаваных** галосных губы пасіўныя, таму гэтыя гукі не маюць губной афарбоўкі: *[а], [і], [ы], [э]*.

Паводле артыкуляцыі языка вызначаюцца спосаб утварэння і месца

ўтварэння галосных гукаў. Паводле спосабу ўтварэння галосныя падзяляюцца ў залежнасці ад ступені пад'ёму языка па вертыкалі. Адрозніваюцца тры ступені пад'ёму, інакш – тры пад'ёмы: верхні, сярэдні, ніжні.

Пры вымаўленні галосных **верхняга пад'ёму** язык у поласці рота займае самае высокае становішча. Ніжняя сківіца крыху апускаецца, ствараючы вузкую шчыліну паміж зубамі, таму галосныя верхняга пад'ёму называюцца вузкімі, або закрытымі: *[і], [ы], [у]*. Артыкуляцыя галосных **ніжняга пад'ёму** адбываецца пры шырокім адкрыцці рота, таму галосныя ніжняга пад'ёму называюць шырокімі. Язык у поласці рота займае самае нізкае становішча: *[а]*. Пры прамежкавым, сярэднім, пад'ёме языка ўтвараюцца галосныя **сярэдняга пад'ёму:** *[о], [э]*.

Месца ўтварэння галосных гукаў залежыць ад рухаў языка па гарызанталі ў напрамку да пярэдніх зубоў і ад таго, якая частка языка актыўна артыкулюе. У адпаведнасці з гэтым вылучаюцца галосныя пярэдняга, сярэдняга і задняга рада. Пры вымаўленні галосных **пярэдняга рада** найбольш актыўны ўдзел у артыкуляцыі прымае пярэдняя частка языка, кончык языка набліжаецца да ніжніх зубоў: *[і], [э]*. Галосныя **сярэдняга рада** ўтвараюцца, калі язык займае сярэдняе, нейтральнае становішча і актыўна артыкулюе сярэдняй часткай: *[ы], [а]*. Галосны *[а]* можна разглядаць і як гук сярэдня-задняга рада. Пры вымаўленні галосных **задняга рада** язык адцягнуты назад, а найбольш актыўна артыкулюе яго задняя частка: *[о], [у]*.

Такім чынам, кожны галосны гук можна ахарактарызаваць па сукупнасці яго трох асноўных прымет: 1) удзелу ў артыкуляцыі губ (лабіялізаваны-нелабіялізаваны), 2) пад'ёму, 3) рада. Напрыклад: *[у]* – лабіялізаваны, верхняга пад'ёму, задняга рада; *[э]* – нелабіялізаваны, сярэдняга пад'ёму, пярэдняга рада.

**Артыкуляцыйная класіфікацыя галосных**

| | Рад | | |
|---|---|---|---|
| Пад'ём | пярэдні | сярэдні | задні |
| | Нелабіялізаваныя | | Лабіялізаваныя |
| Верхні | **[і]** | **[ы]** | **[у]** |
| Сярэдні | **[э]** | | **[о]** |
| Ніжні | | **[а]** | |

Можна вылучыць таксама **акустычную класіфікацыю** гукаў. У аснове акустычнай класіфікацыі гукаў ляжаць аб'ектыўныя акустычныя ўласцівасці гукаў, выяўленыя пры дапамозе спецыяльных электраакустычных прыбораў па дыхатамічным прынцыпе.

Асноўныя акустычныя ўласцівасці гукаў прадстаўлены ў выглядзе

дыхатамічных, двухчленных, праціпастаўленняў. Пры апісанні гукаў беларускай мовы істотнымі з'яўляюцца 9 пар акустычных прымет: вакальнасць / невакальнасць, кансанантнасць / некансанантнасць, дыфузнасць / кампактнасць, нізкая танальнасць і высокая танальнасць, бемольнасць / небемольнасць, дыезнасць / недыезнасць, перарванасць / неперарванасць, рэзкасць / нярэзкасць, звонкасць / глухасць. Усе гэтыя акустычныя прыметы, паводле якіх праводзіцца класіфікацыя, маюць выразныя адпаведнасці ў спектры гука і разам з тым яны пэўным чынам суадносяцца з артыкуляцыйнай характарыстыкай гукавых адзінак.

### 2.6. Змены гукаў у моўнай плыні

Пры напісанні раздзела быў выкарыстаны матэрыял дапаможніка «Сцяцко П.У. Уводзіны ў мовазнаўства: Дапаможнік. – Гродна: ГрДУ, 2001. – 231 с.».

Паколькі гукі вымаўляюцца не ізалявана, а ў гукавым ланцугу, то яны могуць змяняць свае якасці пад уплывам суседніх гукаў або агульных умоў вымаўлення. Такія змены называюцца **фанетычнымі**, бо абумоўлены фанетычным прычынамі: або ўздзеяннем суседняга гука, або націску або паўзы (калі гук стаіць у пачатку ці ў канцы слова). Фанетычныя змены ў залежнасці ад умоў праяўлення падзяляюцца на камбінаторныя і пазіцыйныя. Для беларускай мовы характэрнымі фанетычнымі працэсамі з'яўляюцца акамадацыя, асіміляцыя, дысіміляцыя, рэдукцыя, метатэза, пратэза, эпентэза, дыярэза, гаплалогія, кантракцыя.

**Камбінаторнымі** з'яўляюцца змены, якія ўзніклі пад уздзеяннем суседняга гука. Звязаны такія змены з работай органаў мовы. Перад вымаўленнем кожнага наступнага гука органы мовы не вяртаюцца ў зыходнае становішча, як пры вымаўленні ізаляванага гука, а паступова перабудоўваюцца для ўтварэння наступнага гука. Кожны гук моўнай плыні складаецца з экскурсіі (пачатковага ўчастка), вытрымкі (найбольш характэрнай часткі гучання) і рэкурсіі (канцавога ўчастка). Таму ў моўнай плыні часта атрымліваецца так, што артыкуляцыі суседніх гукаў часткова супадаюць, г. зн. экскурсія або рэкурсія аднаго гука можа зліваецца з экскурсіяй або рэкурсіяй другога гука. Такое «накладанне» артыкуляцый суседніх гукаў прыводзіць да іх узаемапрыстасавання; адаптацыі. Так, напрыклад, пры вымаўленні зубных выбухных *[т, д]* перад пярэднепаднябеннымі *[ш, ж]* кончык языка, рыхтуючыся да вымаўлення наступнага шчыліннага, датыкаецца не да зубоў, а да альвеол. У выніку на месцы *[т, д]* перад *[ш, ж]* вымаўляюцца пярэднепаднябенныя афрыкаты *[ч, ǯ]: мало[чш]ы, а[ǯж]аць (малодшы, аджаць).*

Камбінаторныя змены здзяйсняюцца ў такіх фанетычных працэсах, як акамадацыя, асіміляцыя, дысіміляцыя.

**Акамадацыя** (лац. *accomodatio* 'прыстасаванне') – узаемадзеянне

суседніх разнатыпных гукаў зычных і галосных, частковае прыстасаванне артыкуляцыі зычных да галосных і наадварот. Гэтае прыстасаванне ўзнікае ў выніку накладання рэкурсіі папярэдняга гука на экскурсію наступнага гука; гэтае ўздзеянне, аднак, адбываецца паміж разнатыпнымі гукамі, таму суседнія гукі змяняюцца толькі часткова і не становяцца іншымі гукамі (фанемамі).

Найбольш часта пры акамадацыі вылучаюць: 1) уплыў галосных на вымаўленне зычных: пярэднія галосныя [і], [э] уплываюць на зычныя змякчаюць іх (палаталізуюць): *дом [дом] домік [дом'ік], пры доме [дом'э]*; 2) уплыў мяккіх зычных на галосныя, у выніку чаго апошнія становяцца больш вузкімі і закрытымі, асабліва ў іх становішчы паміж двума мяккімі зычнымі. Параўнайце вымаўленне гука [а] у словах *мата, мята* і *мяць*: у першым слове [мата] гук [а] вымаўляецца найбольш выразна (амаль так, як ізаляваны [а]), у другім [м'ата] менш выразна, як больш вузкі гук у пачатку яго вымаўлення (абазначаецца кропкай злева над літарай), а ў трэцім [м'äц'] яшчэ больш вузка (абазначаецца дзвюма кропкамі справа і злева над літарай), бо на яго вымаўленне ўздзейнічаюць і мяккі гук перад ім, і мяккі гук пасля яго.

**Асіміляцыя** (лац. *assimilatio* 'прыпадабненне') гэта адзін з найбольш пашыраных відаў камбінаторных зменаў гукаў: артыкуляцыйнае і акустычнае прыпадабненне ў маўленні гукаў аднаго тыпу (галосных да галосных, зычных да зычных) у межах слова і словазлучэння. Напрыклад: *ка[с']іць і ка[з']ба* прыпадабненне глухога [с'] да звонкага [б] і пераход у парны па звонкасці-глухасці [з']; *пад колы [пат-колы]*.

Асіміляцыя мае некалькі відаў паводле наступных адзнакаў: 1) выніку (ступені) прыпадабнення: поўная і няпоўная (частковая), 2) адлегласці гукаў: кантактавая (сумежная) і дыстактавая (несумежная), 3) кірунку: прагрэсіўная і рэгрэсіўная. Пры **поўнай асіміляцыі** адзін гук цалкам прыпадабняецца да другога, у выніку чаго звычайна з былых двух гукаў утвараецца адзін доўгі гук: *з жыта [жжыта], кулямётчык [кул'ам'оччык], купаешся [купајэс'с'а], сшытак [шшытак]*; Пры **няпоўнай асіміляцыі** адзін гук прыпадабняецца да іншага толькі часткова, звычайна па адной прымеце: звонкасці або глухасці, цвёрдасці або мяккасці. Напрыклад, у слове *просьба [проз'ба]* глухі [с] набыў перад звонкім [б] звонкасць і ператварыўся ў парны звонкі [з]; у словаформах *казна – казне* цвёрды [з] стаў мяккім [з] у выніку асіміляцыі па мяккасці [каз'н'э].

Пры **кантактавай** (лац. *contactus* 'датыканне') асіміляцыі прыпадабняюцца сумежныя гукі; такая асіміляцыя найбольш пашыраная (гл. папярэднія прыклады); пры **дыстактавай** (лац. *dis* 'раз' і *tactum* 'датыкацца') прыпадабняюцца гукі несумежныя, г.зн. раздзеленыя іншымі гукамі; такая асіміляцыя рэдкая ў мове, сустракаецца ў прастамоўі і

народных гаворках: *[л]аба[р]аторыя – [л]аба[л]аторыя, [к]а[т]лета – [к]а[к]лета.*

**Прагрэсіўная** асіміляцыя (лац. *progressus* 'рух наперад') – гэта прыпадабненне наступнага гука да папярэдняга. Вынікам прагрэсіўнай асіміляцыі ёсць падаўжэнне канцавога гука ў аснове зборных назоўнікаў, калі да асновы адзіночнага ліку далучаецца суфікс зборнасці [j]: *звер – звяр'ё [зв'арjо] і варона – вараннё [варан'н'о].* Або асіміляцыя суфікса -j- пры прыставачна-суфіксальным утварэнні назоўнікаў з прасторавым значэннем: г*ара – уз'гор'е [узгорjэ] і мяжа – узмежжа, лес – палессе*. **Рэгрэсіўная** (лац. *regressio* 'рух назад') – прыпадабненне папярэдняга гука да наступнага: наступны гук уплывае на папярэдні і робіць яго падобным да сябе. Так, у слове *касьба [каз'ба]* звонкі гук [б] уздзейнічаў на папярэдні глухі гук [с'] і ператварыў яго ў звонкі [з'].

**Дысіміляцыя** (лац. *dissimilatio* 'распадабненне') – фанетычны працэс, адваротны асіміляцыі, калі адбываецца распадабненне гукаў: замена ў слове аднаго з аднолькавых ці блізкіх гукаў іншым, менш падобным. Напрыклад, у прастамоўным *транвай* (літар. *трамвай*) на месцы двух губных гукаў [мв] узнік адзін негубны – пярэднеязычны [н]. Або ў дыялектным *піднаваць* (літар. *пільнаваць*) адбылося распадабненне двух сумежных змычна-праходных [л] і [н]: замест першага з іх гука [л] з'явіўся змычны [д]. У літаратурнай мове ў выніку дысіміляцыі з даўнейшых спалучэнняў *тт* і *дт* узніклі *сц(ст): мяту* і *месці, пляту* і *плесці, іду* і *ісці*: каранёвы гук [т] або [д] перад інфінітыўным паказчыкам *ти* распадабніўся: са змычна-выбухнога [т] або [д] (ён перш аглушыўся ў [т]), узнік працяжна-шчылінны [с].

Сярод гукаў, якія ўзаемадзейнічаюць паміж сабой, адрозніваюць актыўны (які ўздзейнічае) і пасіўны (на які ўздзейнічае іншы гук). Напрамак уздзеяння можа быць розным – ад пачатку слова да яго канца і наадварот. Уздзеянне, што ідзе ад папярэдняга гука на наступны, называецца **прагрэсіўным** (уздзеянне наперад). Уздзеянне наступнага гука на папярэдні называецца **рэгрэсіўным** (уздзеянне назад) .

**Пазіцыйныя змены** гукаў залежаць ад агульных умоў вымаўлення, або фанетычнай пазіцыі гука ў слове, напрыклад пазіцыі адносна месца націску (для галосных), пазіцыі пачатку і канца слова. Так, націскныя галосныя адрозніваюцца ад ненаціскных большай напружанасцю артыкуляцыі, большай даўжынёй і гучнасцю. У ненаціскным становішчы галосныя з-за вялай артыкуляцыі моўных органаў у той ці іншай ступені трацяць сваю выразнасць. Таму не пад націскам галосныя становяцца больш кароткімі, чым пад націскам *(л[у]г – л[у]гавы, тр[а]вы – тр[а]ва),* або зусім змяняюць сваю якасць *(к[о]лас – к[а]ласы, р[э]кі – р[а]ка).* Такое змяненне колькасных і якасных характарыстык галосных

называецца адпаведна колькаснай або якаснай рэдукцыяй.

**Рэдукцыя** (лац. *reductio* 'памяншэнне, скарачэнне') – паслабленне, змяненне гучання ненаціскных складоў (гукаў у слабай пазіцыі). Яна выклікана тым, што ў мовах з інтэнсіўным (моцным) дынамічным націскам асноўнае напружанне прыпадае на націскны склад, а ненаціскныя склады маюць больш «вялую», ненапружаную артыкуляцыю. Рэдукцыі найперш падлягаюць галосныя гукі (як вяршыні складу) у слабай пазіцыі не пад націскам. Адрозніваюць рэдукцыю колькасную і якасную. Пры **колькаснай рэдукцыі** галосныя менш напружаныя і карацейшыя, але якасць іх, тэмбр захоўваюцца: *сад – садок – садавіна*. Пры **якаснай рэдукцыі** ненаціскныя галосныя змяняюць свой тэмбр, якасць і супадаюць з іншым гукам: ненаціскныя галосныя сярэдняга пад'ёму [о], [э], якія вымаўляюцца як [а]: *воды – вада, вадаспад, шэсць – шаснаццаць*.

Пазіцыяй канца і пачатку слова (дакладней, уздзеяннем паўз) абумоўлена аглушэнне звонкіх шумных зычных у канцы слова і ўзнікненне прыстаўных гукаў. Фанетычныя змены ў залежнасці ад іх вынікаў падзяляюцца на частковыя і поўныя. Пры **частковых фанетычных зменах** змяняюцца толькі асобныя бакі якасцяў гука, у выніку чаго ўтвараюцца пэўныя разнавіднасці, або мадыфікацыі, аднаго і таго ж гука. Частковыя камбінаторныя змены праяўляюцца звычайна ў акамадацыі. Напрыклад, у спалучэннях «зычны + галосны» на характар вымаўлення зычнага можа ўплываць наступны галосны – рэгрэсіўная акамадацыя (параўн. вымаўленне гукаў *[к]* і *[к°]* у словах *[каса] – [к°осы]; [с]* і *[с°]: [са]д – [с°у]д* – перад лабіялізаванымі галоснымі зычныя лабіялізуюцца). Для галосных істотным з'яўляецца ўздзеянне папярэдняга зычнага – прагрэсіўная акамадацыя (напрыклад, суседства з губнымі зычнымі выклікае лабіялізацыю галосных, параўн. *[ба]к – [ла]к;* насавыя зычныя надаюць галоснаму насавое адценне, параўн.: *[н'о]с – [л'о]с*; пасля мяккіх зычных галосныя набываюць больш пярэднюю артыкуляцыю *[во]з – [в'·о]з, [лу]к – [л' ·у]к.* У транскрыпцыі гэтыя адценні не адзначаюцца.

Частковыя пазіцыйныя змены галосных праяўляюцца ў колькаснай рэдукцыі, калі галосныя не пад націскам крыху скарачаюцца, але сваю асноўную якасць захоўваюць. Як відаць, ва ўсіх прыведзеных прыкладах пры частковых фанетычных зменах якасць гука застаецца нязменнай, утвараюцца толькі камбінаторныя адценні, або пазіцыйныя разнавіднасці, якія носьбіты мовы, як правіла, не заўважаюць.

Пры **поўных фанетычных зменах** якасць гука змяняецца настолькі, што ён супадае з іншым гукам. Гэты від фанетычных змен называюць інакш, пазіцыйнай менай гукаў. Поўныя камбінаторныя змены праяўляюцца ў асіміляцыі – поўнай (два розныя гукі прыпадабняюцца

поўнасцю, становяцца аднолькавымі) і няпоўнай (адзін гук прыпадабняецца да другога па якой-небудзь прымеце: спосабе або месцы ўтварэння (*лё[чч]ык (лётчык)*), звонкасці-глухасці (*ры[пк]а (рыб-ка), ка[ск]а (казка)*), цвёрдасці-мяккасці (*[дв]а ([z'в']е), мо[ст] (мо[с'ц']ік*)), а таксама ў дысіміляцыі зычных.

Фанетычныя змены дысімілятыўнага характару сустракаюцца рэдка ў літаратурнай мове, яны ўласцівы пераважна неўнармаванаму маўленню (дыялекты, прастамоўе, мова дзяцей), напрыклад: *пра[л]убка* замест *пра[р]убка* (прагрэсіўная дысіміляцыя), *тра[н]вай* замест *тра[м]вай* (рэгрэсіўная дысіміляцыя).

Поўныя пазіцыйныя змены зычных абумоўлены пазіцыяй канца слова. Так, звонкія зычныя змяняюцца на глухія ў канцы слова (перад паўзай). Гістарычна гэта мена таксама звязана з падзеннем рэдукаваных. Да страты рэдукаваных кожнае слова канчалася галосным.

Поўныя пазіцыйныя змены галосных (пазіцыйная мена галосных) з'яўляюцца вынікам іх якаснай рэдукцыі, калі галосныя не пад націскам страчваюць сваю асноўную якасць і вымаўляюцца як іншы гук. У беларускай мове якасную рэдукцыю зведваюць галосныя сярэдняга пад'ёму *[о], [э],* якія ў ненаціскным становішчы вымаўляюцца як [а]: *л[о]м – л[а]мы, ш[э]пт – ш[а]птаць.* Неадрозненне гукаў *[о], [э], [а]* у ненаціскным становішчы называецца **аканнем.** Тут тэрмін «аканне» ўжыты ў шырокім значэнні. У лінгвістычнай літаратуры гэты тэрмін ужываецца і ў больш вузкім значэнні, калі ён абазначае супадзенне адзначаных галосных у ненаціскным становішчы ў гуку *[а]* пасля цвёрдых зычных, а таксама ў пачатку слова і пасля галосных. Для абазначэння гэтай з'явы пасля; мяккіх зычных ужываецца тэрмін «яканне». **Яканне** – гэта змяненне гукаў *[о], [э]* на *[а]* пасля мяккіх зычных у першым пераднаціскным складзе.

Такім чынам, поўныя фанетычныя змены зычных і галосных гукаў, як правіла, адбываюцца ў строга акрэсленых фанетычных умовах і маюць абавязковы характар для ўсіх носьбітаў мовы. Менавіта яны ў значнай ступені ствараюць спецыфіку фанетычнай сістэмы беларускай мовы.

Пераважная частка адзначаных фанетычных змен у сучаснай беларускай мове мае характар чаргавання, г. зн. у выніку такіх змен у розных формах аднаго і таго ж слова ўзнікаюць гукавыя чаргаванні.

Акрамя разгледжаных відаў фанетычных змен, існуюць і іншыя, напрыклад, сцяжэнне гукаў на стыку марфем, спрашчэнне груп зычных, развіццё прыстаўных гукаў і інш. Многія з іх маюць асімілятыўную або дысімілятыўную аснову і гістарычна таксама звязаны з падзеннем рэдукаваных галосных. Гэтыя змены ў чаргаванні не выліваюцца.

**Сцяжэнне гукаў (кантракцыя)** – фанетычная з'ява, у выніку якой два аднолькавыя або блізкія ў якіх-небудзь адносінах гукі сцягваюцца ў адзін. У сучаснай беларускай мове сцягваюцца звычайна зычныя гукі, якія знаходзяцца на стыку кораня і суфікса. Сцяжэнне адбываецца ў спалучэннях каранёвых *[д], [т], [з], [с], [ц], [ж], [ш], [ч], [к]* з суфіксальным *[с],* у выніку чаго на іх месцы ўзнікаюць гукі *[с]* і *[ц]: [зс – с]: каўка[з + с] – каўка[с]кі; [кс – ц]: батра[к + с]кі – батра[ц]кі.* Непасрэднае сцяжэнне, такім чынам, адбываецца толькі ў спалучэнні *[сс].* Ва ўсіх астатніх спалучэннях адбываецца рэгрэсіўная асіміляцыя, а затым сцяжэнне.

Спрашчэнне гукавых спалучэнняў, або **дыярэзы** (выкідкі), – фанетычная з'ява, пры якой з этымалагічных трох- і чатырох гукавых спалучэнняў зычных выпадаюць асобныя гукі, звычайна гэта пачатковыя або сярэдзінныя гукі *[т], [д], [л]: позна, сэрца, сонца, расліна* і інш. Выпадзенне зычных гукаў з'яўляецца вынікам страты былых рэдукаваных.

Спрашчацца можа слова і за кошт выпадзення аднаго з двух аднолькавых яго складоў. Гэты фанетычны працэс называецца **гаплалогіяй** (грэц. *gaplos* 'просты' і *logos* 'слова'): *мінералогія (з мінералалогія), трагікамедыя (з трагікакамедыя), марфаналогія (з марфафаналогія).*

Дыярэзе і гаплалогіі супрацьстаяць эпентэза і пратэза. **Эпентэза** (грэц. *epenthesis* 'устаўка') – устаўка гука ў сярэдзіну слова з мэтай палегчыць яго вымаўленне пры збегу зычных ці галосных. У беларускай мове эпентэза мае дзве рэалізацыі. 1) У канцавым (фінальным) складзе збег зычных (з санорным ці двума санорнымі) падзяляецца галосным гукам [э] ці [а]: *карабель, журавель, горан* (параўн. руск. *корабль, журавль, горн*); а ў жывой народнай мове *літар, метар, цэнтар* ды інш. 2) Збег галосных *іо, іа, іу, эа* ў іншамоўных словах падзяляецца ў беларускай мове зычнымі [j], [в] (радзей): biologia – біялогія, ocean – акіян, dialog – дыялог, Leon – Лявон.

**Пратэза** (грэц. *prothesis* 'далучэнне, падстаноўка') – узнікненне гука ў пачатку слова. У беларускай мове пратэза мае два віды: 1) **Вакалічная пратэза** – узнікненне галоснага [і] або [а] перад збегам зычных з пачатковым санорным гукам: *[і]мгла, [і]льну, [і]ржа, [а]ржаны.* 2) **Кансанантавая пратэза** – узнікненне зычнага [в] ці [г] перад пачатковымі галоснымі [о] ці [у], [э]: *[в]ока, [в]осем, [г]эты, [г]эй.*

**Метатэза** (грэц. *metathesis* 'перастаноўка') – фанетычны працэс перастаноўкі гукаў або складоў у слове; звычайна ўласцівы пазычанням, калі ў іх нязвычныя спалучэнні гукаў замяняюцца больш блізкімі да роднай мовы. Напрыклад, у гаворках у слове *інстытут* нязвыклае пачатковае спалучэнне [ін] перайшло ў [ні]: *ністытут*; слова *шасе*

ператварылася ў *саша*.

Сцяжэнне гукаў фанетычны працэс зліцця (сцяжэння) двух аднолькавых ці блізкіх гукаў у адзін; пры сцяжэнні неаднолькавых гукаў перш адбываецца іх прыпадабненне, а затым яны, стаўшы аднолькавымі, зліваюцца ў адзін гук. Напрыклад, у слове *прыгоства*, якое ўтварылася ад прыметніка *прыгожы* з дапамогаю суфікса *ств(а)*, апошні зычны ўтваральнай асновы [ж] перад глухім [с] асіміляваўся ў парны глухі [ш], а пазней спалучэнне [шс] у выніку прыпадабнення альвеолавага [ш] да зубнога [с] дало [сс], якое сцягнулася ў [с]: [жс > шс > сс > с]: прыгожства > прыгошства > прыгосства > прыгоства.

### 2.7. Пазіцыйныя і гістарычныя чаргаванні гукаў

Пры напісанні раздзела быў выкарыстаны матэрыял падручніка «Беларуская мова. У 2 ч. Ч. 1. Фанетыка. Арфаэпія. Графіка. Арфаграфія. Лексікалогія. Фразеалогія. Марфемная будова слова і словаўтварэнне. Марфалогія: Падручнік / Я.М. Адамовіч, Л.А. Акаловіч, Г.Ф. Андарала і інш.: Пад агул. рэд. Л.М. Грыгор'евай. – 4-е выд., перапрац. і дап. – Мн.: Выш. шк., 2001. – 318 с.».

Пры змене граматычнай формы слова або пры словаўтварэнні ў адной і той жа марфеме аднакарэнных слоў адзін гук можа замяняцца другім. Змена гукаў у аснове аднакарэнных слоў называецца **чаргаваннем**. Чаргаванні бываюць пазіцыйныя і гістарычныя.

#### 2.7.1. Чаргаванні галосных гукаў

Пазіцыйныя чаргаванні галосных гукаў звязаны з іх пазіцыяй адносна націску. Да пазіцыйных чаргаванняў адносяцца чаргаванні націскных гукаў з ненаціскнымі:

[о] – [а]: *горы – гара, вёсны – вясна [в'осны – в'асна]*;

[э] – [а]: *рэкі – рака, зелень – зялёны [з'эл'эн'] – [з'ал'оны]*.

Пазіцыйныя чаргаванні вынікаюць з фанетычных законаў, што дзейнічаюць у сучаснай мове. Так, чаргаванне гукаў [о] – [а], [э] – [а] звязана з законам акання.

Гістарычныя чаргаванні – вынік дзейнасці моўных законаў, што існавалі ў старажытныя часы. Гэтых законаў у сучаснай мове няма. Гістарычныя чаргаванні не могуць быць растлумачаны законамі сучаснай мовы. Да гістарычных чаргаванняў адносяцца:

[э(е)] – [о]: *везці* [в'эс'ц'і] – *воз, плесці* [пл'эс'ц'і] – *плот;*

[о] – [ы] (у спалучэннях *ро, ло ры, лы): кроў – крыві, дровы – дрывотня, глотка – глытаць;*

[э(е)] – [і]: *свет* [с'в'эт] – *світанне, выберу* [выб'эру] – *выбіраць;*

[о] – [і] – [е]: *здор – здзіраць – здзерці;*

[у] – [о] – [ы]: *сухі – сохнуць – высыхаць;*

[е] – [і] – нуль гука: *выберу – збіраць – браць;*

[j] – [і]: *б'еш [бjеш] – біць, льеш [лjеш] – ліць;*

[ав] – [у]: *снаваць – сную, каваць – кую;*

[а] – [у]: *вязаць [в'азац'] – вузел, запрагаць – папруга;*

[а(я)] – [н]: *жаць – пожня, мяць – мну;*

[а(я)] – [ім]: *зняць – зніму;*

[о], [а], [э] – нуль гука: *сон – сну, пазногаць – пазногця, пень – пня* [п'эн' – **пн**'а].

Чаргаванне [о, а, э] з нулём гука называецца **бегласцю галосных**. Гэта старажытная з'ява ўзнікла ў выніку падзення рэдукаваных [ъ] (ёр), [ь] (ер) (2-я палова XII ст).

### 2.7.2. Чаргаванні зычных гукаў

Да **пазіцыйных** чаргаванняў зычных гукаў адносяцца чаргаванні звонкіх і глухіх у сярэдзіне слова. Такія чаргаванні ўзніклі ў выніку асіміляцыі.

1) Чаргаванні звонкіх і глухіх, што ўзніклі ў выніку аглушэння звонкіх на канцы слова: *дубы – дуб* [дуп], *галубы – голуб* [γолуп]; *сядзіць – сядзь* [с'ац'], *лебедзі – лебедзь* [л'эб'эц'], *дажджы – дождж* [дошч].

2) Чаргаванні цвёрдых і мяккіх зычных, што ўзніклі ў выніку асіміляцыі зычных па мяккасці і змякчэнні зычных перад [е], [і]: *збор – збіраць* [**з'б'**іраң'], *прызба – прызбе* [прыз**'б'**э]; *дарослы – расці* [ра**с'**ц'і], *ку[т] – у ку[ц']е,* за[в]у – за[в']е.

3) Чаргаванні заднеязычных па мяккасці перад [і]: *цёт[к]а – цёт[к']і, гана[к] – ган[к']і, эпо[х]а – эпо[х']і.*

Да **гістарычных** чаргаванняў зычных адносяцца чаргаванні 1) заднеязычных з шыпячымі:

[γ] – [ж]: *бера[γ]ам – бера[ж]ок, даро[γ]а – даро[ж]ны;*

[к] – [ч]: *кры[к] – кры[ч]аць, су[к] – су[ч]ок;*

[х] – [ш]: *стра[х] – стра[ш]ыць, пу[х] – пу[ш]ысты;*

2) заднеязычных са свісцячымі:

[γ] – [з']: *плу[γ]а – у плу[з']е, ва[γ]а – ва[з']е;*

[х] – [с']: *стра[х]а – на стра[с']е, блы[х]а – аб блы[с']е,*

[к] – [ц]: *му[к]а – у му[ц]э, ра[к]а – на ра[ц]э;*

3) губных з губнымі + [л']:

[б], [б'] – [бл']: *лю[б]оў, лю[б']іць – лю[бл']ю;*

[п], [п'] – [пл']: *паку[п]ка, ку[п']іць – ку[пл']ю;*

[в], [в'] – [ўл']: *сла[в]а, сла[в']іць – сла[ўл]ю;*

[м], [м'] – [мл']: кар[м]авы, кар[м']іць – кар[мл']ю;

[ф], [ф'] – [фл']: гра[ф]а, гра[ф']іць – гра[фл']ю;

4) [л] – [ў]: малацi[л]а – малацi[ў], малява[л]а – малява[ў].

## 2.8. Склад і складападзел

Наша мова складаецца з гукаў, але гукі не вымаўляюцца асобна. Найменшымі артыкуляцыйнымі адрэзкамі, на якія можна расчляніць паўзамі моўную плынь, з'яўляюцца склады.

Абавязковым элементам склада з'яўляецца адзін складаўтваральны (складовы) гук, да якога прымыкаюць нескладовыя. Склады і складападзел не звязаны з сэнсам, г. зн. склад не з'яўляецца сэнсавай, фаналагічнай адзінкай, ён толькі ўдзельнічае ў вымаўленчай арганізацыі мовы.

У лінгвістычнай літаратуры існуе некалькі тэорый склада. Найбольш пашыранымі з'яўляюцца: экспіраторная тэорыя, тэорыя мускульнага напружання і санорная тэорыя. Прыхільнікі **экспіраторнай**, або артыкуляцыйнай, тэорыі вызначаюць склад як спалучэнне гукаў, што вымаўляюцца адным штуршком выдыхаемага паветра. Мяжой складоў з'яўляецца момант самага слабага выдыху. Гэта тэорыя, аднак, не можа растлумачыць некаторыя факты. Так, эксперыментальныя даследаванні паказваюць, што колькасць складоў не заўсёды супадае з колькасцю выдыхальных штуршкоў. Напрыклад, аднаскладовае слова *кпіць* мы вымаўляем двума штуршкамі выдыхаемага паветра, а двухскладовае слова *ау* – адным выдыхальным штуршком. Акрамя таго, з пазіцый экспіраторнай тэорыі цяжка ажыццяўляць складападзел пры збегу зычных гукаў.

Другая тэорыя, тэорыя **мускульнага напружання**, вызначае склад як гукавы адрэзак, які вымаўляецца адным імпульсам мускульнага напружання моўнага апарата. Кожны імпульс складаецца з трох фаз: узрастання напружання, яго максімуму і спаду. Разам з узмацненнем або спадам напружанасці ўзмацняецца або аслабляецца гучнасць. Межы паміж складамі адпавядаюць найменшаму ўзроўню мускульнага напружання і гучнасці. Паводле гэтай тэорыі, складападзел у адным і тым жа слове можа адбывацца па-рознаму, паколькі ён залежыць ад таго, як чалавек узмацняе ці аслабляе мускульнае напружанне: *кар-дон* і *ка-рдон, зор-ка* і *зо-рка.*

Найбольшае пашырэнне атрымала ў апошні час **санорная** тэорыя склада, заснаваная на акустычных крытэрыях. Згодна з тэорыяй санорнасці, склад – гэта хваля санорнасці (гучнасці). Склад утвараюць гукі рознай ступені гучнасці. Найбольш гучны, які з'яўляецца вяршыняй санорнасці, – складовы гук, астатнія гукі нескладовыя. Галосныя, як найбольш гучныя гукі, звычайна бываюць складовымі. Зычныя з'яўляюцца нескладовымі гукамі. Паводле ступені гучнасці гукі можна абазначыць лічбамі: галосныя – 4, санорныя зычныя – 3, звонкія шумныя – 2, глухія шумныя – 1. Напрыклад, слову *ра-да-сны* будзе адпавядаць

наступны рад: 34-24-134, слову *кадр* – 1423. Колькі вяршынь санорнасці, столькі складоў. Кожны склад характарызуецца паступовым узмацненнем гучнасці. Складападзел адбываецца у месцы найбольшага спаду гучнасці. Такім чынам, паводле тэорыі санорнасці, гукі ў складзе размяшчаюцца у парадку ўзрастання гучнасці: *пра-стор* – 134-1143. Прыведзеныя вышэй тлумачэнні механізма складаўтварэння дапамагаюць глыбей зразумець сутнасць склада.

У залежнасці ад характару размяшчэння галосных і зычных у слове вылучаюцца розныя тыпы складоў. Структура склада ў беларускай мове з пункту погляду акустыкі, як і ў іншых мовах складовага ладу, вызначаецца цеснай злітнасцю зычнага з наступным галосным і, наадварот, слабым прымыканнем зычнага да папярэдняга галоснага, таму тыповым складам, які найчасцей сустракаецца ў мове, з'яўляецца склад «зычны+галосны». Такі склад, які канчаецца складовым галосным, называецца **адкрытым** складам. Склад, які пачынаецца зычным гукам, называецца **прыкрытым.** Большасць неканцавых складоў з'яўляюцца адкрытымі прыкрытымі складамі: *бя-ро-за, да-ро-га, ра-бі-на.* Склад, які канчаецца зычным гукам, называецца **закрытым.** Закрытымі часцей за ўсё бываюць канцавыя склады: *ко-лас, ка-нец.* Склад, які пачынаецца галосным гукам, называецца **непрыкрытым:** *э-пас, а-а-зіс, а-га-род.* Непрыкрытыя склады сустракаюцца рэдка. У беларускай мове існуе тэндэнцыяператвараць непрыкрытыя склады ў тыповыя прыкрытыя шляхам развіцця перад галоснымі прыстаўных і ўстаўных зычных: *во-сень, па-вук, пі-ја-нер.* Як адкрытыя, так і закрытыя склады могуць быць прыкрытымі або непрыкрытымі.

### 2.9. Фанетычная прырода націску

Націск як суперсегментная адзінка (побач з інтанацыяй) з'яўляецца адным з важнейшых сродкаў гукавой арганізацыі слова і мовы ў цэлым. Пры дапамозе націску фанетычныя адзінкі (слова, такт, фраза) аб'ядноўваюцца ў адно цэлае. Гэта аб'яднальная функцыя націску здзяйсняецца шляхам выдзялення аднаго са складоў у слове (націскнога) і падпарадкавання яму астатніх (ненаціскных) або вылучэння слова ў такце ці такта ў фразе. Такім чынам, **націск** – гэта вылучэнне фанетычным спосабам той ці іншай гукавой адзінкі ў межах адзінкі больш высокага ўзроўню. У адпаведнасці з тым, якая адзінка вылучаецца націскам, адрозніваюцца наступныя тыпы націску: 1) націск слова, або **слоўны**, – выдзяленне фанетычным спосабам аднаго са складоў у слове; 2) **тактавы**, або **сінтагматычны**, націск – выдзяленне слова ў складзе маўленчага такта (сінтагмы); 3) фразавы націск – выдзяленне такта ў складзе фразы. Даследаванне ўсіх аспектаў праяўлення і функцый націску складае прадмет

вывучэння асобнага раздзела фанетыкі – **акцэнталогіі**.

Да ліку асноўных пытанняў акцэнталогіі адносіцца вызначэнне фанетычнай прыроды націску, яго месца ў слове і ролі ў мове.

У кожным фанетычным слове ёсць націскны склад, які вылучаецца сярод іншых складоў большай гучнасцю, працягласцю або вышынёй тону. У залежнасці ад спосабаў выдзялення націскнога склада адрозніваюцца тры асноўныя тыпы націску: сілавы (або дынамічны), колькасны (або квантатыўны), музычны (або танічны).

Калі націскны склад вылучаецца сярод іншых большай сілай голасу, такі націск лічыцца **сілавым,** або дынамічным. Сіла гуку з'яўляецца адной з прымет націску ў беларускай мове.

**Колькасны,** або квантатыўны націск вызначаецца тым, што націскны склад адрозніваецца ад ненаціскнога большай працягласцю галоснага гука, г. зн. сваёй колькасцю. У беларускай мове націскныя галосныя вымаўляюцца не толькі з большай сілай, але і больш працягла. Так, напрыклад, галосныя ў першым пераднаціскным складзе ў параўнанні з націскнымі галоснымі карацейшыя ў 2-2,5 разы, у іншых перад-паслянаціскных складах яны яшчэ больш кароткія (на слых, аднак, яны захоўваюць свае асноўныя якасці і ўласцівасць адрозніваць словы).

**Музычны,** або танічны, націск характарызуецца тым, што націскны склад вылучаецца сярод іншых змяненнем вышыні асноўнага тону. Такі націск у сербска-харвацкай мове, славенскай, а таксама літоўскай, японскай, кітайскай, шведскай і некаторых інш. Музычны націск быў уласцівы старажытнагрэчаскай мове. У беларускай мове слоўнага музычнага націску няма.

Такім чынам, беларускі націск паводле яго фанетычнай прыроды можа быць вызначаны як колькасна-дынамічны г. зн. Націскны склад больш працяглы і вымаўляецца з большай напружанасцю, чым ненаціскныя. Такі націск уласцівы многім мовам, напрыклад славянскім, а таксама нямецкай, французскай і інш.

Месца націску ў слове ў розных мовах неаднолькавае. Па гэтай прымеце адрозніваюцца націск фіксаваны, або звязаны, аднамясцовы, і свабодны, або рознамясцовы. **Фіксаваным**, ці **аднамясцовым**, лічыцца такі націск, які заўсёды знаходзіцца на пэўным складзе ў слове. Напрыклад, у чэшскай, эстонскай мовах націск заўсёды прыпадае на першы склад, у польскай – на перадапошні, у французскай – на апошні.

У беларускай мове націскны склад можа займаць у слове любое становішча. Такі націск называецца **свабодным**, або **рознамясцовым**. Свабодны націск з'яўляецца дадатковым сродкам фанетычнага адрознення слоў у тых выпадках, калі словы аднолькавыя паводле колькасці, склада і паслядоўнасці размяшчэння гукаў.

Паводле акцэнталагічных суадносін форм у межах слова беларускі націск характарызуецца як **рухомы і нерухомы,** г. зн. пры формаўтварэнні месца націску можа змяняцца або заставацца нязменным. Напрыклад: *твор – твора – твору – творы,* але: *луг – лугам – лугі.* Рухомасць націску з'яўляецца дадатковым сродкам адрознівання граматычных форм аднаго і таго ж слова.

Націск у беларускай мове маюць толькі самастойныя словы. Службовыя словы, як правіла, не маюць націску. Яны прымыкаюць у якасці ненаціскных складоў да самастойных слоў, утвараючы разам з імі адно фанетычнае слова. Некаторыя службовыя словы маюць свой націск, аднак ён больш слабы, чым націск у самастойных словах. Такі націск называецца **слабым,** або **пабочным.** Ён абазначаецца знакам гравіса (\`), у адрозненне ад асноўнага, які абазначаецца знакам акута (´). Слабы націск маюць двухскладовыя часціцы, вытворныя прыназоўнікі, злучнікі: *толькі адзін; вакол школы; перад ад'ездам.* У тэксце слабы націск могуць мець і некаторыя самастойныя словы: звязкі, простыя лічэбнікі ў спалучэнні з назоўнікамі, некаторыя займеннікі: *стаў настаўнікам, тры рублі, яго сябры.*

### 2.10. Транскрыпцыя і яе віды

Пры напісанні раздзела быў выкарыстаны матэрыял дапаможніка «Сцяцко П.У. Уводзіны ў мовазнаўства: Дапаможнік. – Гродна: ГрДУ, 2001. – 231 с.».

Пры вывучэнні гукавога ладу мовы, фанетычным аналізе тэксту выкарыстоўваецца адмысловы навуковы від пісьма – **транскрыпцыя** (лац. *transcriptio* 'перапісванне'): яна дае мажлівасць устанавіць дакладную адпаведнасць паміж гукамі і літарамі, ці фанемамі і літарамі. У сучасным звычайным (арфаграфічным) пісьме такой адпаведнасці часта не існуе.

У беларускім мовазнаўстве ў транскрыпцыі выкарыстоўваюцца свае **графемы** (грэц. *grapho* 'пішу') – літары беларускага алфавіта. Апроч іх ужываюцца дадатковыя графемы: лац. g для абазначэння выбухнога гука [г]: ганак [gанак]; грэч. γ для абазначэння фрыкатыўнага гука [г]: [γл'эба]; часам у дакладнай транскрыпцыі z (лац. z – для гука, які на пісьме абазначаецца літарамі д + з: дзеці [z'эц'і]; ž – (польск.) – для абазначэння гука, які перадаецца на пісьме літарамі д + ж: хаджу [хаžу]; j (ёт) – абазначае «й»: май [маj], іхні [jіхн'і]. На месцы ётаваных літараў *е, ё, ю, я* («палатальных») пішуцца нябтаваныя галосныя з значком «'» (апостраф) перад імі, апостраф паказвае на мяккасць папярэдняга зычнага гука (мяккі знак не выкарыстоўваецца): песня [п'эс'н'а], ледзь – [л'эц'], замест ётавых *е, ё, ю, я* пішуцца дзве літары: jэ(е), jо(ё), jу(ю), jа(я);

напрыклад: яе – [jajэ], ёю [jojу]; графема j пішацца і перад літарай «і», калі яна абазначае два гукі (у становішчы пад націскам: з імі [з jімі], іней [jін'эj]; дадатковы прыгук абазначаецца маленькай літарай пасля асноўнай: [св$^{\text{у}}$ой].

Затранскрыбаваны тэкст (слова ці яго частка, спалучэнне слоў) бярэцца ў квадратныя дужкі; у шматскладовых словах ставіцца націск; вялікія (загалоўныя) літары не выкарыстоўваюцца. Доўгі гук абазначаецца гарызантальнай рыскай над літарай (¯) ці (:) пасля літары: [збож:а]. Для абазначэння суцэльнага вымаўлення праклітыкі (разам з ненаціскнымі словамі) ў складзе фанетычнага слова выкарыстоўваецца значок ˆ або – напрыклад: над намі [надˆнам'і] ці [над-нам'і], меў бы [м'эўˆбы] ці [м'эў-бы]. Для абазначэння працяглай паўзы выкарыстоўваюцца дзве вертыкальныя рыскі: //, а непрацяглай паўзы – адна: /.

**Фанематычная (фанемная) транскрыпцыя** выкарыстоўваецца ў навуковай мове, калі трэба перадаць фанемны склад слова, г. зн. тыповыя гукі ў моцнай пазіцыі (фанемы): галосныя – пад націскам, зычныя – у становішчы перад галоснымі ці санорнымі зычнымі. Напрыклад: свецкі – <с'в'эцк'і>, сям'я <с'амjа>. Затранскрыбаваны тэкст тут бярэцца ў ламаныя дужкі. Не выкарыстоўваюцца таксама літары *е, ё, ю, я*, мяккі знак (ь) і апостраф (').

**Парадак фанетычнага разбору**

1. Запіс слова з дапамогай фанетычнай транскрыпцыі.
2. Падзел на склады, колькасць і тыпы складоў, націскны склад.
3. Тып націску.
4. Характарыстыка гукаў:
   1) галосных: а) паводле націску, б) удзелу губ, месца пад'ёму языка, ступені пад'ёму языка;
   2) зычных: а) паводле ўдзелу голасу і шуму, б) спосабу ўтварэння, в) месца ўтварэння; г) цвёрдасці – мяккасці, д) працягласці (калі гук падоўжаны – адзначыць гэта).
5. Колькасць гукаў і літар.

## 2.11. Арфаэпія як правілы рэалізацыі фанетычнай сістэмы

**Арфаэпія** (грэч. *orthós* 'правільны' *épos* 'мова') – сукупнасць норм, якімі забяспечваецца адзінства гукавога афармлення нацыянальнай літаратурнай мовы, а таксама раздзел мовазнаўства, у якім вывучаюцца правілы вымаўлення. Арфаэпія ахоплівае літаратурнае вымаўленне, а таксама нормы суперсегментнай фанетыкі (націск, тон і інш.). Для беларускай арфаэпіі нормы суперсегментнай фанетыкі, у прыватнасці націск, маюць істотнае значэнне. Асабліва вялікая роля націску пры яго рознамясцовасці і рухомасці. Рознамясцовасць робіць націск

індывідуальнай прыметай асобнага канкрэтнага слова і выкарыстоўваецца для адрознення слоў *(ка′ра* і *кара′, кра′ты* і *краты′),* а таксама граматычных форм розных слоў *(на′шу* і *нашу′, я′му* і *яму′).*

Сучасная беларуская літаратурная мова пачала фарміравацца, як вядома, у XIX ст. на базе народных гаворак галоўным чынам цэнтральнай часткі Беларусі. Паколькі літаратурная мова XIX-пачатку XX ст. яшчэ не выпрацавала дасканалай сістэмы лексіка-граматычных норм і моўна-выяўленчых сродкаў, недасканалымі заставаліся і нормы вуснай літаратурнай мовы. Кола людзей, якія карысталіся літаратурнай мовай, было нешматлікім. Гэта былі галоўным чынам прадстаўнікі інтэлігенцыі – выхадцы з сялянскіх сем'яў, якія ў пэўнай меры захоўвалі асаблівасці родных гаворак. На Беларусі не было вялікіх культурных цэнтраў і буйных тэатральных аб'яднанняў, якія маглі б аказаць уплыў на фарміраванне і выпрацоўку вымаўленчых норм літаратурнай мовы.

Станаўленне важнейшых правіл беларускай арфаэпіі цесна звязана з фарміраваннем арфаграфіі, з асаблівасцямі слова- і формазмянення. Доўгі час адзіным крытэрыем для напісання слоў было іх гучанне ў народнай мове. Пры гэтым за ўзор бралася вымаўленне ў цэнтральных гаворках, якое і рабілася паступова асновай літаратурнага вымаўлення.

Нягледзячы на складаны і супярэчлівы працэс выпрацоўкі арфаэпічных норм, у беларускай мове XIX ст. ужо існавалі фанетычныя рысы, якія былі агульнапашыранымі, вядомымі і ўяўляліся як нарматыўныя для літаратурнага вымаўлення таго часу. Гэта – асімілятыўная мяккасць зычных: *[с'н'эх, ц'в'ік];* цвёрдае вымаўленне шыпячых, *[р]* і *[ц]*: *[ч]аснок, [ж]оўты, [р]ака, [ц]ана;* вымаўленне *[ў]* замест [в] пасля галоснага перад наступным зычным: *каро[ў]ка, гало[ў]ка;* вымаўленне [а] на месцы *[о]* і *[э]* у першым пераднаціскным складзе: в[а]да, д[а]рога*;* вымаўленне падоўжаных зычных у інтэрвакальным становішчы: *збо[жж]а, насе[н'н']е;* вымаўленне глухіх зычных у канцы і ў сярэдзіне слова перад глухімі: *са[т], дзе[ш]ка, а[п]хо[т], па[т]плываць, [с] хаты, [пат] паветкай;* фрыкатыўнага *[γ]: на[γ]а, [γ]руша* і інш. Гэтыя асаблівасці, як і многія іншыя доўгі час не былі кадыфікаваны, але ў далейшым па меры развіцця літаратурнай мовы набывалі характар нацыянальнай нормы як самыя агульнапашыраныя.

Паступова складвалася стабільная, кадыфікаваная сістэма граматычных і арфаграфічных правіл. Разам з гэтым у выніку масавага выкарыстання вуснай формы літаратурнай мовы фарміраваліся яе важнейшыя арфаэпічныя нормы. Стабілізацыя норм літаратурнай мовы ў яе пісьмовай форме аказвала істотны ўплыў на выпрацоўку і станаўленне норм літаратурнага вымаўлення. Беларускае літаратурнае вымаўленне набыло кадыфікаваны характар к канцу 30-х гадоў.

У пасляваенны перыяд у выніку ўрадавай пастановы «Аб удакладненні і частковых зменах існуючага беларускага правапісу» (1957) былі ўдакладнены і асобныя правілы арфаэпіі, з'явіліся манаграфічныя даследаваннні, прысвечаныя апісанню і сістэматызацыі правіл беларускага літаратурнага вымаўлення.

### 2.11.1. Асноўныя правілы вымаўлення галосных

Асноўным фактарам якасці вымаўлення галосных з'яўляецца націскное або ненаціскное становішча іх у моўнай плыні.

1. Усе галосныя пад націскам вымаўляюцца выразна, як і ізаляваныя гукі: *с[а]д, [з'а]блік, д[о]м, [ц'о]плы, в[у]лей, [б'у]ст, ц[э]лы, [л'э]та, м[ы]ла, [м'і]рны.*

2. Ненаціскныя *[о, э, а]* у першым пераднаціскным складзе супадаюць у гуку [а] незалежна ад таго, пасля цвёрдага ці мяккага зычнага яны выступаюць: *в[о]ды – в[а]да, н[о]гі – н[а]га, с[а]д – с[а]ды, р[э]кі – р[а]ка, ц[э]ны – ц[а]на, ш[э]пт – ш[а]птаць, [в'о]дры – [в'а]дро, п[л'э]сці – п[л'а]ту, [ц'а]жкі – [ц'а]жар.*

Ва ўсіх іншых перад- і паслянаціскных складах *[о, э, а]* пасля цвёрдых зычных супадаюць у гуку [а], пасля мяккіх зычных – у гуку *[э]* або [$э^а$] (з а-прыгукам), якія на пісьме перадаюцца літарай *е: рам[о]нт – рам[а]нтаваць, ш[э]пт – ш[а]пянуць, пр[а]ца – пр[а]цаўнік; [л'о]д – [л'э]дзяны, .*

У словах іншамоўнага паходжання гук *[э]* не чаргуецца з *[а]* або *[$э^а$],* і як у першым, так і ў паслянаціскных складах гук *[э]* гучыць нязменна – незалежна ад таго, пасля мяккага ці цвёрдага папярэдняга зычнага ён выступае: *д[э]по, ж[э]тон, мат[э]матыка, А[п'э]ніны, [Б'э]тхо[в'э]н.* Толькі ў невялікай колькасці слоў пасля *[р, ц]* на беларускай глебе адбылася замена [э] на [ы]: *бр[ы]зент, канц[ы]лярыя, інж[ы]нер, р[ы]сора, ц[ы]р[ы]монія.*

Як вынікае з навуковых назіранняў, праведзеных у сектары эксперыментальнай фанетыкі Інстытута мовазнаўства АН Беларусі, якасць ненаціскных галосных аказваецца непасдэдна звязана з хуткасцю (тэмпам) маўлення. У павольным і сярэднім тэмпе маўлення галосныя гукі характарызуюцца стабільным і даволі выразным гучаннем, а ў хуткім тэмпе маўлення колькасць рэалізацый ненаціскнога галоснага аказваецца больш значнай.

3. У запазычаных словах спалучэнні ***іо, іа, іэ*** вымаўляюцца звычайна з устаўным гукам [j]. Пад націскам *іо* вымаўляецца як [ijo *(ыjо)];* не пад націскам – як [ija *(ыjа)]: фі[з'їjо]лаг, бактэр[ыjо]лаг, [п'їjа]нер, д[ыjа]пазон.* У спалучэнні *іэ* гук *[э]* незалежна ад націску вымаўляецца нязменна: *гі[γ їjэ]на, гі[γ 'їjэ]нічны.*

4. Гук *[і]* (пасля цвёрдых зычных – *[ы])* як пад націскам, так і ў не-

націскным становішчы вымаўляецца выразна: *[н'і]зка, [н'і]чога, в[ы]хад, в[ы]датна.*

У пачатку слова і пасля галосных у сярэдзіне слова пад націскам перад *[і]* вымаўляецца [j]: *[jі]скра, кра[jі]на.* Пачатковы ненаціскны *[і],* калі папярэдняе слова заканчваецца на галосны гук, замяняецца гукам *[й]* пры сярэднім і хуткім тэмпе маўлення: *яны [й]шлі, на [й]вана;* некаторыя даследчыкі беларускай арфаэпіі сцвярджаюць, што пры павольным тэмпе маўлення тут можа вымаўляцца спалучэнне j*і: на [jі]вана, яны [jі]шлі.* Пачатковы ненаціскны *[і],* калі папярэдняе слова заканчваецца на зычны гук, за выключэннем [*γ], [к], [х],* вымаўляецца так, як і пасля цвёрдых зычных – *[ы]: [брат ы с'астра, дым ы поп'эл].*

### 2.11.2. Асноўныя правілы вымаўлення зычных

На характар вымаўлення зычных уплываюць у першую чаргу якасць гукавога акружэння зычнага, месцазнаходжанне зычнага ў слове (на стыку слоў, на мяжы марфем, у пачатку або ў канцы слова).

1. Зычныя гукі выразна вымаўляюцца перад галоснымі, напрыклад мяккія і цвёрдыя: *[б]ыў – [б']іў, [п]адаць – [п']яць, [в]осень – [в']ёсны;* глухія і звонкія: *[б]ыў – [п]ыл, [д]ом –* [т]ом; свісцячыя і шыпячыя: *[с]ыты – [ш]ыты, [з]ара – [ж]ар.*

*2.* У беларускай мове гукі *[ж, ž, ч, ш, р, ц]* (калі *[ц]* не з мяккага [т']) заўсёды цвёрдыя, яны не маюць адпаведных сабе мяккіх зычных: *[ж]уры, са[ž]у, [ч]эмпіён, [ш]а[ш]а, [ш]эпт, [р]ака, [ц]ана, [ц]эбар.*

3. Перад палатальным (мяккім) [j] і ў канцы слоў вымаўляюцца цвёрдыя губныя [б, п, *м, ф]: [бjу], [пjу], ся[мjа], голу[п] (голуб), се*[*м*] *вер[ф].*

4. Перад мяккімі зычнымі, акрамя *[γ], [к'] [х'],* у пачатку слова і на стыку марфем, вымаўляюцца мяккія свісцячыя *[з'], [с']: [с'в']ята, [с'н']ег, [з'в']іць, [з'л']іць, [з'м']ерзнуць, не[с'ц']і, гры[с'ц']і.*

У запазычаных словах вымаўляюцца цвёрдыя свісцячыя [з, с]: *[сп']ецыяльна, [сп']ектр, а[сп']ект, ай[зб']ерг.*

*5.* Перад галоснымі і мяккім *[в']* вымаўляюцца вельмі мяккія зычныя гукі *[*z*'], [ц']:* [z']*іця,* [z']*ень, хо[*z*']яць, [*z*'в']еры, [ц']іхі, [ц']ень, [ц']ёмна, [ц'в']ёрды. У* словах іншамоўнага паходжання, як правіла, вымаўляюцца цвёрдыя *[д, т]: [д]элегат, [т]эарэма, сту[д]энтка, [т]ытан, [д]ывізія,* апрача слоў з суфіксамі *-ір, -ёр, -ік, -(ей)ск, -(е)ец: каман[*z*']ір, ак[ц']ёр, блан[*z*']ін, гвар[*z*']ейскі, ін[*z*']еец.*

*6.* Перад мяккімі *[*z*', ц', н', j]* вымаўляюцца толькі мяккія *[л', н']*, а перад іншымі мяккімі зычнымі могуць вымаўляцца і цвёрдыя *[л, н]: па кама[н'*z*']е, на вера[н'*z*']е, на[л'j]е,* але: *бе[нз']ін, ка[нв']ерт.*

*7.* У беларускай літаратурнай мове засведчана вымаўленне фрыкатыўнага *[γ],* змычна-выбухнога *[г]* і фарынгальнага *[h*] у гаворках. Гук

*[ɣ],* які чаргуецца з *[х] (на[ɣ]а – но[х], даро[ɣ]а – даро[х]),* найбольш уласцівы і частаўжывальны ў беларускай мове. Выбухны [г] лексічна абумоўлены, ён вымаўляецца ў нешматлікай групе слоў тыпу *[г]анак, [г]узік, [г]арсэт, маз[г']і.*

*8.* Губна-губны *[ў]* вымаўляецца на месцы этымалагічнага [в] у становішчы пасля галоснага перад зычным, а таксама ў канцы слова: *тра[в]а – тра[ў]ка, пе[в]ень – пе[ў]нік, каро[в]а – каро[ў]* і на месцы этымалагічнага *[л]* пасля галоснага ў канцы дзеясловаў прошлага часу мужчынскага роду адзіночнага ліку: *гавары[л]а – гавары[ў], піса[л]а – піса[ў]* і ў сярэдзіне некаторых слоў: *воўк, шоўк.*

9. У становішчы паміж галоснымі на месцы былых усходнеславянскіх спалучэнняў «мяккі зычны + *ь* + j» вымаўляюцца падоўжаныя *[з', с', н', л', ʒ', ц', ж, ш, ч]: ма[з':]ю, кало[с':]е, насе[н':]е, га[л':]ё, жы[ц':]ё, заці[ш:]а, збо[ж:]а, но[ч:]у,* якія на пісьме перадаюцца падвоеным напісаннем: *маззю, калоссе, насенне, галлё, жыццё, заціша, збожжа, ноччу.*

10. Перад глухімі ў сярэдзіне слова і на стыку слоў вымаўляюцца глухія: *лы[шк]а (лыжка), паво[тк]а (паводка), а[т-х]аты (ад хаты), па[т-х]вояй (пад хвояй).* Глухія вымаўляюцца таксама ў канцы слова: *са[т] (сад), ду[п](дуб), но[ш] (нож).* Перад звонкімі вымаўляюцца звонкія: *бара[ʒ'б]а (барацьба), про[з'б]а (просьба).*

11. На стыку марфем шыпячы прыпадабняецца да наступнага свісцячага: *нясві[с]кі (нясвіжскі), добру[с]кі (добрушскі), каўка[с]кі (каўказскі)* (вымаўляюцца як адзін гук [с]), *у дзе[с]цы (у дзежцы), на даро[с]цы (на дарожцы), адзене[с']я (адзенешся),* На стыку слоў асіміляцыі шыпячага можа не адбывацца пры выразнай паўзе паміж словамі: *на[ш-с]авецкі.*

У пазіцыі свісцячы перад шыпячым на стыку марфем і слоў адбываецца асіміляцыя свісцячага: *[ш:]ытак (сшытак), ра[ш]чыніць (расчыніць), раска[ш]чык (расказчык), ра[ж:]ыцца (разжыцца).*

12. Спалучэнні гукаў *[д]* і *[ч], [т]* і *[ч]* на стыку кораня і суфікса вымаўляюцца як падоўжаны гук *[ч]* або *[тч]* (варыянт): *дакла[ч:]ык, дакла[тч]ык (дакладчык), нала[ч:]ык, нала[тч]ык (наладчык), лё[ч:]ык, лё[тч]ык (лётчык).*

13. Спалучэнні гукаў *[д, т, ч, к]* з гукам *[с],* якія ўзнікаюць на стыку кораня і суфікса, вымаўляюцца як адзін гук *[ц]: гара[ц]кі (гарадскі), саве[ц]кі (савецкі), баранаві[ц]кі (баранавіцкі), беласто[ц]кі (беластоцкі).*

Аднак у большасці слоў іншамоўнага паходжання, што ўтвораны ад уласных геаграфічных назваў, спалучэнне апошняга зычнага асновы *[к]* або *[х]* з суфіксальным *[ск] у* вымаўленні захоўваецца: пішам і вымаўля-

ем *арынокскі, таджыкскі, окскі, мазамбікскі, бангкокскі, казахскі.*

14. Спалучэнне *[ч]* і [н] вымаўляецца без змен: *стрые[чн]ы, сталі[чн]ы, яе[чн']я, Кузміні[чн]а,* але: *сма[шн]ы.* Спалучэнне *[д]* і [т] у канцы запазычаных слоў вымаўляецца як [т]: *Кранштa[т], Гумбаль[т], Шмі[т].*

### 2.11.3. Адхіленні ад норм літаратурнага вымаўлення і іх прычыны

Пры напісанні раздзела быў выкарыстаны матэрыял энцыклапедычнага даведніка «Беларуская мова: Энцыкл. / Беларус. Энцыкл.; Пад рэд. А.Я. Міхневіча; Рэдкал.: Б.І. Сачанка (гал. рэд.) і інш. – Мн., 1994. – 655 с.».

Адна з асноўных прычын, якія парушаюць літаратурнае вымаўленне, – уплыў вымаўлення дыялектнай мовы. Парушэнні такога тыпу назіраюцца ў людзей, якія ў дзяцінстве карысталіся дыялектнай мовай. Дыялектным уплывам тлумачацца змяненні якасці галосных і зычных гукаў у літаратурнай мове выхадцаў з розных рэгіёнаў Беларусі:

1) вымаўленне на месцы націскнога [а] перад [ў] гука [о: *наст [о]ўнік* (наст [а] ўнік), *пр[о]ўда* (пр[а]ўда), *сказ[о]ў* (сказ[а]ў), *у[з'о]ў* (у[з'а]ў);

2) на месцы [ы] пасля губных [б], [в], [м], [п] некаторымі асобамі, для якіх роднымі з'яўляюцца так званыя ўкаючыя гаворкі, вымаўляецца [у]: *б[у]к* (б[ы]к), *в[у]касіць* (в[ы]касіць), *пам[у]лка* (пам[ы]лка), *кап[у]т* (кап[ы]т).

3) У тых, хто нарадзіўся на Магілёўшчыне, сустракаецца вымаўленне замест ненаціскнога гука [ы] гука [а]: *п[а]танне* (п[ы]танне), *бр[а]гадзір* (бр[ы]гадзір), *б[а]ла* (б[ы]ла).

4) Розным характарам акання і якання ў літаратурнай і дыялектнай мовах выкліканы адхіленні ў вымаўленні ненаціскных галосных: *в[ы]да* (в[а]да), *н[ы]га* (н[а]га); *мор[э]* (мор[а]), *піш[э]* (піш[а]), *[н'э]су* ([н'а]су), *[ц'э]гну* ([ц'а]гну), *б[і]да* ([б'а]да), *в[і]сна* ([в'а]сна), *вос[і]нь* (во[с'э]нь), *воз[і]ра* (во[з'э]ра).

5) На значнай частцы паўднёва-заходняй Беларусі ў вымаўленні захоўваецца ненаціскное этымалагічнае [о]: мног[о] (мног[а]), сал[о] (сал[а]).

6) Вымаўленне на месцы падоўжаных зычных скарочаных або зусім кароткіх гукаў: *насе[н']е* (насе[н':]е), *га[л']ё* (га[л':]ё), *збо[ж]а* (збо[ж:]а);

7) Парушэнне правіла аглушэння зычных. Гэта абумоўлена тым, што на значнай тэрыторыі Беларусі ў дыялектнай мове няма аглушэння звонкіх у канцы слоў і перад зычнымі. Часцей за ўсё прадстаўнікі такіх гаворак не чуюць глухіх гукаў на месцы звонкіх і ў літаратурным вымаўленні, а таму не набываюць звычкі да аглушэння: *гора[д]* (гора[т]), *но[ж]* (но[ш]), *ка[з]ка* (ка[с]ка);

8) вымаўленне замест спалучэння [с’ц’] гука [с’]: *рада[с’]* (рада[с’ц’]), *маладо[с’]* (маладо[с’ц’]);
9) замена гука [дз] найбольш блізкім да яго гукам [з], што абумоўлена вельмі слабай супрацьпастаўленасцю [дз] іншым зычным: *[з]ынкаць* (дзынкаць), *пэн[з]аль* (пэндзаль).
10) памякчэнне [з], [с] перад заднеязычнымі гукамі [г’], [к’], [х’]: *[з']гі-нуць* ([з]гінуць), *[с’]кінуць* ([с]кінуць), *[с’]хіліць* ([с]хіліць) і інш.

Яшчэ адна прычына адхіленняў – уплыў рускай мовы, якой валодае большасць жыхароў Беларусі. Парушэнні арфаэпічных нормаў узніка-юць пры недасканалым валоданні беларускай і рускай мовамі, пры нера-змежаванні фанетычных асаблівасцей гэтых дзвюх моў. Даволі часта пад уплывам рускай мовы можна пачуць вымаўленне мяккага *[ч'], [т'], [д']* на месцы беларускіх гукаў *[дз'], [ц'];* выбухнога [г] там, дзе павінен быць фрыкатыўны. Парушаюцца і акцэнтуацыйныя нормы.

Адхіленні ад норм літаратурнага вымаўлення звязаны і з уплывам арфаграфіі. Тут яны праяўляюцца ў вымаўленні па літарах і характэрны ў большасці выпадкаў для жыхароў буйных гарадоў. Вядома, што асноў-ныя прынцыпы, на якіх грунтуецца беларускі правапіс, – фанетычны і марфалагічны. Фанетычны прынцып заключаецца ў тым, што напісанне адпавядае вымаўленню. Але вымаўленне і напісанне супадаюць не заў-сёды. У словах *кніжка, цяжка* пішам **ж,** а вымаўляем [**ш**]; у словах *люд, горад* пішам **д,** а вымаўляем [**т**]; у словах *заводскі, гарадскі* пішам **дс**, а вымаўляем [**ц**]. Такія напісанні заснаваны на марфалагічным прынцыпе.

Веданне арфаэпічных норм беларускай літаратурнай мовы вызна-чае правільнае, літаратурнае вымаўленне – істотны элемент культуры мовы.

### 3. Пытанні да асноўнага тэарэтычнага матэрыялу

1. Што вывучае фанетыка?
2. Якія раздзелы фанетыкі можна вылучыць у адпаведнасці з рознымі аспектамі вывучэння гукавой плыні?
3. Што з'яўляецца аб'ектам вывучэння фаналогіі?
4. Як суадносяцца паняцці гук і фанема?
5. Што адбываецца з гукамі ў моўнай плыні? Ці заўсёды супадаюць характарыстыкі гука, вымаўленага ізалявана і ў складзе слова, ска-за?
6. Што такое фанетычная пазіцыя? Якія пазіцыі з'яўляюцца моцнымі, якія – слабымі?
7. Якія фанетычныя законы дзейнічаюць у сістэме зычных і ў сістэме галосных?
8. Як звязаны фанетычныя законы з правіламі арфаэпіі і прынцыпамі

арфаграфіі?
9. Чым адрозніваецца варыянт фанемы ад варыяцыі?
10. На якія групы падзяляюцца фанетычныя адзінкі?
11. Чым абумоўлена наяўнасць у вуснай мове фанетычных слоў, якія не супадаюць з лексічнымі адзінкамі?
12. Чаму беларуская мова належыць да ліку кансанантных?
13. Якімі параметрамі вызначаецца якасць зычных гукаў?
14. Як класіфікуюцца зычныя ў залежнасці ад удзелу голасу і шуму?
15. На якія групы класіфікуюцца зычныя ў залежнасці ад месца ўтварэння? Ад спосабу ўтварэння?
16. Як класіфікуюцца галосныя паводле удзелу ў артыкуляцыі губ і языка?
17. Якія фанетычныя працэсы характэрныя для беларускай мовы?
18. Што такое асіміляцыя? Назавіце найбольш пашыраныя асіміляцыі ў беларускай мове.
19. Чым адрозніваюцца камбінаторныя і пазіцыйныя змены гукаў?
20. У чым адрозненне гістарычных чаргаванняў ад пазіцыйных? Прывядзіце прыклады?
21. Як можна вызначыць склад згодна з рознымі тэорыямі?
22. Што такое прасодыя? Што такое націск? Якія яго функцыі ў мове?
23. Якімі асаблівасцямі характарызуецца беларускі слоўны націск?
24. Што такое праклітыкі і энклітыкі?
25. Што такое інтанацыя? Якія фанетычныя сродкі выражэння інтанацыі?
26. Што такое фанетычная транскрыпцыя? Чым яна адрозніваецца ад арфаграфічнага пісьма?
27. Якімі пытаннямі займаецца арфаэпія?
28. Калі і на якой аснове склалася беларускае літаратурнае вымаўленне?
29. Якія асаблівасці вымаўлення зычных і галосных гукаў і іх спалучэнняў у беларускай мове?
30. Якія адхіленні ад норм літаратурнага вымаўлення магчымы? Якія іх прычыны?

## 4. Матэрыялы да практычных аўдыторных і самастойных заняткаў

### 4.1. Схема блок-сістэмы практычных заняткаў

| № | Тэма практычных заняткаў | Колькасць гадзін |
|---|---|---|
| 1. | Фанетыка і фаналогія, іх узаемадачыненне. Гук і фанема. Фанемны рад. | 2 |

| | | |
|---|---|---|
| 2. | Асноўныя фанетычныя адзінкі: гук, склад, фанетычнае слова, маўленчы такт (сінтагма), фраза, тэкст; націск, інтанацыя. | 2 |
| 3. | Паняцце аб артыкуляцыйнай і акустычнай класіфікацыі гукаў. Зычныя і галосныя гукі. | 2 |
| 4. | Падзел зычных гукаў на групы паводле ўдзелу голасу і шуму: санорныя і шумныя, звонкія і глухія. | 2 |
| 5. | Падзел зычных гукаў на групы паводле месца ўтварэння: губныя (губна-губныя і губна-зубныя) і язычныя: пярэднеязычныя, сярэднеязычныя, заднеязычныя. | 2 |
| 6. | Падзел зычных гукаў на групы паводле спосабу ўтварэння: змычныя (выбухныя), шчылінныя (фрыкатыўныя), змычна-шчылінныя (афрыкаты), змычна-праходныя. | 2 |
| 7. | Артыкуляцыйная класіфікацыя галосных гукаў. | 2 |
| 8. | Галосныя лабіялізаваныя і нелабіялізаваныя. Галосныя верхняга, сярэдняга і ніжняга пад'ёму. Галосныя пярэдняга, сярэдняга і задняга рада. | 2 |
| 9. | Тыпы складоў: адкрытыя і закрытыя, прыкрытыя і непрыкрытыя. | 2 |
| 10. | Фанетычны, графічны складападзелы, іх адрозненне ад марфемнага падзелу слоў. | 2 |
| 11. | Акустычная характарыстыка беларускага націску. Рознамясцовасць, рухомасць слоўнага націску. | 2 |
| 12. | Асноўны і пабочны націск у складаных словах. Праклітыкі і энклітыкі. | 2 |
| 13. | Пазіцыйныя чаргаванні зычных гукаў: звонкіх і глухіх, цвёрдых і мяккіх, зубных (свісцячых) і пярэднепаднябенных (шыпячых), выбухных і афрыкат. Дзеканне і цеканне. | 2 |
| 14. | Пазіцыйныя змены галосных. Чаргаванні галосных. Фанетычная транскрыпцыя. | 2 |
| 15. | Асноўныя нормы сучаснага беларускага літаратурнага вымаўлення: вымаўленне націскных і ненаціскных галосных, вымаўленне зычных (у моцных і слабых пазіцыях). | 2 |
| 16. | Правілы вымаўлення гукаў на стыку слоў. | 2 |
| 17. | Арфаэпічная норма і культура маўлення. | 2 |
| 18. | Прычыны адхіленняў ад літаратурных нормаў. | 2 |

### 4.2. Практыкаванні для засваення тэарэтычных ведаў па модулі

На занятках 1 выконваюцца практыкаванні 170-174, 192, 215, 216.
На занятках 2 выконваюцца практыкаванні 177, 193, 194.
На занятках 3 выконваюцца практыкаванні 179, 217-219.
На занятках 4 выконваюцца практыкаванні 196-199.
На занятках 5 выконваюцца практыкаванні 203-204, 211.
На занятках 6 выконваюцца практыкаванні 200-202, 212.
На занятках 7 выконваюцца практыкаванні 180-181, 186.
На занятках 8 выконваюцца практыкаванні 182-185.

На занятках 9 выконваюцца практыкаванні 175, 222-223.
На занятках 10 выконваюцца практыкаванні 221.
На занятках 11 выконваюцца практыкаванні 176, 225.
На занятках 12 выконваюцца практыкаванні 224, 226.
На занятках 13 выконваюцца практыкаванні 205-206, 208, 213.
На занятках 14 выконваюцца практыкаванні 178, 187-191.
На занятках 15 выконваюцца практыкаванні 209, 214.
На занятках 16 выконваюцца практыкаванні 210, 220.
На занятках 17 выконваюцца практыкаванні 207, 227.
На занятках 18 выконваюцца практыкаванні 195, 228.

## 5. Дадатковая літаратура па модулі

1. Анічэнка У.В. Гістарычная фанетыка ўсходнеславянскіх моў: Вучэб. дапаможнік. – Гомель: ГДУ, 1982.
2. Бірыла М.В. Націск назоўнікаў у сучаснай беларускай мове. – Мн.: Вышэйш. шк., 1986.
3. Вардомацкий Л.М. Особенности ударения существительных в русском, белорусском и украинском языках: Учеб. пособие для студентов филол.фак. пед. ин-тов. – Мн.: Выш. шк., 1988.
4. Выгонная Л.Ц. Інтанацыя. Націск. Арфаэпія / Акад. навук Беларусі, Ін-т мовазнаўства імя Я. Коласа. – Мн.: Навука і тэхніка, 1991.
5. Івашуціч Я.М. Націск у дзеяслоўных формах сучаснай беларускай мовы: Вучэб. дапам. для філал. фак. пед. ін-таў БССР. – Мн.: Выш. шк., 1981.
6. Крывіцкі А.А. Фанетыка беларускай мовы: Вучэб. дапам. для філфакаў ВНУ. – Мн.: Вышэйш. шк., 1984.
7. Крывіцкі А.А., Падлужны А.І. Фанетыка беларускай мовы. Мн.: Вышэйш. шк., 1984.
8. Падлужны А.І. Нарыс акустычнай фанетыкі беларускай мовы. Мн.: Навука і тэхніка, 1977.
9. Падлужны А.І., Чэкман В.М. Гукі беларускай мовы. Мн.: Навука і тэхніка, 1973.
10. Падлужны А.І. Фаналагічная сістэма беларускай літаратурнай мовы. – Мн.: Навука і тэхн., 1969.
11. Плотнікаў Б.А. Фанетыка і марфалогія беларускай мовы: Вучэб. дапам. / Б.А. Плотнікаў. – Мн.: АУ, 2000. – 116 с.
12. Фанетыка беларускай літаратурнай мовы / І.Р. Бурлыка, Л.Ц. Выгонная, Г.В. Лосік, А.І. Падлужны; Рэд. А.І. Падлужны. – Мн.: Навука і тэхніка, 1989.
13. Фанетыка слова ў беларускай мове. Мн., 1983.
14. Янкоўскі Ф.М. Беларускае літаратурнае вымаўленне. Выд. 4-ае. Мн.: Нар. асвета, 1976.

МОДУЛЬ 5
**«ГРАФІКА І АРФАГРАФІЯ»**

## 1. Схема блок-сістэмы вывучэння тэарэтычнага матэрыялу

| № | Тэма лекцыйных заняткаў | Колькасць гадзін |
|---|---|---|
| 1. | Графіка, яе прадмет і задачы. Алфавіт як аснова графікі. Іншыя графічныя сродкі: апостраф, злучок (дэфіс), націск, пунктуацыйныя знакі і інш. З гісторыі беларускай графікі. Тры графічныя сістэмы. | 2 |
| 2. | Арфаграфія, яе прадмет і задачы. Сувязь беларускай арфаграфіі з фанетыкай. Асноўныя прынцыпы беларускай арфаграфіі: фанетычны і марфалагічны. | 2 |
| 3. | Гісторыя станаўлення беларускай арфаграфіі. Праблемы арфаграфічнай нармалізацыі і кадыфікацыі беларускай мовы ў пачатку XX ст. Канферэнцыя па рэформе беларускага правапісу 1992 г. Рэформа правапісу 2008 г. | 2 |

## 2. Асновы навукова-тэарэтычных ведаў па модулі

**Слоўнік паняццяў для засваення**: графіка, графема, алфавіт, алограф, дыграф, гукавы прынцып, складовы, прынцып, адназначныя літары, двухзначныя літары, кірыліца, лацінка, кітабы, арфаграфія, арфаграма, фанетычны прынцып, марфалагічны прынцып, дыферэнцыйны прынцып, традыцыйны прынцып, моўная рэформа.

### 2.1. Графіка, яе прадмет і задачы. Алфавіт як аснова графікі

Пры напісанні раздзела быў выкарыстаны матэрыял дапаможніка «Сцяцко П.У. Уводзіны ў мовазнаўства: Дапаможнік. – Гродна: ГрДУ, 2001. – 231 с.».

**Графіка** (грэц. *graphike*, ад *grapho* 'пішу, малюю') – гэта інвентар усіх сродкаў пісьма: літары, знакі прыпынку, ідэаграмы (у фізіцы, матэматыцы), піктаграмы (малюнкі на шыльдах крамаў, майстэрняў, клубаў), а таксама сістэма дачыненняў паміж графемамі і фанемамі ў літарна-гукавым (фанематычным) пісьме. У мовазнаўстве тэрмінам «графіка» называецца таксама галіна лінгвістыкі, якая даследуе стасункі (адносіны) паміж графемамі і фанемамі. Паняцце «графіка» дастасоўваецца звычайна да фанематычнага (літарнага) пісьма, якому ўласцівыя тры адметнасці: алфавіт, графіка і арфаграфія.

**Алфавіт** (грэц. *alphabetos* з назваў першых дзвюх літараў грэцкага алфавіта «альфы» і «бэты», у пазнейшым вымаўленні «віты») – гэта сістэма графічных знакаў фанематычнага пісьма – літараў, замацаваных у адпаведнай паслядоўнасці ў той ці іншай пісьмовай мове. Асноўныя патрабаванні да алфавіта – дакладная колькасць адпаведных літараў і ты-

повых гукаў (фанемаў), прастата абрысаў графічных знакаў і іх зручнасць для напісання, выразнае адрозненне адной літары ад іншых.

Графіка і арфаграфія разам вызначаюць правілы функцыянавання графемаў (літараў) фанемаграфічнага пісьма. Графіка ўстанаўляе правілы адпаведнасці графемаў (літараў) гукавым адзінкам мовы (фанемам, складам, дыферэнцыйным адзнакам фанемаў, націску). Ідэальнаю лічыцца графіка, у якой існуе дакладная адпаведнасць паміж графемамі і фанемамі: кожная графема перадае адну фанему, а кожная фанема перадаецца адной графемай. Аднак такой графікі не мае ніводнае натуральнае пісьмо, бо цягам часу пісьмо адстае ад жывой мовы, якая змяняецца больш хуткімі тэмпамі. Таму ў кожнай мове дзейнічае закон эканоміі моўных сродкаў у адпаведнасці з якім літарамі абазначаюцца толькі тыя гукі, якія адрозніваюць словы. У адных мовах разыходжанне паміж напісаннем і вымаўленнем меншае (беларуская, сербская мовы), у іншых большае.

Кожная літара ў алфавіце маю сваю назву і месца, а таксама бытуе ў 4 разнавіднасцях – **алографах** адной графемы: вялікая, радковая, рукапісная, друкаваная. Літары *ь, ў* ужываюцца ў сучаснай моўнай практыцы ў толькі ў радковай форме. Вялікая літара *ы* ўжываецца ў пачатку некаторых іншамоўных назваў.

Што датычыцца назваў літар, то пераважная большасць іх простыя, 3 састаўныя – мяккі знак, *і* нескладовае (й) і *у* нескладовае (ў). Галосныя літары паводле назвы падзяляюцца на ётаваныя і нятаваныя. Назва ётаваных літар складаецца з гука *й* і адпаведнага галоснага гука.

Беларуская графіка заснавана на двух прынцыпах: гукавым і складовым. **Гукавы прынцып** заключаецца ў тым, што адзін і той жа гук на пісьме заўсёды абазначаецца адной і той жа літарай. На гукавым прынцыпе заснавана выкарыстанне адназначных літар, дзе існуюць прамыя суадносіны паміж літарамі і гукамі. Пры **складовым прынцыпе** адзінкаю пісьма пры абазначэнні якасці гука выступае склад. Гэта значыць, што канкрэтнае гукавое значэнне некаторых літар выяўляецца толькі ў межах склада. Літары, напісанне якіх грунтуецца на складовым прынцыпе, двузначныя.

Існуе паняцце **нялітарных графічных сродкаў**. У беларускай мове да такіх належаць апостраф, злучок, знак націску (асноўны і пабочны – гравіс і акут), пунктуацыйныя знакі, прабелы паміж часткамі тэксту, словамі, вылучэнне слоў пры дапамозе шрыфту, знак параграфа і інш.

У сучасным свеце найбольшае пашырэнне маюць тры асноўныя алфавіты: лацінскі (яго нацыянальныя варыянты выкарыстоўваюцца народамі Амерыкі і Аўстраліі, большай часткі народаў Еўропы і некато-

рых краінаў Азіі і Афрыкі), арабскі (у народаў арабскіх краінаў, Ірана, Пакістана, Афганістана) і славянска-кірылаўскі (яго нацыянальныя варыянты ў Балгарыі, Сербіі, Македоніі, Беларусі, Украіне, неславянскіх народаў Расійскай Федэрацыі і інш.).

Старажытная беларуская мова карысталася традыцыйным кірыліцкім алфавітам. Да XVI ст. Кірыліцкае пісьмо было толькі рукапісным, пакуль Ф. Скарына не заснаваў усходнеславянскае кнігадрукаванне. Пасля забароны ў 1696 г. польскім сеймам выкарыстоўваць беларускую мову ў справаводстве афіцыйнай на тэрыторыі Беларусі становіцца польская мова, у аснове графічнай сістэмы якой ляжыць лацінскае пісьмо. Паступова ў творах, напісаных па-беларуску, пачынае таксама выкарыстоўвацца лацінская графіка. Зрэдку выкарыстоўвалася кірыліца. Да пачатку XX ст. Беларусы карысталіся дзвюма графічнымі сістэмамі – лацінкай і кірыліцай. У 1708 г. загадам Пятра I у Расіі была праведзена афіцыйная рэформа кірыліцкага пісьма. Рэфармаваная кірыліца атрымала назву грамадзянскай азбукі («грамадзянкі»). Узоры літар грамадзянскага алфавіта прапанаваў Пятру I беларус Ілля Капіевіч, манах, асветнік, кнігавыдавец. Пасля кастрычніцкіх падзей 1917 г. гэты алфавіт у змененым выглядзе замацаваўся як адзіны графічны сродак беларускай літаратурнай мовы.

Мела месца і выкарыстанне на беларускіх землях арабскага алфавіта. Пачынаючы з XIV ст. на Беларусі пачалі сяліцца татары, адны як ваеннапалонныя, другія добраахвотна. Паступова яны забылі сваю родную мову, перанялі беларускую. Для захавання рэлігіі яны пераклалі каран і іншыя кнігі іслама на беларускую мову. Так з'явіліся **кітабы** – кнігі, напісаныя на беларускай мове арабскім пісьмом.

### 2.1.1. Спрэчныя пытанні беларускага алфавіта

Падаецца паводле Лепешаў І.Я. Сучасная беларуская літаратурная мова: спрэчныя пытанні: Дапаможнік / І.Я.Лепешаў. Гродна: ГрДУ, 2002. 207 с.

У падручніках і дапаможніках падаюцца неаднатыпныя, часам супярэчлівыя сцвярджэнні пра беларускі алфавіт. У «Букварах» А.К. Клышкі (Мн., 1995.) колькасць літар не называецца, але першакласнікі пры жаданні самі могуць зрабіць падлік: апрача 32 літар, тут пасля *д* у дужках прыводзяцца *дж* і *дз*. Тое самае знаходзім і ў падручніку для 2 класа «Беларуская мова» В.А. Бекіша і інш. (Мн., 1995.). Пяцікласнікі з падручніка «Беларуская мова» В.П. Краснея і Я.М. Лаўрэля (Мн., 1995.) даведваюцца, што «ў беларускім алфавіце 32 літары, а гукі [дж] [дз] абазначаюцца на пісьме дзвюма літарамі (*д, ж* і *д, з*). Прыкладна тое самае паўтараецца і ў дапаможніку для вучняў старшых класаў «Беларуская мова» М.Ц. Кавалёвай (Мн., 1995). Аналагічныя звесткі даюцца і ў падручніку для педвучылішчаў «Беларуская мова. Ч. I» (Мн., 1982.). У дапа-

можніках жа для студэнтаў-філолагаў вышэйшых навучальных устаноў сцвярджаецца, што сучасны беларускі алфавіт складаецца з 34 літар, потым даецца іх пералік (гл., напрыклад: Бурак Л.І. Сучасная беларуская мова. Мн., 1974; Камароўскі Я.М., Сямешка Л.І. Сучасная беларуская мова. Мн., 1985; Рагаўцоў В.І., Юрэвіч А.Л. Уводзіны ў мовазнаўства. Мн., 1987; Сцяцко П.У. Пачатковы курс мовазнаўства. Гродна, 1993; Сучасная беларуская мова: Лексікалогія. Фаналогія. Арфаграфія. Мн., 1976.). Праўда, у апошняй з пералічаных кніг, у 2 і 3-м дапрацаваных выданнях (1984; 1993), сказана, што ў нашым алфавіце 32 літары, а *дж* і *дз* утвораны са спалучэння літар і называюцца дыграфамі.

У энцыклапедыі «Беларуская мова» спачатку гаворыцца, што алфавіт складаецца з 32 літар, а затым дадаецца, што «некаторыя даследчыкі асобнымі літарамі лічаць дыграфы *дж, дз*». Думаецца, што тут слова «даследчыкі» ўжыта не зусім дакладна (замест «аўтары падручнікаў»), бо спецыяльнымі даследаваннямі пра названыя дыграфы ніхто ў беларускім мовазнаўстве не займаўся, ды ў гэтым і няма патрэбы, бо існуе адпаведная агульнапрынятая сусветная практыка. Паводле гэтай практыкі, кожная літара алфавіта як асобны графічны знак для перадачы на пісьме пэўнага асноўнага, тыповага гука (фанемы) мае свой, толькі яму ўласцівы малюнак (абрыс), непадобны ні да адной іншай літары.

Няма ў беларускай графіцы асобных знакаў-літар для фанем [дж] і [дз]. Яны абазначаюцца на пісьме спалучэннем дзвюх літар (*д, ж* і *д, з*), кожная з якіх ужо заняла ў алфавіце сваю нішу. Такія спалучэнні дзвюх літар называюцца дыграфамі або лігатурамі. І, зразумела, яны не павінны ўключацца ў алфавіт ні ў дужках пасля *д*, ні без дужак. Як слушна зазначана ў прадмове да «Беларуска-рускага слоўніка ў 2 тамах» (Мн., 1988. Т. І. С. 22), лігатуры «дж, дз пры размяшчэнні слоў у алфавітным парадку разглядаюцца як дзве літары».

Характэрна, што ў 20-я гг. XX ст. не было праблемы адносна таго, уключаць ці не ўключаць у алфавіт дыграфы *дз, дж*. Б. Тарашкевіч у «Беларускай граматыцы для школ. Выданне 5-е» (Вільня, 1929.) і Я. Лёсік у «Граматыцы беларускае мовы: Фонэтыка» (Мн., 1926.) сцвярджалі, што для гукаў *дз, дж* няма асобных літараў, а таму для кожнага ўжываецца па дзве літары. Але вымаўляюцца яны як адзін гук.

У галіне графікі неаднастайна трактуецца і яшчэ адно пытанне пра адназначныя і двухзначныя літары. Гэтыя тэрміны ў школьных падручніках, як і прадугледжана праграмай, не ўпамінаюцца. Але тут даюцца неабходныя звесткі пра двайную ролю літар *е, ё, ю, я*, пра тое, што мяккія зычныя гукі абазначаюцца на пісьме тымі самымі літарамі, што і цвёрдыя гукі, толькі з дапамогай *е, ё, ю, я, і*, а таксама мяккага знака.

Гаворыцца і пра іншыя суадносіны паміж гукамі і літарамі, у пры-

ватнасці, пра тое, што адна зычная літара можа абазначаць розныя гукі. Гэта ілюструецца прыкладамі: літара ***з*** у слове *замок* абазначае гук [з], у слове *казка* – гук [с], у слове *зжаваць* – гук [ж]. Да гэтага можна дадаць, што літарай ***з*** яшчэ абазначаюць і гук [ш], напрыклад, у слове *рэзчык*, а таксама мяккі гук [з']: *азімы*. Як бачым, літара ***з*** мае пяць гукавых значэнняў. Адны з гэтых значэнняў называюцца асноўнымі, другія дадатковымі (другараднымі). Асноўнае значэнне літара мае тады, калі абазначае асноўны, тыповы гук (фанему), гук у моцнай пазіцыі. У пададзеных вышэй прыкладах літара ***з*** мае асноўнае значэнне ў словах *замок*, *азімы*. Астатнія значэнні літары ***з*** дадатковыя, яны рэгулююцца правіламі арфаграфіі. Наша пісьмо мае фанемны характар, таму ў графіцы вывучаюцца толькі асноўныя значэнні, а дадатковыя – у арфаграфіі.

Літары, якія маюць адно асноўнае гукавое значэнне называюцца **аднaзначнымі**. Гэта літары *а, о, у, ы, э* (яны заўсёды абазначаюць адзін адпаведны галосны гук), а таксама *д, ж, й, р, т, ў, ч, ш* і дыграф *дж* (яны абазначаюць адпаведныя зычныя гукі). Астатнія літары, за выключэннем мяккага знака, **двухзначныя:** яны маюць два асноўныя значэнні, адны з іх абазначаюць пэўныя цвёрдыя і мяккія зычныя (*выць віць, конь кон*), а другія (*е, ё, ю, я, і*) у адных выпадках абазначаюць два гукі (*мае, маё, маю, мая, маіх*), а ў другіх адзін галосны гук і мяккасць папярэдняга зычнага: *лес [л'эс]*.

Менавіта такі падзел літар па іх асноўных гукавых значэннях знаходзім у падручніку для педвучылішчаў «Беларуская мова. Ч. I» (Мн., 1982.), хоць тут у пераліку аднaзначных літар чамусьці няма *й, ў*, а таксама ў дапаможніку для студэнтаў-філолагаў «Сучасная беларуская літаратурная мова». У першых двух выданнях гэтага дапаможніка (Мн., 1976; Мн., 1984) сярод аднaзначных, аднак, не называлася літара *й*. Яе, несумненна, трэба адносіць да аднaзначных, бо яна заўсёды абазначае гук [j]: *тайга, майму, мой, гай*.

Зусім іншы сэнс укладваюць у паняцце «аднaзначныя і двухзначныя літары» Я.М. Камароўскі і Л.І. Сямешка аўтары дапаможніка для студэнтаў філалагічных факультэтаў «Сучасная беларуская мова» (Мн., 1985): «Літары, якія адначасова ніколі не абазначаюць двух гукаў, называюцца аднaзначнымі. Так, напрыклад, літара ***б*** адначасова абазначае або цвёрды [б] – [б]ыла, або мяккі [б'] – [б']іць. Да аднaзначных адносяцца ўсе зычныя літары, а таксама галосныя *у, о, а, ы, э*. Галосныя літары *е, ё, ю, я* двухзначныя. У пэўнай пазіцыі ў слове яны адначасова абазначаюць два гукі: [j] з наступнымі [э, о, у, а]: сва[ja](свая)...» Але, як відаць з папярэдняга выкладу, з такім разуменнем аднaзначных і двухзначных літар наўрад ці можна згадзіцца. Да таго ж, як ужо гаварылася, літары *е, ё, ю,*

*я* не заўсёды «адначасова абазначаюць два гукі», нярэдка яны, дадаткова паказваючы на мяккасць папярэдняга зычнага, абазначаюць адзін гук: *зялёны – [зал'оны]*.

Што да мяккага знака (ь), то гэта літара гука не абазначае і таму не адносіцца ні да адназначных, ні да двухзначных. Але ўмоўна можна гаварыць пра яе «двухзначнасць» – з крыху іншым разуменнем гэтага слова. Справа ў тым, што ў адных выпадках яна выступае як змякчальны знак, а ў другіх – як раздзяляльны. Змякчальны мяккі знак ужываецца для абазначэння мяккасці зычных: *мазь, пісьмо, хтосьці*. Раздзяляльны мяккі знак адначасова выконвае дзве функцыі: паказвае на раздзельнае вымаўленне гукаў перад *е, ё, ю, я, і* і абазначае мяккасць папярэдняга зычнага: *рэльеф, мільён, налью, мадзьяр, Ільічы*.

### 2.2. Арфаграфія і яе прынцыпы

Пры напісанні раздзела быў выкарыстаны матэрыял дапаможніка «Сцяцко П.У. Уводзіны ў мовазнаўства: Дапаможнік. – Гродна: ГрДУ, 2001. – 231 с.».

Каб ведаць правілы чытання і пісьма, трэба ведаць не толькі графіку, але і арфаграфію. **Арфаграфія** (грэц. *orthos* 'правільны' і *grapho* 'пішу') – сістэма агульнапрынятых правілаў перадачы вуснай мовы на пісьме: напісання слоў і іх частак (марфемаў), пераносу частак слова на наступны радок, правілаў абазначэння на пісьме межаў паміж моўнымі адзінкамі (напісанні злітыя, паўзлітыя і асобныя), правілаў ужывання вялікай літары і пісьмовых скарачэнняў.

Правілы арфаграфіі будуюцца на падставе графікі. Там, дзе правілы графікі паказваюць на тую ці іншую адпаведнасць як адзіную ў пэўных фанетычных умовах, у арфаграфіі няма патрэбы. Напрыклад, у напісаннях *дом, там, худы* ўжыванне ўсіх літараў вызначаецца графікай. Арфаграфія з некалькіх варыянтаў, якія дапускае графіка, выбірае адзін, астатнія касуе.

Арфаграфія, кіруючыся адпаведным прынцыпам, выбірае адпаведную **арфаграму** (грэц. *orthos* 'правільны' і *gramma* 'пісьмовы знак, літара') – напісанне, выбранае з двух ці болей мажлівых. Так, вымаўленне [гарацкі] можна перадаць на пісьме трыма паралельнымі варыянтамі: *гарацкі, гарадзкі, гарадскі*. Арфаграфія замацоўвае апошні варыянт як нарматыўны, а першыя два касуе.

Выбар паміж паралельнымі магчымымі напісаннямі, якія даюцца графікай, вызначаецца на падставе таго ці іншага арфаграфічнага прынцыпу. Іх вылучаюць 4 альбо 5: 1) фанетычны, 2) марфалагічны, 3) дыферэнцыйны, 4) традыцыйны, 5) граматычны (грамематычны).

Пры **фанетычным** прынцыпе літары-арфаграмы перадаюцца на пісьме ў адпаведнасці з іх вымаўленнем. Напрыклад, у словах *дом* –

*дамы, шэсць – шасці* каранёвыя *о, э*, апынуўшыся ў ненаціскным становішчы, у адпаведнасці з вымаўленнем абазначаюцца літарай *а*: *дамы, шасці*. Гэтак пішуцца і прыстаўкі *з-/с-, без-/бес-, раз-/рас-, цераз-/церас-*, калі зычная фанема <з> у слабай пазіцыі (перад глухім зычным) рэалізуецца ў сваім варыянце *с*.

Аднак не кожнае напісанне, адпаведнае вымаўленню, вызначаецца фанетычным прынцыпам. Так, першыя ў названых парах словы *дом, шэсць* перадаюцца на пісьме не паводле правілаў арфаграфіі (у іх няма арфаграмаў), а чыста графічна, бо на месцы літараў у гэтых словах нельга ўжыць іншыя графемы. Фанетычны ж прынцып патрабуе передачы на пісьме жывых чаргаванняў гукаў, рэалізацыі фанемаў у іх варыянтах. У беларускай мове фанетычным прынцыпам кіруюцца, як правіла, пры выбары напісання галосных.

Пры **марфалагічным** прынцыпе захоўваецца аднастайнае, аднолькавае напісанне марфемаў (іх частак), не зважаючы на іх рознае вымаўленне ў розных фанетычных пазіцыях. Так, мы пішам *заводы* і *завод*, хоць у апошнім слове фанема <д> рэалізуецца ў гуку [т]: [завот]. Пры марфалагічным прынцыпе аднастайна перадаюцца на пісьме гукі ў моцнай пазіцыі, г. зн. фанемы. Таму гэты прынцып называюць **фанематычным (фанемным)**, або **марфанематычным**, бо тут – «фанемнае» напісанне марфемаў (ці іх частак). У беларускай мове паводле гэтага прынцыпу пішуцца зычныя літары: *горад [горат], снег [с'н'эх], лётчык [л'оч:ык]*.

**Дыферэнцыйны** прынцып найчасцей выкарыстоўваецца пры адрозненні слоў, пераважна пры размежаванні ўласных і агульных назоўнікаў: *крапіва* і *Крапіва Кандрат*, *танк* і *Танк Максім*, *арол* і *Арол* (горад). Гэты прынцып мае даволі вузкую сферу прымянення, таму яго звычайна не лічаць прынцыпам, а гавораць пра дыферэнцыйныя напісанні.

**Традыцыйны (гістарычны)** прынцып – гэта прынцып захавання напісання, якое ўсталявалася раней, у гістарычным мінулым і не адпавядае ні рэальнаму вымаўленню, ні марфалагічным стасункам у сучаснай мове. Гэта напісанне з вялікай літары новага вершаванага радка. Да рэформы правапісу 2008 г. у беларускай мове традыцыйныя напісанні з літарай *е* ў першым складзе перад націскам (замест нарматыўнага я) захоўваліся ў словах *васемнаццаць, дзевяты, дзесяты, семнаццаць.* У новых «Правілах беларускай арфаграфіі і пунктуацыі» ў спрадвечна беларускіх словах прапануецца пісаць тут літару ***я*** паводле агульнага правіла: *васямнаццаць, дзявяты, дзясяты, сямнаццаць* і ў вытворных ад іх. І ў іншамоўных словах традыцыйныя напісанні, якія пярэчаць фанетычнаму прынцыпу (яканню), нярэдка змяняюцца, напрыклад: *каляндар, сяржант, дзяжурны, слясарны, ялейны, янот, ярмолка, яфрэйтар, яў-*

*рэй, яхідны.* І традыцыйнае напісанне літары *э* ў ненаціскных складах іншамоўных слоў (асабліва ў канцавых складах спалучэннях *тар, -тал*) замяняецца на *а*: *майстар, лідар, шніцаль, прынтар, кампутар* і г.д.

### 2.3. Кароткія звесткі з гісторыі беларускай арфаграфіі

Пры напісанні раздзела быў выкарыстаны матэрыял падручніка «Беларуская мова. У 2 ч. Ч. 1. Фанетыка. Арфаэпія. Графіка. Арфаграфія. Лексікалогія. Фразеалогія. Марфемная будова слова і словаўтварэнне. Марфалогія: Падручнік / Я.М. Адамовіч, Л.А. Акаловіч, Г.Ф. Андарала і інш.: Пад агул. рэд. Л.М. Грыгор'евай. – 4-е выд., перапрац. і дап. – Мн.: Выш. шк., 2001. – 318 с.».

Правапісныя нормы сучаснай беларускай літаратурнай мовы пачалі складвацца ў XIX ст., у перыяд фарміравання новай беларускай літаратурнай мовы, на аснове жывой гутарковай мовы. Вялікая роля ў выпрацоўцы ўнармаванага пісьма належала беларускім пісьменнікам, у прыватнасці В. Дуніну-Марцінкевічу, Ф. Багушэвічу, а ў пачатку XX ст. Я. Купалу і Я. Коласу, Цётцы, М. Багдановічу, М. Гарэцкаму, Ц. Гартнаму і інш. Адлюстроўваючы ў сваіх творах прагрэсіўныя кірункі развіцця агульнанацыянальнай беларускай мовы, яны закладвалі трывалую аснову ўнармаванай пісьмовай мовы.

Аднак складванне правапісных норм праходзіла марудна, бо царскі ўрад не быў зацікаўлены ў развіцці нацыянальных моў народаў Расіі. Калі беларускі народ атрымаў дзяржаўнасць, стала магчымай сапраўдная нармалізацыя правапісу беларускай мовы. У 1918 г. выйшла «Беларуская граматыка для школ» Б. Тарашкевіча. Гэта была першая нарматыўная граматыка беларускай літаратурнай мовы, найбольш пэўны збор яе арфаграфічных правіл.

Аднак граматыка Б. Тарашкевіча не магла адразу вырашыць усе пытанні правапісу, тым больш, што некаторых правіл у ёй зусім не было, а асобныя напісанні не адпавядалі нормам жывой беларускай мовы *(сыстэма, дыплём, філёзофія).*

Спрэчныя пытанні беларускай арфаграфіі абмяркоўваліся на Акадэмічнай канферэнцыі па рэформе беларускага правапісу ў 1926 г. Было вырашана падрыхтаваць праект новага правапісу. Гэты праект быў апублікаваны ў 1930 г. Пасля яго абмеркавання і ўдакладнення правіл праекта Савет Народных Камісараў БССР 26 жніўня 1933 г. прыняў пастанову «Аб зменах і спрашчэнні беларускага правапісу», якой узаконьваліся адпаведныя нормы беларускай арфаграфіі як агульнаабавязковыя. Было ўстаноўлена пісаць літару *я* толькі ў першым складае перад націскам *(весяліцца, зялёны),* не абазначаць на пісьме асіміляцыйнай мяккасці *(галлё, свет)*, іншамоўныя словы падпарадкоўваліся аканню (пераход *о* ў *а),* зычныя *з, с* змякчаліся, *л* захоўвалася, як правіла, цвёрдым *(фізіка, сі-*

*стэма, маналог).*

На аснове пастановы быў складзены і ў 1934 г. выдадзены «Правапіс беларускай мовы», які, аднак, не мог ахапіць і вырашыць усіх правіл, асабліва напісання складаных слоў, іншамоўных слоў, прозвішчаў і геаграфічных назваў. У перыядычным друку пачалася дыскусія па пытаннях арфаграфіі, аднак яна была перапынена Айчыннай вайной.

Пасля вайны дыскусія працягвалася. Была створана Арфаграфічная камісія на чале з Я. Коласам і К. Крапівой. Яна распрацавала «Праект змен і ўдакладненняў беларускага правапісу» (1951). Пасля абмеркавання праекта Арфаграфічная камісія падрыхтавала новы яго варыянт. 11 мая 1957 г. Савет Міністраў БССР прыняў пастанову «Аб удакладненні і частковых зменах існуючага беларускага правапісу». Гэтай пастановай было пашырана правіла акання (пераход *о* ў *а)* на ўсю запазычаную лексіку, у тым ліку і на інтэрнацыянальна-рэвалюцыйныя словы *(камуніст, савет, камсамол),* удакладнена правіла напісання складаных слоў і абрэвіятур, асабовых канчаткаў дзеясловаў *(несяце, пішаце),* уласных імён і прозвішчаў, геаграфічных назваў; часціцы *ж (жа), бы (б)* сталі пісацца асобна ад слоў *(куды ж, пайшоў бы).* На аснове названай пастановы былі складзены і выдадзены «Правілы беларускай арфаграфіі і пунктуацыі» (1959).

19-20 лістапада 1992 г. Інстытут мовазнаўства імя Якуба Коласа сумесна з Міністэрствам адукацыі Рэспублікі Беларусь, Саюзам пісьменнікаў і Рэспубліканскім таварыствам беларускай мовы імя Ф. Скарыны арганізаваў навуковую канферэнцыю «Праблемы беларускага правапісу». Канферэнцыя мела на мэце абмеркаваць пытанні правапісу, якія найбольш часта былі аб'ектам дыскусіі ў перыядычным друку. Гэта абазначэнне на пісьме асіміляцыйнай мяккасці зычных, правапіс *не/ня* і *без/бяз*, правапіс *і/й*, правапіс іншамоўных слоў і інш. У выніку было прапанавана стварыць камісію па падрыхтоўцы праекту ўдакладненняў.

Канферэнцыя не вырашыла праблему разнабою ў правапісе, таму 2008 г. было прынята рашэнне па рэформе беларускага правапісу, якая ўступае ў дзеянне ў верасні 2010 г.

## 3. Пытанні да асноўнага тэарэтычнага матэрыялу

1. Дайце азначэнне тэрміну «графіка»?
2. Што такое алфавіт? Што пакладзена ў аснову беларускага алфавіта? Як ішло яго развіццё?
3. У якіх разнавіднасцях бытуе кожная літара?
4. У чым сутнасць складовага і гукавога прынцыпаў беларускай графікі?
5. Якія сродкі, акрамя літар, уваходзяць у беларускую графічную сі-

стэму?
6. Якія графічныя сістэмы выкарыстоўваліся на беларускіх землях?
7. Якія погляды існуюць на колькасць літар беларускага алфавіта?
8. Якія літары беларускага алфавіта з'яўляюцца адназначнымі, якія – двухзначнымі?
9. Што такое дыграфы?
10. Што такое арфаграфія?
11. З якіх раздзелаў складаецца арфаграфія?
12. Што такое арфаграма?
13. Якія прынцыпы правапісу з'яўляюцца асноўнымі ў сучаснай арфаграфіі?
14. У чым сутнасць фанетычнага прынцыпу? Якія правілы на ім заснаваны?
15. У чым сутнасць фанематычнага прынцыпу? Чаму яго называюць яшчэ марфалагічным? Якія правілы на ім заснаваны?
16. Што такое традыцыйныя і дыферэнцыйныя напісанні? Якія правілы грунтуюцца на гэтых прынцыпах?
17. Якія этапы станаўлення беларускай арфаграфіі можна вылучыць?

## 4. Матэрыялы да практычных аўдыторных і самастойных заняткаў

### 4.1. Схема блок-сістэмы практычных заняткаў

| № | Тэма практычных заняткаў | Колькасць гадзін |
|---|---|---|
| 1. | Асаблівасці беларускага алфавіта. Суадносіны паміж літарамі (графемамі) і гукамі (фанемамі) у беларускай графіцы. | 2 |
| 2. | Складовы і гукавы прынцып беларускай графікі. Адназначныя і двухзначныя літары. | 2 |
| 3. | Правілы правапісу галосных, заснаваныя на фанетычным прынцыпе. Адхіленні ад фанетычнага прынцыпу ў правапісе галосных. | 2 |
| 4. | Правілы правапісу зычных, заснаваныя на марфалагічным прынцыпе. Правапіс зычных паводле фанетычнага прынцыпу. | 2 |
| 5. | Прынцыпы і правілы напісання слоў злітна, асобна, праз злучок. Ужыванне вялікай літары. Напісанне абрэвіятур і ўмоўных скарачэнняў. Правілы пераносу. | 2 |
| 6. | Напісанні, якія перадаваліся паслядоўна ў канцы XIX-пачатку XX ст. Праблемы сучаснага беларускага правапісу: спрэчныя пытанні. | 2 |

### 4.2. Практыкаванні для засваення тэарэтычных ведаў па модулі

На практычных занятках 1 выконваюцца практыкаванні 229-231, 236.
На практычных занятках 2 выконваюцца практыкаванні 232-235.

На практычных занятках 3 выконваюцца практыкаванні 237-238(I).
На практычных занятках 4 выконваюцца практыкаванні 238(II), 239.
На практычных занятках 5 выконваюцца практыкаванні 240-242.
На практычных занятках 6 выконваюцца практыкаванні 243-245.

## 5. Дадатковая літаратура па модулі


2. Акуленка А.А. Правапіс галосных у сучаснай беларускай мове: Вучэб.-метад. дапам. / А.А. Акуленка, Г.Ф. Вештарт. – Мн.: Ін-т матэматыкі, 2003.
3. Булыка А.М. Развіццё арфаграфічнай сістэмы старабеларускай мовы / АН БССР.Ін-т мовазнаўства імя Я. Коласа. – Мн.: Навука і тэхніка, 1970.
4. Жосткіна Г.В. Цяжкія пытанні правапісу беларускай мовы: вучэбна-метадычны дапаможнік па арфаграфіі / Г.В. Жосткіна. – Гомель: БелДУТ, 2006.
5. Камароўскі Я.М. Сучасная беларуская арфаграфія. – Мн.: Нар.асвета, 1985.
6. Кандраценя І.У. Арфаграфічны слоўнік беларускай мовы / І.У. Кандраценя, Л.П. Кунцэвіч. – Мінск: ТетраСистемс, 2009.
7. Капылоў І. Л. Арфаграфічны слоўнік беларускай мовы для школьнікаў: новыя правілы беларускага правапісу / І.Л. Капылоў, Т.М. Маракуліна. – Мінск: Современная школа, 2009 (макет 2010).
8. Лыч Л.М. Рэформа беларускага правапісу 1933 года: Ідэалаг. аспект. – Мн.: Навука і тэхніка, 1993.
9. Правілы беларускай арфаграфіі і пунктуацыі: Праект новай рэд. / Нац. акад. навук Беларусі, Ін-т мовазнаўства імя Я. Коласа. – Мн., 1999.
10. Тарашкевіч Б.А. Беларускі правапіс. – Мн.: Менск, 1941.
11. Цыбульская С.І. Даведнік па арфаграфіі і пунктуацыі беларускай мовы / С.І. Цыбульская, І.У. Каліценя. – Мінск: ТетраСистемс, 2006.

# МОДУЛЬ 6
# «МАРФЕМІКА І СЛОВАЎТВАРЭННЕ»

## 1. Схема блок-сістэмы вывучэння тэарэтычнага матэрыялу

| № | Тэма лекцыйных заняткаў | Колькасць гадзін |
|---|---|---|
| 1. | Марфемная структура слова, або марфеміка. Марфема, адрозненне яе ад гука, склада, слова. Тыпы марфем. Варыянтныя марфемы. Нулявыя марфемы. | 2 |
| 2. | Аснова слова. Віды асноў. Канчатак. Нулявыя і матэрыяльна выражаныя канчаткі; варыянтныя канчаткі. Корань слова. | 2 |
| 3. | Афіксы і іх віды. Конфікс. Афіксоіды (прэфіксоіды, суфіксоіды). | 2 |
| 4. | Змены ў марфемнай структуры слова. | 2 |
| 5. | Словаўтварэнне. Асноўныя словаўтваральныя паняцці. | 2 |
| 6. | Сінхранічнае словаўтварэнне. Паняцце пра дыяхранічнае словаўтварэнне; марфолага-сінтаксічны, лексіка-семантычны і лексіка-сінтаксічны спосабы. Роля словаўтварэння ва ўзбагачэнні лексікі беларускай мовы. | 2 |

## 2. Асновы навукова-тэарэтычных ведаў па модулі

**Слоўнік паняццяў для засваення**: марфеміка, марфема, морф, аламорф, рэгулярныя марфемы, нерэгулярныя марфемы, прадуктыўныя марфемы, непрадуктыўныя марфемы, аснова, канчатак (флексія), словазменная аснова, формаўтваральная аснова, словаўтваральная аснова, невытворная аснова, вытворная аснова, суплетывізм, члянімая аснова, нечлянімая аснова, перарваная аснова, корань, свабодны корань, звязаны корань, афікс, конфікс, прэфікс, суфікс, постфікс, інтэрфікс, афіксоіды, суфіксоід, прэфіксоід, варыянты кораня, апрошчанне, перараскладанне, ускладненне, дээтымалагізацыя, дэкарэляцыя, замяшчэнне, дыфузія, словаўтварэнне, сінхроннае словаўтварэнне, дыяхроннае словаўтварэнне, вытворнае (матываванае) слова, невытворнае (нематываванае) слова, утваральнае (матывавальнае) слова, словаўтваральная (матывавальная) база (аснова), вытворнасць (матывацыя), словаўтваральны сродак (фармант), словаўтваральнае значэнне, словаўтваральнае гняздо, словаўтваральная пара, словаўтваральны ланцужок, спосаб словаўтварэння, словаўтваральны тып, словаўтваральная мадэль, словаўтваральная парадыгма, марфалагічнае словаўтварэнне, афіксацыя, абрэвіяцыя, марфалагічна-сінтаксічнае словаўтварэнне, субстантывацыя, ад'ектывацыя, пранаміналізацыя, адвербіялізацыя, лексіка-семантычнае словаўтварэнне, лексіка-сінтаксічнае словаўтварэнне.

### 2.1. Марфемная структура слова. Марфема

Пры напісанні раздзела быў выкарыстаны матэрыял вучэбнага дапаможніка «Сучасная беларуская літаратурная мова: Марфалогія: Вучэб. дапам. / Н.В. Гаўрош, М.Ц. Кавалёва, Н.М. Нямковіч і інш.; Пад агул. Рэд. праф. М.С. Яўневіча. – Мн.: Выд. Ул.М. Скакун, 1997. –

288 с.».

Слова – асноўная адзінка мовы. У слове вылучаюцца часткі, або марфемы. Паняцце «марфема» ўвёў у мовазнаўства І.А. Бадуэн дэ Куртэнэ ў 1870-х гг., і з таго часу гэта паняцце і тэрмін сталі ў лінгвістыцы агульнаўжывальнымі. Раздзел мовазнаўства, у якім вывучаюцца значымыя часткі слова – марфемы, іх разнавіднасці і функцыянаванне ў складзе слова называецца – **марфемікай**. Іншае значэнне гэтага тэрміна – сукупнасць марфем у мове. **Марфема** (грэч. *morphe* 'форма') – найменшая структурная значымая частка слова, якая выражае лексічнае або граматычнае значэнне; напрыклад: *зямл-я, пад-зем-н-ы, пры-бярэж-н-ы, за-гавар-ы-ць, на-чыт-а-ц-ца.* Да марфем адносяцца корань і афіксы: прыстаўка (прэфікс), суфікс, канчатак (флексія), постфікс, інтэрфікс (злучальны афікс). Марфемы ў слове размешчаны ў пэўным парадку: *за-рэч-н-ы, кніг-а, кніж-н-ы, кніг-арн-я, кніг-а-с-хов-ішч-а.* У слове можа быць адна *(там, тут, дзе, я)* або некалькі марфем *(даўг-а-веч-н-ы, за-па-вол-ен-а).*

Маючы пэўнае значэнне, марфемы адрозніваюцца ад гукаў і складоў, якія ніякіх значэнняў не выражаюць. Адрозніваюцца марфемы і ад слоў. Словы могуць адносна свабодна спалучацца адно з адным, а марфемы асобна не ўжываюцца і вылучаюцца толькі ў складзе слова: *навук-ов-ы, вуч-об-а, ганар-ы-ц-ца.*

Большасць марфем маюць пэўнае словаўтваральнае значэнне. Напрыклад, суфікс назоўнікаў *-іст- (-ыст-)* абазначае дзейную асобу: *веласіпед**ыст**, тэніс**іст**, самб**іст**, футур**ыст**.* А прыметнікавы суфікс *-іст-* мае значэнне 'які характарызуецца наяўнасцю, мае ўласцівасці, таго, што названа матывавальным словам': *балоцісты, вадзяністы, лясісты, глеісты.* Значымасць марфем праяўляецца не заўсёды выразна. Напрыклад, высокая ступень абагуленасці у паказчыках класа дзеясловаў – дзеяслоўных суфіксаў *-а-, -о-, -і-, -ы-, -е-: піс**а**ць, сядз**е**ць, мал**о**ць, хадз**і**ць,кас**і**ць, крыш**ы**ць.* Зусім неакрэсленае значэнне злучальных марфем у складаных і ў простых словах: *крыг**а**ход, земл**я**трус, амерык**а**нскі.* Але па той прычыне, што значэнне марфем не толькі сэнсавае, але і структурнае, то такія марфемы выконваюць структурна-семантычную функцыю.

У навуковай літаратуры ўжываюцца тэрміны «морф», «аламорф», «аламарфема». **Морф** – гэта непасрэдная рэалізацыя ў канкрэтным слове або словаформе больш агульнага, абстрактнага моўнага паняцця – марфемы (так, як гукі – канкрэтнае ўвасабленне больш абстрактнага моўнага паняцця – фанемы): *вад-а – пад-вод-н-ы – раз-воддз-е.* **Аламорф** (ад грэч. *allos* 'іншы' і *morphe* 'форма') – гэта варыянт морфа ў пэўнай пазі-

цыі. Напрыклад, *круг-, круж-, кружж-* – гэта аламорфы, у якіх рэалізуецца каранёвая марфема слоў *круг, кружыць, паўкружжа.* Тэрмін «аламарфема» мае тое самае значэнне, што і «аламорф».

## 2.2. Тыпы марфем

Пры напісанні раздзела быў выкарыстаны матэрыял дапаможніка «Марозава Я.Н. Тэарэтычныя асновы, заданні, узоры разбору, тэсты / Вучэбна-метадычны комплекс па сучаснай беларускай. – Віцебск: Выдавецтва УА ВДУ імя П.М. Машэрава, 2004. – 50 с.»

Марфемы адрозніваюцца паводле шэрагу прыкмет. <u>Па ролі ў слове</u> марфемы падзяляюцца на абавязковыя і неабавязковыя. **Абавязковыя** – гэта карані, без іх не можа быць слова. **Неабавязковыя** (службовыя, афіксальныя) – гэта афіксы, якія могуць быць у слове, а могуць і не быць.

<u>Па функцыі</u> афіксальныя марфемы падзяляюцца на:

**Словазменныя** – гэта канчаткі ўсіх зменных часцін мовы: няс-**ем**, бяр-**эм**, чытай-**ма**, зрабіў-□-ся, ч-**аго**-сь, к-**ім**-сьці, пяць-□-дзесят-□.

**Словаўтваральныя** прыстаўкі і суфіксы ўтвараюць новыя словы з новым лексічным значэннем: *група – пад-група; дзед – пра-дзед; шчасце – ня-шчасце; песня – песен-н-ы –* пясн-*яр; зіма – зім-ов-ы – зім-н-ік.* Словаўтваральных марфем у мове найбольшая колькасць.

**Формаўтваральныя** афіксы служаць для ўтварэння новай формы слова (лексічнае значэнне пры гэтым не змяняецца). Да іх адносяцца:

прыстаўка *най- і* суфіксы вышэйшай ступені параўнання прыметнікаў і прыслоўяў *-ейш- (-эйш-), -ей (-эй-), -ай, -ш-: зелянейшы, лягчэйшы, лепшы; далей, вышэй, лепш;*

суфіксы суб'ектыўнай ацэнкі: *мал**еньк**і, пес**еньк**а, мат**ульк**а, сын**очак**;*

суфіксы прошлага часу дзеясловаў: *прачыта**ў**, гаварыла, нёс;* трыванняў дзеясловаў: *звяз**ва**ць, запіс**ва**ць* і інш.

суфіксы інфінітыва (пачатковай формы дзеяслова) *-ць, -ці, -чы: чыта**ць**, нес**ці**, берагч**ы**.*

суфіксы дзеепрыметнікаў і дзеепрыслоўяў: *пасівелы, зрабі**ўшы**, прынесе**ны**, пасадж**аны**, змола**ты**,спёк**шы**, нос**ячы**, нес**учы**.*

постфікс *-ся(-ца, -цца)* у дзеясловах залежнага стану: *газета вычытваец**ца** карэктарам, бераг размываец**ца** вадою.*

постфікс -це, з дапамогай якога утвараецца форма 2-й асобы множнага ліку дзеясловаў загаднага ладу: *гавары – гавары**це**, нясі – нясі**це**, глянь – глянь**це**.* Часам яго называюць словазменным постфіксам.

прыстаўкі і суфіксы, што ўтвараюць формы дзеясловаў закончанага трывання, не мяняючы іх лексічнага значэння (у суадносных трывальных парах дзеясловаў): *пісаць – напісаць, чытаць – прачытаць, дапісаць – дапісваць.*

Калі ж пры далучэнні прыстаўкі ў вышэй названым выпадку не толькі ўтвараецца новая форма дзеяслова, а і змяняецца адценне яго лексічнага значэння, такія прыстаўкі называюць **словаформаўтваральнымі**, або **сінкрэтычнымі** (грэч. *sinkrētistos* 'аб'яднанне, злучэнне'), бо яны сумяшчаюць формаўтваральныя і словаўтваральныя функцыі. Напрыклад, прыстаўка *за-* паказвае на закончанае трыванне і адначасова – на пачатак дзеяння: *спяваць – заспяваць, іграць – зайграць.*

Паводле частотнасці ўжывання марфемы бываюць рэгулярныя і нерэгулярныя. **Рэгулярныя** марфемы ўжываюцца ў вялікай колькасці слоў, і словы гэтыя заўсёды аб'ядноўваюцца ў заканамерныя рады (словаўтваральныя або формаўтваральныя мадэлі). Напрыклад: *палі, лясы, гарады* і г. д. (канчатак *-і(-ы)* утварае форму множнага ліку); *белаваты, чырванаваты, кіславаты* і г. д. (суфікс *-ават-* надае словам адценне непаўнаты якасці). **Нерэгулярныя** марфемы спалучаюцца з невялікай колькасцю асноў, словы з такой марфемай не ўтвараюць заканамерных радоў. Напрыклад, нерэгулярны канчатак *-м* у 1-й асобе адзіночнага ліку маюць толькі нетэматычныя дзеясловы *есці* і *даць: е-м, да-м;* у 2-й і 3-й асобах гэтых дзеясловаў таксама нерэгулярныя канчаткі *-сі: я-сі, да-сі; -сць: е-сць, да-сць.*

Паводле здольнасці ўтвараць новыя словы ў сучаснай мове афіксы падзяляюцца на **прадуктыўныя**, якія і сёння ўтвараюць новыя словы (гл. прыклады рэгулярных афіксаў), і **непрадуктыўныя**, якія новых слоў сёння не ўтвараюць: *звана**р**, пека**р**, бараць**ба**, прось**ба**, нось**біт**, най**міт**, **пра**шчур, **пра**радзіма*. Нерэгулярныя афіксы заўсёды непрадуктыўныя, а рэгулярныя могуць быць і прадуктыўнымі і непрадуктыўнымі.

Па семантычных адносінах паміж сабой марфемы бываюць сінанімічнымі, мнагазначнымі, аманімічнымі, антанімічнымі. Марфемы рознага гукавога складу могуць мець аднолькавае ці блізкае значэнне. Такія марфемы называюцца **сінанімічнымі**; напрыклад, са значэннем 'дзейная асоба' выкарыстоўваюцца суфіксы *-шчык, -ыст: бетоншчык, каменшчык, трактарыст, матарыст*. Калі ж марфемы супадаюць гучаннем, але адрозніваюцца значэннем, яны выступаюць як **аманімічныя**; напрыклад, карані ў словах *падводны* і *перавод, пракос* і *перакос;* суфіксы *-нік (кіраўнік* і *бярэзнік), -іст (цымбаліст* і *лясісты);* канчаткі *-у (сястру, кнігу, сталу, бягу, нясу).*

Аманімічныя марфемы трэба адрозніваць ад **мнагазначных**. Мнагазначнасць развіваецца на базе пэўнага значэння марфемы ў выніку таго, што яно дэталізуецца ў словах з рознай, хоць і блізкай семантыкай. Напрыклад, суфікс *-ак(-як)* у назоўніках з прадметным значэннем выступае як мнагазначны, бо з яго дапамогай утвараюцца: 1) назвы прадметаў, прызначаныя для дзеяння *(дзяржак, чарпак);* 2) назвы прадметаў – аб'-

ектаў дзеяння *(стаяк);* 3) назвы прадметаў як вынік адпаведнага дзеяння *(здымак, скрутак).*

Бываюць і **антанімічныя** марфемы, маюць супрацьлеглае значэнне; напрыклад, прыстаўкі *пры- і ад-: прыехаць – ад'ехаць, у- і вы-: уехаць – выехаць.*

### 2.3. Аснова слова і канчатак

Пры напісанні раздзела быў выкарыстаны матэрыял вучэбнага дапаможніка «Сучасная беларуская літаратурная мова: Марфалогія: Вучэб. дапам. / Н.В. Гаўрош, М.Ц. Кавалёва, Н.М. Нямковіч і інш.; Пад агул. Рэд. праф. М.С. Яўневіча. – Мн.: Выд. Ул.М. Скакун, 1997. – 288 с.».

У мове ёсць словы нязменныя, г. зн. такія, якія не скланяюцца і не спрагаюцца: *летась, улетку, наперад, каб, няхай,* і зменныя, г. зн. словы, якія скланяюцца або спрагаюцца: *возера, лес, вялікі, праўдзівы, першы, які, гавару, раблю.* У словах, якія маюць формы словазмянення, вылучаюцца дзве часткі – аснова і канчатак. **Аснова** – частка слова, якая выражае яго канкрэтнае лексічнае значэнне: *узлесак – узлеск-а – узлеск-ам –* (на) *узлеск-у.*

**Канчатак**, або **флексія** (лац. *flecto* 'гну, згінаю'), – частка слова, якая служыць для сувязі слоў у сказе і ўтварае граматычную форму слова. Напрыклад: *радзім-а, радзім-ы, радзім-е, радзім-у, радзім-ай* – тут канчаткі ўтвараюць формы склону; *няс-у, няс-еш, няс-е, няс-ём, нес-яце, няс-уць* – канчаткі утвараюць формы асобы і ліку. Такім чынам, канчаткі – паказчыкі толькі граматычных значэнняў, лексічнага значэння слова яны не змяняюць.

Канчаткі вылучаюцца шляхам параўнання розных формаў аднаго зменнага слова: *хат-а – хат-ы – хат-у – хат-ай –* (у) *хац-е.* Нязменныя словы канчаткаў не маюць. Напрыклад, у прыслоўях *весел-а, па-нов-аму, у-верс-е, з-лёг-к-у* выдзеленыя часткі – не канчаткі, а суфіксы.

У некаторых формах зменных слоў няма матэрыяльна выражаных канчаткаў, г. зн. выражаных гукам ці комплексам гукаў, напрыклад у назоўным склоне назоўнікаў (а для неадушаўлёных – і ў вінавальным) адзіночнага ліку мужчынскага роду 2-га скланення: *стол, гай, чалавек, бераг, горад;* у родным склоне назоўнікаў множнага ліку жаночага роду 1-га скланення: *дарог, зорак, ліній, экспедыцый; у* назоўным-вінавальным склоне назоўнікаў адзіночнага ліку жаночага роду 3-га скланення: *сенажаць, ноч, вільгаць.* У такіх словах **нулявы канчатак**. Нулявы канчатак – таксама паказчык граматычнай формы. Напрыклад, у сказе *Брат вярнуўся з горада* слова *брат* мае форму назоўнага склону адзіночнага ліку, выражае значэнне суб'екта дзеяння. Слова *зорак* у любым тэксце – форма роднага склону множнага ліку, бо яна ўваходзіць у сістэму

склонавых формаў з канчаткамі: *зорк-а, зорк-і, зорц-ы і* г. д. Нулявы канчатак бывае ў дзеяслоўных формах. Напрыклад, у формах прошлага часу тыпу *нёс, плыў* нулявы канчатак – паказчык мужчынскага роду адзіночнага ліку (параўн. канчаткі *-а, -о* ў формах жаночага і ніякага роду: *несл-а, плыл-а, плыл-о;* канчатак *-і* ў форме множнага ліку: *несл-і, плыл-і).*

Існуюць тры тыпы асноў: **словазменная** аснова (частка слова без словазменных марфем – канчаткаў) – вызначаецца звычайна пры марфемным разборы; **формаўтваральная** аснова (частка слова без канчаткаў і формаўтваральных афіксаў); **словаўтваральная** аснова (частка слова ці слоў без словаўтваральнага сродку – фарманта).

Паводле структуры асновы падзяляюцца на невытворныя і вытворныя.

**Невытворная** – гэта аснова, якая супадае з коранем слова: *вад-а, хат-а, нов-ы, свеж-ы.* **Вытворная** – аснова, у якую, апрача кораня, уваходзяць афіксы: *вясёл-к-а, пра-лес-ка, пры-бярэж-н-ы, над-нёман-ск-і, уз-мор-j-э, кніж-к-а.* Вытворныя асновы складаюцца з дзвюх і больш марфем. Словы з такімі словамі звычайна ўтвораны ад іншых слоў з дапамогай афіксаў.

Паміж вытворнай і невытворнай асновамі існуе адрозненне ў выражэнні лексічнага значэння: сэнс невытворнай асновы заключаецца непасрэдна ў корані, у адной марфеме: *гар-а, вад-а, пол-е,* а сэнс вытворнай асновы складаецца са значэнняў некалькіх марфем (якія ў яе ўваходзяць): *пад-вод-н-ы, за-воч-н-ы, во-клад-к-а.* Словы з невытворнай асновай – гэта **нематываваныя** словы, умоўныя абазначэнні прадметаў рэчаіснасці: *акн-о, рак-а, стол,* а словы з вытворнай асновай – **матываваныя**, г. зн. яны абазначаюць прадметы праз іх сувязь з іншымі прадметамі: *пад-акон-н-ік, за-рэч-н-ы, на-столь-н-ік.*

Вытворная і невытворная асновы адрозніваюцца і марфалагічна: невытворную аснову нельга падзяліць на структурныя часткі: *сад, сін-і, трав-а, гавар-у,* а вытворная дзеліцца на часткі, якія маюць пэўнае значэнне: *гарад-ск-і, па-воль-н-ы, маўк-лів-ы.* Вытворная аснова залежыць ад невытворнай. Любая аснова толькі тады з'яўляецца вытворнай, калі ў мове ёсць адпаведная невытворная аснова, суадносная з ёй семантычна і граматычна: *вішн-ёв-ы – вішн-я, на-сцен-н-ы – сцян-а.* Калі па якой-небудзь прычыне знікае адпаведная невытворная аснова або калі страчваецца сувязь паміж роднаснымі словамі, вытворная аснова становіцца невытворнай. Напрыклад, слова *абруч* раней мела вытворную аснову: прыстаўку *аб-,* корань *-руч.* Аснова *абруч* суадносілася з адпаведнай невытворнай асновай *-рук- (-руч-);* параўн. *рук-а, руч-н-ы, з-руч-н-а* і інш. Сувязь з коранем *-рук-* страцілася, і аснова слова *абруч*

успрымаецца як невытворная.

Сустракаюцца выпадкі, калі суадносныя граматычныя формы маюць розныя асновы: *я – мян-е, мн-е, мною; ты – цябе, таб-е, таб-ою; мы – н-ас, н-ам, н-амі і* інш. Такія асновы называюцца **суплетыўнымі** (фр. *supplétif* 'дадатковы').

Суплетывізм – адзін са сродкаў утварэння пэўных формаў слова, напрыклад склону: *мы* – нас; ліку: *чалавек – людзі;* ступені параўнання: *добры – лепшы, вялікі – большы, мала – менш, дрэнна – горш;* трывання: *класціся – легчы, браць – узяць.*

Побач з вытворнай і невытворнай асновай адрозніваюць члянімую і нечлянімую аснову. **Члянімая** аснова мае ў сваім складзе больш за адзін морф: *ліст-ок, жаўт-ават-ы, уз-лес-ак.* **Нечлянімая** аснова – аснова ў склад якой уваходзіць толькі адзін морф – корань: *метро, там.* Паняцце «члянімасць асновы» больш шырокае за паняцце «вытворнасць асновы»: калі аснова вытворная, яна заўсёды члянімая. Члянімая аснова можа быць вытворнай, а можа быць і невытворнай: *чыт-а-ць, кур-ыц-а.*

У словах з постфіксамі аснова **перарваная** на месцы канчаткаў, у тым ліку і нулявых. Постфіксы ўключаюцца ў аснову слова і захоўваюцца ва ўсіх яго формах.

### 2.4. Корань і афіксы

Пры напісанні раздзела быў выкарыстаны матэрыял вучэбнага дапаможніка «Сучасная беларуская літаратурная мова: Марфалогія: Вучэб. дапам. / Н.В. Гаўрош, М.Ц. Кавалёва, Н.М. Нямковіч і інш.; Пад агул. Рэд. праф. М.С. Яўневіча. – Мн.: Выд. Ул.М. Скакун, 1997. – 288 с.».

**Корань** – агульная непадзельная частка роднасных слоў, якая выражае іх агульнае лексічнае значэнне: *дарог-а – дарож-н-ы – падарожж-а – па-дарож-нік – з-дарож-ы-ц-ца.* Непадзельная частка *дарог- (дарож-)* паказвае на агульнае лексічнае значэнне гэтых слоў: усё, звязанае з паняццем «дарога». Канкрэтнае лексічнае значэнне кожнага з адзначаных слоў выражае аснова: *дарожн-ы, падарожнік, па-дарожж-а і* інш. Каб вызначыць корань слова, трэба падабраць роднасныя словы: *лес – лясны – ляснік – узлессе – пералесак – пралеска – Палессе; мароз – марозны – марозна – марозіць; краска – красавац – красаванне і інш.* Пры гэтым трэба ўлічваць, што гукавы склад кораня і яго графічнае (літарнае) абазначэнне не заўсёды супадаюць. Напрыклад, у словах *край, краіна, ускраіна* корань *край-: крај-ін-а, ус-крај-ін-а,* хоць на пісьме гукі [j] (ёт) і [і] ў словах *краіна, ускраіна* абазначаны адной літарай *і.*

Карані падзяляюцца на свабодныя і звязаныя. **Свабодныя** – гэта такія карані, якія ўжываюцца ў спалучэнні з рознымі прыстаўкамі і суфіксамі, а таксама ў спалучэнні толькі з канчаткам, г. зн. могуць выступаць

як невытворныя асновы: *рад-ы, рад-асць; вясн-а, вясн-ов-ы; пчал-а, пчал-яр; вад-а, па-вод-к-а; дуб, дуб-няк.* Большасць слоў мае свабодныя карані.

**Звязанымі** называюцца карані, якія асобна ў мове не ўжываюцца, а толькі ў спалучэнні з афіксамі, г. зн. толькі ў складзе вытворнай асновы: *пры-вык-ну-ць – ад-вык-ну-ць – з-вык-ну-ц-ца – з-выч-ай – з-выч-ай-н-ы – пры-выч-к-а – з-выч-к-а.* У прыведзеных роднасных словах вылучаецца агульная частка *-вык- (-выч-).* Гэта і ёсць корань, які ва ўсіх прыкладах вельмі цесна звязаны з прыстаўкамі і суфіксамі і асобна ўзяты не ўжываецца. У словах *дабавіць, прыбавіць, адбавіць* корань *-бав-* таксама звязаны, ён існуе толькі ў спалучэнні з суфіксамі і прыстаўкамі. Без іншых марфем лексічнае значэнне звязанага кораня незразумела: *пры**няць**, пера**няць**, пад**няць**, уз**няць**, з**няць**, аб**няць**, су**няць**; аб**уць**, раз**уць**, аб**ут**ак* і інш. Такія звязаныя карані ніколі не выступаюць як простая, невытворная аснова; яны вылучаюцца толькі ў выніку параўнання дзвюх ці больш вытворных асноў роднасных слоў.

**Афікс** (лац. *affixus* 'прымацаваны') – марфема, якая служыць для ўтварэння новых слоў ці новых граматычных формаў: *мора – прыморскі, будаваць – збудаваць, разумны – разумнейшы, радаваць – радавацца.* Да афіксаў адносяцца прыстаўкі, суфіксы, інтэрфіксы, постфіксы. Некаторыя вучоныя да афіксаў адносяць і канчаткі. У навуковых граматыках часам вылучаюць яшчэ адзін тып марфемы – **конфікс** (лац. *confixum* 'разам узятае'). Конфікс складаецца з дзвюх частак, якія пры словаўтварэнні выкарыстоўваюцца комплексна, як нешта адзінае, напрыклад: *гаварыць – **з**гаварыц**ца**, зіма – **за**зім**ак*** (прыстаўка *з-* і постфікс *-ца,* прыстаўка *за-* і суфікс *-ак* выкарыстоўваюцца пры ўтварэнні гэтых слоў разам).

**Прыстаўка**, або **прэфікс** (лац. *praefixum prae* 'спераду', *fixum* 'прымацаваны'), – частка асновы, якая стаіць перад коранем і надае слову новае лексічнае або граматычнае значэнне: *за-цвісці, ад-цвісці, на-рваць, пера-плысці, най-лепшы.* Прыстаўка можа знаходзіцца не непасрэдна перад коранем, а перад другой прыстаўкай (дзве прыстаўкі ў слове): *па-на-пісваць, па-на-сыпаць, па-пры-носіць, па-за-вяз-ваць.*

**Суфікс** (лац. *suffixus* 'падстаўлены') – частка асновы, якая стаіць пасля кораня і ўтварае новую форму або новае слова: *сад – сад-ок – сад-ов-ы.* Суфікс можа быць не толькі непасрэдна пасля кораня, а і пасля іншага суфікса: *гад-ав-ін-а, за-гарт-оў-к-а, сард-эч-н-ы.*

У навуковых граматыках у словах выдзяляюць не толькі матэрыяльна выражаныя, а і нулявыя суфіксы (іх абазначаюць графічна *Ø);* напрыклад, у назоўніках з падаўжэннем каранёвага зычнага, у якіх у старажытнасці пасля падзення рэдукаваных суфікс *-j-* быў асіміляваны папярэднім зычным: *багаццØе, прыволлØе, узлессØе, узбярэжжØа.* Суфі-

ксы ў словах такога тыпу фанемай не выражаны, яны вызначаюцца шляхам супастаўлення іх з суадноснымі словамі, дзе не адбылося падаўжэння і захаваўся суфікс *-j-*: *узморjэ, перjэ, купjо.*

Нулявыя суфіксы вызначаюцца ў назоўніках, утвораных ад асноў дзеясловаў або прыметнікаў без далучэння словаўтваральных афіксаў: *вылетØ* (ад *вылятаць), пераходØ* (ад *пераходзіць), засухØа* (ад *засушыць), абаронØа* (ад *абараняць); сушØ* (ад *сухі), чырваньØ* (ад *чырвоны), сіньØ* (ад *сіні).*

Да нульсуфіксальных утварэнняў адносяць таксама парадкавыя лічэбнікі: *пятØы* (ад *пяць), сотØы* (ад *сто);* некаторыя адносныя і прыналежныя прыметнікі, утвораныя ад назоўнікаў і дзеясловаў: *воўчØы* (ад *воўк), мядзвежØы* (ад *мядзведзь), прыезджØы* (ад *прыязджаць), прахожØы* (ад *праходзіць)* і інш.

**Постфікс** (лац. *post* 'пасля', *fixus* 'прымацаваны') – афікс, які знаходзіцца ў слове пасля канчатка ці формаўтваральнага суфікса. Да постфіксаў належаць *-ся (-ца, -цца)* у формах зваротных дзеясловаў: *сустрэў – сустрэў-ся, сустрэла – сустрэла-ся, сустрэць – сустрэц-ца, мыеш – мыеш-ся, мые – мые-цца, мыц-ца* (У навуковай літаратуры постфікс -ся (-ца, -цца) яшчэ называюць пафлексійным суфіксам (знаходзіцца пасля флексіі)*; -це* ў форме 2-й асобы множнага ліку дзеясловаў загаднага ладу: *чытай-це, нясі-це; -сьці(-сь), -небудзь* у няпэўных займенніках: *хтосьці, чагосьці, чыясь, штось, які-небудзь.* У сучаснай мове *-ся(-ца, -цца), -це, -сьці(-сь), -небудзь* не могуць ужывацца свабодна ў сказе, не могуць быць аддзелены іншым словам ад слова, да якога адносяцца, ці пастаўлены перад ім. Як суфіксы і прыстаўкі, яны таксама немагчымыя па-за словам. Гэтыя былыя часціцы поўнасцю перайшлі ў марфемы, захаваўшы асаблівасць размяшчацца пасля канчатка.

**Інтэрфікс** (лац. *inter* 'паміж', *fixus* 'прымацаваны') – службовая марфема, якая стаіць паміж простымі асновамі ў складаным слове і паказвае на сувязь гэтых асноў і іх значэнняў. У складаных словах выкарыстоўваюцца інтэрфіксы *а, о, е, я, і, ух, ох, у: сен-а-кос, час-о-піс, земл-е-трасенне, дал-я-гляд, пяц-і-павярховы, дв-ух-тыднёвы, тр-ох-павярховы, дв-у-коссе.* Інтэрфіксы не выражаюць ніякага значэння, а служаць для сувязі марфем у складаных словах.

Інтэрфіксы бываюць і ў простых словах. Напрыклад, у большасці адносных прыметнікаў, утвораных ад асноў геаграфічных назваў, суфікс *-ск-* далучаецца непасрэдна да ўтваральнай асновы: *Лід-а – лід-ск-і, Барысаў – барысаў-ск-і, Мазыр – мазыр-ск-і* і інш. А ў частцы прыметнікаў такога тыпу паміж утваральнай асновай і суфіксам *-ск-* ёсць інтэрфіксы (устаўкі): *-ен-(-ан-): Узд-а – уздз-ен-ск-і, Лезн-а – лёзн-ен-ск-і, Гарадзішч-а – гарадзішч-ан-ск-і, Любч-а – любч-ан-ск-і; -оў-(-аў-): Стоўбц-ы*

*– стаўбц-оў-ск-і, Ветк-а – ветк-аў-ск-і; -ан-(-ян-): Орш-а – арш-ан-ск-і, Нарач – нарач-ан-ск-і, Рудн-я – рудн-ян-ск-і, Нароўл-я – нараўл-ян-ск-і; -ін-: Ясельд-а – ясельдз-ін--ск-і* і інш. Параўн. таксама: *чай-н-ы* і *кафе-й-н-ы, шасэ-й-н-ы* (у апошніх двух словах *-й-* інтэрфікс).

Да каранёвых марфем адносяцца афіксоіды. **Афіксоіды** (лац. *affixus* 'прымацаваны, «падобны да афіксаў»') – такія каранёвыя марфемы складаных слоў, якія па сваёй функцыі набліжаюцца да суфіксаў і прыставак. Напрыклад, у словах *моваевед, славянавед, прававед, мангалавед* паўтараецца марфема *-вед,* падобная да суфікса (са значэннем 'той, хто вывучае што-небудзь'). Іншы раз такую каранёвую марфему можна замяніць сінанімічным суфіксам, параўн. *славяна-вед – слав-іст.* Афіксоіды – марфемы пераходнага тыпу. Рэгулярна паўтараючыся, яны выконваюць ролю словаўтваральных марфем, але яшчэ не страцілі сэнсавай сувязі і суадноснасці з адпаведнымі невытворнымі асновамі; параўн. *моавед* і *ведаць, веды.*

Афіксоіды, падобныя да суфіксаў, называюць **суфіксоідамі** (абазначаюцца значком перавернутага суфікса): *біёлаг, філолаг, заолаг, фізіёлаг,* падобныя да прыставак – **прэфіксоідамі**: *паўмесяц, паўкруг, паўкажушак, паўмісак* (тут *паў-* не патрабуе, як у іншых выпадках, ад назоўніка формы роднага склону і набліжаецца да прыстаўкі).

Адна і тая марфема можа мець разнавіднасці. Напрыклад, гукавы склад кораня можа мяняцца ў выніку дзеяння тых ці іншых фанетычных працэсаў: *кніга – кніжны, доўгі – даўжыня – здоўжыцца, слухаць – слых – слушны, жаць – жну – дажынкі, есці – ежа – ядуць – ем – ясце, кідаць – кінуць, кладу – класці – кладзеш.* Відазмяненні кораня, што ўзніклі ў выніку тых ці іншых фанетычных працэсаў, называюцца гукавымі **(фанетычнымі) варыянтамі (або мадыфікацыямі) кораня**. Адзінства кораня не парушаецца, бо гэта гукавыя (фанетычныя) варыянты кораня роднасных, генетычна звязаных паміж сабой слоў: *рука – ручны – падручнік; кветка – квітнець; гром – грымоты.*

У мове ёсць гукавыя варыянты не толькі кораня, але і іншых. марфем, напрыклад прыставак – *аб-, аба-: абмовіцца, абагрэцца; з-, с-, са-: збіраць, сказаць, сабраць; раз-, рас-, раза-: разгарнуць, раскласці, разагнуць; у-, ува-: убегчы, увайсці; пад-, пада-: паднесці, падагрэць; ад-, ада: адвезці, адаслаць і* інш. Ва ўсіх групах прыкладаў – фанетычныя варыянты адной прыстаўкі. Ужыванне іх залежыць ад пачатковых гукаў кораня: перад звонкімі і санорнымі ўжываюцца прыстаўкі *з-, уз-, раз-, без-(бяз-): зберагчы, узняць, развеяць, бязмежны,* а перад глухімі – *с-, ус-, рас-, бес-(бяс-): спісаць, успомніць, раскінуць, бяскрайні;* перад збегам зычных з'яўляецца беглы гук [а]: *разаслаць, абагнаць, падабраць.*

Сустракаюцца і варыянты суфіксаў; напрыклад, *-ок(-ак), -к-: па-*

*ясок – паяска, кубак – кубка; -ва-, -ыва-, -іва-: абдумваць, праветрываць, атрымліваць.*

У некаторых склонавых формах назіраюцца варыянты канчаткаў. Напрыклад, у творным склоне назоўнікаў і прыметнікаў жаночага роду ўжываюцца варыянтныя канчаткі *-ой(-ою), -ай(-аю), -ёй(-ёю), -яй ('яю) вадой (вадою), краінай (краінаю), зямлёй (зямлёю), песняй (песняю), маладой (маладою), летняй (летняю);* у родным склоне прыметнікаў жаночага роду – варыянты канчаткаў *-ой(-ое), -ай(-ае), -яй (яе); дарагой (дарагое) радзімы, калгаснай (калгаснае) нівы, летняй (летняе) ночкі.*

Варыянты марфем бываюць двух тыпаў. Адны з іх не могуць узаемазамяняцца ў слове і залежаць ад пазіцыі, ад змен галосных і зычных гукаў *(горад, гарад-ы, (у) горадзе-е, гарадж-анін).* Другія не залежаць ад пазіцыі ў слове і могуць свабодна ўзаемазамяняцца *(прыгожай песняй і прыгожаю песняю, роднай зямлі і роднае зямлі).*

### 2.5. Змены ў марфемнай структуры слова

Пры напісанні раздзела быў выкарыстаны матэрыял вучэбнага дапаможніка «Сучасная беларуская літаратурная мова: Марфалогія: Вучэб. дапам. / Н.В. Гаўрош, М.Ц. Кавалёва, Н.М. Нямковіч і інш.; Пад агул. Рэд. праф. М.С. Яўневіча. – Мн.: Выд. Ул.М. Скакун, 1997. – 288 с.».

Марфемная структура некаторых слоў з часам можа змяняцца. Прычыны такіх змен бываюць розныя:

страта сэнсавай сувязі паміж роднаснымі словамі і фанетычныя змены ў іх: *вока і акно, тхор* і *дыхаць, канец* і *дасканалы;*

выпадзенне з мовы асобных устарэлых слоў, ад якіх утварыліся іншыя словы; так, перастала дзяліцца на марфемы аснова слова *прымы,* якое паходзіць ад старажытнага кораня *им- (имати, иму)* і прыстаўкі *при-;*

страта прадуктыўнасці асобных суфіксаў і прыставак, напрыклад, суфікса *-р-*; *стары, добры, востры* і інш. Часам структура таго ці іншага слова змяняецца ў выніку некалькіх прычын.

**Апрошчанне** – такая змена марфемнай будовы слова, пры якой былая падзельная, вытворная аснова ўспрымаецца як непадзельная, невытворная. У выніку структура слова становіцца больш простай. Напрыклад, у слове *дар* раней вылучаўся корань *да- і* суфікс *-р* (параўн. дзеяслоў *да-ць).* У сучаснай мове гэта слова мае невытворную аснову: суфікс *-р* зліўся з коранем, адбылося апрошчанне. Сучаснае беларускае *нашчадак* – ад таго самага кораня, што і старажытнае *чадо* (дзіця). У старажытнай беларускай мове гэта слова мела вытворную аснову. Пазней адбыліся фанетычныя змены (выпадзенне рэдукаваных гукаў, прыпадабненне [с] да наступнага шыпячага [ч]), страцілася сэнсавая сувязь са

словам *чадо.* У выніку змянілася і будова слова, аснова перастала дзяліцца на марфемы: *нашчадак – нашчадк-і* (аснова слова супадае з коранем). У слове *жыта* этымалагічна вылучаецца корань *жы-* (параўн. *жы-ць) і* суфіке *-т-*; у сучаснай мове гэта слова з невытворнай асновай – адбылося апрошчанне. Дзякуючы апрошчанню мова папаўняецца каранёвымі марфемамі, якія становяцца цэнтрамі новых словаўтваральных гнёздаў, параўн.: *жыта – жытні – жытнік – жытніца – жытнішча* і інш.

Адрозніваюць поўнае і няпоўнае апрошчанне. Пры **поўным** сляды ранейшай вытворнасці зусім страціліся, а пры няпоўным – захоўваюцца. У слове *жыта* этымалагічна вылучаецца корань *жы-* (можна параўнаць са словам *жы-ць) і* суфікс *-т-*; у сучаснай мове гэта слова з невытворнай асновай – адбылося апрошчанне. Дзякуючы апрошчанню мова папаўняецца каранёвымі марфемамі, якія становяцца цэнтрамі новых словаўтваральных гнёздаў, параўн.: *жыта – жытні – жытнік – жытніца – жытнішча* і інш.

**Перараскладанне** – такая змена ў будове слова, пры якой гук або некалькі гукаў адрываюцца ад адной марфемы і далучаюцца да другой. Аснова слова застаецца вытворнай, аднак пачынае дзяліцца на марфемы іншага гукавога складу. Напрыклад, слова *унутры* мела раней выгляд *вънутри,* у ім вылучаліся прыстаўка *вън-,* корань *-утр-* (параўн. старажытнае *утроба,* сучаснае *вантробы),* суфікс *-и-*. Прыстаўка *вън-* пасля падзення рэдукаваных набыла выгляд *вн-,* зычны [н] далучыўся да кораня. У сучаснай мове гэта слова дзеліцца на іншыя марфемы – прыстаўку *у-,* корань *-нутр-,* суфікс *-ы;* параўн. аднакаранёвыя *нутр-о, нутр-ан-ы.*

Перараскладанне садзейнічае ўзбагачэнню мовы новымі словаўтваральнымі сродкамі. Напрыклад, у словах тыпу *недалічыць, недаказаць, недавыканаць, недабор, недагляд* у адну прыстаўку *неда-* зліліся прыстаўкі *не-* і *да-,* гэта – вынік перараскладання ў асновах слоў. Дзякуючы перараскладанню ўтварыліся некаторыя вытворныя суфіксы назоўнікаў, напрыклад *-льнік: будзільнік, выключальнік, -альн-(яльн-): натуральны, індустрыяльны* і інш.

Пры перараскладанні, такім чынам, змяняецда гукавы склад марфем (колькасць гукаў у марфеме павялічваецца ці змяншаецца за кошт суседніх марфем) або колькасць марфем у слове (дзве прыстаўкі аб'ядноўваюцца ў адну, два суфіксы – у адзін).

Зрэдку сустракаецца працэс **ускладнення**, у выніку якога невытворная аснова пачынае дзяліцца на марфемы, становіцца вытворнай. Ускладненне найчасцей уласціва запазычаным словам. Напрыклад, грэчаскае слова *анархія* мела невытворную аснову, але ў сувязі з узнікненнем роднасных слоў *анархіст, анархічны і* іншых аснова яго стала дзяліцца

на корань *анарх-* і суфікс *-іј-(анарх-іј-а).*

Часта разам са зменай структуры слова адбываецца яго **дээтымалагізацыя** – страта першапачатковага значэння і генетычнай сувязі з аднакаранёвымі словамі. Значэнне слова становіцца нематываванае. Напрыклад, назоўнік *крыўда,* утвораны ад прыметніка *крывы,* падзяляўся на корань *крыў-,* суфікс *-д-,*канчатак *-а.* Цяпер значэнне слова *крыўда* не звязваецца са значэннем *крывы.* Адбыліся змены і ў аснове слова: суфікс *-д-* стаў часткай кораня, аснова перастала дзяліцца на марфемы.

**Дэкарэляцыя** – гэта такія змены ў марфемнай будове вытворнага слова, у выніку якіх знешняя структура слоў не змянілася (не змянілася ні колькасць марфем, ні іх межы, ні іх гукавы склад), але змяніўся характар марфем або значэнне марфем, іх функцыя і суадносіны ў слове. Напрыклад, назоўнік *вайна* яшчэ ў агульнаславянскі перыяд утварыўся пры дапамозе суфікса *-н-* ад назоўніка *вои* (што значыць *воін*). Сёння ён так жа дзеліцца на марфемы, але матывуецца дзеясловам *вај-ав-а-ць*.

**Замяшчэнне** – гэта замена адной марфемы іншаю, пры гэтым марфемны склад члянімай асновы ў колькасных адносінах застаецца ранейшым. Напрыклад, у агульнаславянскай мове было слова *зин-иц-а*, утворанае ад гукапераймання *зинь*. Пад уплывам народнаэтымалагічнага збліжэння з *сін-і* корань *зін'-* змяняецца на *сін-*.

**Дыфузія** (фузія, інтэрферэнцыя морфаў, накладанне морфаў (марфем), аплікацыя морфаў) – гэта зліццё, узаемапранікненне марфем пры захаванні імі ў той жа час выразнай самастойнасці. Адна з самых важных прычын дыфузіі – сцяжэнне аднолькавых галосных ці зычных. Дыфузія назіраецца:

1. На стыку прыстаўкі і кораня: *прымаць – пры+ім+а+ць, расада – рас+сад+а, разява – раз+зяв+а.*

2. На стыку кораня і суфікса (ці на стыку 2 суфіксаў):

а) гэта інфінітывы на *-чы*, у якіх яшчэ ў дапісьмовы перыяд у гуку [ч] аб'ядналіся [к] каранёвы і [т] інфінітыўны: *пячы – пяк+чы (пек +ти);* [т] каранёвы і [т] інфінітыўны: *расці – раст+ці;*

б) адносныя прыметнікі з суфіксам *-ск-* і каранёвымі *-ск- або -цк-, -с-, -к-, -ч-, -т-: віцебскі – віцебск+ск+і, рускі – рус+ск+і, разбойніцкі – разбой+н+ік+ск+і, брэсцкі – брэст+ск+і;*

в) дзеясловы з суфіксам *-ну-* на стыку з каранёвым *-н-: пнуць – пн+ну+ць;*

г) якасныя прыметнікі з суфіксам непаўнаты якасці *-ават- (-яват-)* і каранёвым *-ав- (-яв-): лілаваты – лілав+ават+ы.*

3. У складаных словах спляценне частак у выніку накладання двух аднолькавых складоў з фанетычнага пункту погляду называюць яшчэ гаплалогіяй: *дзік**а**браз – дзік**аа**браз – вобраз дзіка; мінерал**о**гія – мінерал**а**-*

*логія.*

## 2.6. Паняцце аб словаўтварэнні

Пры напісанні раздзела быў выкарыстаны матэрыял дапаможніка «Словаўтварэнне: Вучэбна-метадычны дапаможнік для студэнтаў філалагічных факультэтаў / складальнік Я.Н. Марозава. – Віцебск: Выдавецтва Віцебскага дзяржаўнага універсітэта, 1995 – 39 с.»

Лексіка беларускай мовы ўзбагачалася і ўзбагачаецца пераважна за кошт утварэння новых слоў на базе наяўнага моўнага матэрыялу пры дапамозе тых ці іншых сродкаў і спосабаў: *калгас – калгас-н-ы, калгас-нік, калгас-ніц-а; космас – касма-наўт, касма-дром.* Словаўтварэнне – асноўная крыніца папаўнення і ўзбагачэння слоўніка нашай мовы. Новыя словы звычайна ўтвараюцца са словаўтваральных элементаў і па словаўтваральных узорах, мадэлях, ужо вядомых мове. Напрыклад, слова *цалiннiк* узнікла параўнальна нядаўна, яно ўтворана пры дапамозе вядомага суфікса *-нік* ад слова *цаліна.* Словы *лётчык, зенітчык* утварыліся пры дапамозе суфікса *-чык* ад асноў *лёт-, зеніт-,* як і словы з гэтым суфіксам *перапісчык, грузчык і* інш., што ўжываюцца ў нашай мове даўно. Значымыя часткі, напрыклад, слова *атамшчык* існавалі і раней (ужывалася слова *атам,* быў суфікс *-шчык),* слова ж *атамшчык* – камбінацыя гэтых частак – з'явілася параўнальна нядаўна.

Такім чынам, пад **словаўтварэннем** трэба разумець утварэнне новых слоў з вядомых мове словаўтваральных элементаў адпаведнымі спосабамі. Словаўтварэннем называюць таксама раздзел мовазнаўства, у якім вывучаецца структура вытворных слоў, шляхі і сродкі ўтварэння новых лексічных адзінак, апісваецца іх сістэма.

Новаўтвораныя словы далучаюцца да тых граматычных класаў слоў (часцін мовы), якія ўжо існуюць у мове, і, як правіла, набываюць уласцівыя ім граматычныя катэгорыі.

Структура вытворных слоў на працягу гістарычнага развіцця мовы можа мяняцца. Адпаведна мяняюцца і адносіны матываванасці паміж аднакарэннымі словамі. У сувязі з гэтым сучасная мовазнаўчая навука адрознівае сінхроннае і дыяхроннае словаўтварэнні. **Сінхроннае** словаўтварэнне разглядае сэнсавыя і фармальныя сувязі паміж аднакарэннымі словамі на пэўным этапе развіцця мовы (напрыклад, сучасныя), сістэму словаўтваральных сродкаў, якія функцыянуюць у той ці іншы перыяд існавання мовы. **Дыяхроннае** словаўтварэнне вывучае гістарычную паслядоўнасць утварэння слоў у мове і змены, якія адбываюцца ў структуры вытворных слоў у працэсе развіцця мовы. Таму сінхронная і дыяхронная інтэрпрэтацыі (тлумачэнні) словаўтваральных сувязей паміж словамі могуць не супадаць.

Словаўтваральная сістэма мовы апісваецца ў наступных асноўных

паняццях: вытворнае (матываванае) слова; невытворнае (нематываванае) слова; утваральнае (матывавальнае) слова; словаўтваральная (матывавальная) база (аснова); вытворнасць (матывацыя); словаўтваральны сродак (фармант); словаўтваральнае значэнне; словаўтваральнае гняздо; словаўтваральная пара; словаўтваральны ланцужок; спосаб словаўтварэння; словаўтваральны тып; словаўтваральная мадэль; словаўтваральная парадыгма.

**Вытворнае (матываванае) слова** – гэта слова, утворанае ад іншага слова ці словазлучэння. Самай асноўнай асаблівасцю вытворных слоў з'яўляецца іх матываванасць іншымі словамі, г.зн, іх значэнне абумоўлена (матывавана) значэннем іншых слоў. Вытворнае слова заўсёды двухкампанентнае: яно складаецца з утваральнай (матывавальнай) часткі і фарманта (словаўтваральнага сродка). Напрыклад: *белы → белаваты, зарадзіць, → перазарадзіць*. Тут утваральныя часткі – *бел-*, і *-зарадзіць*, а фарманты – *-ават-* і *пера-*. Значэнні вытворных слоў *белаваты* і *перазарадзіць* матываваны значэннямі ўтваральных частак – адпаведна прыметніка *белы* (*белаваты* – 'крыху белы, не цалкам белы') і дзеяслова *зарадзіць* (*перазарадзіць* – 'зарадзіць зноў, паўторна').

**Невытворнае (нематываванае) слова** – слова, не ўтворанае ад іншых слоў, слова з нематываваным значэннем: *стол, фае, тут, чытаць*. Да невытворных адносяць таксама нематываваныя словы са словаўтваральнымі афіксамі і звязаным коранем тыпу: *аб-у-ць – раз-у-ць, рас-прэг-чы, вы-праг-чы, у-ключ-ы-ць, вы-ключ-ы-ць, з-не-важ-а-ць, па-важ-а-ць*.

**Утваральае (матывавальнае) слова** – слова, ад якога непасрэдна утворана дадзенае вытворнае слова.

**Словаутваральная (матывавальная) база** – гэта нефармантная частка вытворнага слова, агульная з утваральным словам (з улікам магчымых марфаналагічных відазмяненняў).

Для абазначэння паняцця «матывавальная база» (тэрмін У.У. Лапаціна) у лінгвістычнай літаратуры існуюць таксама тэрміны «зыходная база» (М.А. Цімафееў), «базавая аснова» (Н.А. Янка-Трыніцкая), «утваральная аснова» (Л.М. Шакун) і інш.

Словаўтваральнай (або матывавальнай) базай можа быць не толькі поўная аснова, але і ўсечаная аснова (*глыбокі → паглыбіць, высокі → высь, пераляцець → пералёт*), базай можа быць цэлае слова (*вучыць → вучыцца; сталовая лыжка → пабудавана тая сталовая*), можа быць спалучэнне некалькіх слоў ці асноў (*слаба, развіты → слабаразвіты, снег і падаць → снегапад*), спалучэнне графічных частак, літар, гукаў зыходнага словазлучэння (*Саюз пісьменнікаў → СП, сельскі магазін → сельмаг, Беларускі аўтамабільны завод → БелАЗ*).

Тэрмін **матывацыя** ўжываецца ў лінгвістыцы ў двух значэннях:

1) семантычныя і фармальныя адносіны паміж матываваным (вытворным) словам і матывавальным (утваральным), абумоўленасць значэння вытворнага слова значэннем другога базавага слова; 2) выяўленне вызначэнне адносін вытворнасці, «вывадзімасці» аднаго слова з другога.

**Словаўтваральны сродак (фармант)** – словаўтваральныя афіксы і іншыя фармальныя паказчыкі (націск, парадак кампанентаў), з дапамогай якіх утворана слова. Напрыклад: *аўтар → сааўтар* (фармант – прыстаўка *са-*), *ніжэй памянёны → ніжэйпамянёны* (фармант – адзіны асноўны націск і замацаваны парадак кампанентаў). У склад фарманта ўваходзяць таксама і марфаналагічныя сродкі (чаргаванне гукаў, інтэрфіксацыя, нарашчэнне асновы, змена націску), але яны толькі суправаджаюць афіксацыю, а самастойнага словаўтваральнага значэння не маюць.

**Словаўтваральнае значэнне** – гэта значэнне, выражанае словаўтваральным сродкам – фармантам. Гэта абагульненае значэнне шэрагу матываваных слоў, якое выяўляецца ў межах словаўтваральнага тыпу і адрознівае ўсе матываваныя словы гэтага тыпу ад іх матывавальных.

У адрозненне ад лексічнага значэння, якое з'яўляецца індывідуальным значэннем асобнага слова, словаўтваральнае значэнне характэрна для шэрагу слоў аднаго словаўтваральнага тыпу. Словаўтваральнае значэнне адрозніваецца і ад граматычнага значэння тым, што ахоплівае толькі частку слоў якой-небудзь часціны мовы, а граматычнае характэрна для ўсіх слоў пэўнай часціны мовы ці цэлага разраду яе (граматычнае значэнне прадметнасці ў назоўнікаў, прыметы ў прыметнікаў, працэсуальнасці, а таксама трывання, стану і інш.

Напрыклад, адназоўнікавыя дзеясловы з суфіксам *-ну-* маюць агульнае словаўтваральнае значэнне 'ўтвараць дзеянне, адпаведнае ўтваральнаму слову – назоўніку': *прага → прагнуць, пах → пахнуць*; адпрыметнікавыя дзеясловы з такім жа фармантам маюць словаўтваральнае значэнне 'набываць прымету, абазначаную ўтваральным словам': *сляпы → слепнуць, сухі – сохнуць*; аддзеяслоўныя дзеясловы з *-ну-* маюць значэнне 'аднакратна ўтварыць дзеянне, названае ўтваральным словам': *круціць → крутнуць, штурхаць → штурхнуць*.

**Словаўтваральнае гняздо** – гэта ўпарадкаваная адносінамі вытворнасці сукупнасць аднакаранёвых слоў. Усе словы аднаго гнязда маюць не толькі агульнасць фармальную (адзін для усіх корань), але і сэнсавую (корань выражае агульнае значэнне ўсіх аднакаранёвых слоў у гняздзе). Пачаткам (зыходным словам) гнязда з'яўляецца невытворнае (нематываванае) слова, у аснове пабудовы гнёздаў ляжыць прынцып паслядоўнага падпарадкавання адных слоў другім, што выражаецца ў ступенным характары словаўтварэння. Зыходнае слова – гэта нулявая ступень.

У словаўтваральных слоўніках вертыкальнымі лініямі з лічбамі

ўнізе ці без іх злучаны словы адной ступені, раздзеленыя словамі наступных ступеняў. Множнасць словаўтваральнай структуры абазначаецца арабскімі лічбамі справа пасля слоў, а рымскімі лічбамі пасля слоў справа абазначаюцца словы-амонімы. Кожнае зыходнае слова-амонім, як і ў тлумачальных слоўніках, падаецца асобным слоўнікавым артыкулам – асобным гняздом.

У кожнае гняздо ўваходзяць толькі словы, якія маюць жывыя семантычныя сувязі. Калі пад уплывам розных лінгвістычных і экстралінгвістычных фактараў слова страчвае сэнсавую сувязь са словамі свайго гнязда, то такое слова выпадае з гнязда і ўтварае новае гняздо. Напрыклад, раней былі аднакаранёвымі, а сёння ў розных гнёздах словы *даць* і *прадаць*, *стол* і *сталіца*, *горад* і *гарадзіць* і многія іншыя. З другога боку, гнёзды могуць папаўняцца новымі словамі. Межы гнёздаў рухомыя. У гняздзе на гарызантальнай восі вылучаюцца словаўтваральныя пары, якія складваюцца ў словаўтваральны ланцужок.

**Словаўтваральная пара** – мінімальная ячэйка словаўтваральнай сістэмы. Гэта два кампаненты – утваральнае слова ці словы і вытворнае: *сум → сумны*. З двух слоў у словаўтваральнай пары вытворным з'яўляецца слова, больш складанае па форме, з большай колькасцю марфем (пры гэтым улічваюцца і нулявыя марфемы): *пяшчота → пяшчотны, сук → сучча*.

Калі ж абодва словы маюць аднолькавую колькасць марфем, то часцей за ўсё вытворным з'яўляецца слова, больш складанае па семантыцы, значэнне якога выводзіцца са значэння другога слова. Утваральнае слова семантычна больш простае, чым вытворнае. Напрыклад, у словах пары *пераход – пераходзіць* па 4 марфемы, але вытворным з'яўляецца *пераход*, бо яго значэнне выводзіцца са значэння дзеяслова, а не наадварот. Пераход – гэта месца, дзе пераходзяць або працэс ад дзеяння 'пераходзіць'.

Калі два словы ў пары семантычна блізкія і роўныя па колькасці марфем, то вытворным з'яўляецца тое, якое мае дадатковае марфалагічнае значэнне, нетыповае для гэтай часціны мовы. Напр., дзеясловы абазначаюць дзеянне (у шырокім сэнсе слова), а аддзеяслоўныя назоўнікі ў наступных парах, акрамя значэння дзеяння, маюць і дадатковае марфалагічнае (назоўнікавае) значэнне прадметнасці: *страляць → страляніна, аднавіць → аднаўленне*. Дзеясловы ж яго не маюць. Таму ў прыведзеных і падобных прыкладах назоўнікі ўтвораны ад дзеясловаў, а не наадварот. Тут назоўнікі абазначаюць дзеянне і маюць значэнне прадметнасці.

**Словаўтваральны ланцужок** – гэта рад аднакаранёвых слоў, звязаных адносінамі паслядоўнай вытворнасці. Іншымі словамі, словаўтваральны ланцужок звязвае паслядоўна ўтвораныя аднакаранёвыя сло-

вы. Зыходнае слова ланцужка невытворнае, яно з'яўляецца і зыходным словам гнязда. У ланцужку пры паслядоўным утварэнні слоў вызначаюцца ступені словаўтварэння: *віць (нулявая ступень) → навіць (1-я ступень) → навіваць (2-я ступень) → навівальшчык (3-я ступень) → навівальшчыца (4-я ступень).*

**Словаўтваральны тып** – сукупнасць слоў з агульнымі словаўтваральнымі характарыстыкамі. Гэта фармальна-семантычная схема (формула) утварэння слоў, якая характарызуецца 1) агульнасцю часціны мовы ўтваральнага слова; 2) агульнасцю фарманта; 3) агульнасцю словаўтваральнага значэння.

Напрыклад, словы *свіснуць, крыкнуць, гукнуць* належаць да аднаго словаўтваральнага тыпу, таму што

1) усе яны ўтвораны на базе адной часціны мовы – ад дзеясловаў *свістаць, крычаць, гукаць* ;

2) усе яны маюць агульны словаўтваральны сродак – суфікс -*ну-* ;

3) гэтыя словы маюць адно і тое ж трыванне, суфікс -*ну-* ў іх выражае адно і тое ж словаўтваральнае значэнне – 'аднакратна ўтварыць дзеянне'.

Некаторыя лінгвісты, замест тэрміна тып, неапраўдана выкарыстоўваюць тэрмін мадэль словаўтварэння. Гэта нятоесныя паняцці, лічыць гэтыя тэрміны ўзаемазамяняльнымі не варта. Мадэль – гэта паняцце больш вузкае, чым словаўтваральны тып. Напр., словы *рапірыст, шпажыст* утвораны па адным тыпе, але па дзвюх марфаналагічных мадэлях, таму што перад суфіксам у першым слове няма чаргавання, а ў другім ёсць. Да аднаго тыпу, але да розных мадэляў адносяцца таксама наступныя словаўтварэнні: 1-я мадэль: *барысаўскі, кастрамскі, слаўгарадскі, наўгародскі*; 2-я мадэль: *наваградскі, ямайскі, іспанскі* (з усячэннем асновы базавага слова); 3-я мадэль: *уздзенскі, зэльвенскі, лёзненскі, езярышчанскі* (з інтэрфіксам -*ен-//-ан-*); 4-я мадэль: *стаўбцоўскі, веткаўскі, арлоўскі, відзаўскі* (з інтэрфіксам -*оў-/-аў-*) і іншыя мадэлі гэтага тыпу: адтапонімных прыметнікаў з суфіксам -*ск-* са значэннем 'адносіны да месца – да геаграфічных назваў'.

**Словаўтваральная парадыгма** – гэта сукупнасць усіх слоў, якія непасрэдна ўтварыліся ад аднаго і таго ж слова. Словаўтваральная парадыгма выступае ў слоўніку ў гняздзе на вертыкальнай восі ў якасці асноўнай адзінкі.

**Спосаб словаўтварэння** – гэта агульны шлях утварэння слоў. Гэта больш шырокая, чым словаўтваральны тып, адзінка класіфікацыі, якая аб'ядноўвае шэраг тыпаў з адным відам фарманта. Напр., адзін спосаб – словаўтварэнні з любымі суфіксамі, другі спосаб – з любымі прыстаўкамі і г.д. Спосаб словаўтварэння дае самы агульны адказ на пытанне, як

утвораны словы. Спосабы ўтварэння вызначаюцца па фармантах.

### 2.6.1. Спосабы словаўтварэння

Пры напісанні раздзела быў выкарыстаны матэрыял вучэбнага дапаможніка «Сучасная беларуская літаратурная мова: Марфалогія: Вучэб. дапам. / Н.В. Гаўрош, М.Ц. Кавалёва, Н.М. Нямковіч і інш.; Пад агул. Рэд. праф. М.С. Яўневіча. – Мн.: Выд. Ул.М. Скакун, 1997. – 288 с.».

У сучаснай беларускай літаратурнай мове вылучаюцца наступныя спосабы словаўтварэння: марфалагічнае, марфалагічна-сінтаксічнае, складанне і лексіка-семантычнае. Гэтыя спосабы адрозніваюцца сваімі словаўтваральнымі сродкамі і рознай ступенню пашырэння.

Самае пашыранае – **марфалагічнае** словаўтварэнне, пры якім новыя словы ўтвараюцца ў выніку спалучэння марфем. Побач з традыцыйным тэрмінам «марфалагічнае словаўтварэнне» ўжываюць як раўназначныя тэрміны «марфемнае словаўтварэнне», «афіксальнае словаўтварэнне». Асноўным сродкам марфалагічнага словаўтварэння ў нашай мове з'яўляецца **афіксацыя** – утварэнне слоў шляхам далучэння да ўтваральнай асновы словаўтваральных афіксаў, т. зв. фармантаў. У залежнасці ад таго, пры дапамозе якіх афіксаў утвараюцца новыя словы, у марфалагічным словаўтварэнні выдзяляюцца наступныя разнавіднасці гэтага спосабу: суфіксальны, прыставачны (прэфіксальны), прыставачна-суфіксальны, постфіксальны, прыставачна-постфіксальны і бязафіксны (нулявая суфіксацыя).

**Суфіксальнае** словаўтварэнне характарызуецца далучэннем да ўтваральнай асновы суфіксаў: *смелы – смел-асць, смяль-чак, смял-е-ць, смел-а, лес – ляс-н-ы – лясн-ік – лесніч-ых-а, лес – ляс-іст-ы – лясіст-асць, лес – лес-ав-ы – лесав-ік, вучань – ву-чан-іц-а, вучн-еў, бацька – бацьк-аў – бацькаў-шчын-а і* інш.

**Прыставачнае (прэфіксальнае)** словаўтварэнне характарызуецца далучэннем прыставак (прэфіксаў) да слова: *біць – за-біць, пры-біць, кінуць – за-кінуць, ад-кінуць, гаварыць – аб-гаварыць, пры-гаварыць, дзед – пра-дзед, тэкст – пад-тэкст, навуковы – анты-навуковы, не-навуковы, палітычны – а-палітычны, куды – ні-куды, які – ні-які* і інш.

Адносна мала пашырана **бязафікснае** (**нульсуфіксальнае**) словаўтварэнне, якое сваімі асаблівасцямі адрозніваецца ад іншых спосабаў марфалагічнага ўтварэння слоў. Пры ўтварэнні слоў гэтым спосабам афіксы (суфіксы і прыстаўкі) не выкарыстоўваюцца. Бязафіксным спосабам звычайна ўтвараюцца назоўнікі ад некаторых дзеясловаў і прыметнікаў: *бегаць – бег-Ø, стукаць – стук-Ø, скры-пець – скрып-Ø, сумны – сум-Ø, сіні* – сінь-Ø і інш. Пры гэтым спосабе ўтварэння часта адбываецца частковае скарачэнне (усячэнне) асновы прыметніка і дзеяслова: *глыбок-і* –

*глыб-Ø, блакітн-ы – блакіт-Ø, да-лёк-і – даль-Ø, вары-ць – вар-Ø, шуме-ць – шум-Ø.* Назіраюцца таксама іншыя фанетычныя змены ў аснове: чаргаванне гукаў: *глухі – глуш-Ø, сухі – суш-Ø, пла-каць – плач-Ø, клікаць – кліч-Ø, жоўты – жоўць-Ø, прыходзіць – прыход-Ø;* змякчэнне зычнага на канцы новай асновы: *зялёны – зелень-Ø, белы – бель-Ø;* адначасовае ўсячэнне асновы і чаргаванне (змякчэнне) зычнага: *высокі – высь-Ø, мутны – муць-Ø, гладкі – гладзь-Ø;* змена націску: *выводзіць – вываз-Ø, вына-сіць – вынас-Ø, запісаць – запіс-Ø, заплываць – за-плыў-Ø, заязджаць – заезд-Ø, чырвоны – чырвань-Ø.* Прымаючы пад увагу фанетычныя змены ў аснове слова, гэты спосаб называюць яшчэ **фанетыка-марфалагічным**.

**Постфіксальнае** словаўтварэнне характэрна практычна толькі для дзеясловаў: *вучы-(ць) → вучы-(ц)-ца, рыхтава-(ць) → рыхтава-(ц)-ца, бе-раг-(чы) → берaг-(чы)-ся.* Вельмі абмежавана ўтвараюцца іншыя часці-ны мовы, напрыклад, займеннікі *(што-небудзь, калі-сьці).*

**Складанне** – такі спосаб словаўтварэння, пры якім у выніку аб'-яднання дзвюх і болей асноў ці цэлых слоў або іх частак утвараецца адно слова. Выдзяляюцца разнавіднасці складання.

**Асноваскладанне** – гэта такі спосаб, пры якім словы ўтвараюцца шляхам зліцця дзвюх і болей асноў. Пры гэтым спосабе асновы аб'ядноў-ваюцца, як правіла, з дапамогай службовых марфем – інтэрфіксаў *а(о), е(я); светл-а-зялёны, цёмн-а-сіні, мароз-а-ўстой-лівы, руск-а-беларуск-а-украінскі, ільн-о-валакно, зерн-я-сховішча, паравоз-а-вагон-а-рамонтны, лес-а-стэп, жыцц-я-здольны, вугл-е-падобны, вогн-е-трывалы.*

**Асноваскладанне** можа спалучацца з суфіксацыяй, у тым ліку ну-лявой: *ардэн-а-нос-ец, перш-а-курс-нік, адн-а-павярх-овы, тр-ох-моў-н-ы, дв-ух-гадзін-н-ы, трыцца-ці-гад-ов-ы, дзесяц-і-рубл-ёв-ы, сад-а-вод-Ø, земл-я-воз-Ø, атам-а-ход-Ø.* Такі спосаб словаўтварэння называюць **складана-суфіксальным.**

**Словаскладанне** (зрашчэнне) – гэта такі спосаб словаўтварэння, пры якім два словы зліваюцца ў адно складанае слова без змен, з захаваннем семантыкі і ўсіх сваіх формаў: *мімаволі ← міма волі, вечна-зялёны ← вечна зялёны, малазнаёмы ← мала знаёмы, свежапафарбава-ны ← свежа пафарбаваны, густанаселены ← густа населены.*

Пры ўтварэнні слоў могуць зліваццa і часткі слоў – скарочаныя асновы; у гэтым выпадку, як правіла, утвараюцца назоўнікі – складана-скарочаныя словы, або **абрэвіятуры** (іт. *abbreviatura* < лац. *brevis* 'каро-ткі'). Такі спосаб утварэння слоў называюць **абрэвіяцыяй**.

Паводле ўтварэння адрозніваюць некалькі відаў абрэвіятур, напры-клад: *прафкам, філфак* (часткі слова), *прафсаюз, медсястра, педінсты-тут* (частка слова і цэлае слова), *БелАЗ, педВНУ* (частка слова і пачатко-

выя гукі або назвы літар), *МАЗ, ЦУМ, ААН* (пачатковыя гукі слоў), *БДУ, БДПУ, РБ, ТБМ, АМС, МЗС* (назвы пачатковых літар слоў).

Скарачэнне асноў пры ўтварэнні складанаскарочаных слоў адвольнае, яно не падпарадкуецца якім-небудзь адзіным, абавязковым патрабаванням. Напрыклад, спалучацца могуць пачатак першага слова з пачаткам і канцом другога слова: *эсмінец ← **эскадраны мінаносец**,* пачатак першага слова з канцавой часткай другога слова: *рацыя ← **ра**дыё* і *ста**нцыя**, мапед ← **ма**тацыкл* і *веласі**пед*** і г. д.

Пры **марфалагічна-сінтаксічным** словаўтварэнні новыя словы ўзнікаюць у выніку набыцця імі значэння і граматычных катэгорый, уласцівых іншым часцінам мовы. У такім выпадку слова з адной часціны мовы пераходзіць у другую. Сюды належыць, напрыклад, пераход прыметнікаў і іншых часцін мовы ў назоўнікі – **субстантывацыя** (лац. *substantivum* 'назоўнік'): *стары, малы, паляўнічы, дзяжурны;* дзеепрыметнікаў у прыметнікі – **ад'ектывацыя** (лац. *adjectivum* 'прыметнік'): *загарэлы, пераспелы, зморany, ляжачы, траскучы;* лічэбнікаў *(адзін, другі),* прыметнікаў *(цэлы, наступны)* у займеннікі – **пранаміналізацыя** (лад. *pronomen* 'займеннік'). Так, пры пераходзе прыметніка ў разрад назоўнікаў ён набывае значэнне прадметнасці, граматычныя катэгорыі назоўніка, выконвае ў сказе ролю дзейніка або дапаўнення: *малы засмяяўся, паклікаць малога* (параўн.: *малы хлопчык), паляўнічы выстраліў, сустрэлі паляўнічага* (параўн.: *паляўнічы нож), дзяжурны зрабіў заўвагу, чакаць дзяжурнага* (параўн.: *дзяжурны ўрач).* Некаторыя прыметнікі канчаткова перайшлі ў разрад назоўнікаў і як прыметнікі не ўжываюцца: *ляснічы, араты, рулявы, піражнае.*

Да марфалагічна-сінтаксічнага словаўтварэння фактычна адносіцца пераход склонавых формаў назоўнікаў у разрад прыслоўяў – **адвербіялізацыя** (лац. *adverbium* 'прыслоўе'): *бягом, вярхом, кругом, крокам, часам, вечарам, вясною, маўчком, дома* і інш. Гістарычна гэтыя прыслоўі – застылыя формы творнага склону адпаведных назоўнікаў *(бег, верх, круг, крок, час, вечар, вясна, маўчок),* слова *дома* – роднага склону назоўніка *дом.* З пункту погляду сучаснага (сінхроннага) словаўтварэння гэтыя прыслоўі мэтазгодна разглядаць як суфіксальныя ўтварэнні: *бег – бяг-ом, верх – вярх-ом, круг – круг-ом, крок – крок-ам, час – час-ам, вечар – вечар-ам, вясна – вясн-ою, маўчок – маўчк-ом, дом – дом-а.*

Утварэнне слоў можа адбывацца ў выніку таго, што якое-небудзь слова з цягам часу набывае новае значэнне; вядомае раней і новае значэнні аднаго слова так адасабляюцца, адмяжоўваюцца адно ад другога, што нарэшце становяцца ўласцівымі асобным, самастойным словам. Такое словаўтварэнне называюць **лексіка-семантычным**. Пры ім абсалютна новыя словы паводле гукавога складу не ўтвараюцца, адбываецца

толькі расчляненне аднаго слова на амонімы, якія ўжываюцца як самастойныя словы: *кулачок* (маленькі кулак) і *кулачок* (дэталь машыны), *завод* (прамысловае прадпрыемства) і *завод* (механізма), *падполле* – 'памяшканне, месца пад падлогай' і *падполле* – 'нелегальнае становішча; тайная дзейнасць пры строгай канспірацыі' і інш. Тут мы маем словы-амонімы. Цяпер у значэннях гэтых слоў семантычная сувязь не адчуваецца, хоць у мінулым яна і была. Лексіка-семантычнае словаўтварэнне ў сучаснай беларускай мове малапрадуктыўнае.

**Лексіка-сінтаксічны** спосаб словаўтварэння – зліццё ў адно слова сінтаксічнага словазлучэння з захаваннем парадку слоў і іх склонавых форм: *сягоння* (з сяго дня), *трыста* (тры ста). Лексіка-сінтаксічны спосаб адносіцца пераважна да дыяхроннага словаўтварэння. Большасць слоў, утвораных з яго дапамогай, з сінхроннага пункту погляду належыць да невытворных.

Як відаць, словаўтварэнне цесна звязана і з лексікай і з граматыкай: шляхам утварэння слоў узбагачаецца лексіка мовы; усе новаўтвораныя словы афармляюцца ў адпаведнасці з законамі, правіламі граматыкі.

## 2.7. Марфемны, этымалагічны і словаўтваральны аналіз

Марфемны аналіз – гэта вызначэнне структуры, якую слова мае ў сучаснай мове. Пры гэтым трэба ўлічваць жывыя словаўтваральныя сувязі, г. зн. параўноўваць, супастаўляць слова з роднаснымі і вылучаць толькі тыя марфемы, якія ёсць у ім у сучаснай мове. Напрыклад, пры марфемным аналізе ў слове *добры* вылучаецца корань *добр-* і канчатак *-ы*, не вылучаецца былы суфікс *-р-*.

Прыняты такі парадак марфемнага аналізу:

1. Даць агульную лексіка-граматычную характарыстыку слова, назваць, якая гэта часціна мовы.

2. Адзначыць, зменнае слова ці нязменнае; калі зменнае, то як змяняецца;

3. Канчатак (у тым ліку нулявы), пералічыць граматычныя значэнні канчатка,

4. Аснова, вызначыць тып асновы, адзначыць, калі перарваная;

5. Афіксы. Функцыі афіксаў (словаўтваральныя яны ці формаўтваральныя), указаць, якую канкрэтна граматычную форму ці слова ўтварае, сфармуляваць, дзе магчыма, значэнне афікса.

Падабраць аднаструктурныя словы – словы з тымі ж афіксамі і з аднолькавым значэннем у іх; абазначыць афіксы ў прыкладах.

6. Корань, назваць тып кораня (свабодны ці звязаны), пералічыць варыянты кораня. Калі свабодны – праілюстраваць гэта на прыкладзе.

Роднасныя словы (падабраць столькі прыкладаў, колькі неабходна для вызначэння межаў усіх марфем у слове); абазначыць у іх корань.

Варыянты кораня (у дужках паказаць, у якіх словах яны вызначаны).

Афіксоід (суфіксоід ці прэфіксоід); падабраць аднаструктурныя словы з такім жа афіксоідам.

7. Графічнае абазначэнне марфемнай будовы слова.

Этымалагічны аналіз ставіць задачай вызначэнне той марфемнай структуры, якую слова мела раней. Часам для гэтага неабходна высветліць паходжанне слова, час яго ўзнікнення, рэканструяваць пачатковую форму. Так, пры этымалагічным аналізе слова *добры* дзеліцца на корань *доб-* (параўн. *падобны, здобны, спадабацца*), суфікс *-р-,* канчатак *-ы.* У большасці выпадкаў дзяленне слоў на часткі пры марфемным і этымалагічным аналізе супадае.

Пры словаўтваральным аналізе вызначаецца, ад якога слова (утваральнай асновы), пры дапамозе якога (якіх) сродку (сродкаў) – суфікса, прыстаўкі, інтэрфікса і інш., якім спосабам слова ўтворана; называецца спосаб словаўтварэння. Так, прыметнік *гаспадарлівы* ўтвораны ад асновы назоўніка *гаспадар* пры дапамозе суфікса *-лів-,* г. зн, суфіксальным спосабам, утваральная аснова *гаспадар-;* назоўнік *гаспадарлівасць* утвораны ад асновы прыметніка *гаспадарлівы* пры дапамозе суфікса *-асць,* г. зн. суфіксальным спосабам, утваральная аснова *гаспадарлів-*. Прыметнік *заморскі* утвораны ад асновы назоўніка *мора* пры дапамозе суфікса *-ск- і* прыстаўкі *за-,* г. зн. прыставачна-суфіксальным спосабам, утваральная аснова *мор-*.

### 3. Пытанні да асноўнага тэарэтычнага матэрыялу

1. У чым розніца ў падыходзе да разгляду слоў сінхронным і дыяхронным словаўтварэннем?
2. Якія часткі слова называюцца марфемамі?
3. З якім значэннем ужываюцца ў навуковай літаратуры тэрміны «морф», «аламорф»?
4. Што выражае аснова слова? Якія бываюць тыпы асноў?
5. Якая роля канчаткаў у словах?
6. Якая частка слова называецца коранем? Чым адрозніваюцца свабодныя і звязаныя карані?
7. Якія каранёвыя марфемы называюцца афіксоідамі?
8. Якая роля ў слове прыставак і суфіксаў?
9. Для чаго служаць словаўтваральныя і формаўтваральныя афіксы? Прывядзіце прыклады.
10. Якая марфема называецца постфіксам?
11. Раскажыце пра інтэрфіксы ў складаных і простых словах.
12. У чым сутнасць змен (апрошчання і пераракладання) у структуры

слова?
13. Чым адрозніваюцца марфемны, словаўтваральны і этымалагічны аналіз?
14. Што разумеюць пад словаўтварэннем? Якая яго роля ва ўзбагачэнні і развіцці лексікі?
15. Якія ёсць спосабы словаўтварэння? На якой аснове яны вылучаюцца? Чым адрозніваюцца паміж сабой?
16. Што такое марфалагічнае словаўтварэнне? Якія ёсць разнавідвасці гэтага спосабу ўтварэння слоў?
17. Чым характарызуецца марфалагічна-сінтаксічнае словаўтварэнне?
18. Што такое складанне як спосаб словаўтварэння? Якія ёсць разнавіднасці складання? Чым яны адрозніваюцца? Падмацуйце прыкладамі.
19. Які спосаб утварэння слоў называюць абрэвіяцыяй? Якія ёсць віды абрэвіятур?
20. Які спосаб словаўтварэння называюць лексіка-семантычным? У чым яго адметнасць? Якое яго месца сярод іншых спосабаў утварэння слоў?

## 4. Матэрыялы да практычных аўдыторных і самастойных заняткаў

### 4.1. Схема блок-сістэмы практычных заняткаў

| № | Тэма практычных заняткаў | Колькасць гадзін |
|---|---|---|
| 1. | Тыпы марфем а) па ролі ў слове, б) па функцыі, в) па месцы ў складзе слова, г) па частотнасці ўжывання, д) па семантычных адносінах паміж марфемамі. | 2 |
| 2. | Варыянтныя марфемы (карані, прыстаўкі, суфіксы, канчаткі, пастфіксы, інтэрфіксы). Нулявыя марфемы (суфіксы, інтэрфіксы, канчаткі). | 2 |
| 3. | Віды асноў: словазменная, словаўтваральная (база), формаўтваральная; вытворная і невытворная; члянімая і нечлянімая. Супletыўныя асновы. Словы з перарванай асновай. | 2 |
| 4. | Фанетычныя разнавіднасці (варыянты) кораня. Свабодныя і звязаныя карані. Аманімічныя карані. Аднафанемныя карані. Вызначэнне кораня пры сінхронным і дыяхронным падыходах. | 2 |
| 5. | Словаўтваральныя і формаўтваральныя, варыянтныя афіксы, адкрытыя і закрытыя, прыкрытыя і непрыкрытыя прэфіксы, суфіксы і постфіксы. | 2 |
| 6. | Мнагазначныя, сінанімічныя, аманімічныя, антанімічныя суфіксы і прыстаўкі; віды інтэрфіксаў у складаных словах і ў простых. Конфікс. Афіксоіды (прэфіксоіды, суфіксоіды). | 2 |

| | | |
|---|---|---|
| 7. | Змены ў марфемнай структуры слова: апрошчанне (поўнае і няпоўнае), перараскладанне, ускладненне, дэкарэляцыя, замяшчэнне, дыфузія (фузія), гаплалогія як разнавіднасць дыфузіі. | 2 |
| 8. | Марфемны, этымалалчны і словаўтваральны аналіз структуры слова. | 2 |
| 9. | Асноўныя словаўтваральныя паняцці: вытворнае (матыванае) і невытворнае (нематыванае) слова; словаўтваральная база; словаўтваральны сродак (фармант); словаўтваральнае значэнне; матывацыя, множнасць матывацый; словаўтваральнае гняздо, словаўтваральны ланцужок. | 2 |
| 10. | Словаўтваральны тып і мадэль словаўтварэння; спосаб словаўтварэння. | 2 |
| 11. | Марфемныя спосабы словаўтварэння: афіксацыя (яе разнавіднасці) і складанне (яго разнавіднасці). Субстантывацыя і ад'ектывацыя. Прадуктыўныя спосабы словаўтварэння. | 2 |

### 4.2. Практыкаванні для засваення тэарэтычных ведаў па модулі

На занятках 1 выконваюцца практыкаванні 246, 261-262.
На занятках 2 выконваюцца практыкаванні 248, 249.
На занятках 3 выконваюцца практыкаванні 247, 250.
На занятках 4 выконваюцца практыкаванні 251-256.
На занятках 5 выконваюцца практыкаванні 258-260.
На занятках 6 выконваюцца практыкаванні 257, 263-264.
На занятках 7 выконваюцца практыкаванні 267-270.
На занятках 8 выконваюцца практыкаванні 265, 266.
На занятках 9 выконваюцца практыкаванні 271, 274, 278.
На занятках 10 выконваюцца практыкаванні 272, 275-277.
На занятках 11 выконваюцца практыкаванні 273, 279.

## 5. Дадатковая літаратура па модулі


1. Вадановіч В.Л. Словаўтварэнне назоўнікаў у беларускай мове: манаграфія. – Гродна: ГрДУ, 2005.
2. Васілеўскі М.С. Дзеяслоўнае словаўтварэнне: Адыменныя суфіксальныя лексемы / Пад рэд. М.Г. Булахава. – Мн.: Навука і тэхніка, 1985.
3. Васілеўскі М.С. Прадуктыўныя тыпы дзеясловаў у сучаснай беларускай мове. – Мн.: Выд. БДУ, 1970.
4. Лукашанец А.А. Словаўтварэнне і граматыка. – Мн.: Права і эканоміка, 2001.
5. Паўленка М.А. Нарысы па беларускаму словаўтварэнню: Жаночыя асабовыя намінацыі ў старабеларускай мове. – Мн.: Выд-ва БДУ, 1978.
6. Сіплівеня Ж.С. Словаўтварэнне прыметнікаў ад іншамоўных назоўнікаў у сучаснай беларускай літаратурнай мове: Дапам. для студэнтаў філал. спецыяльнасцей ВНУ. – Гродна: ГрДУ, 2000.
7. Сцяцко П.У. Беларускае народнае словаўтварэнне: Афіксальныя назоўнікі / Рэд. М.В. Бірыла. – Мн.: Навука і тэхніка, 1977.
8. Шакун Л.М. Словаўтварэнне: Вучэб. дапаможнік для філалаг. ВНУ / МДПІ

імя А.М. Горкага, каф. беларус. мовы. – Мн.: Вышэйш. шк., 1978.

МОДУЛЬ 7
# «МАРФАЛОГІЯ»

## 1. Схема блок-сістэмы вывучэння тэарэтычнага матэрыялу

| № | Тэма лекцыйных заняткаў | Колькасць гадзін |
|---|---|---|
| 1. | Марфалогія як граматычнае вучэнне аб слове. Граматычныя значэнні слова, сродкі і спосабы іх выражэння. | 2 |
| 2. | Часціны мовы як лексіка-граматычныя разрады слоў. Прынцыпы класіфікацыі часцін мовы. Сістэма часцін мовы. | 2 |

## 2. Асновы навукова-тэарэтычных ведаў па модулі

**Слоўнік паняццяў для засваення**: граматыка, марфалогія, граматычнае значэнне, граматычная катэгорыя, граматычная форма, катэгарыяльнае (класіфікацыйнае) значэнне, часціны мовы, паўназначныя часціны мовы, непаўназначныя часціны мовы, самастойныя часціны мовы, службовыя часціны мовы, кан'юнкцыяналізацыя.

Пры напісанні раздзела быў выкарыстаны матэрыял вучэбнага дапаможніка «Сучасная беларуская літаратурная мова: Марфалогія: Вучэб. дапам. / Н.В. Гаўрош, М.Ц. Кавалёва, Н.М. Нямковіч і інш.; Пад агульн. рэд. праф. М.С. Яўневіча. – Мн.: Выд. Ул.М. Скарун, 1997. – 288с.»

### 2.1. Марфалогія як граматычнае вучэнне аб слове

Слоўнікавы склад мовы падпарадкоўваецца пэўным правілам, на аснове якіх словы змяняюцца, спалучаюцца, аб'ядноўваюцца ў словазлучэнні і сказы. Правілы будовы слоў і сказаў утвараюць граматычны лад мовы, які з'яўляецца аб'ектам вывучэння граматыкі.

**Граматыка** (грэч. *grammatikĕ* ад *gramma* 'літара, напісанне') – раздзел мовазнаўства, змест якога складае вучэнне аб заканамернасцях формаўтварэння і словазмянення, тыпах словазлучэнняў і сказаў. Тэрмін «граматыка» мае некалькі значэнняў: 1) навука, раздзел мовазнаўства; 2) граматычны лад мовы, сістэма правілаў словазмянення, сувязі слоў у сказах; 3) сукупнасць прынятых для пэўнай мовы правілаў змянення слоў і пабудовы словазлучэнняў і сказаў (граматыка акадэмічная, граматыка навуковая, граматыка школьная); 4) падручнікі, дапаможнікі, у якіх разглядаюцца гэтыя правілы. Граматыка падзяляецца на два раздзелы – марфалогію і сінтаксіс.

**Марфалогія** (ад грэч. *morphe* 'форма' і *logos* 'вучэнне') – гэта граматычнае вучэнне аб слове; раздзел граматыкі, які вывучае структуру слова, правілы словазмянення, а таксама граматычныя катэгорыі і класы слоў (часціны мовы). У XIX ст. і раней вучэнне аб формах слоў называлася не марфалогіяй, а этымалогіяй.

Слова – асноўны аб'ект марфалогіі. Марфалогія вывучае граматычныя ўласцівасці слоў, акрэслівае іх граматычныя значэнні, выяўляе спецыфіку граматычных катэгорый слоў, якія адносяцца да розных часцін мовы. Так, назоўнікі і прыметнікі маюць катэгорыі роду, ліку і склону, якія, аднак, у кожнай з гэтых часцін мовы праяўляюцца па-рознаму: у назоўнікаў яны самастойныя, а ў прыметнікаў сінтаксічна абумоўленыя.

Задача марфалогіі – выявіць і апісаць спецыфіку граматычных катэгорый розных часцін мовы. Марфалогія вызначае склад граматычных формаў розных тыпаў слоў, выяўляе правілы іх змянення, размеркавання па тыпах скланення і спражэння.

У марфалогію ўваходзіць вучэнне пра часціны мовы. Яна разглядае семантычныя і фармальныя асаблівасці слоў розных лексіка-граматычных разрадаў, выпрацоўвае асноўныя крытэрыі і правілы класіфікацыі слоў па часцінах мовы, устанаўлівае сістэму часцін мовы, вывучае лексіка-граматычныя асаблівасці слоў кожнай часціны мовы, выяўляе заканамернасці іх узаемадзеяння.

Пры вывучэнні марфалогіі неабходна ўлічваць асаблівасці слоўнікавага складу мовы, бо граматыка не існуе без слова. Абагульненае (катэгарыяльнае) лексічнае значэнне слова – адзін з вырашальных фактараў пры класіфікацыі часцін мовы. Так, словы з катэгарыяльным значэннем прадметнасці кваліфікуюцца як назоўнікі, са значэннем прыметы – як прыметнікі, са значэннем працэсу дзеяння – як дзеясловы, са значэннем колькасці – як лічэбнікі і г. д. Ад лексічнага значэння слова залежыць яго спалучальнасць з іншымі словамі ў сказе.

Марфалогія цесна звязана з іншымі раздзеламі граматыкі: фанетыкай, марфаналогіяй, словаўтварэннем і асабліва сінтаксісам. Паколькі без гукавога афармлення слоў мова не можа існаваць, то зразумела, што марфалогія цесна звязана з фанетыкай. Фанетычныя змены непасрэдна ўплываюць на форму і будову слова. У залежнасці ад характару апошняга гука асновы вызначаецца канчатак слова: *вясн-а – па вясн-е, вішн-я – на вішн-і, сын – сын-ам, госць – госц-ем*. Ад фанетычных асаблівасцей асновы ў значнай ступені залежыць размеркаванне назоўнікаў па родах і тыпах скланення.

Марфалогія звязана са словаўтварэннем: пераважная большасць беларускіх слоў утворана з дапамогай марфем (суфіксаў і прыставак), у межах кожнай часціны мовы вылучаюцца свае асаблівасці словаўтварэння.

Сувязь марфалогіі з сінтаксісам абумоўлена тым, што кожная граматычная катэгорыя праяўляецца ў сінтаксічных адзінках – словазлучэннях ці сказах. Паміж марфалагічнымі і сінтаксічнымі катэ-

горыямі існуе пэўная адпаведнасць: кожная часціна мовы выконвае функцыю таго ці іншага члена сказа. У некаторых выпадках сінтаксічная роля слова ў сказе дапамагае вызначыць, да якой часціны мовы яно адносіцца. Параўн.: *Сустрэлі Рамана стрымана, але радасна* (А. Ч.) і *Гэтак радасна, гэтак хораша, гэтак цёпла!* (Б.). Слова *радасна* ў першым сказе – акалічнасць спосабу дзеяння, выражаная якасным прыслоўем; у другім – выказнік, выражаны безасабова-прэдыкатыўным словам.

### 2.1.1. Граматычныя значэнні і сродкі іх перадачы

Слова – гэта адзінства лексічнага і граматычнага значэнняў. Лексічнае (асноўнае) значэнне, індывідуальнае для кожнага слова, дапаўняецца, удакладняецца дадатковым значэннем – граматычным. Лексічнае значэнне слова – яго індывідуальная, сэнсавая прымета, якая адлюстроўвае суадноснасць гэтага слова як моўнай адзінкі (моўнага знака) з той або іншай рэаліяй (з'явай рэчаіснасці). Таму лексічнае значэнне называюць яшчэ рэальным.

**Граматычныя** значэнні характэрны для цэлага класа слоў. Так, граматычныя значэнні ніякага роду, адзіночнага ліку, вінавальнага склону аб'ядноўваюць у адзін лексіка-граматычны разрад – назоўнік. Такім чынам, граматычнае значэнне, адцягненае ад лексічнага зместу слова, характэрнае для цэлага класа слоў, выяўляецца ў яго адносінах з іншымі словамі выказвання. Граматычныя значэнні існуюць у адзінстве з лексічным, яны як бы напластоўваюцца на лексічнае значэнне, абапіраюцца на яго, таму невыпадкова лінгвісты называюць граматычныя значэнні спадарожнымі.

Суадноснасць лексічнага і граматычных значэнняў у розных часцін мовы неаднолькавая. Для самастойных часцін мовы лексічныя значэнні асноўныя, а граматычныя – спадарожныя. Службовыя часціны мовы (прыназоўнікі, злучнікі, часціцы) маюць пераважна граматычнае значэнне, якое для іх з'яўляецца асноўным. У асобных словах лексічнае і граматычнае значэнні не заўсёды лёгка размежаваць. Так, значэнне асобы ў займенніках *я, ты, ён (яна, яно), мы, вы, яны* – лексічнае, а ў дзеясловах граматычнае – з'яўляецца паказчыкам асобы: *я малюю, ты малюеш, ён малюе* і г. д.

Найбольш агульнае граматычнае значэнне (выражэнне сувязей і адносін паміж словамі ў выказванні), уласцівае цэлым разрадам слоў, называецца **граматычнай катэгорыяй**. Так, граматычныя значэнні адзінкавасці – множнасці ўтвараюць катэгорыю ліку, граматычныя значэнні, якія паказваюць на працягласць – закончанасць дзеяння, утвараюць катэгорыю трывання. Граматычная катэгорыя – двухбаковае адзінства марфалагічнай сістэмы мовы, якое мае план зместу (валодае сва-

ёй семантыкай) і план выражэння (мае свае знешнія паказчыкі, формы, пры дапамозе якіх выражаецца гэта семантыка).

Асобныя граматычныя катэгорыі могуць ахопліваць увесь аб'ём часціны мовы (лік і склон – у назоўнікаў; стан, трыванне і лад – у дзеясловаў і г. д.), а могуць быць уласцівыя толькі пэўнай групе словаформаў (час і асоба – толькі дзеясловам абвеснага ладу; кампаратыў – толькі якасным прыметнікам і адпаведным прыслоўям ці прэдыкатывам і г. д.). Такім чынам, ёсць катэгорыі **агульныя** і **прыватныя**. Элементы значэння, звязаныя з агульнымі катэгорыямі, лічацца **абавязковымі**, з прыватнымі – **неабавязковымі**.

Усе элементы значэння словаформы ўмоўна можна падзяліць на два класы: **намінатыўныя** і **сінтаксічныя**. Намінатыўныя элементы значэння выяўляюцца перш за ўсё ў самой словаформе, а сінтаксічныя – у спалучэнні гэтай словаформы з іншымі словаформамі. Так, элементы значэння адзіночнага або множнага ліку ці значэння пэўнага роду ў назоўнікаў – гэта значэнні намінатыўныя, а такія ж элементы ліку ці роду ў прыметніках – сінтаксічныя.

Выражэнне граматычнай катэгорыі пэўнымі моўнымі сродкамі называецца **граматычнай формай**. У навуковай літаратуры тэрмін «граматычная форма» ўжываецца ў двух значэннях: 1) моўныя сродкі, што служаць для выражэння граматычных значэнняў; 2) сінонім тэрміна «форма слова», або «словаформа».

Формы слова (граматычныя формы слова) – гэта разнавіднасці аднаго і таго ж слова, якія маюць адно лексічнае значэнне і супрацьпастаўленыя граматычныя значэнні. Так, словаформы дзеяслова *чытаць* – *чытаю, чытаеш, чытае, чытаем, чытаюць, чытаў, буду чытаць* – маюць адно лексічнае значэнне 'працэс дзеяння', але адрозніваюцца граматычнымі значэннямі. Форма *чытаю* выражае значэнне 1-й асобы, адзіночнага ліку, цяперашняга часу, незакончанага трывання, формы *чытаеш, чытае* супрацьпастаўленыя ёй значэннямі 2-й і 3-й асобы, астатнія значэнні ў іх супадаюць. Супрацьпастаўленне формаў па граматычным значэнні заўсёды мае фармальнае выражэнне (канчаткі і формаўтваральныя афіксы). Кожная граматычная форма – гэта і ёсць словаформа; яна з'яўляецца прадстаўніком слова ў маўленні.

Сукупнасць граматычных формаў слова, прыведзеная ў сістэму, называецца **парадыгмай** (грэц. *paradeigma* 'прыклад, узор'). Парадыгму маюць толькі зменныя словы. Так, парадыгму слова *стол* складаюць 12 словаформаў (6 у адз. л. і 6 у мн. л.). Парадыгмай называюць і саму схему словазмянення або спалучэнне канчаткаў слова. Так, у падручніках па граматыцы нярэдка падаецца парадыгма склонавых канчаткаў замест пераліку ўсіх словаформаў слова.

Граматычныя значэнні маюць свае сродкі і спосабы выражэння: 1) канчаткі, 2) формаўтваральныя афіксы, 3) націск, 4) чаргаванне гукаў, 5) службовыя словы, 6) інтанацыя, 7) дапаможныя словы, 8) парадак слоў, 9) суплетывізм.

З дапамогай канчаткаў выражаюцца значэнні роду, ліку і склону назоўнікаў, прыметнікаў, дзеепрыметнікаў, займеннікаў. З дапамогай формаўтваральных афіксаў утвараюцца формы прошлага часу дзеяслова, формы трывання, формы стану, формы вышэйшай і найвышэйшай ступеней параўнання прыметнікаў і прыслоўяў.

У славянскіх мовах унутраная флексія (чаргаванне гукаў) непашыраны спосаб перадачы граматычных значэнняў; ён сустракаецца пры ўтварэнні трыванняў дзеясловаў: *забіраць – забраць, заснуць – засынаць, засылаць – заслаць.*

Націск таксама служыць для перадачы граматычных значэнняў, напрыклад, граматычнага значэння трывання: *насы́паць* (зак.) – *насыпа́ць* (незак.), *раскі́даць* (зак.) – *раскіда́ць* (незак.); граматычных значэнняў склону і ліку: *ру́кі* (мн. л., Н. склон) – *рукі́* (адз .л., Р. склон), *стру́ны – струны́.*

Службовыя словы (прыназоўнікі, злучнікі, часціцы, звязкі і інш. дапаможныя словы) пашыраны спосаб пазаслоўнай перадачы розных граматычных значэнняў. Прыназоўнікі перадаюць розныя падпарадкавальныя адносіны паміж членамі сказа, удакладняюць склонавыя значэнні назоўнікаў: *пайшоў да сябра, пайшоў за сябра пайшоў па сябра, пайшоў з сябрам*; яны выражаюць розныя граматычныя значэнні: прычынныя (*праз, з-за, дзякуючы*), мэтавыя (*для, дзеля*), часавыя (*да, перад, пасля, па*), прасторавыя (*на, пры, за, над, у*) і інш.

Склонавыя значэнні назоўнікаў звычайна выражаюцца з дапамогай прыназоўнікаў і канчаткаў, а нескланяльных назоўнікаў – толькі прыназоўнікаў: *ехаць у метро, працаваць у дэпо, сядзець за піяніна.*

Злучнікі перадаюць злучальныя і падпарадкавальныя адносіны, прычым апошнія звычайна ў складаным сказе. Напрыклад, злучальныя злучнікі (і, а, але, ды і інш.) паказваюць на раўнапраўнасць ці супрацьлегласць і інш., а падпарадкавальныя на прычынныя (бо, таму што), мэтавыя (для таго, каб), параўнальныя (нібы, як) ды шмат якія іншыя адносіны. Граматычныя значэнні перадаюцца таксама злучнікавымі словамі (займеннікамі і прыслоўямі), якія, не губляючы ролі члена сказа, паказваюць на пэўныя граматычныя адносіны паміж даданай і галоўнай часткамі складанага сказа: *Як не любіць той край, адкуль ты родам; Хто дбае, той мае.*

Часціцы перадаюць разнастайныя мадальныя значэнні, дачыненні моўцы да таго, што ён выказвае, і дачыненні зместу выказанага да рэчаіснасці: сцверджанне (*так, я чытаў*), адмаўленне (*не, не чытаў*), пытанне

(*ці знайшоў*), запрашэнне ці загад (*зайшоў бы, хай зойдзе*). Як дадатковы сродак выражэння граматычных значэнняў загаднага і ўмоўнага ладу выступаюць часціцы *няхай (хай), бы (б)*: *А мы [крыніцы] выпусцім на прастор – няхай бягуць, няхай звіняць, няхай працуюць на нас!* (Б.). *Хай сонца не гасне, хай свецяцца зоры, хай сэрца не стыне ў людзей* (Кул.). *Хоць бы мне па жменьцы сонца, я б сыпнуў туды, дзе цёмна* (Бр.).

Да службовых слоў належыць дапаможны дзеяслоў *быць*, які паказвае на час, асобу, лік у аналітычнай форме будучага часу (*буду чытаць, будзеш чытаць, будзе чытаць, будзем чытаць, будзеце чытаць, будуць чытаць*), а ў аналітычнай форме прошлага часу на мужчынскі, жаночы і ніякі род і на множны лік (*быў прыйшоў, была прыйшла, было прыйшло, былі прыйшлі*). Да службовых слоў належыць дзеяслоў-звязка як элемент аналітычнай формы іменнага выказніка. Гэтая звязка перадае значэнні часу, ладу і ліку: *Дзень дажджлівы. Дзень будзе дажджлівы. Дзень быў дажджлівы. Дні былі дажджлівыя.* Да службовых слоў-звязак адносяць і слова *гэта*.

Службовымі выступаюць словы: 1) *больш, болей; менш, меней*; 2) *найбольш, наименш, самы*, якія паказваюць на меру (ступень) якасці ў якасных прыметніках і прыслоўях. Яны адпавядаюць афіксам: 1) суфіксу *-эйш-(-ейш-)* у сінтэтычных (простых) формах ступеняў параўнання: *больш (болей) светлы і менш (меней) светлы, святлейшы*; 2) прыстаўцы *най-*: *найбольш светлы ці самы светлы, найсвятлейшы*.

Парадак слоў (пэўнае размяшчэнне слоў у сказе або ў сінтаксічнай групе) у беларускай, рускай і іншых мовах мае вырашальнае значэнне толькі пры вызначэнні дзейніка і дапаўнення, калі супадаюць формы назоўнікаў назоўнага і вінавальнага склонаў (граматычная аманімія): *Зелле глушыць лён*. Слова, якое стаіць перад выказнікам, лічыцца дзейнікам, а пасля яго – выказнікам. Парадак слоў дазваляе адрозніваць тыпы сказаў, калі яны маюць аманімічныя словазлучэнні: сказ з назоўніка і прыметніка пасля яго ў функцыі выказніка двухсастаўны: *Дарога гладкая, слізкая, бліскучая* (Луж.), а сказ з прыметнікам перад назоўнікам аднасастаўны: *Калючыя зоры. Паўночны спакой* (Вял.). Такім чынам, сінтаксічная роля прыметніка дыктуецца тут яго пазіцыяй у дачыненні да паяснёнага слова – назоўніка: у постпазіцыі – выказнік, у прэпазіцыі – азначэнне. Але акрамя пазіцыі прыметнікаў, сказы тут маюць і адметную інтанацыю.

Інтанацыя таксама выконвае важную граматычную функцыю служыць для адрознення тыпаў сказаў паводле мэты выказвання (з тым самым наборам слоў): 1) Ты быў у бацькоў. 2) Ты быў у бацькоў? 3) Ты быў у бацькоў!

Суплетывізм – спосаб перадачы граматычных значэнняў шляхам спалучэння ў адну граматычную пару формаў ад розных каранёў ці асноў, напрыклад: *чалавек* (адзіночны лік) – *людзі* (множны лік), *браць* (незако-

нчанае трыванне) – *узяць* (зак. трыванне). Як бачым, тут граматычныя формы таго самага слова ўтвараюцца ад розных каранёў. Або: *малы – меншы*, дзе розныя асновы (мал-/мен-). Найперш суплетыўныя формы ўласцівыя ступеням параўнання прыметнікаў і прыслоўяў са значэннем 'добры' і 'кепскі': *добры – лепшы, кепскі (дрэнны) – горшы*. Суплетыўныя формы займеннікаў выкарыстоўваюцца з суб'ектным і аб'ектным значэннямі ва ўсіх індаеўрапейскіх мовах (а гэта сведчанне іх роднасці): *я – мяне, мне, мною, ты – цябе, табе, ён, яна, яно – яго (j-аго), яе (j-ае), яны – іх (j-іх)* і г.д.

Адна і тая ж граматычная форма можа выражаць некалькі граматычных значэнняў. Так, у сказе *Вецце раскінулі і расцвілі белыя ліпы* (Грах.) суфікс *-л-* і канчатак *-і* дзеясловаў *раскінулі, расцвілі* выражаюць граматычныя значэнні абвеснага ладу, прошлага часу, множнага ліку; канчатак *-ы* назоўніка *ліпы* – граматычныя значэнні множнага ліку, назоўнага склону.

Паводле граматычнай будовы беларуская мова адносіцца да флектыўных, таму большасць яе граматычных значэнняў выражаецца простымі, сінтэтычнымі формамі, г. зн. з дапамогай сродкаў, якія ўваходзяць у само слова (пераважна з дапамогай канчаткаў, суфіксаў, прыставак). Аднак ёсць выпадкі, калі граматычныя значэнні выражаюцца больш складанымі, аналітычнымі формамі, якія складаюцца з двух кампанентаў: адзін (асноўны) выступае як носьбіт лексічнага значэння, а другі (дапаможны) служыць для выражэння граматычнага значэння. Гэта формы вышэйшай і найвышэйшай ступеней параўнання прыметнікаў і прыслоўяў: *здольны – больш здольны, самы здольны, падрыхтаваны – менш падрыхтаваны, самы падрыхтаваны; прыгожа – больш прыгожа*; формы будучага часу: *буду чакаць, буду працаваць*; складаная форма прошлага часу (старажытны плюсквамперфект): *пайшоў быў, прыйшлі былі, успомніла была*; формы загаднага ладу: *няхай жывуць, хай чакаюць, няхай працуюць, давай спаткаемся.*

Аналітычным спосабам лічыцца выражэнне граматычных значэнняў пры дапамозе сінтаксічных сродкаў, г. зн. сродкаў кантэксту, тых слоў, з якімі тая ці іншая форма спалучаецца. Так, у сказе *Хлопец амаль подбегам з адчуваннем палёгкі ўвайшоў у светлае фае* (У. К.) значэнне ніякага роду вінавальнага склону назоўніка *фае* выражана ўжываннем прыметніка *светлае* ў форме ніякага роду. З дапамогай кантэксту канкрэтызуюцца значэнні назоўнікаў агульнага роду. Параўн.: *Прыйшла мая маленькая Саша* і *Прыйшоў мой маленькі Саша.*

## 2.2. Часціны мовы як лексіка-граматычныя разрады слоў

Паводле граматычных уласцівасцей усе словы беларускай мовы размяркоўваюцца па лексіка-граматычных разрадах, якія называюцца ча-

сцінамі мовы. Падзел слоў на часціны мовы адбываецца на аснове іх катэгарыяльнага (класіфікацыйнага) лексічнага значэння, марфалагічных прымет, сінтаксічных уласцівасцей і асаблівасці сістэмы словаўтварэння.

**Катэгарыяльнае (класіфікацыйнае) значэнне** – гэта абагульненае лексічнае значэнне слоў пэўнай часціны мовы, не звязанае з лексічным значэннем кожнага асобнага слова – семантычнай прыметай, якая індывідуалізуе слова, вылучае яго ў асобную лексему. Катэгарыяльнае значэнне абагульняе, аб'ядноўвае словы ў адзін клас (разрад).

Да марфалагічных прымет, якія ўлічваюцца пры класіфікацыі часцін мовы, адносяцца: зменнасць ці нязменнасць слоў, тып і асаблівасці іх змянення (скланенне, спражэнне); граматычныя катэгорыі слоў і іх спецыфіка.

Лексіка-граматычныя класы слоў, якія характарызуюцца адзінствам абагульненага значэння, агульнасцю граматычных катэгорый, асаблівасцей словазмянення, спалучальнасці з іншымі словамі, падабенствам асноўных сінтаксічных функцый і спосабаў словаўтварэння, складаюць 10 часцін мовы: назоўнік, прыметнік, лічэбнік, займеннік, дзеяслоў, прыслоўе, прыназоўнік, злучнік, часціцы, выклічнік.

Часціны мовы падзяляюцца на **паўназначныя** (назоўнік, прыметнік, лічэбнік, займеннік, дзеяслоў, прыслоўе) і **непаўназначныя** (прыназоўнік, злучнік, часціцы). Выклічнік знаходзіцца па-за межамі гэтага падзелу. Сярод паўназначных часцін мовы вылучаюцца **ўказальныя** словы (займеннік), якія не называюць прадметаў, прыкмет ці колькасці, а толькі ўказваюць на іх. Астатнія паўназначныя часціны мовы адносяцца да **знамянальных**.

Да паўназначных часцін мовы звычайна адносяць і словы, што называюць стан асобы, асяроддзе *(весела, сумна, холадна, шкада, досыць, нельга* і падобныя) ці маюць значэнне ацэнкі (магчымасці або немагчымасці) і г. д. Гэты клас слоў у многіх даследаваннях называюць па-рознаму: прэдыкатывамі, катэгорыяй стану, безасабова-прэдыкатыўнымі словамі, прэдыкатыўнымі прыслоўямі.

Непаўназначныя – перш за ўсё службовыя словы. Асобны клас слоў дзеяслоўнага паходжання – звязкі *(быць, стаць, з'яўляцца* і падобныя) і часціцы.

Такая класіфікацыя часцін мовы складвалася паступова і не з'яўляецца завершанай, бо пабудавана не на адзінай лагічнай аснове і не ахоплівае ўсіх магчымых класаў слоў. Яна традыцыйная і, пераважна, практычная, зручная для навучання ў школе. У сучаснай навуковай літаратуры вылучаюцца 3 погляды на часціны мовы: анталагічны (у самой мове аб'ектыўна існуюць разрады слоў, яны нібы прапануюцца самой

моўнай сістэмай), навуковы (людзі самі ствараюць класіфікацыі слоў і таму бясконца спрачаюцца пра колькасць часцін мовы), дыдактычны (як лепш падаць сістэму слоў мовы прыстасавальна да запатрабаванняў школы).

Усе словы можна падзяліць на зменныя і нязменныя. **Зменныя** маюць сістэму форм, у кожнай з іх свой адпаведны сродак выражэння, звычайна канчатак. **Нязменныя** словы без канчаткаў. Зменнымі словамі з'яўляюцца назоўнікі, прыметнікі, лічэбнікі, займеннікі, дзеясловы, нязменнымі – прыслоўі, катэгорыя стану (безасабова-прэдыкатыўныя словы), мадальныя словы, усе службовыя словы і выклічнік. Акрамя таго, сярод зменных часцін мовы могуць быць нязменныя словы. Напрыклад, сярод назоўнікаў у асобную групу выдзяляюцца нескланяльныя словы тыпу *метро, дэпо, кенгуру, калібры* і інш.

Зменныя словы скланяюцца (назоўнікі, прыметнікі, лічэбнікі, займеннікі) або спрагаюцца (дзеясловы). Часціны мовы характарызуюцца розным наборам граматычных катэгорый і іх зместам. Найбольшую колькасць граматычных катэгорый мае дзеяслоў.

Такім чынам, **часціны мовы** – гэта лексіка-граматычныя класы слоў, якія характарызуюцца катэгарыяльным (класіфікацыйным) значэннем, уласцівымі ім граматычнымі катэгорыямі, асноўнымі сінтаксічнымі функцыямі, спосабамі словаўтварэння.

### 2.2.1. Сістэма часцін мовы

У залежнасці ад ступені самастойнасці, сістэмы граматычных катэгорый, характару сінтаксічных функцый часціны мовы дзеляцца на два разрады – самастойныя і службовыя.

**Самастойныя** часціны мовы – назоўнік, прыметнік, лічэбнік, займеннік, дзеяслоў, прыслоўе, безасабова-прэдыкатыўныя словы – маюць лексічнае значэнне, намінатыўную функцыю, з'яўляюцца членамі сказа.

Назоўнік мае катэгарыяльнае значэнне прадметнасці, характарызуецца самастойнымі катэгорыямі роду, ліку і склону, у сказе выконвае сінтаксічную функцыю дзейніка і дапаўнення. Назоўнікі ўтвараюцца ўсімі спосабамі беларускага словаўтварэння.

Прыметнік мае катэгарыяльнае значэнне прыметы, дапасуецца да назоўніка ў родзе, ліку і склоне; граматычныя катэгорыі прыметніка сінтаксічна залежныя і рэалізуюцца праз сінтаксічную сувязь з назоўнікам. У сказе прыметнік выконвае тыповую сінтаксічную функцыю азначэння або выказніка. Прыметніку ўласцівыя спецыфічныя склонавыя канчаткі, словаўтваральныя і формаўтваральныя суфіксы.

Лічэбнік мае катэгарыяльнае значэнне колькасці, якое канкрэтызуецца ў значэннях – адцягнены лік, колькасць аднародных прадметаў, парадак іх пры лічэнні. Для лічэбнікаў характэрна катэгорыя склону; фо-

рмы роду і ліку маюць толькі асобныя лічэбнікі. У сказе лічэбнікі могуць выконваць ролю любога члена сказа.

Займеннік паказвае на прадметы, прыметы прадметаў ці колькасць, не называючы іх. Лексічнае значэнне, марфалагічныя прыметы і сінтаксічная функцыя займенніка залежаць ад таго, якую часціну мовы ён «замяняе».

Дзеяслоў мае катэгарыяльнае значэнне працэсу, характарызуецца самай складанай сістэмай граматычных катэгорый і формаў; ён мае катэгорыі стану, пераходнасці – непераходнасці, трывання, ладу, часу, асобы, ліку. Спрагальныя формы дзеяслова выконваюць сінтаксічную ролю выказніка, неспрагальныя – азначэння і акалічнасці. Для дзеяслова характэрна своеасаблівая сістэма словаўтварэння.

Прыслоўе абазначае прымету дзеяння, стану ці прымету якасці. Семантычна прыслоўі суадносяцца з усімі зменнымі часцінамі мовы і ўтвараюцца ад іх суфіксальна-прэфіксальным, суфіксальным спосабамі, а таксама спосабам адвербіялізацыі. Нязменнасць – асноўная марфалагічная прымета прыслоўяў. У сказе прыслоўі выконваюць функцыю акалічнасці.

Многія лінгвісты цяпер разглядаюць як асобную часціну мовы безасабова-прэдыкатыўныя словы (словы катэгорыі стану), якая характарызуецца спецыфічным лексічным значэннем – абазначае стан прыроды ці чалавека; граматычнымі прыметамі – словы гэтай часціны мовы не змяняюцца; сінтаксічнай функцыяй – выконвае ролю выказніка (прэдыката) у безасабовых сказах: *Весела на полі, слаўна пад бярозкай* (К-с). Але пытанне пра вылучэнне ў асобную часціну мовы безасабова-прэдыкатыўных слоў канчаткова не вырашана. У школьнай практыцы гэтыя словы вывучаюцца ў межах прыслоўя.

Да другога разраду адносяцца **службовыя** часціны мовы – прыназоўнікі, злучнікі, часціцы. Яны не маюць намінатыўнага значэння і граматычных катэгорый, самастойнай сінтаксічнай функцыі – не з'яўляюцца членамі сказа. Ужываюцца яны толькі ў спалучэнні з самастойнымі часцінамі мовы і могуць выражаць адносіны паміж кампанентамі словазлучэння, канкрэтызаваць значэнні склонавых формаў (прыназоўнік), злучаць словы і часткі складаных сказаў, выражаючы сэнсавыя адносіны паміж імі (злучнік), а таксама даваць разнастайныя сэнсавыя і мадальнавалявыя, эмацыянальна-экспрэсіўныя ацэнкі слова, словазлучэння ці сказа (часціцы).

Асобна ў сістэме часцін мовы стаяць выклічнікі і гукапераймальныя словы. Яны выражаюць пачуцці, розныя волевыяўленні, але не называюць іх (выклічнік) або перадаюць з дапамогай моўных сродкаў розныя гукавыя з'явы (гукапераймальныя словы).

Сістэма часцін мовы, аднак, не з'яўляецца пастаяннай, нязменнай, бо не застаюцца нязменнымі межы кожнай часціны мовы, яе аб'ём. Адбываецца не толькі павелічэнне або змяншэнне колькасці слоў, якія ўваходзяць у пэўную часціну мовы, мяняецца і колькасць саміх часцін мовы. Адна з прымет (семантычная, марфалагічная, сінтаксічная), што ляжыць у аснове выдзялення пэўнай часціны мовы, можа ўзмацняцца або паслабляцца, у выніку мяняецца класіфікацыйная характарыстыка слоў гэтага разраду. Так, у навуковых граматыках у асобную часціну мовы цяпер вылучаюцца мадальныя словы. Мадальныя словы выражаюць суб'ектыўна-аб'ектыўныя адносіны асобы да зместу выказвання. Яны не змяняюцца, граматычна не звязаны з іншымі словамі ў сказе, не з'яўляюцца членамі сказа, як правіла, выдзяляюцца інтанацыйна, звычайна выконваюць функцыю пабочных слоў: *Па-над рэчкай у лузе квяцістым мы хадзілі, бывала, не раз* (К-с). *Здаецца, увесь поплаў звініць, спявае* (Асіп.). Упершыню ў сістэму часцін мовы мадальныя словы ўключыў В.У. Вінаградаў, ахарактарызаваўшы іх як самастойны лексіка-граматычны разрад слоў.

Няма адной думкі ў вучоных адносна кваліфікацыі дзеепрыметнікаў і дзеепрыслоўяў. Хоць традыцыйна яны лічацца асобымі формамі дзеяслова, спецыфіка іх лексічнага значэння, сістэма граматычных катэгорый, асаблівасці сінтаксічнай функцыі далі падставу некаторым вучоным, напрыклад Н.М. Шанскаму, А.Н. Ціханаву, разглядаць гэтыя словы як асобныя часціны мовы.

Колькасць слоў той ці іншай часціны мовы не застаецца нязменнай. Словы могуць змяняць лексічнае і граматычнае значэнні, набываць іншую сінтаксічную функцыю і пераходзіць у іншы лексіка-граматычны разрад. Так, прыслоўі папаўняюцца за кошт страты формаў словазмянення іншымі часцінамі мовы. У сучаснай беларускай літаратурнай мове пераход зменных часцін мовы ў разрад прыслоўяў адбываецца даволі актыўна. Словы трацяць сувязь з суадноснай часцінай мовы (з зыходнай яе формай), на базе якой утварылася: *датла ← тло, спрадвеку ← век, сёння ← се дьня.* Адбываецца зліццё прыназоўнікава-склонавай формы зменнай часціны мовы ў адно слова (знізу, справа, збоку), змена сінтаксічнай функцыі слова ў сказе.

У выніку субстантывацыі прыметнікі пераходзяць у назоўнікі. Існуе два тыпы такога пераходу – лексікалізацыя асобнай граматычнай формы прыметніка, г. зн. пераўтварэнне яе ў новую лексічную адзінку (параўн.: паляўнічы нож і старанны паляўнічы), і семантыка-граматычнае пераафармленне цэлай парадыгмы (параўн.: малады чалавек і малады, старыя людзі і старыя). Пры лексікалізацыі новае слова атрымлівае ўсе прыметы, характэрныя для той часціны мовы, у якую яно перахо-

дзіць, пры семантыка-граматычным пераафармленні парадыгмы формы словазмянення новага слова захоўваюцца. Напрыклад, субстантываваныя прыметнікі маюць ранейшую парадыгму скланення.

У выніку пераходу прыметнікаў у назоўнікі лексічнае значэнне якасці прыметніка губляецца, якасць абстрагуецца і выступае як паказчык прадметнасці. Мяняюцца і граматычныя характарыстыкі субстантываваных прыметнікаў – катэгорыі роду, ліку і склону становяцца незалежнымі: *Шчаслівы той, хто ў сталасці сваёй дапамагае жыць прыгожа* ***маладым*** (Б.). *І прыйдзе яшчэ летапісец, каб час вечным сковам звязаць, каб толькі* ***сапраўднае*** *ўзвысіць, адзіную праўду сказаць* (С. З.).

Семантыка-граматычнае пераафармленне цэлай парадыгмы адбываецца пры пераходзе дзеепрыметнікаў у прыметнікі (пры ад'ектывацыі). Асноўнай прычынай ад'ектывацыі дзеепрыметнікаў з'яўляецца змена імі семантыкі: прымета, набытая ў выніку пэўнага дзеяння, становіцца пастаяннай, нязменнай; на змену прамому значэнню, поўнасцю суадноснаму з дзеясловам, прыходзіць пераноснае значэнне і пашырэнне слоўных сувязей. Такія дзеепрыметнікі губляюць граматычныя значэнні часу, стану, трывання і ўзмацняюць лексічнае значэнне якасці: *жаданы госць, несканчоныя дарогі, незлічоныя дні. Восень зроду такой не была: залатая,* ***пахучая****, цёплая* (Гіл.). *З цяністых груш і яблынь маладых сарваў лісты* ***гаручыя*** *віхор* (М.Т.). *Маленства – гэта багацце, тая* ***гаючая*** *крыніца, якую мы носім у сабе і з якой спатольваем і будзем спатольваць яшчэ не раз прагу жыцця* (Сач.).

Некаторыя назоўнікі, прыметнікі, лічэбнікі могуць страчваць сваё лексічнае значэнне, набываць абстрактнасць і ўказальнасць і пераходзіць у разрад займеннікаў – з'ява пранаміналізацыі: *Ганна была ўжо не тая гарэзлівая ганарліўка,* ***другая*** *жанчына глядзела на жыццё іншымі вачыма* (І.М.). *Ішлі пераважна пажылыя...* ***Аднаго*** *высокага мужчыну падтрымліваў падлетак* (Хадк.).

За кошт іншых часцін мовы актыўна папаўняецца прыслоўе: *пайсці да хаты дзеда Васі – пайсці дахаты; засмуціцца ў дзень атэстацыі – удзень пайшоў дождж.*

Разрад прыназоўнікаў папаўняецца за кошт прыслоўяў і дзеепрыслоўяў – **кан'юнкцыяналізацыя**: *Усё навакольнае раскрываецца мне... То поле* ***абапал*** *гасцінца, то луг, то старыя, карэлыя бярозы...* (Б.). *Ад прадзедаў* ***спакон*** *вякоў мне засталася спадчына* (Куп.). ***Нягледзячы на*** *ранні час, куранёўцы жылі сваім клапатлівым жыццём* (І.М.).

### 3. Пытанні да асноўнага тэарэтычнага матэрыялу

1. Якія значэнні мае тэрмін «граматыка»? Што з'яўляецца аб'ектам яе вывучэння?

2. Які змест і аб'ём тэрміна «марфалогія»?
3. Якія задачы вывучэння марфалогіі?
4. Якое месца займае марфалогія сярод іншых раздзелаў мовазнаўства?
5. Што такое граматычнае значэнне?
6. Назавіце сродкі і спосабы выражэння граматычных значэнняў.
7. Што ўключае паняцце «граматычная катэгорыя»?
8. Што такое словаформа?
9. Што такое парадыгма?
10. Дайце азначэнне паняцця «часціны мовы».
11. Якія прынцыпы вылучэння і размежавання часцін мовы?
12. Ці можна ахарактарызаваць слова як часціну мовы па-за кантэкстам?
13. Якія часціны мовы называюцца самастойнымі, а якія службовымі? Назавіце іх асноўныя кваліфікацыйныя характарыстыкі.
14. У сувязі з чым мяняецца аб'ём той ці іншай часціны мовы? Раскажыце пра пераход слоў з адной часціны мовы ў другую.

## 4. Матэрыялы да практычных аўдыторных і самастойных заняткаў

### 4.1. Схема блок-сістэмы практычных заняткаў

| № | Тэма практычных заняткаў | Колькасць гадзін |
|---|---|---|
| 1. | Сістэма часцін мовы. Самастойныя і службовыя часціны мовы. Выклічнікі і гукапераймальныя словы. | 2 |
| 2. | Граматычныя значэнні слова. Сродкі і спосабы іх выражэння. Граматычная катэгорыя. Граматычная форма. Парадыгма. | 2 |
| 3. | Пераход слоў адной часціны мовы ў іншую. | 2 |

### 4.2. Практыкаванні для засваення тэарэтычных ведаў па модулі

На занятках 1 выконваюцца практыкаванні 280-283.
На занятках 2 выконваюцца практыкаванні, 285, 287.
На занятках 3 выконваюцца практыкаванні 284, 286.

## 5. Дадатковая літаратура па модулі

1. Гістарычная марфалогія беларускай мовы / А.М. Булыка, А.І. Жураўскі, І.І. Крамко. – Мн.: Навука і тэхніка, 1979.
2. Курс сучаснай беларускай літаратурнай мовы: Марфалогія: Падруч. для студ. філал. фак. ун-таў і пед. ін-таў / Рэдкал.: акад. К.К. Атраховіч (К.Крапіва), акад. П.Ф. Глебка, канд. філал. навук М.Г. Булахаў, Н.І. Гурскі. – Мн.: Вучпедвыд, 1957.
3. Лёсік Я. Граматыка беларускай мовы: Марфалогія: Для настаўніцкіх педтэ-

хнікумаў. – Мн.: Дзяржвыд Беларусі, 1927.
4. Марфалогія ў табліцах: Вучэб.-метад. дапам. для студэнтаў філал. фак. / М-ва адукацыі і навукі РБ, Віцеб. дзярж. ун-т. – Віцебск, 1995.
5. Шарамета М.В. Тыпы марфалагічных адзінак у французскай і беларускай мовах. – Мн.: МДЛУ, 1996.
6. Шуба П.П. Уводзіны ў граматыку беларускай мовы. – Мн.: БДУ імя У.І.Леніна, 1969.
7. Янкоўскі Ф.М. Роднае слова / Пад рэд. М. Яўневіча. – Мн.: Вышэйш. шк., 1972.

# МОДУЛЬ 8
# «НАЗОЎНІК»

## 1. Схема блок-сістэмы вывучэння тэарэтычнага матэрыялу

| № | Тэма лекцыйных заняткаў | Колькасць гадзін |
|---|---|---|
| 1. | Назоўнік. Назоўнік як часціна мовы. Катэгарыяльнае значэнне, марфалагічныя прыметы і сінтаксічная роля. Лексіка-семантычныя групы назоўнікаў. Лексіка-граматычныя групы назоўнікаў. | 2 |
| 2. | Граматычныя катэгорыі назоўніка. Род назоўнікаў. Назоўнікі агульнага роду. Вызначэнне роду нескланяльных назоўнікаў. Лік назоўнікаў. Адзіночналікавыя і множналікавыя назоўнікі. Склон назоўнікаў. Асноўныя значэнні склонаў. | 2 |
| 3. | Скланенне назоўнікаў. Тыпы скланення: назоўнікі субстантыўнага, ад'ектыўнага, змешанага (субстантыўна-ад'ектыўнага), нулявога скланення. Рознаскланяльныя назоўнікі. | 2 |
| 4. | Скланенне асабовых імёнаў, прозвішчаў і геаграфічных назваў. Рознаскланялытыя назоўнікі. Нескланяльныя назоўнікі. | 2 |
| 5. | Утварэнне назоўнікаў. | 2 |

## 2. Асновы навукова-тэарэтычных ведаў па модулі

**Слоўнік паняццяў для засваення**: назоўнік, уласныя назоўнікі, агульныя назоўнікі, канкрэтныя назоўнікі, абстрактныя назоўнікі, адушаўлёныя назоўнікі, неадушаўлёныя назоўнікі, асабовыя назоўнікі, неасабовыя назоўнікі, зборныя назоўнікі, рэчыўныя назоўнікі, адзінкавыя назоўнікі, лік назоўнікаў, адзіночналікавыя назоўнікі, множналікавыя назоўнікі, склон назоўнікаў, скланенне, парадыгма скланення.

Пры напісанні раздзела быў выкарыстаны матэрыял вучэбнага дапаможніка «Сучасная беларуская літаратурная мова: Марфалогія: Вучэб. дапам. / Н.В. Гаўрош, М.Ц. Кавалёва, Н.М. Нямковіч і інш.; Пад агульн. рэд. праф. М.С. Яўневіча. – Мн.: Выд. Ул.М. Скарун, 1997. – 288с.»

### 2.1. Назоўнік як часціна мовы. Лексіка-граматычныя разрады назоўніка

**Назоўнік** – самастойная часціна мовы, якая аб'ядноўвае словы з катэгарыяльным значэннем прадметнасці і мае самастойныя граматычныя катэгорыі роду, ліку і склону. Гістарычна назоўнікі як самастойны клас слоў не вылучаліся. Разам з іншымі скланяльнымі словамі яны адносіліся да разраду імёнаў, якія формамі словазмянення і іншымі граматычнымі адзнакамі проціпастаўляліся другой часціне мовы – дзеяслову як спрагальнай групе слоў. Аднак па меры станаўлення і развіцця пэўных граматы-

чных і лексіка-граматычных катэгорый, форм словазмянення і словаўтварэння з агульнага недыферэнцыраванага ў мінулым імені сталі вылучацца назоўнікі, прыметнікі, займеннікі, а пасля і лічэбнікі. Так сфарміравалася сістэма іменных часцін мовы з уласцівымі ім граматычнымі асаблівасцямі.

Назоўнікі валодаюць разгалінаванай сістэмай граматычных катэгорый і форм, якія дазваляюць ім выконваць у мове разнастайныя сінтаксічныя функцыі, маюць уласную сістэму структураўтваральных элементаў і вызначаюцца багаццем значэнняў і іх адценняў. Яны могуць абазначаць: асоб паводле іх імёнаў, прозвішчаў, псеўданімаў, мянушак, паводле іх занятку, дзейнасці, прафесіі, пасадзе, спецыяльнасці, званні, сацыяльнай прыналежнасці, полу, узросту, нацыянальнасці і г. д. *(Сяргей, брыгадзір, селянін, цясляр, хлопец, беларус),* прадстаўнікоў жывёльнага і расліннага свету *(зубр, дзяцел, авадзень, уюн, дуб, явар, мох, грыб),* з'явы прыроды, стыхійныя бедствы, поры года, часавыя прамежкі, перыяды *(дождж, гром, світанне, паводка, буран, сезон),* прасторавыя паняцці, напрамкі, часткі свету, мясцовасці, масівы, населеныя пункты, прыродныя ўтварэнні, выкапні, рэчывы *(галактыка, Антарктыда, Усход, небасхіл, акіян, узвышша, мінерал),* прадметы вытворчасці, прылады, прыстасаванні, вырабы *(станок, плуг, кросны, фуганак, дыван, карункі),* прадпрыемствы, установы, арганізацыі, аб'яднанні *(завод, клуб, брыгада, звяно, суполка, грамада),* падзеі, грамадскія з'явы, рух, ідэі, вучэнні, дзяржаўныя органы, формы кіраўніцтва *(бунт, забастоўка, дэманстрацыя, вайна, рэвалюцыя)*, разумовыя паняцці, уяўленні *(думка, свядомасць, тэзіс, аргумент),* адцягненыя якасці, уласцівасці, адносіны, ацэнкі *(прыгажосць, сціпласць, дабрыня, дабрачыннасць, міласэрнасць, клопат),* станы, адчуванні, апрадмечаныя дзеянні, працэсы *(гнеў, боль, імкненне, жаданне, уздым)* і інш.

Назоўнікі могуць мець пры сабе дапасаваныя азначэнні, выражаныя прыметнікамі, дзеепрыметнікамі, займеннікамі, парадкавымі лічэбнікамі, і недапасаваныя азначэнні, выражаныя назоўнікамі, прыслоўямі, інфінітывам.

Тыповая сінтаксічная функцыя назоўніка – выступаць у ролі дзейніка (у форме назоўнага склону) або дапаўнення (у форме ўскосных склонаў). Радзей назоўнікі выступаюць у ролі іншых членаў сказа – выказніка, акалічнасці, недапасаванага азначэння.

У залежнасці ад лексічнага значэння і граматычных катэгорый назоўнікі дзеляцца на агульныя і ўласныя, канкрэтныя і абстрактныя, адушаўлёныя і неадушаўлёныя, асабовыя і неасабовыя, зборныя і рэчыўныя.

**Уласныя** назоўнікі абазначаюць індывідуалізаваныя назвы асоб,

істот, прадметаў і з'яў рэчаіснасці (Мікола, Купала, (верш) «Гусляр», Віхор, Вараны, Палессе, Нёман, Няміга, Зямля, Поўнач, Усход, (завод) «Ударнік», (калгас) «Перамога», (трактар) «Беларусь», (таварыства) «Спартак», Радзіма). **Агульныя** называюць цэлыя класы аднародных прадметаў і з'яў, істот, паняццяў (кніга, дрэва, луг, рака, чалавек, звер, маўзер, джоўль, кюры, краязнаўцы). Уласныя назоўнікі звычайна ўжываюцца толькі ў форме адзіночнага ліку, але ёсць асобныя словы і ў форме множнага ліку, хоць яны і абазначаюць адзінкавыя прадметы (Асіповічы, Клімавічы, Бялынічы, Чашнікі, Цімкавічы, Альпы, Гімалаі). Форму множнага ліку маюць імёны і прозвішчы, калі яны абазначаюць групу людзей: апавяданне Янкі Брыля «Іваны», браты Камаровы, сям'яВасілевічаў. Некаторыя агульныя назоўнікі пры пэўных умовах могуць стаць уласнымі: так узніклі, напрыклад, прозвішчы Верабей, Суша, Шпак, Крот, Сак, Курган, Мельнік, Каваль, геаграфічныя назвы Круглае, Глыбокае, Гарадок, Мір, Гай, Дуброва. Некаторыя ўласныя назоўнікі ў сваю чаргу могуць стаць агульнымі. Напрыклад, агульныя назоўнікі *рэнтген, ватман, маўзер, наган, дызель, ампер, кулон, ом, габелен, батыст, рэглан* утварыліся ад імёнаў асоб, якія былі іх вынаходнікамі, адкрывальнікамі. Уласныя назоўнікі становяцца агульнымі і тады, калі набываюць абагульняльны сэнс і пачынаюць ужывацца з пераносным значэннем. Гэта звычайна прозвішчы літаратурных тыпаў, якія ўжываюцца як абагульненыя характарыстыкі людзей пэўных паводзін: *зёлкіны, тулягі, гарлахвацкія, быкоўскія.*

**Канкрэтныя** назоўнікі абазначаюць пэўныя прадметы рэчаіснасці, з'явы прыроды, тыя ці іншыя падзеі, дзеянні і ўяўляюцца ў пэўнай акрэсленасці: *дом, стол, дрэва, возера, ноч, год).* Такія прадметы і з'явы ўспрымаюцца органамі пачуццяў. Канкрэтныя назоўнікі, як правіла, маюць формы адзіночнага і множнага лікаў*: дрэва – дрэвы, кніга – кнігі, дождж – даждджы, туман – туманы; спалучаюцца з колькаснымі і парадкавымі лічэбнікамі: адно дрэва, тры баравікі, другі экзамен, пятае заданне.* **Абстрактныя** назоўнікі абазначаюць адцягненыя паняцці, якасці, уласцівасці, станы, адчуванні, псіхічныя працэсы: *павага, любоў, гнеў, сорам, чуласць, слава, воля, гуманізм, энтузіязм, геройства, смеласць.* Яны звычайна ўжываюцца толькі ў форме адзіночнага ліку, не могуць спалучацца з колькаснымі лічэбнікамі, аднак некаторыя абстрактныя назоўнікі спалучаюцца з няпэўна-колькаснымі словамі *многа, мала, шмат, трохі, гэтулькі, столькі, некалькі.* Асобныя абстрактныя назоўнікі пры канкрэтызацыі набываюць форму множнага ліку: *гэтыя цяжкасці, першыя выпрабаванні, зламаныя лёсы, нашы спатканні.* Некаторыя абстрактныя назоўнікі маюць форму толькі множнага ліку: *абставіны, адведзіны, адносіны, перагаворы, дажынкі і інш.*

**Адушаўлёныя** назоўнікі абазначаюць назвы людзей, жывёл, птушак, рыб, насякомых: *слесар, воўк, кнігаўка, сарока, шчупак, карась, плотка, матыль, камар*; **неадушаўлёныя** – прадметаў нежывой прыроды, з'яў і падзей рэчаіснасці: *вуліца, дом, універсітэт, памяць, сустрэча, пошук.* Большасць адушаўлёных назоўнікаў – гэта назоўнікі мужчынскага і жаночага роду; адушаўлёных назоўнікаў ніякага роду вельмі мала: *дзіця, птушаня, качаня, ягня, парася, насякомае* і некаторыя іншыя.

Граматычнае паняцце «адушаўлёнасць – неадушаўлёнасць» не адпавядае паняццю «жывое – нежывое» ў біялогіі. Граматычнае адрозненне адушаўлёных і неадушаўлёных назоўнікаў выражаецца формай вінавальнага склону. У адушаўлёных назоўнікаў мужчынскага роду адзіночнага ліку (за выключэннем назоўнікаў на -а(-я) форма вінавальнага склону супадае з формай роднага склону: *бачу чалавека, настаўніка – не было чалавека, настаўніка.* Форма вінавальнага склону супадае з формай роднага і ў адушаўлёных назоўнікаў множнага ліку: *бачу людзей, настаўнікаў – не было людзей, настаўнікаў.* У неадушаўлёных назоўнікаў форма вінавальнага склону множнага ліку супадае з формай назоўнага: *бачу палі, узгоркі – паказаліся палі, узгоркі.* Да неадушаўлёных адносяцца назоўнікі *народ, атрад, натоўп, моладзь, вучнёўства, студэнцтва, таварыства*, якія маюць зборнае значэнне.

Да адушаўлёных належаць некаторыя назоўнікі, якія абазначаюць нежывыя істоты. Гэта назвы фантастычных і міфалагічных персанажаў: *лясун, чорт, вядзьмар, гном*; назвы цацак: *лялька, заяц, ліса, вавёрка*; назвы шахматных фігур: *слон, кароль, конь, ферзь*; назвы страў: *карп, шчупак, лешч*; назоўнікі *нябожчык, тапелец.*

Некаторыя неадушаўлёныя назоўнікі пры іх выкарыстанні ў пераносным значэнні набываюць граматычныя прыметы адушаўлёных, калі яны абазначаюць асоб: *прывезці языка (палоннага), убачыць гэтага арыгінала (чалавека, не падобнага на іншых), сустрэць такога тыпа (чалавека з адмоўнымі рысамі).*

**Асабовыя** назоўнікі з'яўляюцца назвамі пэўных асоб *(хлебароб, патрыёт, асілак, калега, запявала, мужчына, дзяўчына),* **неасабовыя** служаць для абазначэння розных іншых істот, прадметаў і з'яў *(лось, барсук, вавёрка, хвоя, неба, тундра).*

**Зборныя** назоўнікі называюць прадметы ў іх непадзельным адзінстве, цэласнасці, сукупнасці: *чалавецтва, люд, моладзь, дзятва, машкара, птаства, жарства, хвойнік, лазняк, галлё, крылле, карэнне, лісце.* Звычайна яны ўжываюцца толькі ў форме адзіночнага ліку і не спалучаюцца з колькаснымі лічэбнікамі, аднак некаторыя могуць спалучацца з няпэўна-колькаснымі словамі *мала, многа, шмат, трохі, гэтулькі, колькі, столькі, некалькі: многа звяр'я, мала лісця, шмат птаства,*

*столькі ламачча.* У пэўным кантэксце значэнне зборнасці могуць набываць і іншыя назоўнікі ў форме адзіночнага ліку:*Была б і **ягада** і **грыб**, калі б наведаў госць* (У.Х.). *А зірнеш на лес – сэрца сціснецца: і маркотна ў ім і нявесела! Пажаўцеў убор, пышны **ліст** яго, і ціхусенька асыпаецца* (К-с).

**Рэчыўныя** назоўнікі абазначаюць назвы рэчываў аднароднага саставу. Такія рэчывы можна дзяліць на часткі, пры гэтым яны захоўваюць назву цэлага. Рэчыўныя назоўнікі, як і зборныя, не паддаюцца лічэнню, але яны могуць вымярацца. Адзінкамі вымярэння служаць меры вагі *(грам, кілаграм, цэнтнер, то-на),* аб'ёму *(літр, кубаметр),* даўжыні *(сантыметр, метр).* Да рэчыўных назоўнікаў адносяцца назвы хімічых элементаў і злучэнняў: *кісларод, азот, вадарод, аміяк*; прадуктаў харчавання: *мёд, малако, цукар*; лекаў: *аспірын, валідол, цытрамон*; тканін: *шоўк, сацін, паркаль* і інш.

З некаторымі зборнымі і рэчыўнымі назоўнікамі суадносяцца так званыя **адзінкавыя** назоўнікі (назоўнікі са значэннем адзінкавасці). Адзінкавыя назоўнікі – гэта назоўнікі, што абазначаюць асобныя прадметы, выдзеленыя з аднароднага рэчыва або з сукупнасці аднародных прадметаў; яны ўтвараюцца ад рэчыўных і зборных назоўнікаў пры дапамозе суфіксаў *-ін-(-ын-), -інк(-ынк-)*, якія надаюць ім значэнне адзінкавасці: *гарох – гарошына, трава – травінка, пыл – пылінка, снег – сняжынка, чай – чаінка.*

### 2.2. Род назоўнікаў

Катэгорыя роду – адна з асноўных граматычных катэгорый назоўніка. Назоўнікі ў форме адзіночнага ліку адносяцца да аднаго з трох родаў: мужчынскага, жаночага, ніякага. Назоўнікі, якія ўжываюцца толькі ў множным ліку, катэгорыі роду не маюць: *духі, сані, акуляры, калготы, Асіповічы.*

Катэгорыя роду назоўнікаў вызначаецца ўстойлівасцю. Аднак некаторыя назоўнікі ў працэсе развіцця мовы змянілі сваю родавую прыналежнасць. Так, у першай трэці XX ст. у беларускай мове назоўнікі *кляса, эліпса, рэха, коміна* ўжываліся ў форме жаночага роду, назоўнікі *роспач, люстэрак* мелі форму мужчынскага роду: *Зварухнулася сіла, толькі **рэхаю** стогне абшар* (Ч.). *Ляжаў, курыў і цыркаў сліну з-за белай **коміны** на хату* (К-с). *Быў **роспач** у яго вачах* (К.Ч.). *Над маім над высокім парогам распускаецца клён малады, краскі лёгенька выбеглі логам паглядзецца ў **люстэрак** вады* (У.Х.).

Род назоўнікаў можна вызначыць трыма спосабамі: марфалагічна, сінтаксічна, семантычна.

Марфалагічна род назоўнікаў вызначаецца па склонавых канчатках. Да **мужчынскага** роду адносяцца назоўнікі, якія ў назоўным скло-

не маюць нулявы канчатак, а ў родным – канчаткі -а(-я), -у(-ю): *дом – дома, цэх – цэха, дзень – дня, град – граду, край – краю, настрой – настрою*. Да мужчынскага роду адносіцца невялікая група асабовых назоўнікаў, якія ў назоўным склоне маюць канчатак -а(-я), а ў родным – -і(-ы): *дзядзька – дзядзькі, бацька – бацькі, мужчына – мужчыны.* Мужчынскі род уласцівы субстантываваным прыметнікам і дзеепрыметнікам, якія ў назоўным склоне маюць канчатак -ы: *знаёмы, паляўнічы, дзяжурны, ранены, камандуючы*.

Да **жаночага** роду адносяцца назоўнікі, якія ў назоўным склоне маюць канчатак -а(-я) і нулявы канчатак, а ў родным – канчатак -ы(-і): *вуліца – вуліцы, вясна – вясны, песня – песні, зямля – зямлі, ноч – ночы, далонь – далоні, гусь – гусі, Сібір – Сібіры*. Жаночы род маюць субстантываваныя прыметнікі і дзеепрыметнікі, якія ў назоўным склоне маюць канчатак -ая: *дзяжурная, знаёмая, сталовая, маладая, важатая.*

Да **ніякага** роду адносяцца назоўнікі, якія ў назоўным склоне маюць канчаткі *-а(-я), -о(-ё), -е*, а ў родным – *-а(-я)*: *збожжа – збожжа, возера – возера, дзіця – дзіця(ці), жарабя – жарабя(ці), акно – акна, вядро – вядра, жыццё– жыцця, калоссе – калосся, зерне – зерня.* Ніякі род уласцівы субстантываваным прыметнікам і дзеепрыметнікам, якія ў назоўным склоне маюць канчатак *-ае*: *марожанае, піражнае, шампанскае*.

Сінтаксічна род назоўнікаў вызначаецца па форме дапасаванага азначэння (прыметніка, парадкавага лічэбніка, займенніка, дзеепрыметніка) або па форме выказніка, выражанага дзеясловам прошлага часу: *сонечная раніца, пяты пад'езд, наш універсітэт, занесенае снегам поле, прыйшла зіма, пачуўся стрэл.*

Семантычна вызначаецца род асабовых назоўнікаў у залежнасці ад полу асобы: *брат, бацька, мужчына, хлопец* – мужчынскага роду; *сястра, маці, жанчына, дзяўчына* – жаночага роду.

Род назоўнікаў **агульнага** роду, якія з'яўляюцца імёнамі і прозвішчамі, таксама вызначаецца семантычна: *сын Жэня – дачка Жэня, унук Шура – унучка Шура, хлопчык Саша – дзяўчынка Саша; Алеся Ждановіч – Віктар Ждановіч, Ніна Ткач – Максім Ткач.*

Нярэдка назоўнікі, што абазначаюць назвы асоб паводле іх прафесійных заняткаў, пасад, маюць форму мужчынскага роду і захоўваюць яе ў тых выпадках, калі адносяцца да асоб жаночага полу. Тлумачыцца гэта тым, што раней у пэўных сферах дзейнасці былі занятыя выключна мужчыны: *прафесар, дацэнт, дэкан, акадэмік, рэдактар, скульптар, біёлаг, карэктар, афіцэр, лейтэнант, капітан, генерал, тэрапеўт, слесар, будаўнік, інжынер* і г. д. Назоўнікі, якія ўзнікаюць у мове для абазначэння новых прафесій і пасад, найчасцей традыцыйна таксама маюць форму

толькі мужчынскага роду: *касманаўт, кардыёлаг, дызайнер, авіяканструктар, механік, бортінжынер, вірусолаг, эпідэміёлаг, дыялектолаг, каардынатар*. Дзеясловы-выказнікі пры назоўніках мужчынскага роду, якія абазначаюць жанчын па прафесіі, ужываюцца ў прошлым часе ў форме жаночага роду, а азначэнні захоўваюць форму мужчынскага роду: *на сходзе выступіла ганаровы акадэмік Папова; малады лейтэнант Патапава справілася з заданнем; вопытны кардыёлаг Яна Іванаўна распазнала хваробу*.

Назоўнікі толькі жаночага роду, што абазначаюць назвы асоб паводле іх прафесійных заняткаў, пасад, у беларускай мове сустракаюцца рэдка: *няня, прачка, машыністка, пакаёўка, павітуха, кастэлянка, манікюрша, педыкюрша, балерына*.

У беларускай мове назіраецца актыўны працэс утварэння адпаведных назоўнікаў жаночага роду ад назоўнікаў мужчынскага роду, якія абазначаюць назвы асоб паводле прафесій і пасад. Вялікай прадуктыўнасцю пры гэтым вызначаецца суфікс *-к-*: *бібліітэкар – бібліятэкарка, практыкант – практыкантка, аспірант – аспірантка, дыпламант – дыпламантка, кіяскёр – кіяскёрка, лабарант – лабарантка, сакратар – сакратарка, фельчар – фельчарка, бухгалтар – бухгалтарка, дыктар – дыктарка, дысертант – дысертантка, дыспетчар – дыспетчарка, дэлегат – дэлегатка, дэпутат – дэпутатка*. Пакуль што многія назоўнікі жаночага роду з суфіксам *-к-* маюць у «Тлумачальным слоўніку беларускай мовы» памету *разм*. (размоўнае). Аднак гэта не перашкаджае такім назоўнікам актыўна ўжывацца ў мове мастацкай літаратуры.

Назоўнікі жаночага роду з суфіксам *-іх-(-ых-)* тыпу *старшыніха, старасціха, каваліха, дырэктарыха (як і Васіліха, Іваніха, Камарыха)* паказваюць не на прафесію, пасаду; яны маюць значэнне 'жонка старшыні', 'жонка старасты', 'жонка дырэктара'. Гэтым назоўнікам уласціва адценне размоўнасці.

Назвы некаторых жывёл і птушак у залежнасці ад полу носьбіта маюць формы назоўнікаў мужчынскага і жаночага роду: *воўк – ваўчыца, слон – сланіха, заяц – зайчыха, казёл – каза, бык – карова, гусь – гусак*. Аднак не ва ўсіх назоўнікаў, якія абазначаюць назвы жывых істот (апрача чалавека), граматычны род і біялагічны пол супадаюць. Многія назвы жывёл, птушак, рыб, паўзуноў ужываюцца толькі ў форме мужчынскага або толькі ў форме жаночага роду: *вожык, крот, верабей, шчупак, жук, камар; сарока, сініца, ластаўка, чапля, вавёрка, аса, муха, яшчарка*. Форму ніякага роду (безадносна да полу носьбіта) маюць назоўнікі, што абазначаюць назвы маладых істот: *кацяня, парася, птушаня, зайчаня, дзіця*.

Некаторыя суадносныя пары назоўнікаў мужчынскага і жаночага

роду, якія абазначаюць сваяцкія адносіны або называюць жывёл у адпаведнасці з прыналежнасцю да полу, маюць суплетыўныя асновы: *дзед – баба, бацька – маці, сын – дачка, баран – авечка, певень – курыца*. Большасць родавых пар назоўнікаў утвараюцца пры дапамозе суфіксаў *-к-, -ых-, -эс-, -ыс-*: *беларус – беларуска, артыст – артыстка, унук – унучка, ткач – ткачыха, паэт – паэтэса, акцёр – актрыса* або без суфіксаў: *Алесь – Алеся, Аляксандр – Аляксандра, Валянцін – Валянціна* (канчатак *-а (-я)* у гэтых словах мае словаформаўтваральнае значэнне).

У сучаснай беларускай мове ёсць група назоўнікаў, род якіх канчаткова не вызначыўся: *зал і зала, замш і замша, бярлог і бярлога, клавіш і клавіша, перыфраз і перыфраза, аблога і аблог, салата і салат, рэпрыза і рэпрыз, пачак і пачка, кішэнь і кішэня, шаша і шасэ*. У мове XIX – пачатку XX ст. такіх назоўнікаў было значна больш: *цуд і цуда, жаваранак і жаваранка, воблака і воблак, табака і табак* і інш.

Каб вызначыць род нескланяльных назоўнікаў іншамоўнага паходжання, пад увагу бярэцца значэнне слова. Да назоўнікаў мужчынскага роду адносяцца назоўнікі – назвы асоб мужчынскага полу і назвы жывых істот: *спецыяльны аташэ, японскі мікада, маленькі калібры, ружовы фламінга, аўстралійскі кенгуру* (назоўнікі *івасі* і *цэцэ* належаць да жаночага роду); да назоўнікаў жаночага роду – назвы асоб жаночага полу: *пажылая ледзі, эфектная пані, прыгожая фраў*; да назоўнікаў ніякага роду – назвы неадушаўлёных прадметаў: *бясспрэчнае алібі, вішнёвае жэле, разнастайнае меню, светлае фае, кваліфікаванае журы, глыбокае дэкальтэ, цікавае інтэрв'ю*. Род нескланяльных назоўнікаў – геаграфічных назваў вызначаецца па родзе агульнага назоўніка, якім можна замяніць уласнае імя: *Токіо, Баку, Батумі* (горад), *Хакайда, Ханею* (востраў) – мужчынскі род; *Чылі, Перу* (дзяржава), *Місісіпі* (рака), *Кіліманджара* (гара) – жаночы род; *Антарыо* (возера) – ніякі род.

Род нескланяльных складанаскарочаных назоўнікаў, як правіла, вызначаецца па апорным слове словазлучэння, з якога ўтварылася абрэвіятура: *БелТА* (Беларускае тэлеграфнае агенцтва), *СП* (сумеснае прадпрыемства) – ніякі род; *ЭВМ* (электронная вылічальная машына), *ААН* (Арганізацыя Аб'яднаных Нацый), *ДАІ* (Дзяржаўная аўтаінспекцыя) – жаночы род; *СП* (Саюз пісьменнікаў), *РАНА* (раённы аддзел народнай асветы) – мужчынскі род. Род скланяльных абрэвіятур, што заканчваюцца на зычны, вызначаецца не па сэнсе, а па структуры (нагадвае назоўнікі мужчынскага роду): *ЛіМ* («Літаратура і мастацтва»), *БАМ* (Байкала-Амурская магістраль) – мужчынскі род: *у апошнім ЛіМе, на далёкім БАМе*.

У сучаснай беларускай мове ёсць група назоўнікаў на -а(-я), якія ў залежнасці ад ужывання могуць абазначаць асоб мужчынскага і жаноча

га полу. Гэта так званыя назоўнікі **агульнага** роду: *калега, сведка, гарэза, ціхоня, непаседа, малайчына, назола, плакса, соня, туляга, беларучка, задзіра* і інш.: *няўрымслівы гарэза – няўрымслівая гарэза, такі малайчына – такая малайчына, вясёлы непаседа – вясёлая непаседа.* Такіх назоўнікаў у беларускай мове каля сотні. Ім уласцівыя спецыфічныя суфіксы *-с-, -он-, -іц-, -к-*: *плакса, ціхоня, п'яніца, няўдаліца, выскачка, задавака, калека, хвалько.* У большасці выпадкаў назоўнікі агульнага роду маюць стылістычна зніжаную экспрэсіўную афарбоўку, ужываюцца для адмоўнай характарыстыкі асобы ў гутарковай мове і ў мове мастацкай літаратуры.

### 2.3. Лік назоўнікаў

Лік назоўнікаў – гэта граматычная катэгорыя, якая выражае колькасць прадметаў, паказваючы на адзін або некалькі прадметаў. Формы ліку ўласцівыя не толькі канкрэтным, але і некаторым абстрактным назоўнікам: *перспектыва – перспектывы, ідэя – ідэі, мара – мары, наступленне – наступленні, подых – подыхі, абавязак – абавязкі.*

У сучаснай беларускай мове два лікі: адзіночны і множны. Назоўнікі адзіночнага ліку абазначаюць адзін прадмет, множнага – два і больш аднародных прадметаў. Катэгорыя ліку вызначаецца марфалагічна і сінтаксічна. Марфалагічнымі паказчыкамі катэгорыі ліку з'яўляюцца канчаткі: для адзіночнага ліку – канчаткі *-а(-я), -о, -е, нулявы канчатак*; для множнага – канчатак *-ы(-і)*, канчатак *-е* для невялікай групы назоўнікаў: *палачанін – палачане, гараджанін – гараджане, селянін – сяляне, мінчанін – мінчане*, але: *два гараджаніны, тры селяніны.* Некаторыя назоўнікі пры ўтварэнні формаў множнага ліку змяняюць аснову: *ягнё – ягняты, кацянё – кацяняты, неба – нябёсы.* Пры ўтварэнні формы множнага ліку могуць узнікаць суплетыўныя асновы: *чалавек – людзі.*

Сінтаксічна катэгорыя ліку назоўнікаў вызначаецца па форме дапасаванага азначэння (прыметніка, парадкавага лічэбніка, займенніка, дзеепрыметніка) або выказніка, выражанага дзеясловам: *бурная рака – бурныя рэкі, першая сустрэча – першыя сустрэчы, твой абавязак – твае абавязкі, прачытаная кніга – прачытаныя кнігі, ідзе дождж – ідуць дажджы, зацвіла кветка – зацвілі кветкі, зайшоў сябар – зайшлі сябры.* Сінтаксічны сродак (дапасаванае азначэнне і выказнік) з'яўляецца адзіным паказчыкам ліку для нескланяльных назоўнікаў: *прыгожы кенгуру – прыгожыя кенгуру, цёплае паліто – цёплыя паліто, адчынілася кафэ – адчыніліся кафэ, праляцеў фламінга – праляцелі фламінга.*

Большасць назоўнікаў беларускай мовы маюць дзве формы ліку – адзіночнага і множнага: *бераг – берагі, рака – рэкі, чыгунка – чыгункі.* Аднак некаторыя назоўнікі маюць або толькі адзіночны, або толькі множны лік. Назоўнікі, якія ўжываюцца толькі ў форме адзіночнага ліку,

называюцца адзіночналікавымі. Назоўнікі, што ўжываюцца толькі ў форме множнага ліку, называюцца множналікавымі.

Да **адзіночналікавых** належаць назоўнікі:

рэчыўныя: *малако, мяса, кісель, капуста, золата, чарніла*;

зборныя: *насенне, калоссе, птаства, бярэзнік, моладзь, студэнцтва*;

абстрактныя: *мараль, радасць, сумленне, годнасць, прынцыповасць, адказнасць, бесклапотнасць*;

назвы формаў дзяржаўнага і грамадскага ладу, плыняў мастацтва: *капіталізм, сацыялізм, класіцызм, сентыменталізм, рэалізм*;

назвы напрамкаў свету: *поўнач, поўдзень, усход, захад*;

назвы месяцаў: *студзень, люты, сакавік, красавік, май, чэрвень;*

уласныя імёны: *Якуб Колас, Уладзімір Караткевіч, горад Мазыр, рака Іслач, возера Свіцязь, пасёлак Мір*.

У мове мастацкай літаратуры з пэўнай стылістычнай мэтай некаторыя адзіночналікавыя назоўнікі могуць ужывацца ў форме множнага ліку: *Якія толькі стагоддзі цябе ні хрысцілі ў сваіх Дняпрах, а ты язычнікам так і застаўся, човен* (Барад.). *Вучыў у геаграфіях пра тайфуны...* (Каратк.).

Да **множналікавых** належаць назоўнікі, якія абазначаюць:

канкрэтныя прадметы, што складаюцца з дзвюх або некалькіх аднолькавых частак: *нажніцы, абцугі, акуляры, сані, плаўкі, джынсы, калготы*;

рэчывы, прадукты, адыходы вытворчасці: *духі, кансервы, дрожджы, абдзіркі;*

народныя звычаі: *заручыны, радзіны, імяніны, дажынкі, адведкі, вячоркі;*

гульні: *кеглі, хованкі, жмуркі, фанты, шахматы;*

грамадскія працэсы, дзеянні: *зносіны, выбары, перагаворы, дэбаты, манеўры;*

прыродныя з'явы, адрэзкі часу: *замаразкі, прыцемкі, суткі;*

геаграфічныя назвы: *Радашковічы, Смілавічы, Рэдкавічы, Жыровічы.*

## 2.4. Склон назоўнікаў. Асноўныя значэнні склонаў

Склон – граматычная катэгорыя, якая паказвае адносіны назоўніка да іншых слоў у словазлучэннях і сказах. У сучаснай беларускай мове шэсць склонаў: назоўны (адказвае на пытанні хто?, што?) родны (каго?, чаго?), давальны (каму?, чаму?), вінавальны (каго?, што?), творны (кім?, чым?), месны (па кім?, на чым?, аб чым?). Назоўны склон **прамы**, астатнія – **ускосныя**. Назоўны склон ніколі не ўжываецца з прыназоўнікамі, а месны – без прыназоўнікаў. Усе астатнія склоны могуць ужывацца з

прыназоўнікамі і без іх. Прыназоўнікі ўдакладняюць значэнне склонавай формы. Пачатковай формай назоўніка з'яўляецца форма назоўнага склону адзіночнага ліку.

У старажытнай беларускай мове быў сёмы склон – клічны. У сучаснай беларускай мове формай клічнага склону выражаецца зваротак: *Паклон табе, мой беларускі краю!* (Гіл.).

**Назоўны** склон мае значэнне суб'екта, утваральніка дзеяння. Назоўнік назоўнага склону абазначае граматычна незалежны член сказа, выступае ў ролі дзейніка двухсастаўнага і аднасастаўнага намінатыўнага сказа: ***Вечар*** *зацяпліў бярозак свечы* (Каратк.).

У так званых пасіўных канструкцыях назоўнік назоўнага склону можа абазначаць прадмет, на які накіравана дзеянне: ***Дарога*** *сціскаецца лесам і спускаецца ў лагчыну, потым ізноў падымаецца на горку* (К-с). ***Хмара*** *нібы расшчапілася маланкай, прагучаў магутны ўдар грому* (Хадк.).

Назоўны склон можа ўжывацца ў ролі выказніка: *Парэчча – слаўная* ***мясціна, куток*** *прыгожы і вясёлы* (К-с); прыдатка: *Недзе там, у ветранай прасторы, злосна фыркаюць нябачныя* ***чмялі****-кулі* (В.Б.); зваротка: *Адышло ад нас ты,* ***лета****, жаўталісцем лес адзеты* (К-с).

**Родны** склон самы багаты на значэнні; ён можа абазначаць:

частку ад цэлага: *кавалак хлеба, шклянка малака, аркуш паперы*;

аб'ект дзеяння: *уборка бульбы, рэцэнзаванне артыкула, ахова прыроды* (дзеянне, накіраванае на прамы аб'ект, выражаецца аддзеяслоўнымі назоўнікамі);

аб'ект пры адмаўленні: *не выканаць задання, не вывучыць урока*;

адносіны асобы да іншай асобы або да калектыву: *брат нявесткі, сябар сям'і*;

аб'ект часовага карыстання: *папрасіць алоўка, пазычыць грошай, узяць нажа*;

прыналежнасць: *словы бацькі, кніга сястры, сэрца хлопчыка;*

азначальнае значэнне: *тэма працы, подых навальніцы, успаміны дзяцінства;*

часавае значэнне: *падрыхтавацца з вечара, чакаць да вясны*;

прасторавае значэнне: *стаяць каля дарогі, ісці ўздоўж лесу;*

значэнне мэты: *жыць для шчасця, падрыхтавацца для сустрэчы.*

**Давальны** склон мае значэнне ўскоснага аб'екта, абазначае асобу ці прадмет, на які накіравана дзеянне: *напісаць маці, дзякаваць сябру, усміхацца дзіцяці*; можа мець значэнне ўскоснага суб'екта ў безасабовых сказах: *маці не спіцца, хлопчыку не сядзіцца, бабулі нездаровіцца.*

**Вінавальны** склон мае значэнні: прамога аб'екта: *любіць літаратуру, пісаць пісьмо, чытаць газету, глядзець тэлевізар;*

прадмета думкі, мовы, пачуцця: *думаць пра бацькоў, гаварыць пра надвор'е;*

прасторавае: *паехаць у горад, павесіць пад столь, павярнуць на поўдзень;*

часавае: *вярнуцца пад вечар, не бачыцца месяц, працаваць дзень і ноч;*

мэты: *пайсці па ваду, збегаць па сястру, спяшацца на спатканне.*

**Творны** склон мае значэнні:

прылады дзеяння, сродку вытворчасці: *пісаць ручкай, касіць касой;*

ускоснага аб'екта (асабліва ў безасабовых сказах): *пахне сенам, павеяла свежасцю, пацягнула дымком, напоўнілася водарам;*

сумеснасці: *явар з калінаю, брат з сястрою, студэнты з выкладчыкамі;*

часавае: *прыйсці познім вечарам, убачыць ясным днём, пачуць летняю ноччу;*

прасторавае (без прыназоўніка і з прыназоўнікам): *прабірацца лясамі, ехаць лугам, схавацца за дрэвамі;*

спосабу дзеяння і параўнання: *спяваць басам, ісці хуткім крокам, сабрацца гуртам, звівацца вужакаю (як вужака), залівацца салаўём (як салавей).*

Калі творны склон ужываецца ў складзе іменнага выказніка, ён мае значэнне творнага прэдыкатыўнага: *Для нас бор медны, неабсяжны* ***шчытом*** *надзейным* ***быў*** *і* ***хатай*** (М.Т.).

**Месны** склон мае значэнні:

месца: *працаваць у полі, адпачываць на рацэ, жыць у горадзе;*

часу: *марыць у юнацтве, сустрэцца па вясне, сабрацца а пятай гадзіне;*

прычыны: *памыліцца па нявопытнасці, накрычаць са злосці;*

аб'ектнае: *дагавор аб супрацоўніцтве, злавіць на слове, сумаваць па волі;*

стану: *спыніцца ў захапленні, быць у роспачы, зайсціся ў плачы.*

### 2.5. Тыпы скланення назоўнікаў

Змяненне назоўнікаў па склонах называецца **скланеннем**. Назоўнікі, якім уласцівыя аднолькавыя склонавыя канчаткі, аб'ядноўваюцца ў групы, або тыпы скланення. Сістэма склонавых формаў назоўнікаў называецца **парадыгмай скланення**.

У залежнасці ад склонавых канчаткаў большасць назоўнікаў традыцыйна адносіцца да першага, другога або трэцяга скланення. Некаторыя даследчыкі вылучаюць назоўнікі субстантыўнага скланення, сярод якіх адрозніваюць назоўнікі 1-га, 2-га, 3-га скланення, рознаскланяльныя, нулявога скланення (нескланяльныя) і множналікавыя назоўнікі;

назоўнікі ад'ектыўнага скланення, якія маюць форму прыметнікаў (сталовая, насякомае); назоўнікі змешанага (субстантыўна-ад'ектыўнага) скланення, якія ўключаюць прозвішчы на *-ін(-ын), -оў(-ёў, -аў): Кузьмін, Чыгрын, Папоў, Карпаў* (гл., напрыклад; Шуба П.П. Сучасная беларуская мова: Марфаналогія. Марфалогія. Мн., 1987. С. 65). Тып скланення вызначаецца па назоўным склоне адзіночнага ліку з улікам катэгорыі роду назоўніка.

Да **першага** скланення адносяцца назоўнікі жаночага роду з канчаткам *-а(-я): краіна, дарога, вуліца, песня, яблыня, зязюля* і назоўнікі агульнага роду, калі абазначаюць асоб жаночага полу: *калега, сведка, цёзка, забіяка, ціхоня, плакса.* У навуковых граматыках традыцыйна такія назоўнікі адносяць да другога скланення.

Да **другога** скланення адносяцца назоўнікі мужчынскага роду з нулявым канчаткам: *горад, месяц, трамвай, ураджай*; усе назоўнікі ніякага роду з канчаткамі *-о(-ё), -е, -а; акно, дно, вясло, жыццё, галлё, насенне, каменне, возера*; у тым ліку пяць назоўнікаў на *-мя: полымя, бярэмя, цемя, вымя, семя;* назоўнікі тыпу *Пятро, Дняпро,* а таксама назоўнікі мужчынскага роду на *-а* з ацэначнымі суфіксамі *-іск-а (-ыск-а), -ішч-а (-ышч-а): агніска, вятрыска, галасішча, дамішча.* У навуковых граматыках традыцыйна такія назоўнікі адносяць да першага скланення.

Да **трэцяга** скланення адносяцца назоўнікі жаночага роду з нулявым канчаткам: *ноч, радасць, дробязь, любоў.*

Склонавыя канчаткі назоўнікаў у кожным тыпе скланення залежаць ад асновы слова і націску; у некаторых выпадках – ад лексічнага значэння слова (напрыклад, канчаткі роднага склону назоўнікаў мужчынскага роду другога скланення: *брата, аўтобуса, дома; грому, цукру, гаю, болю, агню, голаду, галалёду*).

Аснова назоўнікаў можа заканчвацца:

на цвёрды зычны: *вясна, парта, грам, дом, грыб, балота, цяпло;*

на мяккі зычны: *зямля, хвоя, радасць, дзень, край, насенне, шчасце;*

на зацвярдзелыя зычныя ***ж, ш, ч, дж, р, ц***: *мяжа, глуш, ключ, мора, сініца;*

на заднеязычныя ***г, к, х***: *нага, кніга, казка, замок, воблака, рэха, страха.*

Пры скланенні назоўнікаў могуць змяняцца не толькі канчаткі, але і аснова ў выніку чаргавання галосных або зычных: *галка – галак, сон – сну, рука – у руцэ, страха – на страсе, брыгада – у брыгадзе, плот – на плоце.*

Не належаць ні да аднаго з адзначаных тыпаў скланення назоўнікі, якія маюць ва ўскосных склонах канчаткі, уласцівыя розным тыпам скла-

нення, – так званыя рознаскланяльныя назоўнікі: *імя, племя, стрэмя, цяля, парася, птушаня, бацька, задзіра, плакса*; нескланяльныя назоўнікі: *таксі, паліто, дэпо, метро, Антарыо;* субстантываваныя прыметнікі: *рабочы, дзяжурная, настаўніцкая*; назоўнікі, якія ўжываюцца толькі ў множным ліку: *акуляры, дажынкі, хованкі, вароты, духі, вілы.*

### 2.5.1. Назоўнікі першага скланення, іх канчаткі

Назоўнікі першага скланення з асновай на цвёрды і зацвярдзелы зычны ў **родным** склоне адзіночнага ліку маюць канчатак ***-ы***: *вярбы, прамовы, пушчы, сястры, мяжы, лужы, плошчы*; з асновай на мяккі зычны і ***г, к, х*** – ***-і***: *зямлі, вышыні, хвалі, кухні, сям'і, рукі, страхі.*

У **давальным** і **месным** склонах назоўнікі маюць аднолькавыя канчаткі ***-е, -і, -ы, -э***. Канчатак ***-е*** уласцівы назоўнікам з асновай на цвёрды зычны і на ***г, х,*** прычым цвёрды зычны чаргуецца з мяккім, а ***г, х*** – з ***з', с'***: *сцяна – сцяне, на сцяне, парта – парце, у парце, дарога – дарозе, на дарозе, нага – назе, на назе, страха – страсе, на страсе.* Канчатак ***-і*** маюць назоўнікі з мяккай асновай: *зямля – зямлі, у зямлі, кухня – кухні, на кухні.* Канчатак ***-ы*** маюць назоўнікі з асновай на зацвярдзелы зычны і на ***к***, які чаргуецца з ***ц:*** *пушча – пушчы, у пушчы, сястра – сястры, у сястры, гутарка – гутарцы, у гутарцы, загартоўка – загартоўцы, пры загартоўцы;* пад націскам – канчатак ***-э***; *шчака – шчацэ, на шчацэ, рака – рацэ, у рацэ.*

У **вінавальным** склоне назоўнікі ў залежнасці ад характару асновы маюць канчаткі ***-у, -ю***: *вярбу, пушчу, зямлю, сям'ю, вышыню.*

У **творным** склоне назоўнікі з асновай на цвёрды і зацвярдзелы зычны маюць пад націскам канчатак ***-ой(-ою)*** (так званыя варыянтныя канчаткі): *вярбой(-ою), стралой(-ою), сястрой(-ою)*, не пад націскам ***-ай(-аю)***: *прамовай(-аю), плошчай(-аю), лужай(-аю)*; з асновай на мяккі зычны пад націскам ***-ёй(-ёю)***: *зямлёй(-ёю), вышынёй(-ёю), дабрынёй(-ёю)*, не пад націскам ***-яй(-яю)***: *хваляй(-яю), кухняй(-яю), пёсняй(-яю).*

Назоўнікі агульнага роду з канчаткам ***-а(-я)***, якія абазначаюць асоб жаночага полу, скланяюцца па тыпе першага скланення: *непаседа, ціхоня – непаседы, ціхоні; непаседзе, ціхоні; непаседу, ціхоню; непаседай, ціхоняй; аб непаседзе, пры ціхоні.*

Асабовыя імёны, геаграфічныя назвы з канчаткам -а(-я) скланяюцца, як агульныя назоўнікі першага скланення. Прозвішчы на ***-а(-я)***, якія належаць асобам жаночага полу, скланяюцца, як назоўнікі першага скланення: *Паўлючэнка Таня, Паўлючэнкі Тані, Паўлючэнцы Тані, Паўлючэнку Таню, Паўлючэнкай Таняй, пры Паўлючэнцы Тані.*

### 2.5.2. Назоўнікі другога скланення, іх канчаткі

Назоўнікі мужчынскага роду ў залежнасці ад лексічнага значэння ў **родным** склоне маюць канчаткі ***-а(-я)*** або ***-у(-ю)***. Канчатак ***-а(-я)*** маюць назоўнікі, што абазначаюць:

асоб, жывых істот: *брата, сябра, студэнта, мядзведзя, шчупака, камара* (канчатак *-а* маюць таксама назоўнікі *тапелец, нябожчык, мярцвяк*);

канкрэтныя прадметы: *аўтобуса, агурка, медаля, сшытка, алоўка*;

арганізацыі, прадпрыемствы, установы: *саюза, завода, камітэта, ліцэя*;

спартыўныя гульні, віды спорту, танцы: *хакея, тэніса, вальса*;

населеныя пункты, геаграфічныя назвы: *пасёлка, горада, Лунінца, Лоева*;

адзінкі вымярэння, адрэзкі часу: *вольта, градуса, грама, рубля, дня;*

навуковыя тэрміны: *ромба, косінуса, дзеяслова, прэфікса*, (але: *склону*).

Канчатак ***-у(-ю)*** характэрны для назоўнікаў, што абазначаюць:

зборныя прадметы: *бярэзніку, хмызняку, алешніку, натоўпу, калектыву;*

рэчывы, хімічныя злучэнні, элементы: *цукру, пяску, снегу, чаю, соку, шакаладу, клею, ёду, кіслароду, цэзію, стронцыю (але: хлеба, аўса);*

з'явы прыроды, стыхійныя бедствы: *ветру, галалёду, агню, тайфуну;*

прасторавыя паняцці: *лугу, краю, шляху, усходу, небасхілу, нізу, верху;*

абстрактныя паняцці, якасці, дзеянні, стан: *густу, розуму, спакою, болю;*

грамадскія фармацыі, навуковыя плыні, тэорыі: *сацыялізму, дарвінізму, матэрыялізму, фармалізму, сіянізму.*

Канчатак ***-у(-ю)*** уласцівы назоўнікам, што ўваходзяць у склад устойлівых выразаў: *даць маху, ні роду ні плоду, звесці са свету, час ад часу, ні слыху ні дыху, носу не паказваць, не да смеху, не да твару, ні складу ні ладу, з першага погляду.*

У залежнасці ад лексічнага значэння некаторыя назоўнікі мужчынскага роду ў родным склоне могуць мець канчаткі ***-а(-я) і -у(-ю)***: *трэцяга лістапада* (месяц) і *пара лістападу* (працэс, з'ява), *абляцела лісце з ясеня* (прадмет) і *шафа з ясеню* (матэрыял), *смак ананаса* (плод) і *вырошчванне ананасу* (расліна, зборнае значэнне), *не было пропуска* (дакумент) і *без пропуску заняткаў* (абстрактны назоўнік), *беларускага народа* (нацыя, насельніцтва рэспублікі) і *шмат народу* (зборны назоўнік),

*падысці да трамвайнага парка* (месца стаянкі і рамонту, канкрэтны назоўнік) і *рамонт трамвайнага парку* (сукупнасць рухомага саставу, зборны назоўнік).

У **давальным** склоне назоўнікі мужчынскага роду маюць канчатак ***-у(-ю)***: *брату, гораду, гароху, густу, кіслароду, цукру, соку, ветру, даждждду, краю, клею.*

Адушаўлёныя назоўнікі мужчынскага роду ў **вінавальвым** склоне супадаюць з родным і маюць канчатак ***-а(-я)***: *брата, чалавека, сябра, студэнта, настаўніка, шчупака, мядзведзя, каня*; неадушаўлёныя – з назоўным і маюць нулявы канчатак: *інстытут, хлеб, гонар, цукар, недахоп, стыль.*

У **творным** склоне назоўнікі мужчынскага роду з асновай на цвёрды і зацвярдзелы зычны, а таксама з асновай на ***г, к, х*** пад націскам маюць канчатак ***-ом***: *арлом, будаўніком, мараком, цесляром, ланцугом, замком, нажом, сталом*, не пад націскам – ***-ам***: *лёсам, пасёлкам, саюзам, смехам, поспехам, архітэктарам*, з асновай на мяккі зычны пад націскам – ***-ём***: *вераб'ём, ласём, салаўём, рублём, ручаём, медалём, агнём*, не пад націскам – ***-ем***: *героем, ценем, шчаўем, болем, воем.*

У **месным** склоне назоўнікі мужчынскага роду могуць мець канчаткі ***-е, -і, -ы, -у(-ю)***. Канчатак ***-е*** маюць назоўнікі з цвёрдай асновай, а таксама з асновай на ***г, х,*** якія чаргуюцца з ***з', с'***: *стол – у стале, саюз – у саюзе, агарод – на агародзе, парог – на парозе, луг – у лузе, кажух – у кажусе*. Назоўнікі з мяккай асновай маюць канчатак ***-і***: *цень – у цяні, пень – на пні, май – у маі, гай – у гаі*; з асновай на зацвярдзелы ***-ы***: *дождж – на дажджы, шалаш – у шалашы, гараж – у гаражы.* Назоўнік *двор* у залежнасці ад лексічнага значэння ўжываецца або з канчаткам ***-ы***, або з канчаткам ***-э***: *На прасторным двары сабралася шмат людзей* і *На дварэ было ветрана.* Канчатак ***-у(-ю)*** маюць назоўнікі з асновай на ***к*** і на ***г, х***, якія не чаргуюцца з ***з', с'***: *цвік – на цвіку, канчатак – у канчатку, подзвіг – аб подзвігу, доўг – у даўгу, сцяг – на сцягу, мех – у мяху, мох – на моху, рух – у руху*, а таксама назоўнікі, што абазначаюць асобу чалавека: *пры мастаку, студэнту, рэктару, настаўніку, госцю, кавалю*. Некаторыя назоўнікі з цвёрдай асновай, што абазначаюць асобу чалавека, часам ужываюцца і з канчаткам ***-е*** (паводле граматыкі – назоўнікі з асновай на цвёрды зычны): пры сыне, аб аграноме, на Міхале.

Назоўнікі **ніякага** роду з асновай на цвёрды і зацвярдзелы зычны, а таксама на ***г, к, х*** у **родным** склоне маюць канчатак ***-а***: *акна, дна, возера, сонца, іржышча*; з асновай на мяккі зычны – ***-я***: *поля, полымя, семя, насення, галля.*

У **давальным** склоне назоўнікі ніякага роду маюць адпаведна асновам канчатак ***-у(-ю)***: *дну, акну, возеру, сонцу, іржышчу, вуху, рэху,*

*полю, полымю.*

Канчаткі **вінавальнага** склону назоўнікаў ніякага роду супадаюць з канчаткамі назоўнага склону: *акно, возера, сонца, іржышча, рэха, вуха, полымя.*

**Творнаму** склону назоўнікаў ніякага роду, як і назоўнікам мужчынскага роду, уласцівыя канчаткі ***-ом(-ам), -ём(-ем)***: *дном, акном, возерам, сонцам, іржышчам, рэхам, галлём, полем.*

У **месным** склоне для назоўнікаў ніякага роду ў залежнасці ад асновы, як і для назоўнікаў мужчынскага роду, характэрныя канчаткі ***-е, -і, -ы, -у***: *дно – на дне, акно – на акне, поле – у полі, мора – на моры, сонца – на сонцы, возера – у возеры, рэха – у рэху, ліха – аб ліху.* Назоўнік *малако* ў месным склоне мае націскны канчатак ***-э***: *у малацэ.*

### 2.5.3. Назоўнікі трэцяга скланення, іх канчаткі

У родным, давальным і месным склонах назоўнікі жаночага роду з асновай на мяккія і губныя зычныя маюць канчатак ***-і***: *радасць – радасці, у радасці, сувязь – сувязі, у сувязі, рунь – руні, на руні, верф – верфі, на верфі*; з асновай на зацвярдзелы – ***-ы***: *ноч – ночы, аб ночы, рэч – рэчы, у рэчы, печ – печы, на печы.*

Форма вінавальнага склону назоўнікаў супадае з формай назоўнага склону, ёй уласцівы нулявы канчатак: *ноч, мыш, шыр, печ, рэч, Нарач.*

У творным склоне назоўнікі трэцяга скланення з асновай на зацвярдзелыя зычныя маюць канчатак ***-у***: *ноччу, печчу, рэччу*; з асновай на мяккія, губныя і р ***-ю***: *радасцю*, *сувяззю, рунню, даллю, соллю, верф'ю, шыр'ю*. Пры гэтым апошні зычны асновы ў інтэрвакальным становішчы падаўжаецца: *завяззю, чырванню, моладдзю*. Не падаўжаюцца губныя зычныя і ***р***, хоць і стаяць паміж галоснымі; пасля ***р*** і губных (апрача ў) ставіцца апостраф: *Сібір'ю, верф'ю, Об'ю, любоўю.*

Некаторыя назоўнікі трэцяга скланення ў творным склоне ўжываюцца таксама з канчаткамі ***-ой(-ай)*** або ***-ою(-аю)*** (графічна -ёй(-яй), -ёю(-яю)): *граззю – гразёй(-ёю), сенажаццю – сенажацяй(-яю), кроўю – крывёй(ёю), далонню – далоняй(-яю), даланёй(-ёю)*. Такія формы назоўнікаў ужываюцца пераважна ў мове мастацкай літаратуры: *У тую крыніцу, з якой піў ваду,* ***гразёю*** *не кіну, хоць, можа, лепшую з часам знайду* (М.Т.).

### 2.5.4. Рознаскланяльныя назоўнікі, іх канчаткі

Да рознаскланяльных адносяцца: 1) назоўнікі – назвы маладых істот: *птушаня(-ё), кацяня(-ё), цяля(-ё), ягня(-ё);* 2) тры назоўнікі на ***-мя***: *імя, племя, стрэмя;* 3) назоўнікі мужчынскага роду з ненаціскным канчаткам ***-а(-я)*** тыпу *мужчына, дзядуля, бацька, дзядзька*; 4) назоўнікі агульнага роду, калі яны абазначаюць асоб мужчынскага полу: *забіяка, гарэза, цёзка, ціхоня, плакса, сведка.*

Рознаскланяльныя назоўнікі ва ўскосных склонах маюць канчаткі, уласцівыя розным тыпам скланення (другому і трэцяму, першаму і другому).

Назоўнікі – назвы маладых істот у родным, давальным і месным склонах набываюць суфікс ***-яц-*** і скланяюцца, як назоўнікі трэцяга скланення: *птушаняці, ягняці, дзіцяці, аб птушаняці, на ягняці, пры дзіцяці.* У творным склоне гэтыя назоўнікі маюць канчатак другога скланення ***-ём***: *птушанём, ягнём, дзіцём.* Ва ўсіх склонах множнага ліку назвы маладых істот (за выключэннем назоўніка *дзіця*) маюць суфікс ***-ят-***: *птушаняты, ягняты, цяляты, птушанят, ягнят, цялят.*

Назоўнікі *імя, племя, стрэмя* могуць пры скланенні ўжывацца з суфіксам ***-ен-*** або без яго. Калі яны набываюць суфікс ***-ен-***, то, як і назоўнікі – назвы маладых істот, у родным, давальным і месным склонах маюць канчатак ***-і***: *імені, племені, стрэмені, па імені, у племені, на стрэмені.* Калі гэтыя назоўнікі ўжываюцца без суфікса ***-ен-***, то маюць канчаткі назоўнікаў другога скланення з мяккай асновай: *імя, імю, аб імі.*

| | | |
|---|---|---|
| Н. імя | племя | стрэмя |
| Р. імя (імені) | племя (племені) | стрэмя (стрэмені) |
| Д. імю (Імені) | племю (племені) | стрэмю (стрэмені) |
| В. імя | племя | стрэмя |
| Т. імем (іменем) | племем (племенем) | стрэмем (стрэменем) |
| Ц. у імі (імені) | племі (племені) | стрэмі (стрэмені) |

У множным ліку назоўнікі *імя, стрэмя* ўжываюцца без суфікса ***-ён-*** або з ім, а назоўнік *племя* ў множным ліку ўжываецца толькі з суфіксам ***-ён-:***

| | | |
|---|---|---|
| Н. імі (імёны) | стрэмі (страмёны) | плямёны |
| Р. імяў (імён, імёнаў) | стрэмяў (страмён, страмёнаў) | плямён (плямёнаў) |
| Д. імям (імёнам) | стрэмям (страмёнам ) | плямёнам |
| В. імі (імёны) | стрэмі (страмёны) | плямёны |
| Т. імямі (імёнамі) | стрэмямі (страмёнамі) | плямёнамі |
| М. у імях (імёнах) | стрэмях (страмёнах) | плямёнах |

Назоўнікі мужчынскага роду на ***-а(-я)*** у родным і вінавальным склонах маюць канчаткі першага скланення: *мужчыны, дзядзькі, мужчыну, дзядзьку.* У давальным і месным склонах яны такія, як і ў назоўнікаў першага і другога скланенняў. Канчаткі давальнага і меснага склонаў залежаць ад асновы і націску: *Кузьме, Фаме, пры Кузьме, пры Фаме* (першае скланенне), *дзядзьку, Пецю, пры дзядзьку, пры Пецю* (другое скланенне). У творным склоне ў залежнасці ад асновы і націску назоўнікі мужчынскага роду на ***-а(-я)*** маюць ненаціскны канчатак ***-ам***:

*мужчынам, дзядзькам, бацькам*, націскны ***-ой(-ою)***: *Кузьмой(-ою), Фамой(-ою)*; назоўнікі з мяккай асновай маюць канчаткі ***-ем, -ёй(-ёю)***: *дзядулем, суддзёй(-ёю), старшынёй(-ёю).*

Гэтак жа скланяюцца назоўнікі агульнага роду, калі яны абазначаюць асоб мужчынскага полу: *гарэза – гарэзы, гарэзу, гарэзам, пры гарэзу*. Назоўнік *сірата*, незалежна ад таго, асобу якога полу ён абазначае, скланяецца, як назоўнік жаночага роду першага скланення: *сірата, сіраты, сіраце, сірату, сіратой(-ою), на сіраце.*

### 2.5.5. Скланенне назоўнікаў у множным ліку

У сучаснай беларускай мове назоўнікі ўсіх трох скланенняў у множным ліку ва ўсіх склонах, за выключэннем роднага, маюць уніфікаваныя, аднолькавыя канчаткі. У **назоўным** склоне множнага ліку назоўнікі з цвёрдай і зацвярдзелай асновай маюць канчатак ***-ы***: *гарады, вакзалы, дамы, вуліцы, дубы, ночы, сёстры*; з мяккай і асновай на ***г, к, х -і***: *заданні, камяні, палі, стагі, рэкі, імхі*; з суфіксам ***-анін(-янін)*** – ***-е***: *бабруйчане, гамяльчане, грамадзяне.*

У **родным** склоне назоўнікі множнага ліку маюць канчаткі ***-аў(-яў), -оў(-ёў), -ей(-эй)*** і нулявы канчатак. Назоўнікі першага скланення маюць канчатак ***-аў(-яў)***, калі іх аснова заканчваецца збегам зычных: *тундраў, адозваў, кафедраў*, і нулявы канчатак: *рук, кароў, армій, экспедыцый, станцый*. Некаторым назоўнікам уласцівыя варыянтныя формы: *сёстраў – сясцёр, яблыняў – яблынь, хвояў – хвой, кішэняў – кішэнь.*

Назоўнікі другога скланення маюць канчаткі ***-аў(-яў), -оў(-ёў)***: *вокнаў, сёлаў, вёдраў, ураджаяў, караваяў*; радзей – ***-ай(-ей)***: *вушэй, гасцей.*

Назоўнікі трэцяга скланення пад націскам маюць канчатак ***-эй(-ей)***, не пад націскам ***-аў(-яў)***: *начэй, рэчаў, печаў, даляў*. Назоўнікі трэцяга скланення могуць мець варыянтныя формы: *асаблівасцей – асаблівасцяў, вадкасцей – вадкасцяў, сенажацей – сенажацяў, пячэй – печаў.*

Для **давальнага** склону назоўнікаў усіх трох скланенняў характэрны канчатак ***-ам(-ям)***: *дубам, рэчам, печам, вуліцам, заданням, вяселлям.*

У **вінавальным** склоне назоўнікі, што абазначаюць неадушаўлёныя прадметы, маюць канчаткі ***-і, -ы***, як і ў назоўным склоне: *вёскі, сувязі, агні, сады, верасы;* назоўнікі, што абазначаюць адушаўлёныя прадметы, ***-аў(-яў), -оў(-ёў), -эй(-ей)*** і нулявы канчатак, як і ў родным склоне: *інжынераў, аграномаў, суседзяў, братоў.*

У **творным** склоне назоўнікі множнага ліку маюць канчаткі ***-амі(-ямі)***: *грыбамі, песнямі, гасцямі, палямі*; ***-мі***: *коньмі*; ***-ыма***: *плячыма, грашыма.*

Назоўнікі множнага ліку ў **месным** склоне маюць канчаткі ***-ах(-ях)***: *пры бацьках, на сталах, у гарадах, у палях, на вяселлях.*

### 2.5.6. Скланенне некаторых прозвішчаў і геаграфічных назваў

У беларускай мове ўзнікаюць пэўныя цяжкасці пры скланенні прозвішчаў на ***-а(-я)***. Прозвішчы, якія паходзяць ад назваў прадметаў жаночага роду з асновай на ***г, к, х*** і маюць ненаціскны канчатак ***-а***, тыпу *Конаўка, Трэска, Пасека, Плотка, Суседзька, Жыхарка, Папруга, Саладуха* набываюць склонавыя канчаткі ў залежнасці ад полу асобы. Калі гэта прозвішча належыць жанчыне, яно скланяецца, як агульныя назоўнікі жаночага роду першага скланення з адпаведнай асновай, а калі мужчыне – як рознаскланяльныя назоўнікі мужчынскага роду з адпаведнай асновай: Н. *Бярозка Алена, Бярозка Алесь*; Р. *Бярозкі Алены, Бярозкі Алеся*; Д. *Бярозцы Алене, Бярозку Алесю*; В. *Бярозку Алену, Бярозку Алеся*; Т. *Бярозкай Аленай, Бярозкам Алесем*; М. *на Бярозцы Алене, на Бярозку Алесю.*

Прозвішчы, якія паходзяць ад назваў прадметаў жаночага роду на ***-а***, апрача прозвішчаў на ***г, к, х*** з ненаціскным канчаткам ***-а***, скланяюцца незалежна ад полу асобы, як агульныя назоўнікі жаночага роду з адпаведным тыпам асновы: Н. *Выдра, Суша, Луста*; Р. *Выдры, Сушы, Лусты*; Д. *Выдры, Сушы, Лусце*; В. *Выдру, Сушу, Лусту*; Т. *Выдрай, Сушай, Лустай*; М. *пры Выдры, пры Сушы, пры Лусце.*

Прозвішчы з націскным канчаткам ***-а(-я)*** тыпу *Крапіва, Каляда, Вярба, Баразна* скланяюцца, як назоўнік агульнага роду *сірата*: Н. *Вера (Лёня) Вярба*, Р. *Веры (Лёні) Вярбы*, Д. *Веры (Лёню) Вярбе*, В. *Веру (Лёню) Вярбу*, Т. *Верай (Лёнем) Вярбой*, М. *пры Веры (Лёню) Вярбе.*

Прозвішчы, якія не суадносяцца з назвамі канкрэтных прадметаў, тыпу Глебка, Бядуля, Шышла, Ворса скланяюцца, як назоўнікі мужчынскага роду на ***-а(-я)***, калі належаць асобе мужчынскага полу: Н. *Шышла Пётр*, Р. *Шышлы Пятра*, Д. *Шышлу Пятру*, В. *Шышлу Пятра*, Т. *Шышлам Пятром*, М. пры *Шышлу Пятру*. Не скланяюцца гэтыя прозвішчы, калі яны належаць жанчыне: Н. *Шышла Ніна*, Р. *Шышла Ніны*, Д. *Шышла Ніне*; В. *Шышла Ніну*, Т. *Шышла Нінай*, М. *пры Шышла Ніне.*

Не скланяюцца жаночыя прозвішчы, якія ўтварыліся ад агульных назоўнікаў ніякага роду (*Шыла, Дула, Сукала*) або ад назоўнікаў, род якіх цяпер вызначыць цяжка (*Тармола, Бірыла, Валошанка*).

Аднак у моўнай практыцы абсалютная большасць прозвішчаў на ***-а(-я)*** скланяецца, як назоўнікі агульнага роду. Як адзначаюць даследчыкі, няма патрэбы суадносіць скланенне прозвішчаў на -а(-я) са скланеннем назоўнікаў (апелятываў), ад якіх яны ўтвораны, тым больш што часам немагчыма вызначыць, ад назоўніка якога роду паходзіць тое ці іншае прозвішча (напрыклад, *Бядуля, Купала, Карызна, Машара, Біруля, Вярбіла, Талапіла, Сырыська* і інш.).

У беларускай мове не скланяюцца жаночыя прозвішчы з нулявым канчаткам, якія заканчваюцца на зычны (*Бародзіч, Радзюк, Туль, Шупе-*

*нік, Глябовіч, Сак, Чмель, Жак, Вуяк, Кароль*), а таксама беларускія і іншамоўныя прозвішчы асоб мужчынскага і жаночага полу на націскны ***-о*** (*Сянько, Бажко, Кійко, Крайко, Чурко, Мяцко, Змушко, Жудро*), і прозвішчы на ***-ых(-іх)***: *Баранавых, Сядых, Мялкіх*.

Жаночыя прозвішчы з асновай на ***-ав-, -ев-, -ов-, -ёв-, -ын-, -ін-*** змяняюцца па так званым змешаным тыпе скланення: у назоўным і вінавальным склонах маюць канчаткі назоўнікаў першага скланення, у родным, давальным, творным і месным – канчаткі прыметнікаў: Н. *Тарасава, Краўцова, Шыпуліна*; Р. *Тарасавай, Краўцовай, Шыпулінай*; Д. *Тарасавай, Краўцовай, Шыпулінай*; В. *Тарасаву, Краўцову, Шыпуліну*; Т. *Тарасавай, Краўцовай, Шыпулінай*; М. *аб Тарасавай, Краўцовай, Шыпулінай*.

Мужчынскія прозвішчы на ***-аў, -еў, -оў, -ёў, -ын, -ін*** скланяюцца, як агульныя назоўнікі другога скланення з цвёрдай асновай, аднак у творным склоне яны маюць канчатак ***-ым***, як прыметнікі, а ў месным склоне – ***-у*** («Беларуская граматыка» (Мн., 1986. С. 102) патрабуе ў месным склоне канчатка ***-е***: аб *Данілаве, Кавалёве, Фаміне*): Н. *Платонаў, Пятроў, Дудкін*; Р. *Платонава, Пятрова, Дудкіна*; Д. *Платонаву, Пятрову, Дудкіну*; В. *Платонава, Пятрова, Дудкіна*; Т. *Платонавым, Пятровым, Дудкіным*; М. *пры Платонаву, Пятрову, Дудкіну*.

Мужчынскія прозвішчы, якія заканчваюцца на зычны, скланяюцца, як агульныя назоўнікі другога скланення: Н. *Дубовік, Сачык, Шупенік*; Р. *Дубовіка, Сачыка, Шупеніка*; Д. *Дубовіку, Сачыку, Шупеніку*; В. *Дубовіка, Сачыка, Шупеніка*; Т. *Дубовікам, Сачыкам, Шупенікам*; М. *пры Дубовіку, Сачыку, Шупеніку*.

Пры скланенні ўласных геаграфічных назваў (тапонімаў) у першую чаргу трэба мець на ўвазе род агульных назоўнікаў, ад якіх гэтыя тапонімы ўтварыліся, і тып асновы.

Геаграфічныя назвы ніякага роду скланяюцца па мадэлі агульных назоўнікаў з адпаведнымі асновамі: Н., В. *Жодзіна, Сянно, Залессе, Селішча*; Р. *Жодзіна, Сянна, Залесся, Селішча*; Д. *Жодзіну, Сянну, Залессю, Селішчу*; Т. *Жодзінам, Сянном, Залессем, Селішчам*; М. *у Жодзіне, Сянне, Залессі, Селішчы.*

Назоўнікі мужчынскага роду, якія з'яўляюцца геаграфічнымі назвамі і заканчваюцца на зычны, скланяюцца, як агульныя назоўнікі другога скланення: Н., В. *Магілёў, Валожын, Клецк*; Р. *Магілёва, Валожына, Клецка*; Д. *Магілёву, Валожыну, Клецку*; Т. *Магілёвам, Валожынам, Клецкам*; М. *у Магілёве, Валожыне, Клецку.*

Назоўнікі жаночага роду з канчаткам ***-а(-я)*** скланяюцца па першым скланенні назоўнікаў: Н. *Крыніца, Рэчыца*; Р. *Крыніцы, Рэчыцы*; Д. *Крыніцы, Рэчыцы*; В. *Крыніцу, Рэчыцу*; Т. *Крыніцай, Рэчыцай*; М. *у Крыніцы,*

*Рэчыцы.* Тапонімы тыпу *Свіслач, Случ, Пціч, Нарач.* скланяюцца, як назоўнікі жаночага роду трэцяга скланення: Н., В. *Свіслач, Случ*; Р., Д. *Свіслачы, Случы*; Т. *Свіслаччу, Случчу*; М. *у Свіслачы, Случы.*

Геаграфічныя назвы на ***-оў(-аў), -еў(-ёў), -ын(-ін)*** тыпу *Рагачоў, Крычаў, Лоеў, Талачын, Брагін* скланяюцца, як агульныя назоўнікі другога скланення з цвёрдай асновай: Н. *Рагачоў, Брагін*; Р. *Рагачова, Брагіна*; Д. *Рагачову, Брагіну*; В. *Рагачоў, Брагін*; Т. *Рагачовам, Брагінам*; М. *у Рагачове, Брагіне.*

Геаграфічныя назвы ў форме множнага ліку скланяюцца, як правіла, на ўзор агульных назоўнікаў множнага ліку: Н., В. *Мсціжы*, Р. *Мсціжоў*, Д. *Мсціжам*, Т. *Мсціжамі*, М. *у Мсціжах.* Тапонімы на ***-ічы(-ычы), -овічы (-ёвічы), -аны(-яны)*** маюць варыянтныя канчаткі ў родным склоне: *Бялыніч – Бялынічаў, Асіповіч – Асіповічаў, Жупран – Жупранаў, Ашмян – Ашмянаў.*

### 2.5.7. Нескланяльныя назоўнікі

Назоўнікі, якія не змяняюцца па склонах і не маюць склонавых канчаткаў, называюцца **нескланяльнымі**. Да іх адносяцца:

агульныя назоўнікі іншамоўнага паходжання на галосны: *бюро, метро, кашпо, таксі, кашнэ, авеню, калібры, кенгуру;*

уласныя назоўнікі іншамоўнага паходжання на галосны: *Дзідро, Гюго, Дзюма, Гётэ, Вердзі, Закапане, Хакайда, Баку, Сухумі, Алатау;*

славянскія прозвішчы на -о: *Манько, Скурко, Дзіско, Жданко, Зянько;*

жаночыя прозвішчы на зычны: Купраш, Русак, Ліхтар, Курган, Кузміч;

складанаскарочаныя словы літарнага і змешанага тыпу: *СП* (сумеснае прадпрыемства), *ЦСУ* (Цэнтральнае статыстычнае ўпраўленне), *КП* (кантрольны пункт), *БелТА* (Беларускае тэлеграфнае агенцтва), *БДПУ* (Беларускі дзяржаўны педагагічны універсітэт). Аднак некаторыя абрэвіятуры, у якіх ёсць галосны гук, могуць скланяцца. У такім выпадку канчаткі ўсіх склонаў пішуцца малымі літарамі: *ЛіМ* (газета «Літаратура і мастацтва») *– рэцэнзія ў ЛіМе, МАЗ* (Мінскі аўтамабільны завод і машына гэтага завода) *– машыны МАЗа, ехаць на МАЗе, ГУМ* (Галоўны універсальны магазін) *– прадаўцы ГУМа, БелАЗ* (Беларускі аўтамабільны завод) *– побач з БелАЗам.*

Склон нескланяльных назоўнікаў вызначаецца іх сувяззю з іншымі словамі і сінтаксічнай функцыяй у сказе: *З кафэ таксама выйшлі разам* (Я.С.) (родны склон). *Унізе гралі на піяніна* (Я.С.) (месны склон).

## 2.6. Формы назоўнікаў з суфіксамі ацэнкі

Ацэначныя адценні памяншальнасці, павелічальнасці, ласкальна-

сці, узмацняльнасці, зневажальнасці і інш., уласцівыя некаторым назоўнікам, звычайна залежаць ад суб'екта – ад таго, хто гаворыць. Таму суфіксы, пры дапамозе якіх назоўнікі набываюць такія адценні, называюцца суфіксамі суб'ектыўнай ацэнкі. Назоўнікі з суфіксамі суб'ектыўнай ацэнкі не толькі называюць прадмет, але і выражаюць станоўчыя або адмоўныя адносіны да яго таго, хто гаворыць, з'яўляюцца сродкам эфектыўнага ўздзеяння на суразмоўцу. Такія назоўнікі ўжываюцца пераважна ў гутарковай мове і ў мове мастацкай літаратуры: ***Завейка****, слабая і нязлосная спачатку, не завея, а ўсяго толькі паметуха, пачала брацца на мяцеліцу* (Луж.). ***Рачулкі***, ***рэчачкі****, рэкі – іх стала тут раптам безліч, – упадаючы ў самую вялікую раку краю – Прыпяць, і ўдзень і ўночы рабілі сваю наканаваную лёсам работу...* (Сач.). *Вось яе,* ***госцейку****. зноў ставяць на лаву, надзяваюць ёй паліто, завязваюць* ***хустачку****, потым хустку, тады накрываюць вялізнай цёплай хустай – так, каб захутаць усю* (Б.).

Дзякуючы суфіксам суб'ектыўнай ацэнкі адзін і той жа прадмет, з'ява ў залежнасці ад сітуацыі могуць ацэньвацца па-рознаму. Гэта добра відаць, напрыклад, у паэме Я. Коласа «Новая зямля», калі аўтар апісвае паляванне Міхала: ***Ваўчуга*** *з сёл сюды бяжыць і проста валіць на Міхала. А воўк ляціць. Вось ён на Нёмне.... Няма,* ***ваўчок****, табе збавення! Дарэмны ўсе твае імкненні!*

Суфіксы суб'ектыўнай ацэнкі належаць да формаўтваральных суфіксаў, яны ўтвараюць толькі новыя формы слоў, а не новыя словы: *зямля – зямелька – зямліца, сын – сынок – сыночак.*

З улікам сэнсавых і стылістычных адценняў сярод суфіксаў суб'ектыўнай ацэнкі вылучаюцца памяншальна-ласкальныя, павелічальна-ўзмацняльныя і павелічальна-зневажальныя суфіксы.

Сярод памяншальна-ласкальных найбольш ужывальныя ў сучаснай беларускай мове суфіксы ***-ок(-ак), -ік(ык), -чык, -к-, -ачк-, -ц-, -ейк-, -яйк-.*** Суфіксы ***-ок(-ак), -ік(-ык), -чык*** уласцівыя адушаўлёным і неадушаўлёным назоўнікам мужчынскага роду: *сад – сад-ок, воз – ваз-ок, унук – унуч-ак, арэх – арэш-ак, замок – замоч-ак, конь – кон-ік, брат – брац-ік, палец – паль-чык, кабан – кабан-чык, зал – заль-чык.* Асобныя назоўнікі для абазначэння высокай ступені ласкальнасці або памяншальнасці могуць мець два памяншальна-ласкальныя суфіксы: *матыль – матыл-ёк – матыл-ёч-ак, сын – сын-ок, сын-оч-ак, дождж – дождж-ык – дождж-ыч-ак, стол – стол-ік – стол-іч-ак, грыб – грыб-ок – грыб-оч-ак.*

Суфіксы ***-к-, -ачк-*** служаць у асноўным для ўтварэння формаў назоўнікаў жаночага роду: *трава – траў-к-а, галава – галоў-к-а, яблыня – яблынь-к-а, форма – форм-ачк-а.* Назоўнікі тыпу *дужачка, трэсачка, птушачка, зязюлечка* маюць два суфіксы: *дуж-к-а – дуж-ач-к-а, трэс-к-*

*а – трэс-ач--к-а, птуш-к-а – птуш-ач-к-а, зязюль-к-а – зязюл-еч-к-а.*

Суфікс ***-к-*** можа ўжывацца таксама ў некаторых назоўніках мужчынскага і ніякага роду: *мужчына – мужчын-к-а, дзед – дзед-к-а, салавей – салавей-к-а, вуха – вуш-к-а, века – веч-к-а.*

Формы суб'ектыўнай ацэнкі неадушаўлёных назоўнікаў ніякага роду ўтвараюцца пры дапамозе суфіксаў ***-ц-, -айк-, -ейк-, -ечк-***: *акно – акен-ц-а, дрэва – дрэў-ц-а, возера – азяр-ц-о, сэрца – сэрц-айк-а, лета – лец-ейк-а, лісце – лісц-ечк-а, гнязд‍о – гнязд‍з-ечк-а.* Пры дапамозе суфікса ***-ечк-*** утвараюцца таксама формы суб'ектыўнай ацэнкі адушаўлёных назоўнікаў мужчынскага і жаночага роду: *дзядзя – дзядз-ечк-а, То-ля – Тол-ечк-а, Коля – Кол-ечк-а, Валя – Вал-ечк-а, Таня – Тан-ечк-а.*

Сярод памяншальна-ласкальных суфіксаў менш пашыраныя суфіксы ***-ул-, -уль-к-, -ухн-(-юхн-)***, уласцівыя некаторым адушаўлёным назоўнікам са значэннем асобы: *дзяд-ул-я – дзяд-уль-к-а, сын-ул-я – сын-уль-к-а, мат-ул-я – мат-ульк-а, дзет-ухна, цёт-ухн-а, бац-юхн-а.*

Павелічальна-ўзмацняльнае адценне надаюць назоўнікам суфіксы ***-ішч-(-ышч-), -ін-(-ын-)***: *хвост – хвасц-ішч-а, гразь – гразь-ішч-а, стог – стаж-ышч-а, рука – руч-ышч-а, нага – наж-ышч-а, дом– дам-ін-а, храм – харом-ін-а, вуж – вуж-ын-а.*

Павелічальна-зневажальнае адценне мае суфікс ***-уг-(-юг-)***: *звер – звяр-уг-а, воўк – ваўч-уг-а, злодзей – зладз-юг-а.*

## 2.7. Утварэнне назоўнікаў

Назоўнік – самая багатая на спосабы словаўтварэння часціна мовы. Вылучаюцца наступныя спосабы ўтварэння назоўнікаў: марфалагічнае, складанне, лексіка-семантычнае, марфалагічна-сінтаксічнае.

Для марфалагічнага ўтварэння характэрнае афіксальнае і бязафіксна словаўтварэнне. Афіксальнае словаўтварэнне ў сваю чаргу падзяляецца на суфіксальнае, прыставачнае і прыставачна-суфіксальнае

**Суфіксальны** спосаб – найбольш прадуктыўны ў марфалагічным утварэнні назоўнікаў. З дапамогай словаўтваральных суфіксаў (а іх налічваецца каля сотні) утвараюцца розныя групы назоўнікаў, у тым ліку назвы асоб мужчынскага і жаночага полу, назвы канкрэтных прадметаў, назвы абстрактных паняццяў. Суфіксальнае ўтварэнне характэрнае таксама для рэчыўных, зборных і адзінкавых назоўнікаў. Пры дапамозе суфіксаў *-нік(-ніц-), -чык(-чыц-), -шчык(-шчыц-), -льнік(-льніц-), -іст(-іст-к-), -ыст(-ыст-к-), -ар(-ар-к-), -ач(-ач-к-)* і інш. ад дзеясловаў і назоўнікаў утвараюцца назоўнікі са значэннем асобы паводле роду заняткаў, дзейнасці, прафесіі, схільнасці да пэўнага дзеяння: *праводзіць – праваднік – праваднiца, парушаць – парушальнік – парушальніца, разносіць – разносчык – разносчыца, выкладаць – выкладчык –*

*выкладчыца, апавядаць – апавядальнік – апавядальніца, збіраць – збіральнік – збіральніца, таксі – таксіст – таксістка, шантаж – шантажыст – шантажыстка, гандляваць – гандляр – гандлярка, архітэктура – архітэктар, свіння – свінар – свінарка, чытаць – чытач – чытачка, слухаць – слухач – слухачка, глядзець – глядач – глядачка.*

Суфіксы *-ан-ін(-ян-ін), -ан-к-, -ін(-ын), -ін-к-, -ак(-як), -ац(-ец), -іч, -ук і* інш. служаць для ўтварэння назоўнікаў, якія абазначаюць асоб паводле нацыянальнасці, месца нараджэння, жыхарства. Такія назоўнікі ўтвараюцца ад назоўнікаў: *малдаванін, егіпцянін, грузін, татарын, асецінка, сібірак, нарвежац, карэец, кітаец, масквіч, паляшук.*

Назоўнікі, якія абазначаюць асоб паводле іх індывідуальных якасцей, знешняга выгляду, утвараюцца ад прыметнікаў пры дапамозе суфіксаў *-ік(-іц-), -ец, -ак(-як), -ун: нахабны – нахабнік – нахабніца, разумны – разумнік – разумніца, шчаслівы – шчаслівец, бедны – бядняк, хітры – хітрун, гаваркі – гаварун.*

Пры дапамозе суфіксаў *-ік, -нік, -льнік, -л-*, *-лк-, -цель, -льн-* і інш. утвараюцца назвы канкрэтных прадметаў. Суфікс *-ік* ужываецца для ўтварэння назоўнікаў ад прыметнікаў: *гарчычны – гарчычнік, ватны. – ватнік, тварожны – тварожнік; -нік* – ад асноў назоўнікаў: *сыр – сырнік, чай – чайнік, гадзіна – гадзіннік; -льнік, -л-, -лк-, -цель, -льн-* – ад дзеясловаў: *кіпяціць – кіпяцільнік, халадзіць – халадзільнік, награвацъ – награвальнік, выключаць – выключальнік, будзіць – будзільнік, зубіць – зубіла, сушыць – сушылка, паіць – паілка, праяўляць – праявіцель, глушыць – глушыцель, спаць – спальня, чытаць – чытальня.*

Абстрактныя назоўнікі ўтвараюцца пры дапамозе суфіксаў *-осць(-асць), -ств-(-цтв-), -нн-, -енн-(-энн-), -к-, -ын-(-ін-), -от-(-ат-), -б-, -ацыј-* і інш. Суфіксы *-осць(-асць), -ын-, -от-(-ат-)* далучаюцца да асноў прыметнікаў: *малады – маладосць, прыгожы – прыгажосць, смелы – смеласць, актыўны – актыўнасць, гарачы – гарачыня, шырокі – шырыня, глыбокі – глыбіня, лянівы – лянота, добры – дабрата, цесны – цеснота, поўны – паўната.*

Суфіксы *-нн-, -енн-(-энн-), -б-, -к-* пры ўтварэнні абстрактных назоўнікаў далучаюцца да асноў дзеясловаў: *чытаць – чытанне, захаваць – захаванне, аднаўляць – аднаўленне, хадзіць – хадзьба, касіць – касьба, зімаваць – зімоўка, падтрымаць – падтрымка.* Суфіксы *-ацыј-, -ізацыј-* маюць абстрактныя назоўнікі іншамоўнага паходжання: *публікаваць – публікацыя, актывізаваць – актывізацыя, мадэрнізаваць – мадэрнізацыя.*

Суфікс *-ств-(-цтв-)* пры ўтварэнні абстрактных назоўнікаў найчасцей далучаецца да назоўнікаў, радзей – да прыметнікаў і дзеясловаў: *герой – геройства, майстар – майстэрства, умелы – умельства, дзяжу-*

*рыць – дзяжурства, спаборнічаць – спаборніцтва.*

Рэчыўныя назоўнікі ўтвараюцца ад назваў жывёл, птушак, рыб пры дапамозе суфіксаў *-ін-(-ын-), -ацін-(-яцін-): баран – бараніна, свіння – свініна, асетр – асятрына, курыца – кураціна, гусь – гусяціна, цяля – цяляціна;* ад дзеясловаў – пры дапамозе суфіксаў *-а-нк-: мачаць – мачанка, запякаць – запяканка.*

Значэнне зборнасці надаюць назоўнікам суфіксы *-ств-(-цтв-), -нік, -няк, -j-, -от-(-ат-), -ін-(-ын-)* і інш.: *селянін – сялянства, настаўнік – настаўніцтва, бяроза – бярэзнік, маліна – маліннік, дуб – дубняк, граб – грабняк, звер – звяр'ё, пяро – пер'е, ліст – лістота, збожжа – збажына.*

Назоўнікі са значэннем адзінкавасці ўтвараюцца пры дапамозе суфіксаў *-ін-(-ын-), -інк-(-ынк-): салома – саломіна, бульба – бульбіна, фасоля – фасоліна, гарох – гарошына, раса – расінка, сляза – слязіна – слязінка, дождж – дажджынка* (суфіксы *-інк-(-ынк-)* адначасова надаюць словам памяншальна-ласкальнае адценне).

Частотнасць ужывання словаўтваральных суфіксаў неаднолькавая. Адны суфіксы актыўна ўдзельнічаюць у працэсе словаўтварэння: *-нік, -чык, -ств-, -енн-, -асць, -ізм, -іст, -ец* і інш. Іншыя суфіксы ў сучаснай мове амаль не ўжываюцца (непрадуктыўныя) *-б-, -об-, -аль, -ух(-юх): хадзьба, просьба, вучоба, каваль, пастух, конюх.*

Сярод суфіксаў адрозніваюць суфіксы-амонімы – словаўтваральныя і формаўтваральныя. Так, пры дапамозе словаўтваральнага суфікса *-чык* ад асноў дзеясловаў утвараюцца назоўнікі, што абазначаюць назвы асоб паводле прафесіі, роду заняткаў: *грузіць – грузчык, пераплятаць – пераплётчык, загадваць – загадчык.* Формаўтваральны суфікс *-чык* надае памяншальна-ласкальнае адценне назоўнікам: *пакой – пакойчык, палец – пальчык, зал – зальчык, магнітафон – магнітафончык.* Ад асноў дзеясловаў пры дапамозе словаўтваральнага суфікса *-к-* утвараюцца назоўнікі, што абазначаюць адцягненыя дзеянні: *вандраваць – вандроўка, заправаўляць – заправаўка, збіраць – зборка.* Формаўтваральны суфікс -к- надае памяншальна-ласкальнае адценне назоўнікам: *трава – траўка, карова – кароўка, галава – галоўка.*

Аманімічныя таксама наступныя суфіксы: *папял-**ішч**-а – граз-**ішч**-а, рэч-**ышч**-а* (ракі) – *руч-**ышч**-а, пажар-**ышч**-а* (у лесе) – *наж-**ышч**-а, ігл-**іц**-а – зямл-**іц**-а, хад-**ок** – зуб-**ок**, тварожн-**ік** – нос-**ік**.*

**Прыставачны** спосаб утварэння назоўнікаў менш пашыраны, чым суфіксальны. Гэтым спосабам назоўнікі ўтвараюцца толькі ад назоўнікаў шляхам далучэння прыставкі: *парадак – беспарадак, група – падгрупа, разлік – пераразлік, апрацоўка – пераапрацоўка, унук – праўнук, падрыхтоўка – перападрыхтоўка.*

Пры дапамозе прадуктыўнай прыстаўкі *не-(ня-)* і менш прадуктыў-

ных запазычаных прыставак *дэ-, дыс-, контр-, рэ-* і інш. утвараюцца назоўнікі з супрацьлеглым значэннем: *воля – няволя, праўда – няпраўда, шчасце – няшчасце, мабілізацыя – дэмабілізацыя, намінацыя – дэнамінацыя, прапорцыя – дыспрапорцыя, гармонія – дысгармонія, наступленне – контрнаступленне, арганізацыя – рэарганізацыя, трансляцыя – рэтрансляцыя.*

Назоўнікі могуць утварацца з дапамогай прыставак і суфіксаў адначасова, г. зн. **прыставачна-суфіксальным спосабам**. У сучаснай мове ён не вызначаецца прадуктыўнасцю. Назоўнікі могуць утварацца ад назоўнікаў пры дапамозе прыставак і суфіксаў *пад-* і *-ак: лес – падлесак, голас – падгалосак, мур – падмурак, свіння – падсвінак; на- і -нік; канец – наканечнік, пара – напарнік, хлеб – нахлебнік, стол – настольнік, морда – наморднік; пад- і -авік, -ік: бяроза – падбярозавік, асіна – падасінавік, акно – падаконнік, рама – падрамнік; пры- і -ак: лес – прылесак, сцяна – прысценак, печ – прыпечак, гара – прыгорак.* Зрэдку сустракаюцца і іншыя спалучэнні словаўтваральных прыставак і суфіксаў: *плячо – паплечнік, рукаў – безрукаўка, дом – бяздомнік, лес – узлесак, лес – пралеска, зоры – сузор'е(јэ), пень – апенька, бок – абочына, грып – антыгрыпін, бяседа – субяседнік, айчына – суайчыннік, мароз – замаразак.*

**Бязафіксным (нульсуфіксальным)** спосабам назоўнікі ўтвараюцца ад дзеясловаў і прыметнікаў без словаўтваральных афіксаў. Ад дзеясловаў утвараюцца пераважна назоўнікі мужчынскага роду: *бегаць – бег, пераходзіць – пераход, вылятаць – вылет, выганяць – выган, насыпаць – насып;* ад прыметнікаў – назоўнікі жаночага роду: *сіні – сінь, чырвоны – чырвань, ціхі – ціш, далёкі – далеч, гладкі – гладзь, малады – моладзь.* Аснова аддзеяслоўных і адпрыметнікавых назоўнікаў можа супадаць з коранем зыходных слоў, а можа і не супадаць: *шырокі – шыр, памагаць – помач, заказаць – заказ, прымяшаць – прымесь, заслужыць – заслуга, выходзіць – выхад, белы – бель, высокі – высь, зялёны – зелень.*

Пры ўтварэнні назоўнікаў спосабам **складання** выдзяляюцца **асноваскладанне**: *далягляд, атамаход, пешаход;* **складана-суфіксальны** спосаб: *бульбакапалка, пяцігодка, другакласнік, палкаводзец;* **словаскладанне** (два словы аб'ядноўваюцца ў складанае без змен і без злучальнай галоснай): *інжынер-канструктар, генерал-лейтэнант, плашч-палатка, сон-трава.*

Складаныя назоўнікі могуць утварацца з дапамогай інтэрфіксаў – злучальных галосных *а, о, е, я: байкапісец, газазварка, хлебароб, ільновалакно, зернеўборка, краявід.* Складаныя назоўнікі ўтвараюцца шляхам злучэння асноў розных часцін мовы:

двух назоўнікаў: *жалезабетон, лесатундра, законапраект, лесапарк, насаглотка, шкловалакно, торфабрыкет, серавадарод, кінапра-*

*кат;*

назоўніка і дзеяслова: *кнігапродаж, кнігаабмен, снегапад, ліставпад, санцапёк, ледакол, громаадвод;*

прыметніка і назоўніка: *пустацвет, пустазвон, галалёд, даўганосік, сухафрукты, новабудоўля;*

лічэбніка і назоўніка: *першацвет, першадрукар, першакрыніца, адзінаначальнік, васьміног, сараканожка;*

займенніка і назоўніка: *самаадукацыя, самаабслугоўванне, самадысцыпліна;*

прыслоўя і дзеяслова: *усюдыход, пешаход.*

Калі складаны назоўнік утвараецца ад назоўніка і дзеяслова, можа адбывацца скарачэнне (усячэнне) дзеяслоўнай асновы: *складападзел, пыласос, кашавар, хлебапёк.*

Пры складана-суфіксальным спосабе складаныя назоўнікі найчасцей утвараюцца ад асноў:

назоўніка і дзеяслова з дапамогай суфіксаў ***-нік***: *рукамыйнік, вогнепаклоннік, токапрыёмнік;* ***-льнік***: *мінашукальнік, святловымяральнік;* ***-шчык:*** *сталеліцейшчык, збожжанарыхтоўшчык;* ***-ец***: *краязнавец, мастацтвазнавец, таваразнавец, флатаводзец;* ***-к-***: *вадакачка, мясарубка;* -лк-: *землечарпалка, бетонамяшалка, бульбасаджалка;* ***-ств-:*** *рыбалоўства, судаходства;* ***-оўл-:*** *птушкагадоўля, авечкагадоўля;* ***-нн-***: *кроваўтварэнне, станкабудаванне, землеўпарадкаванне;*

прыметніка і дзеяслова з дапамогай суфіксаў ***-ств-, -нн-:*** *вальнадумства, чыстапісанне;*

лічэбніка і дзеяслова з дапамогай суфіксаў ***-льнік, -ец***: *першаадкрывальнік, першапраходзец;*

прыметніка і назоўніка з дапамогай суфіксаў ***-нік, -ец, -ц, -j-***: *гарналыжнік, старшакласнік, чужаземец, пласкагубцы, белакроўе(je), пустаслоўе, раўнапраўе;*

лічэбніка і назоўніка з дапамогай суфіксаў ***-нік, -ак***: *першаразраднік, другагоднік, шасцікласнік, аднагодак, першагодак.*

Некаторыя складаныя назоўнікі ўтвораны пры дапамозе суфіксаў непасрэдна ад складаных прыметнікаў: *рознакаляровы – рознакаляровасць, шматмоўны – шматмоўнасць, шматслоўны – шматслоўнасць, добраўпарадкаваны – добраўпарадкаванасць, мнагазначны – мнагазначнасць, мнагалюдны – мнагалюднасць, своеасаблівы – своеасаблівасць, своечасовы – своечасовасць.*

У якасці словаўтваральнай базы складаных назоўнікаў могуць выкарыстоўвацца так званыя звязаныя кампаненты, якія самастойна ў мове не ўжываюцца. Некаторыя даследчыкі (Л. Шакун) разглядаюць такія марфемы як афіксоіды, а ўтвораныя з іх дапамогай словы не адносяць да

складаных. Як правіла, гэта запазычанні з іншых моў. Сярод найбольш ужывальных – звязаныя кампаненты ***-метр*** у назвах вымяральных прыбораў: *дазіметр, віброметр, мікрометр, рэнтгенометр*; ***-бус*** у назвах відаў транспарту: *аўтобус, тралейбус, мікрааўтобус*; ***-тэка*** ў назвах, якія абазначаюць збор чаго-небудзь або памяшканне для захоўвання гэтага збору: *картатэка, фанатэка, фільматэка, бібліятэка*; ***-фон*** у назвах прыбораў, якія перадаюць гукі: *тэлефон, патэфон, магнітафон, гідрафон*: ***-скоп*** у назвах прыбораў, інструментаў, пры дапамозе якіх вядзеццаназіранне за чым-небудзь: *мікраскоп, тэлескоп, фільмаскоп*; ***-лаг*** у назоўніках – назвах чалавека па прафесіі: *філолаг, псіхолаг, археолаг, арнітола*г; ***-філ*** у назоўніках – назвах асоб, якія маюць схільнасць да чаго-небудзь: *бібліяфіл, славянафіл* і інш.

Складанне – надзвычай прадуктыўны спосаб утварэння назоўнікаў у сучаснай беларускай мове. Так, напрыклад, толькі з асновай ***кіна-*** ў нашай мове ўжываецца каля 70 складаных назоўнікаў: *кінадакумент, кінаархіў, кінаальманах, кінаапаратар, кінаакцёр, кінабаявік, кінабудка, кінагерой, кінадраматургія, кінадылогія, кінажурналіст, кіназала, кіназдымка, кіназнаўства, кіназорка, кінакамера, кінакампанія, кінакрытыка, кінамастацтва, кінамеханік, кінаплёнка, кінапракат, кінарэжысёр, кінасеанс, кінастудыя, кінастужка, кінасцэнарый, кінафестываль, кінахроніка, кінафікацыя, кіначасопіс, кінаэкран, кінаэпапея* і інш. Разнавіднасцю складання з'яўляецца **абрэвіяцыя** – утварэнне складанаскарочаных назоўнікаў з усечаных асноў. Абрэвіяцыя – адзін з прадуктыўных шляхоў утварэння назоўнікаў. Абрэвіятуры могуць утварацца:

1) з пачатковых літар слоў (літарны ініцыяльны тып): *Мінскі трактарны завод – МТЗ* (эмтэзэ), *Беларускі дзяржаўны педагагічны універсітэт – БДПУ* (бэдэпэу), *Таварыства беларускай мовы – ТБМ* (тэбээм), *камандны пункт – КП* (капэ), сумеснае прадпрыемства – *СП* (эспэ), *Садружнасць Незалежных Дзяржаў – СНД* (эсэндэ). У асобных выпадках вымаўленне літарных абрэвіятур можа перадавацца ў пісьмовай мове: *Скверам між маладых рабін з прывялым на сонцы збялелым лісцем яна падышла да эрдэка* (Пташн.);

2) з пачатковых гукаў (гукавы ініцыяльны тып): *Мінскі аўтамабільны завод – МАЗ, жыллёва-эксплуатацыйная служба – ЖЭС, Цэнтральны універсальны магазін – ЦУМ, Тэатр юнага гледача – ТЮГ, Арганізацыя Аб'яднаных Нацый – ААН;*

3) з пачатковых складоў слоў (складовы тып): *лясгас, камбат, юннат, сельмаг, леспрамгас, філфак;*

4) з часткі першага слова і пачатковых гукаў наступных (змешаны тып): *БелСЭ, аблана, БелАЗ;*

5) з часткі слова і цэлага слова: *медсястра, педсавет, педінсты-*

*тут, генплан, нарсуд, жылплошча.* Такія назоўнікі-абрэвіятуры блізкія да складаных слоў; ім уласцівыя асаблівасці і абрэвіяцыі і асноваскладання;

6) з пачатку першага слова і канца другога (так званыя «вышчарбленыя» асновы): *радыёстанцыя – рацыя, біялогія і электроніка – біёніка, матарызаваны атэль – матэль, мотавеласіпед – мапед.*

7) з усечаных частак (або першых складоў) першага слова спалучэння і пачатковых літар астатніх: *педВНУ*;

8) з пачатковай часткі першага слова і пачатковай і канцавой частак другога: *эсмінец (эскадрыльны мінаносец), ваенкамат (ваенны камісарыят).*

Лексічны склад беларускай мовы ў апошні час актыўна папаўняецца за кошт абрэвіятур – уласных назваў: *Белнафтапрадукт, Белзнешэканомбанк, Белбізнесбанк, Белінфарм, Дзяржкамстат, Мінхлебапрадукт* і інш.

Тэрмін «абрэвіяцыя» часам ужываецца ў больш вузкім значэнні – як назва працэсу ўтварэння новых слоў шляхам скарачэння, або ўсячэння, утваральнай асновы назоўніка. Утвораныя шляхам усячэння назоўнікі ўжываюцца паралельна з поўнымі назоўнікамі і нярэдка маюць адценне размоўнасці: *маг – ад магнітафон, фота – ад фатакартка, спец – ад спецыяліст, бакі – ад бакенбарды.* Усячэнне назоўнікаў можа суправаджацца суфіксацыяй – звычайна выкарыстоўваецца суфікс *-ік: велік – ад веласіпед, відзік – ад відэамагнітафон, тэлік – ад тэлевізар, мульцік – ад мультфільм.*

**Лексіка-семантычнае** ўтварэнне назоўнікаў у сучаснай беларускай мове малапрадуктыўнае. Пры лексіка-семантычным утварэнні назоўнікі ўзнікаюць у выніку распаду полісеміі і ўтварэння самастойных слоў-амонімаў: *гасцінец* 'шлях' і *гасцінец* 'пачастунак', *поўдзень* 'напрамак свету' і *поўдзень* 'сярэдзіна дня', *поўнач* 'напрамак свету' і *поўнач* 'сярэдзіна ночы, 12 гадзін', *ліст* (на дрэве) і *ліст* (паперы).

Найчасцей лексіка-семантычным шляхам узнікаюць не новыя словы, а новыя значэнні слова – адбываецца метафарызацыя: *сцюдзёная крыніца – крыніца ведаў – літаратурная крыніца; рукаў паліто – рукаў рэчкі – пажарны рукаў; чыгуначная платформа – платформа грузавога саставу – туфлі на платформе – палітычная платформа; мехавая шапка – шапка сланечніка – шапка валасоў – артыкулы пад адной шапкай.*

Да **марфалагічна-сінтаксічнага** словаўтварэння адносіцца субстантывацыя. Часцей за ўсё субстантывуюцца прыметнікі, якія набываюць прадметнае значэнне, нязменнасць катэгорыі роду і выконваюць у сказе асноўную функцыю назоўніка – ужываюцца ў ролі дзейніка або дапаўнення: ***Мінулае** не вяртаецца. **Мінулае** нельга зрабіць сённяшнім,*

*якім бы ты ні быў разумным і моцным* (Я.С). *Завяралі* ***старэйшыя****, што імі ўжо вырашаны праблемы праўды і няпраўды, дружбы, кахання, жыцця і смерці* (М.Т.).

Працэс пераходу прыметнікаў у назоўнікі – з'ява даволі актыўная ў сучаснай беларускай мове. Адны прыметнікі пры субстантывацыі поўнасцю пераходзяць у назоўнікі і як прыметнікі больш не ўжываюцца (так званая поўная субстантывацыя), другія могуць ужывацца і як назоўнікі і як прыметнікі (частковая субстантывацыя).

Субстантываваныя прыметнікі, якія поўнасцю перайшлі ў назоўнікі, страцілі значэнне прыметы і набылі прадметнае значэнне, хоць знешнюю форму прыметніка і захавалі: *піроaccess, шампанскае, насякомае, ляснічы, араты, вартавы, звеннявая.* Такія субстантываваныя прыметнікі могуць мець пры сабе азначэнні: *свежае піроaccess, халоднае шампанскае, маладая звеннявая.*

Пры частковай субстантывацыі прыметнікі, набываючы прадметнае значэнне, ужываюцца як назоўнікі: *у пакой увайшла класная, падышоў знаёмы, фатаграфаваліся маладыя, пазваніў хворы, заплакала малая, умяшаліся дарослыя, выйшлі працоўныя, сабраліся паляўнічыя.* Калі ж прыметнікі захоўваюць атрыбутыўнае значэнне, то ўжываюцца ў сваёй функцыі: *класная дошка, знаёмы доктар, маладыя настаўнікі, хворы хлопчык, малое дзіця, дарослыя аднавяскоўцы, працоўныя будні, паляўнічыя сабакі.*

Пры поўнай субстантывацыі былыя прыметнікі і дзеепрыметнікі страчваюць здольнасць змяняцца па родах. Таму, напрыклад, назоўнікі *вартавы, камандуючы* ўжываюцца толькі ў форме мужчынскага роду і не могуць мець формаў жаночага або ніякага роду, а былыя прыметнікі *шампанскае, піроaccess* – у форме ніякага роду і не могуць мець формаў мужчынскага або жаночага роду.

Некаторыя субстантываваныя прыметнікі, якія маюць значэнне асобы, могуць у залежнасці ад полу носьбіта ўжывацца ў форме мужчынскага або ў форме жаночага роду і змяняцца па ліках: *класны – класная – класныя, служачы – служачая – служачыя, дзяжурны – дзяжурная – дзяжурныя, малады – маладая – маладыя, стары – старая – старыя, хворы – хворая – хворыя, дарослы – дарослая – дарослыя, малы – малая – малыя.*

Субстантываваныя прыметнікі не ўваходзяць у сістэму назоўнікавага скланення і скланяюцца, як прыметнікі. Субстантываванымі прыметнікамі паводле свайго паходжання з'яўляюцца шматлікія прозвішчы і геаграфічныя назвы: *Ганчароў, Кавалёў, Карасёў, Селязнёў, Пятроў, Фёдараў, Андрэеў; Рагачоў, Глыбокае, Круглае, Шчучын, Барысаў.*

У пэўным кантэксце значэнне назоўніка могуць набываць словы

любой часціны мовы:

лічэбнікі: *Тыя* ***чацвёра****, што асталіся ў пакойчыку, доўга іх чакалі* (І.Н.). ***Адзін*** *жыве як хочацца, а другі – як прыйдзецца* (Пр.). ***Адзін*** *з сошкаю, а сямёра з ложкаю* (Пр.);

займеннікі: *Калі адрываю на* ***штосьці*** *лісток перакіднога календара, міжволі думаю пра дні, якія пройдзены* (М.Т.). *Што глядзіш на мяне абыякава, як на* ***кожнага,*** *як на* ***ўсякага?*** (Дзяр.);

дзеепрыметнікі: ***Паранены*** *прыўзняў галаву* (М.Л.). *Ноч палохала трывогай, нязведанасцю, горкім сумам па* ***страчаным,*** *па* ***загубленым*** (М.Л.);

прыслоўі: *Цяпер можна мяне вітаць – школу скончыў на* ***«выдатна»*** (Кр.). *Да* ***сягоння*** *жыве памяць аб злым гэтым дусе на ўсёй чыста Украіне і на Беларусі* (Куп.). ***Учора*** *не дагоніш, ад* ***заўтра*** *не ўцячэш* (Пр.);

службовыя часціны мовы: ***Вакол, замест, акрамя*** *– вытворныя прыназоўнікі.* ***А, і, ды, бо, але*** *– невытворныя злучнікі. Прыслоўі з* ***абы-*** *пішуцца праз злучок;*

выклічнікі і гукапераймальныя словы: *Цяпер недзе за лесам, з хутара, чуваць па-хатняму празаічна-дзярлівае, а ўжо таксама веснавое, іншае* ***кукарэку*** (Б.). *Ясельда. І кладачка, як прасла, зоўнае зязюліна* ***«куку»*** (Янішч.).

### 3. Пытанні да асноўнага тэарэтычнага матэрыялу

1. Якія граматычныя катэгорыі ўласцівыя назоўніку?
2. На якія лексіка-граматычныя разрады падзяляюцца назоўнікі? Якія назоўнікі залежаць да агульных і ўласных, канкрэтных і абстрактных? Як вызначаецца катэгорыя адушаўлёнасці – неадушаўлёнасці назоўнікаў? Якія назоўнікі адносяцца да асабовых назоўнікаў? Назавіце характэрныя рысы зборных і рэчыўных назоўнікаў.
3. Як вызначаецца катэгорыя ліку назоўнікаў? Якія назоўнікі належаць да адзіночналікавых і множналікавых назоўнікаў?
4. Як вызначаецца катэгорыя роду назоўнікаў? Як суадносіцца граматычная катэгорыя роду з біялагічным полам? Якія назоўнікі адносяцца да назоўнікаў агульнага роду?
5. Якая граматычная катэгорыя называецца склонам? Якое значэнне ўласціва назоўнаму склону? Якія значэнні маюць ускосныя склоны?
6. Назавіце тыпы скланення назоўнікаў. Ад чаго залежаць склонавыя канчаткі назоўнікаў? Якія назоўнікі адносяцца да рознаскланяльных? Як скланяюцца назоўнікі ў множным ліку? Як скланяюцца прозвішчы на *-а(-я)?* Якія прозвішчы ў беларускай мове не скланяюцца? Як скланяюцца геаграфічныя назвы? Якія назоўнікі адносяцца да

нескланяльных?
7. Як утвараюцца формы назоўнікаў з суфіксамі ацэнкі? Якія суфіксы надаюць назоўнікам памяншальна-ласкальнае, павелічальна-ўзмацняльнае і павелічальна-зневажальнае адценне?
8. Назавіце ўсе спосабы словаўтварэння назоўнікаў у беларускай мове.
9. Як утвараюцца складаныя назоўнікі? Ахарактарызуйце асноваскладанне, складана-суфіксальны спосаб і словаскладанне. Як утвараюцца абрэвіятуры? Якія назоўнікі ўзнікаюць лексіка-семантычным шляхам? Што такое субстантывацыя? Якія часціны мовы могуць субстантывавацца?

## 4. Матэрыялы да практычных аўдыторных і самастойных заняткаў

### 4.1. Схема блок-сістэмы практычных заняткаў

| № | Тэма практычных заняткаў | Колькасць гадзін |
|---|---|---|
| 1. | Назоўнік як часціна мовы. Значэнне, марфалагічныя прыметы. сінтаксічная роля. Лексіка-граматычныя разрады назоўнікаў: агульныя і ўласныя, канкрэтныя і абстрактныя, адушаўлёныя і неадушаўлёныя, асабовыя і неасабовыя, зборныя, рэчыўныя. | 2 |
| 2. | Род назоўнікаў. Назоўнікі агульнага роду. Вызначэнне роду нескланяльных назоўнікаў. | 2 |
| 3. | Лік назоўнікаў. Адзіночналікавыя і множналікавыя назоўнікі. | 2 |
| 4. | Склон назоўнікаў. Асноўныя значэнні склонаў. | 2 |
| 5. | Скланенне назоўнікаў. Тыпы скланення: назоўнікі субстантыўнага, ад'ектыўнага, змешанага (субстантыўна-ад'ектыўнага), нулявога скланення. Рознаскланяльныя назоўнікі. | 2 |
| 6. | Скланенне прозвішчаў і геаграфічных назваў. Формы назоўнікаў з суфіксамі ацэнкі. Утварэнне назоўнікаў: марфалагічнае, складанне, лексіка-семантычнае, марфолага-сінтаксічнае. | 2 |

### 4.2. Практыкаванні для засваення тэарэтычных ведаў па модулі

На занятках 1 выконваюцца практыкаванні 288-292, 294-303.
На занятках 2 выконваюцца практыкаванні 313-322.
На занятках 3 выконваюцца практыкаванні 304-312.
На занятках 4 выконваюцца практыкаванні 323-327.
На занятках 5 выконваюцца практыкаванні 328-337.
На занятках 6 выконваюцца практыкаванні 338, 340-347.

## 5. Дадатковая літаратура па модулі

1. Анічэнка У.В. Марфалогія ўсходнеславянскіх моў: Назоўнік. Дзеяслоў. Прыслоўе. – Мн.: Вышэйш. шк., 1973.
2. Жыдовіч М.А. Назоўнік у беларускай мове: [у 2 ч.]. – Мн.: Выдавецтва Беларускага дзяржаўнага універсітэта, 1969.

3. Мощенская Л.Г. Как белорусы говорят по-русски?: Варианты рода имён существительных в русской речи белорусов / Ред. П.П. Шуба. – Мн.: Университетское, 1992.
4. Наркевіч А.І. Назоўнік. Граматычныя катэгорыі і формы. – Мн.: БДУ, 1976.
5. Параскевіч Г. В. Назоўнік у беларускіх прыказках. – Мн.: Універсітэцкае, 1984.
6. Татаринова Т.И. Русские и белорусские языковые соответствия в области имени существительного: Учеб.-метод. пособие для студентов филол. фак. / Мозыр. гос. пед. ин-т им. Н.К.Крупской. – Мозырь: МГПИ, 1998.

МОДУЛЬ 9
# «ПРЫМЕТНІК»

## 1. Схема блок-сістэмы вывучэння тэарэтычнага матэрыялу

| № | Тэма лекцыйных заняткаў | Колькасць гадзін |
|---|---|---|
| 1. | Прыметнік як часціна мовы. Катэгарыяльнае значэнне, марфалагічныя прыметы, сінтаксічная роля. Лексіка-граматычныя разрады прыметнікаў: якасныя, адносныя, прыналежныя. Пераход прыметнікаў з аднаго разраду ў другі. | 2 |
| 2. | Поўныя і кароткія формы якасных прыметнікаў. Ступені параўнання якасных прыметнікаў. | 2 |
| 3. | Спосабы і сродкі ўтварэння якасных, адносных і прыналежных прыметнікаў. Пераход дзеепрыметнікаў у прыметнікі (ад'ектывацыя). | 2 |

## 2. Асновы навукова-тэарэтычных ведаў па модулі

**Слоўнік паняццяў для засваення**: прыметнік, якасныя прыметнікі, адносныя прыметнікі, прыналежныя прыметнікі, уласнапрыналежныя прыметнікі, агульнапрыналежныя прыметнікі, поўныя ( членныя) прыметнікі, кароткія ( нячленныя) прыметнікі, сцягнутыя (усечавыя) прыметнікі, элятыў.

Пры напісанні раздзела быў выкарыстаны матэрыял вучэбнага дапаможніка «Сучасная беларуская літаратурная мова: Марфалогія: Вучэб. дапам. / Н.В. Гаўрош, М.Ц. Кавалёва, Н.М. Нямковіч і інш.; Пад агульн. рэд. праф. М.С. Яўневіча. – Мн.: выд. Ул.М. Скарун, 1997. – 288 с.»

### 2.1. Прыметнік як часціна мовы

**Прыметнік** – самастойная часціна мовы, якая мае абагульненае значэнне прыметы, характарызуецца граматычнымі катэгорыямі роду, ліку і склону, у сказе выконвае функцыю азначэння або выказніка.

Значэнне прыметы – катэгарыяльнае значэнне прыметніка як часціны мовы. Яно ахоплівае знешнія якасці, уласцівасці людзей і жывёл: *малады, стройны, прыгожы, хітры, кульгавы;* унутраныя (псіхалагічныя) рысы чалавека: *добры, мудры, сарамлівы, руплівы;* прыметы па адносінах да прасторы, месца, часу, ліку, матэрыялу, дзеяння: *высокі, гарадскі, учарашні, трохступенны, драўляны, ломкі,носкі;* колер: *белы, зялёны;* якасці, уласцівасці: *мяккі, салодкі, кіслы;* прыметы прадметаў паводле іх прызначэння: *службовы* (аўтобус), *уступныя* (экзамены) ці прыналежнасць пэўнай асобе або жывой істоце: *бацькаў* (падарунак), *матчына* (ласка), *баброва* (хатка).

Граматычныя катэгорыі роду, ліку і склону ў прыметніка сінтаксічныя, залежныя ад назоўніка: *зялёны лес, шырокае поле, далёкая дарога, вясновыя дні.* Значэнні роду, ліку і склону прыметнікі выражаюць з дапамогай канчаткаў. Прыметнікам уласцівыя спецыфічныя словаўтваральныя і формаўтваральныя суфіксы: *агністы, аўтарскі, імклівы, міленькі, велічэзны, святлейшы.*

Асноўная сінтаксічная функцыя прыметніка – быць у сказе азначэннем або выказнікам: *Я выпешчу, выпушчу ў ранак* ***вясновы****, як птушак, душы* ***запаветныя*** *словы пасланцамі* ***песеннай матчынай*** *мовы* (Т.Б.). ***Гарачая была*** *гэта раніца* (К-с).

### 2.2. Разрады прыметнікаў

Паводле значэння, граматычных і словаўтваральных уласцівасцей прыметнікі падзяляюцца на якасныя, адносныя і прыналежныя.

**Якасныя** прыметнікі абазначаюць разнастайныя прыметы прадметаў непасрэдна праз лексічнае значэнне асновы. Найчасцей яны абазначаюць уласцівасці і якасці, якія ўспрымаюцца органамі пачуццяў: *салодкі, горкі, гарачы, белы, сіні, звонкі, шумны, нізкі, тоўсты;* уласцівасці характару, асаблівасці псіхічнага складу чалавека: *добры, крыклівы, памяркоўны;* выражаюць агульную ацэнку: *трывалы, цудоўны, выдатны.* Якасныя прыметнікі характарызуюцца наступнымі граматычнымі, словаўтваральнымі і лексічнымі асаблівасцямі, якімі яны адрозніваюцца ад адносных і прыналежных:

абазначаюць прымету, якая можа праяўляцца ў большай ці меншай ступені – утвараюць ступені параўнання: *смелы – смялейшы, найсмялейшы, самы смелы;*

маюць поўную і кароткую формы: *смутны – смуцен, рады – рад, поўны – повен;*

спалучаюцца з прыслоўямі меры і ступені: *вельмі здольны, надта прыгожы, надзвычай лёгкі;*

могуць быць вытворныя і невытворныя: *духмяны, цярплівы, звонкі, белы, чысты;*

утвараюць формы ацэнкі і меры якасці: *белы – беленькі, бялюсенькі, бялюткі, бялюсенечкі, белаваты; шырокі – шырачэзны;*

ад большасці якасных прыметнікаў утвараюцца якасныя прыслоўі на *-а, -у: светла, хораша, па-маладому, па-геройску,* а таксама назоўнікі з адцягненым значэннем: *белізна, смеласць, сінеча, маладосць;*

утвараюць антанімічныя пары: *лёгкі – цяжкі, далёкі – блізкі.*

Не ўсе якасныя прыметнікі маюць пералічаныя асаблівасці. Так, напрыклад, прыметнікі *вялы, халасты, жанаты* не ўтвараюць ступеней параўнання, прыметнікі *гняды, вараны* не маюць і суадносных якасных прыслоўяў. Аднак некаторыя з гэтых прыметнікаў утвараюць формы ацэ-

нкі і меры якасці: *гнядзенькі, вараненькі;* утвараюць адцягненыя назоўнікі: *вяласць.*

**Адносныя** прыметнікі абазначаюць прымету прадмета праз яго адносіны да іншых прадметаў: да матэрыялу, з якога зроблены прадмет: *дубовы стол – стол з дубу, залаты пярсцёнак – пярсцёнак з золата;* да месца знаходжання і часу існавання: *падземная дарога, ранішняя прагулка;* да дзеяння як уласцівасці: *раскладное крэсла – крэсла, што раскладаецца;* да прызначэння: *прыёмны пакой, вучэбная кніга;* да ўдзельнікаў: *студэнцкая* (канферэнцыя), *прафсаюзны* (сход); да тэрміну: *сутачны* (рацыён), *гадавы* (план); да меры і вагі: *трохметровы* (ясень), *пяцітонны* (самазвал).

Адносныя прыметнікі абазначаюць пастаянную, нязменную прымету прадмета і паводле паходжання яны вытворныя.

Адносныя прыметнікі ў кантэксце могуць набываць пераноснае значэнне і ўжывацца ў ролі якасных: *залаты пярсцёнак* і *залаты лістапад, сонечны прамень і сонечны ўспамін.* У сваю чаргу якасныя прыметнікі могуць набываць значэнне сталай (пастаяннай) прыметы, тэрміналагізавацца і пераходзіць у адносныя: *звонкі голас* і *звонкі зычны* (гук), *глухі стук* і *глухі зычны, лёгкае заданне* і *лёгкая прамысловасць.* Такія прыметнікі звычайна становяцца тэрмінамі.

**Прыналежныя** прыметнікі абазначаюць прыналежнасць прадмета пэўнай канкрэтнай асобе (жывой істоце): *маміна кніга, бабуліна хустка, бацькаў партфель, буслава гняздо*; паказваюць на агульную родавую прыналежнасць: *воўчы след, вавёрчыны арэхі.* У некаторых навуковых працах прыналежныя прыметнікі кваліфікуюцца як адносныя, паколькі яны абазначаюць прымету не непасрэдна, а праз адносіны да іншых прадметаў (асоб), прымету прадмета па адносінах да іх уладальніка. Прыналежныя прыметнікі падзяляюцца на ўласнапрыналежныя і агульнапрыналежныя.

**Уласнапрыналежныя** прыметнікі абазначаюць прыналежнасць прадмета канкрэтнай, індывідуальнай асобе, маюць свае адметныя асаблівасці: у назоўным і вінавальным склонах пры неадушаўлёных і асабовых назоўніках жаночага і ніякага роду маюць кароткую форму: *братава паліто, бацькаву шапку, бабулін стол, сестрына дачка, сестрыну дачку;* утвараюцца толькі ад асабовых назоўнікаў: ад назоўнікаў мужчынскага роду пры дапамозе суфіксаў *-аў(-аў), -ёў(-еў): братаў, Колеў, старшынёў, краўцоў;* ад назоўнікаў жаночага роду – пры дапамозе суфіксаў *-ін(-ын): мамін, Наташын.*

**Агульнапрыналежныя** прыметнікі паказваюць на агульную, родавую прыналежнасць: *воўчы след – след воўка, пчаліны мёд.* Агульнапрыналежныя прыметнікі падобныя да адносных і значэннем (абазначаюць

не індывідуальную прыналежнасць, а агульную), і формай – могуць быць поўнымі ў назоўным і вінавальным склонах: *бабровая хатка, мядзведжы бярлог, казінае малако, салаўіная песня.*

Прыналежныя прыметнікі пры пераносна-вобразным ужыванні набываюць значэнне якасных: *заячая нара* і *заячая смеласць, мядзведжы след* і *мядзвежая сіла, воўчы апетыт, лісіная хітрасць.* Ужытыя з якасным значэннем, гэтыя прыметнікі могуць набываць граматычныя рысы якасных: утвараць ступені параўнання (найчасцей – складаныя формы); ад іх могуць утварацца прыслоўі на *-а* і назоўнікі на *-асць;* могуць далучаць да сябе прыслоўі меры і ступені: *паэтычная назва – яшчэ больш паэтычная, надта паэтычная, паэтычнасць, паэтычна.*

## 2.3. Поўныя і кароткія формы прыметнікаў

Якасныя прыметнікі ў беларускай мове ўжываюцца пераважна ў поўнай форме. Поўныя ( членныя) прыметнікі ў назоўным склоне адзіночнага ліку мужчынскага роду маюць канчатак -ы (-і): *ясны, далёкі;* жаночага роду *ая(-яя): вясёлая, сіняя;* ніякага роду *– ое, -ае(-яе): густое, сіняе, бязмежнае;* у назоўным склоне множнага ліку *– -ыя(-ія): далёкія, бязмежныя.* Поўныя прыметнікі скланяюцца. У сказе бываюць азначэннем і выказнікам: *Я чытаў* ***гонкім*** *соснам* ***просты шчыры*** *свой верш* (Бр.). *У* ***познюю*** *восень вада пад мастом* ***чыстая і халодная*** (К.Ч.). Поўная форма якасных прыметнікаў у ролі выказніка – агульная норма для ўсіх стыляў беларускай літаратурнай мовы: *Як паэт Алесь Бачыла* ***шматгранны і своеасаблівы*** (Грах.). *Жыццё, існаванне беларускай нацыі без роднай мовы* ***немагчымае*** (ЛіМ). *Дзень* ***гасцінны, мітуслівы, гаманлівы, каларытны.*** *Доўга я блукаў шчаслівы сярод вуліц старажытных* (М.Т.).

**Кароткія ( нячленныя)** прыметнікі ў назоўным склоне адзіночнага ліку маюць нулявы канчатак у мужчынскім родзе: *рад, повен, чуцён. дуж, весел, смуцен;* канчатак ***-а*** – у жаночым родзе: *чутна, рада, шчаслі-ва;* ***-а*** не пад націскам і ***-о*** пад націскам – у ніякім родзе: *дзіця рада, акно чыста, добрае далёка чутно;* ***-ы(-і)*** – у назоўным склоне множнага ліку: *рады, вясёлы, дарагі.* Кароткія прыметнікі не скланяюцца, змяняюцца толькі па родах і ліках. У сказе выконваюць функцыю выказніка: *Стаў* ***чырван*** *месяц круглаліцы* (К-с). *Даль* ***імгліста, нерухома*** *– не відна нічо-га* (К-с).

У беларускай мове ўжыванне кароткіх прыметнікаў абмежаванае: яны сустракаюцца пераважна ў паэтычных творах, дзе іх выкарыстанне вымагаецца рытмам і рыфмай: *І* ***люб*** *і* ***смуцен*** *час прыгоды, калі душа ўсяе прыроды з тваёю злучана душою* (К-с). *І ўсё* ***мілагучна*** *для слыху майго: і звонкае «дзе» і густое «чаго»* (Панч.).

Кароткую форму як агульную норму літаратурнай мовы маюць

прыналежныя прыметнікі ў назоўным і вінавальным склонах пры неадушаўлёных назоўніках: *братаў дыплом, сестрына кніга, жончына паліто, чытаў сынава пісьмо.* У кароткай форме, як правіла, выкарыстоўваюцца прыметнікі, якія маюць значэнне стану: *відзён, чуцён, павінен; відна, чутна, павінна; відно, чутно, павінна; відны, чутны, павінны; рад, рада* (поруч з *рады, радая): Старая ішла па абочыне. Сцежкай пад вербамі. **Радая**, што халадок* (Б.). *Стол устаўлены багата, госцю я сардэчна **рад*** (Бял.).

Ад кароткіх прыметнікаў трэба адрозніваць **сцягнутыя (усечаныя)** формы якасных прыметнікаў, якія з'явіліся ў выніку скарачэння (адсячэння) апошняга склада канчатка поўнай формы; параўн.: *буйныя ветры і буйны ветры: сіняе і сіне: чорныя і чорны, **Буйны** ветры там зложаць песню-быль* (Т.). *Забурліла **сіне** мора* (Куп.). *Спахмурнелі **чорны** бровы* (Куп.). У сказе такія прыметнікі з'яўляюцца азначэннямі. Усечаная (злітая) форма прыметнікаў – жывая з'ява ў народных беларускіх гаворках, яе маюць прыметнікі ўсіх разрадаў (якасныя, адносныя і прыналежныя) у форме жаночага роду адзіночнага ліку назоўна-вінавальнага склону: *дубова дошка, цагляна сцяна, летня ночка, смачну грушу, вясёлу песню, ціху рэчку, чысту ваду.*

### 2.4. Ступені параўнання якасных прыметнікаў

Якасныя прыметнікі маюць ступені параўнання – вышэйшую і найвышэйшую. Утвараюцца дзве формы ступеней параўнання – простая (сінтэтычная) і складаная (аналітычная).

Прыметнікі вышэйшай і найвышэйшай ступеней параўнання маюць у беларускай мове поўную форму, змяняюцца па родах, склонах і ліках.

Прыметнікі **вышэйшай** ступені параўнання абазначаюць прымету, якая ўласціва аднаму прадмету ў большай ці меншай ступені ў параўнанні з іншымі. **Простая форма вышэйшай** ступені параўнання ўтвараецца пры дапамозе суфіксаў *-эйш-, -ейш-, -ш-,* якія далучаюцца да асновы прыметніка, і з'яўляецца поўнай зменнай формай: *мудры – мудрэйшы, светлы – святлейшы (святлейшага, святлейшаму* і г. д.). Суфікс *-ш-* далучаецца да суплетыўнай асновы: *малы – меншы, добры – лепшы, кепскі – горшы, вялікі – большы. Няма на свеце прыгажэйшага і мілейшага краю, чым той, дзе ты нарадзіўся* (Кір.).

Прыметнікі *малодшы, старшы*, утвораныя з дапамогай суфікса -ш-, лексікалізуюцца і трацяць значэнне вышэйшай ступені параўнання. Звычайна яны выступаюць як кампаненты тэрміналагічных спалучэнняў: *малодшы (старшы) навуковы супрацоўнік, малодшы (старшы) лейтэнант.* У рускай мове прыметнікі вышэйшай ступені параўнання – закасцянелая, нязменная форма, якая граматычным складам не адрозніваецца

ад прыслоўяў: *мудрее, мудрей, светлее, светлей, веселей.* Ужыванне ў беларускай літаратурнай мове формаў тыпу *лепей, дужэй, ясней* як прыметнікаў – адхіленне ад літаратурнай нормы; яны сустракаюцца ў вершаваных творах, дзе вымагаюцца рытмікай і рыфмай: ***Лепей** за ўсё мне на свеце мясціна тая, дзе я нарадзіўся і ўзрос (Кір.).*

У беларускай мове ёсць якасныя прыметнікі, якія не ўтвараюць простай формы вышэйшай ступені параўнання. Гэта прыметнікі, якія абазначаюць стан чалавека *(жывы, дарослы, нямы),* колер прадметаў праз адносіны да іншых прадметаў *(бэзавы, вішнёвы, васільковы, ліловы, залацісты),* масць жывёл *(вараны, гняды, буланы),* знешнюю фізічную прымету чалавека *(барадаты, вусаты, кульгавы),* прыметнікі з суфіксамі *-ав-, -іст-, -аўн-, -ат-, -к- (перадавы, сакаўны, шурпаты, ліпкі),* якія першапачаткова былі адноснымі, а зараз або канчаткова перайшлі ў якасныя, або выступаюць і як якасныя, і як адносныя; параўн.: *баявы зарад* і *баявы хлопец; перадавая лінія фронту і перадавая работніца.* Не ўтвараюць ступеней параўнання і якасныя складаныя прыметнікі: *сінявокі, чарнабровы, светла-сіні, бела-чырвоны.*

**Складаная форма вышэйшай** ступені параўнання ўтвараецца спалучэннем прыметнікаў са словамі *больш (болей), менш (меней): больш моцны, больш дужы, менш вясёлы, меней салодкі.* Складаная форма вышэйшай ступені параўнання больш ужывальная, чым простая, бо ўтвараецца практычна ад усіх якасных прыметнікаў.

Складаная форма вышэйшай ступені параўнання прыметнікаў можа выступаць як адзіна магчымая і як паралельная да простай; такія формы найбольш ужывальныя ў пісьмовай мове.

Значэнне вышэйшай ступені якасці ў беларускай мове можа быць выражана з дапамогай словазлучэнняў тыпу «прыметнік вышэйшай ступені параўнання + назоўнік вінавальнага склону з прыназоўнікам *за*»: *мацнейшы за таварыша, святлейшы за сонца. У аднастайны посвіст ветру ўрываліся гукі, мацнейшыя за вецер* (Пестр.); з дапамогай параўнальных зваротаў са злучнікамі *як, чым: Няма прыгажэйшай, як наша Радзіма* (М.Т.). *Рыпнулі дзверы. Пачуліся з сенцаў мяккія і часцейшыя, чым бывала, крокі* (Ян.). *І нараджаецца праўда, яшчэ болей цікавая часамі, чым сама казка* (К-с).

Да формы вышэйшай ступені параўнання могуць далучацца часціцы *яшчэ, куды,* якія маюць узмацняльнае значэнне: *яшчэ дужэйшы, куды смялейшы, яшчэ разумнейшы.*

Прыметнікі **найвышэйшай** ступені параўнання абазначаюць гранічную (самую высокую ці самую нізкую) ступень якасці, уласцівасці прадмета: *Найвялікшае шчасце – жыць для свайго народа.* **Простая форма найвышэйшай** ступені параўнання ўтвараецца пры дапамозе пры-

стаўкі ***най-***, якая далучаецца да простай формы вышэйшай ступені параўнання: *званчэйшы – найзванчэйшы, весялейшы – найвесялейшы. І вось смычок цалуе ціха струны, як быццам праганяе сон апошні, і асцярожна выпытаць спрабуе, дзе песня найзванчэйшая ляжыць* (Бур.). Простая форма найвышэйшай ступені параўнання можа ўтварацца ад прыметнікаў прыставачна-суфіксальным спосабам: *новы – найноўшы, вялікі – найвялікшы.*

**Складаная форма найвышэйшай** ступені параўнання ўтвараецца спалучэннем прыметнікаў са словамі *самы, найбольш, найменш: самы прыгожы, самы шчаслівы, самы старанны, найбольш плённы, найменш зразумелы. Самыя раннія – веснія воды, самыя познія – цені змяркання, самыя лёгкія – шчасныя гады, самыя цяжкія – слёзы расстання, самыя ціхія – сцежкі дубровы, самыя звонкія – родныя гукі, самыя чэрствыя – крыўдныя словы, самыя чулыя – матчыны рукі* (М. Т.). *Ціхае шчасце сціпласці патрэбна нам для найбольш плённага назірання жыцця* (Б.). *А нам жа ты матчынай мовай была, і самай прыгожай, і самаю мілай* (Бач.).

Значэнне найвышэйшай ступені якасці перадаецца і спалучэннямі прыметнікаў з прыслоўямі *вельмі, надта, надзвычай: вельмі руплівы, надта вясёлы, надзвычай здольны.*

Для абазначэння гранічнай (самай высокай ці самай нізкай) ступені якасці прадмета без параўнання з якасцю іншых прадметаў нярэдка выкарыстоўваецца простая форма вышэйшай ступені – форма **элятыва** (ад лац. *elativus* 'узвышаны'): *прыгажэйшы горад Еўропы – Мінск, старажытнейшы горад, цікавейшы раман.* Форма элятыва не характэрная для беларускай літаратурнай мовы, ужыванне яе – парушэнне нормы. Ёй адпавядаюць формы найвышэйшай ступені параўнання: *касцёл у Сар'і самы высокі ў Беларусі; найстаражытнейшы горад; самы цікавы раман.*

## 2.5. Формы прыметнікаў са значэннем ацэнкі і меры якасці

Значэнне высокай меры якасці, яе непаўнаты можа быць выражана і без параўнання – формамі ацэнкі і меры якасці: *завялікі* (касцюм), *велізарны* (горад), *сінявата*e (неба), *бялявы* (хлопчык).

Утвараюцца такія прыметнікі з дапамогай суфіксаў і прыставак. Прыметнікі, утвораныя з дапамогай прыставак ***за-, звыш-, ультра-, архі-***, абазначаюць меру якасці, блізкую да найвышэйшай ступені: *замалады* (хлопец) *– надта малады; завысокі, звыштэрміновы, ультраправы.* Прыстаўкі *ультра-, архі-* надаюць прыметнікам значэнне гранічнай меры якасці (як прыслоўі *надзвычай, празмерна): ультрафіялетавы, архіцяжкі.* Прыстаўка *звыш-* выражае перавышэнне якасці: *звыштэрміновы, звышмагутны.* Прыстаўка *за-* ўтварае формы прыметнікаў са зна-

чэннямі 'такі, які не вельмі перавышае меру якасці' і 'такі, які ў значнай ступені перавышае якасць, названую ўтваральнай асновай': *завялікі* 'велікаваты' і *завялікі* 'надта вялікі'. Для абазначэння невялікага перавышэння якасці да прыметнікаў далучаюцца прыслоўі меры і ступені *крыху (крышку), трохі (трошкі).*

Прыметнікі з прыстаўкамі *ультра-, архі-, звыш-* больш характэрныя для кніжнай мовы, а з прыстаўкай *за-* часцей выкарыстоўваюцца ў гутарковай мове і ў мове мастацкай літаратуры. Прыметнікі з суфіксамі ***-ізн-, -эзн-, -эразн-, -энн-*** маюць павелічальна-ўзмацняльнае значэнне: *вялізны, даўжэзны, таўшчэразны, страшэнны;* з суфіксамі ***-еньк-, -эньк- (-аньк-), -юсеньк-(-юсенечк-), -явеньк-, -ютк-*** выражаюць памяншальна-ласкальнае значэнне: *беленькі, даражэнькі, малюсенькі, малюсенечкі, драбнюткі, чарнявенькі, жаўтаваценькі;* з суфіксамі ***-ав-(-яв-), -ават-(-яват-)*** абазначаюць непаўнату якасці: *белаваты, сіняваты, смуглявы, танклявы.*

Такія прыметнікі маюць значэнне ацэнкі якасці і выражаюць адносіны да яе. Ацэначныя формы прыметнікаў шырока выкарыстоўваюцца ў жывой мове і ў мастацкіх творах: *Дымок танюткі, белаваты павіваецца над хатай* (К-с). *А знізу гэты лес кашлаты меў зелянюсенькія шаты* (К-с).

Значэнне высокай меры якасці можа перадавацца падваеннем прыметніка: *светлы-светлы, добры-добры, высокі-высокі. Снег дасвеццем перапаў рана-рана, і ляжыць ён на дварах, на парканах...* ***чысты-чысты*** (Гіл.). ***Цёмная-цёмная*** *вада... Шуміць Вілія* (Пташ.).

### 2.6. Утварэнне прыметнікаў

Прыметнік як самастойная (знамянальная) часціна мовы мае сваю спецыфічную сістэму словаўтварэння. Утваральнай базай для прыметнікаў служаць розныя часціны мовы. Найбольш часта прыметнікі ўтвараюцца ад назоўнікаў і дзеясловаў, значна радзей – ад лічэбнікаў, займеннікаў, прыметнікаў і прыслоўяў.

Прыметнікі ўтвараюцца наступнымі спосабамі: суфіксальным, прыставачным, прыставачна-суфіксальным (канфіксальным), бязафіксным, складаннем асноў, складана-суфіксальным, шляхам зрашчэння слоў і ад'ектывацыі. Самымі прадуктыўнымі пры ўтварэнні прыметнікаў з'яўляюцца суфіксальны і складана-суфіксальны спосабы.

**Суфіксальным** спосабам у беларускай мове ўтвараюцца прыметнікі ўсіх трох разрадаў – якасныя, адносныя і прыналежныя. Пры дапамозе суфіксаў ***-оў(-ёў), -аў(-еў), -ын(-ін)*** утвараюцца ўласнапрыналежныя прыметнікі ад асабовых агульных і ўласных назоўнікаў мужчынскага і жаночага роду: *бацькаў наказ, старшынёў партфель, Алесеў сшытак; матчын спеў, Аленін дзённік. Калі пярун штось хмары гуў, а тая ішла-*

*плыла нястрымная, густая і косы дажджавыя расплятала, і з матчынай пяшчотаю шаптала: «Шумі ліствой, зялёны мой клянок!»* (Панч.).

З дапамогай суфікса ***-ын(-ін)*** утвараюцца агульнапрыналежныя прыметнікі ад назоўнікаў: *гусіны, курыны, салаўіны. Ты не чуеш, як падаюць росы патокам, як гарлачыкам трызніцца новы дзень, як нячутнымі, як салаўінымі крокамі над вялікай ракою каханне ідзе* (Каратк.). Агульнапрыналежныя прыметнікі ўтвараюцца і з дапамогай суфіксаў ***-ач-(-яч-), -эч-***: *дзіцячы смех, старэчы ўздых,* а таксама з дапамогай нулявога суфікса (з чаргаваннем *дз : дж, к : ч* у аснове): *мядзведзь – мядзведжы, чалавек – чалавечы, стары – старэчы, воўк – воўчы.*

Якасныя прыметнікі ўтвараюцца пры дапамозе прадуктыўных суфіксаў:

***-лів-*** – ад дзеясловаў і назоўнікаў: *руплівы, бурлівы, зычлівы, дажджлівы, тамлівы, шчымлівы, ліслівы. Міканор прыглядаўся да каранёўскіх дзяўчат... з тамлівым прадчуваннем нязнанага шчасця* (І. М.).

***-н-*** – ад назоўнікаў, дзеясловаў і прыслоўяў: *азёрны, гарэзны, дзівосны, чароўны, лясны, росны. У азёрнай старонцы маёй ёсць чатыры музыкі, у якіх так пявуча іграюць смыкі, што аж рэха грыміць над зямлёй* (М.Т.). *Шуміць, шуміць чароўны спеў зялёным верхавіннем дрэў* (Бр.). *І сабрала неба фарбы колераў дзівосных* (К-с);

***-іст-(-ыст-)*** – ад назоўнікаў, дзеясловаў, прыметнікаў і лічэбнікаў: *валакністы, іскрысты, задзірысты, дваісты, шаўкавісты. І назаве яе [песню] сваёю залівістая старана* (Е.Л.);

***-аст-*** – ад назоўнікаў і дзеясловаў: *галаваcты, зубасты, блішчасты;*

***-ат-*** – ад назоўнікаў: *вусаты, рагаты;*

***-еват-*** – ад назоўнікаў: *сукаваты, дуплаваты;*

***-ов-(-ав-)*** – ад назоўнікаў: *тыповы, ласкавы;*

***-ів-*** – ад назоўнікаў: *літасцівы, праўдзівы. Літасцівы мой лёсе, падары мне вясну і даспелую восень* (Грах.);

***-авіт-*** – ад назоўнікаў: *працавіты;*

***-к-*** – ад назоўнікаў і дзеясловаў: *звонкі, цяжкі, гаваркі, коўзкі, зыбкі. Пад лёгкім ветрам гойдаліся цяжкія каласы ярыны* (У.К.).

Адносныя прыметнікі ўтвараюцца пры дапамозе наступных суфіксаў:

***-ов-(-ёв-),-ев-, -ав-(-яв-)*** – ад назоўнікаў: *зімовы, ясянёвы, векавы;*

***-льн-, -ільн-(-ыльн-), -альн-(-яльн-)*** – ад дзеясловаў і назоўнікаў: *купальны, асушальны, развітальны, паказальны, дубільны, сушыльны, геніяльны. Калі б ад тваіх развітальных крокаў і слоў аддзяліць цішыню, што ўварвалася ў хату... яшчэ можна было б жыць* (М.Т.);

***-ан-(-ян-), -ск-*** – ад назоўнікаў: *бульбяны, сельскі, людскі, палескі;*

***-оўн-(-аўн-), -оўск-(-еўск-)*** – ад назоўнікаў: *духоўны, сакаўны, бацькоўскі.*

Невялікая колькасць прыметнікаў утварылася ад дзеясловаў нульсуфіксальным спосабам: *хварэць – хворы, любіць – любы, праязджаць – праезджы;* ад назоўнікаў: *золата – залаты;* ад лічэбнікаў: *адзін – адзіны.*

**Прыставачнае** ўтварэнне прыметнікаў значна менш пашыранае. У пераважнай большасці прыметнікі з дапамогай прыставак утвараюцца ад іншых прыметнікаў. Словаўтваральных прыставак невялікая колькасць. Гэта – ***да-***: *даваенны, дашкольны, дапрызыўны;* ***за-***: *залеташні;* ***су-***: *сугліністы, сугучны, суадносны;* ***перад-, звыш-, над-; анты-, ультра-***: *перадапошні, перадназіскны, надзвычайны, звышмагутны, антымастацкі, ультракароткі.*

Пры ўтварэнні прыметнікаў актыўную ролю адыгрываюць прыстаўкі ***не-(ня-)*** і ***без-(бяс-)***, якія надаюць прыметнікам значэнне супрацьлегласці: *немалы, нячулы, бясспрэчны.*

У сучаснай беларускай мове пашыранае **прыставачна-суфіксальнае (канфіксальнае)** утварэнне прыметнікаў. Утваральнай базай выступаюць формы ўскосных склонаў назоўнікаў з прыназоўнікамі, а таксама дзеясловы з часціцай ***не***: *бязмежны, незагойны.* Пры канфіксальным утварэнні прыметнікаў другім кампанентам словаўтваральнага фарманта выступаюць суфіксы ***-н-, -льн; -шн-, -ов-(-ав-), -ск-(-цк-), -аўск-***. Да дзеслоўнай асновы далучаецца толькі фармант *«не + н»: неаслабная (увага), нязломная (воля).* Да назоўнікавай асновы могуць далучацца розныя з названых суфіксаў пры аднолькавых ці розных прыстаўках: *наднёманскі, прыдняпроўскі, заморскі, унутрыінстытуцкі, перадсвітальны.* Толькі невялікая колькасць прыметнікаў утворана прыставачна-нульсуфіксальным спосабам. Утваральнай базай у такіх прыметніках выступаюць назоўнікі: *бязвусы, бяскрылы, бязлісты.*

Складаныя прыметнікі ўтвараюцца трыма спосабамі: **складаннем** (аб'яднаннем дзвюх ці трох асноў), сродкам аб'яднання выступае інтэрфікс: *крыштальна-сярэбраны, залаціста-фіялетавы, чароўна-летуценны, усхвалявана-тонкі, стоена-мудры, самотна-зялёны, чырвона-ірдзісты, гожа-ціхі. На міг я адкрыю сабе, што замала пражыта ў самотна-зялёным кутку, што часта губляла, калі вандравала без мэты, вось гэты лясок і раку* (Янішч.). *Бярозкі ствол усхвалявана-тонкі. Над берагам зялёны явар звонкі і моцныя, спрадвечныя дубы* (Каратк.); **складана-суфіксальным** спосабам: *шматгадовы, пяцітонны;* **зрашчэннем** кампанентаў словазлучэння ў адно слова: *вечназялёны, дабраякасны.* Прыметнікі-зрашчэнні найчасцей складаюцца з прыслоўя і прыметніка (дзеепрыметніка): *глыбокапаважаны, высокаідэйны, свежапафарбаваны.*

Прыметнікі могуць утварацца **марфалагічна-сінтаксічным** спосабам – шляхам ад'ектывацыі. У такім выпадку дзеепрыметнікі трацяць дзеяслоўныя катэгорыі, а лексічнае значэнне прыметы прадмета па дзеянні набывае сталы (пастаянны) характар: *кіпучае жыццё, гаючая вада, бегучы дзень, плакучая вярба.*

### 3. Пытанні да асноўнага тэарэтычнага матэрыялу

1. Што кладзецца ў аснову вылучэння прыметніка ў самастойную часціну мовы?
2. Ахарактарызуйце граматычныя катэгорыі прыметніка.
3. Якія лексіка-граматычныя разрады прыметнікаў ведаеце?
4. Назавіце дзве формы прыметнікаў. Якія формы называюцца сцягнутымі (злітымі)?
5. Назавіце формы ступеней параўнання. Як яны ўтвараюцца?
6. Якія асаблівасці канчаткаў прыметнікаў? Як скланяюцца прыналежныя прыметнікі?
7. Якія існуюць спосабы выражэння значэння высокай меры і ступені якасці?
8. Назавіце прадуктыўныя спосабы ўтварэння прыметнікаў.

## 4. Матэрыялы да практычных аўдыторных і самастойных заняткаў

### 4.1. Схема блок-сістэмы практычных заняткаў

| № | Тэма практычных заняткаў | Колькасць гадзін |
|---|---|---|
| 1. | Прыметнік як часціна мовы. Значэнне, марфалагічныя прыметы, сінтаксічная роля. Залежнасць роду, ліку, склону прыметнікаў ад назоўнікаў. Поўныя, кароткія, сцягнутыя формы прыметнікаў у сучаснай беларускай мове. Іх ужыванне і сінтаксічная функцыя. | 2 |
| 2. | Лексіка-граматычныя разрады прыметнікаў: якасныя, адносныя, прыналежныя. Ужыванне прыметнікаў аднаго разраду са значэннем іншага. | 2 |
| 3. | Ступені параўнання якасных прыметнікаў. Элятыў. Формы прыметнікаў са значэннем ацэнкі і меры якасці. Поўныя і кароткія формы якасных прыметнікаў. Скланенне прыметнікаў. | 2 |
| 4. | Скланенне прыметнікаў. Утварэнне прыметнікаў: суфіксальны, прэфіксальны, прэфіксальна-суфіксальны спосабы, складанне асноў, зрашчэнне, ад'ектывацыя. | 2 |

### 4.2. Практыкаванні для засваення тэарэтычных ведаў па модулі

На занятках 1 выконваюцца практыкаванні 348-350, 352, 353.
На занятках 2 выконваюцца практыкаванні 351, 354-358.

На занятках 3 выконваюцца практыкаванні 359-370.
На занятках 4 выконваюцца практыкаванні 371-383.

## 5. Дадатковая літаратура па модулі


1. Багамолава А.М. Дэрывацыя і функцыя экспрэсіўных прыметнікаў у мове народна-паэтычных твораў: манаграфія / А.М.Пісарэнка. – Мінск: БелСаЭС "Чарнобыль", 2005.
2. Булахаў М.Г. Прыметнік у беларускай мове / АН БССР. Ін-т мовазнаўства імя Я. Коласа. – Мн.: Навука і тэхніка, 1964.
3. Гнеўка В.Т. Складаныя прыметнікі ў сучаснай беларускай літаратурнай мове. – Мн.: Выд. М-ва выш. сярэд. спец. і праф. адукацыі БССР, 1963.

МОДУЛЬ 10
# «ЛІЧЭБНІК»

## 1. Схема блок-сістэмы вывучэння тэарэтычнага матэрыялу

| № | Тэма лекцыйных заняткаў | Колькасць гадзін |
|---|---|---|
| 1. | Лічэбнік як часціна мовы. Разрады лічэбнікаў паводле значэння. Разрады лічэбнікаў паводле структуры. | 2 |
| 2. | Асаблівасці сінтаксічнай сувязі лічэбнікаў з назоўнікамі. Скланенне колькасных і парадкавых лічэбнікаў. Няпэўна-колькасныя словы. | 2 |

## 2. Асновы навукова-тэарэтычных ведаў па модулі

**Слоўнік паняццяў для засваення**: лічэбнік, уласнаколькасныя лічэбнікі, простыя лічэбнікі, складаныя лічэбнікі, састаўныя лічэбнікі, зборныя лічэбнікі, дробавыя лічэбнікі, парадкавыя лічэбнікі.

Пры напісанні раздзела быў выкарыстаны матэрыял вучэбнага дапаможніка «Сучасная беларуская літаратурная мова: Марфалогія: Вучэб. дапам. / Н.В. Гаўрош, М.Ц. Кавалёва, Н.М. Нямковіч і інш.; Пад агульн. рэд. праф. М.С. Яўневіча. – Мн.: выд. Ул.М. Скарун, 1997. – 288 с.»

### 2.1. Лічэбнік як часціна мовы. Разрады лічэбнікаў

Лічэбнік – гэта часціна мовы, якая абазначае адцягненыя лікі, колькасць аднародных прадметаў або паказвае на парадкавы нумар прадметаў пры іх лічэнні.

Лічэбнік як самастойная часціна мовы мае ўласцівыя ёй марфалагічныя прыметы і сінтаксічныя асаблівасці. Лічэбнікі (за выключэннем *дзевяноста, паўтара, паўтары*) скланяюцца; большасць лічэбнікаў, што абазначаюць колькасць прадметаў, не маюць катэгорыі роду, амаль усе лічэбнікі пазбаўлены формаў ліку; пры спалучэнні лічэбніка з назоўнікам утвараецца сінтаксічна непадзельнае словазлучэнне, якое выступае як адзін член сказа: *У возера Байкал упадае* ***трыста трыццаць шэсць рэчак*** (дзейнік). Лічэбнікі не маюць пры сабе прыметніка-азначэння.

Ад лічэбнікаў трэба адрозніваць назоўнікі з лікавым значэннем тыпу *тройка, пяцёрка, сотня, дзесятак*: *У школьнай зале вучняў было дзесяткі два* (К-с). Хоць такія словы і выражаюць назву колькасці, аднак яны не ўваходзяць у сістэму лічэння; асноўным у іх выступае значэнне прадметнасці. Гэтыя назоўнікі маюць родавыя адрозненні: *тая пяцёрка, той дзесятак*; змяняюцца па ліках, могуць спалучацца з лічэбнікамі: *адна сямёрка, тры сямёркі*; могуць мець пры сабе азначэнне: *гэтыя*

*тройкі, першы дзесятак*; ад іх не ўтвараюцца парадкавыя лічэбнікі.

Паводле значэння, граматычных уласцівасцей і характару ўжывання лічэбнікі падзяляюцца на колькасныя: *пяць, дваццаць, сто сорак чатыры* і парадкавыя: *пяты, дваццаты, сто сорак чацвёрты*.

Сярод колькасных лічэбнікаў вылучаюцца ўласна-колькасныя, зборныя і дробавыя.

### 2.1.1. Уласнаколькасныя лічэбнікі

Уласнаколькасныя лічэбнікі абазначаюць пэўную колькасць аднародных прадметаў: *сем чалавек, восем кніг, пяцьсот рублёў*, а таксама адцягнены лік: *Пятнаццаць дзеліцца на пяць*. Гэтыя лічэбнікі складаюць нешматлікую лексічную групу (іх усяго 39 са словамі *тысяча, мільён, мільярд*), аднак рознымі іх спалучэннямі можна абазначаць любыя колькасныя паняцці і самыя вялікія лікі.

Паводле марфалагічнага складу сярод уласнаколькасных лічэбнікаў адрозніваюцца простыя, складаныя і састаўныя. Да **простых** адносяцца лічэбнікі з адным коранем: *адзін, два – дзесяць, сто, тысяча*; ад іх утварыліся ўсе іншыя лічэбнікі. Да **складаных** адносяцца вытворныя лічэбнікі, у якіх зліліся два словы: *пяцьдзесят, дзвесце, дзевяцьсот*. Так, складаныя лічэбнікі *пяцьдзесят – восемдзесят* утварыліся ў выніку зліцця слоў *пяць, шэсць* і г. д. з формай *-дзесят* (былы родны склон множнага ліку лічэбніка *дзесяць*). Лічэбнікі *адзінаццаць – дзевятнаццаць*, якія ўтварыліся шляхам зліцця слоў *адзін, два – дзевяць* з *на десяте* (*десяте* – былая форма меснага склону слова дзесяць): *один+на+десяте – адзінаццаць*, а таксама *дваццаць, трыццаць* у некаторых дапаможніках цяпер разглядаюцца як простыя (Граматыка, 2007, с. 277).

**Састаўнымі** называюцца лічэбнікі, якія складаюцца з некалькіх асобных слоў: *семдзесят дзевяць, сто восемдзесят чатыры.*

Уласнаколькасныя лічэбнікі па марфалагічных прыметах неаднастайныя. Абсалютная большасць лічэбнікаў гэтай групы (*тры, чатыры* – да *дзевяцісот*) не мае катэгорыі роду; усе яны (за выключэннем *адзін*) не змяняюцца па ліках.

Марфалагічнымі прыметамі выдзяляюцца лічэбнікі *адзін, два, тысяча, мільён, мільярд.*

Лічэбнік *адзін* мае родавыя адрозненні: *адзін чамадан, адна брыгада, адно заданне* і формы адзіночнага і множнага ліку: *адзін гектар, адны вароты*. Слова *адзін* выступае лічэбнікам у форме адзіночнага ліку, калі паказвае на адзінкавы прадмет: *адзін дзень, адзін кілаграм*. Слова *адны* выступае як лічэбнік, калі ўжыта з назоўнікамі, што маюць форму толькі множнага ліку і абазначаюць прадметы, якія можна лічыць: *адны вароты, адны граблі, адны абцугі, адны сані*.

Лічэбнік *два* таксама мае родавыя формы: *два* – для мужчынскага і

ніякага роду: *два дубы, два акны*; *дзве* – для жаночага роду: *дзве кнігі, дзве бярозы*.

Словы *тысяча, мільён, мільярд* выражаюць колькасныя паняцці і ўжываюцца пры лічэнні прадметаў: *тысяча кветак, мільён пудоў*; уваходзяць у склад састаўных лічэбнікаў: *дваццаць тры тысячы пяцьсот сорак шэсць*; ад іх утвараюцца парадкавыя лічэбнікі: *тысячны, мільённы*. Гэтыя прыметы даюць падставу адносіць гэтыя словы да лічэбнікаў.

Словы *тысяча, мільён, мільярд* маюць катэгорыю роду: *тысяча* – жаночы род, *мільён, мільярд* – мужчынскі род; змяняюцца па ліках: *тысяча – тысячы, мільён – мільёны*; могуць мець пры сабе азначэнне, якое дапасуецца ў родзе, ліку і склоне: *уся тысяча кніг, той мільён сшыткаў*; *усёй тысячы кніг, таго мільёна сшыткаў*; могуць ужывацца з лічэбнікамі: *дзесяць тысяч, сто мільёнаў*. Адзначаныя граматычныя прыметы набліжаюць словы *тысяча, мільён, мільярд* да назоўнікаў кшталту *дзесятка, сотня*.

### 2.1.2. Зборныя лічэбнікі

Зборныя лічэбнікі абазначаюць пэўную колькасць прадметаў як сукупнасць, як адно цэлае: *двое, трое, чацвёра*. Утвараюцца яны ад колькасных лічэбнікаў пры дапамозе суфіксаў *-ој-*: *двое (двој-э), трое (тројэ)*; *-ёр-, -ер-: пяцёра, дзевяцера*.

Зборныя лічэбнікі, якія ўтвораны ад слоў *два, тры – дзесяць*, ужываюцца часта. *Перад асабняком на вуліцы стаяла двое саней* (Гал.). Зборныя лічэбнікі, утвораных ад лічэбнікаў *адзінаццаць, дванаццаць* і іншых, у сучаснай беларускай мове сустракаюцца зусім рэдка: *Дванаццацера дзяцей было* (Кул.).

Зборныя лічэбнікі абазначаюць тую самую колькасць, што і лічэбнікі, ад якіх яны ўтварыліся, аднак адрозніваюцца ад іх тым, што ўжываюцца ў спалучэнні толькі з пэўнымі назоўнікамі.

Са зборнымі лічэбнікамі ўжываюцца назоўнікі: 1) якія маюць форму толькі множнага ліку ці абазначаюць назвы парных прадметаў: *двое сутак, трое варот, чацвёра саней, пяцёра лыжаў*; 2) якія абазначаюць назвы маладых істот: *двое кацянят, трое жарабят, шасцёра парасят*; 3) якія абазначаюць асоб мужчынскага полу: *двое мужчын, трое салдат, пяцёра вучняў*; параўн.: *два мужчыны, тры салдаты, пяць вучняў*. Зборныя лічэбнікі ўжываюцца і з некаторымі іншымі назоўнікамі: *людзі, дзеці, гусі, коні, свінні* і г. д.

Да зборных адносяцца таксама лічэбнікі *абодва* (мужчынскага і ніякага роду), *абедзве* (жаночага роду): *Спыніўшыся на беразе, Андрэй паўкідаў **абодва** кавалкі ў ваду* (К-с). *Агульнае гора і надзеі вельмі здружылі **абедзвюх** жанчын за апошні год* (І.М.). Словы *абодва, абедзве* захоўваюць родавыя адрозненні ва ўсіх склонах. Калі гутарка ідзе пра асоб

і мужчынскага і жаночага полу, тады ўжываецца зборны лічэбнік *абое*: *Сымон бярэ яе за руку, і* ***абое*** *нікнуць у цемнаце* (Куп.).

### 2.1.3. Дробавыя лічэбнікі

Дробавыя лічэбнікі абазначаюць дробавыя велічыні – або толькі часткі ад цэлага: *тры пятыя, шэсць восьмых*, або цэлае і часткі яго: *пяць цэлых сем дзесятых, дванаццаць цэлых чатыры сотыя, восем і адна сотая*. Шляхам розных спалучэнняў можна ўтварыць вялікую колькасць дробавых лічэбнікаў, якія абазначаюць самыя разнастайныя велічыні.

Дробавыя лічэбнікі ўтвараюцца з колькаснага лічэбніка (у лічніку) і парадкавага лічэбніка (у назоўніку); назоўнік пры іх ужываецца ў родным склоне: *пяць шостых тоны, восем сотых гектара*.

Сярод дробавых лічэбнікаў асобна стаяць словы *паўтара, паўтары*. Слова *паўтара* ўжываецца з назоўнікамі мужчынскага і ніякага роду, *паўтары* – з назоўнікамі жаночага роду: *паўтара грама, паўтара вядра, паўтары тоны*.

Дробавыя лічэбнікі звычайна ўжываюцца ў афіцыйна-дзелавым і навуковым стылях мовы, асабліва часта – у матэматычных працах.

## 2.2. Сінтаксічная сувязь лічэбнікаў з назоўнікамі

Лічэбнікі сінтаксічна звязаны з назоўнікамі і разам з імі ўтвараюць колькасна-іменныя спалучэнні, якія ў сказе выступаюць як адзін член сказа і могуць быць дзейнікам: ***Два чаўны*** *вынырнулі з цемры адначасова* (Шам.); дапаўненнем: *Міхаська прынёс* ***тры слівы****, Сцёпка –* ***пяць вішань*** *малых...* (Аст.); акалічнасцю: ***Тры дні*** *стаіць яго плыт на адным месцы* (К-с).

Лічэбнік можа стаяць пасля назоўніка, у такім выпадку абазначаецца не дакладная, а толькі прыблізная колькасць прадметаў: *Праз* ***дні два*** *ён дабярэцца дадому* (К.Ч.).

Сувязь лічэбнікаў з назоўнікамі ў назоўным і ва ўскосных склонах мае пэўныя асаблівасці. Лічэбнік *адзін (адна, адно, адны)* дапасуецца да назоўніка ў родзе, ліку і склоне: Н. *адзін дуб, адна сасна, адно дрэва, адны сані*; Р. *аднаго дуба, адной сасны, аднаго дрэва, адных саней* і г. д.

Пры лічэбніках *два (дзве), абодва (абедзве), тры, чатыры* назоўнік ужываецца ў форме назоўнага склону множнага ліку: *два алоўкі, дзве брыгады, тры клёны, чатыры гарады*. Усе астатнія лічэбнікі (*пяць, шэсць* і г. д.), за выключэннем састаўных, якія заканчваюцца лічэбнікамі *адзін, два, тры, чатыры*, патрабуюць назоўнікаў у форме роднага склону множнага ліку: *пяць алоўкаў, шэсць брыгад, дваццаць клёнаў, сорак гарадоў*.

Такім чынам, у форме назоўнага склону лічэбнікі *адзін – чатыры* дапасуюцца да назоўнікаў, а лічэбнікі *пяць, шэсць* і вышэй кіруюць

назоўнікамі. Ва ўскосных склонах, за выключэннем вінавальнага, усе лічэбнікі дапасуюцца да назоўнікаў: Р. *двух рублёў, пяці сталоў*; Д. *двум рублям, пяці сталам* і г. д. Лічэбнікі *адзін – чатыры* дапасуюцца і ў вінавальным склоне.

Дробавыя лічэбнікі патрабуюць пасля сябе назоўніка роднага склону: *тры шостыя насельніцтва, адна пятая плошчы, дзве трэція ўраджаю.*

## 2.3. Скланенне ўласнаколькасных, зборных і дробавых лічэбнікаў

У скланенні ўласнаколькасных, зборных і дробавых лічэбнікаў назіраецца вялікая разнастайнасць: адны з іх маюць свае асаблівасці скланення; другія змяняюцца, як назоўнікі; трэція – як прыметнікі; некаторыя скланяюцца, як займеннікі; асобныя (*дзевяноста, паўтара*) ва ўсіх склонах маюць аднолькавую форму.

Лічэбнікі *адзін, адна, адно* скланяюцца, як прыметнікі.

| | | | |
|---|---|---|---|
| Н. | *адзін адно адна* | В. | як Н. або Р. *адну* |
| Р. | *аднаго адной(-ае)* | Т. | *адным адной(-ою)* |
| Д. | *аднаму адной* | М. | *(пры) адным адной* |

Лічэбнікі *адзін, адно* захоўваюць родавыя адрозненні толькі ў назоўным склоне і страчваюць іх у астатніх склонах. Слова *адна* ў родным і творным склонах мае два варыянты канчаткаў.

Лічэбнік *адны* скланяецца, як прыметнік у форме множнага ліку: *адных, адным, аднымі.*

Уласнаколькасныя лічэбнікі *два, дзве* і зборныя *абодва, абедзве* ахоўваюць родавыя адрозненні ва ўсіх склонах: *два, абодва* (з цвёрдай асновай) – мужчынскага і ніякага роду, *дзве, абедзве* (з мяккай асновай) – жаночага роду.

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| Н. | два | абодва | дзве | абедзве |
| Р. | двух | абодвух | дзвюх | абедзвюх |
| Д. | двум | абодвум | дзвюм | абедзвюм |
| В. | як Н. | або Р. | | |
| Т. | двума | абодвума | дзвюма | абедзвюма |
| М. | (пры) двух | абодвух | дзвюх | абедзвюх |

Лічэбнікі *тры, чатыры* ў творным склоне захавалі форму парнага ліку на *-ма: трыма, чатырма.*

Лічэбнікі *пяць – дзесяць, адзінаццаць – дваццаць, трыццаць* скланяюцца, як назоўнікі 3-га скланення тыпу *косць, радасць*: *пяці, сямі, шаснаццаці; пяццю, сямю, шаснаццаццю.* У форме творнага склону гэтых лічэбнікаў гук [ц] у інтэрвакальным становішчы падаўжаецца: *дзесяццю, дванаццаццю*; але: *шасцю.*

У лічэбніках *адзінаццаць – дзевятнаццаць* ва ўсіх склонах націск

прыпадае на склад *-на-*.

Лічэбнікі *сорак, сто* пры скланенні маюць толькі дзве формы: для назоўнага і вінавальнага – *сорак, сто*, для астатніх – *сарака, ста*. Лічэбнік *дзевяноста* зусім страціў склонавыя формы. На склон гэтых лічэбнікаў паказвае назоўнік, з якім яны спалучаюцца: *О зямля! Ты ўся ў абновах! Ты ў мільён званочкаў звоніш, ты* ***на ста пявучых мовах*** *весняй радасцю гамоніш* (Гіл.).

У лічэбніках *пяцьдзесят, шэсцьдзесят, семдзесят, восемдзесят* пры скланенні змяняюцца абедзве часткі. Ва ўскосных склонах (за выключэннем вінавальнага) гэтыя лічэбнікі маюць адзін націск – на канчатку першай часткі слова: *пяцідзесяці, сямідзесяці; пяццюдзесяццю, сямюдзесяццю*.

У складаных лічэбніках тыпу *дзвесце – дзевяцьсот* таксама змяняюцца абедзве часткі; другая частка гэтых лічэбнікаў ва ўскосных склонах мае чатыры формы (*васьмісот, васьмістам, васьмюстамі, у васьмістах*). Лічэбнік *дзвесце* захоўвае форму жаночага роду абедзвюх частак толькі ў назоўным і вінавальным склонах, у астатніх – прымае форму мужчынскага роду: *двухсот, двумстам, двумастамі*.

Лічэбнік *тысяча* скланяецца, як назоўнікі 1-га скланення кшталту *задача*; *мільён, мільярд* – як назоўнікі 2-га скланення кшталту *завод*. У творным склоне лічэбнік *тысяча* ўжываецца ў дзвюх формах: *тысячай* і *тысяччу*.

Зборныя лічэбнікі *двое, трое, пяцёра* і інш. скланяюцца, як займеннікі *твае, свае: дваіх, траіх, пяцярых; дваім, траім, пяцярым* і г. д.

У дробавых лічэбніках асобна скланяюцца лічнік і назоўнік: *адна шостая, тры і пяць дзесятых; адной шостай, трох і пяці дзесятых; адной шостай, тром і пяці дзесятым* і г. д.

Лічэбнікі *паўтара* ў спалучэнні з назоўнікамі мужчынскага і ніякага роду і *паўтары* з назоўнікамі жаночага роду ва ўсіх склонах маюць аднолькавую форму – *паўтара, паўтары* і захоўваюць родавыя адрозненні.

| | | |
|---|---|---|
| Н. | *паўтара (кілаграма, вядра)* | *паўтары (тоны)* |
| Р. | *паўтара (кілаграма, вядра кілаграмаў, вёдраў)* | *паўтары (тоны, тон)* |
| Д. | *паўтара (кілаграмам, вёдрам)* | *паўтары (тонам)* |
| В. | *паўтара (кілаграма, вядра)* | *паўтары (тоны)* |
| Т. | *паўтара (кілаграмамі, вёдрамі)* | *паўтары (тонамі)* |
| М. | *(у) паўтара (кілаграмах, вёдрах)* | *паўтары (тонах)* |

Пры лічэбніках *паўтара, паўтары* назоўнік ужываецца ў адзіночным ліку, а ва ўскосных склонах (за выключэннем вінавальнага) прымае форму множнага ліку; у родным склоне ўжываюцца абедзве формы –

адзіночнага і множнага ліку.

Пры скланенні састаўных лічэбнікаў змяняюцца ўсе словы, якія ўваходзяць у склад гэтых лічэбнікаў

### 2.4. Парадкавыя лічэбнікі, іх утварэнне і скланенне

Парадкавыя лічэбнікі паказваюць на парадкавы нумар прадметаў пры іх лічэнні: *шостае пытанне, дзевятая кніга, пятнаццаты дзень*.

Парадкавыя лічэбнікі – словы вытворныя ад колькасных лічэбнікаў: *тры – трэці, восем – восьмы, тысяча – тысячны, сто трыццаць – сто трыццаты*.

Некаторыя лічэбнікі маюць суплетыўныя асновы: *адзін – першы, два – другі*. Пры ўтварэнні парадкавых лічэбнікаў ад састаўных ўласна-колькасных змяняецца толькі апошняе слова спалучэння: *дзвесце дваццаць шэсць – дзвесце дваццаць шосты, тысяча трыццаць чатыры – тысяча трыццаць чацвёрты*.

Характэрнай рысай парадкавых лічэбнікаў з'яўляецца тое, што яны маюць такія ж марфалагічныя асаблівасці, як і прыметнікі. На гэтай падставе некаторыя мовазнаўцы разглядаюць словы кшталту *другі, пяты* як разнавіднасць прыметнікаў. Хоць парадкавыя лічэбнікі па граматычных прыметах і сінтаксічнай ролі і падобныя да прыметнікаў (дапасуюцца да назоўнікаў у родзе, ліку, склоне, выступаюць у сказе азначэннямі), аднак яны адрозніваюцца ад прыметнікаў: парадкавыя лічэбнікі абазначаюць не якасць ці ўласцівасць прадмета, а яго парадкавы нумар; яны захоўваюць лікавае значэнне; суадносяцца асновамі з уласнаколькаснымі лічэбнікамі. Акрамя таго, структура састаўных парадкавых лічэбнікаў адрозніваецца ад структуры прыметнікаў.

Парадкавыя лічэбнікі скланяюцца так, як прыметнікі. У састаўных парадкавых лічэбніках пры скланенні змяняецца толькі апошняе слова: *дзевяцьсот трыццаць чацверты, дзевяцьсот трыццаць чацвёртага, дзевяцьсот трыццаць чацвёртаму* і г. д. У лічэбніках, якія заканчваюцца асновамі *-тысячны, -мільённы, -мільярдны*, таксама змяняецца толькі апошняя частка: *чатырохсоттысячны, чатырохсоттысячнага, чатырохсоттысячнаму* і г. д.

### 2.5. Пераход лічэбнікаў у іншыя часціны мовы

Некаторыя лічэбнікі могуць пераходзіць у іншыя часціны мовы. У такім выпадку яны страчваюць колькаснае значэнне, набываюць значэнне адпаведнай часціны мовы і выконваюць яе сінтаксічную ролю ў сказе.

Лічэбнік *адзін (адна, адно, адны)* часта набывае значэнне займенніка: *Прыгадваецца надпіс у **адной** сталоўцы...* (Шам.); часціцы: *Ужо снедаць час, і поўдзень скора, ды з гэтым бацькам **адно** гора!* (К-с); прыметніка: *Зімою і летам **адным** цветам* (Пр.); *Усё ж мы людзі **аднае** прафе-*

*сіі і ў аднолькавым становішчы знаходзімся* (Крап.) (са значэннем 'аднолькавай'); прыслоўя: *Лясніцкі ішоў дахаты адзін* (Зарэц.).

Лічэбнікі *адзін, другі, першы* ў спалучэнні са словам *раз* могуць ужывацца ў ролі прыслоўяў са значэннем 'аднойчы, калі-небудзь, упершыню': *Хадзіў ці доўга ён, ці мала, ды толькі нешта адзін раз бяда ў бары яго спаткала* («Тарас на Парнасе»). *А тыя два – блазнота, яны ўжо не першы раз уцякаюць* (Б.).

Слова *другі (другая, другое)* часта ўжываецца як займеннік: *Палессе засталося дзесь ззаду. Другая краіна, другія малюнкі* (К-с); параўн.: *Іншая краіна, іншыя малюнкі.*

**2.6. Няпэўна-колькасныя словы**

Для абазначэння няпэўнай, недыферэнцыраванай колькасці ўжываюцца няпэўна-колькасныя словы: *многа (нямнога), мала (нямала), трохі, шмат, столькі, гэтулькі, колькі, некалькі*. Гэтыя словы хоць і выражаюць колькасныя паняцці, аднак не маюць значэння ліку.

Няпэўна-колькасныя словы могуць спалучацца з назоўнікамі, якія абазначаюць рэчыўныя прадметы і адцягненыя паняцці: *многа цукру, нямала мёду, шмат пілавіння, мала ўвагі, трохі клопату, столькі радасці, гэтулькі хваляванняў.* Словы *многа (нямнога), мала (нямала), трохі, шмат*, як і прыслоўі, не скланяюцца, могуць ужывацца пры дзеясловах, паказваючы ступень і меру праяўлення дзеяння. *Хто многа зазнаў, той многа пазнаў* (Пр.). *Міхал з Антосем сваю душу дарогай цешылі нямала* (К-с). Апрача гэтага, словы *многа, мала,* як і прыслоўі, маюць ступені параўнання: *многа – больш, мала – менш*; могуць паўтарацца ў сказе.

Словы *некалькі, столькі, гэтулькі, колькі* паказваюць на няпэўную колькасць, як займеннікі: *Іншы [салавей] гэтулькі кален выкіне, што і не злічыць* (Лупс). *Купляй, заплюшчыўшы хоць вочы, ды колькі грошай ён захоча?* (К-с). Слова *колькі*, як займеннік, можа выконваць у сказе ролю злучальнага слова: *Колькі гадоў таму дубу, ніхто не ведае* (Пальч.). Гэтыя словы скланяюцца, як прыметнікі ў множным ліку.

У некаторых дапаможніках усе словы гэтага тыпу адносяцца да разраду **няпэўнаколькасных лічэбнікаў** (Кароткая граматыка беларускай мовы, 2007). Няпэўнаколькасныя лічэбнікі трэба адрозніваць ад падобных да іх прыслоўяў. Словы *колькі, некалькі, столькі, гэтулькі, мала, многа, шмат* з'яўляюцца лічэбнікамі, калі яны ўступаюць у сінтаксічную сувязь з назоўнікамі, прыслоўі ж спалучаюцца звычайна з дзеясловамі: *нямала травы, нямала скасілі, многа снегу, многа спазнаў.*

Хоць няпэўна-колькасныя словы ў некаторай ступені і блізкія да лічэбнікаў, аднак паводле значэння і граматычных прымет адны з іх (*многа (нямнога), мала (нямала), трохі, шмат*) мэтазгодна разглядаць як прыслоўі, другія (*некалькі, столькі, колькі*) – як займеннікі.

### 3. Пытанні да асноўнага тэарэтычнага матэрыялу

1. Чым характарызуецца лічэбнік як часціна мовы? Якое адрозненне лічэбніка ад іншых самастойных часцін мовы?
2. На якія разрады паводле значэння і граматычных уласцівасцей падзяляюцца лічэбнікі?
3. Якія групы вылучаюцца сярод колькасных лічэбнікаў?
4. Якія выдзяляюцца групы ўласнаколькасных лічэбнікаў паводле марфалагічнага складу? Ахарактарызуйце кожную групу.
5. У чым асаблівасці сінтаксічнай сувязі лічэбнікаў з назоўнікамі?
6. Якія асаблівасці скланення маюць колькасныя лічэбнікі (па групах)?
7. Складзіце і праскланяйце колькасна-іменныя спалучэнні са зборнымі лічэбнікамі *абодва (абедзве), трое, сямёра* і назоўнікамі мужчынскага і жаночага роду.
8. Якія асаблівасці скланення парадкавых лічэбнікаў?
9. Растлумачце з'яву пераходу некаторых лічэбнікаў у разрад іншых часцін мовы і наадварот. Падмацуйце прыкладамі.
10. Якія словы называюць няпэўна-колькаснымі? Чым яны характарызуюцца?

## 4. Матэрыялы да практычных аўдыторных і самастойных заняткаў

### 4.1. Схема блок-сістэмы практычных заняткаў

| № | Тэма практычных заняткаў | Колькасць гадзін |
|---|---|---|
| 1. | Лічэбнік як часціна мовы. Значэнне, марфалагічныя прыметы, сінтаксічная роля. Лічэбнікі і назоўнікі з лікавым значэннем. Лічэбнікі колькасныя (уласнаколькасныя, зборныя, дробавыя) і парадкавыя. Простыя, складаныя, састаўныя лічэбнікі. | 2 |
| 2. | Асаблівасці сінтаксічнай сувязі лічэбнікаў з назоўнікамі. Скланенне ўласнаколькасных, зборных і дробавых лічэбнікаў. | 2 |
| 3. | Утварэнне і скланенне парадкавых лічэбнікаў. Пераход лічэбнікаў у іншыя часціны мовы. Няпэўна-колькасныя словы. | 2 |

### 4.2. Практыкаванні для засваення тэарэтычных ведаў па модулі

На занятках 1 выконваюцца практыкаванні 384-391.
На занятках 2 выконваюцца практыкаванні 392-398.
На занятках 3 выконваюцца практыкаванні 399-402.

### 5. Дадатковая літаратура па модулі

1. Вярхоў П.В. Лічэбнік у беларускай мове: Параўнальна з рускай і ўкраінскай мовамі. – Мн.: Выд. Белдзяржун-та, 1961.

2. Лічэбнік у сучаснай беларускай мове: дапаможнік / Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь, Установа адукацыі «Мазырскі дзяржаўны педагагічны універсітэт імя І.П. Шамякіна»; [складальнік Н.А. Барысенка]. – Мазыр : МДПУ, 2009.
3. Чабярук А.І. Лічэбнік у беларускіх гаворках / АН БССР, І-т мовазнаўства імя Я. Коласа. – Мн.: Навука і тэхніка, 1977.

МОДУЛЬ 11
# «ЗАЙМЕННІК»

## 1. Схема блок-сістэмы вывучэння тэарэтычнага матэрыялу

| № | Тэма лекцыйных заняткаў | Колькасць гадзін |
|---|---|---|
| 1. | Займеннік як часціна мовы. Суадноснасць займеннікаў з іншымі часцінамі мовы: абагульнена-прадметныя, абагульнена-якасныя, абагульнена-колькасныя займеннікі. | 2 |
| 2. | Разрады займеннікаў. Скланенне займеннікаў. Пераход слоў іншых часцін мовы ў займеннікі. Ужыванне займеннікаў у ролі іншых часцін мовы. | 2 |

## 2. Асновы навукова-тэарэтычных ведаў па модулі

**Слоўнік паняццяў для засваення**: займеннік, абагульнена-прадметныя займеннікі, абагульнена-якасныя займеннікі, абагульнена-колькасныя займеннікі, асабовыя займеннікі, зваротныя займеннікі, прыналежныя займеннікі, указальныя займеннікі, азначальныя займеннікі, пытальныя займеннікі, адносныя займеннікі, адмоўныя займеннікі, няпэўныя займеннікі, пранаміналізацыя.

Пры напісанні раздзела быў выкарыстаны матэрыял вучэбнага дапаможніка «Сучасная беларуская літаратурная мова: Марфалогія: Вучэб. дапам. / Н.В. Гаўрош, М.Ц. Кавалёва, Н.М. Нямковіч і інш.; Пад агульн. рэд. праф. М.С. Яўневіча. – Мн.: Выд. Ул.М. Скарун, 1997. – 288с.»

### 2.1. Займеннік як часціна мовы

Займеннік – часціна мовы, якая ўказвае на прадметы, прыметы прадметаў ці колькасць, не называючы іх. Таму лексічнае значэнне таго ці іншага займенніка канкрэтызуецца, становіцца зразумелым толькі ў кантэксце.

Займеннікі складаюць лексічна абмежаваную групу слоў, аднак патрэба і магчымасці іх ужывання ў мове надзвычай вялікія. Гэта тлумачыцца тым, што кожны займеннік мае абагульнена-ўказальнае значэнне і не называе канкрэтных прадметаў, іх прымет або колькасці.

Значэннем, марфалагічнымі прыметамі і сінтаксічнымі функцыямі адны займеннікі набліжаюцца да назоўнікаў, другія – да прыметнікаў, трэція – да лічэбнікаў. Паводле суадноснасці з іншымі часцінамі мовы займеннікі падзяляюцца на тры групы:

займеннікі, суадносвыя з назоўнікамі (**абагульнена-прадметныя**): *я, мы, ты, вы, ён (яна, яно), яны, сябе, хто, што, ніхто, нішто, нехта, нешта, хто-небудзь, што-небудзь* і інш.;

займеннікі, суадносныя з прыметнікамі (**абагульнена-якасныя**): *мой, твой, свой, наш, ваш, які, усякі, кожны, такі, гэты* і інш.;

займеннікі, суадносныя з лічэбнікамі (**абагульнена-колькасныя**): *столькі, колькі, некалькі, гэтулькі.*

У граматычных адносінах займеннікі не вызначаюцца аднастайнасцю: некаторыя з іх (*хто, што, колькі, столькі*) не маюць катэгорый роду і ліку; родавых адрозненняў не маюць таксама займеннікі *я, ты, мы, вы*, а займеннік *сябе*, акрамя гэтага, – і формы назоўнага склону.

Займеннік – гэта такая часціна мовы, якая не развіла сістэмы словаўтварэння. Сродкі ўтварэння займеннікаў зусім абмежаваныя; яны ўтвараюцца ад іншых займеннікаў пры дапамозе спецыфічных прыставак і постфіксаў: *хто – нехта, ніхто, абы-хто, хто-не-будзь, хтосьці* і інш.

Асноўная сінтаксічная роля займеннікаў – выступаць у сказе дзейнікам, азначэннем, дапаўненнем: *Хтосьці глянуў на гадзіннік. Было ўжо за дванаццаць* (Пестр.). *Відаць, дзеда Талаша займалі **нейкія** думкі* (К-с). *Праца **нікога** не ганьбіць* (Пр.). У ролі выказніка і акалічнасці займеннікі ўжываюцца радзей: *Не пазнаеш і вясковых людзей – не, не тыя, не тыя яны* (К-с). *Гэты бераг як **быў наш** спрадвеку, то **нашым і застанецца*** (К-с). *На адным баку дарогі ляжалі калгасныя палі. **На іх** расла збажына* (А.Ч.).

Паводле лексічнага значэння займеннікі падзяляюцца на дзевяць разрадаў:

асабовыя: *я, мы, ты, вы, ён, яна, яно, яны;*

зваротныя: *сябе*;

прыналежныя: *мой, наш, твой, ваш, свой;*

указальныя: *гэты, той, такі, гэтакі, столькі, гэтулькі;*

азначальныя: *сам, самы, увесь (уся, усё, усе), усякі, кожны, іншы;*

пытальныя: *хто?, што?, які?, каторы?, чый?, колькі?;*

адносныя: *хто, што, які, каторы, чый, колькі;*

адмоўныя: *ніхто, нішто, нічый, ніякі;*

няпэўныя: *нехта, нешта, некаторы, нейкі, нечы (нейчы), хтосьці, штосьці, якісьці, чыйсьці, хто-небудзь, што-небудзь, які-небудзь, чый-небудзь, абы-што, абы-хто, абы-які, абы-чый, некалькі.*

### 2.2. Разрады займеннікаў

#### 2.2.1. Асабовыя займеннікі

Сярод займеннікаў гэтай групы адрозніваюцца асабовыя – *я, мы, ты, вы* і асабова-ўказальныя – *ён, яна, яно, яны.*

Характэрная асаблівасць асабовых займеннікаў *я, ты* – тое, што яны не могуць замяняць слоў-назваў, не маюць катэгорыі роду; на пол

асобы паказвае форма выказніка, калі ён выражаны дзеясловам прошлага часу: *я прыехаў, я прыехала*. Займеннік *я* ўказвае на першую асобу – самога, хто гаворыць; *ты* – на другую асобу, да якой непасрэдна звяртаецца той, хто гаворыць.

Займеннік *ты* можа паказваць не на канкрэтную асобу, а на ўсякага чалавека наогул, г. зн. можа набываць абагульнена-асабовае значэнне: *Па дарозе ты з кашом у лес шыбуеш ціхачом* (К-с). *У поле хоць ты не хадзі* (Корб.).

Займеннік першай асобы *мы* не абазначае многа «я», а паказвае на групу асоб, у якую ўваходзіць і тая, што гаворыць; мы – гэта «я і іншая асоба» ці «я і іншыя асобы»: *Мы збудавалі горад нанова* (Шам.). *Баранілі нас дубы і сосны і прымалі разам з намі бой* (А.П).

Займеннік *вы* паказвае на дзве асобы або на групу асоб (без першай), да якіх звяртаюцца: *Сябры паважаныя, як вы маглі задаць мне такое пытанне?* (А.К.). *Паслухаць вас, усе вы хваты!* (К-с).

Займеннік *вы* можа ўжывацца замест *ты* пры звароце да адной асобы, у такім выпадку ён служыць сродкам выражэння ветлівасці, павагі да субяседніка: *«Што вы сёння нешта не ў гуморы?» – запыталася Ядвіся і глянула на настаўніка* (К-с). *Я чакаю вас, дзядзька Якуб* (Бял.).

Асабова-ўказальныя займеннікі паказваюць на трэцюю асобу – тую, якая не ўдзельнічае ў гутарцы, але пра якую гавораць; яны адрозніваюцца ад займеннікаў 1-й і 2-й асобы (*я, ты*) тым, што маюць формы ўсіх трох родаў і формы адзіночнага і множнага ліку: *ён, яна, яно, яны*.

Займеннікі 3-й асобы могуць ужывацца не толькі замест назоўнікаў, якія абазначаюць асобу чалавека, але і замест назоўнікаў, што абазначаюць назвы жывёл, прадметаў: *Натоўп жанчын акружыў Паходню, як толькі ён з'явіўся на двары* (Хадк.). *Коршак спакойна праплыў над сядзібай. Усе правялі яго вачамі* (Шам.). *Праз рэдкія кусты і бярозкі прылеску мы ўбачылі луг. Ён рассцілаўся шырока ў бакі і наперад* (Б.).

Асаблівасцю займеннікаў *я, мы, ты* з'яўляецца тое, што яны ва ўскосных склонах маюць суплетыўныя асновы, г. зн. іншыя ў параўнанні з асновамі назоўнага склону.

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| Н. | я | ты | м-ы | в-ы |
| Р. | мян-е | цяб-е | н-ас | в-ас |
| Д. | мн-е | таб-е | н-ам | в-ам |
| В. | мян-е | цяб-е | н-ас | в-ас |
| Т. | мн-ой(-ою) | таб-ой(-ою) | н-амі | в-амі |
| М. | (пры) мн-е | таб-е | н-ас | в-ас |

У родным, вінавальным і месным склонах займеннікі *мы* і *вы* маюць своеасаблівы канчатак ***-ас***.

У творным склоне адзіночнага ліку займеннікі *я, ты* ўжываюцца з

варыянтнымі канчаткамі: *мной* і *мною*, *табой* і *табою*: *Галопам скачуць рысакі. І пада мной палоззе, як спараваныя смыкі, іграе на марозе* (См.). *Вось як цяпер, перада мною ўстае куточак той прыгожа...* (К-с).

Займеннікі 3-й асобы скланяюцца наступным чынам:

| | | | |
|---|---|---|---|
| Н. | ён, яно | яна | яны |
| Р. | яго | яе | іх |
| Д. | яму | ёй | ім |
| В. | яго | яе | іх |
| Т. | ім | ёй(ёю) | імі |
| М. | (пры) ім | (пры) ёй | (пры) іх |

Асновам ускосных склонаў займеннікаў 3-й асобы, як і 1-й і 2-й асобы, характэрны суплетывізм; асновай ускосных склонаў гэтых займеннікаў выступае адзін гук [j]: ён – j-аго, j-аму; яна – j-ае, j-ой; ян-о – j-аго, j-аму; яны – j-іх, j-ім.

Займеннік *яна* ў творным склоне мае два варыянты – *ёй* і *ёю*: *Легкавая машына паволі набліжалася. За ёй ішла калона з чатырох грузавікоў* (І.М.). *Матку тваю бачыла, але пагаварыць з ёю не прыйшлося* (К-с).

### 2.2.2. Зваротны займеннік *сябе*

Займеннік *сябе* не мае формы назоўнага склону, а таксама формаў роду і ліку; ён можа адносіцца да кожнай асобы – 1-й, 2-й, 3-й: *Але сабе трубу пакіну пастухову* (Зар.). *«Ты сам сябе выгнаў», – кажа бацька* (К-с). *Серж азірнуўся. За крокаў трыста ад сябе ў святле вулічнай лямпы ён убачыў высокага старога* (К.Ч.). Займеннік *сябе* выконвае ў сказе ролю дапаўнення, зрэдку – акалічнасці месца: *Не хвалі сам сябе, няхай людзі пахваляць цябе* (Пр.). *Ён быццам нічога не заўважыў навокал сябе* (К.Ч.).

Займеннік *сябе* скланяецца, як займеннік *ты*:

Н. – В. сяб-е

| | |
|---|---|
| Р. сяб-е | Т. саб-ой(-ою) |
| Д. саб-е | М. (пры) саб-е |

У творным склоне займеннік *сябе* мае дзве формы – *сабой* і *сабою*: *Вясна! Вясна! О, колькі радасці прыносіш ты з* ***сабой****!* (Куп.). *Мой мілы таварыш, мой лётчык, вазьмі ты з* ***сабою*** *мяне!* (Кул.).

### 2.2.3. Прыналежныя займеннікі

Прыналежныя займеннікі суадносныя з асабовымі і паказваюць на прыналежнасць прадмета пэўнай асобе: *мой, наш* – 1-й, *твой, ваш* – 2-й, *свой* – усім тром асобам. Гэтыя займеннікі, як і прыналежныя прыметнікі, дапасуюцца да назоўніка, з якім звязаны, у родзе, ліку і склоне; у сказе яны выступаюць азначэннем: *Цешаць маё вока сонечныя хвалі нашых*

*ясных дзён* (К-с). *Заскрыпеў снег сыпучы пад маімі нагамі* (Багд.). *Лабановіч сядзіць у сваім аблюбаваным пакойчыку* (К-с).

Для абазначэння прыналежнасці прадмета 3-й асобе ўжываецца асабовы займеннік 3-й асобы ў родным склоне – *яго, яе, іх*: *Няспрытна варушыліся* ***яго*** *пальцы* (Каратк.) *Засмучэнне і боль адбіліся на* ***яе*** *твары* (К-с). *Кожны* ***іх*** *крок, кожны рух і вымаўленае слова чуліся ў кватэры настаўніка* (К-с).

У мове мастацкай літаратуры часта сустракаюцца прыналежныя займеннікі *ягоны, ягоная, іхні*: *А песні ягоныя былі – дзіва!* (Каратк.).

Прыналежныя займеннікі скланяюцца, як прыметнікі.

| | | | |
|---|---|---|---|
| Н. | наш | наш-а наш-а | наш-ы |
| Р. | наш-ага | наш-ай(-ае) | наш-ых |
| Д. | наш-аму | наш-ай | наш-ым |
| В. | як Н. або Р. | наш-а наш-у | як Н. або Р. |
| Т. | наш-ым | наш-ай(-аю) | наш-ымі |
| М. | (пры) наш-ым | наш-ай | наш-ых |

Некаторыя займеннікі гэтай групы маюць асаблівасці ва ўжыванні склонавых канчаткаў.

Займеннікі жаночага роду *мая (маj-а), твая (тваj-а), свая (сваj-а), наша, ваша* ў родным склоне адзіночнага ліку побач з асноўнай формай *маёй, тваёй, сваёй, нашай, вашай* маюць менш ужывальную форму – *мае, твае, свае, нашае, вашае*, якая сустракаецца пераважна ў мастацкіх творах.

Займеннікі *наша, ваша* жаночага і ніякага роду і *нашы, вашы* множнага ліку назоўнага склону ў мастацкіх творах сустракаюцца ў формах *нашая, нашае, вашая, вашае, нашыя, вашыя.* У вінавальным склоне таксама побач з асноўнымі формамі *нашу, вашу, наша, ваша, нашы, вашы* ў мастацкіх творах ужываюцца менш пашыраныя формы *нашую, вашую, нашае, вашае, нашыя, вашыя.*

У творным склоне займеннікі жаночага роду побач з канчаткамі *-ёй, -ай* маюць канчаткі *-ёю, -аю*: *сваёй* і *сваёю*, *нашай* і *нашаю*, *тваёй* і *тваёю*.

### 2.2.4. Указальныя займеннікі

Указальныя займеннікі *гэты, той, такі, гэтакі* дапасуюцца да назоўніка, з якім звязаны, у родзе, ліку і склоне і з'яўляюцца ў сказе азначэннем. Займеннікі *столькі, гэтулькі* катэгорый ліку і роду не маюць.

Займеннік *гэты (гэта)* паказвае на пэўны прадмет, які знаходзіцца зусім блізка, або наогул на вядомы прадмет: *Аднойчы я быў у гэтым доме* (Шам.). Займеннік *той* паказвае на прадмет, які знаходзіцца крыху далей ці які ўжо быў названы: *Але на тым беразе бязлесны луг* (Шам.).

Займеннікі *такі, гэтакі* паказваюць на якасць прадмета, якая мае

ўдакладняльнае, выдзяляльнае значэнне: *Тарасу спадабалася такая падзяка за пачастунак, і ён весела засмяяўся* (Шам.).

Пры скланенні ўказальных займеннікаў назіраюцца некаторыя асаблівасці.

| | | |
|---|---|---|
| Н. т-ой, т-ое | т-ая | т-ыя |
| Р. т-аго | т-ой(-ае) | т-ых |
| Д. т-аму | т-ой | т-ым |
| В. як Н. або Р. т-ое | т-ую | як Н. або Р. |
| Т. т-ым | т-ой(-ою) | т-ымі |
| М. (у) т-ым | т-ой | т-ых |

Займеннік *той* ва ўсіх склонах адзіночнага і множнага ліку мае аднолькавую аснову – з аднаго гука [т]. У займенніках *гэты, такі, гэтакі* аснова таксама аднолькавая ва ўсіх формах: *гэт-ы, гэт-ага, гэт-аму; так-і, так-ога, так-ому.*

Займеннік *той* у форме адзіночнага ліку мае націск на другім складзе канчатка: *таго, таму*, у множным ліку – на першым складзе: *тыя, тымі.*

Указальны займеннік *гэты* ў назоўным і вінавальным склонах ніякага роду мае форму *гэта*, жаночага роду – *гэта, гэту.* Ужываецца таксама поўная форма гэтага займенніка жаночага роду, але яна менш пашырана: *гэтая.*

Побач з формамі роднага склону *гэтай, той*, *такой* у мастацкіх творах зрэдку сустракаюцца формы *гэтае, тае, такое: Я не мог дачакацца тае суботы* (Гр.). *Не сцярпеў Кандрат такое крыўды* (К-с).

У творным склоне ўказальныя займеннікі жаночага роду ўжываюцца з варыянтнымі канчаткамі *-ай* і *-аю*, *-ой* і *-ою*: *гэтай* і *гэтаю*, *той* і *тою: Быў смешны дзядзька той часінай з пустою лыжкаю, з тычынай* (К-с). *Чаму ж, чаму часінай тою мы не спаткаліся з табою?* (К-с).

Займеннікі *столькі, гэтулькі* скланяюцца, як прыметнікі ў множным ліку: *стольк-іх, стольк-ім, стольк-імі.*

### 2.2.5. Азначальныя займеннікі

Асноўнае значэнне займенніка *сам (сама, само, самі)* – паказваць на асобу ці прадмет, якія ўтвараюць дзеянне самастойна, без чыёй-небудзь дапамогі ці ўдзелу. Займеннік *сам* у пазіцыі перад назоўнікам ці асабовым займеннікам указвае на асобу ці прадмет, ужо вядомыя з гутаркі: *Яна зноў... прыгледзелася і запыталася: «А ці не вы будзеце сам Савіцкі?»* (Лупс.). *Гэта старыца ракі. Самой ракі не відаць* (Шам.).

Займеннік *самы* мае выдзяляльна-ўзмацняльнае значэнне, паказвае на крайнюю мяжу распаўсюджання дзеяння, з'явы або праяўлення якасці ў прасторы ці часе: *Пры самым акне стаяла шафа* (К.Ч.). *Б'юцца ветры*

*шалёныя люта, гнуцца дрэвы да самай зямлі* (Маш.).

Займеннік *увесь (уся, усё, усе)* мае значэнне зборнасці, абагуленасці, паказвае на ахоп дзеяннем усяго прадмета: *Апошні раз акінуў Лабановіч вачамі ўсе ваколіцы* (К-с). *Мінск – сталіца, гордасць наша, слава ўсёй краіны* (Куп.).

Займеннікі *усякі (усякая, усякае, усякія)* і *кожны (кожная, кожнае, кожныя)* ужываюцца для выдзялення адзінкавых прадметаў з групы падобных ці розных прадметаў, прычым займеннік *усякі* сваім значэннем блізкі да слоў *любы, розны*, а займенніку *кожны* ў большай ступені ўласціва значэнне выдзяляльнасці: *Усякі з нас летняму дожджыку рад* (Куп.). *Яна разумела не толькі кожнае яго слова, але кожны рух, жэст* (Шам.).

Займеннік *іншы (інакшы)* паказвае на адрозненне прыметы, якасці прадмета: *І роля яе ў гэтым баі была зусім іншая, чым яна жадала* (Шам.).

Займеннікі *сам, самы, кожны, іншы* скланяюцца, як прыметнікі з цвёрдай асновай, а займеннік *самі* – як прыметнікі з асновай на мяккі ***н***.

Пры скланенні займеннікі *сам, самы* захоўваюць аднолькавую аснову. Націск у займенніку *сам* ва ўскосных склонах прыпадае на першы галосны канчатка: *самога, самому*, а ў займенніку *самы* – на аснову: *самага*, *самаму*.

Займеннік жаночага роду *сама* ў вінавальным і творным склонах мае дзве формы: *самую* і *саму*, *самой* і *самою*; займеннікі *самая, кожная* – у родным склоне формы *самай, кожнай* і *самае, кожнае*, у творным – *самай, кожнай* і *самаю, кожнаю.*

Займеннікі *увесь, уся, усё, усе* скланяюцца, як прыметнікі з асновай на мяккі ***н***.

Займеннік *увесь* ва ўсіх формах адзіночнага і множнага ліку, за выключэннем назоўнага склону мужчынскага роду, мае аснову *ус-*: *увесь, ус-яго, ус-яму: ус-я, ус-ёй; ус-е, ус-іх, ус-ім* і г. д.

Займеннік жаночага роду *уся* ў родным склоне побач з формай *усёй* мае менш пашыраную форму *усяе*; у творным – *усёй* і *усёю.*

### 2.2.5. Пытальныя і адносныя займеннікі

Пытальныя займеннікі выражаюць пытанне пра асобу або прадмет (*хто?, што?*), пра якасць ці прыналежнасць прадмета (*які?, чый?*), пра месца прадмета сярод іншых прадметаў (*каторы?*), пра колькасць прадметаў (*колькі?*).

Адносныя займеннікі ўжываюцца для сувязі частак у складаназалежным сказе, дзе паказваюць адносіны дадатай часткі да галоўнай: *Яна вельмі ўважліва сачыла за тымі, хто працаваў...* (Шам.). *Смачна пахне жывіцай, што ліпне да рук цесляроў* (Б.).

Слова *каторы* як адносны займеннік ужываецца рэдка: *Лес расступіўся, і глянула круглая палянка, па краях каторай цягнулася чорная стужка невысокага, радкаватага лесу* (К-с).

Характэрнай асаблівасцю займеннікаў *хто, што*, а таксама *колькі* з'яўляецца тое, што яны не маюць граматычнага роду і ліку; займеннікам жа *які, чый, каторы* формы роду і ліку ўласцівыя: *які, якая, якое, якія* і г. д.

Пытальныя і адносныя займеннікі скланяюцца так:

| | | | |
|---|---|---|---|
| Н. хт-о | шт-о | В. к-аго | шт-о |
| Р. к-аго | ч-аго | Т. к-ім | ч-ым |
| Д. к-аму | ч-аму | М. (пры) к-ім | ч-ым |

| | | |
|---|---|---|
| Н. чый, чыё (чыј-о) | чы-я (чыј-а) | чы-е (чыј-э) |
| Р. чый-го | чы-ёй(-е) (чыј-ой(-э) | чы-іх (чыј-іх) |
| Д. чый-му | чы-ёй(чыј-ой) | чы-ім (чыј-ім) |
| В. як Н. або Р. чыё(чыј-о) | чы-ю (чыј-у) | як Н. або Р. |
| Т. чы-ім(чыј-ім) | чы-ёй(-ёю) чы-ёй(чыј-ой) (чыј-ой(-ою) | чы-імі(чыј-імі) |
| М. (у) чыім (чыј-ім) | чы-ёй (чыј-ой) | чы-іх (чыј-іх) |

Займеннікі *хто, што* пры скланенні маюць суплетыўныя асновы: *хт-о – к-аго, к-аму; што – ч-аго, ч-аму.*

Займеннік жаночага роду *чыя* ў родным склоне мае асноўную форму *чыёй*, зрэдку сустракаецца *чые*, у творным – *чыёй*, радзей – *чыёю.*

### 2.2.5. Адмоўныя займеннікі

Адмоўныя займеннікі ўтвораны ад пытальных пры дапамозе прыстаўкі ***ні-***: *ніхто, нішто, ніякі (ніякая, ніякае, ніякія), нічый (нічыя, нічыё, нічые), ніколькі.* Яны абазначаюць адмаўленне, паказваюць на адсутнасць асобы або прадмета, прыметы ці прыналежнасці і колькасці. Адмоўныя займеннікі ўжываюцца толькі ў адмоўных сказах, у якіх ёсць часціца ***не*** пры дзеяслове-выказніку ці слова *няма*: *Чамусьці ў тую ноч ніхто не хацеў дзяжурыць* (Шам.). *Нічога, брат, няма ў вуллі* (К-с).

Адмоўныя займеннікі скланяюцца так, як і пытальныя.

У займенніках *ніхто, нішто* пры скланенні націск прыпадае на першы галосны канчатка: *нікога, нічога, нікому, нічому*; параўн.: *каго, чаго, каму, чаму*; у займенніку *ніякі (ніякая, ніякае, ніякія)* ва ўсіх склонах націск захоўваецца на аснове: *ніякага, ніякаму* і г. д,; параўн. *якога, якому.*

Калі пры адмоўным займенніку ўжываецца прыназоўнік, ён ставіцца пасля адмоўнай часціцы ***ні***, прычым націск тады можа прыпадаць на розныя склады займеннікаў: *ні на кога* і *ні на каго*, *ні да чога* і *ні да чаго*,

*ні за якія грошы* і *ні за якія грошы* і інш. Больш уласцівыя літаратурнай мове формы тыпу *ні за кога, ні да чога, ні за якія.*

У мастацкіх творах побач з асноўнай формай роднага склону займенніка жаночага роду *ніякай* сустракаецца форма *ніякае*: *Я, саколка, не баюся ніякае працы* (К-с).

У займенніку *нічый* націск ва ўскосных склонах на канчатку: *нічый, нічыёй, нічыіх.*

### 2.2.6. Няпэўныя займеннікі

Да няпэўных адносяцца займеннікі, якія няпэўна паказваюць на асобы, прадметы: *нехта, нешта*; на прыметы, прыналежнасць прадмета: *нейкі, нечы*; на асобу ці прадмет, выдзелены з групы іншых: *некаторы*, на колькасць: *некалькі*. Значэнне гэтых займеннікаў нават у кантэксце поўнасцю не раскрываецца, не канкрэтызуецца: *Штось пабегла там у лозы, нешта скокнула пад мост* (К-с).

Няпэўныя займеннікі ўтвараюцца ад пытальных пры дапамозе часціц *не, абы-*, якія становяцца прыстаўкамі: *нехта, нешта, нейкі, некаторы, не-калькі, абы-хто, абы-што, абы-які, абы-чый*, і постфіксаў *-небудзь, -сьці(-сь)*: *хто-небудзь, што-небудзь, які-небудзь, чый-небудзь, хтосьці (хтось), штосьці (штось), якісьці (якісь), чыйсьці (чыйсь).*

Няпэўныя займеннікі скланяюцца так, як адпаведныя пытальныя, ад якіх яны ўтвораны. Толькі ў займенніку *нечы (нечая, нечае, нечыя)* выступае зменная аснова пытальнага займенніка; параўн.: *неч-ы, неч-ага, неч-аму* і *чый, чый-го, чый-му.*

У займенніках *нехта, нешта, нечы, нейкі* ва ўсіх склонах націск на прыстаўцы ***не-***: *некага, некаму*; займеннік *некаторы* захоўвае націск на апошнім складзе асновы: *некаторага, некатораму, некаторым*; у займенніках з постфіксам *-небудзь* націск прыпадае на першы склад постфікса: каго-небудзь, каму-небудзь, з прыстаўкай *абы-* – на канчатак: *абы-каго, абы-каму.*

Калі пры займенніку з часціцай *абы* ўжываецца прыназоўнік, ён ставіцца пасля часціцы: *То гаварылі абы пра што, то маўчалі* (І.М.).

Да няпэўных адносяць таксама складаныя займеннікі, якія паказваюць на няпэўныя асобы: *хто-ніхто, сёй-той*; прадметы: *што-нішто*; прыметы: *такі-сякі, сякі-такі.*

Са значэннем няпэўных займеннікаў могуць ужывацца пытальныя займеннікі *хто, што*, *колькі,* калі яны не выражаюць пытання: *Бывала, калі вязу што або каго ў Нясвіж, дык заўсёды начаваў у цябе* (К.Ч.). (Параўн.: *вязу што-небудзь або каго-небудзь*) *«Абярыце каго маладзейшага і болей спрактыкаванага ў ваеннай справе», – заявіў дзед Талаш* (К-с).

### 2.3. Пераход слоў іншых часцін мовы ў займеннікі. Ужыванне займеннікаў у ролі іншых часцін мовы

Некаторыя словы іншых часцін мовы, страчваючы сваё асноўнае значэнне, могуць пераходзіць у займеннікі. Пераход слоў іншых часцін мовы ў займеннікі называецца **пранаміналізацыяй**. У такім выпадку яны ў той ці іншай ступені набываюць значэнне займенніка і выконваюць у сказе яго ролю. Найбольш часта ў ролі займенніка ўжываецца колькасны лічэбнік *адзін (адна, адно, адны)*, парадкавы *другі (другая, другое, другія)* і інш.: ***Адзін** багаты пан вельмі любіў слухаць казкі* (Як.) (са значэннем 'нейкі'). *На дварэ было больш людзей. **Адны** ляжалі на зямлі, **другія** стаялі* (К.Ч.) (са значэннем 'некаторыя'). *Па **адзін** бок – блеск дзянніцы, па **другі** – цьма, дзе ён жыў* (К-с) (са значэннем 'гэты, той'). *За край небасхілу пралегла раўніна, і воблік зямлі стаў адменны, **другі*** (М.Т.) (са значэннем 'іншы'). *Сам не гам і **другому** не дам* (Пр.) (са значэннем 'іншаму').

У ролі азначальнага займенніка *увесь (уся, усё)* ужываецца прыметнік *цэлы (цэлая, цэлае)*: ***Цэлае** лета жыла Аленка думкаю аб школе, аб далейшай сваёй навуцы* (К-с). *Ну, увесь дзень не буду нічога есці... Тады **цэлы** пірог з'ем* (С.А.).

Больш часта займеннікі пераходзяць у іншыя часціны мовы. У такім выпадку яны страчваюць сваё асноўнае значэнне, набываюць значэнне іншай часціны мовы і выконваюць яе ролю ў сказе.

Азначальныя займеннікі *усё, усе, усякі, кожны, іншы, сам*, ужытыя без назоўніка, набываюць прадметнае значэнне і субстантывуюцца: *Яна **ўсё** ўмела і **ўсё** ведала* (Шам.). ***Кожны** адстойваў сваё меркаванне* (Пальч.). *Перш чым на **іншага** ківаць, узорам **сам** павінен стаць* (Вал.). *Яго **ўсякі** гоніць, **усякі** ўшчувае* (К-с).

Прыналежныя займеннікі *наш, свой, твой, мой* таксама могуць набываць значэнне прадметнасці, пераходзіць у разрад назоўнікаў і выконваць у сказе іх сінтаксічную функцыю: *Не ішлі сюдой ні **нашы**, адыходзячы, ні немцы* (Б.). *Яна пазнала **сваіх** і шчыра ўзрадавалася* (Шам.). ***Мая** ездзіла на тым тыдні ў Мінск* (Б.). Пераходзяць у назоўнікі ўказальныя займеннікі *гэта, той,* калі яны не паясняюць іншых назоўнікаў: *І **гэта** больш за ўсё непакоіла Міхася* (Лупс). *Яго рогат устрывожыў Яраша. **Той** кінуў вуды і вылез з лазняку, каб паглядзець, што здарылася* (Шам.).

Займеннікі пераходзяць у часціцы. Напрыклад, зваротны займеннік у форме давальнага склону – *сабе* можа ўжывацца ў якасці ўзмацняльнай часціцы і падкрэсліваць значэнне незалежнасці асобы, нават абыякавасці да таго, пра што гаворыцца: *Мужчына смяецца, а Паўлюк **сабе** толькі маўчыць, хоць бы што* (Б.). *Наталька... ішла **сабе** паволі, пазіраючы на*

*тое, што рабілася на вуліцы* (К-с).

Указальны займеннік *гэта* таксама можа набываць значэнне часціцы і выконваць яе ролю ў сказе: *Ці не вецер гэта звонкі ў тонкіх зёлках шапаціць?* (Багд.). *Дзеці – гэта такі чытач, якога абы-чым не падкупіш* (Б.).

У якасці ўзмацняльнай часціцы можа выступаць слова *усё*: *І народ усё крэпкі, малады, здаровы, як на падбор* (К-с). *Кабан рые павольна і заложна, усё болей і болей углыбляючыся ў зямлю* (К-с).

Займеннікі *які (якая, якое, якія), колькі* часта страчваюць сваё асноўнае значэнне і ўжываюцца ў ролі клічнай часціцы: *Які прастор! Які надзіва прыгожы дзень!* (А.Ж.). *Якая цёплая ноч!* (К-с). *Якое празрыстае неба! Якія яркія зоры!* (А. Ч.). *Колькі ўзнялося дубоў маладых!* (Луж.).

Словы *штосьці (штось), нешта* таксама могуць страчваць займеннікавае значэнне і выступаць у сказе як часціцы, але з адценнем прыслоўнага значэння: *Лабановіч стараўся заснуць, але яму штось не спалася* (К-с). *«Нешта я зусім здаюся», – сказала яна* (Як.). Значэнне часціцы ў слове *нешта* выяўляецца тады, калі яно ўжываецца пры канструкцыях, якімі выражаецца мера, колькасць: *Ужо асушана [балота]* ***нешта*** *каля пяцісот гектараў* (Пестр.).

Займеннік *што* ў форме назоўнага, роднага *(чаго)* і давальнага *(чаму)* склонаў можа пераходзіць у прыслоўе пры выражэнні пытання: *Што ты, пушча, трывожна шуміш нада мною?* (У.Д.). *Чаго хмурыцца неба сіняе?* (Куп.). *А чаму, журботны, цёмны гаю, ахінуўся густа ў туманы?* (Бял.).

Спалучэнне займенніка *што* з прыназоўнікам *за* выступае як клічна-пытальная часціца: *Што за ліха! У пільні агонь гарыць* (К.Ч.). *Ты што за чалавек? Чым займаешся?* (К-с).

### 3. Пытанні да асноўнага тэарэтычнага матэрыялу

1. У чым адметнасць займенніка як часціны мовы ў параўнанні з іншымі самастойнымі часцінамі мовы?
2. Якую сінтаксічную функцыю выконваюць займеннікі ў сказе?
3. На якія групы падзяляюцца займеннікі паводле суадноснасці а іншымі часцінамі мовы? У чым адметнасць займеннікаў кожнай з гэтых груп?
4. Якія разрады займеннікаў адрозніваюцца паводле значэння?
5. Чым адрозніваюцца асабовыя займеннікі ад займеннікаў іншых груп?
6. Якім спосабам утвараюцца адмоўныя і няпэўныя займеннікі?
7. Што маюць агульнае і чым адрозніваюцца пытальныя і адносныя

займеннікі?
8. Чым характарызуецца слова *што* як пытальны займеннік, адносны займеннік і злучнік? Падмацуйце прыкладамі.
9. У чым асаблівасць скланення займеннікаў усіх разрадаў?
10. Якія займеннікі маюць варыянтныя канчаткі пры скланенні?
11. Словы якіх часцін мовы могуць набываць значэнне займенніка і выконваць яго функцыі? Што такое пранаміналізацыя? Прывядзіце прыклады.

## 4. Матэрыялы да практычных аўдыторных і самастойных заняткаў

### 4.1. Схема блок-сістэмы практычных заняткаў

| № | Тэма практычных заняткаў | Колькасць гадзін |
|---|---|---|
| 1. | Займеннік як часціна мовы. Значэнне, марфалагічныя прыметы, сінтаксічная роля. Суадноснасць займеннікаў з іншымі часцінамі мовы: абагульнена-прадметныя, абагульнена-якасныя, абагульнена-колькасныя займеннікі. | 2 |
| 2. | Разрады займеннікаў. Лексіка-граматычная характарыстыка займеннікаў розных разрадаў. | 2 |
| 3. | Скланенне займеннікаў. Пераход слоў іншых часцін мовы ў займеннікі. Ужыванне займеннікаў у ролі іншых часцін мовы. | 2 |

### 4.2. Практыкаванні для засваення тэарэтычных ведаў па модулі

На занятках 1 выконваюцца практыкаванні 403-409.
На занятках 2 выконваюцца практыкаванні 410-414.
На занятках 3 выконваюцца практыкаванні 415-418.

## 5. Дадатковая літаратура па модулі

1. Сцяшковіч Т.Ф. Займеннік у беларускай мове / Рэд. А.І. Жураўскі. – Мн.: Навука і тэхніка, 1977.

МОДУЛЬ 12
# «ДЗЕЯСЛОЎ»

## 1. Схема блок-сістэмы вывучэння тэарэтычнага матэрыялу

| № | Тэма лекцыйных заняткаў | Колькасць гадзін |
|---|---|---|
| 1. | Дзеяслоў як часціна мовы. Граматычныя катэгорыі дзеяслова: трыванне, стан, лад, час, асоба; лік і род. | 2 |
| 2. | Сістэма дзеяслоўных формаў. Інфінітыў як пачатковая форма дзеяслова. Граматычныя катэгорыі інфінітыва. Асновы дзеяслова. | 2 |
| 3. | Пераходныя і непераходныя дзеясловы. Зваротныя дзеясловы. Спражэнне дзеясловаў. | 2 |

## 2. Асновы навукова-тэарэтычных ведаў па модулі

**Слоўнік паняццяў для засваення**: дзеяслоў, спрагальныя і неспрагальныя формы дзеяслова, інфінітыў, пераходныя дзеясловы, непераходныя дзеясловы, зваротныя дзеясловы, незваротныя дзеясловы, reflexiva tantum, катэгорыя стану дзеясловаў, залежны стан дзеясловаў, незалежны стан дзеясловаў, трыванне дзеяслова, катэгорыя ладу дзеяслова, абвесны лад, загадны лад, умоўны лад, катэгорыя часу, абсалютны час, адносны час, цяперашні час, прошлы час, будучы час, катэгорыя асобы дзеяслова, асабовыя дзеясловы, безасабовыя дзеясловы, спражэнне дзеяслова.

Пры напісанні раздзела быў выкарыстаны матэрыял вучэбнага дапаможніка «Сучасная беларуская літаратурная мова: Марфалогія: Вучэб. дапам. / Н.В. Гаўрош, М.Ц. Кавалёва, Н.М. Нямковіч і інш.; Пад агульн. рэд. праф. М.С. Яўневіча. – Мн.: Выд. Ул.М. Скарун, 1997. – 288с.»

### 2.1. Дзеяслоў як часціна мовы

Дзеяслоў – часціна мовы, якая абазначае дзеянне ці стан прадмета як працэс і выражае яго ў граматычных катэгорыях трывання, стану, асобы, ладу, часу.

Слова «працэс» у характарыстыцы дзеяслова мае шырокае значэнне. Дзеясловы могуць абазначаць канкрэтнае фізічнае дзеянне: *будаваць, малаціць, жаць, ткаць, чытаць, пісаць, касіць*; рух, перамяшчэнне ў прасторы: *ісці, бегчы, ехаць, ляцець, імчацца*; маўленне і думку: *гаварыць, размаўляць, разумець, разважаць*; успрыманне: *бачыць, слухаць, адчуваць*; адносіны асобы да каго-небудзь, чаго-небудзь: *любіць, кахаць, ненавідзець, паважаць*; стан: *спаць, драмаць, маўчаць*; змену прыметы ці стану: *разумнець, цяплець, старэць, спялець, жаўцець, святлець* і інш.

Дзеяслоў мае граматычныя катэгорыі стану, трывання, ладу, часу,

асобы, ліку, роду. Ён мае таксама складаную сістэму формаў, сярод іх выдзяляюцца чатыры разрады: інфінітыў (неазначальная форма дзеяслова), асабовыя формы (формы асобы, ліку, ладу, часу, роду), дзеепрыметнік, дзеепрыслоўе.

Формы дзеяслова падзяляюцца на спрагальныя і неспрагальныя. Спрагальныя – асабовыя формы; яны змяняюцца па асобах, ліках, ладах, часах (а ў прошлым часе – і па родах). Неспрагальныя формы – інфінітыў, дзеепрыметнік, дзеепрыслоўе. Спрагальныя і неспрагальныя формы маюць шэраг агульных прымет, якія аб'ядноўваюць іх у адзіную сістэму формаў дзеяслова: 1) агульнасць лексічнага значэння; 2) наяўнасць катэгорый трывання і стану; 3) агульнасць кіравання; 4) аднолькавую магчымасць прымыкання прыслоўя.

Інфінітыў і дзеепрыслоўе – нязменныя формы дзеяслова, астатнія – зменныя. Зменным формам уласціва катэгорыя ліку, якая залежыць ад ліку таго слова, да якога дзеяслоў адносіцца: *вучань піша – вучні пішуць, зжатае поле – зжатыя палі*. Дзеепрыметнікі маюць катэгорыі трывання, стану, часу. Інфінітыў і дзеепрыслоўі маюць катэгорыі трывання і стану.

Сінтаксічная роля дзеяслоўных формаў неаднолькавая. Асабовыя (спрагальныя) формы ў сказе заўсёды выказнікі (таму іх яшчэ называюць прэдыкатыўнымі): *Лес* ***супакойвае***, ***разганяе*** *трывогу, нервознасць* (Шам.). *Сонца* ***забегла*** *за хмурынку і* ***знікла*** *зусім* (Грах.). Інфінітыў можа быць любым членам сказа. Дзеепрыметнікі часцей выступаюць у сказе азначэннямі, зрэдку – выказнікамі, а кароткія – толькі выказнікамі: *Зара адплывала ў змрок, як* ***падпалены*** *ветразь* (Панч.). *Сад хоць і невялікі, але* ***дагледжаны*** (Ж.). *Вароты не* ***зачынены****: прыходзь і кум, і сват* (Куп.). Дзеепрыслоўі ў сказе звычайна з'яўляюцца акалічнасцямі: ***Жартуючы***, ***смеючыся***, *прайшла па вуліцы моладзь* (Хадк.).

Агульная характэрная сінтаксічная прымета ўсіх дзеяслоўных формаў – здольнасць кіраваць скланяльнымі часцінамі мовы, якія выступаюць у ролі дапаўнення ці акалічнасці: *прывезці з горада, прывёз з горада, прывязу з горада, прывязуць з горада, прывезлі з горада, прывёз бы з горада, прывязі з горада, прывезены з горада, прывёзшы з горада.*

Да ўсіх дзеяслоўных формаў можа прымыкаць прыслоўе, паясняючы іх: *уважліва прачытаць, уважліва прачытаю, уважліва прачытаў, уважліва прачытаў бы, уважліва прачытай, уважліва прачытаны, уважліва прачытаўшы.*

### 2.2. Інфінітыў

Інфінітыў (неазначальная форма дзеяслова) – нязменная форма дзеяслова, якая абазначае дзеянне ці стан, не звязаныя з асобай і часам: *Прыемнасць – пазнаёміцца з чалавекам ветлым, радасць – пагутарыць з*

*разумным, удача – знайсціся ў патрэбе са смелым, шчасце – жыць, працаваць з чалавекам сумленным* (М.Т.).

Інфінітыў традыцыйна разглядаецца як зыходная, пачатковая форма дзеяслова. Семантычна ён аналагічны назоўнаму склону назоўніка са значэннем дзеяння (параўн.: *даглядаць – догляд, навучаць – навучанне*).

Інфінітыў мае граматычныя катэгорыі трывання: *пісаць – спісаць, берагчы – зберагчы* і стану: *абмяркоўваць, вывучаць – абмяркоўвацца, вывучацца*. Ён можа быць пераходным ці непераходным: *будаваць (школу), сеяць (лён), сядзець, ісці*; незваротным ці зваротным: *мыць – мыцца, сустракаць – сустракацца.*

У беларускай мове інфінітыў мае суфіксы ***-ць, -ці, -чы***. Суфікс *-ць* далучаецца да асновы, якая канчаецца на галосны гук: *жаць, грэць, абараняць, рваць, веяць, ехаць, хадзіць, плаваць, віць, ліць, гаварыць, пісаць.* Суфікс *-ці* ўжываецца ў дзеясловах, аснова якіх канчаецца зычным гукам: *лезці, паўзці, скрэбці, сесці, плесці, прасці, месці.* Суфікс *-чы* маюць дзеясловы з асновай на заднеязычны ***г***: *бегчы, берагчы, легчы, стрыгчы, сцерагчы*. Дзеясловы з асновай цяперашняга часу на заднеязычны ***к*** (тыпу *валакуць, таўкуць, пякуць*) у інфінітыве звычайна ўжываюцца без ***к***: *валачы, таўчы, пячы.* Толькі адзін дзеяслоў ужываецца ў двух варыянтах – (*сячы* і *секчы* (пры перавазе першага).

Інфінітыў можа ўжывацца ў ролі любога члена сказа – галоўных яго членаў: *Век **зжыць** – не мех **сшыць*** (Пр.); азначэння: *У Таўбіна клекатала нястрымная прага **тварыць*** (Луж.); дапаўнення: *Лабановіч загадаў выхаванцам **прынесці** кнігі, сшыткі, якія ў іх ёсць, і ўсё, што патрэбна для навучання* (К-с); акалічнасці: *Усе рынуліся на поле – **капаць** картоплю* (І.М.). Інфінітыў можа быць часткай выказніка: *І ў лесе, і ў палях **пачынала цямнець*** (К-с).

Словы *відаць, чуваць* у беларускай мове не спрагаюцца, яны толькі знешне супадаюць з дзеясловамі на ***-аць***. У сказе яны выступаюць выказнікам, спалучаюцца з дзеясловам-звязкай *быць*, які паказвае на час (у цяперашнім часе дзеяслоў-звязка не ўжываецца). Напрыклад: *Адтуль **відаць** адразу пяць азёр* (Б.). *Чым бліжэй падыходзілі, тым выразней **чуваць** былі песні* (Зарэц.).

### 2.3. Асновы дзеяслова

Дзеяслоўныя формы ўтвараюцца пры дапамозе формаўтваральных суфіксаў і канчаткаў, якія далучаюцца да асновы. Звычайна выдзяляюць дзве ўтваральныя асновы – інфінітыва і цяперашняга часу.

**Аснова інфінітыва** вызначаецца шляхам аддзялення суфіксаў ***-ць, -ці, -чы***: *спява-ць, вез-ці, бег-чы.* Яна супадае з асновай прошлага часу дзеяслова, якая вызначаецца аддзяленнем суфікса прошлага часу;

параўн.: *збіра-ць – збіра-ў, працава-ць – працава-ў, чыта-ць – чыта-ў*. Аднак у асобных дзеясловах асновы інфінітыва і прошлага часу адрозніваюцца. Такія дзеясловы маюць тры асновы: інфінітыва, цяперашняга (будучага простага) часу і прошлага часу: *вес-ці – вяд-уць – вё-ў, плес-ці – плят-уць – плё-ў, ся-чы – сяк-уць – сек, мокну-ць – мокн-уць – мок, сохну-ць – сохн-уць – сох.*

Ад асновы інфінітыва ўтвараюцца формы прошлага часу, умоўнага ладу, дзеепрыметнікі прошлага часу, дзеепрыслоўі закончанага трывання: *памы-ць – памы-ў, памы-ў бы, памы-т-ы, памы-ўшы, прывез-ці – прывёз, прывёз бы, прывез-ен-ы, прывёз-шы.*

**Аснова цяперашняга часу** (будучага простага – у дзеясловах закончанага трывання) вызначаецца шляхам аддзялення канчаткаў 3-й асобы множнага ліку ў форме цяперашняга (ці будучага простага) часу: *піш-уць, пол'-уць (полюць), няс-уць, вуч-аць*. Калі ў дзеяслове цяперашняга часу перад канчаткам ёсць галосны, то аснова цяперашняга (будучага простага) часу заканчваецца на ***j***, які на пісьме не мае спецыяльнага графічнага абазначэння: *мыюць – мыj-уць; сустракаj-уць, збудуj-уць.*

Ад асновы цяперашняга часу ўтвараюцца асабовыя формы цяперашняга (будучага простага) часу, формы загаднага ладу, дзеепрыметнікі цяперашняга часу і дзеепрыслоўі незакончанага трывання: *рухаj-уць – ру-хаj-у, рухаj-эш, рухай, рухаj-уч-ы, рухаj-учы; кіруj-уць – кіруj-у, кіруj-эш, кіруй, кіруj-уч-ы, кіруj-учы; звяз-уць – звяз-у, звяз'-эш, звяз-і.*

Асновы інфінітыва і цяперашняга часу могуць супадаць (*бераг-чы* і *бераг-уць*, *вез-ці* і *вяз-уць*, *нес-ці* і *няс-уць*, *стрыг-чы* і *стрыг-уць*) і не супадаць (*ляце-ць* і *ляц'-аць*, *хадзі-ць* і *ходз'-аць*, *насі-ць* і *нос'-аць*, *бяле-ць* і *бялеj-уць*).

У зваротных дзеясловах постфікс ***-ся*** ўваходзіць у склад асновы слова (перарывістая аснова): *купацца* – аснова інфінітыва *купа-...-ца*, аснова цяперашняга часу *купаj-...-ца*; *берагчыся* – аснова інфінітыва *бераг-...-ся*, аснова цяперашняга часу *бераг-...-ца.*

### 2.4. Пераходныя і непераходныя дзеясловы

Усе дзеясловы ў залежнасці ад характару накіраванасці, пераходу абазначанага імі дзеяння на аб'ект падзяляюцца на пераходныя і непераходныя.

**Пераходныя** дзеясловы абазначаюць дзеянне, якое накіравана, пераходзіць на аб'ект – дапаўненне ў форме вінавальнага склону без прыназоўніка: *араць поле, жаць жыта, касіць траву, апрацоўваць дэталь, правяраць сшыткі, радаваць сяброў, сустракаць брата*. Такое дапаўненне пры пераходных дзеясловах называецца *прамым аб'ектам*. Калі прамым аб'ектам выступае не ўвесь прадмет, а толькі частка (частковы аб'ект), то назоўнік ужываецца ў родным склоне: *прынесці вады,*

*нарэзаць хлеба, выпіць квасу, прывезці дроў.* Аб'ект мае форму роднага склону і тады, калі пры пераходным дзеяслове ёсць адмоўе: *не здаваў экзаменаў, не чытаў кнігі, не скасіў травы, не пасеялі ячменю, не напісаў сачынення.* Форма роднага склону назоўніка ўжываецца таксама як прамы аб'ект пры дзеясловах *браць, даць, прасіць* і падобных, калі «бярэцца, даецца і г. д. на час» (аб'ект часовага карыстання): *вазьмі нажа, дай ручкі, папрашу сшытка.*

Пры пераходных дзеясловах у сказе можа і не быць прамога аб'екта, але ён лёгка падразумяваецца: *Дзень у дзень ідзе ён [Тарэнта] туды ў заработкі: то* ***жаць****, то* ***касіць****, то* ***прыбіраць*** *снапы* (Гал.). *«Давай крыху* ***перачакаем****», – параіў Лабановіч* (К-с).

Ролю прамога аб'екта можа выконваць дададая дапаўняльная частка ў складаназалежным сказе: *Дык* ***ведай*** *жа, што свой парог і ў горы дапаможа* (Бр.).

Аб'екты пры пераходных дзеясловах бываюць разнастайныя. Яны могуць абазначаць назвы асобы ці жывёлы: *апранаць дзіця, сустракаць брата, даглядаць цялят*; канкрэтных неадушаўлёных прадметаў, што ўзнікаюць у выніку дзеяння: *пабудаваць мост, надрукаваць кнігу, звязаць шапачку* або існавалі да пачатку дзеяння: *малаціць жыта, азеляніць вуліцу, рамантаваць кватэру*. Прамым аб'ектам могуць выступаць і назвы абстрактных паняццяў: *падрыхтаваць сюрпрыз, падаць каманду, траціць надзею*.

У некаторых пераходных дзеясловах, калі яны ўжываюцца без прамога аб'екта, можа аслабляцца аб'ектнае значэнне, а ўвага сканцэнтроўваецца на самім дзеянні; параўн.: *спявае песню* і *хараша спявае*, *чытае кнігу* і *хутка чытае*, *піша ліст* і *прыгожа піша*. У гэтых выпадках пераходныя дзеясловы збліжаюцца значэннем з непераходнымі, характарызуючы стан, навыкі, уласцівыя ўтваральніку дзеяння.

**Непераходнымі** называюцца дзеясловы, якія не могуць мець пры сабе прамога дапаўнення ў форме вінавальнага склону без прыназоўніка (дзеянне не пераходзіць на аб'ект): *сядзець, дзейнічаць, адпачываць, ехаць, сінець, сохнуць, плакаць, расці, цвісці*. Непераходныя дзеясловы звычайна абазначаюць стан і рух суб'екта.

Сярод непераходных дзеясловаў ёсць такія, што абазначаюць пераход дзеяння на аб'ект, які з'яўляецца ўскосным дапаўненнем (ускосным аб'ектам): *перашкаджаць брату, сумаваць па радзіме, завалодаць сэрцам, смяяцца з хлусні*. Такія дзеясловы часам называюць **ускосна-пераходнымі**.

Пераходныя і непераходныя дзеясловы не маюць спецыяльных марфалагічных паказчыкаў. Выключэнне складаюць выпадкі, калі да дзеяслова далучаецца постфікс ***-ся***. Кожны пераходны дзеяслоў пры

далучэнні *-ся* становіцца непераходным: *мыць – мыцца, сустракаць – сустракацца, узнімаць – узнімацца, здзіўляць – здзіўляцца, абмяркоўваць – абмяркоўвацца.*

Часам далучэнне прыстаўкі да непераходнага дзеяслова робіць яго пераходным: *дыміць – задыміць, дыхнуць – выдыхнуць, жыць – абжыць, працаваць – выпрацаваць.*

Пераходнасць – непераходнасць дзеяслова ў пэўнай ступені звязваецца з яго лексічным значэннем і словаўтваральнай структурай. Напрыклад, адыменныя дзеясловы з суфіксамі ***-іча-ць, -ніча-ць, -ствава-ць, -е-ць, -э-ць*** непераходныя: *арыгінальнічаць, важнічаць, фамільярнічаць, бяздзейнічаць, ліберальнічаць, дырэктарстваваць, днець, дзірванець, парахнець, сінець, бялець, цямнець, рыжэць, харашэць.* Дзеясловы, утвораныя ад выклічнікаў і гукапераймальных слоў, таксама непераходныя: *акаць, айкаць, ойкаць, нукаць, булькаць, хукаць.* Адыменныя дзеясловы з суфіксамі ***-і-ць, -ы-ць*** належаць да пераходных: *бяліць, сініць, маладзіць, поўніць, вузіць, бадзёрыць, сушыць.*

### 2.5. Зваротныя дзеясловы

**Зваротныя** дзеясловы – гэта дзеясловы з постфіксам ***-ся(-ца, -цца)***. Дзеясловы без гэтага постфікса – **незваротныя**.

Асноўная граматычная функцыя *-ся* – фармальна выражаць агульнае значэнне непераходнасці. Таму ўсе зваротныя дзеясловы непераходныя.

Постфікс *-ся* мае словаўтваральнае і формаўтваральнае значэнні. У сувязі з гэтым трэба адрозніваць самастойныя лексічныя адзінкі – асобныя словы і зваротныя формы незваротных дзеясловаў. Напрыклад, у словазлучэннях *сябры сустрэліся, вучні хвалююцца, дзеці купаюцца, голле калышацца -ся* ў зваротных дзеясловах з'яўляецца словаўтваральным, таму што гэтыя дзеясловы з'яўляюцца асобнымі словамі ў адносінах да адпаведных незваротных. Такія дзеясловы, як *красціся, валачыся, кіпяціцца, цягнуцца* і інш., зусім разышліся значэннем з адпаведнымі незваротнымі. Постфікс *-ся* мае формаўтваральнае значэнне ў дзеясловах залежнага стану. Такія дзеясловы ўтвараюцца толькі ад пераходных дзеясловаў: *настаўнік правярае сшыткі – сшыткі правяраюцца настаўнікам.*

Зваротныя дзеясловы са словаўтваральным постфіксам *-ся* ўтвараюцца ад пераходных і непераходных дзеясловаў. Зваротныя дзеясловы, утвораныя ад непераходных дзеясловаў, можна падзяліць на дзве асноўныя групы: дзеясловы, якія ўтварыліся шляхам далучэння постфікса *-ся*, і дзеясловы, утвораныя пры дапамозе прыстаўкі і *-ся.*

Постфікс *-ся*, далучаючыся да многіх непераходных дзеясловаў, пазбаўляе ўласцівай ім сувязі дзеяння з суб'ектам і ператварае асабовыя

дзеясловы ў безасабовыя, надаючы дзеянню міжвольны характар: *ён весела жыве – яму весела жывецца, добра працую – добра працуецца, хутка чытаю – хутка чытаецца, не сядзіць – не сядзіцца, не сплю – не спіцца*. Некаторым непераходным дзеясловам постфікс *-ся* надае адценне інтэнсіўнага дзеяння: *стукацца, прасіцца*. У асобных выпадках незваротны і зваротны дзеясловы выступаюць як сінонімы, постфікс *-ся* толькі больш падкрэслівае значэнне непераходнасці: *бялець – бялецца, зелянець – зелянецца, сінець – сінецца, дыміць – дыміцца, трапляць – трапляцца, пытаць – пытацца, заблудзіць – заблудзіцца: Зелянее траўка ў полі, у небе птушачкі пяюць* (Ч.). *Травіца зелянеецца, кветачкі цвітуць, ой, як прыгожа цвітуць!* (Куп.).

У сучаснай беларускай мове шырока ўжываюцца дзеясловы, утвораныя шляхам далучэння постфікса *-ся* і прыстаўкі адначасова. Зваротны дзеяслоў, утвораны такім чынам, можа мець значэнне выніку: *апомніцца, нагуляцца, адваявацца, выстаяцца, выкруціцца, даскакацца, дадумацца, зжыцца, ужыцца*; узмацнення, нарастання дзеяння: *разгарэцца, разгаварыцца, разгаманіцца*; вычарпальнасці дзеяння: *выплакацца, выстагнацца, выгуляцца, выгаварыцца, выспацца* і інш.

Сярод зваротных дзеясловаў ёсць такія, што не маюць адпаведных незваротных; яны ўжываюцца толькі з *-ся* (reflexiva tantum). Адны з такіх дзеясловаў адыменнага паходжання – маюць аднакаранёвыя назоўнікі ці прыметнікі: *гняздзіцца – гняздо, каласіцца – колас, кусціцца – куст, дзяцініцца – дзіця, бугрыцца – бугор, слязіцца – слёзы, купчасціцца – купчасты, храбрыцца – храбры*; другія ўтвораны ад дзеяслоўных асноў: *бадзяцца, важдацца, застацца, заляцацца, завіхацца, каяцца, квапіцца, кланяцца, спадзявацца, спрачацца, сумнявацца*. Некаторыя з падобных дзеясловаў у старажытнай агульнаўсходнеславянскай мове мелі адпаведныя незваротныя.

### 2.6. Катэгорыя стану дзеясловаў

Катэгорыя **стану** паказвае адносіны паміж суб'ектам (утваральнікам дзеяння), дзеяннем і аб'ектам, выражаючы гэта ў формах дзеяслова і ў сінтаксічнай канструкцыі. Яна грунтуецца на проціпастаўленні незалежнага і залежнага стану. Такая парная класіфікацыя станаў у мовазнаўстве вядома як бінарная. У лінгвістаў няма адзінага погляду на катэгорыю стану. Акрамя бінарнай тэорыі, існуюць і іншыя.

**Незалежны** стан паказвае, што дзеянне ўтварае суб'ект, які ў сказе з'яўляецца дзейнікам: *Архітэктар праектуе школу. Аўтар дапрацоўвае рукапіс. Прафесар прачытаў лекцыю. Студэнты вучацца*. Дзеясловы незалежнага стану не маюць спецыяльных сродкаў выражэння стану. Канструкцыі з дзеясловамі незалежнага стану называюць **актыўнымі**.

**Залежны** стан паказвае дзеянне як пасіўнае (залежнае ад іншай

асобы, прадмета) у адносінах да аб'екта, які ў сказе з'яўляецца дзейнікам, а суб'ект выступае дапаўненнем у творным склоне. Такі творны называецца творным дзейнага прадмета **(творным суб'екта)**. Дзеясловы залежнага стану ўтвараюцца ад пераходных дзеясловаў пры дапамозе постфікса *-ся*: *Школа праектуецца архітэктарам. Рукапіс дапрацоўваецца аўтарам.* Такія канструкцыі называюць **пасіўнымі**.

Абедзве канструкцыі абазначаюць тое самае дзеянне, але абазначаюць яго па-рознаму: актыўная канструкцыя мае значэнне 'суб'ект утварае дзеянне', а пасіўная – 'аб'ект прымае ўздзеянне суб'екта'.

Катэгорыя стану дзеясловаў цесна звязана з катэгорыяй трывання: ад пераходных дзеясловаў незакончанага трывання ўтвараюцца пераважна дзеясловы залежнага стану, а ад пераходных дзеясловаў закончанага трывання – дзеепрыметнікі залежнага стану: *праект зацвярджаецца міністэрствам, праект зацверджаны міністэрствам.*

Канструкцыі з дзеясловам залежнага стану бываюць двух відаў: з творным дзейнага прадмета і без творнага дзейнага прадмета.

Найбольш яскрава залежны стан праяўляецца ў першых канструкцыях, асабліва калі творны дзейнага прадмета абазначае асобу, групу людзей, калектыў. *На папярэдніх паказах я не быў, бо п'еса штораз і аўтарам і рэжысёрам* ***папраўлялася*** (Скр.) – параўн.: *Аўтар і рэжысёр папраўлялі п'есу...*

Канструкцыі без творнага дзейнага прадмета ў сучаснай беларускай мове ўжываюцца значна часцей, чым канструкцыі з творным дзейнага прадмета. Адсутнасць творнага дзейнага прадмета тлумачыцца па-рознаму. Напрыклад, у некаторых зваротных дзеясловах (*абмяркоўвацца, адсылацца, пасылацца, пералічвацца, расказвацца, распрацоўвацца, стварацца* і інш.) залежны стан абумоўліваецца іх семантыкай: *Нездарма кожны дзень дзесяткі і сотні заяў* ***прыносіліся*** *і* ***прысылаліся*** (Бяд.). *Для вядзення спраў саюза* ***выбіраецца*** *бюро ў складзе трох асоб: Садовіча, Райскага і Тукалы* (К-с).

Творны дзейнага прадмета можа не называцца і таму, што ўтваральнік дзеяння вядомы з папярэдняга кантэксту: *Часамі ён [Якуб Колас] намагаўся завяршыць пэўны раздзел трылогіі ў той самы дзень, калі пачынаў. Тады адпачынак* ***адмяняўся*** *ці* ***пераносіўся*** *на пазнейшы час* (Луж.).

У некаторых выпадках пры дзеясловах залежнага стану ўтваральнік дзеяння можа ўяўляцца няпэўна ці абагульнена, таму творны дзейнага прадмета таксама называецца. Такім залежным канструкцыям адпавядаюць незалежныя, якія з'яўляюцца аднасастаўным сказам (няпэўна-асабовым ці абагульнена-асабовым): *Міналі стагоддзі. Лясы* ***высякаліся, выпальваліся, выкарчоўваліся*** (В.В.) – параўн.: *Лясы высякалі, выпа-*

*львалі, выкарчоўвалі...*

Пры дзеясловах залежнага стану можа быць **творны сродку дзеяння**, які трэба адрозніваць ад творнага дзейнага прадмета: *Нездарма **пісаліся** на заявах сінімі алоўкамі, чырвоным атрамантам наўкосныя, перакрыжаваныя ўпоперак рэзалюцыі* (Бяд.) – параўн.: *Пісалі рэзалюцыі алоўкамі, атрамантам...*

Некаторыя мнагазначныя зваротныя дзеясловы ў адных выпадках адносяцца да залежнага стану, у другіх – да незалежнага: *Каменьчыкі **кідаліся** [настаўнікам] усё глыбей і глыбей* (Я.М.). *Дзед Талаш нарэшце з сякерай **кідаўся** на польскіх салдат* (К-с). У першым сказе дзеяслоў *кідацца* залежнага стану, а ў другім – незалежнага стану.

Катэгорыю стану маюць усе дзеясловы. Адны з іх могуць утвараць парныя станавыя адносіны (пераходны дзеяслоў незалежнага стану і ўтвораны ад яго дзеяслоў залежнага стану), другія з'яўляюцца аднастанавымі, яны адносяцца да незалежнага стану.

## 2.7. Паняцце трывання

Трыванне дзеяслова – граматычная катэгорыя, якая паказвае на адносіны дзеяння да яго мяжы, закончанасці. Катэгорыя трывання ахоплівае ўсе нормы дзеяслова. Выдзяляюцца два трыванні: незакончанае і закончанае.

Дзеясловы **незакончанага** трывання абазначаюць працягласць, развіццё, паўтаральнасць дзеянняў, не паказваючы на іх мяжу: *плыць, спяваць, будаваць, ісці, каваць, малаціць.*

Дзеясловы **закончанага** трывання абазначаюць дзеянні, якія паказваюць на іх мяжу, вынік, закончанасць: *паплыць, заспяваць, узараць, пабудаваць, прыйсці, выкаваць, змалаціць, стукнуць*. Значэнне закончанасці дзеяння мае толькі форма закончанага трывання прошлага часу: *даараў, пасеяў, вылечыўся*. Форма закончанага трывання будучага часу не можа абазначаць закончанага дзеяння. Яна паказвае, што дзеянне адбудзецца пасля моманту гутаркі, а той, хто гаворыць, упэўнены, што яно дасягне пэўнай мяжы, выніку: *даару, пасею, вылечышся*.

Дзеясловы незакончанага і закончанага трывання, лексічнае значэнне якіх супадае, утвараюць суадносную трывальную пару. Такія дзеясловы адрозніваюцца толькі граматычна: утваральныя сродкі змяняюць і граматычнае (трывальнае) значэнне, не ўплываючы на лексічнае: *чытаць – прачытаць, малоць – змалоць, мыць – памыць, рашаць – рашыць*. Калі ж дзеясловы незакончанага і закончанага трывання адрозніваюцца не толькі граматычна, а і лексічна, то яны не ўтвараюць суадноснай трывальнай пары: *будаваць – надбудаваць, араць – заараць, капаць – перакапаць, сеяць – высеяць*, суадносныя будуць: *надбудоўваць – надбудаваць, заворваць – заараць, перакопваць – перакапаць, высяваць*

– *высеяць.*

У сучаснай беларускай мове ёсць дзеясловы, якія не ўтвараюць трывальных пар. Іх называюць **аднатрывальнымі**, або **няпарнымі**. Адны з такіх дзеясловаў маюць толькі форму закончанага трывання: *размгаварыцца, расплакацца, прыдбаць, сурочыць, грымнуць, рынуцца* і інш., другія – толькі форму незакончанага трывання: *адсутнічаць, дзейнічаць, удзельнічаць, заляцацца, ганарыцца, нездаровіцца, прадчуваць, пахаджваць* і інш.

Не ўтвараюць формаў закончанага трывання дзеясловы, якія выступаюць звязкай пры выказніку: *быць, з'яўляцца, даводзіцца, лічыцца, значыць.*

Некаторыя дзеясловы ў адной лексеме сумяшчаюць значэнні абодвух трыванняў, таму іх называюць **двухтрывальнымі**: *адрасаваць, акцэнтаваць, актывізаваць, арандаваць, канкрэтызаваць, нейтралізаваць, радыёфікаваць, матываваць* і інш. Гэта пераважна дзеясловы з запазычанымі асновамі. Яны не маюць спецыяльных граматычных (трывальных) паказчыкаў, іх трыванне – закончанае ці незакончанае – высвятляецца з кантэксту, а таксама з дапамогай іншых дзеясловаў у сказе, якія маюць граматычныя паказчыкі трывання: *Увечары атрад атрымаў загад – атакаваць апоўначы станцыю, узарваць вагоны з боепрыпасамі і цыстэрны з гаручым* (І.М.). У гэтым сказе двухтрывальны дзеяслоў *атакаваць* мае значэнне закончанага трывання, таму што другі дзеяслоў у сказе – *узарваць* – закончанага трывання.

### 2.7.1. Утварэнне суадносных пар трывання

Суадносныя пары трывання ўтвараюцца пры дапамозе суфіксаў, прыставак, чаргавання ў аснове, змены месца націску і суплетывізму асноў.

**Суфіксальнае ўтварэнне**. Гэта прадуктыўны сродак утварэння незакончанага трывання ад закончанага. Ужываюцца наступныя суфіксы:

-ва-: *апраўдаць – апраўдваць, заплюшчыць – заплюшчваць, даказаць – даказваць*;

*-іва-(-ыва-)*: *атрымаць – атрымліваць, адрозніць – адрозніваць, падцерабіць – падцярэбліваць*;

*-оўва-(-ёўва-): аб'яднаць – аб'ядноўваць, выкарыстаць – выкарыстоўваць, параўнаць – параўноўваць*;

*-а-(-я-)*: *рашыць – рашаць, абвадніць – абвадняць, дазволіць – дазваляць, натхніць – натхняць.*

З дапамогай суфіксаў *-а-(-я-)* і *-ва-, -іва-(-ыва-)* могуць утварацца сінанімічныя формы дзеясловаў незакончанага трывання ад дзеясловаў закончанага трывання: *прыглушыць – прыглушаць, прыглушваць; апу-*

*стошыць – апусташаць, апустошваць; адшчапіць – адшчапляць, адшчэплiваць.*

Пры ўтварэнні незакончанага трывання шляхам суфіксацыі можа адбывацца чаргаванне гукаў у дзеяслоўнай аснове: *прычасаць – прычэсваць, абмяняць – абменьваць, абламаць – абломваць, прастудзіць – прастуджваць, вывесіць – вывешваць, зацікавіць – зацікаўліваць.*

**Прыставачнае ўтварэнне**. Прыстаўкі шырока выкарыстоўваюцца для ўтварэння дзеясловаў закончанага трывання ад дзеясловаў незакончанага трывання. Калі пры такім утварэнні лексічнае значэнне дзеяслова не змяняецца, то формы дзеясловаў закончанага і незакончанага трывання складаюць суадносную пару.

У сучаснай беларускай мове няма такіх прыставак, якія б служылі толькі для ўтварэння трывання. Тыя самыя прыстаўкі могуць быць і словаўтваральнымі, і формаўтваральнымі. Пры ўтварэнні закончанага трывання выкарыстоўваюцца прыстаўкі *а-(аб-), вы-, ад-, з-(с-, са-), на-, па-, пад-, пёра-, пра-, пры-, раз-, у-, уз-*. З іх найбольш часта ва ўтварэнні суадносных пар трывання ўжываюцца *па-, на-, з-(с-, са-), а-(аб-)*: *бяліць – пабяліць, маляваць – намаляваць, жаць – зжаць, планаваць – сплanаваць; шаляваць – ашаляваць.*

Аўтары некаторых дапаможнікаў (гл.: Современный русский язык / Под ред. В.М. Галкиной-Федорук. М., 1964, с. 148; Шуба П.П. Дзеяслоў у беларускай мове. Мн., 1968, с. 28–20) прапануюць прыём, які ў многіх выпадках дапамагае адрозніць словаформу ад слова (новай лексемы). Сутнасць яго ў наступным: калі ад прыставачнага дзеяслова нельга ўтварыць новай формы незакончанага трывання шляхам суфіксацыі, то перад намі не новае слова, а толькі форма закончанага трывання. Напрыклад: абедаць – *паабедаць, знаёміць – пазнаёміць* (няма «паабедваць», «пазнаёмліваць»).

Чаргаванне ў аснове. У парах трывання адбываецца чаргаванне нуля гука (у форме закончанага трывання) з гукам [і] ([ы]) (у форме незакончанага трывання): *адаслаць – адсылаць, адабраць – адбіраць, выбраць – выбіраць, назваць – называць, праспаць – прасыпаць.*

Змена месца націску. Пры гэтым сродку ўтварэння суадносных пар дзеяслоў закончанага трывання мае націск на прыстаўцы ці корані, незакончанага – на суфіксе *-а(-я-)*: *выклікаць – выклікаць, выразаць – выразаць, рассыпаць – рассыпаць, раскідаць – раскідаць.*

Суплетывізм асноў. Гэты сродак утварэння пар трывання ўжываецца ў сучаснай беларускай мове рэдка: *легчы – класціся, разысціся – разыходзіцца, увайсці – уваходзіць, узяць – браць, стаць – станавіцца.*

### 2.7.2. Ступеннае ўтварэнне трыванняў

Некаторыя дзеясловы шляхам паслядоўнага далучэння прыставак і

суфіксаў могуць утвараць не адну пару, а рады паслядоўных ступенных пераходаў, у якіх кожны раз мяняецца трыванне. Такі спосаб утварэння трыванняў называецца ступенным. Вызначаюцца тры ступені ўтварэння трыванняў – першая, другая і трэцяя.

Дзеясловы пры далучэнні прыстаўкі ў адным выпадку захоўваюць лексічнае значэнне, г. зн. утвараюць суадносную пару. Яны звычайна не даюць далейшага ўтварэння пар трывання: *бяліць – пабяліць, мыць – памыць*. У другім выпадку дзеясловы пры далучэнні прыстаўкі набываюць новае лексічнае значэнне і даюць далейшае ўтварэнне трыванняў.

Першая ступень: ад беспрыставачнага дзеяслова незакончанага трывання пры дапамозе прыстаўкі ўтвараецца дзеяслоў закончанага трывання: *бяліць – выбеліць, мыць – намыць*.

Другая ступень: ад утворанага прыставачнага дзеяслова закончанага трывання пры дапамозе суфікса ўтвараецца дзеяслоў незакончанага трывання: *выбеліць – выбельваць, намыць – намываць*.

Трэцяя ступень: ад атрыманага прыставачнага дзеяслова незакончанага трывання пры дапамозе прыставак ***на-*** ці ***па-*** утвараецца дзеяслоў закончанага трывання: *выбельваць – навыбельваць, намываць – панамываць*.

I ступень: *будаваць – збудаваць, будаваць – прыбудаваць*. II ступень: *прыбудаваць – прыбудоўваць*. III ступень: *прыбудоўваць – напрыбудоўваць*.

### 2.8. Паняцце катэгорыі ладу. Абвесны лад

**Катэгорыя ладу** абазначае адносіны дзеяслоўнага дзеяння да рэчаіснасці. Яна можа паказваць дзеянне як рэальнае ў цяперашнім, прошлым ці будучым часе або як нерэальнае – пажаданае, неабходнае, магчымае. У сучаснай беларускай мове вылучаюцца тры лады: абвесны, загадны і ўмоўны.

**Абвесны** лад выражае сцвярджэнне ці адмаўленне дзеяння, якое рэальна працякае ў цяперашнім, прошлым ці будучым часе: *Мы вітаем над светам дзён новых зару* (М.Т.). *Прыйшоў жаданы час спаткання* (К-с). *Не, не развітаюся ніколі з родным краем, дзе так светла нам* (Панч.).

Абвесны лад не мае спецыфічных марфалагічных паказчыкаў. Ён мае формы часу і гэтым адрозніваецца ад астатніх ладоў. Абвеснаму ладу ўласцівы таксама формы асобы і ліку.

**Загадны** лад паказвае, што асоба пабуджае каго-небудзь выканаць дзеянне. Пабуджэнне можа абазначаць загад, патрабаванне, прапанову, заклік, параду, просьбу і адносіцца не толькі да якой-небудзь асобы, але і да неадушаўлёных прадметаў, якія ўяўляюцца як адушаўлёныя: *Сябры мае, жыццё будуйце, гадуйце весела малых, усмешак людзям не шкадуйце і не шкадуйце тым хвалы, хто справу любіць больш за славу* (Панч.).

*Не спі, краса мая, прыйдзі паслухаць песню салаўя* (М. Т.). *Няхай у ясным небе цішыня заўсёды цішынёю застаецца* (Грах.).

Загаднаму ладу ўласціва асобая інтанацыя і экспрэсіўнасць. Дзеясловы загаднага ладу звычайна ўжываюцца без асабовага займенніка. Наяўнасць асабовага займенніка перад загаднай формай узмацняе катэгарычнасць загаду, а пасля яе – змякчае загад: *Дарог у свеце вельмі многа, а ты між іх сваю знайдзі. Няхай нялёгкая дарога, а ты ідзі, а ты ідзі!* (Бр.). *«Не чапайся ты з імі, няхай іх», – вучыла Зося свайго хлопца* (Б.).

Загадны лад мае пяць формаў: 2-й і 3-й асобы адзіночнага ліку, 1-й, 2-й і 3-й асобы множнага ліку.

Асноўнымі, найбольш ужывальнымі з'яўляюцца формы 2-й асобы адзіночнага і множнага ліку. Яны ўтвараюцца ад асновы цяперашняга часу і маюць разнавіднасці.

Дзеясловы з канчаткамі *-і, -ы* – гэта найбольш шматлікая група дзеясловаў загаднага ладу 2-й асобы адзіночнага ліку: *апрані, вазі, гавары, насі, кіпяці, мясі, касі, хадзі, знікні, мерзні, кладзі, беражы, пячы, сячы, кажы, пішы, тчы, калышы, скачы.*

Аднаскладовыя дзеясловы *біць, віць, ліць, піць* у 2-й асобе адзіночнага ліку загаднага ладу маюць форму *бі, ві, лі, пі.*

Дзеясловы з нулявым канчаткам (з асновай на зычны): *маж, рэж, сып, цеш, пазыч, сустрэнь, глянь, рашай, пытай, думай, слухай, хавай, шануй, малюй, снедай, вячэрай, шый, крый, мый.*

Форма 2-й асобы множнага ліку загаднага ладу ўтвараецца ад формы 2-й асобы адзіночнага ліку шляхам далучэння да яе постфікса ***-це***: *нясіце, плывіце, ідзіце, хадзіце, крычыце, гаварыце, думайце, рашайце, пытайце, піце, ліце, сустрэньце, сыпце.*

Формы 1-й асобы множнага ліку загаднага ладу называюць часам формамі сумеснага дзеяння. Яны маюць канчаткі *-ем(-эм, -ам), -ім(-ым).* Адны з гэтых формаў спецыфічныя для загаднага ладу: *нясем, хадзем, збярэм* і інш., другія супадаюць з формамі будучага простага часу абвеснага ладу: *глянем, пойдзем, напішам, спынім, сходзім, памаўчым* і інш. Таму ў апошнім выпадку пры выражэнні загаднага ладу важную ролю адыгрывае інтанацыя.

У некаторых паўднёва-заходніх гаворках ужываюцца формы 1-й асобы множнага ліку з канчаткам ***-ма***. Гэтыя дзеясловы ў 2-й асобе адзіночнага ліку загаднага ладу канчаюцца на зычны: *чытайма, спявайма, гляньма, уцякайма, хаваймася.* Такія формы дзеясловаў сустракаюцца ў мастацкай літаратуры: *«Уцякайма», – тузанула Валя старога* (І.М.). *Пацалуймася, брат!* (Лыньк.).

Форма 1-й асобы множнага ліку можа выражацца апісальна: часці-

цай *давай* і дзеясловам у форме будучага часу ці інфінітыва; калі дзеянне павінны выконваць больш як дзве асобы, то да часціцы *давай* далучаецца постфікс ***-це***: *Давай удвух сустрэнем ранне сярод туманнай сівізны* (Панч.). *Давайце дзейнічаць!* (Шам.).

Формы 3-й асобы адзіночнага і множнага ліку заўсёды аналітычныя: яны складаюцца з формаў цяперашняга ці будучага простага часу 3-й асобы адзіночнага або множнага ліку, якія тут страчваюць сваё часавае значэнне, і часціцы *няхай* (*хай*). Часцей за ўсё такія формы выражаюць пажаданне, заклік: *Скажы Валі, няхай прыедзе на колькі дзён* (Хадк.). *Нявер'е хай пажаўцелым лісцем ападзе* (Зв.). *Няхай жа на шчасце цвіце ваша доля* (Р.).

Формы загаднага ладу не заўсёды ўжываюцца са сваім прамым значэннем. Напрыклад, форма 2-й асобы адзіночнага ліку можа ўжывацца ў адносінах да некалькіх асоб. З адценнем зборнасці яна служыць для звароту да некалькіх асоб у гутарковай мове: *Лодкі, хлопцы, вяслуй на ўсход, да яснот, цёмны вір абмінай і вясну абнімай!* (Я.П.). *Дарогу! Дарогу! Разыдзіся!* (Бяд.). *«Мужыкі! – сказала Клейна. – А ну, кідай зброю»* (Каратк.).

Форма 2-й асобы загаднага ладу можа страчваць значэнне загаду, а набываць розныя адценні мадальнасці – магчымасці, неабходнасці, вымушанасці дзеяння: *«Так і прабасцяешся ўсё жыццё панскім сабакам, – злаяў Міхал сваю лесніковую службу. – Вартуй чужога, хадзі па чужым, жыві не ў сваёй хаце. А грызіся з сваімі»* (Луж.). *Толькі і ведаў тады: зараджай, страляй, ляці ў атаку, адступай, поўзай у акопе, дыхай парахавым дымам і прэллю сырой зямлі, гарачай крывёю і потам* (Грах.).

У дзеясловах успрыняцця, мовы і думкі ў форме загаднага ладу можа аслабляцца інтанацыя загаду, а часам – зусім сціраецца лексічнае значэнне, значэнне дзеяння: *Глядзі ты, яшчэ растуць!* (Луж.). *І вось, скажы ж ты, не паладзілі заневашта!* (К-с). *Скажы ты, як спрасавалася гліна!* (І.М.).

Формы загаднага ладу з *хоць* ужываюцца ва ўступальных канструкцыях, у параўнальных сказах і зваротах, якія маюць значэнне меры і ступені праяўлення дзеяння або стану: *Дзівіліся людзі і надзівіцца не маглі. Хоць вязі ў горад на паказ* (Бяд.). *А пасля, братка, як паднялі тарарам, – хоць уцякай!* (Б.).

Формы загаднага ладу могуць ужывацца са значэннем умовы: *Зайдзі ка мне – я даў бы хлеба* (Куп.). *Вось скруткі белага льнянога палатна, нібы сама заснула ў іх зіма, здаецца, расхіні – дыхнуць буранам снежным* (М. Т.).

Пабуджэнне да дзеяння можа выражацца не толькі формай загаднага ладу, а і іншымі дзеяслоўнымі формамі. Напрыклад, інфінітыў часта

выкарыстоўваецца для передачы катэгарычных загадаў, распараджэнняў: *Слухаць толькі ўважна, не перабіваць* (Куп.). *«Падрыхтавацца», – сказаў Мішка* (Каратк.).

Формы 2-й асобы будучага простага часу з загаднай інтанацыяй могуць служыць для выражэння распараджэнняў, у выкананні якіх упэўнены той, хто гаворыць: *Вернешся і будзеш чакаць мяне ў Н.* (К-с).

Форма прошлага часу некаторых дзеясловаў руху і канкрэтнага дзеяння з інтанацыяй запрашэння абазначае прапанову неадкладна прыступіць да сумеснага дзеяння: *Эй, вы, пайшлі!* (Б.). *Васіль як бы чамусьці сумеўся, але тут жа... бадзёра сказаў: «Пайшлі на плошчу»* (Шам.).

Загаднасць можа быць выражана прыслоўямі: *Цішэй, маленькая мая, цішэй* (Шам.). *Спакойна, сэрца!* (Зв.).

**Умоўны лад** абазначае дзеянне, якое ўяўляецца як пажаданае ці магчымае. Ажыццяўленне такога дзеяння залежыць ад пэўных умоў.

Умоўны лад мае аналітычную форму. Ён выражаецца дзеясловам у форме прошлага часу і часціцай *бы (б)*. Месца гэтай часціцы ў сказе рознае: яна можа знаходзіцца пры дзеяслове ці пры іншых словах: *Я Чорнае мора зялёным назваў бы, як толькі заціхнуць і бура і шторм* (Грах.). *А ў Палессе заляцеў калі б ты ў гэты час, убачыць быў бы рад: між былых багнішчаў эўкаліпты ўзнімаюць к сонцу бuслянят* (Панч.).

Умоўны лад не мае формаў часу і асобы, ён мае формы трывання: *шукаў бы, адшукаў бы, ссек бы*; роду: *пайшоў бы, пайшла б, пайшло б*; ліку: *пайшоў бы, пайшлі б.*

Умоўны лад мае некалькі значэнняў. Найбольш часта ён выражае магчымае дзеянне, ажыццяўленне якога залежыць ад іншага дзеяння ці абставін. Гэта значэнне выяўляецца пераважна ў складаных сказах, адна (ці некалькі) са структурных частак якіх змяшчае ўмову: *Не пісаў бы, не складаў бы я вас, думы-песні, каб не вецер шызакрылы, вецер напрадвесні* (М. Т.). *Быў бы ты жывы, Джэк Лондан, наглядзеўся б цудаў мноства* (Зв.).

Выражэнне ўмовы можа вынікаць з кантэксту ці з папярэдніх сказаў. *Нешта здарылася з Анісімам. І здарылася нядобрае. Інача ён ужо вярнуўся б* (Сач.).

У даданых частках складаназалежных сказаў дзеясловы ўмоўнага ладу могуць абазначаць розную ступень праяўлення дзеяння: тут ужываюцца спалучэнні *куды б ні, дзе б ні, што б ні, адкуль бы ні* і г. д.: *Куды б цябе ні завяла далёкая дарога, не забывай ніколі ты бацькоўскага парога* (Бр.).

Умоўны лад выражае таксама дзеянне са значэннем меркавання; такое дзеянне звязана з супрацьпастаўленнем: *А ён [журавель] хацеў бы вельмі ў звонкі ранак махнуць на ўсё – на вецер і мароз, пайсці і стаць*

*паміж магутных кранаў, ды ён стары і да зямлі прырос* (Бур.).

Умоўны лад перадае значэнне пажаданасці дзеяння: *Хутчэй бы прыйшла зіма, белая і маладая* (Панч.). *Вось цяпер прыехаў бы!* (Б.). Пажаданасць дзеяння можа выражацца інфінітывам у спалучэнні з часціцай ***бы***: *Так бы вербай стаяць пры дарозе і глядзець на наш родны прастор* (Маш.). *На міг бы стрэцца мне з гадамі, што адышлі з маёй вясной* (Бр.).

Умоўны лад можа ўжывацца са значэннем іншых ладоў. Значэнне абвеснага ладу ён мае ў сцвярджэннях-меркаваннях, парадах: *Ні ў кога з мясцовых людзей не ўзнялася б рука страляць па іх у такі час* (Каратк.). *Хацеў бы я час перасцерагчы: на новыя планеты летучы, глядзіце, каб хто не занёс з сабой туды прывычкі дрэннай і ліхой* (М.Т.).

Дзеясловы ўмоўнага ладу могуць ужывацца са значэннем, блізкім да загаднага. У такім выпадку яны перадаюць просьбу, параду з адценнямі нерашучасці, далікатнасці, мяккасці або, наадварот, з адценнем папроку, а таксама запрашэнне, прапанову выканаць дзеянне: *Можа б ты, сынок, збегаў да цёткі і паклікаў матку?* (К-с). *Вы, тата, прылеглі б дзе ды адпачылі* (В.).

### 2.9. Катэгорыя часу дзеясловаў

Катэгорыя часу выражае адносіны дзеяння да моманту гутаркі. Гэту катэгорыю маюць толькі дзеясловы абвеснага ладу. Адрозніваюць формы цяперашняга, прошлага і будучага часу.

У аснове вызначэння часу здзяйснення працэсу ляжыць абстрактны граматычны пункт адліку. Гэты пункт можа супадаць з момантам гутаркі ці не супадаць. Адрозніваюць абсалютнае і адноснае часавае значэнне дзеяслоўных формаў. Час называецца **абсалютным**, калі ў якасці зыходнага пункту вызначэння часавага плана выступае момант гутаркі: *Дрэмле вечар у ціхай дуброве, летняй стомаю ные зямля* (Ген.). *Віхрыўся бубен, струна звінела, стагнала дудка* (Панч.). Час называецца **адносным**, калі зыходным пунктам выступае не момант гутаркі, а час ажыццяўлення іншага дзеяння. Такія дзеяслоўныя формы сустракаюцца пераважна ў даданых частках складаназалежнага сказа: *Ніхто толкам не ведаў, куды і адкуль ідуць цягнікі* (Грах.) – у гэтым сказе дзеяслоў *ідуць* мае форму цяперашняга часу, але ён паказвае на супадзенне дзеяння не з момантам гутаркі, а з часам дзеяння дзеяслова *не ведаў*. Гэта значэнне формы *ідуць* і з'яўляецца яе адносным часавым значэннем.

Катэгорыя часу цесна звязана з катэгорыяй трывання дзеяслова. Дзеясловы незакончанага трывання маюць формы цяперашняга, прошлага і будучага складанага часу: *пішу, пісаў, буду пісаць*, а дзеясловы закончанага трывання – формы прошлага і будучага простага часу: *напісаў, напішу*.

### 2.9.1. Цяперашні час

Цяперашні час паказвае, што дзеянне, выражанае дзеясловам, супадае з момантам гутаркі: *Шуміць вецер з кронамі,* ***абтрасае*** *сон,* ***пахаджае*** *промнямі сонца ля вакон* (Ген.). Формы цяперашняга часу абазначаюць: дзеянне, якое адбываецца ў момант гутаркі, дзеянне пастаяннае або дзеянне, характэрнае для пэўнага прадмета.

Сістэму формаў цяперашняга часу складаюць тры асабовыя формы адзіночнага ліку і тры асабовыя формы множнага ліку: *будую, будуеш, будуе; будуем, будуеце, будуюць*. Канчаткі з'яўляюцца паказчыкам асобы і ліку, яны адначасова выступаюць і паказчыкам цяперашняга часу дзеяслова.

Формы цяперашняга часу могуць ужывацца са значэннем прошлага (цяперашні гістарычны). Такое ўжыванне цяперашняга часу з'яўляецца стылістычным сродкам: дапамагае больш вобразна, жыва паказаць падзеі, што адбываліся ў мінулым. На тое, што падзеі адбываліся ў прошлым часе, паказвае кантэкст, іншыя дзеясловы прошлага часу ці часціца *бывала*: *Дзядзьку ў рыбе* ***шанцавала***. ***Бывала****, пострыжні* ***паправіць****, на шчупакоў* ***нясе*** *і* ***ставіць*** (К-с).

Цяперашні час можа ўжывацца і са значэннем будучага. У такім выпадку дзеяслоў абазначае дзеянне, якое або павінна адбыцца неадкладна пасля моманту гутаркі, або акрэслена пэўным прамежкам часу: *«Так, – кажа Буднік, – значыць* ***еду****, пара ў вагон»* (Гал.). *Праз два гады* ***канчаю*** *інстытут.*

### 2.9.2. Будучы час

Будучы час выражае дзеянне, якое будзе адбывацца ці адбудзецца пасля моманту гутаркі: *Жывеш і* ***будзеш жыць*** *ты, песня матчына, пакуль народа сэрца будзе біцца!* (Гіл.).

Існуюць формы будучага простага (сінтэтычныя) і будучага складанага (аналітычныя) часу. Яны адрозніваюцца паміж сабой утварэннем і значэннем. Формы будучага простага часу ўтвараюцца ад асновы цяперашняга часу дзеясловаў закончанага трывання пры дапамозе тых самых канчаткаў асобы і ліку, што і пры ўтварэнні формаў цяперашняга часу: *пабудую, пабудуеш, пабудуе; пабудуем, пабудуеце, пабудуюць*. Формы будучага складанага часу ўтвараюцца аналітычна ад дзеясловаў незакончанага трывання і з'яўляюцца спалучэннем формы будучага часу дапаможнага дзеяслова *быць* з інфінітывам: *буду працаваць, будзеш працаваць, будзе працаваць; будзем працаваць, будзеце працаваць, будуць працаваць*.

Значэнне формаў будучага часу цесна звязана з катэгорыяй трывання дзеяслова. Выражаючы тое самае значэнне працякання дзеяння пасля

моманту гутаркі, формы будучага часу розных трыванняў канкрэтызуюць і ўдакладняюць яго.

Формы будучага часу дзеясловаў незакончанага трывання (будучага складанага) звычайна ўжываюцца для абазначэння працяглых або паўтаральных дзеянняў, не паказваючы на іх закончанасць або вынік: *На расквечанай паляне, ля ўрачыстага кастра, легендарныя паданні* ***будзе слухаць*** *дзетвара* (Ал.).

Формы будучага часу дзеясловаў закончанага трывання (будучага простага) абазначаюць дзеянні, у выкананні якіх упэўнены той, хто гаворыць: *Вясна прыйдзе, снег пагіне* (К-с).

Будучы просты час мае некалькі значэнняў. Асноўнае з іх – будучае дзеянне з адценнем закончанасці, дасягнення выніку: *О, калі ж яны* ***прыдуць****, гады алівы, што галінамі шар зямны* ***абаўе****?* (Караткя.).

Будучы просты час у складаных сказах можа паказваць на ўмову ці вынік дзеяння: *А* ***з'ясі*** *ты з бульбай скварку – і работа* ***пойдзе*** *шпарка* (Р.). *А шахцёру як ты* ***спадабаешся****, – пад зямлёй ад яго не* ***схаваешся*** (Р.)

Будучы просты час можа мець абагульненае значэнне. Часта з такім значэннем ён ужываецца ў прыказках, прымаўках: *Здароўя не* ***купіш****. Агню агнём не* ***патушыш****. Не шукаючы, не* ***знойдзеш****. Надвор'я не* ***нагрэеш****.*

Формы будучага простага часу могуць ужывацца са значэннем іншага часу. Са значэннем цяперашняга часу будучы просты сустракаецца пераважна ў апісаннях, дзе ён ужываецца побач з цяперашнім часам: *Размернымі ціхімі крокамі ідзе ён [Тарэнта] па мяжы...* ***Пройдзе*** *крыху і* ***стане****,* ***азірнецца*** *назад, тады зноў ідзе...* (Гал.).

Са значэннем прошлага часу будучы просты ўжываецца ў спалучэнні з прошлым незакончанага трывання або з часціцай *бывала*: *Ён [прафесар] прыпамінае, як прыехаў сюды ўпершыню.* ***Быў*** *гэтак жа канец чэрвеньскага сонечнага дня. Проста перад вачыма высокая сцяна стромкіх сосен, за якімі* ***хавалася*** *сонца. Зрэдку яго прамень іскрамі* ***блісне*** *праз гушчар зялёных цёмных верхавін,* ***рассыплецца*** *па жоўтым пяску пляцоўкі і згасне* (Гал.). ***Паддасць, бывала****, дзядзька руху, пачуўшы холад-завіруху* (К-с).

Будучы просты час можа абазначаць нечаканае, імгненнае дзеянне ў мінулым. У такіх выпадках пры дзеяслове ўжываюцца ўзмацняльныя часціцы *як, калі*: *А потым брама адчынілася – і адтуль* ***як павaліць*** *народ!* (Я.М.).

### 2.9.3. Прошлы час

Прошлы час абазначае дзеянне, якое адбывалася ці адбылося да моманту гутаркі: *Мы* ***секлі*** *лес,* ***часалі*** *шпалы,* ***калолі*** *тоўстыя камлі і к*

*дваццаці гадам нямала ўжо* ***зрабілі*** *на зямлі* (Грах.).

Прошлы час дзеяслова ўтвараецца ад асновы інфінітыва пры дапамозе суфікса ***-л-(-ў)*** і адпаведных канчаткаў: для жаночага роду адзіночнага ліку – *-а*, для ніякага – *-а(-о)*, дзеясловы мужчынскага роду маюць нулявы канчатак, а ўсіх родаў у множным ліку – *-і: працаваць – працаваў, працавала, працавалі.*

Пры ўтварэнні формаў прошлага часу можна адзначыць некаторыя асаблівасці. Дзеясловы, аснова інфінітыва якіх канчаецца на зычны, у форме мужчынскага роду прошлага часу суфікса ***-л(-ў)*** не маюць: *везці – вёз, несці – нёс, лезці – лез, паўзці – поўз, церці – цёр, грызці – грыз.*

Дзеясловы, якія ў інфінітыве канчаюцца на ***-сці*** і ў цяперашнім часе маюць аснову на ***д, т***, у прошлым часе страчваюць [д], [т], а суфікс *-л(-ў)* далучаецца да галоснага асновы: *весці, вяду – вёў, вяла, вялі; плесці – плёў, пляла, плялі; класці – клаў, клала, клалі; мес-ці – мёў, мяла, мялі.*

Дзеясловы на ***-чы*** пасля галоснага аднаўляюць [к] у прошлым часе: *пячы – пёк, пякла, пякло, пяклі; валачы – валок, валакла, валакло, валаклі.* Астатнія дзеясловы ў прошлым часе захоўваюць той зычны, які знаходзіцца ў інфінітыве перад ***-чы***.

Дзеясловы са значэннем змены стану тыпу *кіснуць, мокнуць* у прошлым часе страчваюць суфікс ***-ну-***: *кіснуць – кіс, мокнуць – мок, сохнуць – сох.*

Значэнні прошлага часу звязаны з трываннем дзеясловаў. Прошлы час незакончанага трывання абазначае дзеянні як факт мінулага, не паказваючы на іх паслядоўнасць. Такія формы часта выкарыстоўваюцца пры апісаннях: *Не даходзячы да лукі, выгнуўшыся яшчэ раз каля лесу вельмі прыгожаю дугою, Нёман* ***забіраў*** *управа, пралёгшы роўнаю, бліскучаю стужкаю паміж лугамі і полем. На адным канцы дугі стаялі кучаравыя пышныя хвоі, звесіўшы над вадою махрыстыя галіны і аплёўшы пясчаны бераг цэлаю сеткаю смаляных карэнняў. За імі* ***пачыналіся*** *маладыя сакавітыя баравіны, перамешаныя са старым лесам...* (К-с).

У некаторых апісаннях падкрэсліваецца паўтаральнасць дзеяння ў мінулым: *Штодня мы* ***слалі*** *радыёграмы –* ***прасілі*** *прыслаць самалёты. Амаль штодня* ***атрымлівалі*** *адказы, што заўтра-паслязаўтра самалёт вылятае. Але дарэмна мы* ***чакалі, не спалі*** *начамі* (Шам.).

Дзеясловы прошлага часу закончанага трывання абазначаюць: закончанае дзеянне ў мінулым: ***Расцвілі*** *пад восень кветкі* (К.Б.); паслядоўнасць закончаных дзеянняў у мінулым: *Стол* ***заслалі, прынеслі*** *талеркі з вяндлінаю, якую так добра ўмеюць прыгатаўляць на Беларусі, і* ***селі*** *піць чай* (К-с); дзеянне, якое адбылося ў мінулым, але вынік яго захаваўся і ў момант гутаркі (значэнне былога перфекта): ***Сышліся*** *горы ўшчыльную каля замшэлае скалы* (Грах.).

У беларускай мове, акрамя простай формы прошлага часу, ёсць і складаная. Яна ўтвараецца з дзеяслова ў прошлым часе і дапаможнага дзеяслова *быць*. Дапаможны дзеяслоў мае тыя самыя формы роду і ліку, што і асноўны дзеяслоў: *быў напісаў, была напісала, было напісала, былі напісалі*. Такая форма пераважна ўжываецца ў гутарковай мове. Яна абазначае даўно мінулае дзеянне, якое адбылося раней за іншае мінулае дзеянне (значэнне старажытнага плюсквамперфекта). Часта складаная форма прошлага часу надае дзеянню адценне перарванасці, супрацьпастаўлення: дзеянне, абазначанае складанай формай, перапыняецца або не можа адбыцца з-за іншага дзеяння, выражанага простай формай: *Людзі **кінуліся былі** ўцякаць, але, убачыўшы партызан, высыпалі на вуліцу* (Лыньк.).

Форма прошлага часу можа выражацца спалучэннем дзеяслова з часціцай *бывала*, якая заўсёды надае дзеянню адценне паўторнасці: ***Любіў** я некалі, **бывала**, глядзець, як ліўся дождж суздром...* (Бач.).

Дзеясловы прошлага часу могуць ужывацца са значэннем будучага, калі дзеянне павінна адбыцца адразу пасля моманту гутаркі: *«Нічога, Толя, – сказала Люда, – пакуль я снеданне зраблю, ты зловіш яшчэ. Ну, я **пайшла**»* (Б.).

У гутарковай мове, а таксама ў тэкстах мастацкіх і фальклорных твораў даволі шырока ўжываюцца формы прошлага часу з раптоўнаімгненным значэннем кшталту *бразь, бултых, бух, бульк, круць, глядзь, скок, стук, лясь*: *А і Марылька набрала кашы ды **бразь** лыжкай па лаве* (Б.). Гэтыя словы суадносяцца з формамі прошлага часу аднакратных дзеясловаў з суфіксам ***-ну-***: *глянуць – глянуў* і *глядзь*, *бразнуць – бразнуў* і *бразь*. Аднак словы тыпу *бразь*, *бульк* больш экспрэсіўныя, яны абазначаюць раптоўнае, імгненнае дзеянне (гучанне ці рух) суб'екта. Большасць з іх сумяшчаюць дзеяслоўныя і гукапераймальныя значэнні.

## 2.10. Катэгорыя асобы дзеясловаў

Катэгорыя асобы паказвае на адносіны дзеяння і яго ўтваральніка (суб'екта) да таго, хто гаворыць. Утваральнікам дзеяння можа быць асоба, якая гаворыць, яе субяседнік або той, хто не ўдзельнічае ў размове. У залежнасці ад гэтага выдзяляюцца тры асобы дзеяслова: першая, другая і трэцяя.

Сістэма формаў, якая абслугоўвае ўласна катэгорыю асобы, складаецца з трох формаў адзіночнага і трох формаў множнага ліку ў абвесным ладзе. У загадным ладзе маецца пяць формаў: дзве формы адзіночнага ліку і тры формы множнага ліку.

Паказчыкам асобы служыць канчатак асабовай формы, які адначасова выражае значэнне ладу і ліку, а ў абвесным ладзе – і значэнне цяперашняга часу. Формы прошлага часу абвеснага ладу і формы ўмоўнага

ладу не маюць паказчыкаў асобы, пры іх такімі паказчыкамі могуць быць асабовыя займеннікі або назоўнікі: *ты чытаў (бы), ён чытаў (бы), рабочыя пабудавалі (б).*

Асабовыя формы дзеяслова маюць пэўныя значэнні. Форма дзеяслова **першай** асобы адзіночнага ліку абазначае дзеянне таго, хто гаворыць: *я вучу, еду, сяджу, расказваю, хвалююся*. Гэта форма ў кантэксце можа паказваць на абагульнена-асабовае значэнне: *Чужую бяду рукой развяду* (Пр.) Форма дзеяслова першай асобы множнага ліку абазначае сумеснае дзеянне таго, хто гаворыць, і іншай асобы (іншых асоб): *мы вучым, едзем, сядзім, расказваем, хвалюемся*. Форма дзеяслова 1-й асобы множнага ліку можа ўжывацца замест 2-й асобы адзіночнага і множнага ліку з адценнем спачування, спагадлівасці або фамільярнасці: *«Як мы сябе адчуваем сёння?» – звярнуўся доктар да Віталіка* (П.К.). Бародка ласкава пахлопаў яе па плячы: *«Чытаем, дачка? Чытай, чытай, пакуль ёсць магчымасць»* (Шам.). Часам 1-я асоба множнага ліку абазначае абагульнена-асабовае дзеянне: *Як маем, так ужываем* (Пр.).У навуковых працах нярэдка аўтар ужывае форму дзеяслова 1-й асобы множнага ліку са значэннем адзіночнага (т. зв. «аўтарскае мы»).

Форма дзеяслова **другой** асобы адзіночнага ліку абазначае дзеянне субяседніка: *ты вучыш, едзеш, сядзіш, расказваеш, хвалюешся*. Такая форма можа мець абагульнена-асабовае значэнне: *Гуляючы, розуму не прыдбаеш* (Пр.).

Форма дзеяслова 2-й асобы множнага ліку паказвае на дзеянне групы асоб, да якіх звяртаюцца з гаворкай, або на сумеснае дзеянне субяседніка з іншай асобай (іншымі асобамі): *вы вучыце, едзеце, расказваеце, хвалюецеся*. Форма дзеяслова 2-й асобы множнага ліку ўжываецца пры ветлівым звароце да субяседніка: *Арэшкін сказаў: «А вы ўсё прыгажэеце, Марына Астапаўна!»* (Шам.). Гэта форма можа мець і абагульнена-асабовае значанне: *Перабраўшыся на левы, лугавы бераг Сажа, вы трапляеце на вельмі здабытлівыя рыбацкія мясціны* (Кір.).

Форма дзеяслова **трэцяй** асобы адзіночнага ліку паказвае дзеянне суб'екта, які не ўдзельнічае ў размове. Утваральнікам дзеяння можа быць адушаўлёны і неадушаўлёны прадмет: *ён (яна, яно) вучыць, едзе, сядзіць, расказвае, хвалюецца; дрэва зеляне, сад цвіце*. Форма дзеяслова 3-й асобы множнага ліку абазначае дзеянне асоб ці прадметаў, пра якія ідзе размова: *яны вучаць, едуць, сядзяць, расказваюць, хвалююцца; дрэвы зеляне-юць, сады цвітуць*. Гэту форму актыўна ўжываюць з абагульнена-асабовым ці няпэўна-асабовым значэннем: *У лес дроў не возяць* (Пр.). *Пасля таго, як Ніна вярнулася з Мінска, яе паслалі да сувязных у мястэчка* (І.М.).

Некаторыя дзеясловы не маюць формаў 1-й і 2-й асобы: *бялець,*

*бялецца, святлець, святлецца, цямнець, цямнецца, зелянець, зелянецца* і пад. са значэннем 'выдзяляцца пэўным колерам', а таксама дзеясловы *разрасціся, набухнуць, распаўсюджвацца, сплюшчыцца* і інш., што абазначаюць дзеянні, утваральнікам якіх не можа быць асоба.

Дзеясловы, якія маюць формы словазмянення па асобах, называюцца **асабовымі**. Асабовым дзеясловам процiпастаўляюцца дзеясловы безасабовыя.

### 2.10.1. Безасабовыя дзеясловы

Безасабовыя дзеясловы абазначаюць дзеянне, якое адбываецца як бы само па сабе, без дзеючай асобы або прадмета. Яны з'яўляюцца выказнікам у неасабовых сказах, у якіх няма дзейніка: *У той год з вясны вельмі дажджыла* (Сач.). *Парыць, вельмі парыць* (Сач.). *Паволі святлела* (І.М.).

Безасабовыя дзеясловы не змяняюцца па асобах, г. зн. не маюць катэгорыі асобы. Яны ўжываюцца ва ўсіх формах часу абвеснага ладу, але найбольш характэрныя для іх формы цяперашняга і прошлага часу. У цяперашнім (будучым простым) часе безасабовыя дзеясловы супадаюць (аманімічныя) з формай 3-й асобы адзіночнага ліку, а ў прошлым – з формай ніякага роду: *світае, днее, звечарэе; світала, днела, звечарэла*. Безасабовыя дзеясловы могуць мець форму ўмоўнага ладу і інфінітыва: *світала б, падмарожвала б; пачне світаць, стала падмарожваць*.

Безасабовыя дзеясловы пераважна абазначаюць: з'явы прыроды: *вечарэе, днее, світае, марозіць, змяркаецца;* фізічны і псіхічны стан чалавека ці іншай жывой істоты: *нездаровіцца, калоціць, нядужыцца, дыхаецца, працуецца, верыцца, думаецца, жадаецца*; магчымасць, неабходнасць дзеяння і г. д.: *прыйшлося (лічыцца), спатрэбіцца (праверыць), пашчасліваіцца (прыехаць), трапляецца (паглядзець)*; дзеянне невядомай або стыхійнай сілы: *нясе, шанцуе, цягне, замяло (снегам), зацерушыла (лісцем)*.

Безасабовыя дзеясловы могуць быць незваротныя і зваротныя. Сярод незваротных дзеясловаў выдзяляюцца: уласна безасабовыя дзеясловы: *вечарэе, світае, днее, марозіць*; асабовыя дзеясловы, якія ўжываюцца са значэннем безасабовых; параўн.: *Пахне вільгаццю, нейкімі рачнымі водарасцямі* (Сач.) і *Пахне восень бульбаю, кмінам і цыбуляю, перагрэтай лебядой, мутнаватаю вадой* (Панч.). Некаторыя безасабовыя дзеясловы гэтай падгрупы адрозніваюцца значэннем ад адпаведных асабовых; параўн.: *Рыбак цягне сетку і Цягне вільгаццю. Звініць званок і Звініць у галаве.*

Безасабовыя зваротныя дзеясловы складаюць шматлікую групу. Яны ўтвараюцца ад незваротных асабовых (галоўным чынам непераходных) дзеясловаў у форме 3-й асобы адзіночнага ліку далучэннем по-

стфікса *-ся*. Пры гэтых безасабовых дзеясловах звычайна ўжываецца залежнае слова ў давальным склоне (давальны адрасата): *Маладзейшым не сядзелася* (Кр.). Такога залежнага слова пры безасабовым зваротным дзеяслове можа і не быць, калі асоба, да якой адносіцца дзеянне, вядома з кантэксту або ўяўляецца абагульнена: *У маладосці рэдка здараецца, каб не спалася, хіба толькі ў часы цяжкіх перажыванняў, гора* (Шам.).

У беларускай мове ўжываюцца ўстойлівыя звароты, якія складаюцца з безасабовага дзеяслова *брацца*, прыназоўніка *на* і назоўніка ў вінавальным склоне. Дзеяслоў *брацца* мае тут значэнне наступлення, пачатку таго, што абазначана назоўнікам. З гэтым дзеясловам ужываюцца пераважна назоўнікі, якія абазначаюць з'явы прыроды: *Бралася на мароз. Бярэцца на вясну (на зіму, на світанне, на дзень, на ноч* і г. д.). Блізкія да гэтых структурай словазлучэнні з безасабовымі дзеясловамі *займацца, збірацца*: *Займаецца на світанне (на золак, на дзень). Збіраецца на дождж (на навальніцу).*

### 2.11. Спражэнне дзеясловаў

Спражэнне – гэта змяненне дзеясловаў па асобах і ліках у цяперашнім (будучым простым) часе абвеснага ладу.

У залежнасці ад канчаткаў формаў цяперашняга (будучага простага) часу ўсе дзеясловы падзяляюцца на два спражэнні – першае (I) і другое (II). У 1-й асобе адзіночнага ліку канчаткі дзеясловаў абодвух спражэнняў супадаюць, а ў астатніх асобах (2-я і 3-я адзіночнага ліку, 1-я, 2-я, 3-я множнага ліку) дзеясловы I і II спражэнняў маюць розныя канчаткі.

Дзеясловы **першага** спражэння маюць такія канчаткі:

| адзіночны лік | множны лік |
|---|---|
| 1-я -у(-ю) | 1-я -ём(-ем, -ом, -ам) |
| 2-я -еш(-эш, -аш) | 2-я -еце(-яце, -ацё) |
| 3-я -е(-э, -а) | 3-я -уць(-юць) |

Дзеясловы **другога** спражэння маюць наступныя канчаткі:

| адзіночны лік | множны лік |
|---|---|
| 1-я -у(-ю) | 1-я -ім(-ым) |
| 2-я -іш(-ыш) | 2-я -іце(-ыце) |
| 3-я -іць(-ыць) | 3-я -аць(-яць) |

Найбольш выразна дзеясловы I і II спражэнняў адрозніваюцца ў 3-й асобе адзіночнага і множнага ліку. Па гэтай форме часта можна вызначыць тып спражэння.

Дзеясловы I і II спражэнняў лёгка вызначаюцца, калі ў асабовых формах націск падае на канчатак: *вядзеш, гнеш, сядзіш, маўчыш; вядзе, гне, сядзіць, маўчыць; вядуць, гнуць, сядзяць, маўчаць*. Калі ж у асабовых формах націск не на канчатку, то могуць сустрэцца цяжкасці ў вызначэн-

ні спражэння. Дакладнае вызначэнне яго неабходна, каб правільна ўтварыць формы дзеепрыметнікаў і дзеепрыслоўяў, а таксама правільна пісаць дзеяслоў. Вызначыць тып спражэння ў дзеясловах з ненаціскнымі канчаткамі ў асабовых формах дапамагае інфінітыў.

Да II спражэння адносяцца дзеясловы, якія ў інфінітыве заканчваюцца:

на *-іць(-ыць)*, дзе *-і-(-ы-)* суфікс: *бяліць, мясіць, касіць, варыць, вучыць, гаварыць*. Аднаскладовыя дзеясловы тыпу *біць, віць, крыць, ліць, мыць, піць, рыць, шыць*, якія заканчваюцца ў інфінітыве на *-ць* і ў якіх *-і-(-ы-)* не з'яўляецца суфіксам, адносяцца да I спражэння;

*-ець(-эць)*, калі *-е-(-э-)* не захоўваецца ў 1-й асобе адзіночнага ліку цяперашняга часу: *глядзець (гляджу), ляцець, цярпець, сядзець, гарэць* (выключэнне – дзеяслоў *хацець*, які адносіцца да I спражэння).

Да II спражэння таксама адносяцца дзеясловы *гнаць, належаць, спаць, стаяць, баяцца.*

Усе астатнія дзеясловы належаць да I спражэння.

### 2.11.1. Рознаспрагальныя дзеясловы

Рознаспрагальнымі традыцыйна называюць дзеясловы *бегчы, даць, есці* і вытворныя ад іх, якія ў адных формах маюць канчаткі, уласцівыя I спражэнню, у другіх – канчаткі, уласцівыя II спражэнню, або спецыфічныя канчаткі. Дзеяслоў *бегчы* ў 3-й асобе множнага ліку мае канчатак I спражэння, а ва ўсіх астатніх – канчаткі II спражэння: *бяг-у, бяж-ыш, бяж-ыць; бяж-ым, беж-ыце́, бяг-уць*.

Дзеяслоў *есці* ва ўсіх трох асобах не мае тэматычнага галоснага. У дзеясловах *есці*, *даць* у форме множнага ліку канчатак 1-й асобы супадае з канчаткам II спражэння, канчатак 3-й асобы – з канчаткам I спражэння, а канчатак 2-й асобы і ўсе канчаткі адзіночнага ліку спецыфічныя, не ўласцівыя ні I, ні II спражэнню:

| адзіночны лік | множны лік |
|---|---|
| 1-я *е-м да-м* | 1-я *ядз-ім дадз-ім* |
| 2-я *я-сі да-сі* | 2-я *я-сце да-сце́* |
| 3-я *е-сць да-сць* | 3-я *яд-уць дад-уць* |

Дзеяслоў *даваць* у цяперашнім часе спрагаецца, як дзеяслоў I спражэння: *да-ю, да-еш, да-е, да-ём, да-яце́, да-юць.*

## 2.12. Утварэнне дзеясловаў

Сярод усіх часцін мовы дзеяслоў валодае самым высокім словаўтваральным патэнцыялам. На базе дзеяслова ўтвараюцца словы ўсіх асноўных часцін мовы – назоўнікі, прыметнікі, прыслоўі, дзеясловы. Разнастайныя дзеяслоўныя формы пераходзяць у безасабова-прэдыкатыўныя словы, прыназоўнікі, часціцы.

Дзеясловы ўтвараюцца ад назоўнікаў, прыметнікаў, займеннікаў, лічэбнікаў, прыслоўяў, выклічнікаў, гукапераймальных слоў і ад саміх дзеясловаў пераважна шляхам **марфалагічных** (афіксальных) спосабаў словаўтварэння: суфіксальнага, прыставачнага, постфіксальнага, прыставачна-суфіксальнага, суфіксальна-постфіксальнага, прыставачна-постфіксальнага, прыставачна-суфіксальна-постфіксальнага. Вельмі рэдка дзеясловы ўтвараюцца шляхам складання.

**Суфіксальным** спосабам дзеясловы ўтвараюцца ад назоўнікаў, прыметнікаў, рэдка – ад лічэбнікаў, займеннікаў, выклічнікаў ці гукапераймальных слоў.

Ад назоўнікаў найбольш прадуктыўнае ўтварэнне дзеясловаў пры дапамозе суфіксаў:

***-ава-(-ява-)****: вапна – вапнаваць, група – групаваць, зіма – зімаваць, лета – летаваць, крэдыт – крэдытаваць, дзень – дняваць, нікель – нікеляваць;*

***-ізава(-ызава-), -ірава-(-ырава-)****: шпіталь – шпіталізаваць, дэталь – дэталізаваць, догма – дагматызаваць; браня – браніраваць, афіша – афішыраваць;*

***-і-(-ы-), -е-****: воск – вашчыць, крухмал – крухмаліць, масла – масліць, партызан – партызаніць, гаспадар – гаспадарыць, мох – імшыць; парахня – парахнець, хмель – хмялець;*

***-ніча-****: ліберал – лібералънічаць, сталяр – сталярнічаць, гультай – гультайнічаць.*

Ад прыметнікаў прадуктыўнае ўтварэнне дзеясловаў пры дапамозе суфіксаў:

***-і-(-ы-)****: белы – бяліць, сіні – сініць, вясёлы – весяліць, кіслы – кісліць, малады – маладзіць, хітры – хітрыць;*

***-е-(-э-)****: сівы – сівець, чорны – чарнець, ясны – яснець, багаты – багацець, благі – блажэць, глухі – глушэць;*

***-ава-****: мілы – мілаваць, мудры – мудраваць, люты – лютаваць, хітры – хітраваць.*

Дзеясловы, утвораныя суфіксальным спосабам ад іншых часцін мовы, нешматлікія: ад лічэбнікаў: *дваіць, траіць, чацвярыць, пяцярыць*; ад займеннікаў: *якаць, тыкаць, выкаць*; ад выклічнікаў і гукаперайманняў: *ойкаць, айкаць, вохкаць, ахкаць, мяўкаць, кукарэкаць, гаўкаць, дзынкаць.*

**Прыставачны** спосаб пашыраны пры ўтварэнні дзеясловаў ад дзеяслоўных асноў. Найбольш прадуктыўныя наступныя прыстаўкі:

***аб-(аба-, а-)****: абламаць, абысці, аб'ехаць, абмераць, абагнаць, авеяць;*

***ад-(ада-)****: ад'ехаць, аднесці, адшукаць, адпрацаваць, адабраць,*

*адагнаць;*

***вы-**: выйсці, выехаць, выскачыць, вылушчыць, выхадзіць, выжыць;*

***да-**: дабегчы, дайсці, даехаць, даплыць, дабудаваць, дайграць;*

***з-(с-, са-), за-**: змыць, зрэзаць, спіліць, склеіць, сабраць, сагнаць; зайсці;*

***на-**: навучыць, намалаціць, наляцець, накіпець, наляпіць, накінуць;*

***неда-**: недагаварыць, недагледзець, недаесці, недасаліць, недаспаць;*

***па-**: паехаць, пайсці, пагаварыць, пакруціць,* прэфікс ***па-*** можа далучацца да прыставачных дзеясловаў: *павыбіраць, пазбіваць, пазаворваць, паадчыняць;*

***пад-(пада-)**: падкласці, падбіць, падляцець, падаслаць, падаткнуць;*

***пера-**: перайсці, пераехаць, пераляцець, перачытаць, перакіпець;*

***пра-**: прабегчы, праскочыць, праплысці, правезці, прамаўчаць;*

***пры-**: прыехаць, прыляцець, прыбегчы, прыбудаваць, прымірыць;*

***раз-(рас-, раза-)**: разліць, размарозіць, рассеяць, раскласці, разамлець;*

***у-(ува-)**: уехаць, увезці, убегчы, уплесці, ушыць, увагнаць, увабраць;*

***уз-(уза-, ус-)**: уз'ехаць, узысці, узбегчы, узарваць, ускінуць, ускалыхнуць.*

**Постфіксальным** спосабам дзеясловы ўтвараюцца ад дзеясловаў пры дапамозе толькі постфікса ***-ся(-ца, -цца)***: *будавацца; сустракацца, збірацца, валачыся, цягнуцца, красціся, круціцца, вітацца, журыцца, туліцца.*

**Прыставачна-суфіксальным** спосабам дзеясловы ўтвараюцца ад дзеяслоўных асноў і ад іншых часцін мовы (назоўнікаў, прыметнікаў, лічэбнікаў і прыслоўяў). Пры гэтым спосабе выкарыстоўваюцца тыя самыя прэфіксы і суфіксы, што і пры прэфіксальным і суфіксальным спосабах словаўтварэння.

Ад дзеясловаў утвараюцца дзеясловы пераважна пры дапамозе прыставак ***па-, пад-, пры-, раз-(рас-), уз-(ус-)*** і суфіксаў ***-ва-(-іва-, -ыва-)***: *паварушваць, пакалыхваць, пагрукваць, паігрываць; падпяваць, падсвістваць; прыгаворваць, прытупваць; разгульваць, раздумваць; узмахваць, ускрыкваць.*

Пры ўтварэнні дзеясловаў ад назоўнікаў і прыметнікаў найбольш прадуктыўныя прыстаўкі ***а-(аб-, аба-), ад- (ада-); вы-, з-(с-, са-), за, пад-, пры-, у- і суфіксы -і-(-ы-), -е-(-э-, -а-)***: *акрыліць, аснежыць, акталічыць, ажывіць, абнавіць, абазначыць; адслаіць, аднавіць; выветрыць; здрабніць, змякчыць, спрасціць, састарыць, спапялець, спалатнець; запрыгоніць, замшэць, занядужаць; паднавіць, падбольшыць, падахвоціць;*

*прыгубіць, прызямліць; узаконіць, усынавіць, упрыгожыць.*

Ад лічэбнікаў і прыслоўяў прыставачна-суфіксальным спосабам утвораны нешматлікія дзеясловы: *раздвоіць, удвоіць, утроіць, удзесяцярыць, падвоіць, патроіць, перайначыць.*

**Суфіксальна-постфіксальным** спосабам утвараюцца дзеясловы ад назоўнікаў і прыметнікаў пераважна шляхам адначасовага далучэння суфікса ***-і-(-ы-)*** і постфікса ***-ся***: *гняздзіцца, каласіцца, слязіцца, дзяцініцца, петушыцца, лапушыцца, дзічыцца, скупіцца, кучаравіцца, храбрыцца.*

Прыставачна-постфіксальным спосабам дзеясловы ўтвараюцца ад дзеяслоўных асноў. Найбольш часта постфікс ***-ся*** выступае ў спалучэнні з прыстаўкамі ***а-(аб-, аба-), ад-(ада-), вы-, да-, з-(с-, са-), на-, раз-(раза-, рас-)***: *аступіцца, абазнацца; адгаварыцца, адаспацца; выгуляцца, выбегацца, выспацца; дагаспадарыцца, дагуляцца; змовіцца, спрацавацца, сазваніцца; нагаварыцца, нагасцявацца, наспявацца; раз'ехацца, разгарэцца, раскрычацца.*

**Прыставачна-суфіксальна-постфіксальвым** спосабам утвараюцца дзеясловы ад назоўнікаў, прыметнікаў і дзеясловаў. Утварэнне дзеясловаў ад назоўнікаў і прыметнікаў адбываецца з дапамогай прыставак ***а-, вы-, пры-, раз-(рас-), у-,*** суфіксаў ***-ава-, -і-(-ы-)*** і постфікса ***-ся***: *банкрут – абанкруціцца, пагода – выпагадзіцца, распагодзіцца, хітры – ухітрыцца.* Такое ўтварэнне дзеясловаў абмежаванае.

Пры ўтварэнні дзеясловаў ад дзеяслоўных асноў пераважна ўжываецца прыстаўка ***пера-***, суфікс ***-ва-*** і постфікс ***-ся***; *шаптаць – перашэптвацца, гаварыць – перагаворвацца, пісаць – перапісвацца, свістаць – перасвіствацца, міргаць – пераміргвацца, гукаць – перагуквацца.*

Дзеясловы, утвораныя шляхам **складання**, сустракаюцца даволі рэдка ў беларускай мове: *самавызначацца, самаабслугоўвацца, самаакупіцца, самазагарацца, самаўхіляцца, самакіравацца, відазмяняць, злоўжываць, узаемадзейнічаць.*

Дзеясловы вельмі рэдка пераходзяць у іншыя часціны мовы. Можна назваць адзінкавыя выпадкі **пераходу** дзеясловаў у мадальныя словы: *відаць, здаецца, значыць,* у часціцы: *дай, давай,* у выклічнікі: *бывай, здароў.*

## 3. Пытанні да асноўнага тэарэтычнага матэрыялу

1. Якая часціна мовы называецца дзеясловам? Якія значэнні маюць дзеясловы? Якія марфалагічныя адзнакі дзеяслова? Назавіце спрагальныя і неспрагальныя формы дзеяслова, зменныя і нязменныя. Якая сінтаксічная роля дзеяслоўных формаў? Што аб'ядноўвае ўсе дзеяслоўныя формы ў адну сістэму?

2. Што такое інфінітыў? Якія яго марфалагічныя адзнакі? Якая сінтаксічная роля інфінітыва?
3. Назавіце асновы дзеяслова. Якія формы дзеяслова ўтвараюцца ад асновы інфінітыва, а якія – ад асновы цяперашняга часу? Назавіце выпадкі несупадзення асноў інфінітыва і цяперашняга часу, інфінітыва і прошлага часу.
4. Якія дзеясловы называюцца пераходнымі, а якія непераходнымі? Ахарактарызуйце тэрмін «прамы аб'ект», пакажыце яго наяўнасць – ненаяўнасць пры пераходных дзеясловах.
5. Ахарактарызуйце зваротныя дзеясловы, раскрыйце паходжанне постфікса *-ся*. Назавіце групы зваротных дзеясловаў, утвораныя ад пераходных дзеясловаў, а таксама групы, утвораныя ад непераходных дзеясловаў, праілюструйце прыкладамі.
6. Што такое катэгорыя стану? У чым сутнасць проціпастаўлення незалежнага і залежнага станаў дзеясловаў? Ахарактарызуйце канструкцыі з творным дзейнага прадмета і без яго. Якія групы дзеясловаў адносяцца да незалежнага стану?
7. Ахарактарызуйце катэгорыю трывання. Якія дзеясловы адносяцца да закончанага трывання, а якія – да незакончанага? Што такое суадносная трывальная пара? Якія дзеясловы называюцца няпарнымі, а якія – двухтрывальнымі? Як адбываецца ўтварэнне суадносных пар трывання? Ахарактарызуйце і пакажыце на прыкладах ступеннае ўтварэнне трывання.
8. Ахарактарызуйце семантычныя групы дзеясловаў – спосабы дзеяслоўнага дзеяння.
9. Ахарактарызуйце лад як дзеяслоўную катэгорыю. Што выражае абвесны лад? Што выражае загадны лад? Якія формы ён мае і як яны ўтвараюцца? Якімі іншымі формамі можа выражацца пабуджэнне да дзеяння? Што абазначае ўмоўны лад? Назавіце значэнні ўмоўнага ладу.
10. Ахарактарызуйце катэгорыю часу. Што абазначае цяперашні час? Назавіце выпадкі ўжывання формы цяперашняга часу са значэннем іншага часу. Ахарактарызуйце будучы час, яго формы. Што абазначае прошлы час? Як утвараюцца формы прошлага часу? Ахарактарызуйце складаную форму прошлага часу, яе значэнне і ўжыванне. Назавіце выпадкі ўжывання формы прошлага часу са значэннем іншага часу.
11. Што выражае катэгорыя асобы дзеясловаў? Назавіце асабовыя формы дзеяслова, раскрыйце іх значэнні. Якія дзеясловы называюцца асабовымі?
12. Якія дзеясловы называюцца безасабовымі? Якія граматычныя ка-

тэгорыі і формы маюць безасабовыя дзеясловы? Якія значэнні маюць безасабовыя дзеясловы? Назавіце ўласна безасабовыя дзеясловы і іншыя, вытворныя групы безасабовых дзеясловаў.

13. Што называецца спражэннем дзеяслова? Якія асабовыя канчаткі дзеясловаў I і II спражэнняў? Як вызначыць спражэнне дзеяслова па інфінітыве? Якія дзеясловы адносяцца да рознаспрагальных і ў чым іх своеасаблівасць?
14. Ад якіх часцін мовы ўтвараюцца дзеясловы? Назавіце і ахарактарызуйце спосабы словаўтварэння дзеясловаў, праілюструйце прыкладамі.

## 4. Матэрыялы да практычных аўдыторных і самастойных заняткаў

### 4.1. Схема блок-сістэмы практычных заняткаў

| № | Тэма практычных заняткаў | Колькасць гадзін |
|---|---|---|
| 1. | Дзеяслоў як часціна мовы. Значэнне, граматычныя катэгорыі дзеяслова. Спрагальныя і неспрагальныя формы. Сінтаксічная роля дзеяслова. Інфінітыў. Граматычныя Катэгорыі, уласцівыя інфінітыву. Суфіксы інфінітыва. Сінтаксічная роля інфінітыва. Асновы дзеяслова. | 2 |
| 2. | Пераходныя і непераходныя дзеясловы. Зваротныя дзеясловы. | 2 |
| 3. | Катэгорыя стану дзеяслова. Пытанне пра стан дзеяслова ў лінгвістычнай літаратуры. Дзеясловы незалежнага і залежнага стану. | 2 |
| 4. | Катэгорыя трывання дзеяслова. Утварэнне суадносных пар трывання. Ступеннае ўтварэнне трыванняў. | 2 |
| 5. | Катэгорыя ладу дзеяслова. Значэнне форм ладу. Формы ўмоўнага ладу. Формы загаднага ладу. Ужыванне форм аднаго ладу са значэннем іншага. | 2 |
| 6. | Катэгорыя часу дзеясловаў. Сістэма часоў. Цяперашні час. Ужыванне формы цяперашняга часу са значэннем іншых часоў. Прошлы час. Простая і складаная формы прошлага часу. Ужыванне формы прошлага часу са значэннем іншых часоў. Будучы час. Простая і складаная формы будучага часу. Ужыванне формы будучага часу са значэннем іншых часоў. | 2 |
| 7. | Катэгорыя асобы дзеясловаў. Формы асобы, іх значэнне і ўжыванне. Безасабовыя дзеясловы, іх семантычныя і граматычныя асаблівасці, сінтаксічная роля. Спражэнне дзеясловаў. Рознаспрагальныя дзеясловы. | 2 |
| 8. | Утварэнне дзеясловаў. | 2 |

## 4.2. Практыкаванні для засваення тэарэтычных ведаў па модулі

На занятках 1 выконваюцца практыкаванні 419-425, 427.
На занятках 2 выконваюцца практыкаванні 428-436.
На занятках 3 выконваюцца практыкаванні 437-441.
На занятках 4 выконваюцца практыкаванні 443-451.
На занятках 5 выконваюцца практыкаванні 452-461.
На занятках 6 выконваюцца практыкаванні 426, 462-468.
На занятках 7 выконваюцца практыкаванні 469-475.
На занятках 8 выконваюцца практыкаванні 476-477.

## 5. Дадатковая літаратура па модулі


1. Анічэнка У.В. Марфалогія ўсходнеславянскіх моў: Назоўнік. Дзеяслоў. Прыслоўе. – Мн.: Вышэйш. шк., 1973.
2. Груцо А.П. Категории глагольного времени в истории русского и белорусского языков: учеб. пособие. – Мн.: БГПУ, 2004.
3. Дзеяслоў: Вучэб.-метад. дапам. па курсу «Суч.беларус.мова» / Гомельск. дзярж. ун-т. – Гомель, 1984.
4. Дзеяслоў: вучэбна-метадычны дапаможнік / Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь, Установа адукацыі «Мазырскі дзяржаўны педагагічны універсітэт». – Мазыр: МДПУ, 2004.
5. Марозава Я.Н. Марфалогія: Дзеяслоў. Дзеепрыметнік. Дзеепрыслоўе. Прыслоўе. БПС. Няпоўназнамянальныя словы: вучэбна-метадычны дапаможнік. – Віцебск: Выдавецтва ВДУ, 2006.
6. Мацкевіч Ю.Ф. Марфалогія дзеяслова ў беларускай мове. – Мн., 1959.
7. Шуба П.П. Дзеяслоў у беларускай мове. / Пад рэд.М.Г.Булахава. – Мн.: Выд-ва БДУ імя У.І. Леніна, 1968.

МОДУЛЬ 13
«ДЗЕЕПРЫМЕТНІК. ДЗЕЕПРЫСЛОЎЕ»

## 1. Схема блок-сістэмы вывучэння тэарэтычнага матэрыялу

| № | Тэма лекцыйных заняткаў | Колькасць гадзін |
|---|---|---|
| 1. | Дзеепрыметнік як форма дзеяслова. Дзеепрыметнікі незалежнага і залежнага стану, іх утварэнне. Асаблівасці ўжывання дзеепрыметнікаў у сучаснай беларускай літаратурнай мове. | 2 |
| 2. | Дзеепрыслоўе як форма дзеяслова. Дзеепрыметнікі Дзеепрыслоўі незакончанага і закончанага трывання, іх утварэнне. Асаблівасці ўжывання дзеепрыслоўяў. | 2 |

## 2. Асновы навукова-тэарэтычных ведаў па модулі

**Слоўнік паняццяў для засваення**: дзеепрыметнік, дзеепрыметнікі незалежнага стану, дзеепрыметнікі залежнага стану, дзеепрыслоўе, адноснае абазначэнне часу, дзеепрыслоўі закончанага трывання, дзеепрыслоўі незакончанага трывання.

Пры напісанні раздзела быў выкарыстаны матэрыял вучэбнага дапаможніка «Сучасная беларуская літаратурная мова: Марфалогія: Вучэб. дапам. / Н.В. Гаўрош, М.Ц. Кавалёва, Н.М. Нямковіч і інш.; Пад агульн. рэд. праф. М.С. Яўневіча. – Мн.: Выд. Ул.М. Скарун, 1997. – 288с.»

### 2.1. Дзеепрыметнік

#### 2.1.1. Дзеепрыметнік як дзеяслоўная форма

Дзеепрыметнік – форма дзеяслова, якая абазначае прымету або ўласцівасць прадмета (асобы) паводле дзеяння. Дзеепрыметнікі маюць асаблівасці дзеяслова і прыметніка.

Дзеепрыметнікі ўтвараюцца ад дзеясловаў, маюць з імі агульную аснову і агульнае лексічнае значэнне: *прачытаць апавяданне – прачытанае апавяданне, пажаўцелі лісты – пажаўцелыя лісты, звіць вянок – звіты вянок*. Як і дзеяслову, дзеепрыметніку ўласцівыя граматычныя катэгорыі часу, стану: *квітнеючы сад* (параўн.: *сад, які квітнее*), *павесялелы хлопчык* (параўн.: *хлопчык, які панесялеў*); трывання: *сплесці – сплецены, пасадзіць – пасаджаны, накрыць – накрыты*. Дзеепрыметнікі, як і дзеясловы, кіруюць назоўнікамі: *засеяць зернем, асвятліць сонцам – засеяны зернем, асветлены сонцам*; да дзеепрыметнікаў прымыкаюць прыслоўі: *сабраць вечарам, – сабраны вечарам, скасіць хутка – скошаны хутка*.

Дзеепрыметнікі, як і прыметнікі, маюць катэгорыі роду, ліку і

склону, якія з'яўляюцца залежнымі, сінтаксічнымі катэгорыямі: *зжаты ячмень, зжатая ніва, зжатае поле; зжатыя палі, зжатымі палямі, на зжатых палях*; поўную і кароткую форму: *адноўлены край і адноўлен край, прачытаная кніга і прачытана кніга.* Кароткую форму маюць толькі дзеепрыметнікі залежнага стану прошлага часу; яны змяняюцца па родах і ліках, але не скланяюцца: *верш вывучан, сачыненне напісана, лугі скошаны.* Кароткія дзеепрыметнікі, як і кароткія прыметнікі, у беларускай літаратурнай мове малаўжывальныя.

Поўныя дзеепрыметнікі ў сказе выконваюць ролю азначэння і выказніка: *За вокнамі снежныя казкі расказвае* ***сцішаны*** *лес* (Грах.). *Варшава і сёння* ***залітая*** *сонцам, Варшава і сёння працуе ад ранняга рання* (Б.). Кароткія дзеепрыметнікі ў сказе бываюць выказнікам: *Зямля і неба* ***звязаны*** *дажджамі, мы з роднай вёскай – памяццю навек* (Панч.).

Дзеепрыметнік можа мець паясняльныя словы, утвараючы разам з імі дзеепрыметнае словазлучэнне, якое сінтаксічна непадзельнае – у сказе выступае адным членам сказа: ***Пафарбаваныя марозам, абмытыя дажджом****, заснулі ціхія бярозы ўночы пад акном* (Астр.).

### 2.1.2. Утварэнне дзеепрыметнікаў

Дзеепрыметнікі **незалежнага стану прошлага часу** ўтвараюцца ад асновы інфінітыва непераходных дзеясловаў закончанага трывання з дапамогай суфікса ***-л-***: *пасталець – пасталелы, пасівець – пасівелы.* Дзеепрыметнікі незалежнага стану прошлага часу могуць утварацца і з дапамогай суфіксаў ***-ш-, -ўш-*** ад асноў інфінітыва пераходных і непераходных дзеясловаў. Суфікс ***-ш-*** далучаецца да асноў на зычны: *узнікнуць – узнікшае (пытанне)*; ***-ўш-*** – да асноў на галосны: *расквітнець – расквітнеўшая (ліпа).* У сучаснай беларускай літаратурнай мове дзеепрыметнікі прошлага часу незалежнага стану з суфіксамі ***-ш-; -ўш-*** ужываюцца абмежавана, а дзеепрыметнікі з суфіксам ***-л-*** выразна пашырыліся. У форме мужчынскага роду яны аманімічныя з дзеепрыслоўямі і ў асноўным выцеснены дзеепрыметнікамі з суфіксам ***-л-***.

Дзеепрыметнікі **незалежнага стану цяперашняга часу** ўтвараюцца ад асновы дзеясловаў цяперашняга часу незакончанага трывання з дапамогай суфіксаў ***-уч-(-юч-), -ач-(-яч-)***. Для беларускай літаратурнай мовы гэтыя дзеепрыметнікі не характэрныя; ужываюцца яны звычайна як кампаненты ўстойлівых словазлучэнняў тэрміналагічнага характару: *бастуючыя рабочыя, рухаючыя сілы гісторыі.*

Дзеепрыметнікі **залежнага стану цяперашняга часу** ўтвараюцца ад асноў дзеясловаў цяперашняга часу, як правіла, пераходных незакончанага трывання з дапамогай суфіксаў ***-ом-(-ем-), -ім-(-ым-)***: *самалёт, вядомы камандай з зямлі; мадэль, ствараемая канструктарам.*

Рэдкія ў беларускай мове дзеепрыметнікі незалежнага і залежнага

стану цяперашняга часу з суфіксамі ***-уч-(-юч-), -ач-(яч-), -ем-(-ом-), -ім-***. Не характэрныя для беларускай мовы і зваротныя дзеепрыметнікі; ужыванне іх – парушэнне нормы беларускай літаратурнай мовы.

Дзеепрыметнікі **залежнага стану прошлага часу** ўтвараюцца ад асновы інфінітыва пераходных дзеясловаў закончанага трывання пры дапамозе суфіксаў ***-н-, -ан-, -ен-, -т-***. Суфікс ***-н-*** маюць дзеепрыметнікі, утвораныя ад асноў на ***а, я***: *аблюбаваць – аблюбаваны, засеяць – засеяны*. Суфіксы ***-ен-, -ан-*** маюць дзеепрыметнікі, утвораныя ад інфінітыва з асновай на зычны або на галосныя ***і, ы, е***. Суфікс ***-ен-*** ужываецца пасля галосных і мяккіх зычных, ***-ан-*** – пасля зацвярдзелых зычных: *запаліць – запалены, занесці – занесены, астудзіць – астуджаны, запрасіць – запрошаны, вывучыць – вывучаны*. З дапамогай суфікса ***-т-*** утвараюцца дзеепрыметнікі, аснова інфінітыва якіх канчаецца на ***а, я, ы, і*** (бесприставачная частка аднаскладовая): *звіць – звіты, шыць – шыты, узняць – узняты*, а таксама ад дзеясловаў з асновай інфінітыва на ***о, у, ну***: *абуць – абуты, прапалоць – прапалаты, сагнуць – сагнуты*.

У беларускай літаратурнай мове найбольш ужывальныя дзеепрыметнікі прошлага часу залежнага і незалежнага стану з суфіксамі ***-л-, -н-, -ан-, -ен-, -т-***.

### 2.1.3. Пераход дзеепрыметнікаў у прыметнікі

Дзеепрыметнікі могуць страчваць дзеяслоўныя адзнакі (трыванне, стан, час) і набываць якаснае значэнне. У такім выпадку яны абазначаюць пазачасавую, сталую прымету і пераходзяць у прыметнікі.

У сучаснай беларускай літаратурнай мове дзеепрыметнікі цяперашняга часу з суфіксамі ***-уч-(-юч-), -ач-(-яч-), -ем-, -ім-*** у пераважнай большасці перайшлі ў прыметнікі: *неўміручы подзвіг, кіпучая кроў, гаручыя слёзы, гаючая крыніца, стаячая вада, ляжачы камень, рашучыя меры, траскучы мароз, цягучы гоман, дрымучы лес, калючы дрот, вядомы вучоны, любімы горад, знаёмы чалавек.*

Перайшлі ў прыметнікі дзеепрыметнікі прошлага часу залежнага стану, утвораныя ад дзеясловаў незакончанага трывання. Такія дзеепрыметнікі звычайна не маюць пры сабе паясняльных слоў: *чаканая гадзіна, жаданая вясна, лічаныя дні.*

З'ява ад'ектывацыі назіраецца і ў дзеепрыметнікаў прошлага часу з суфіксамі ***-л-, -н-, -ен-, -ан-, -т-***: *спелыя яблыкі, рослы хлопец, пажылы чалавек, друкаваны тэкст, вершаваны твор, біты гасцінец*. Такія прыметнікі захоўваюць суадносінасць з дзеепрыметнікамі. Некаторыя дзеепрыметнікі залежнага стану прошлага часу з суфіксам ***-ан-***, перайшоўшы ў прыметнікі, мяняюць месца націску: *Неба раз'яснялася і свяцілася ўночы* ***незлічонымі*** *халоднымі агнямі зорак* (К-с). *Завялі вятры над голлем* ***нескончоны***, *дружны спеў* (Бр.).

## 2.2. Дзеепрыслоўе

### 2.2.1. Дзеепрыслоўе як дзеяслоўная форма

Дзеепрыслоўе – нязменная форма дзеяслова, якая абазначае дадатковае дзеянне і паясняе асноўнае дзеянне, выражанае дзеясловам-выказнікам. Дзеепрыслоўі маюць асаблівасці дзеяслова і прыслоўя.

Дзеепрыслоўі ўтвараюцца ад дзеясловаў, захоўваюць агульнасць асновы і лексічнага значэння: *распытаць – распытваючы, хвалявацца – хвалюючыся, імкнуцца – імкнучыся, збудаваць – збудаваўшы, прынесці – прынёсшы.*

Дзеепрыслоўі маюць граматычныя прыметы, агульныя з прыметамі асабовых формаў дзеяслова і інфінітыва: пераходнасць – непераходнасць: *прачытаўшы кнігу, косячы траву, выканаўшы заданне* (пераходныя дзеепрыслоўі), *углядаючыся ў цемру, ідучы дарогай* (непераходныя дзеепрыслоўі); зваротнасць – незваротнасць: *нахіліўшы – нахіліўшыся, падымаючы – падымаючыся, радуючы –радуючыся*; трыванне (закончанае і незакончанае): *збіраць – збіраючы, назбіраць – назбіраўшы, пісаць – пішучы, напісаць – напісаўшы, гаварыць – гаворачы, сказаць – сказаўшы*; стан (бываюць толькі незалежнага стану): *сустрэўшы сябра – сустрэўшыся з сябрам, вяртаючы кнігу – вяртаючыся з горада.* Не ўсе незваротныя дзеепрыслоўі маюць адпаведныя ім зваротныя; некаторыя дзеепрыслоўі, як і суадносныя з імі асабовыя формы і інфінітыў, бываюць толькі незваротныя (*ідучы, бегучы, ходзячы, размаўляючы, ездзячы* і інш.) або толькі зваротныя (*спрачаючыся, смеючыся, кланяючыся, каючыся* і інш.).

Дзеепрыслоўі кіруюць назоўнікам (займеннікам), як і той дзеяслоў, ад якога ўтвораны: *спяваць песню – спяваючы песню, запаліць святло – запаліўшы святло, вярнуцца з лесу – вярнуўшыся з лесу*; да дзеепрыслоўя, як і да іншых формаў дзеяслова, могуць прымыкаць прыслоўі, якія паясняюць іх: *ісці хутка – ідучы хутка, зразумець правільна – зразумеўшы правільна.*

Улічваючы адзначаныя асаблівасці, агульныя з асаблівасцямі асабовых формаў дзеясловаў, дзеепрыслоўі традыцыйна ўключаюцца ў сістэму формаў дзеяслова. У некаторых дапаможніках дзеепрыслоўе разглядаюць як асобную, самастойную часціну мовы. І на гэта ёсць свае падставы.

Дзеепрыслоўі маюць такія прыметы, якія не ўласцівы дзеяслову; гэтыя прыметы агульныя ў дзеепрыслоўяў з прыметамі прыслоўяў. Яны, як і прыслоўі, не змяняюцца: *заўважыўшы, адкрываючы, разгарнуўшы*; прымыкаюць да дзеяслова і паясняюць яго: *ішлі спяшаючыся, сядзеў не рухаючыся*; выконваюць у сказе сінтаксічную ролю акалічнасці. Адзіно-

чныя дзеепрыслоўі, якія стаяць у канцы сказа, у пазіцыі пасля выказніка, могуць страчваць дзеяслоўныя прыметы і пераходзіць у прыслоўі: *Бацька доўга сядзіць* ***задумаўшыся*** (Скр.). *Не маглі расстацца не* ***выгаварыўшыся*** (І.М.).

Дзеепрыслоўе найчасцей ужываецца з паяснябнымі словамі, утвараючы разам з імі дзеепрыслоўнае словазлучэнне, якое ў сказе выступае як адзін член сказа: ***Саломку выгнуўшы дугою****, звісае колас над зямлёю* (К-с). Дзеепрыслоўнае словазлучэнне выконвае сінтаксічную ролю адасобленай акалічнасці спосабу дзеяння.

Дзеепрыслоўі, як правіла, прымыкаюць да дзеяслоўнага выказніка: *Бачу я,* ***з прыродай зліўшыся душой****, як дрыжаць ад ветру зоркі нада мной* (Багд.). Зрэдку дзеепрыслоўі прымыкаюць і да іменнага састаўнога выказніка: ***Развітваючыся пасля вячэры****, панна Ядвіся была сур'ёзная і не папрасіла суседа заходзіць да іх вечарамі* (К-с). Іншы раз дзеепрыслоўі прымыкаюць да інфінітыва, які выступае не ў ролі выказніка, а ў ролі іншых членаў сказа, напрыклад дзейніка: *Сядзець жа дома,* ***не маючы пэўных заняткаў****, было нецікава* (К-с).

У паўночна-ўсходніх беларускіх гаворках, часам і ў мове мастацкай літаратуры, дзеепрыслоўі на ***-ўшы, -ш-*** ужываюцца ў ролі выказніка (са звязкай і без яе): *Сын даўно* ***ажаніўшыся****. Ужо сонца* ***было зайшоўшы*** (з гаворак Полаччыны).

### 2.2.2. Адноснае абазначэнне часу дзеепрыслоўямі

Дзеепрыслоўе, як нязменная форма дзеяслова, марфалагічна не можа выражаць часавых значэнняў – формаў часу дзеепрыслоўі не ўтвараюць. Калі ў дзеясловах форма часу абазначае адносіны дзеяння да моманту гутаркі (гавару – гаварыў – буду гаварыць), то ў дзеепрыслоўях значэнне часу выражаецца толькі ў адносінах да часу дзеяслова-выказніка, г. зн. ім уласціва адноснае абазначэнне часу.

Дзеепрыслоўе незакончанага трывання абазначае звычайна незакончанае дадатковае дзеянне, якое адбываецца ці адбывалася аднachасова з асноўным дзеяннем, выражаным дзеясловам-выказнікам: *Асірацелыя старыя дубы ў чорных шапках буслiных гнёздаў спакойна* ***стаялі, не варушачы*** *ніводным лістам...* (К-с).

Дзеепрыслоўе закончанага трывання абазначае закончанае дадатковае дзеянне, якое адбылося раней за асноўнае дзеянне, выражанае дзеясловам-выказнікам: ***Падышоўшы*** *бліжэй, Грыбаед моўчкі* ***паклаў*** *вінтоўку, стомлена сеў і зняў шапку* (В.Б.). *Глядзелі хлопцы, як на дзіва, як дзядзька, цеста* ***замяшаўшы, качаў*** *галушкі, міску* ***ўзяўшы*** (К-с).

Зрэдку дзеепрыслоўі закончанага трывання абазначаюць дадатковае дзеянне, якое адбываецца (адбывалася) аднachасова з асноўным дзеяннем, выражаным дзеясловам-выказнікам: *Сядзяць грыбы, як капыты, і,*

***разгарнуўшы*** *парасоны,* ***глядзяць****, бы нейкія персоны* (К-с).

Дзеепрыслоўе можа прымыкаць да дзеяслова ў форме розных часоў – цяперашняга, прошлага і будучага: ***Ідучы*** *па сцежцы, мы* ***захапляемся*** *вясновай раніцай.* ***Ідучы*** *па сцежцы, мы* ***захапляліся*** *вясновай раніцай.* ***Ідучы*** *па сцежцы, мы* ***будзем захапляцца*** *вясновай раніцай.* Хоць час дзеяслова ва ўсіх гэтых выпадках розны, часавае значэнне дзеепрыслоўяў застаецца тое самае: падкрэсліваецца, што абодва дзеянні адбываюцца адначасова (*ідзём і захапляемся, ішлі і захапляліся, будзем ісці і захапляцца*).

Такім чынам, катэгорыі часу дзеепрыслоўі не маюць: яна злілася ў іх з катэгорыяй трывання і не выражаецца ні лексічным значэннем, ні формаўтваральнымі суфіксамі.

### 2.2.3. Утварэнне дзеепрыслоўяў

Дзеепрыслоўі незакончанага трывання ўтвараюцца ад дзеясловаў незакончанага трывання, дзеепрыслоўі закончанага трывання – ад дзеясловаў закончанага трывання.

Дзеепрыслоўі **незакончанага** трывання ўтвараюцца ад асновы цяперашняга часу дзеясловаў I спражэння з дапамогаю суфіксаў ***-учы(-ючы)***, ад дзеясловаў II спражэння – з дапамогай суфіксаў ***-ачы(-ячы)***: *пiш-уць – піш-учы, ід-уць – ід-учы; кос-яць – кос-ячы, бач-аць – бач-ачы, ходз-яць – ходз-ячы.*

Ад некаторых дзеясловаў II спражэння дзеепрыслоўі незакончанага трывання ўтвараюцца з дапамогай суфіксаў ***-учы(-ючы)***, а не ***-ачы(-ячы)***: *баяцца – баючыся, крычаць – крычучы, дрыжаць – дрыжучы, спаць – сплючы.*

Дзеепрыслоўі **закончанага** трывання ўтвараюцца ад асновы інфінітыва (або прошлага часу) з дапамогаю суфіксаў ***-ўшы*** (пасля галосных) і ***-шы*** (пасля зычных): *раскінуць – раскінуўшы, прачытаць – прачытаўшы, зразумець – зразумеўшы, прынесці – прынёсшы, абтрэсці – абтросшы.*

Ад асноў прошлага часу ўтвараюцца дзеепрыслоўі ў тых выпадках, калі ў інфінітыве дзеясловы маюць перад суфіксам ***-ці*** гук [с'], які ўзнік у выніку дысіміляцыі [д], [т]: *прывес-ці – прывяд-уць – прывё-ў – прывёўшы, сплес-ці – сплят-уць – сплё-ў – сплё-ўшы*; калі ў інфінітыве маюць суфікс ***-ну-***, які ў форме прошлага часу выпадае: *высахну-ць – высах – высах-шы, намокну-ць – намок – намок-шы*; калі дзеясловы ў інфінітыве заканчваюцца суфіксам ***-чы***, у якім гук [ч] узнік са спалучэння *кт*: *спячы – спёк – спёк-шы.*

### 2.2.4. Ужыванне дзеепрыслоўяў

Дадатковае дзеянне, выражанае дзеепрыслоўем, і асноўнае дзеян-

не, выражанае дзеясловам-выказнікам, утвараюцца адной і той жа асобай або прадметам: *Васіль, **стараючыся** не разбудзіць нікога, ціха **адзеўся**, **абуўся**, **выйшаў** на ганак* (І.М.).

Ёсць пэўныя заканамернасці, правілы ўжывання дзеепрыслоўяў у сказе. Нельга ў адным сказе ўжываць дзеепрыслоўе і дзеяслоў-выказнік, якія абазначаюць дзеянні розных асоб або прадметаў; гэта парушэнне літаратурнай нормы. Няправільная, напрыклад, будова такога сказа: *Сям-там, праязджаючы вёрсты, нам трапляюцца клёны і дубы*, бо дзеяслоў-выказнік *трапляюцца* адносіцца тут да дзейнікаў *клёны і дубы*, а дзеепрыслоўе *праязджаючы* да гэтых дзейнікаў не адносіцца.

У сказе можа ўжывацца не адно, а некалькі дзеепрыслоўяў (з паясняльнымі словамі і без іх), якія адносяцца да аднаго дзеяслова-выказніка: ***Стараючыся** не рабіць многа шуму ў гэты ранні час, імшыстай сцежкай паміж балотам і лесам ішло многа людзей, **расцягнуўшыся** доўгім ланцугом* (К.Ч.).

Месца дзеепрыслоўяў незакончанага і закончанага трывання ў сказе абумоўлена паслядоўнасцю асноўнага і дадатковых дзеянняў: ***Прыехаўшы** з кірмашу дамоў, ён прывязаў каня да плота і, не **заходзячы** ў хату, пайшоў склікаць людзей* (Б.).

### 3. Пытанні да асноўнага тэарэтычнага матэрыялу

1. Як матывуецца тэрмін «дзеепрыметнік»? Назавіце прыметы дзеяслова і прыметніка, уласцівыя дзеепрыметнікам.
2. Якія дзеепрыметнікі ўжываюцца ў поўнай і кароткая формах? У чым спецыфіка іх ужывання?
3. Раскажыце пра ўтварэнне і ўжыванне дзеепрыметнікаў незалежнага стану цяперашняга і прошлага часу.
4. Як утвараюцца дзеепрыметнікі залежнага стану прошлага часу?
5. Якія дзеепрыметнікі найбольш прадуктыўныя ў сучаснай беларускай літаратурнай мове?
6. Раскажыце пра сродкі замены неўласцівых беларускай мове дзеепрыметнікаў пры перакладзе з рускай мовы.
7. У чым сутнасць ад'ектывацыі?
8. Што абазначае дзеепрыслоўе як асобая нязменная форма дзеяслова?
9. Якія прыметы агульныя ў дзеепрыслоўя і дзеяслова?
10. Якія прыметы агульныя ў дзеепрыслоўя і прыслоўя?
11. Ці маюць дзеепрыслоўі катэгорыю часу? Чаму мы гаворым пра адноснае абазначэнне часу дзеепрыслоўямі?
12. Ад якой асновы і з дапамогай якіх суфіксаў утвараюцца дзеепрыслоўі незакончанага трывання?
13. Ад якой асновы і з дапамогай якіх суфіксаў утвараюцца дзеепрыслоўі

законачанага трывання?
14. Раскажыце аб правілах ужывання дзеепрыслоўяў у сказе. Прывядзіце прыклады.

## 4. Матэрыялы да практычных аўдыторных і самастойных заняткаў

### 4.1. Схема блок-сістэмы практычных заняткаў

| № | Тэма практычных заняткаў | Колькасць гадзін |
|---|---|---|
| 1. | Дзеяслоўныя прыметы дзеепрыметнікаў (катэгорыя стану, трывання, часу; дзеяслоўнае кіраванне назоўнікамі; утварэнне дзеепрыметнікаў ад дзеяслоўных асноў). Адзнакі прыметніка (род, лік, склон, сінтаксічная роля). Поўная і кароткая формы дзеепрыметнікаў. | 2 |
| 2. | Утварэнне дзеепрыметнікаў незалежнага і залежнага стану. Асаблівасці ўжывання дзеепрыметнікаў у сучаснай беларускай мове. Пераход дзеепрыметнікаў у прыметнікі. | 2 |
| 3. | Дзеяслоўныя прыметы дзеепрыслоўя (катэгорыя трывання, стану; зваротная форма; дзеяслоўнае кіраванне назоўнікамі; утварэнне дзеепрыслоўяў ад дзеяслоўных асноў). Прыметы прыслоўя (нязменнасць, прымыканне да дзеяслова, сінтаксічная роля). Адноснае абазначэнне часу дзеепрыслоўямі. | 2 |
| 4. | Утварэнне дзеепрыслоўяў незаконачанага і законачанага трывання. Ужыванне дзеепрыслоўяў. | 2 |

### 4.2. Практыкаванні для засваення тэарэтычных ведаў па модулі

На занятках 1 выконваюцца практыкаванні 478-481, 488-489.
На занятках 2 выконваюцца практыкаванні 482-487, 490.
На занятках 3 выконваюцца практыкаванні 491-494, 498.
На занятках 4 выконваюцца практыкаванні 495-497, 499-500.

## 5. Дадатковая літаратура па модулі


1. Вештарт Г.Ф. Дзеепрыметнікі ў мове законаў // Беларуская лінгвістыка. – Мн., 1983. Вып. 34. – С. 38 – 40.
2. Кечык С.Я. Дзеепрыслоўе ў сучаснай беларускай мове: вучэбны дапаможнік для студэнтаў філалагічных факультэтаў педагагічных інстытутаў Беларусі / С.Я.Кечык. – Мінск: Вышэйшая школа, 1985.
3. Ляончанка Д.А. З гісторыі форм дзеепрыметнікаў у беларускай мове: Матэрыялы к курсу гіст. граматыкі бел. мовы / Д.А.Ляончанка. – Гомель, 1957.
4. Марозава Я.Н. Марфалогія: Дзеяслоў. Дзеепрыметнік. Дзеепрыслоўе. Прыслоўе. БПС. Няпоўназнамянальныя словы: вучэбна-метадычны дапаможнік. – Віцебск: Выдавецтва ВДУ, 2006.

# МОДУЛЬ 14
# «ПРЫСЛОЎЕ. КАТЭГОРЫЯ СТАНУ»

## 1. Схема блок-сістэмы вывучэння тэарэтычнага матэрыялу

| № | Тэма лекцыйных заняткаў | Колькасць гадзін |
|---|---|---|
| 1. | Прыслоўе як часціна мовы. Разрады прыслоўяў паводле значэння: азначальныя (якасныя, спосабу дзеяння, колькасныя (меры і ступені) і акалічнасныя (месца, часу, прычыны, мэты). Ступені параўнання якасных прыслоўяў. Пераход слоў іншых часцін мовы ў прыслоўі (адвербіялізацыя) і ўжыванне прыслоўяў у ролі іншых часцін мовы. | 2 |
| 2. | Безасабова-прэдыкатыўныя словы (катэгорыя стану). Значэнне, марфалагічныя прыметы і сінтаксічная роля. Утварэнне безасабова-прэдыкатыўных слоў. Пытанне пра катэгорыю стану ў лінгвістычнай літаратуры. | 2 |

## 2. Асновы навукова-тэарэтычных ведаў па модулі

**Слоўнік паняццяў для засваення**: прыслоўе, азначальныя прыслоўі, акалічнасныя прыслоўі, якасныя прыслоўі, колькасныя прыслоўі, прыслоўі спосабу дзеяння, прыслоўі месца, прыслоўі часу, прыслоўі прычыны, прыслоўі мэты, адвербіялізацыя.

Пры напісанні раздзела быў выкарыстаны матэрыял вучэбнага дапаможніка «Сучасная беларуская літаратурная мова: Марфалогія: Вучэб. дапам. / Н.В. Гаўрош, М.Ц. Кавалёва, Н.М. Нямковіч і інш.; Пад агульн. рэд. праф. М.С. Яўневіча. – Мн.: Выд. Ул.М. Скарун, 1997. – 288с.»

### 2.1. Прыслоўе як часціна мовы

Прыслоўе – нязменная часціна мовы, якая абазначае прымету дзеяння ці стану, прымету якасці, зрэдку – прымету прадмета. Прымету дзеяння ці стану прыслоўе абазначае тады, калі адносіцца да дзеяслова ці дзеепрыслоўя (*сустракаліся зрэдку, убачыўшы знянацку*); прымету якасці – калі адносіцца да прыметніка, дзеепрыметніка або прыслоўя (*вельмі цікавы, добра дагледжаны, зусім мокра*); прымету прадмета – калі адносіцца да назоўніка (*паездка ўдвух, школа насупраць, размова па-нямецку*).

Нязменнасць – характэрная асаблівасць прыслоўяў. Яны не скланяюцца і не спрагаюцца, не маюць формаў роду і ліку. Аднак прыслоўі, утвораныя ад якасных прыметнікаў, маюць ступені параўнання: *смела – смялей, больш смела, найсмялей, найбольш смела*. Некаторыя прыслоўі, утвораныя ад якасных прыметнікаў, маюць формы ацэнкі і меры якасці:

*ціха – ціхенька, ціхутка, ціхусенька; рана – раненька, ранюсенька, ранютка.*

Прыслоўям уласцівыя спецыфічныя суфіксы ***-а, -е, -аму(-ему), -яму, -у, -ы*** і інш., якія супадаюць з канчаткамі прыметнікаў і назоўнікаў: *ціха, глыбока, уверсе, унізе, па-добраму, па-веснавому, па-летняму, збоку, угары.*

Як ні адна іншая часціна мовы, прыслоўе багатае на граматычныя варыянты (словы з аднолькавым лексічным значэннем і аднолькавым коранем, якія адрозніваюцца афіксамі): *здалёк – здалёку, дарма – дарэмна, удалечыню – удалячынь, навек – навекі – навечна, пехатой – пеша – пяшком – пешкі – пешшу, абапал – паабапал* і інш. Яны найбольш поўна адлюстраваны ў мове мастацкай літаратуры.

Шматлікія прыслоўі маюць акцэнталагічныя варыянты: *навылёт – навылет, угору – угару, папоцемку – папацёмку, дарма – дарма* і інш.

Прыслоўі ўтварыліся і актыўна ўтвараюцца ад зменных часцін мовы, таму большасць з іх суадносныя, а часам і аманімічныя з іншымі часцінамі мовы і іх формамі; з назоўнікамі: *адпачываць удзень – у Дзень нараджэння, пачаць спачатку – з пачатку сенакосу, звярнуць убок – у бок лесу*; з прыметнікамі: *закончыць збольшага – з большага дрэва*; з лічэбнікамі: *пайсці ўдвух – у двух братоў, застацца ўтрох – у трох вёсках*; з займеннікамі: *чаго ты едзеш – чаго ты хочаш*; з дзеепрыслоўямі: *жыве прыпяваючы – прыпяваючы куплет.*

Некаторыя прыслоўі, утвораныя ад знамянальных часцін мовы, могуць пераходзіць у службовыя часціны мовы: *Навальніца заўсёды прыходзіла **з боку** лесу* (І.Н.). – *Недзе далёка **збоку**, на левым краі, за ракою засакатаў кулямёт* (Кр.). – *Дзед моўчкі смокча сваю самаробную арэхавую люльку на ўслоне **збоку** стала* (Як.) (назоўнік з прыназоўнікам – прыслоўе – прыназоўнік); *Няма **на што** глядзець* (Нар. тв.). – *Дзімка, **нашто** ты напісаў гэты ліст?...* – ***Нашто** ўжо палахлівы чорны дрозд, а і той да вады хоць і пеша, азіраючыся, але падыдзе* (Р.І.) (займеннік з прыназоўнікам – прыслоўе – часціца).

У сказе прыслоўе найчасцей выступае ў ролі акалічнасці месца, часу, спосабу дзеяння, меры і ступені, прычыны, мэты. Калі прыслоўе адносіцца да назоўніка, яно звычайна з'яўляецца азначэннем: *У двор каля ліпы пажылы чалавек уводзіў з пашы каня, з двара **насупроць** выганялі парасят* (І.М.).

Набываючы значэнне іншых часцін мовы, прыслоўі мяняюць свае сінтаксічныя функцыі. Субстантывуючыся, прыслоўе можа быць: дзейнікам: *І ўсё мілагучна для слыху майго: і звонкае «**дзе**» і густое «чаго»* (Панч.); азначэннем (прыдаткам): *Назавём гэты ціхі, спакойны, зялёны – з адных толькі хат і садоў пры іх – невялікі райцэнтр... проста і ў той*

*жа час крыху элегічна – гарадок **Учора*** (Я.С); дапаўненнем: *Уздымаліся тосты за гаспадароў, за наша шчаслівае **сёння** і светлае **заўтра*** (Корб.).

### 2.2. Разрады прыслоўяў паводле значэння

Паводле значэння прыслоўі падзяляюцца на два семантычныя разрады: **азначальныя** (іх яшчэ называюць уласна характарызуючымі (П.П. Шуба), да якіх адносяцца якасныя, колькасныя (меры і ступені), прыслоўі спосабу дзеяння, і **акалічнасныя**, што аб'ядноўваюць прыслоўі месца, часу, прычыны, мэты і паказваюць на розныя акалічнасці, пры якіх адбываецца дзеянне.

**Якасныя** прыслоўі абазначаюць якасць дзеяння і адказваюць на пытанне *як?*. Яны ўтвараюцца ад якасных прыметнікаў, складаюць найбольш шматлікую групу прыслоўяў: *проста, мудра, радасна, смела, цікава.*

**Колькасныя** прыслоўі абазначаюць колькасць дзеяння (*занадта, багата, крыху, больш-менш*), яго інтэнсіўнасць або мяжу (*дарэшты, дашчэнту, датла*), меру ці ступень якасці (*мала, многа, цалкам*). Колькасныя прыслоўі адказваюць на пытанні *колькі?, як многа?, да якой ступені?*. У спалучэнні з назоўнікамі словы *многа (нямнога), мала (нямала), багата, трохі, шмат* і інш. абазначаюць няпэўную колькасць і выступаюць у ролі так званых няпэўна-колькасных слоў: *многа грыбоў, мала ягад, трохі солі, шмат кветак, багата рыбы.*

Прыслоўі **спосабу дзеяння** паказваюць, як адбываецца дзеянне, адказваюць на пытанні *як?, якім чынам?, якім спосабам?* (*моўчкі, уголас, шэптам, бягом, насцеж, пехатой, раптам, па-вашаму, вобмацкам*). Прыслоўі спосабу дзеяння могуць даваць якасную характарыстыку праз параўнанне (*пранёсся віхрам, ехаў зайцам, дзяліўся па-брацку, мітусіліся роем*), могуць паказваць на сумеснасць ці раздзельнасць дзеяння (*удвух, утраіх, гуртам, паасобку*).

Прыслоўі **месца** ўказваюць на месца, дзе адбываецца дзеянне (*тут, там, блізка, далёка, высока, дзесьці, побач, навокал*), куды ці адкуль яно накіравана (*налева, направа, назад, уперад, сюды, дахаты, адгэтуль, здалёк, зверху*), да якой мяжы адбываецца (*даверху,данізу*). Яны адказваюць на пытанні *дзе?, куды?, адкуль?, дакуль?*. Сярод акалічнасных прыслоўі месца ўтвараюць найбольш шматлікую групу.

Прыслоўі **часу** абазначаюць, калі, як доўга адбываецца дзеянне (*летам, раніцой, штодзень, летась, увосень, даўно, нядоўга, заўсёды*), з якога часу пачынаецца, да якога часу працягваецца (*зранку, спачатку, спрадвеку, дацямна, навек*). Яны адказваюць на пытанні *калі?, як доўга?, з якога часу?, да якога часу?*.

Значэнне прыслоўяў часу ў пэўным кантэксце могуць набываць не-

каторыя прыслоўі месца; параўн.: *А **там**, за ціхаю дарогай, шуміць бярэзнік малады* (К-с). – *Не можа быць, будзе які-небудзь парадак, а **там** і вайна гэта скончыцца* (К-с); *Цякла **тут** з лесу невялічка травой заросшая крынічка, абодва берагі каторай лазняк, алешнік абступалі* (К-с). – *А **тут** якраз і гаспадыня, надзеўшы сукню для гасцей, шыбуе важна, як гусыня...* (К-с).

Прыслоўі **прычыны** абазначаюць, чаму, па якой прычыне адбываецца дзеянне (*згарача, чаму, чамусьці, здуру, спрасонку, без дай прычыны, сослепу*). Яны адказваюць на пытанні ***чаму?, па якой прычыне?***.

Прыслоўі **мэты** паказваюць, для чаго, з якой мэтай адбываецца дзеянне (*знарок, назло, напаказ, сумысна, наперакор*).

Прыслоўі прычыны і мэты ў параўнанні з іншымі разрадамі складаюць невялікія групы. Гэта тлумачыцца тым, што на час утварэння гэтых прыслоўяў для выражэння прычынных і мэтавых адносін у мове ужываліся прыназоўнікава-іменныя спалучэнні, інфінітыў, адасобленыя канструкцыі, даданыя часткі ў складаназалежных сказах і інш. І таму мова не мела патрэбы ў развіцці і пашырэнні гэтых разрадаў прыслоўяў (П.П. Шуба).

### 2.3. Ступені параўнання якасных прыслоўяў

Прыслоўі, утвораныя ад якасных прыметнікаў, маюць вышэйшую і найвышэйшую ступені параўнання і паказваюць на розную ступень праяўлення дзеяння, стану ці якасці. «Беларуская граматыка» (Мн., 1985, ч. 1.) вылучае звычайную і вышэйшую ступені параўнання прыслоўяў, пакідаючы па-за ўвагай найвышэйшую ступень. Але такая класіфікацыя наўрад ці можа быць прымальнай: у так званай звычайнай ступені параўнання (*добра, ціха, высока*) няма параўнання. Формы ступеней параўнання прыслоўяў, як і ступеней параўнання прыметнікаў, бываюць простыя (сінтэтычныя) і складаныя (аналітычныя).

**Простая** форма **вышэйшай** ступені параўнання ўтвараецца ад асновы якаснага прыслоўя пры дапамозе суфікса ***-ей(-эй)***: *смела – смялей, весела – весялей, зручна – зручней, моцна – мацней, хутка – хутчэй, блізка – бліжэй*. Прыслоўі *мала, многа, добра, дрэнна* ўтвараюць суплетыўныя простыя формы вышэйшай ступені параўнання: *мала – менш (меней), многа – больш (болей), добра – лепш (лепей), дрэнна – горш (горай)*. Суплетыўныя формы з суфіксам ***-ш*** у сучаснай беларускай літаратурнай мове ўжываюцца часцей, чым з суфіксам ***-ей(-ай)***.

Формы вышэйшай ступені параўнання *раней, даўней, далей* могуць траціць значэнне ступені параўнання – адбываецца лексікалізацыя – і набываць значэнне 'калісьці', 'у мінулым', 'потым'. Такое значэнне формы параўнання называецца **элятывам**: ***Раней*** *ніякі дождж цябе не мог спыніць...* (М. Т.). ***Даўней*** *забівалі паслоў, якія прыносілі дрэнныя звесткі*

(М.Т.). ***Далей**, як і ва ўсіх пісьмах, ішлі паклоны – кожнаму паасобку* (Як.).

**Складаная** форма **вышэйшай** ступені параўнання ўтвараецца з дапамогай слоў *больш (болей), менш (меней)*, якія далучаюцца да якасных прыслоўяў: *больш выразна, больш вынікова, больш зручна, менш прыкметна, менш адчувальна, менш эфектыўна*.

**Простая** форма **найвышэйшай** ступені параўнання ўтвараецца ад простай формы вышэйшай ступені параўнання прыслоўя пры дапамозе прыстаўкі ***най-***: *найбольш, найменш, найпрыкметней, найпрасцей, найэфектыўней, найзручней*.

**Складаная** форма **найвышэйшай** ступені параўнання ўтвараецца далучэннем слоў *найбольш, найменш* да прыслоўяў, а таксама далучэннем да простай формы вышэйшай ступені параўнання прыслоўяў слоў *за ўсё, за ўсіх*: *найбольш дакладна, найбольш эфектыўна, найбольш зручна, найменш удала, менш за ўсё, лепш за ўсё, хутчэй за ўсіх, мацней за ўсіх*.

Складаныя формы ступеней параўнання могуць утварацца ад усіх якасных прыслоўяў, чаго нельга сказаць адносна простых формаў, якія ўтвараюцца не ад усіх якасных прыслоўяў: *хрыпла, чула, зразумела, балюча, дымна, слушна, сярдзіта, колка, ліпка, слізка* (параўн. з прыметнікамі, якія не ўтвараюць простых формаў ступеней параўнання).

Да формаў вышэйшай і найвышэйшай ступеней параўнання прыслоўяў могуць далучацца часціцы *яшчэ, усё, куды, як, чым, сама* і інш., якія ўзмацняюць значэнне ступені: *яшчэ мацней, усё горш, куды цяжэй, як найхутчэй, чым найкарацей, сама лепш*: *Трэба было **як найхутчэй** рухацца далей* (В. Б.). *Памаленечку, але з кожным днём **усё смялей** і **ўладарней** наступала вясна* (Сач.). *Сусед заўсёды чытаў нешта такое старое-старое: кніга, што ляжала перад ім, **сама меней** мела гадоў сто* (Дам.).

### 2.4. Формы прыслоўяў са значэннем ацэнкі і меры якасці

Якасныя прыслоўі, як і якасныя прыметнікі, маюць формы выражэння значэння высокай ці нізкай меры якасці без параўнання. Формы прыслоўяў са значэннем ацэнкі і меры якасці адначасова перадаюць значэнне ацэнкі і экспрэсіўныя адценні (ласкальнасці, пагарджальнасці, зневажальнасці і інш.): *хуценька, асцярожненька, страшэнна, шырачэзна*. Утвараюцца гэтыя формы пры дапамозе тых самых суфіксаў, што і формы прыметнікаў са значэннем ацэнкі і меры якасці. Найбольш прадуктыўным пры ўтварэнні гэтых формаў з'яўляецца суфікс ***-еньк-(-аньк-)***: *нізенька, чысценька, блізенька, лёгенька, поўненька, роўненька, хуценька*. У такіх формах спалучаецца значэнне высокай меры якасці з экспрэсіўным адценнем ласкальнасці.

Суфіксы ***-утк-(-ютк-), -усеньк-(-юсеньк-), -усенечк-(юсенечк-)*** пры ўтварэнні формаў прыслоўяў са значэннем ласкальнасці ці памяншальнасці ўжываюцца параўнальна рэдка: *ціхутка, ранютка, паўнютка, ціхусенька, танюсенька, памалюсенечку*. Нячаста таксама ўжываюцца суфіксы ***-енн-(-энн-), -эзн-, -эразн-*** з узмацняльна-павелічальным значэннем: *страшэнна, высачэзна, даўжэразна.*

Значэнне непаўнаты якасці надае прыслоўям суфікс ***ават-***: *ранавата, высакавата, пазнавата, цемнавата.*

Памяншальныя формы маюць некаторыя прыслоўі, утвораныя ад назоўнікаў: *капельку, крышку, крышачку, ранічкай.*

Формы прыслоўяў са значэннем ацэнкі і меры якасці ўжываюцца пераважна ў гутарковым стылі і стылі мастацкай літаратуры.

### 2.5. Спосабы ўтварэння прыслоўяў

Прыслоўе актыўна папаўняецца за кошт іншых часцін мовы. Пераход розных формаў зменных часцін мовы ў прыслоўе называецца адвербіялізацыя (лац. adverbium – прыслоўе). Пераходзячы ў разрад прыслоўяў, самастойныя часціны мовы змяняюць сваё лексічнае і граматычнае значэнне. Так, назоўнікі страчваюць уласцівыя ім граматычныя катэгорыі роду, ліку, склону, у іх змяняецца марфемная будова слова: прыназоўнікі становяцца прыстаўкамі, канчаткі – суфіксамі. Пры адвербіялізацыі можа назірацца змена націску: *без канца – бясконца, за мужам – замужам, кругам – кругом, верхам – вярхом, бегам – бягом*. Перайшоўшы ў разрад прыслоўяў, былы назоўнік мяняе сваю сінтаксічную функцыю і ўжываецца, як правіла, у ролі акалічнасці.

Сярод марфалагічных спосабаў утварэння прыслоўяў вылучаюцца: суфіксальны (*смачна, зелена, завочна, магутна, тройчы*), прыставачны (*няўмела, наводдаль, паабапал, занадта, заўчора, залетась*), прыставачна-суфіксальны, або конфіксны (*па-суседску, адразу, спаўна, утрох, зрэдку, збоку, пароўну*). Некаторыя прыслоўі ўтварыліся спосабам словаскладання:

а) шляхам спалучэння займенніка *што* з назоўнікамі: *штовечар, штогод, штодзень (штодня), штолета, штоночы, штораз, штохвіліны*;

б) паўтарэннем аднолькавых, блізкіх ці антанімічных слоў: *даўно-даўно, высока-высока, далёка-далёка, век-векам, перш-наперш, туды-сюды, дзе-нідзе, калі-нікалі*. Асобныя складаныя прыслоўі ў сучаснай беларускай мове ўспрымаюцца як невытворныя: *сёлета (з сего лета), летась (а лето се), сёння (з сего дня).*

Прыслоўі ўтварыліся і ўтвараюцца ад усіх самастойных часцін мовы. Некаторыя прыслоўі ўтварыліся даўно, ад слоў, якія ў сучаснай мове не ўжываюцца: *знянацку, znячэўку, знарок, насцеж, датуль, трохі, цяпер, дасюль* і інш. Большасць прыслоўяў – пазнейшага ўтварэння, таму

можна вызначыць, ад якіх часцін мовы яны ўтварыліся: *збоку, зверху, знізу* – ад назоўнікаў роднага склону з прыназоўнікам *з*; *нанач, наперад* – ад назоўнікаў вінавальнага склону з прыназоўнікам *на*; *раніцаю, вечарам, ноччу* – ад назоўнікаў творнага склону; *па-зімоваму, па-новаму* – ад прыметнікаў давальнага склону з прыназоўнікам *па*.

Найчасцей прыслоўі ўтвараюцца ад назоўнікаў, прыметнікаў і займеннікаў, радзей – ад лічэбнікаў, дзеясловаў і прыслоўяў.

Прыслоўі ўтвараюцца ад ускосных склонаў назоўнікаў з прыназоўнікамі і без іх. Прыслоўі ўтвараюцца ад назоўнікаў:

а) роднага склону з прыназоўнікамі *ад, да, з, без: адразу, адвеку, дагары, дадому, дарэшты, даволі, дарэчы, збоку, зверху, здуру, спачатку, бясконца*;

б) вінавальнага склону адзіночнага ліку з прыназоўнікамі *за, на, па, у: зараз, замуж, навыварат, назад, наперад, нанач, насілу, наспех, налета, назло, напаказ, навылёт, падчас, удзень, уголас, ураз, уніз, уверх*; вінавальнага склону множнага ліку з прыназоўнікамі *на, у: навыперадкі, наўцёкі, напярэймы, напрасткі, нацянькі, упрысядкі, убакі, употайкі*; вінавальнага склону без прыназоўнікаў (іх мала): *раз, век*;

в) творнага склону без прыназоўнікаў: *ноччу, бягом, адвячоркам, сілком, парой, вясной, зімой, гуртам, часам*; творнага склону з прыназоўнікамі *за, пад: замужам, подбегам, падыспадам*;

г) меснага склону з прыназоўнікамі *у, на, па, а: уверсе, унізе, угары, увечары, наверсе, наперадзе, наводшыбе, напярэдадні, папраўдзе, пасярэдзіне, апоўначы, апоўдні*.

Найбольш актыўна ўтвараюцца прыслоўі ад розных формаў назоўнікаў ускосных склонаў з прыназоўнікамі.

Прыслоўі, утвораныя ад прыметнікаў, можна падзяліць на дзве групы. Адну групу складаюць прыслоўі, што паходзяць ад кароткіх прыметнікаў, другую – ад поўных прыметнікаў. Прыслоўі першай (больш старажытнай) групы ўтварыліся:

а) ад кароткіх прыметнікаў ніякага роду назоўнага склону: *мала, добра, густа, горка, звонка, ярка, ціха, хутка, суха, поўна, светла*. На ўзор гэтых утварылася большасць пазнейшых прыслоўяў з суфіксамі *-а(-о)*, у адзінкавых выпадках *-е: завочна, літаральна, дзіўна, актыўна, паслухмяна, знешне, залішне*;

б) роднага склону з прыназоўнікамі *да, з: дабяла, дацямна, дачыста, злева, справа, змалку, зблізку, зрэдку, здалёку, змоладу, злёгку*;

в) давальнага склону з прыназоўнікам *па: паціху, памалу, пароўну, паблізу*;

г) вінавальнага склону з прыназоўнікамі *за, на, у: завідна, зацемна, зажыва, надоўга, навечна, наглуха, насуха, нанава, направа, улева, упра-*

*ва*;

л) меснага склону з прыназоўнікам *на: нароўні, напагатове*.

Прыслоўі другой групы нешматлікія, яны ўтварыліся ад поўных прыметнікаў;

а) роднага склону з прыназоўнікам *з: збольшага*;

б) давальнага склону з прыназоўнікам *па: па-новаму, па-ранейшаму, па-веснавому, па-летняму, па-святочнаму, па-гарадскому*;

в) вінавальнага склону з прыназоўнікамі *па, на, у: па-чалавечы, па-дзіцячы, па-немаўлячы, па-воўчы, напрапалую, начыстую, наўдалую, уручную, усляпую, урассыпную, упустую*.

Ад лічэбнікаў утворана невялікая колькасць прыслоўяў. Яны утвараюцца ад лічэбнікаў:

а) зборных у вінавальным склоне з прыназоўнікамі *у, на: удвая, утрая, надвое, заадно*;

б) колькасных і зборных у месным склоне з прыназоўнікам *у: удвух, удваіх, удзвюх, утраіх, утрох, упяцёх, упяцярых, ушасцёх, ушасцярых*;

в) парадкавых: *перш, спярша, па-другое, па-першае*.

Ад займеннікаў у беларускай мове ўтварыліся шматлікія прыслоўі, частка якіх сёння ўспрымаюцца як невытворныя. Гэта найбольш архаічныя прыслоўі *там, тут, тады, туды, куды, сюды, калі, дзе, усюды, адкуль, іначай, інакш, дасюль, пакуль* і інш., якія ўтварыліся ад кароткіх займеннікаў *тъ, сь, вьсь, къ, инъ* у розных склонах пры дапамозе суфіксаў або суфіксаў і прыставак. У выніку розных фанетычных змен гукавы склад і марфемная будова многіх прыслоўяў значна змяніліся і адрозніваюцца ад першапачатковай.

У іншых прыслоўях выразна прасочваецца сувязь з сучаснымі займеннікамі. Такія прыслоўі паходзяць ад займеннікаў:

а) роднага склону без прыназоўнікаў: *чаго, чагосьці*;

б) давальнага склону без прыназоўнікаў і з прыназоўнікам *па: чаму, чамусьці, таму, па-мойму, па-нашаму, па-вашаму, па-твойму, па-іхняму, па-свойму*;

в) вінавальнага склону без прыназоўнікаў і з прыназоўнікамі *за, на: штосьці, затое, нашто*;

г) творнага склону з прыназоўнікамі *з, за: зусім, затым*;

д) меснага склону з прыназоўнікам *па: потым*.

Ад дзеясловаў прыслоўі ўтвараюцца прыставачным і прыставачна-суфіксальным спосабам: *перабіць – наперабой, сутыкацца – усутыч, замяняць – узамен, даганяць – наўздагон, выпускаць – навыпуск, угадаць – наўгад, паваліць – напавал, перамяшаць – уперамешку, прыкусіць – упрыкуску, перастаць – бесперастанку, пераганяць – наперагонкі*.

У беларускай мове вылучаюцца прыслоўі, якія паходзяць ад дзеепрыметнікаў незалежнага і залежнага стану цяперашняга часу: *бліскуча, хвалююча, рашуча, балюча, непрымірыма*; незалежнага і залежнага стану прошлага часу: *умела, узнёсла, асірацела, абурана, захоплена, упэўнена, адкрыта, прыўзнята*.

Ад дзеепрыслоўяў прыслоўі ўтвараюцца рэдка; можна назваць толькі адзінкавыя: *прыпяваючы (жыў прыпяваючы), крадучыся (ішоў крадучыся)*.

Звычайна дзеепрыслоўе найбольш збліжаецца з прыслоўем, калі не мае паясняльных слоў, стаіць пасля дзеяслова і з'яўляецца акалічнасцю спосабу дзеяння: *гаварыў смеючыся, ішоў туляючыся, бег азіраючыся, расказваў спяшаючыся, ішоў спатыкаючыся*. У некаторых выпадках такое дзеепрыслоўе можна замяніць прыслоўем: *ішоў не спяшаючыся – ішоў няспешна, рабіў умеючы – рабіў умела*.

У гутарковай мове і ў мове мастацкай літаратуры ўжываюцца прыслоўі, утвораныя ад дзеяслоўных асноў пры дапамозе суфікса *-ма*. Яны звычайна ўжываюцца ў спалучэнні з аднакаранёвымі дзеясловамі і маюць узмацняльнае значэнне: *лежма ляжаць, гульма гуляць, седзьма сядзець, роўма раўці, крычма крычаць, бегма бегчы*.

Ад прыслоўяў прыслоўі ўтвараюцца пры дапамозе прыставак, часціцы *абы-*, постфіксаў *-сьці і -небудзь*.

Пры дапамозе прыстаўкі *не-(ня-)* утвараюцца антанімічныя прыслоўі: *высока – невысока, далёка – недалёка, надоўга – ненадоўга, мала – нямала, многа – нямнога, добра – нядобра, шмат – няшмат*.

Прыстаўка *ні-* надае прыслоўям адмоўнае значэнне: *дзе – нідзе, калі – нікалі, як – ніяк, куды – нікуды, адкуль – ніадкуль*.

Прыстаўка *за-*, далучаючыся да прыслоўяў, можа надаваць значэнне 'залішне', 'праз меру' або непаўнаты якасці: *густа – загуста, высока – завысока, лішне – залішне, многа – замнога, доўга – задоўга, нізка – занізка, мала – замала*. Такія прыслоўі ўжываюцца пераважна ў гутарковым стылі і стылі мастацкай літаратуры.

Прыслоўі ўтвараюцца таксама пры дапамозе прыставак *на-, па-, у-, паза-, пасля-: навокал, наскрозь, наводдаль, назаўтра, назаўсёды, насупраць, паабапал, упоперак, пазалетась, пазаўчора, паслязаўтра*.

Пры дапамозе часціцы *абы-* ўтварыліся прыслоўі *абы-адкуль, абы-калі, абы-куды, абы-дзе, абы-як*.

Постфіксы *-сьці, -небудзь* надаюць прыслоўям значэнне няпэўнасці: *дзе – дзесьці, калі – калісьці, куды – кудысьці, дзе – дзе-небудзь, калі – калі-небудзь, куды – куды-небудзь*.

У беларускай мове вылучаецца невялікая група складаных прыслоўяў. Яны ўтвараюцца:

а) паўтарэннем таго самага прыслоўя з далучэннем прыстаўкі ці без яе. Такія прыслоўі пішуцца праз злучок: *як-ніяк, дзе-нідзе, калі-нікалі, перш-наперш, раз-пораз, далёка-далёка, высока-высока, глыбока-глыбока, ціха-ціха*;

б) паўтарэннем супрацьлеглых па значэнні прыслоўяў: *там-сям, сям-там, сюды-туды (сюд-туд), туды-сюды, сяды-тады, тады-сяды, так-сяк*;

Ад складаных прыслоўяў трэба адрозніваць устойлівыя спалучэнні, утвораныя паўтарэннем тых самых назоўнікаў у розных склонавых формах з прыназоўнікамі, якія пішуцца асобна: *дзень у дзень, след у след, слова ў слова, год ад году, час ад часу, рука ўруку*.

в) спалучэннем займенніка што з назоўнікамі: *штогод, штомесяц, штотыдзень, штодзень (штодня), штовечар, штоноч (штоночы), штораніцы, штохвіліны, штораз*; такія складаныя прыслоўі пішуцца разам;

г) спалучэннем слова *сама* з прыслоўямі: *тамсама, таксама, гэтаксама*;

д) ад складаных прыметнікаў: *святочна-ўрачыста, прытарна-салодка, сумна-задуменна, вогненна-ярка, светла-празрыста* і інш.

**2.6. Ужыванне прыслоўяў у ролі іншых часцін мовы**

Некаторыя прыслоўі пры пэўных умовах могуць ужывацца ў ролі іншых часцін мовы. У такім выпадку яны страчваюць лексічнае значэнне прыслоўя і набываюць значэнне адпаведнай часціны мовы. Пры гэтым мяняецца сінтаксічная роля слова ў сказе.

Прыслоўі *вакол, насустрач, побач, пасля, уздоўж, абапал, паблізу* і інш. могуць ужывацца ў ролі прыназоўнікаў. Параўн.: *Пачынала днець, ужо добра было відаць **вакол*** (Хомч.) – ***Вакол** руін некалькі старых клёнаў, ліп, дубоў* (Міс.); *Лабановіч шпарка пайшоў **насустрач**, незвычайна рады нечаканаму спатканню* (К-с) – ***Насустрач** першай зорцы змрок краўся нацянькі* (К-с); ***Побач** былі градкі, зелянелі дрэвы* (Хомч.) – ***Побач** дзетдома расла старая бяроза* (Каз.).

Прыслоўі могуць ужывацца ў ролі злучнікаў *як, калі, ледзь*. Параўн.: *Цяжка было ўявіць, **як** пройдзе гэтая ноч* (Кул.) – *Тут зямля **як** зямля – беларуская шэрая глеба* (Лук.); *І **калі** ты ўжо сур'ёзным чалавекам станеш?* (Лыньк.) – *Дзед любіць, **калі** яго хто доўга слухае* (Лыньк.); *Каміны **ледзь** выглядалі з віхрастай саломы на стрэхах* (К.Ч.) – ***Ледзь** бліснула такая думка, і... [Лялькевіч] увесь скалануўся, пачырванеў* (Шам.).

Значэнне часціц могуць набываць прыслоўі *ужо, проста, роўна, чыста, тут, там, яшчэ* і інш. Параўн.: *Вось **ужо** і сонейка зайшло, птушкі сціхлі* (Як.) – ***Ужо** ў дзвярах Нічыпар азірнуўся* (Асіп.); *Дом быў на*

*ўзгорку, **проста** над ракой* (Асіп.) – *Бацька – панскі фурман – махнуў у паветры даўжэзнай пугай, якая **проста** стрэламі заўсёды страляе* (Бяд.); *З фермы на поле, нагружаныя **роўна** з коньмі белымі мяхамі, паехалі дзве падводы* (Пташ.) – ***Роўна** праз дзве гадзіны сем хвілін лектар згарнуў паперы і ўзяўся за акуляры, не падымаючы вачэй на аўдыторыю* (П.К.); ***Чыста** вымытая падлога пахла аерам* (Кул.) – *Да сягоння жыве памяць аб злым гэтым дусе на ўсёй **чыста** Украіне і на Беларусі* (Куп.); *Ты тут? А я думаў, што цябе даўно **тут** няма* (К.Ч.) – *Ну, **тут** дзеўка бягом да начальніка* (Ракіт.); *«Адтуль, адтуль заходзь – **там** самая рыба ходзіць!» – раіць дзед* (Лыньк.) – *Як бы **там** ні было, а праседзець цэлы дзень на возе нялёгка* (Як.).

Прыслоўі могуць ужывацца ў ролі мадальных слоў *напэўна, сапраўды, бясспрэчна, безумоўна, магчыма* і інш. Параўн.: *Крайко, што называецца, дзейнічаў заўсёды **напэўна**, ён не любіў працаваць прыблізна, абы-як* (Вад.) – *У седлавіне, **напэўна**, быў перавал, туды вяла сцежка* (В.В.); *Ва ўсёй постаці старога зубра было **сапраўды** нешта дзікае, лясное, першабытнае* (В.В.). – ***Сапраўды**, конь быў нікуды не варты* (Тк.); *Гэта стала **магчыма** дзякуючы вам* (Кул.). – *Выбачайце, пан афіцэр, калі я, **магчыма**, не так зразумеў вас...* (Лыньк.).

## 2.7. Безасабова-прэдыкатыўныя словы (катэгорыя стану)

### 2.7.1. Агульная характарыстыка безасабова-прэдыкатыўных слоў

Да самастойных часцін мовы адносіцца таксама група нязменных слоў, якія ў адрозненне ад прыслоўяў абазначаюць не прымету дзеяння ці якасць, а стан прыроды або чалавека. У безасабовых сказах такія словы выступаюць у ролі выказніка: *Ранкамі было **свежа і росна*** (І.М.). *Потым нечакана насунулася хмара, пайшоў дождж, стала **цёмна-цёмна*** (Я.С).

Упершыню вылучыў гэтыя словы ў асобную групу акадэмік Л.У. Шчэрба (артыкул «О частях речи в русском языке», 1928). Акадэмік В.У. Вінаградаў у сваёй кнізе «Русский язык. Грамматическое ученне о слове» (1947) даў іх усебаковы аналіз.

У лінгвістаў пакуль што няма адзінага погляду на гэту групу слоў: канчаткова не вырашана пытанне вылучэння іх у асобную часціну мовы, няма адзінай думкі наконт таго, які аб'ём мае гэта катэгорыя, якімі шляхамі ідзе яе папаўненне. Гэтыя словы называюць безасабова-прэдыкатыўнымі словамі, словамі катэгорыі стану, прэдыкатывамі, прэдыкатыўнымі прыслоўямі. Аднак паралельнае ўжыванне прыведзеных тэрмінаў наўрад ці можна лічыць праваметным: прэдыкатыўныя прыслоўі – гэта толькі частка слоў (*хораша, чыста, рана*), якія ўваходзяць у разрад

безасабова-прэдыкатыўных разам з былымі назоўнікамі (*смех, грэх, сорам*) і дзеясловамі (*відаць, чуваць*); тэрмін «прэдыкатыў» мае шырокае значэнне – так звычайна называюць выказнік, у ролі якога могуць ужывацца ўсе самастойныя часціны мовы. Найбольш прыдатныя – два тэрміны: безасабова-прэдыкатыўныя словы (улічваецца ў першую чаргу сінтаксічная функцыя гэтай групы слоў) і катэгорыя стану (падкрэсліваецца лексічнае значэнне слоў).

Безасабова-прэдыкатыўныя словы могуць спалучацца з дзеяслоўнай звязкай і інфінітывам, кіраваць назоўнікам або займеннікам: *Яму* ***стала сорамна****, і ён вырашыў адразу ж ехаць* (Я.С). *Ізноў я пішу неадкладныя пісьмы, што* ***жыць*** *без цябе* ***немагчыма*** (М.Т.).

Дзеяслоўная звязка служыць для выражэння прошлага і будучага часу, а таксама ўмоўнага ладу: *было цёпла, было б цяплей, стане цёпла*.

Словы катэгорыі стану абазначаюць:

псіхічны і фізічны стан чалавека або жывой істоты: *прыемна, добра, лёгка, весела, балюча, сумна, цяжка, страшна, трывожна, холадна, цёпла*;

стан прыроды або навакольнага асяроддзя: *светла, ціха, горача, цесна, утульна, чыста, цёмна, цёпла, холадна, зорна, месячна, ветрана, сыра, брудна*;

ацэнку якога-небудзь стану або становішча: *далёка, блізка, хораша, шкода, рана, позна*;

меру чаго-небудзь: *многа, мала, досыць, дастаткова, даволі*;

мадальную ацэнку чаго-небудзь: *можна, трэба, нельга, немагчыма*;

ацэнку чаго-небудзь з маральна-этычнага боку: *сорам, ганьба, грэх, страх, смех*;

неадкладнасць дзеяння, якое павінна адбыцца: *час, пара*;

зрокавыя і слыхавыя ўспрыняцці: *відаць, чуваць*.

Безасабова-прэдыкатыўныя словы, як і якасныя прыслоўі, могуць мець формы ступеней параўнання і формы са значэннем ацэнкі і меры, якія ўтвараюцца, як і адпаведныя формы прыслоўяў: *халадней, цяплей, весялей, больш светла, менш утульна, найлягчэй, халаднавата, цёпленька, добранька*.

### 2.7.2. Утварэнне безасабова-прэдыкатыўных слоў

Безасабова-прэдыкатыўныя словы ўтварыліся ад розных часцін мовы:

якасных прыметнікаў (*горача, светла, балюча, весела, глуха, прыгожа, спакойна, хораша*) і прыслоўяў (*рана, позна, блізка, далёка, мала, многа, даволі, досыць*). Такое ўтварэнне безасабова-прэдыкатыўных слоў стала магчымым дзякуючы ўзмацненню сінтаксічнай функцыі слоў –

ужыванню ў ролі выказніка ў безасабовым сказе;

назоўнікаў (*сорам, грэх, смех, страх, пара, час, дзіва*); гэтыя словы, пераходзячы ў безасабова-прэдыкатыўныя, трацяць не толькі значэнне прадметнасці, але і граматычныя катэгорыі роду, ліку, склону;

дзеясловаў (*відаць, чуваць*).

Безасабова-прэдыкатыўныя словы, утвораныя ад прыметнікаў і прыслоўяў, аманімічныя прыслоўям (за выключэннем слоў *зорна, месячна, хлебна, душна, зелена, неабходна* і некаторых іншых, якія ўтварыліся ад прыметнікаў і не маюць аманімічных прыслоўяў). (Параўн.: ***Ціха*** *і светла над сталом* (Б.) – *Сярод асенніх хмар і загонаў* ***ціха*** *рабіна з ветрам гамоніць* (М.Т.). У першым сказе *ціха* – безасабова-прэдыкатыўнае слова, выказнік, у другім – прыслоўе, акалічнасць спосабу дзеяння.

Амонімамі з'яўляюцца таксама безасабова-прэдыкатыўныя словы і назоўнікі, ад якіх яны ўтвораны: *І* ***пара*** *маёй песні зноў збірацца ў дарогу* (М.Т.) – *Набліжалася тая* ***пара****, калі Юля павінна была стаць маці* (Гр.); *Я перачытаў гэтулькі кніг, што аж самому* ***дзіва****, колькі чалавек можа ўсяго перачытаць* (К.Ч.) – *Было маленькае ярка-чырвонае* ***дзіва*** *на таку – малатарня* (І.М.).

### 3. Пытанні да асноўнага тэарэтычнага матэрыялу

1. Ахарактарызуйце прыслоўе як часціну мовы. У ролі якіх членаў сказа можа выступаць прыслоўе?
2. Якія прыслоўі адносяцца да разраду азначальных? Якія групы прыслоўяў уваходзяць у разрад акалічнасных?
3. Якія прыслоўі маюць формы ступеней параўнання? Як утвараюцца ступені параўнання прыслоўяў?
4. Якія прыслоўі маюць формы суб'ектыўнай ацэнкі? Як яны ўтвараюцца?
5. Якія спосабы ўтварэння прыслоўяў найбольш прадуктыўныя? Што такое адвербіялізацыя?
6. Як утвараюцца прыслоўі ад назоўнікаў? Раскажыце пра ўтварэнне прыслоўяў ад прыметнікаў.
7. Якія прыслоўі, што паходзяць ад займеннікаў, адносяцца да невытворных? Ад якіх займеннікаў паходзяць, вытворныя прыслоўі?
8. Як утвараюцца прыслоўі ад дзеяслоўных формаў?
9. Пры дапамозе якіх словаўтваральных афіксаў утвараюцца прыслоўі ад прыслоўяў?
10. У якія часціны мовы могуць пераходзіць прыслоўі?
11. Якія словы адносяцца да безасабова-прэдыкатыўных? Чым безасабова-прэдыкатыўныя словы адрозніваюцца ад прыслоўяў? У ролі якога члена сказа яны выступаюць?

12. Хто з вучоных упершыню вылучыў безасабова-прэдыкатыўныя словы ў асобную групу? Назавіце тэрміны, што ўжываюцца ў лінгвістычнай літаратуры ў дачыненні да гэтай групы слоў.
13. Што абазначаюць безасабова-прэдыкатыўныя словы?
14. Ад якіх часцін мовы ўтварыліся безасабова-прэдыкатыўныя словы?

## 4. Матэрыялы да практычных аўдыторных і самастойных заняткаў

### 4.1. Схема блок-сістэмы практычных заняткаў

| № | Тэма практычных заняткаў | Колькасць гадзін |
|---|---|---|
| 1. | Разрады прыслоўяў паводле значэння: азначальныя і акалічнасныя. Ступені параўнання якасных прыслоўяў. Формы прыслоўяў са значэннем ацэнкі і меры якасці. | 2 |
| 2. | Утварэнне прыслоўяў ад розных часцін мовы. Адвербіялізацыя. Ужыванне фразеалагізмаў і слоў службовых часцін мовы ў ролі прыслоўяў. Ужыванне прыслоўяў у ролі іншых часцін мовы. | 2 |
| 3. | Значэнне, марфалагічныя прыметы і сінтаксічная роля безасабова-прэдыкатыўных слоў. Утварэнне безасабова-прэдыкатыўных слоў. | 2 |

### 4.2. Практыкаванні для засваення тэарэтычных ведаў па модулі

На занятках 1 выконваюцца практыкаванні 501-508.
На занятках 2 выконваюцца практыкаванні 509-516.
На занятках 3 выконваюцца практыкаванні 517-520.

## 5. Дадатковая літаратура па модулі

1. Анічэнка У.В. Марфалогія ўсходнеславянскіх моў: Назоўнік, дзеяслоў, прыслоўе. – Мн.: Вышэйш. шк., 1973.
2. Марозава Я.Н. Марфалогія: Дзеяслоў. Дзеепрыметнік. Дзеепрыслоўе. Прыслоўе. БПС. Няпоўназнамянальныя словы: вучэбна-метадычны дапаможнік / Я. Н. Марозава. – Віцебск: Выдавецтва ВДУ, 2006.
3. Шуба П.П. Прыслоўе ў беларускай мове: Марфалагіч. нарыс / АН БССР, І-т мовазнаўства імя Я. Коласа. – Мн.: Выд-ва АН БССР, 1962.

# МОДУЛЬ 15
# «СЛУЖБОВЫЯ ЧАСЦІНЫ МОВЫ»

## 1. Схема блок-сістэмы вывучэння тэарэтычнага матэрыялу

| № | Тэма лекцыйных заняткаў | Колькасць гадзін |
|---|---|---|
| 1. | Службовыя часціны мовы. Прыназоўнік як часціна мовы. | 2 |
| 2. | Злучнік як часціна мовы. | 2 |
| 3. | Часціцы як часціна мовы. | 2 |
| 4. | Мадальныя словы. Выклічнік як часціна мовы. | 2 |

## 2. Асновы навукова-тэарэтычных ведаў па модулі

**Слоўнік паняццяў для засваення**: прыназоўнік, невытворныя прыназоўнікі, вытворныя прыназоўнікі, простыя прыназоўнікі, складаныя прыназоўнікі, састаўныя прыназоўнікі, злучнік, злучальныя злучнікі, спалучальныя злучнікі, супастаўляльныя злучнікі, размеркавальныя злучнікі, далучальныя злучнікі, паясняльныя злучнікі, падпарадкавальныя злучнікі, семантычныя злучнікі, асемантычныя злучнікі, невытворныя злучнікі, вытворныя злучнікі, простыя злучнікі, састаўныя злучнікі, адзіночныя злучнікі, паўторныя злучнікі, парныя злучнікі, часціцы, простыя часціцы, састаўныя часціцы, невытворныя часціцы, вытворныя часціцы, указальныя часціцы, азначальна-ўдакладняльныя часціцы, вылучальна-абмежавальныя часціцы, мадальныя часціцы, мадальна-валявыя часціцы, эмацыянальна-экспрэсіўныя часціцы, словаўтваральныя часціцы, формаўтваральныя часціцы, выклічнік, эмацыянальныя выклічнікі, волевыяўленчыя выклічнікі, выклічнікі моўнага этыкету, гукапераймальныя словы, мадальнасць.

Пры напісанні раздзела быў выкарыстаны матэрыял вучэбнага дапаможніка «Сучасная беларуская літаратурная мова: Марфалогія: Вучэб. дапам. / Н.В. Гаўрош, М.Ц. Кавалёва, Н.М. Нямковіч і інш.; Пад агульн. рэд. праф. М.С. Яўневіча. – Мн.: Выд. Ул.М. Скарун, 1997. – 288с.»

### 2.1. Прыназоўнік

### 2.1.1. Прыназоўнік як часціна мовы

Прыназоўнік – гэта службовая часціна мовы, якая выражае адносіны паміж назоўнікам (або займеннікам) ва ўскосным склоне і іншымі словамі ў сказе. Так, у сказе *За ракой туманяцца лугі* (Р.) пры дапамозе прыназоўніка за выражаюцца адносіны паміж назоўнікам *ракой* (у творным склоне) і дзеясловам *туманяцца*.

Сама назва гэтай часціны мовы паказвае, што прыназоўнік ужываецца ў спалучэнні з назоўнікам і стаіць перад ім (пры назоўніку). Прыназоўнік служыць для сінтаксічнай сувязі слоў у сказе, кіруе формамі

назоўніка (займенніка), паказваючы на залежнасць аднаго слова ад другога; разам з тым ён удакладняе, дыферэнцыруе значэнне таго ці іншага склону. Напрыклад, у сказах *Ён пайшоў у хату* і *Ён пайшоў за хату* прыназоўнікі *у, за*, кіруючы вінавальным склонам, канкрэтызуюць яго значэнне: прыназоўнік *у* паказвае накіраванасць дзеяння ў сярэдзіну прадмета, а прыназоўнік *за* – на другі бок прадмета, за пэўную мяжу. Без склонавай формы назоўніка (займенніка) прыназоўнікі не ўжываюцца; як граматычны разрад слоў яны нязменныя.

Значэнне прыназоўніка выразна выяўляецца толькі ў спалучэнні слоў, у прыназоўнікава-іменнай канструкцыі. Так, прыназоўнік *з* у залежнасці ад кантэксту можа выражаць розныя адносіны: прасторавыя: *прыехаць з вёскі*, часавыя: *працаваць з самай раніцы*; аб'ектныя: *смяяцца з каго-небудзь*; спосабу дзеяння: *ударыць з размаху*; прычыны: *аслабець з голаду*; азначальныя: *дрэва з сукамі* і інш. Без спалучэння з назоўнікам (або займеннікам) можна вызначыць значэнне толькі некаторых прыназоўнікаў. Найбольш выразна выступае лексічнае значэнне прыназоўнікаў, якія паходзяць ад прыслоўяў: *вакол, сярод, побач, уздоўж, міма* і інш.

Паміж назоўнікам і прыназоўнікам можа стаяць азначальнае слова ці спалучэнне слоў, якое паясняе назоўнік, але гэта не парушае сувязі прыназоўніка з назоўнікам: ***На тваёй зямлі*** *квяцістай сонца ясна свеціць* (Куп.). ***У чорнай смаляной вадзе*** *гайдаюцца аблокі...* (Вял.).

Ужыванне прыназоўніка пасля слова, з якім ён спалучаецца, – з'ява рэдкая, яе можна сустрэць пераважна ў творах мастацкай літаратуры: *І ўсё забываецца,* ***шчасця апроч*** (Кір.).

### 2.1.2. Невытворныя і вытворныя прыназоўнікі

Адны прыназоўнікі выконваюць службовую ролю са старажытных часоў, другія як службовыя словы пачалі ўжывацца значна пазней; дакладна вызначыць, з якога часу ўжываецца кожны прыназоўнік, амаль немагчыма.

Паводле марфалагічнай будовы і паходжання прыназоўнікі падзяляюцца на невытворныя (або простыя) і вытворныя.

Да **невытворных** адносяцца прыназоўнікі, паходжанне якіх з пункту гледжання сучаснай мовы цяжка ці немагчыма растлумачыць, бо яны ўтварыліся ў старажытную пару. Да іх належаць: *а, аб, ад, з (са), за, без, да, для, дзеля, к (ка), на, над, пад, пра, праз, пры, у (ва), цераз*. Ёсць меркаванне мовазнаўцаў, што невытворныя прыназоўнікі паходзяць ад самастойных слоў.

Некаторыя невытворныя прыназоўнікі (*аб, з, за, на, па, у* і інш.) спалучаюцца з двума ці трыма склонамі і характарызуюцца мнагазначнасцю: *ісці па вуліцы* (прасторавае значэнне), *ударыць па стале* (аб'ектнае), *атрымаць па рублю* (размеркавальнае), *паехаць па дровы*

(значэнне мэты).

Разнавіднасцю невытворных з'яўляюцца складаныя прыназоўнікі *з-за, з-пад, па-за, па-над, паўз*, у якіх адзін прыназоўнік дапаўняе, удакладняе значэнне другога.

Як вядома, большасць прыставак у словах (*з-, на-, ад-, пры-, пад-, у-* і інш.) – гэта былыя невытворныя прыназоўнікі. Аднак не заўсёды назіраецца адпаведнасць прыназоўнікаў і прыставак. Так, у беларускай мове ўжываюцца прыназоўнікі *для, к*, але няма такіх прыставак; ёсць прыстаўкі *вы-, уз-, пера-, раз-* і інш., але няма такіх прыназоўнікаў.

Да вытворных адносяцца прыназоўнікі, якія паходзяць ад знаменальных слоў: *вакол, замест, акрамя, у адпаведнасці з*. Гэтыя прыназоўнікі больш позняга паходжання, таму яны захавалі лексічнае значэнне тых слоў, ад якіх утварыліся.

Чым далей у старажытнасць адыходзіць утварэнне прыназоўніка, тым цяжэй вызначыць яго паходжанне. Для прыкладу можна назваць прыназоўнік *акрамя*, які паходзіць ад малавядомага ў сучаснай беларускай мове назоўніка *крома* (край, мяжа) у форме меснага склону з прыстаўкай а-; *апрача* – ад *прокъ* (рэшта, астатні, іншы) з прыстаўкай *а-*; *каля* – ад назоўніка *коло* (круг); *між* (паміж) – ад назоўніка *межа* (*мяжа*), яшчэ ў XVI–XVII ст. ён меў форму назоўніка – *межы* (межы); *замест* – ад *место* (месца), які яшчэ ў XVII ст. ужываўся без прыстаўкі *за-* і інш.

**Вытворныя** прыназоўнікі звычайна ўжываюцца з адным якім-небудзь склонам і не характарызуюцца мнагазначнасцю.

Па суадносінах з іншымі часцінамі мовы вылучаюцца тры групы вытворных прыназоўнікаў. Адну групу ўтвараюць прыназоўнікі **прыслоўнага** паходжання: *вакол, абапал, упоперак, пасля, насуперак* і інш. Некаторыя прыслоўныя прыназоўнікі (*апрача (апроч), акрамя, замест, наконт, паводле* і інш.) амаль страцілі лексічнае значэнне і ў сучаснай мове выконваюць толькі службовую ролю; гэтыя словы канчаткова перайшлі ў прыназоўнікі і як прыслоўі зусім не ўжываюцца: *Пытаўся я ў людзей, брат, сёння* ***наконт зямлі*** *каля Заблоння* (К-с). *У хаце* ***апроч бабкі*** *Насты нікога не было* (К-с). *База падрыхтавалася да сустрэчы гасцей* ***паводле*** *вашых* ***указанняў*** («Звязда»). Другія словы гэтай групы (*вакол, побач, абапал, скрозь, насустрач, пасля, напярэдадні* і інш.) захоўваюць прыслоўнае значэнне месца або часу і ў сучаснай мове ўжываюцца то як прыслоўі, то як прыназоўнікі, параўн.: ***Вакол*** *было ціха і глуха* (К-с) і *Афіцэры сабраліся* ***вакол*** *свайго начальніка...* (К-с). ***Побач*** *на касагоры стаяў лес* (В.Б.) і ***Побач*** *чыгункі стаяў высокі стары лес* (К-с).

Некаторыя прыназоўнікі ўтварыліся ў выніку злучэння прыслоўя з невытворным прыназоўнікам: *побач з, поплеч з, поруч з, разам з, згодна*

*з, незалежна ад, збоку ад, воддаль ад, следам за. Алёша сядзеў моўчкі на задняй парце побач з Лявонам* (Шам.). ***Поруч з дубкамі*** *раслі грабы, ясені, вязы, рабіны* (А.Ч.). *Таварыш* ***поплеч з ім*** *ідзе і несці кніжкі памагае* («Тарас на Парнасе»). Група прыназоўнікаў прыслоўнага паходжання паступова папаўняецца.

Да другой групы належаць прыназоўнікі, якія ўтвораны ў выніку злучэння аднаго ці двух невытворных прыназоўнікаў з назоўнікам ва ўскосным склоне; гэта так званыя **адыменныя** прыназоўнікі: *на працягу, з выпадку, з мэтай, за выключэннем, у час, у выніку, у параўнанні з, у сувязі з, у адпаведнасці з, у адносінах да.* ***На працягу стагоддзяў*** *змагаліся мазуры з нямецкімі захопнікамі за хлеб з роднага поля і за родную мову* (Б.). *«Добра на лузе* ***ў час сенакосу****», – прызнаўся Янка* (К-с). *Змены на сонцы адбываюцца* ***ў залежнасці ад прычын*** *атмасфернага характару* (Астраномія). ***У сувязі з гэтым*** *трэба крыху вярнуцца і расказаць пра яго [Ваўковіча] «доктарскае аблічча»* (Вас.).

Прыназоўнікі *шляхам, перад, каля* з'яўляюцца застылымі формамі назоўнікаў: *Пракоп ішоў памалу, разважліва аглядаў дарогу* ***перад сабою*** (К-с). *Зямля* ***каля рэчкі*** *найбольш пясчаная, няўдзячная* (І.М.).

Трэцюю групу складаюць прыназоўнікі **дзеяслоўнага** паходжання; яны ўтварыліся ў выніку пераходу дзеепрыслоўя ў прыназоўнік. Некаторыя дзеепрыслоўі ўжываюцца як прыназоўнікі ў спалучэнні з невытворным прыназоўнікам: *нягледзячы на, гледзячы па, пачынаючы з*; другія дзеепрыслоўі ўжываюцца ў ролі прыназоўніка самастойна: *дзякуючы, уключаючы, выключаючы, не лічачы, канчаючы.* ***Нягледзячы на*** *позні* ***час****, у кватэры Садовіча гарэла лямпа* (К-с). *Урад Індыі аб'явіў, што* ***пачынаючы з 25 студзеня*** *1965 года афіцыяльнай мовай Індыі будзе мова хіндзі* («Звязда»). ***Дзякуючы*** *мясцовым* ***камсамольцам*** *удалося дастаць зусім спраўную супрацьтанкавую гармату* (Б.).

Большасць вытворных адыменных прыназоўнікаў (*у выніку, у справе, з мэтай, з боку, у адносінах да, у адпаведнасці з*), а таксама аддзеяслоўныя і асобныя прыслоўныя прыназоўнікі (*дзякуючы, згодна з, адпаведна* і інш.) ужываюцца пераважна ў публіцыстычным, канцылярска-дзелавым і навуковым стылях мовы.

Па марфалагічнай будове адрозніваюцца тры тыпы прыназоўнікаў: **простыя** прыназоўнікі: *аб, без, за, у, на, для, пад, пры*; **складаныя** прыназоўнікі, у якіх зліліся два словы: *з-за, з-пад, па-за, па-над, паўз, замест*; **састаўныя**, якія складаюцца з двух і болей слоў: *поруч з, у галіне, з прычыны, у параўнанні з, у залежнасці ад.*

### 2.1.3. Ужыванне прыназоўнікаў са склонамі

Ускосныя склоны назоўнікаў могуць ужывацца з прыназоўнікамі і без іх: *не бачыў брата – не быў у брата, ножка стала – сядзець ля ста-*

*ла* і інш. Толькі месны склон ужываецца заўсёды з прыназоўнікамі, якія фактычна і ўтвараюць форму гэтага склону: *Трапляліся часамі* ***пры беразе*** *чароты і аер* (К-с).

Усе прыназоўнікі ва ўжыванні замацаваліся за пэўнымі склонамі; некаторыя прыназоўнікі спалучаюцца з адным, некаторыя – з двума ці трыма склонамі.

З адным склонам ужываюцца наступныя прыназоўнікі:

*ад, да, для, дзеля, без, з-за, з-пад, каля (ля), сярод, акрамя, апрача, замест, супроць, паводле* – з родным;

*к (ка), насуперак, насустрач, услед, дзякуючы* – з давальным;

*пра, праз, паўз, скрозь, цераз* – з вінавальным;

*над, перад, па-за, па-над* – з творным;

*а, пры* – з месным.

З двума склонамі ўжываюцца прыназоўнікі:

*за, пад* – з вінавальным і творным;

*аб, на* – з вінавальным і месным;

*між (паміж)* – з родным і творным.

З трыма склонамі ўжываюцца прыназоўнікі:

*з* – з родным, вінавальным і творным;

*у* – з родным, вінавальным і месным;

*па* – з месным, вінавальным і давальным.

У працэсе развіцця мовы адбываюцца змены ва ўжыванні прыназоўнікаў – у спалучэнні іх са склонамі і ў выражэнні значэнняў.

У сказе кожны прыназоўнік звычайна ўжываецца з адным назоўнікам, з якім ён выражае тое ці іншае значэнне. Пры аднародных членах сказа адзін прыназоўнік можа спалучацца з двума ці больш назоўнікамі, якія стаяць у адным склоне: ***У лясах, гаях*** *дразды спявалі...* (К-с). Прыназоўнік можа паўтарацца пры кожным назоўніку, у такім выпадку асабліва падкрэсліваецца значэнне кожнага прыназоўнікава-іменнага спалучэння: ***Над усім – над горадам, над ракой, над*** *бязмежнымі* ***прасторамі*** *зямлі гарэла, пералівалася зыркае ранішняе сонца* (Лыньк.).

### 2.1.4. Асноўныя значэнні прыназоўнікаў

Першапачатковае значэнне невытворных прыназоўнікаў – прасторавае, а іншыя значэнні развіліся з яго як пераносныя.

Найбольш багатыя значэннямі і іх адценнямі невытворныя прыназоўнікі, якія спалучаюцца з двума ці трыма склонамі: *на, у, за* і інш. Менш значэнняў выражаюць прыназоўнікі пазнейшага паходжання, утвораныя ад самастойных слоў: *побач, акрамя, паабапал, згодна з* і інш. Так, прыназоўнік *абапал*, які ўжываецца з родным склонам, выражае толькі прасторавае значэнне – 'па абодва бакі чаго-небудзь': *Абапал балота густою сцяною стаяў лес* (К-с). Прыназоўнік *каля* з родным склонам вы-

ражае два значэнні – прасторавае і прыблізнай колькасці і меры: *Лабановіч стаяў каля расчыненага акна* (К-с). *Самы меншы хлопчык, якому было каля чатырох год, заплакаў* (Бяд.).

У розным лексічным акружэнні прыназоўнік можа выражаць розныя адносіны. Напрыклад, у сказах *На Новы год пасвяткаваць у горад завітала ёлка* (М.Т.). *Успамінаецца, як у вайну мы з ім ляжалі разам у акопах* (Гл.). *Вясна-красуня ў бубны б'е* (Ал.). *Між прысадамі дарога, я іду туды ў траву* (Т.) прыназоўнік *у* з рознымі назоўнікамі ў вінавальным склоне і дзеясловамі выражае адносіны: прасторавыя (*завітала ў горад*), часавыя (*ляжалі ў вайну*), аб'ектныя (*б'е ў бубны*) і мэты (*іду ў траву*).

Назавём – некаторыя адносіны, якія выражаюцца пры дапамозе прыназоўнікаў:

прасторавыя: *Пакацілася сонца за горы, вечар ціхі на зямлю прылёг* (Т.). *На ўзгорках і ў далінах лягла ціхая зіма* (Б.);

часавыя: *А ў нядзелю чуць зара сякеры запелі* (Куп.). *На досвітку ў кустах на варожым беразе загаварылі кулямёты* (Б.).

аб'ектныя: *На восень гэтую Наўмыснік вельмі спадзяваўся* (К.Ч.). *Дзедка заўсёды жартуе з мяне* (Куп.);

азначальныя: *Міхал быў у кароткай вопратцы на кудзелях* (К.Ч.). *Дастаў яшчэ адну напісаную паперу за многімі подпісамі* (Бяд.);

прычынныя: *Ад радасці вочы мае расцвілі* (Вял.). *Рэдка якая [вольха] падала пад націскам ветру* (Шам.);

мэты: *На змярканні ў школе сышліся настаўнікі для зацвярджэння пратакола* (К-с). *Я ад'язджаў у горад на вучобу* (Гіл.);

спосабу дзеяння: *Дрозд спяваў на ўсе лады* (К-с). *Так яны малацілі ў два цапы* (К.Ч.).

Наогул жа ў спецыяльных даследаваннях выдзяляецца значна больш відаў адносін, адрозніваюцца дзесяткі значэнняў і іх адценняў, якія выражаюцца ў прыназоўнікава-іменных спалучэннях слоў.

Ва ўжыванні прыназоўнікаў даволі шырока развіта сінаніміка: для выражэння блізкіх ці амаль што аднолькавых значэнняў могуць выкарыстоўвацца розныя прыназоўнікі. Так, некаторыя віды адносін часта выражаюцца сінанімічнымі прыназоўнікамі: прасторавыя – прыназоўнікамі *на – у, па – з* і інш.: *На небе месяц устаў зялёны...* (Багд.). *У небе месяц устаў зялёны* (Багд.). *Па другі бок узгорка стаіць мешаны лес...* (К-с). *Супроць яе хаты, з другога боку вуліцы, быў гародчык Алесі* (К-с); прычынныя – прыназоўнікамі *з – ад, за – з-за* і інш.: *Максім зразумеў, што са злосці нагаварыў лішняе* (Шам.). *Слухаў дзед Талаш і тросся ад злосці на паноў...* (К-с). *За гэтым агульным смехам Лабановічу не ўдалося нічога адказаць...* (К-с). *Габрыня не магла гаварыць далей з-за смеху* (К-с).

У беларускай мове многім прыназоўнікавым канструкцыям адпавядаюць паводле значэння сінанімічныя беспрыназоўнікавыя канструкцыі: *Ходзіць вецер па даліне, ходзіць, павявае* (К-с). *Ходзіць вецер далінаю, ходзіць каля гаю* (К-с). *І на вочы свае сам я бачыў яе, гэтую машыну* (К-с). *Я так, Ганя, бачу ўласнымі вачыма* (К-с).

### 2.1.5. Некаторыя асаблівасці ўжывання прыназоўнікаў

Ва ўжыванні прыназоўнікаў назіраецца шмат асаблівасцей, некаторыя з іх з'яўляюцца адметнай рысай беларускай мовы.

Ужыванне таго ці іншага прыназоўніка часта вызначаецца дзеясловам, пры якім стаіць прыназоўнікава-іменнае спалучэнне. Так, пры дзеясловах, якія абазначаюць эмоцыі, перажыванні і пад. (*смяяцца, жартаваць, кпіць, здзекавацца, дзівіцца, цешыцца*), для выражэння аб'ектных адносін, як правіла, ужываецца прыназоўнік ***з (са)*** з родным склонам назоўніка (або займенніка): *Ёй стала няёмка: як гэта яна будзе* ***смяяцца з настаўніка*** (К-с). *Яна... пачынала* ***кпіць са старых****...* (Шам.).

Пры дзеясловах *гаварыць, думаць, ведаць, клапаціцца* і пад. звычайна ўжываецца прыназоўнік ***пра*** з вінавальным склонам: *Калі* ***пра гэта ведае*** *Галя, дык, напэўна ж, пра гэта ведае ўся вёска* (Шам.). У мове газет, а таксама ў некаторых мастацкіх творах пры гэтых дзеясловах ужываецца прыназоўнік ***аб*** з месным склонам: *Гаспадарчыя групы павінны* ***паклапаціцца аб аснашчэнні*** *школ патрэбным абсталяваннем* («Настаўніцкая газета»).

Пры дзеясловах *жаніцца (жаніць, ажаніць)* ужываецца прыназоўнік ***з*** з творным склонам: *Паміж іншым сябар пісаў, як яго падпаілі і хацелі* ***ажаніць з*** *адной* ***дзяўчынаю****...* (К-с).

Дзеясловы, што выражаюць пачуцці смутку, гора, жалю (*сумаваць, тужыць, плакаць, бедаваць* і інш.), патрабуюць спалучэння прыназоўніка ***па*** з месным склонам: ***Па*** *роднай* ***краіне, па*** *любай* ***дзяўчыне*** *мы ўсе сумавалі не раз* (Бр.). Пры дзеясловах руху (*ісці, ехаць, хадзіць, бегчы, плыць* і інш.) прыназоўнік ***па*** таксама ўжываецца з месным склонам: *Як віхры, машыны бягуць* ***па зямлі, па моры па сінім*** *плывуць караблі* (Куп.).

Прыназоўнік ***па*** з вінавальным склонам шырока выкарыстоўваецца для выражэння мэты дзеяння: *Зося ўсміхнулася і* ***пайшла па Славу*** *і рэчы* (К.Ч.). Ужыванне прыназоўніка ***за*** з гэтым значэннем – адхіленне ад літаратурнай нормы.

З прыназоўнікам ***па*** назоўнікі множнага ліку пры выражэнні амаль усіх значэнняў ужываюцца толькі ў форме меснага склону: *Пайшоў гул* ***па*** *зялёных* ***імшарах*** (Куп.). Пры абазначэнні прасторавай мяжы ўжываецца вінавальны склон: ***зайшоў у ваду*** *па пахі, вада па калені* і г. д.

Прыназоўнік ***між*** (***паміж***) пры абазначэнні месца ўжываецца з

родным склонам: ***Між буданоў*** *агонь палае* (К-с). ***Паміж вольхаў*** *рака, як штодзень, не бурліць* (Куп.). Аднак сустракаюцца і канструкцыі з творным склонам: *Раз пад вечар* ***між жытамі*** *Ганна з поля йшла адна* (К-с).

Пры форме вышэйшай ступені параўнання прыметніка і прыслоўя звычайна ўжываецца прыназоўнік ***за*** і радзей – прыназоўнік ***ад***: *Двое* ***меншых за Міхалку*** *дзяцей лавілі па хаце матыля* (К.Ч.). *Кватэра гэта была многа* ***лепшая ад яго*** *кватэры* (К-с). .

Прыназоўнік ***за*** часта ўжываецца пры іменнай частцы састаўнога выказніка, што з'яўляецца адной з характэрных рыс беларускай мовы: *Да таго як прыстаць у прымы, Талаш* ***быў*** *у пана* ***за пастуха*** (К-с).

### 2.2. Злучнік

#### 2.2.1. Злучнік як часціна мовы

Злучнік – службовая часціна мовы, якая злучае аднародныя члены сказа, часткі складанага сказа, а таксама асобныя сказы ў тэксце і выражае сэнсава-граматычныя адносіны паміж гэтымі сінтаксічнымі адзінкамі. Злучнік з'яўляецца адным з важных і актыўных сінтаксічных сродкаў мовы, які звязвае сінтаксічныя адзінкі ў адно цэлае і выконвае арганізуючую функцыю. Так, у сказе *Дзядзька Марцін паехаў араць,* ***а*** *Лабановіч некаторы час сядзеў* ***і*** *слухаў навіны дамашняга жыцця* (К-с) злучнік *і* звязвае аднародныя выказнікі (сядзеў і слухаў), паказваючы на спалучальныя адносіны, злучнік *а* аб'ядноўвае часткі складаназлучанага сказа і паказвае на супастаўляльныя адносіны паміж імі.

Злучнік, калі ён ужыты ў пачатку сказа, можа паказваць на сэнсавую сувязь паміж асобнымі, самастойнымі сказамі: *У лесе пахла растопленай смалой.* ***І*** *ўсё жывое хавалася ў цень* (Чыгр.).

Пры дапамозе злучнікаў у сказ уключаюцца параўнальныя звароты, пабочныя і ўстаўныя канструкцыі: *Вецер на полі гуляе, вые,* ***як*** *звер* (Багд.). *Мы жылі,* ***як*** *бачыце, у глухім кутку* (Гр.).

Як службовая часціна мовы, злучнік не мае граматычных катэгорый, ён не самастойны ва ўжыванні і не можа выступаць у ролі членаў сказа. Ён не мае таго намінатыўнага значэння, якім характарызуюцца самастойныя часціны мовы. Значэнне злучніка – гэта тыя сінтаксічныя адносіны, якія выражаюцца з яго дапамогай (спалучальныя, размеркавальныя, супраціўныя, параўнальныя, часу, прычыны і інш.). Гэтыя адносіны і ляжаць у аснове падзелу злучнікаў на групы па значэнні.

Сярод злучнікаў можна вылучыць вузка спецыялізаваныя, якія паказваюць на які-небудзь адзін від адносін (*таму што, затое* і інш.), і такія, якія могуць фарміраваць розныя адносіны паміж сінтаксічнымі адзінкамі, іх значэнне выяўляецца толькі ў пэўным кантэксце (*і, а, ды, ці,*

*як, быццам, калі* і інш.). Напрыклад, злучнік *як* ужываецца з параўнальным, тлумачальным і часавым значэннем: *Бліщчасты месяц, **як** кружок залаты, стаяў ужо высока над лесам* (К-с). *Пабачыў яшчэ я красуню-Дзвіну, пачуў, **як** рака ля парогаў шумела* (Зар.). ***Як** на бераг выходзіў, мне ногі абпёк успамінам гарачым халодны пясок* (А.К.).

Сродкам аб'яднання частак у складаназалежным сказе выступаюць адносныя займеннікі *хто, што, які, чый, каторы, колькі* і займеннікавыя прыслоўі *дзе, куды, адкуль, як, калі* і інш. Іх называюць злучальнымі словамі, бо яны сумяшчаюць службовую функцыю з функцыяй самастойнай часціны мовы – звычайна замяняюць адно са слоў галоўнай часткі і выступаюць пэўнымі членамі сказа ў дадзенай частцы. *Слава вам, адважныя салдаты, што ў абдымку з беларускай спяць зямлёй* (Панч.) – у гэтым сказе адносны займеннік *што* звязвае дадзеную азначальную частку з галоўнай, замяшчае назоўнік салдаты і выступае ў дадзенай дзейнікам.

Некаторыя злучнікі могуць страчваць сваю ўласцівасць сродку сувязі і выконваць ролю іншых часцін мовы, напрыклад часціц. Параўн.: *І не заўважыў з нас ніхто, **як** ноч вясенняя мінула* (М.Т.) і ***Як** шпарка праходзіць час!* (К-с). *Базыль прывітаўся з калегамі, распытаў іх, **ці** на ўсё лета прыехалі* (К-с) і ***Ці** ты яшчэ тут?* (Сам.). І злучнікамі і часціцай могуць быць у сказе словы *быццам, нібы, хоць* і інш.

Да злучнікаў па сваёй функцыі ў сказе набліжаюцца і некаторыя часціцы, мадальныя словы, прыслоўі (*нават, асабліва, толькі, значыць, мабыць, потым*): *Падрыўнікі з ранейшай дакладнасцю вялі сваю работу, **нават** параненыя не сышлі з палатна* (Кул.). *Усюды ціха, **толькі** патрэсквае агонь* (К.Ч.). *Паліцца печ, **значыць**, маці дома* (Вас.). Гэтыя словы сумяшчаюць у сабе адначасова якасці і адпаведнай часціны мовы, і злучніка, таму іх функцыі немагчыма строга размежаваць.

### 2.2.2. Злучальныя і падпарадкавальныя злучнікі

Усе злучнікі паводле сваёй сінтаксічнай функцыі падзяляюцца на дзве асноўныя групы – злучальныя і падпарадкавальныя.

**Злучальныя** злучнікі аб'ядноўваюць адносна раўнапраўныя сінтаксічныя адзінкі, паказваючы на іх незалежнасць адна ад другой. Яны звязваюць аднародныя члены сказа або часткі складаназлучанага сказа: *Над лугам **і** ў нізінах стаяў малочны туман, **і** ў твар шыбала прыемным вільготным халадком* (Шам.). Злучальныя злучнікі па значэнні, г. зн. паводле характару адносін, якія выражаюцца з іх дапамогай, падзяляюцца на спалучальныя, супастаўляльныя, размеркавальныя, далучальныя і паясняльныя.

**Спалучальныя** злучнікі *і, ды* (са значэннем *і*), паўторныя *і ... і, ні ... ні,* парны *як ... так і* выражаюць адносіны спалучальнасці, пералічэння; яны паказваюць, што аб'ядноўваюць два ці больш аднаро-

дныя кампаненты, у пэўных адносінах аднолькавыя, падобныя: *Пад вяслом **і** шастом ласкава плёхала ды булькала вада* (Б.). ***Ні** птушцы, **ні** затуканаму зверу я кулі аніколі не пашлю* (Панч.). *Пажар заўважылі **як** з баракаў, **так і** з пасёлка* (Пестр.).

Сярод спалучальных злучнікаў найбольш шырока ўжываецца злучнік *і*. Акрамя свайго асноўнага значэння – выражаць спалучальныя адносіны – ён можа мець і адценні іншых значэнняў; праўда, пры падтрымцы кантэксту ці пэўных слоў. *Ён хацеў гаварыць **і** не мог* (К-с) – адценне супраціўнага значэння. *Усюды добра, **і** асабліва дома* (Гал.) – далучальнае значэнне, канкрэтызаванае часціцай *асабліва*.

Злучнік *і*, ужыты перад кожным аб'яднаным кампанентам, у тым ліку і першым, набывае ўласцівасці ўзмацняльнай часціцы. Такую ж функцыю набывае і паўторны злучнік *ні*, які ўжываецца ў сказах з адмоўем: ***І** сэрцы, **і** воля, **і** думы народа злучыліся ў плыні адной* (К-с). *Глеб зноў не меў **ні** сну, **ні** спакою некалькі дзён і начэй* (Сач.).

**Супастаўляльныя** злучнікі *а, але, ды*, (*дык, аднак, ж (жа), толькі, затое, а то, а не то,* парныя *не толькі ... але і, не то што ... а, не то што ... але ж* у адпаведнасці з іх канкрэтным значэннем можна падзяліць на падгрупы:

а) злучнікі, якія паказваюць на супастаўляльнасць дзеянняў, з'яў, прымет, іх адрозненне (супастаўляльныя): *Туман шэранню асеў на дрэвах, **а** тратуары ўкрыў голы лядок* (У.К.). *Жыта на лужках вымакла зусім, **затое** на гары і пад лесам сцяной ідзе* (Лыньк.). *Раслі тут не толькі вольхі, **але** і магутныя стогадовыя дубы* (Шам.);

б) злучнікі, якія падкрэсліваюць неадпаведнасць, супрацьлеглы змест аб'яднаных кампанентаў (супраціўныя): *Кружым па лесе, **а** стомы няма* (Вял.). *Вецер сціх, **але** сонца не прабівалася праз нізкія шэрыя хмары* (Г.М.). *Сады маладыя вайна пакасіла, **ды** толькі не скосіць народную сілу* (Бял.). *І пяюць, пяюць салоўкі, **толькі** іх ніхто не чуе* (С.З.).

**Размеркавальныя** злучнікі *або (альбо), ці, або ... або, ці ... ці, то ... то, ці то ... ці то, не то ... не то* паказваюць на ўзаемнае выключэнне, узаемную замену або чаргаванне пэўных з'яў: *Кожны дзень прыходзілі сюды бацька **або** маці* (К.Ч.). ***Ці** плачу я, **ці** пяю, **ці** размаўляю з матуляю – песню сваю, мову сваю я да грудзей прытульваю* (Панч.).

**Далучальныя** злучнікі далучаюць да папярэдняй часткі сказа словы, словазлучэнні, сказы, у якіх заключаюцца дадатковыя, папярэдне не прадугледжаныя звесткі, заўвагі. Спецыялізаваным сродкам выражэння далучальных адносін выступаюць злучнікі *ды і, ды і то, прычым, прытым*: *Лемяшэвіча даўно ўжо лічылі тут сваім чалавекам, **ды і** сам ён прывык лічыць сябе членам гэтай дружнай сям'і* (Шам.). *У Андрэя вопы-*

*ту не больш,* ***прытым*** *і характарам ён мяккаваты* (Маш.). *Мікола доўга гаварыў,* ***прычым*** *зусім не хваляваўся* (Н.).

Далучальную функцыю могуць выконваць і многія іншыя злучальныя злучнікі – *і, а, але* і інш. Для канкрэтызацыі далучальнага значэння пры гэтых злучніках часта ўжываюцца словы *так, гэта, таму, таксама* і інш.: *Голас у начальніка быў басавіты,* ***і гэта*** *бянтэжыла мужчын* (Пальч.). *Даводзілася блытацца,* ***а таму*** *яны спазніліся* (Я.М.). Далучальныя адносіны могуць выражаць злучнікі, якія стаяць у пачатку самастойнага сказа: *Прасторы зямлі шырыліся, разгортваючы свае малюнкі-чары.* ***І*** *хто не паддасца гэтым чарам?* (К-с).

У асобную групу выдзяляюць так званыя **паясняльныя** злучнікі, якія ўжываюцца для сувязі як пэўных членаў сказа, так і частак складаных сказаў. Паясняльныя злучнікі паказваюць, што сінтаксічная адзінка, якая пры дапамозе іх далучаецца да папярэдняй, мае паясняльны характар і ўдакладняе, канкрэтызуе яе змест. Да злучнікаў, якімі афармляюцца паясняльныя адносіны, належаць *гэта значыць, а іменна, а менавіта, а таксама* злучнікі *ці, або, што* ўжываюцца пры адасобленых членах сказа: *Драма ... паказвае, як чалавек актыўна ўмешваецца ў жыццё, каб змяніць яго ў адпаведнасці са сваімі імкненнямі і перакананнямі,* ***гэта значыць*** *паказвае чалавека ў дзеянні* (Лаз.). *Я быў на лузе,* ***а іменна*** *– сушыў сена* (Гал.). *Шыпшына,* ***або*** *дзікая ружа, належыць да сямейства ружакветных* (Корс.). *На вашай зямлі за вайну стала многа аблог,* ***ці****, як у нас кажуць, ялавін* (Пестр.). Паясняльныя злучнікі не вызначаюцца шырокім ужываннем і з'яўляюцца прыналежнасцю пераважна кніжнай мовы.

**Падпарадкавальныя** злучнікі аб'ядноўваюць нераўнапраўныя часткі складанага сказа. Яны характэрныя для складаназалежных сказаў, у якіх паказваюць, што дадзеная частка падпарадкоўваецца галоўнай, паясняе яе, і з'яўляюцца неад'емным яе элементам. Некаторыя падпарадкавальныя злучнікі (*як, нібы, быццам, што, чым* і інш.) могуць выкарыстоўвацца і ў простым сказе: *На карце свету мая Беларусь* ***як*** *дубовы лісток* (Вял.). *А нам снежныя зімы больш прыемныя,* ***чым*** *лета* (Шам.).

Падпарадкавальныя злучнікі выражаюць паміж часткамі складаназалежнага сказа адносіны часу, прычыны, мэты, умовы, параўнання, уступкі, тлумачэння, выніку. У адпаведнасці з характарам гэтых адносін яны падзяляюцца на наступныя групы:

**часавыя** злучнікі: *калі, пакуль, як, ледзь, чуць, толькі, як толькі, тым часам як, з таго часу як, пасля таго як, перш чым* і інш. *І вясной,* ***як*** *забуяюць росы, зашуміць, загойдае калоссе* (Бр.). ***Калі*** *сонца паднялося вышэй, на зямлю зноў сышла гарачыня* (І.М.). *Рана, рана маці ўстала,* ***ледзь*** *успыхнулі зарніцы* (Вр.);

**прычынныя** злучнікі: *бо, што, таму што, паколькі, з прычыны таго што, з-за таго што, як, а то. Праясняецца пагода, **бо** вярнулася вясна* (Багд.). *Злаваць чыноўнік пачынае, **што** дзядзька вытрыманасць мае* (К-с);

**мэтавыя** злучнікі: *каб, для таго каб, дзеля таго каб, з тым каб, абы. За колькі дзён да касавіцы касцы заглянуць на паліцы, **каб** малаток знайсці і бабку* (К-с);

**умоўныя** злучнікі: *калі, калі б, каб, як, раз, абы, толькі, калі ... то, калі ... дык, як ... то, раз ... то. Вось бяда будзе, **калі** дзяўчына не захоча ісці да нас* (Кр.). *Нават **калі** скінуць гадоў пятнаццаць з плячэй дзеда Талаша, **то** і тады ён быў ужо немалады...* (К-с);

**параўнальныя** злучнікі: *як, нібы, быццам, што, бы, як бы, як быццам, чым ... тым. Глядзелі з вокнаў аганькі мне ўслед з трывогай шчыра, **нібы** ў далёкі і цяжкі я падымаўся вырай* (А.К.). *Гасне дзень у задуменні, **як** гаснуць жыцця летуценні* (К-с);

**уступальныя** злучнікі: *хоць, нягледзячы на тое што, хай, няхай. Наша воля неўміруча, **хоць** і пад замкамі* (Хвед.). ***Нягледзячы на тое што** прыказкі і прымаўкі самастойна не бытуюць, яны не трацяць ад гэтага свайго велізарнага значэння* (Кр.). *Юрка хлопчык ўжо вялікі, **хай** сабе замала год...* (Куп.);

**тлумачальныя** злучнікі: *што, як, каб, чым, нібы, быццам, як быццам, ці. Як позна зразумеў, **што** на зямлі бацькоў няма бязмоўных дрэў, маўклівых валуноў* (М.Т.). *Вы чулі, **як** вуркочуць лясныя галубы?* (Панч.). *Потым Лабановіч разважаў у думках, **ці** правільна зрабіў ён Думітрашку такую заўвагу* (К-с);

**выніковыя** злучнікі: *так што, то, дык. Усё гэта патрабавала часу, **так што** Сяргей выбраўся з горада толькі ў пачатку мая...* (Пол.). *Адкукавала зязюля, **то** хутка і восень* (Бяд.).

Большасць падпарадкавальных злучнікаў замацаваныя за пэўнымі тыпамі дадaных частак, бо выразна паказваюць на тыя адносіны, якія выражаюцца паміж часткамі складаназалежнага сказа. Такія злучнікі называюць **семантычнымі**. Да іх адносяцца, напрыклад, часавыя (*пакуль, пасля таго як* і інш.), прычынныя (*бо, таму што* і інш.), умоўныя (*калі б, раз* і інш.). Другія ж злучнікі (*як, што, чым, каб* і інш.) не маюць канкрэтнага значэння і ўжываюцца для выражэння розных відаў адносін. Гэта так званыя **асемантычныя** злучнікі, або **функцыянальныя**.

Некаторыя падпарадкавальныя злучнікі (*таму што, з-за таго што, для таго каб* і інш.) у адпаведнасці з лагічным націскам могуць распадацца на дзве часткі, у выніку чаго адна частка становіцца суадносным словам у галоўнай частцы сказа, а другая – злучнікам у даданай: *Я*

*гэту мову ўзяў сабе **таму, што** зашмат у ёй было гаротных песень* (М.Т.). Аднак у большасці выпадкаў такія злучнікі ўваходзяць поўнасцю ў дадзеную частку сказа: *На ўскраіне горада машыны спыніліся, **таму што** сталі пярэднія* (І.М.).

### 2.2.3. Класіфікацыя злучнікаў паводле іх паходжання, структуры і спосабу ўжывання

Паводле паходжання злучнікі бываюць невытворныя і вытворныя. **Невытворныя** злучнікі (*і, а, але, ды, бо* і інш.) з пункту погляду сучаснай беларускай мовы не суадносяцца са словамі іншых часцін мовы. Гэта вельмі старажытныя словы, паходжанне якіх немагчыма ўстанавіць. Да **вытворных** адносяцца злучнікі, што захавалі сувязь са словамі, ад якіх яны ўтварыліся, – з займеннікамі, прыслоўямі, назоўнікамі ці рознымі спалучэннямі слоў. Іх паходжанне ад іншых часцін мовы відавочнае. Напрыклад, злучнікі *што, таму што* паходзяць ад займеннікаў; *як, калі, пакуль* – ад прыслоўяў; *хоць (хаця), няхай (хай)* – ад дзеясловаў; *раз* – ад назоўніка; *ці, быццам, толькі* – ад часціц. Ад спалучэння розных часцін мовы паходзяць злучнікі *затое (за тое), для таго каб, як бы, тым часам як, нягледзячы на тое што, з прычыны таго што* і інш.

Паводле структуры злучнікі падзяляюцца на простыя і састаўныя. **Простыя** злучнікі выступаюць як адно слова: *і, ды, ці, што, каб, калі, аднак*. Сярод простых могуць быць як невытворныя злучнікі (*і, але, а*), так і вытворныя (*што, як*).

**Састаўныя** злучнікі складаюцца з двух ці некалькіх слоў, якія ўтвараюць сэнсавае адзінства: *таму што, так што, для таго каб, з таго часу як, як толькі, як быццам* і інш. Гэтыя злучнікі паводле паходжання звычайна вытворныя, часта ў іх склад уваходзяць словы, суадносныя з займеннікамі, прыслоўямі, назоўнікамі. Ва ўтварэнні многіх састаўных злучнікаў удзельнічаюць простыя злучнікі *і, што, як, каб* і інш.

У залежнасці ад спосабу ўжывання злучнікі падзяляюцца на адзіночныя, паўторныя і парныя.

**Адзіночныя** злучнікі, звязваючы пэўныя кампаненты сказа, ужываюцца ў ім толькі адзін раз. Адзіночнымі могуць быць як злучальныя, так і падпарадкавальныя злучнікі: *і, ці, або, калі, як, што, каб* і інш. Заўсёды адзіночнымі з'яўляюцца злучальныя злучнікі *а, але, ды, затое*, якія могуць звязваць толькі два кампаненты і таму не паўтараюцца.

Да адзіночных таксама належаць і тыя злучнікі, якія хоць і ўжываюцца ў сказе некалькі разоў, але звязваюць неаднатыпныя кампаненты: *Прасякнутае цеплынёй **і** пахамі адталай зямлі паветра крыштальна чыстае, **і** далягляд вырысоўваецца выразна **і** акрэслена* (Хадк.). У гэтым сказе злучнік *і* адзіночны, бо ў першым выпадку ён звязвае аднародныя

дапаўненні, у другім – часткі складаназлучанага сказа, у трэцім – аднародныя акалічнасці.

**Паўторныя** злучнікі паўтараюцца пры кожным аднародным кампаненце, якія яны звязваюць. Адны з іх (*або, ці, і, ды, што, калі, як* і інш.) могуць быць як адзіночнымі, так і паўторнымі. Другія (*то ... то, ці то ... ці то, не то ... не то, ні ... ні*) – толькі паўторнымі, бо наяўнасць аднаго злучніка патрабуе такога ж другога: ***Ці то*** *сонца свеціць,* ***ці то*** *месяц ясны вам смяецца з неба весела і шчасна* (Куп.); ***То*** *лясок,* ***то*** *луг,* ***то*** *поле,* ***то*** *лужок зялёны* (К-с).

**Парныя** злучнікі складаюцца з дзвюх структурна неабходных частак: першая адносіцца да аднаго аднароднага кампанента, другая – да другога. Парнымі з'яўляюцца злучальныя злучнікі (*не толькі ... але і, не толькі ... а і, як ... так і, не то што ... але* і інш.) і падпарадкавальныя злучнікі (*калі ... то, калі ... дык, чым ... тым, як... то, раз... то* і інш.): *І пра гэта гаварылася ў школе* ***не толькі*** *шэптам, з вуха на вуха,* ***але і*** *на поўны голас, на занятках* (Сач.). ***Чым*** *ніжэй апускалася асенняе сонца,* ***тым*** *гусцей спавіваў туман лесавыя сенажаці* (Бяд.). ***Раз*** *не было песень,* ***то*** *не было і вяселля* (Пр.).

У сучаснай беларускай мове працэс утварэння новых злучнікаў адбываецца пераважна за кошт пашырэння іх саставу, г. зн. падключэннем да злучніка іншых часцін мовы, напрыклад прыслоўяў ці прыназоўнікава-іменных спалучэнняў: *а таксама, а менавіта, як толькі, для таго каб, у выніку таго што* і інш. Некаторыя спалучэнні толькі яшчэ знаходзяцца на шляху пераходу ў злучнікі.

Злучнікі, як і словы іншых часцін мовы, могуць мець стылістычную афарбоўку. Многія з іх стылістычна нейтральныя (*і, а, але, калі, што, як*), а некаторыя з'яўляюцца прыналежнасцю кніжнай мовы (*з прычыны таго што, у той час як, нягледзячы на тое што* і інш.) або размоўнага стылю (*раз, дарма што, абы, пакі, усе роўна як* і інш.).

## 2.3.Часціцы

### 2.3.1. Часціцы як часціна мовы

Часціцы – службовая часціна мовы, якая выражае дадатковыя сэнсавыя, мадальныя і эмацыянальна-экспрэсіўныя адценні слоў, словазлучэнняў і сказаў.

З дапамогай часціц можна вылучыць, падкрэсліць найбольш важнае слова ў тэксце, узмацніць яго гучанне, сэнс, выказаць пачуццё, выразіць пытанне, сцвердзіць або адмовіць факты ці з'явы рэчаіснасці, выказаць пабуджэнне да дзеяння, пажаданне.

Як і іншыя службовыя словы, часціцы самі па сабе не маюць самастойнага лексічнага значэння, не называюць прадметаў і з'яў рэчаіснасці,

не з'яўляюцца членамі сказа. Яны не ўжываюцца асобна ад самастойных слоў, па-за кантэкстам страчваюць тое дадатковае адценне значэння, якое надаюць моўнай адзінцы. Часціцы далучаюцца да асобных слоў, словазлучэнняў, сказаў.

Некаторыя часціцы *(так, але, не, ага, няўжо)* у дыялогах могуць выступаць у ролі слоў-сказаў – даюць адказ на пытанне, выражаюць згоду або нязгоду, пярэчанне, адмаўленне.

Большасць часціц не мае пастаяннага месца ў сказе. Звычайна ў пачатку сказа ўжываюцца часціцы *ці, няўжо, хіба* (у пытальных сказах), часціцы *так, але, не* (у адказах на пытанні), часціцы *што за, ну, няхай, бадай.* Часціцы *проста, не, ні, ані, амаль, толькі, менавіта, іменна, хоць, як бы, нібы, нібыта і* інш. стаяць перад словам, да якога адносяцца, а *жа(ж), такі, сабе* і інш. – пасля яго.

Некаторыя часціцы, якія былі цесна звязаны са словамі, ператварыліся ў афіксы. Сталі постфіксамі былыя часціцы *-сьці(-сь), -небудзь, -кольвек* у няпэўных займенніках і прыслоўях: *хтосьці (хтось), дзесьці (дзесь), калісьці, калі-небудзь, што-небудзь, як-небудзь, дзе-кольвек, што-кольвек; -ся(-ца, -цца)* у зваротных дзеясловах: *сустракаўся, сустракацца, сустракаецца.* Гэтыя былыя часціцы, як і іншыя марфемы, нельга аддзяліць ад слова, з якім яны звязаны, нельга пераставіць у сказе, нельга ўставіць слова паміж самастойнай часцінай мовы і такой часціцай.

Асобныя часціцы *(не, ні, ані, абы)* выконваюць двайную функцыю – ужываюцца або як часціцы, або як афіксы (прыстаўкі): *ён не знаёмы з намі – незнаёмы чалавек; ані не зважаў на гэта – аніхто не адказаў.*

### 2.3.2. Класіфікацыя часціц

Часціцы аб'ядноўваюцца ў пэўныя групы паводле іх марфалагічнага складу, паходжання, значэння, функцыі.

Паводле марфалагічнага складу часціцы падзяляюцца на простыя і састаўныя. Да **простых** адносяцца аднаслоўныя часціцы: *не, ні, аж, хіба, як, няхай, вунь, вось, ці, гэта, амаль* і інш. **Састаўныя** часціцы складаюцца з двух ці больш слоў (простых часціц): *вось дык, ну і, ну вось, хіба толькі, куды там, амаль што, абы толькі, хоць бы, што за, як бы, вось ужо, як быццам бы і* інш. Састаўныя часціцы надаюць выказванню яшчэ большую экспрэсію, чым простыя: *Ну вось – і мы з табою дома! За павароткай будзе сад* (Гл.). *Сцёпка скончыў школу, і Аленка скончыла яе – ды яшчэ як!* (К-с).

Паводле паходжання часціцы падзяляюцца на невытворныя і вытворныя. Да **невытворных** належаць часціцы, якія з пункту гледжання сучаснай мовы не суадносяцца з самастойнымі часцінамі мовы: *вось, вунь, а, і, жа(ж), але, не, ні, дык, нават, аж і* інш. **Вытворныя** часціцы

паходзяць з самастойных часцін мовы і суадносяцца з імі: ад займеннікаў утварыліся часціцы *гэта, усё, сабе, то, яно;* ад прыслоўяў – *проста, якраз, амаль, чыста, менавіта, іменна, выключна, так, як, куды, ужо, няўжо;* ад дзеясловаў – *дай, давай (давайце), хоць, хаця, няхай(хай), бач.* Некаторыя часціцы паходзяць ад выклічнікаў – *ну, ага.*

У кантэксце трэба адрозніваць адпаведныя самастойныя часціны мовы і аманімічныя з імі часціцы. Параўн.: ***Гэта*** *здарэнне ўсхвалявала ўсіх* (К-с) *і Акіян –* ***гэта*** *шчодрасць без краю* (Б.) – у першым сказе *гэта* – указальны займеннік, мае самастойнае значэнне, паказвае на прымету, дапасуецца да назоўніка ў родзе, ліку, склоне, з'яўляецца ў сказе азначэннем; у другім *гэта* – указальная часціца, не мае самастойнага значэння, не змяняецца, не з'яўляецца членам сказа. *Дарога ішла* ***проста,*** *адна – нідзе не перакрыжоўвалася з другой* (Пестр.) і ***Проста*** *не ведаю, што і сказаць...* (Шам.) – у першым выпадку *проста* прыслоўе, мае самастойнае значэнне, абазначае прымету дзеяння, паясняе дзеяслоў-выказнік, выступае ў ролі акалічнасці, у другім *проста* часціца, не мае самастойнага значэння, членам сказа не з'яўляецца.

Паводле значэння часціцы падзяляюцца на тры групы: часціцы, якія выражаюць дадатковыя сэнсавыя адценні; мадальныя і мадальна-валявыя часціцы; эмацыянальна-экспрэсіўныя часціцы. У асобную, чацвёртую групу вылучаюцца словаўтваральныя і формаўтваральныя часціцы.

### 2.3.3. Часціцы, якія выражаюць дадатковыя сэнсавыя адценні

Да часціц, якія выражаюць дадатковыя сэнсавыя адценні, адносяцца ўказальныя, азначальна-ўдакладняльныя і вылучальна-абмежавальныя часціцы.

**Указальныя** часціцы *вось, вунь, гэта* паказваюць на наяўнасць прадметаў і з'яў рэчаіснасці.

Часціца *вось* паказвае на прадметы і з'явы, якія знаходзяцца побач, у непасрэднай блізкасці: ***Вось*** *вакзал. Як хутка ты, расстанне!* (Луж.). Часціца *вунь* паказвае на прадметы і з'явы, якія знаходзяцца на некаторай адлегласці, аддаленыя ад назіральніка: ***Вунь*** *там, каля рэчкі, таксама быў некалі лес* (Скр.).

Указальныя часціцы могуць ужывацца ў спалучэнні з узмацняльнай часціцай *і;* у такіх выпадках сказ набывае выразнае дадатковае адценне з'яўлення, дасягнення чаго-небудзь пажаданага: ***Вось*** *і хата, якую так часта ён сніў* (Бр.). ***Вось*** *ужо і лес, ужо зусім блізка* (М.Л.).

У спалучэнні з займеннікамі і займеннікавымі прыслоўямі, з іншымі часціцамі ўказальныя часціцы *вось, вунь* набываюць узмацняльна-ўдакладняльнае значэнне, ужываюцца для выражэння розных эмацыянальных ацэнак – здагадкі, здзіўлення, захаплення, задавальнення, радасці: ***Дык вось*** *чым рэчка хлопцу міла, чым так яго прываражыла!* (К-с). ***Дык***

***вось** яно што! Гэта бярозы развітваюцца з адламаным веццем!* (Луж.).

У народных гаворках і ў мове мастацкіх твораў сустракаюцца варыянты ўказальных часціц: *вось – во, от, ось, вот; вунь – унь: Глядзіце, **во** прасторы! **Во** нівы, лясы, палі!* (Ц.). ***Унь** недзе рыпнулі вароты* (І.М.). Адзначаныя варыянты ўказальных часціц надаюць сказам гутарковае адценне.

Часціца *гэта* паказвае на прадметы, з'явы, выдзяляе, падкрэслівае пэўнае слова ў сказе і надае выказванню ўзмацняльнае значэнне: *Кожны чалавек – **гэта** толькі свой, асаблівы, нідзе не паўтораны вобраз* (Скр.).

**Азначальна-ўдакладняльныя** часціцы *іменна, менавіта, якраз, акурат, проста, амаль, амаль што, прыблізна, сапраўды* ўдакладняюць і падкрэсліваюць сэнс слоў, перад якімі стаяць, даюць ім пэўную характарыстыку: *Навязваць людзям сваю волю, вымагаць ад іх, каб яны рабілі **іменна** так, а не іначай, мы не маем права, бо хто можа паручыцца за тое, што мы не памыляемся?* (К-с). ***Менавіта** на гэта – на асаблівасць, адметнасць, непаўторнасць усяго – указвалі і ўказваюць тыя, хто займаўся вывучэннем Палесся* (Сач.). *Старая Лукашыха прыйшла **якраз** у той час, калі трэба ўжо тушыць у хаце агонь* (К-с). Удакладняльная часціца *акурат* мае гутарковае адценне, яна блізкая значэннем да часціцы *якраз: Хата была **акурат** пад гарою, у ціхім, парослым травою завулку* (І.М.).

Азначальна-ўдакладняльныя часціцы падобныя да прыслоўяў, але па сваёй функцыі ў сказе выразна адрозніваюцца ад іх: не маюць самастойнага лексічнага значэння і не з'яўляюцца членамі сказа, а толькі ўдакладняюць сэнс пэўных слоў.

**Вылучальна-абмежавальныя** часціцы *толькі, абы толькі, хіба толькі, хоць, хаця, хоць бы, хаця б, ледзь, чуць, адзіна, выключна* вылучаюць у сказе пэўныя словы і надаюць ім абмежавальнае адценне: *Месяц амаль не свяціў, **толькі ледзь** бліскаў у імглістым ззянні* (В.Б.).***Чуць** трошкі ў лесе пасвятлее, глядзіш – на рэчку ён шыбуе...* (К-с).

Часціцы *хоць, хаця, толькі* ў спалучэнні з часціцай *бы(б)* выражаюць мадальныя значэнні – меркавання, перасцярогі, пажадання: ***Толькі** б захаваць усё найлепшае, **толькі б** пахаваць усё найгоршае* (Панч.). ***Хаця б** на міг, **хаця б** знянацку зірні здалёку на мяне!* (Бур.).

У гутарковай мове, мове мастацкіх твораў сустракаецца часціца *адно,* блізкая значэннем да часціцы *толькі: Гэта ў нас тут дзвесце вёрст – дарога вялікая, а ў стэпе **адно** можа ад станіцы да станіцы* (Чыгр.). *Жадаю вам, любыя рэкі, **адно** толькі міру, спакою* (Кір.). ***Адно** вазьмі яго з сабою, усюды пойдзе за табою і ўсё забудзе, ўсё даруе, на дзядзьку больш не засярдуе* (К-с).

### 2.3.4. Мадальныя і мадальна-валявыя часціцы

**Мадальныя** часціцы выражаюць розныя адносіны гаворачай асобы да рэчаіснасці: сцвярджэнне, адмаўленне, пытанне, меркаванне, пажаданне, параўнанне і інш. Адпаведна вылучаюцца некалькі груп часціц, якія перадаюць разнастайныя мадальныя адценні.

**Сцвярджальныя** часціцы *так, але, ага, ну* абазначаюць станоўчы адказ на пытанне, згоду з думкай субяседніка, пацвярджэнне яго слоў: *«А вы, дзеткі, яшчэ першы раз прыйшлі да школкі?» – мякка прамовіў настаўнік да малых. – **«Але»*** (К-с). *«У брыгадзе будзеш?» – **«Ага»*** (Шам.).

Сцвярджальныя часціцы ўжываюцца пераважна ў дыялогах, у рэпліках-адказах на пытанні субяседніка. Яны могуць выкарыстоўвацца і для пацвярджэння ўласных думак: *Сцепаніду пранізала здагадка: мост! **Так,** гэта было за недалёкай павароткай гасцінца, менавіта там нешта адбывалася* (В.Б.).

**Адмоўныя** часціцы *не, ні, ані* – асноўны сродак адмаўлення ў беларускай мове. Часціца *не* мае два значэнні. Яна можа выражаць адмаўленне выказвання – нязгоду, адмоўны адказ на пытанне, прапанову (у такіх выпадках ужываецца ў дыялогах і выступае як слова-сказ): *«Стаміўся?» – спытаў бацька, з ласкавасцю заглядаючы ў вочы сына. – **«Не»*** (Каратк.). Другое значэнне часціцы *не* – адмаўленне таго, што абазначана асобным словам, да якога яна адносіцца. Гэта часціца можа стаяць пры любой самастойнай часціне мовы, але найчасцей у адмоўных сказах спалучаецца з дзеясловам-выказнікам: *Ніхто так дзецям **не** спагадае, як матка родная* (Пр.).

Часціца *не* можа надаваць выказванню і сцвярджальны сэнс. Гэта бывае ў наступных выпадках:

калі *не* ўжываецца двойчы – пры кожнай частцы састаўнога дзеяслоўнага выказніка: *Апейка **не** мог **не** здзіўляцца: як можна было мецъ такі ясны, багаты розум пры векавечнай, да знямогі, працы!* (І.М.);

калі ўжываецца ў незалежных пытальна-клічных (звычайна рытарычных) сказах у спалучэнні з займеннікамі, прыслоўямі, часціцамі *(хто не, які не, дзе не, дзе толькі не, чаго толькі не, куды не і* інш.): ***Хто ж не** любіць душою нашу маці-зямлю!* (Бр.). *У песнях-калыханках **чаго толькі не** гаварылася!* (Сач.);

калі ўжываецца ў спалучэнні з інфінітывам у аднасастаўных інфінітыўных сказах: *Гэту нашу вандроўку мне век **не** забыць* (М. Т.).

калі стаіць пасля злучнікаў *пакуль, каб,* часціц *ледзь, чуць, амаль: Сэрца **ледзь не** вырывалася з грудзей* (М.Л.);

калі стаіць перад назоўнікам з прыназоўнікам *без: прачытаў кнігу **не без** карысці для сябе* (г. зн. з карысцю), *глянуў не без цікавасці* (г. зн. з

цікавасцю).

Часціца *ні* ўжываецца для ўзмацнення адмаўлення:

у адмоўных сказах, дзе адмаўленне выражаецца часціцай *не,* словамі *няма, нельга, немагчыма, няможна: Дзьмуў, **ні** на хвіліну **не** аціхаў моцны, парывісты вецер* (Сач.). ***Няма ні** душы на вуліцы;*

у адмоўных сказах з аднароднымі членамі сказа, у якіх часціца *ні* выконвае ролю злучніка пры пералічэнні; у такіх выпадках яе можна замяніць паўторным злучнікам *і: Голас даўняга рэха **ні** ўдзень і **ні** ўноч не змаўкае* (Кір.)

Часціца *ні* мае адмоўнае значэнне ў пабуджальных сказах: *Ні з месца! Ні кроку назад!,* а таксама ў безасабовых сказах пры дапаўненні ў форме роднага склону: *На небе **ні** хмурынкі. У лесе **ні** гуку.*

Часціца *ані* служыць для ўзмацнення адмаўлення, перадае большую, чым часціца *ні,* экспрэсію, набывае ў кантэксце значэнне 'нікольki', 'нічуць', 'зусім': *Маўчаць хваіны, **ані** зыку, не шэпне гэты бор-музыка* (К-с).

Часціца *ні* мае сцвярджальнае значэнне з адценнем узмацнення, калі ўжываецца ў даданых частках складаназалежнага сказа ў спалучэнні са злучальнымі словамі – займеннікамі і прыслоўямі *дзе ні, хто ні, што ні, куды ні, як ні, які ні* і інш. (у такіх спалучэннях можа быць і часціца *бы(б): дзе б ні, хто б ні, куды б ні* і інш.): ***Куды ні** глянь – усё бялютка* (К-с). ***Дзе б** мы **ні** былі, якія б краіны нас ні паклі-калі, мы ўсё роўна будзем сніць адну-адзіную дарогу, якая вядзе нас да роднай хаты* (Я.С).

**Пытальныя** часціцы *ці, хіба, няўжо, а, га, ну* служаць для выражэння пытання і афармлення пытальных сказаў. Пытальныя часціцы (асабліва ў рытарычных пытаннях) могуць надаваць выказванню розныя эмацыянальныя і мадальныя адценні – радасці, захаплення, упэўненасці, няўпэўненасці, сумнення, меркавання і інш.: ***Ці** ў цудоўную гэту краіну ўступіць, **ці** яе абысці, абмінуць старанай, не парушыўшы гэты спрадвечны спакой?* (М.Т.). ***Хіба** можна так доўга трымаць крыўду на Ядвісю?* (К-с). ***Няўжо, няўжо** мінулася расстанне?* (Кір.).

**Параўнальныя** часціцы *быццам, бы, як быццам, нібы, як бы, быццам бы* ўжываюцца пры супастаўленні падобных прадметаў, з'яў, дзеянняў, але часта прадмет параўнання бывае толькі ўмоўны; у сказе выражаецца меркаванне, сумненне, няўпэўненасць: *Увайшлі ў сяло і **быццам** нырнулі пад цёмную павець: уся вуліца была абсаджана старымі ліпамі* (Кудр.). *Там, у высокай недасяжнасці, не спалі, глядзелі зоры. Яны **нібы** далучалі да нечага недасяжнага, вечнага* (І.М.).

**Мадальна-валявыя** часціцы *бы(б), ня-хай(хай), давай(давайце), дай(дайце), ну, ану (а ну), бадай, такі* выражаюць волю гаворачай асобы.

Часціцы *бы (б), няхай (хай), дай (дайце), давай (давайце)* служаць

для ўтварэння формы ўмоўнага або загаднага ладу дзеясловаў, выражаюць пабуджэнне да дзеяння, пажаданне, перасцярогу, просьбу, прапанову: *Каб на кожным слове ставілі таўро праўды, напэўна, лягчэй і святлей нам жылося **б** на свеце* (М.Т.). ***Давай** з табой паслухаем, як гай спявае песню нам* (Панч.).

Часціца *ну* можа надаваць выказванню розныя мадальныя адценні – пабуджэнне да дзеяння, прапанову, пажаданне, згоду або нязгоду, паказвае на вывад, заключэнне: *«**Ну, давай**, жыва! Выходзьце!» – пачулася каманда* (В.Б.). *«**Ну** то добра, сядайце. Паслухайце песню!» – сказаў дзед* (Каратк.).

Часціца *ану (а ну)* выражае пабуджэнне да дзеяння, патрабаванне, катэгарычны загад: *Давайце за працу, **ану**, жыва!* (Шам.). ***А ну** давай, брат, запрабуем, які тут сок на новым месце? Мо з хлебам можна яго есці?* (К-с).

Часціца *такі* сцвярджае рэальны факт, бясспрэчнасць з'явы, дзеяння: *Мачаха, збітая трохі папрокам за Ганніну бяду, у якой яна чула сябе **такі** вінаватаю, момант шукала, што б такое сказаць* (І.М.). *Папаліся-**такі** добра, сярод поля, з канём* (В.Б.).

Часціца *бадай* ужываецца для выражэння пажадання з адценнем жарту, іроніі, часта выкарыстоўваецца ў кленічах: ***Бадай** жа ты прапаў, мой мілы! Усё сапсаваў, **бадай** ты знік!* (К-с).

Да мадальна-валявых прымыкаюць часціцы, якія выражаюць адносіны да верагоднасці выказвання – *наўрад, наўрад ці, бадай, бадай што: Васіля таміла прадчуванне, што і Апейка **наўрад ці** паможа чым-небудзь* (І.М.). *Тут, на ўсходзе Беларусі, растуць **бадай што** найлепшыя бары, звонкія, прапахлыя жывіцай* (Каратк.).

### 2.3.5. Эмацыянальна-экспрэсіўныя часціцы

Эмацыянальна-экспрэсіўныя часціцы выражаюць эмацыянальную ацэнку выказвання або ўзмацняюць яго выразнасць. Да гэтай групы адносяцца клічныя і ўзмацняльныя часціцы.

**Клічныя** часціцы *што за, як, ну, ну і, вось, вось дык, няхай (хай), куды* даюць эмацыянальна-экспрэсіўную характарыстыку асобы, прадмета, дзеяння, надаюць выказванню розныя эмацыянальныя адценні – захаплення, радасці, здзіўлення, насмешкі і інш.: ***Што за** дока быў дзед Мікіта ў маладыя гады! І не было ў сяле роўнага яму* (К-с). ***Як** многа гавораць мне назвы такія – Мінск, Пінск, Брэст!* (Бр.).

**Узмацняльныя** часціцы *нават, ды, дык, ж (жа), аж (ажно), і, ні, усё, сабе* ўзмацняюць змест выказвання, лагічна выдзяляюць і падкрэсліваюць сэнс пэўнага слова, словазлучэння, сказа: *Панасыпала сёння сумётаў, **аж** схаваліся яблынь камлі* (Бур.). *Гуртам **і** ў бядзе лягчэй* (Пр.). *Каса станавілася **ўсё** цяжэйшай, рукі наліваліся ўтомаю* (І.М.). Узмац-

няльнае значэнне эмацыянальна-экспрэсіўных часціц асабліва выразна выяўляецца тады, калі яны ўжываюцца ў спалучэнні з іншымі часціцамі: ***Дык вось*** *які Мінск! Ой,* ***дый*** *горад* ***жа***! (К-с).

### 2.3.6. Словаўтваральныя і формаўтваральныя часціцы

У асобную групу вылучаюцца часціцы, якія служаць для ўтварэння новых слоў ці новых формаў слоў. Да **словаўтваральных** адносяцца часціцы паводле паходжання, а ў сучаснай мове прыстаўкі *не-(ня), ні-, ані-, абы-,* постфіксы *-небудзь, -сьці(-сь).* З дапамогай прыстаўкі *не-(ня-)* ад назоўнікаў, прыметнікаў, прыслоўяў утвараюцца словы з супрацьлеглым значэннем – антонімы: *прыяцель – непрыяцель, далёкі – недалёкі, лёгка – нялёгка, высока – невысока.*

З дапамогай прыставак *не-, абы-,* постфіксаў *-небудзь, -сьці(-сь)* утвараюцца: няпэўныя займеннікі ад займеннікаў адносных: *што – нешта, абы-што, што-небудзь, штосьці(штось); які – нейкі, абы-які, які-небудзь, якісьці (якісь); чый – нейчы (нечы), абы-чый, чый-небудзь, чый-сьці (чыйсь)*; няпэўныя прыслоўі ад займеннікавых прыслоўяў: *дзе – недзе, абыдзе, дзесьці (дзесь), дзе-небудзь; як – неяк, абы-як, яксьці, як-небудзь; калі – некалі, абы-калі, калісьці (калісь), калі-небудзь і* інш.

Часціца *-кольвек (-кольвечы, -колечы),* якая выкарыстоўваецца для ўтварэння няпэўных займеннікаў і прыслоўяў, мае гутарковае адценне: *Сотнікаў з байцамі* ***як-колечы*** *развярнуў апошнюю ўцалелую гармату проста на бруку I паслаў цяжкі снарад у бок ворага* (В.В.).

Прыстаўка *ні-* (часціца паводле паходжання) ужываецца для ўтварэння адмоўных займеннікаў і прыслоўяў: *ніхто, нішто, ніякі, нічый, ніколі, нідзе, ніяк.* З такой жа функцыяй выкарыстоўваецца і часціца *ані-,* якая мае значэнне ўзмоцненага адмаўлення: *ані-хто, анішто, аніякі, анічый, анідзе, аніколі, аніяк.*

Да **формаўтваральных** адносяцца часціцы *бы(б), няхай (хай), давай (давайце), -ся(-ца, -цца),* з дапамогай якіх утвараюцца формы дзеяслова.

Часціца *бы (б)* служыць для ўтварэння формы ўмоўнага ладу дзеясловаў: *Колькі гэтыя дубы, якім па пяцьсот-шэсцьсот гадоў,* ***маглі б*** *расказаць, каб умелі гаварыць* (Каратк.).

З дапамогай часціцы *няхай (хай)* утвараюцца аналітычныя формы загаднага ладу 3-й асобы адзіночнага і множнага ліку: *Падстаўлю рукі пад сняжынкі,* ***хай*** *на далонях* ***растаюць*** (Е.Л.).

Часціца *давай (давайце)* выкарыстоўваецца пры ўтварэнні аналітычных формаў загаднага ладу 1-й асобы множнага ліку: ***Давай*** *з табою з узбярэжжа па зорнай сцежцы пабяжым!* (Грах.).

Часціца-постфікс *-ся (-ца, -цца)* служыць для ўтварэння зваротных дзеясловаў: *Нельга* ***адмахнуцца*** *ад чужой трывогі і бяды* (Грах.). *Белыя*

*валокны сцелюцца над долам* (К-с).

Падзел часціц на тры групы ў залежнасці ад іх значэння і вылучэнне чацвёртай групы на аснове іх граматычнага статуса ўскладняецца няпэўнасцю семантыкі асобных часціц і іх мнагазначнасцю. У многіх часціцах актыўна развіваюцца мадальныя значэнні. Некаторыя часціцы выступаюць як дапаможныя сродкі выражэння сінтаксічных адносін – выконваюць ролю злучнікаў у складаназлучаных і складаназалежных сказах *(ні – ні, то – то, жа (ж), хоць, хаця, быццам, як бы* і інш.).

## 2.4. Выклічнік

### 2.4.1. Выклічнік як часціна мовы

Выклічнік – гэта клас слоў, з дапамогай якіх выражаюцца пачуцці, волевыяўленні чалавека, яго эмацыянальна-валявая рэакцыя на з'явы і падзеі навакольнай рэчаіснасці. Выклічнікі могуць перадаваць вялікі дыяпазон пачуццяў і волевыяўленняў: радасць, захапленне, здзіўленне, сумненне, крыўду, абурэнне, іронію, запрашэнне, заклік і інш.

У сістэме часцін мовы выклічнік займае асобнае месца: гэта і не самастойная, і не службовая часціна мовы. Адметнасць выклічніка як часціны мовы ў тым, што ён не мае намінатыўнага значэння: словы-выклічнікі толькі выражаюць пачуцці, волевыяўленні, аднак не называюць іх. Акрамя гэтага, выклічнікі – нязменныя словы, яны не маюць ніякіх граматычных паказчыкаў, марфемна непадзельныя і не з'яўляюцца членамі сказа. Не выконвае выклічнік у сказе і ніякіх службовых функцый, аналагічных функцыям прыназоўніка, злучніка ці часціцы.

У той жа час выклічнікі – моўныя адзінкі, якія маюць пэўны змест і зразумелыя носьбітам той ці іншай мовы. Гэтыя словы паддаюцца класіфікацыі паводле семантыкі і паходжання, могуць набліжацца да іншых лексіка-граматычных разрадаў слоў па сінтаксічных функцыях.

Выклічнікі з'яўляюцца выразным моўным сродкам, аднак значэнне многіх з іх выяўляецца толькі ў кантэксце, пры падтрымцы інтанацыі і слоў, якія падкрэсліваюць іх семантыку, дакладна называючы пачуцці, волевыяўленні. Выражаць самыя разнастайныя пачуцці могуць выклічнікі *ай!, ой!, ах!, ох!, о!, аго!, ну!, эй!, эх!* і інш.

Некаторыя выклічнікі здольныя перадаваць толькі якое-небудзь адно значэнне. Напрыклад, выклічнік *цыц* выражае загад змоўкнуць, *на табе* – здзіўленне, расчараванне: *«**Цыц** вы, гультаі, хопіць скардзіцца!» – зноў азваўся старшы* (Маш.). *Жалоба па бацьку яшчэ не адышла, ... а ён – на табе! На скрыпцы выігрывае* (Куп.).

Як часціна мовы выклічнікі маюць свае граматычныя асаблівасці. Уваходзячы ў склад сказа, яны часцей за ўсё не звязваюцца з іншымі членамі сказа, выступаюць як сінтаксічна незалежныя адзінкі: ***Ох**, слаўна з*

*дзядзькам ім жылося!* (К-с). Акрамя таго, выклічнікі могуць мець самастойнае інтанацыйнае афармленне і з'яўляцца своеасаблівым сродкам перадачы эмацыянальна афарбаванай думкі: ***Ша!*** *Хмарка, хмарка дарагая паўзе па небе з-за лясоў!* (К-с). *Адчуўшы кароткі пробліск задавальнення, ён кінуў:* ***«Айда?»*** (В.Б.).

Выклічнікі ўжываюцца пераважна ў пачатку сказа, і перамяшчэнне іх у сказе амаль немагчымае.

Набываючы ў сказе намінатыўнае значэнне, выклічнікі набліжаюцца да самастойных часцін мовы і выконваюць ролю розных членаў сказа: дзейніка, выказніка, дапаўнення, азначэння, акалічнасці: *Ляцела ўпартае* ***«алё»*** *па правадах паштовых* (М.К.). *Там рыба –* ***ого-го*** (Я.М.). *У парканах шулы, як салдаты, стаяць у струнку, зухаваты, башлык высокі, шапкі косы,* ***«ура!»*** *гукнуць табе гатовы* (К-с).

Некаторыя выклічнікі служаць базай для ўтварэння новых слоў – дзеясловаў і назоўнікаў, што ўжываюцца звычайна ў размоўным стылі: *ахаць, аханне, развойкацца, развохкацца, люляць, люлянне* і інш.

### 2.4.2. Разрады выклічнікаў

Па сваім значэнні выклічнікі падзяляюцца на тры разрады: эмацыянальныя, волевыяўленчыя і выклічнікі моўнага этыкету.

**Эмацыянальныя** выклічнікі перадаюць стан чалавека, выражаюць яго станоўчыя і адмоўныя эмоцыі, а таксама даюць эмацыянальную ацэнку з'явам рэчаіснасці. Да эмацыянальных выклічнікаў адносяцца *а!, о!, э!, ого!, ах!, ох!, ой!, ай!, ат!, божа барані!, божа мой!, брава!, біс!* і інш. Яны выражаюць радасць, захапленне, здзіўленне, страх, спалох, спачуванне, незадавальненне, прыкрасць, папрок, пратэст і г. д.: ***О****, якое цёплае, цёплае, цёплае мора* (Каратк.). ***Ах****, добра!* ***Ах****, як добра!* (Лыньк.). Адметнасцю выклічнікаў гэтага разраду з'яўляецца мнагазначнасць: яны могуць выражаць самыя разнастайныя пачуцці, нават супрацьлеглыя, і значэнне іх высвятляецца ў кантэксце.

**Волевыяўленчыя** (пабуджальныя, імператыўныя) выклічнікі выражаюць валявыя імкненні – розныя адценні пабуджэння да дзеяння, загад, заклік, зварот. Сярод волевыяўленчых выклічнікаў можна выдзеліць: 1) выклічнікі, якія выражаюць заклік, загад пачаць ці спыніць якоенебудзь дзеянне – *стоп!, марш!, гайда!, цсс!, ша!, цыц!, но!, тпру!* і інш.: ***Ша!*** *Ціха вы, не гаманіце!* (К-с); 2) выклічнікі, якія выражаюць зварот да каго-небудзь, заклік адгукнуцца, звярнуць увагу – *эй!, гэй!, ау!, агу!, алё!* і інш.: ***Гэй****, сябры мае! Дзе вы, родныя?* (К-с); 3) выклічнікі, якія выкарыстоўваюцца з мэтай адагнаць ці падазваць жывёл, птушак – *кыш!, псік!, кось-кось!, вуць-вуць! гуцё, гуцё, гуцё!* і інш.: *А тут кот адкуль ні ўзяўся і пад локаць яму – тоўк! – «****Псік****, не лезь!»* (К-с); 4) выклічнікі, якія ўжываюцца, каб супакоіць ці закалыхаць дзіця, – *агу, а-а-а, люлі-*

*люлі, баю-бай*: *Усё заснула ў цішыні, дык і ты хутчэй засні, **люлі-люлі, баю-бай**, спі, дзіцятка, засынай* (Грах.).

Асобную групу ўтвараюць так званыя **выклічнікі моўнага этыкету** – словы ці спалучэнні слоў, якімі выражаюцца прывітанне, развітанне, падзяка, просьба і іншыя формы ветлівасці – *добры дзень!, бывай(це)!, дзякуй!, дабранач!, калі ласка!* і інш.:, ***Добрай ночы** зара-заранiца!* (Багд.).

Паводле паходжання выклічнікі падзяляюцца на дзве групы: невытворныя і вытворныя.

**Невытворныя** выклічнікі сваім паходжаннем не звязаны з якiмі-небудзь іншымі часцінамі мовы. Яны ўтвараюцца з аднаго галоснага гука або спалучэння некалькіх гукаў: *о!, ах!, ну!, ого!, эге!*. Гэтыя выклічнікі могуць поўнасцю ці часткова паўтарацца і ўтвараць цэлы гукавы комплекс (*а-а-а!, ай-ай!, ай-яй-яй!, о-го-го!*): *«**О-го-го**, брат! – дзядзька кажа: – Цяпер зіма напэўна ляжа!»* (К-с).

**Вытворныя** выклічнікі суадносяцца з пэўнымі часцінамі мовы. Яны ўтвараюцца ад слоў, якія страчваюць сваю намінатыўную функцыю і граматычныя прыметы, але набываюць выразную эмацыянальную афарбоўку. Напрыклад, ад назоўнікаў паходзяць выклічнікі *божа!, жах!, бацюхны!, чорт!, глупства!*, ад дзеясловаў – *бывай(це)!, прабач(це)!, дзякуй!, падумаеш!*, ад прыслоўяў – *досыць!, ціха!*. На базе ўстойлівых фразеалагічных спалучэнняў утварыліся выклічнікі *вось табе і на!, вось яно што!, божа мой!, слава богу!* і інш. Такім чынам, гэты разрад выклічнікаў папаўняецца ў выніку пераходу іншых часцін мовы ў выклічнікі.

Да вытворных таксама адносяцца і выклічнікі, запазычаныя з іншых моваў: *біс!* (з лац.), *брава!* (з італ.), *алё!* (з фр.), *стоп!* (з англ.), *каравул!* (з цюркс.), *марш!* (з фр.) і інш.

Выклічнікі шырока ўжываюцца ў мове мастацкіх твораў, бо валодаюць яркай эмацыянальна-экспрэсіўнай афарбоўкай.

### 2.4.3. Гукапераймальныя словы

Гукапераймальныя словы – моўныя адзінкі, якія прыблізна ўзнаўляюць, пераймаюць гукі, характэрныя для жывой і нежывой прыроды. Гукапераймaнні імітуюць крык птушак (*ку-ку, курлы-курлы, га-га-га* і г. д.), жывёл (*му-у, гаў-гаў, мяў-мяў, і-га-га* і г. д.), гукі і шумы прыроды (*ш-ш-ш, шу-шу-шу, гу-у-у* і г. д.), гукі, што ўзнікаюць у выніку нейкіх дзеянняў, працэсаў (*бух, трах, дзынь-дзынь, буль-буль* і г. д.): ***«Крук-крук-крум!»** – прыцішана крыкнуў крумкач і важка сеў на дзіду* (У.А.). *Мчацца коні. **Дзын-дзын-дзын!*** (К-с).

Гукапераймальныя словы набліжаюцца да выклічнікаў чыста фармальна, толькі гукавым складам. Іх адрозненне ў тым, што выклічнікі выражаюць пачуцці, волевыяўленні чалавека, а гукапераймaнні ўзнаўля-

юць, пераймаюць гукі, пазбаўленыя ўсякага сэнсу, значэння, бо належаць, як правіла, не чалавеку, а іншым жывым істотам, пэўным прадметам, прыродзе,

Для перадачы гукаў жывой і нежывой прыроды, якія найбольш часта суправаджаюць чалавека, у мове замацаваліся традыцыйныя гукавыя комплексы: *ку-ку, мяў-мяў, цік-так* і г. д., гукаперайманні ж, створаныя самімі аўтарамі для канкрэтных выпадкаў, не маюць строга замацаванай формы: ***«Гу-гу-гу-у-у-у»***, *– гудзелі бярэзіны* (Гал.) і ***«Р-р-р»*** *– рыпелі намерзлыя галіны старой бярозы* (І.М.).

У кантэксце гукаперайманні звычайна выступаюць асобным словам, сказам і аддзяляюцца ад слоў аўтара (клічнікам і працяжнікам, коскай і працяжнікам (або толькі працяжнікам): ***«Ку-ку! Ку-ку!»*** *– абудзіла мой успамін сапраўдная зязюля* (Кір.). ***«Дзум-дзум-дзум!»*** *– пчала звінела* (Як.).

Гукаперайманні, як і выклічнікі, пры субстантывацыі выконваюць функцыі розных членаў сказа: *У небе пачулася працяжнае* ***кру-кру!*** *адлятаючых жураўлёў* (І.М.).

Некаторыя гукаперайманні паслужылі асновай для ўтварэння новых слоў: *кукаваць, кукаванне, кукарэкаць, кукарэканне, гаўкаць, гаўканне, мяўкаць* і інш.

Да гукаперайманняў набліжаюцца словы са значэннем імгненнага дзеяння кшталту *грук, гоп, шмыг, скок, зірк* і інш., якія называюць дзеяслоўнымі выклічнікамі: *Уладзік зараз –* ***шмыг*** *у дзверы* (К-с). Гэтыя словы захоўваюць лексічнае значэнне адпаведных дзеясловаў, а ў сказе выконваюць ролю выказніка. З гукаперайманнямі іх яднае гучанне, з выклічнікамі – дынамічнасць і эмацыянальная выразнасць.

## 2.5. Мадальныя словы

### 2.5.1. Мадальнасць і сродкі яе выражэння

Мадальнасць (лац. *modus* – спосаб, мера) – паняційная (семантыка-граматычная) катэгорыя, што выражае адносіны зместу выказвання да яго рэальнага ажыццяўлення, якія вызначаюцца аўтарам выказвання. Мадальнасць, такім чынам, адлюстроўвае і суб'ектыўныя і аб'ектыўныя адносіны чалавека да тых ці іншых з'яў рэчаіснасці.

Мадальнасць – катэгорыя ўнутрана вельмі разнапланавая; у беларускай мове выражаецца марфалагічнымі, сінтаксічнымі і лексічнымі сродкамі.

*Марфалагічным* сродкам выражэння мадальнасці выказвання з'яўляюцца формы ладоў дзеяслова, з дапамогай якіх перадаюцца разнастайныя мадальныя значэнні: рэальнасць – нерэальнасць дзеяння, яго магчымасць – немагчымасць, неабходнасць, пажаданасць – непажа-

данасць, упэўненасць – няўпэўненасць у яго ажыццяўленні; загад, просьба, парада, папярэджанне і г. д.: *Я **быў бы** шчаслівы бязмерна, калі б удалося мне здзейсніць надзеі маіх настаўнікаў і сяброў* (М.Т.). *Назад **бы вярнуцца** ў сад маленства* (Р.Б.). ***Раскладайце,** паліце купалля агні!* (Гіл.). ***Віруй**, жыццё! Сцялі імклівых дзён сцяжынкі* (Л.Д.).

*Сінтаксічныя* сродкі выражэння мадальнасці наступныя:

разнастайныя тыпы пабочных і ўстаўных слоў, словазлучэнняў і сказаў: *Спявайце, юныя паэты! **Магчыма,** вам якраз і здзейсніць дзядоў вялікі запавет* (Гіл.). *Век не пражыць – гэта ведае кожны – без непакою, без дум і турбот* (Кір.);

апавядальныя (сцвярджальныя, адмоўныя), пытальныя, пабуджальныя і клічныя сказы: *Магутнае слова, ты, роднае слова! Са мной ты на яве і ў сне* (Куп.). *Чаго вам хочацца, панове? Які вас выклікаў прымус забіць трывогу аб той мове, якой азваўся беларус?* (Куп.). *Суджана, стаўлена пад перакладзіны, сечана, палена, а не аддадзена, не парастрачвана і не раскрадзена роднае слова* (Луж.). *Цаніце! Высока пачуцці цаніце! Як дзеці, не цешцеся мілай маной!* (Бач.).

Мадальнасць выказвання можа быць выражана лексічна (праз семантыку розных часцін мовы):

назоўнікамі тыпу *праўда, самота, выпадковасць, сумненне, магчымасць;*

прыметнікамі – *рады, упэўнены, абавязковы, правільны;*

дзеясловамі – *сумнявацца, запэўніваць, сцвярджаць, адмаўляць;*

інфінітывам у спалучэнні з дзеясловамі, якія выражаюць магчымасць, неабходнасць, жаданне, імкненне і г. д.: *хачу вучыцца, стараўся не адставаць, загадаў спяшацца, мусіў прызнацца, не мог успомніць;*

інфінітывам у спалучэнні са словамі катэгорыі стану: *нельга сумнявацца, трэба працаваць, можна меркаваць, добра адпачываецца;*

часціцамі *ага, так, не, хіба, няхай (хай), няўжо, як бы* і інш.: ***Няхай** на свеце праўда пераможа* (К-с). ***Няўжо** зноў пачнецца гэты халодны і нудны дождж?* (А.М.). *Хай сонца не гасне, **хай** свецяцца зоры! Хай родная мова заўсёды жыве!* (ЛіМ).

Менавіта значэнне мадальнасці аб'ядноўвае названыя лексіка-граматычныя разрады слоў у адну лексіка-семантычную групу, нягледзячы на тое, што кожнае слова мае ўсе прыметы той часціны мовы, да якой адносіцца.

Як лексічны сродак выражэння мадальнасці выступаюць і мадальныя словы, якія аб'ядноўваюцца ў асобную часціну мовы на аснове агульнасці іх лексічнага значэння, граматычных уласцівасцей і функцый: *безумоўна, бясспрэчна, напэўна, мабыць, можа, магчыма, вядома,*

*здаецца, праўда, відаць* і інш. *Паплыў бы я, здаецца, хмаркі, разам з вамі* (К-с). *Пачаў церушыць халодны дождж, які сабраўся, **мабыць**, на ўсю ноч, а можа і на болей* (Лыньк.). *Нарэшце прыходзіў і вечар* (К.Ч.). *Не цяжка ў бары заблудзіцца, **вядома**, таму, хто не знае бароў* (Пр.).

### 2.5.2. Мадальныя словы іх характарыстыка і семантычныя разрады

Мадальныя словы – гэта асобны лексіка-граматычны разрад слоў, якія выражаюць адносіны ўсяго выказвання (ці яго частак) да рэчаіснасці. Яны не называюць прадметаў ці з'яў, прымет ці дзеянняў. З дапамогай мадальных слоў апавядальнік перадае свае адносіны да выказанай думкі: тое, аб чым гаворыцца ў сказе, можа мысліцца як рэальнае ці толькі магчымае, пажаданае або як неабходнае, абавязковае: ***Сапраўды**, у лесе было ціха і глуха* (К.Ч.). ***Праўда**, ружы былі ўжо пазразаныя* (Я.С).

Месца мадальных слоў у сістэме часцін мовы яшчэ канчаткова не вызначана, не акрэслены змест і аб'ём саміх мадальных слоў. Большасць даследчыкаў лічаць, што мадальныя словы не ўваходзяць у сістэму лексіка-граматычных разрадаў слоў, а займаюць асобнае месца.

Мадальныя словы маюць свае адметныя асаблівасці: яны нязменныя; у якасці мадальнага слова ў мове, як правіла, замацоўваецца толькі адна форма зменнага (суадноснага) слова. Напрыклад: форма назоўніка назоўнага склону адзіночнага ліку (*праўда, факт*), формы прыметніка (*вядома, мажліва*), дзеяслова (*значыцца*). І толькі ў адзінкавых выпадках у мадальныя словы ўваходзіць адразу некалькі словаформаў (*здаецца, здавалася, здавалася б*); яны не звязаны з іншымі словамі ў сказе ніякім відам сінтаксічнай сувязі; з агульным выказваннем яны звязаны толькі інтанацыйна; у сказе выконваюць ролю пабочных слоў, у дыялогах – словаў-сказаў: *Д а н і л а. То, **мусіць**, хутар перацягне? Б а т у р а. **Вядома**. Маргун не дачакаецца, калі Шмігельскі ў сваты прыйдзе* (Кр.).

Мадальныя словы не маюць сталага месца ў сказе; яны, як правіла, знаходзяцца ў непасрэднай блізкасці да таго словазлучэння ці слова, на якім акцэнтуецца ўвага: ***Здаецца**, кропелькі блакіту прасыпаліся з нябесных вышынь – гэта цвілі ля самай крыніцы незабудкі* (Лыньк.).

Мадальныя словы ўдакладняюць, узмацняюць мадальнасць выказніка, выражаюць дакладную ці прыблізную ацэнку рэчаіснасці. Калі мадальныя словы стаяць у пачатку сказа, то звычайна выражаюць мадальнасць усяго выказвання: ***Значыць**, у яго з мамаю была ўжо свая хата* (Я.С). Мадальныя словы, якія падкрэсліваюць мадальнасць выказніка, звычайна стаяць перад ім: *На дварэ, **праўда**, было ўжо холадна* (Бяд.).

Такім чынам, мадальныя словы не адносяцца ні да самастойных, ні да службовых часцін мовы. Ад першых яны адрозніваюцца тым, што не выконваюць намінатыўнай функцыі, не маюць катэгарыяльнага

лексічнага значэння, не з'яўляюцца членамі сказа. У адрозненне ад службовых часцін мовы мадальныя словы не служаць для сувязі слоў у словазлучэнні і сказе, не надаюць сэнсавых адценняў словам, словазлучэнням і сказам.

Паводле семантыкі мадальныя словы падзяляюцца на дзве групы: 1) мадальныя словы, якія выражаюць упэўненасць, перакананне, сцвярджэнне таго, пра што гаворыцца ў сказе: *праўда, факт, сапраўды, зразумела, безумоўна, бясспрэчна, відавочна, вядома, несумненна* і інш.; 2) мадальныя словы, якія выражаюць няўпэўненасць, меркаванне, дапушчэнне, магчымасць або немагчымасць таго, аб чым гаворыцца ў выказванні. Мадальныя словы гэтай групы абазначаюць так званую гіпатэтычную мадальнасць: *можа, мабыць, мажліва, магчыма, здаецца, відаць, можа быць, як быццам, як быццам бы.*

### 2.5.3. Суадноснасць мадальных слоў з іншымі часцінамі мовы

Паводле паходжання мадальныя словы цесна звязаны з самастойнымі часцінамі мовы. Большасць мадальных слоў яшчэ не страцілі суадноснасці з тымі часцінамі мовы, ад якіх утварыліся. Мадальныя словы паходзяць ад наступных часцін мовы:

назоўнікаў: *праўда, факт*; параўн.: *Стрэльба, **праўда**, была дужа старая* (Лыньк.) і ***Праўда** даражэйшая за золата* (Пр.);

кароткай формы прыметнікаў, дзеепрыметнікаў: *вядома, магчыма, мажліва*; параўн.: ***Вядома**, Іван разумеў, што ў такім становішчы трэба быць асабліва пільным* (В.Б.) і *Сцёпку было **вядома**, хто так пільна глядзеў яму ўслед* (К-с);

прыслоўяў: *сапраўды, зразумела, бясспрэчна, безумоўна, відавочна, канешне, несумненна*; параўн.: *Голас, у якім чулася шчырая жаласць і спачуванне, **відавочна**, належаў пажылой жанчыне* (Вас.) і *Зусім **відавочна** стала, што гораду патрэбен галоўны архітэктар* (У.К.);

дзеясловаў: *здаецца, здавалася, значыцца, можа, мусіць*; параўн.: *Дзяўчынка, **здавалася**, паспакайнела і глядзела на вайскоўца даверліва* (І.Г.) і *Груша цвіла і **здавалася** незвычайна прыгожаю* (Каратк.);

катэгорыі стану: *відаць*; параўн.: *Лёс, **відаць**, назнарок мяне кінуў на сумнае поле* (М.В.) і *З-пад хвой-красунь, як на далоні, **відаць** і хаты і двары* (К-с).

Самастойныя часціны мовы, пераходзячы ў разрад мадальных слоў, страчваюць сваё лексічнае значэнне, граматычныя катэгорыі, перастаюць змяняцца. Падабенства мадальных слоў да суадносных часцін мовы толькі знешняе; яны фактычна становяцца амонімамі.

Як мадальныя ўжываюцца словазлучэнні *трэба думаць, можа быць, можна меркаваць, на самай справе, па праўдзе сказаць, можна сказаць, трэба думаць, уласна кажучы* і інш.

Некаторыя вучоныя да мадальных слоў адносяць усе пабочныя словы, незалежна ад таго, якія адносіны яны выражаюць. Аднак ёсць думка, што да мадальных слоў нельга адносіць: 1) словы *на жаль, на шчасце*, якія яшчэ не страцілі поўнасцю лексічнага значэння і выражаюць эмацыянальныя адносіны гаворачай асобы да прадметаў і з'яў рэчаіснасці; 2) словы і ўстойлівыя спалучэнні, якія выражаюць паслядоўнасць, парадак думак, злучаюць, далучаюць ці супастаўляюць часткі сказа. Яны займаюць прамежкавае становішча паміж злучнікамі і мадальнымі словамі: *па-першае, па-другое, па-трэцяе, наогул, наадварот, нарэшце, такім чынам, гэта значыць, між іншым, тым больш, разам з тым* і інш. Гэтыя словы і словазлучэнні служаць для сувязі частак сказа і надаюць выказванню дадатковае адценне мадальнасці.

### 3. Пытанні да асноўнага тэарэтычнага матэрыялу

1. Якія асаблівасці і функцыі прыназоўніка як службовай часціны мовы?
2. На якія групы падзяляюцца прыназоўнікі паводле паходжання?
3. Чым характарызуюцца невытворныя прыназоўнікі?
4. Якія прыназоўнікі адносяцца да вытворных? Назавіце іх групы паводле суадноснасці з іншымі часцінамі мовы.
5. На якія групы падзяляюцца прыназоўнікі паводле марфалагічнай будовы?
6. У чым асаблівасць ужывання прыназоўнікаў з рознымі склонамі?
7. Якія значэнні выражаюцца з дапамогай прыназоўнікаў?
8. Канструкцыі з якімі прыназоўнікамі выступаюць як сінанімічныя?
9. Якія асаблівасці назіраюцца ва ўжыванні прыназоўнікавых канструкцый?
10. Дайце поўную характарыстыку злучніка як службовай часціны мовы. Вызначце яго функцыі ў сказе.
11. Назавіце тыя часціны мовы, якія могуць выконваць функцыі злучнікаў.
12. Якія выдзяляюцца разрады злучнікаў паводле сінтаксічнай функцыі?
13. Ахарактарызуйце злучальныя злучнікі. Назавіце іх групы па значэнні.
14. Дайце характарыстыку падпарадкавальных злучнікаў. Назавіце іх семантычныя групы.
15. Якія функцыі выконваюць далучальныя злучнікі? Чым адрозніваюцца іх значэнні ад значэнняў злучнікаў іншых груп?

16. Вызначце адрозненне падпарадкавальных злучнікаў ад злучальных слоў.

17. На якія групы падзяляюцца злучнікі паводле паходжання і саставу?

18. На якія групы падзяляюцца злучнікі паводле спосабу ўжывання? Прывядзіце прыклады з парнымі злучнікамі.

19. Ахарактарызуйце часціцы як службовую часціну мовы.

20. Якое месца займаюць часціцы ў сістэме часцін мовы?

21. На якія групы падзяляюцца часціцы паводле марфалагічнага складу?

22. Якія вылучаюцца групы часціц паводле іх паходжання?

23. На якія групы падзяляюцца часціцы паводле значэння?

24. Якія часціцы адносяцца да словаўтваральных і формаўтваральных?

25. Ахарактарызуйце выклічнік як асобую часціну мовы; вызначце яго ролю ў сказе.

26. У чым адметнасць выклічніка ў параўнанні са службовымі і самастойнымі часцінамі мовы?

27. На якія групы падзяляюцца выклічнікі па паходжанні?

28. Якія семантычныя групы выклічнікаў вылучаюцца? Ахарактарызуйце кожную групу.

29. Ад чаго залежыць значэнне некаторых выклічнікаў у сказе? Што канкрэтызуе іх значэнне?

30. Чым падобныя да выклічнікаў і чым адрозніваюцца ад іх гукапераймальныя словы?

31. Дайце азначэнне тэрміна «мадальнасць».

32. Якія ёсць спосабы выражэння мадальнасці ў сучаснай беларускай літаратурнай мове?

33. Дайце азначэнне мадальных слоў. Назавіце іх прыметы.

34. Якія ведаеце семантычныя групы мадальных слоў?

35. У чым адрозненне мадальных слоў ад аманімічных самастойных часцін мовы?

## 4. Матэрыялы да практычных аўдыторных і самастойных заняткаў

### 4.1. Схема блок-сістэмы практычных заняткаў

| № | Тэма практычных заняткаў | Колькасць гадзін |
|---|---|---|
| 1. | Прыназоўнік як часціна мовы. Невытворныя і вытворныя прыназоўнікі. | 2 |
| 2. | Ужыванне прыназоўнікаў са склонамі. Асноўныя значэнні прына зоўнікаў. Сінаніміка прыназоўнікаў | 2 |

| | | |
|---|---|---|
| 3. | Злучнік як часціна мовы. Разрады злучнікаў паводле паходжання,складу, ужывання. Злучальныя злучнікі і іх групы. Падпарадкавальныя злучнікі і іх групы. Далучальныя злучнікі. | 2 |
| 4. | Вытворныя і невытворныя злучнікі. Простыя і састаўныя злучнікі. Адзіночныя, паўторныя, парныязлучнікі. | 2 |
| 5. | Часціцы як часціна мовы. Класіфікацыя часціц паводле марфалагічнага складу (простыя і састаўныя), паходжання (невытворныя і вытворныя). Словаўтваральныя і формаўтваральныя часціцы. | 2 |
| 6. | Класіфікацыя часціц паводле значэння (часціцы, якія выражаюць дадатковыя сэнсавыя адценні; мадальныя і мадальна-валявыя часціцы; эмацыянальна-экспрэсіўныя часціцы). | 2 |
| 7. | Мадальныя словы. Мадальнасць і сродкі яе выражэння (марфалагічныя, сінтаксічныя, лексічныя), Характарыстыка мадальных слоў. Семантычныя разрады мадальных слоў. Суадноснасць мадальных слоў з іншымі часцінамі мовы. | 2 |
| 8. | Выклічнік як часціна мовы. Разрады выклічнікаў (эмацыянальныя, волевыяўленчыя і выклічнікі моўнага этыкету). Невытворныя і вытворныя выклічнікі. Гукапераймальныя словы, іх адрозненне ад выклічнікаў. | 2 |

### 4.2. Практыкаванні для засваення тэарэтычных ведаў па модулі

На занятках 1 выконваюцца практыкаванні 521-528.
На занятках 2 выконваюцца практыкаванні 529-533.
На занятках 3 выконваюцца практыкаванні 534-538.
На занятках 4 выконваюцца практыкаванні 539-542.
На занятках 5 выконваюцца практыкаванні 543-544, 546-548.
На занятках 6 выконваюцца практыкаванні 545, 549-551.
На занятках 7 выконваюцца практыкаванні 552-558.
На занятках 8 выконваюцца практыкаванні 559-572.

## 5. Дадатковая літаратура па модулі


1. Киселев Н.А. Частицы в современных восточнославянских языках. – Мн., 1976.
2. Лянкевіч А.У. Беларускі выклічнік у Сеціве. – Мінск: Права і эканоміка, 2009.
3. Паўлоўская Н.Ю. Катэгорыя мадальнасці ў сучаснай беларускай мове. – Мн.: МДЛУ, 2001.
4. Шаранда А.Н. Сравнительная типология категории предлога (на материале немецкого, русского и белорусского языков). – Мн.: Наука и техника, 1981.
5. Шуба П.П. Прыназоўнік у беларускай мове. – Мн.: Выд-ва БДУ імя У.І. Леніна, 1971.
6. Шуба П.П. Тлумачальны слоўнік беларускіх прыназоўнікаў. – Мн.: Нар.асвета, 1993.

## УМОЎНЫЯ СКАРАЧЭННІ

А.Ж. – А. Жаўрук
А.К. – А. Куляшоў
А.М. – А. Марціновіч
А.П. – А. Пысін
Ал. – А. Александровіч
Асіп. – А. Асіпенка
Аст. – А. Астапенка
Астр. – А. Астрэйка
А.Ч. – А. Чарнышэвіч
Б. – Я. Брыль
Багд. – М. Багдановіч
Барад. – Р. Барадулін
Бач. – А. Бачыла
Бр. – П. Броўка
Бур. – Г. Бураўкін
Бяд. – З. Бядуля
Бял. – А. Бялевіч
В. – А. Вольскі
В.Б. – В.Быкаў
В.В. – В. Вольскі
Вад. – М. Ваданосаў
Вал. – Э. Власевіч
Вас. – М. Васілёк
Вял. – А. Вялюгін
Гал. – П. Галавач
Ген. – Л. Геніюш
Гіл. – Н. Гілевіч
Гл. – П. Глебка
Г.М. – Г. Марчук
Гр. – І. Грамовіч
Грах. – С. Грахоўскі
Дам. – У. Дамашэвіч
Дзяр. – С. Дзяргай
Е.Л. – Е. Лось
Ж. – А. Жук
Зар. – А. Зарыцкі
Зарэц. – М. Зарэцкі
Зв. – А. Звонак
І.Г. – І. Гурскі
І.М. – І. Мележ
І.Н. – І. Навуменка
Каз. – В. Казько
Каратк. – У. Караткевіч
К.Б. – К. Буйло
Кір. – К. Кірэенка
Корб. – У. Корбан
Корс. – У. Корсун

Кр. – У. Краўчанка
Крап. – К. Крапіва
К-с – Я. Колас
Кудр. – А. Кудравец
Кул. – А. Кулакоўскі
Куп. – Я. Купала
К.Ч. – К. Чорны
Лаз. – М. Лазарук
Л.Д. – Л. Дайнека
ЛіМ – газета «Літаратура і мастацтва»
Луж. – М. Лужанін
Лук. – В. Лукша
Лупс. – М. Лупсякоў
Лыньк. – М. Лынькоў
Маш. – М. Машара
М.В. – М. Воранаў
Міс. – П. Міську
М.К. – М. Калачынскі
М.Л. – М. Лобан
М.Т. – М. Танк
Н. – І. Новікаў
Нар. тв. – Народная творчасць
Пальч. – А. Пальчэўскі
Панч. – П. Панчанка
Пестр. – П. Пестрак
П.К. – П. Кавалёў
Пол. – «Полымя»
Пр. – прыказка, прымаўка
Пташ. – І. Пташнікаў
Р. – А. Русак
Ракіт. – М. Ракітны
Р.І. – Р. Ігнаценка
С.А. – С. Александровіч
Сам. – Э. Самуйлёнак
Сач. – Б. Сачанка
С.З. – С. Законнікаў
Скр. – Я. Скрыган
См. – М. Смагаровіч
Т. – П. Трус
Т.Б. – Т. Бондар
Тк. – М. Ткачоў
У.А. – У. Арлоў
У.Д. – У. Дубоўка
У.К. – У. Карпаў
У.Х – У. Хадыка
Хадк. – Т. Хадкевіч
Хвед. – М. Хведаровіч
Ц. – Цётка

Ч. – М. Чарот
Чарн. – А. Чарнышэвіч
Чыгр. – І. Чыгрынаў
Шам. – І. Шамякін
Як. – А. Якімовіч
Я.М. – Я. Маўр
Янішч. – Я. Янішчыц
Я.П. – Я. Пушча
Я.С. – Я. Сіпакоў
Ян. – Ф.Янкоўскі

# ЗМЕСТ

УВОДЗІНЫ....3
Спіс асноўнай літаратуры па курсе «Сучасная беларуская мова»....5
МОДУЛЬ 1....6
«ЛЕКСІКАЛОГІЯ»....6
1. Схема блок-сістэмы вывучэння тэарэтычнага матэрыялу....6
2. Асновы навукова-тэарэтычных ведаў па модулі....6
2.1. Формы беларускай нацыянальнай мовы. Сістэма функцыянальных стыляў літаратурнай мовы....7
2.2. Лексікалогія як раздзел мовазнаўства....11
2.3. Слова як адзінка мовы....13
2.4. Асноўныя тыпы лексічных значэнняў слова....16
2.5. Мнагазначнасць слова....19
2.6. Лексічныя моўныя апазіцыі....22
2.6.1. Апазіцыі фармальнай тоеснасці. Амонімы ....22
2.6.2. Апазіцыі семантычнай тоеснасці. Сінонімы....24
2.6.3. Апазіцыі семантычнай процілегласці. Антонімы. ....26
2.6.4. Фармальна-семантычныя апазіцыі. Паронімы. ....28
2.7. Дыферэнцыяцыя слоўнікавага складу....29
2.7.1. Лексіка беларускай мовы паводле паходжання....30
2.7.2. Актыўная і пасіўная лексіка. Новыя і ўстарэлыя словы....32
2.7.3. Лексіка беларускай мовы паводле сферы ўжывання....34
2.7.4. Лексіка беларускай мовы паводле стылістычнай дыферэнцыяцыі....36
3. Пытанні да асноўнага тэарэтычнага матэрыялу....38
4. Матэрыялы да практычных аўдыторных і самастойных заняткаў....40
4.1. Схема блок-сістэмы практычных заняткаў....40
4.2. Практыкаванні для засваення тэарэтычных ведаў па модулі....41
5. Дадатковая літаратура па модулі....41
МОДУЛЬ 2....43
«ФРАЗЕАЛОГІЯ»....43
1. Схема блок-сістэмы вывучэння тэарэтычнага матэрыялу....43
2. Асновы навукова-тэарэтычных ведаў па модулі....43
2.1. Фразеалогія як раздзел мовазнаўства....43
2.2. Фразеалагізм як моўная адзінка і яго прыметы....44
2.3. Класіфікацыі фразеалагічных зваротаў....46
2.4. Мнагазначнасць, варыянтнасць, сінанімічнасць, антанімічнасць і аманімічнасць фразеалагізмаў....49
3. Пытанні да асноўнага тэарэтычнага матэрыялу....55
4. Матэрыялы да практычных аўдыторных і самастойных заняткаў....56
4.1. Схема блок-сістэмы практычных заняткаў....56
4.2. Практыкаванні для засваення тэарэтычных ведаў па модулі....56
5. Дадатковая літаратура па модулі....57
МОДУЛЬ 3....58
«ЛЕКСІКАГРАФІЯ І ФРАЗЕАГРАФІЯ»....58
1. Схема блок-сістэмы вывучэння тэарэтычнага матэрыялу....58
2. Асновы навукова-тэарэтычных ведаў па модулі....58
2.1. Лексікаграфія як навука....58
2.2. Віды лінгвістычных слоўнікаў....60

3. Пытанні да асноўнага тэарэтычнага матэрыялу....................................................64
4. Матэрыялы да практычных аўдыторных і самастойных заняткаў........................65
4.1. Схема блок-сістэмы практычных заняткаў..................................................65
4.2. Практыкаванні для засваення тэарэтычных ведаў па модулі........................65
5. Дадатковая літаратура па модулі.....................................................................65
МОДУЛЬ 4...................................................................................................................68
«ФАНЕТЫКА, ФАНАЛОГІЯ, АРФАЭПІЯ».....................................................................68
1. Схема блок-сістэмы вывучэння тэарэтычнага матэрыялу.................................68
2. Асновы навукова-тэарэтычных ведаў па модулі...............................................68
2.1. Фанетыка і фаналогія як раздзелы мовазнаўства.........................................69
2.2. Гук і фанема....................................................................................................71
2.3. Фанетычны падзел маўленчай плыні.............................................................74
2.4. Гукі мовы і аспекты іх вывучэння ..................................................................75
2.5. Класіфікацыя гукаў маўлення і яе прынцыпы...............................................76
2.5.1 Зычныя гукі і прынцыпы іх класіфікацыі...................................................77
2.5.2. Артыкуляцыйная класіфікацыя галосных................................................79
2.6. Змены гукаў у моўнай плыні..........................................................................81
2.7. Пазіцыйныя і гістарычныя чаргаванні гукаў..................................................87
2.7.1. Чаргаванні галосных гукаў.......................................................................87
2.7.2. Чаргаванні зычных гукаў..........................................................................88
2.8. Склад і складападзел .....................................................................................89
2.9. Фанетычная прырода націску........................................................................90
2.10. Транскрыпцыя і яе віды................................................................................92
2.11. Арфаэпія як правілы рэалізацыі фанетычнай сістэмы................................93
2.11.1. Асноўныя правілы вымаўлення галосных.............................................95
2.11.2. Асноўныя правілы вымаўлення зычных.................................................96
2.11.3. Адхіленні ад норм літаратурнага вымаўлення і іх прычыны................98
3. Пытанні да асноўнага тэарэтычнага матэрыялу....................................................99
4. Матэрыялы да практычных аўдыторных і самастойных заняткаў......................100
4.1. Схема блок-сістэмы практычных заняткаў..................................................100
4.2. Практыкаванні для засваення тэарэтычных ведаў па модулі.......................101
5. Дадатковая літаратура па модулі....................................................................102
МОДУЛЬ 5.................................................................................................................103
«ГРАФІКА І АРФАГРАФІЯ».......................................................................................103
1. Схема блок-сістэмы вывучэння тэарэтычнага матэрыялу...............................103
2. Асновы навукова-тэарэтычных ведаў па модулі.............................................103
2.1. Графіка, яе прадмет і задачы. Алфавіт як аснова графікі.............................103
2.1.1. Спрэчныя пытанні беларускага алфавіта...............................................105
2.2. Арфаграфія і яе прынцыпы..........................................................................108
2.3. Кароткія звесткі з гісторыі беларускай арфаграфіі.......................................110
3. Пытанні да асноўнага тэарэтычнага матэрыялу..................................................111
4. Матэрыялы да практычных аўдыторных і самастойных заняткаў......................112
4.1. Схема блок-сістэмы практычных заняткаў..................................................112
4.2. Практыкаванні для засваення тэарэтычных ведаў па модулі.......................112
5. Дадатковая літаратура па модулі....................................................................113
МОДУЛЬ 6.................................................................................................................114
«МАРФЕМІКА І СЛОВАЎТВАРЭННЕ».........................................................................114
1. Схема блок-сістэмы вывучэння тэарэтычнага матэрыялу...............................114

2. Асновы навукова-тэарэтычных ведаў па модулі....114
2.1. Марфемная структура слова. Марфема....114
2.2. Тыпы марфем....116
2.3. Аснова слова і канчатак....118
2.4. Корань і афіксы....120
2.5. Змены ў марфемнай структуры слова....124
2.6. Паняцце аб словаўтварэнні....127
2.6.1. Спосабы словаўтварэння....132
2.7. Марфемны, этымалагічны і словаўтваральны аналіз....135
3. Пытанні да асноўнага тэарэтычнага матэрыялу....136
4. Матэрыялы да практычных аўдыторных і самастойных заняткаў....137
4.1. Схема блок-сістэмы практычных заняткаў....137
4.2. Практыкаванні для засваення тэарэтычных ведаў па модулі....138
5. Дадатковая літаратура па модулі....138
МОДУЛЬ 7....139
«МАРФАЛОГІЯ»....139
1. Схема блок-сістэмы вывучэння тэарэтычнага матэрыялу....139
2. Асновы навукова-тэарэтычных ведаў па модулі....139
2.1.1. Граматычныя значэнні і сродкі іх перадачы....141
2.2. Часціны мовы як лексіка-граматычныя разрады слоў....145
2.2.1. Сістэма часцін мовы....147
3. Пытанні да асноўнага тэарэтычнага матэрыялу....150
4. Матэрыялы да практычных аўдыторных і самастойных заняткаў....151
4.1. Схема блок-сістэмы практычных заняткаў....151
4.2. Практыкаванні для засваення тэарэтычных ведаў па модулі....151
5. Дадатковая літаратура па модулі....151
МОДУЛЬ 8....153
«НАЗОЎНІК»....153
1. Схема блок-сістэмы вывучэння тэарэтычнага матэрыялу....153
2. Асновы навукова-тэарэтычных ведаў па модулі....153
2.1. Назоўнік як часціна мовы. Лексіка-граматычныя разрады назоўніка....153
2.2. Род назоўнікаў....157
2.3. Лік назоўнікаў....161
2.4. Склон назоўнікаў. Асноўныя значэнні склонаў....162
2.5. Тыпы скланення назоўнікаў....164
2.5.1. Назоўнікі першага скланення, іх канчаткі....166
2.5.2. Назоўнікі другога скланення, іх канчаткі....167
2.5.3. Назоўнікі трэцяга скланення, іх канчаткі....169
2.5.4. Рознаскланяльныя назоўнікі, іх канчаткі....169
2.5.5. Скланенне назоўнікаў у множным ліку....171
2.5.6. Скланенне некаторых прозвішчаў і геаграфічных назваў....172
2.5.7. Нескланяльныя назоўнікі....174
2.6. Формы назоўнікаў з суфіксамі ацэнкі....174
2.7. Утварэнне назоўнікаў....176
3. Пытанні да асноўнага тэарэтычнага матэрыялу....184
4. Матэрыялы да практычных аўдыторных і самастойных заняткаў....185
4.1. Схема блок-сістэмы практычных заняткаў....185
4.2. Практыкаванні для засваення тэарэтычных ведаў па модулі....185

5. Дадатковая літаратура па модулі.....185
МОДУЛЬ 9.....187
«ПРЫМЕТНІК».....187
1. Схема блок-сістэмы вывучэння тэарэтычнага матэрыялу.....187
2. Асновы навукова-тэарэтычных ведаў па модулі.....187
2.1. Прыметнік як часціна мовы.....187
2.2. Разрады прыметнікаў.....188
2.3. Поўныя і кароткія формы прыметнікаў.....190
2.4. Ступені параўнання якасных прыметнікаў.....191
2.5. Формы прыметнікаў са значэннем ацэнкі і меры якасці.....193
2.6. Утварэнне прыметнікаў.....194
3. Пытанні да асноўнага тэарэтычнага матэрыялу.....197
4. Матэрыялы да практычных аўдыторных і самастойных заняткаў.....197
4.1. Схема блок-сістэмы практычных заняткаў.....197
4.2. Практыкаванні для засваення тэарэтычных ведаў па модулі.....197
5. Дадатковая літаратура па модулі.....198
МОДУЛЬ 10.....199
«ЛІЧЭБНІК».....199
1. Схема блок-сістэмы вывучэння тэарэтычнага матэрыялу.....199
2. Асновы навукова-тэарэтычных ведаў па модулі.....199
2.1. Лічэбнік як часціна мовы. Разрады лічэбнікаў.....199
2.1.1. Уласнаколькасныя лічэбнікі.....200
2.1.2. Зборныя лічэбнікі.....201
2.1.3. Дробавыя лічэбнікі.....202
2.2. Сінтаксічная сувязь лічэбнікаў з назоўнікамі.....202
2.3. Скланенне ўласнаколькасных, зборных і дробавых лічэбнікаў.....203
2.4. Парадкавыя лічэбнікі, іх утварэнне і скланенне.....205
2.5. Пераход лічэбнікаў у іншыя часціны мовы.....205
2.6. Няпэўна-колькасныя словы.....206
3. Пытанні да асноўнага тэарэтычнага матэрыялу.....207
4. Матэрыялы да практычных аўдыторных і самастойных заняткаў.....207
4.1. Схема блок-сістэмы практычных заняткаў.....207
4.2. Практыкаванні для засваення тэарэтычных ведаў па модулі.....207
5. Дадатковая літаратура па модулі.....207
МОДУЛЬ 11.....209
«ЗАЙМЕННІК».....209
1. Схема блок-сістэмы вывучэння тэарэтычнага матэрыялу.....209
2. Асновы навукова-тэарэтычных ведаў па модулі.....209
2.1. Займеннік як часціна мовы.....209
2.2. Разрады займеннікаў.....210
2.2.1. Асабовыя займеннікі.....210
2.2.2. Зваротны займеннік сябе.....212
2.2.3. Прыналежныя займеннікі.....212
2.2.4. Указальныя займеннікі.....213
2.2.5. Азначальныя займеннікі.....214
2.2.5. Пытальныя і адносныя займеннікі.....215
2.2.5. Адмоўныя займеннікі.....216
2.2.6. Няпэўныя займеннікі.....217

2.3. Пераход слоў іншых часцін мовы ў займеннікі. Ужыванне займеннікаў у ролі іншых часцін мовы....................218
3. Пытанні да асноўнага тэарэтычнага матэрыялу....................219
4. Матэрыялы да практычных аўдыторных і самастойных заняткаў....................220
4.1. Схема блок-сістэмы практычных заняткаў....................220
4.2. Практыкаванні для засваення тэарэтычных ведаў па модулі....................220
5. Дадатковая літаратура па модулі....................220
МОДУЛЬ 12....................221
«ДЗЕЯСЛОЎ»....................221
1. Схема блок-сістэмы вывучэння тэарэтычнага матэрыялу....................221
2. Асновы навукова-тэарэтычных ведаў па модулі....................221
2.1. Дзеяслоў як часціна мовы....................221
2.2. Інфінітыў ....................222
2.3. Асновы дзеяслова....................223
2.4. Пераходныя і непераходныя дзеясловы....................224
2.5. Зваротныя дзеясловы....................226
2.6. Катэгорыя стану дзеясловаў....................227
2.7. Паняцце трывання....................229
2.7.1. Утварэнне суадносных пар трывання....................230
2.7.2. Ступеннае ўтварэнне трыванняў....................231
2.8. Паняцце катэгорыі ладу. Абвесны лад....................232
2.9. Катэгорыя часу дзеясловаў....................236
2.9.1. Цяперашні час....................237
2.9.2. Будучы час....................237
2.9.3. Прошлы час....................238
2.10. Катэгорыя асобы дзеясловаў....................240
2.10.1. Безасабовыя дзеясловы....................242
2.11. Спражэнне дзеясловаў....................243
2.11.1. Рознаспрагальныя дзеясловы....................244
2.12. Утварэнне дзеясловаў....................244
3. Пытанні да асноўнага тэарэтычнага матэрыялу....................247
4. Матэрыялы да практычных аўдыторных і самастойных заняткаў....................249
4.1. Схема блок-сістэмы практычных заняткаў....................249
4.2. Практыкаванні для засваення тэарэтычных ведаў па модулі....................250
5. Дадатковая літаратура па модулі....................250
МОДУЛЬ 13....................251
«ДЗЕЕПРЫМЕТНІК. ДЗЕЕПРЫСЛОЎЕ»....................251
1. Схема блок-сістэмы вывучэння тэарэтычнага матэрыялу....................251
2. Асновы навукова-тэарэтычных ведаў па модулі....................251
2.1. Дзеепрыметнік....................251
2.1.1. Дзеепрыметнік як дзеяслоўная форма....................251
2.1.2. Утварэнне дзеепрыметнікаў....................252
2.1.3. Пераход дзеепрыметнікаў у прыметнікі ....................253
2.2. Дзеепрыслоўе....................254
2.2.1. Дзеепрыслоўе як дзеяслоўная форма....................254
2.2.2. Адноснае абазначэнне часу дзеепрыслоўямі....................255
2.2.3. Утварэнне дзеепрыслоўяў....................256
2.2.4. Ужыванне дзеепрыслоўяў....................256

3. Пытанні да асноўнага тэарэтычнага матэрыялу....257
4. Матэрыялы да практычных аўдыторных і самастойных заняткаў....258
4.1. Схема блок-сістэмы практычных заняткаў....258
4.2. Практыкаванні для засваення тэарэтычных ведаў па модулі....258
5. Дадатковая літаратура па модулі....258
МОДУЛЬ 14....259
«ПРЫСЛОЎЕ. КАТЭГОРЫЯ СТАНУ»....259
1. Схема блок-сістэмы вывучэння тэарэтычнага матэрыялу....259
2. Асновы навукова-тэарэтычных ведаў па модулі....259
2.1. Прыслоўе як часціна мовы....259
2.2. Разрады прыслоўяў паводле значэння....261
2.3. Ступені параўнання якасных прыслоўяў....262
2.4. Формы прыслоўяў са значэннем ацэнкі і меры якасці....263
2.5. Спосабы ўтварэння прыслоўяў....264
2.6. Ужыванне прыслоўяў у ролі іншых часцін мовы....268
2.7. Безасабова-прэдыкатыўныя словы (катэгорыя стану)....269
2.7.1. Агульная характарыстыка безасабова-прэдыкатыўных слоў....269
2.7.2. Утварэнне безасабова-прэдыкатыўных слоў....270
3. Пытанні да асноўнага тэарэтычнага матэрыялу....271
4. Матэрыялы да практычных аўдыторных і самастойных заняткаў....272
4.1. Схема блок-сістэмы практычных заняткаў....272
4.2. Практыкаванні для засваення тэарэтычных ведаў па модулі....272
5. Дадатковая літаратура па модулі....272
МОДУЛЬ 15....273
«СЛУЖБОВЫЯ ЧАСЦІНЫ МОВЫ»....273
1. Схема блок-сістэмы вывучэння тэарэтычнага матэрыялу....273
2. Асновы навукова-тэарэтычных ведаў па модулі....273
2.1. Прыназоўнік....273
2.1.1. Прыназоўнік як часціна мовы....273
2.1.2. Невытворныя і вытворныя прыназоўнікі....274
2.1.3. Ужыванне прыназоўнікаў са склонамі....276
2.1.4. Асноўныя значэнні прыназоўнікаў....277
2.1.5. Некаторыя асаблівасці ўжывання прыназоўнікаў....279
2.2. Злучнік....280
2.2.1. Злучнік як часціна мовы....280
2.2.2. Злучальныя і падпарадкавальныя злучнікі....281
2.2.3. Класіфікацыя злучнікаў паводле іх паходжання, структуры і спосабу ўжывання....285
2.3.Часціцы....286
2.3.1. Часціцы як часціна мовы....286
2.3.2. Класіфікацыя часціц....287
2.3.3. Часціцы, якія выражаюць дадатковыя сэнсавыя адценні....288
2.3.4. Мадальныя і мадальна-валявыя часціцы....289
2.3.5. Эмацыянальна-экспрэсіўныя часціцы....292
2.3.6. Словаўтваральныя і формаўтваральныя часціцы....293
2.4. Выклічнік....294
2.4.1. Выклічнік як часціна мовы....294
2.4.2. Разрады выклічнікаў....295

2.4.3. Гукапераймальныя словы......................................................................296
2.5. Мадальныя словы...............................................................................297
2.5.1. Мадальнасць і сродкі яе выражэння.....................................................297
2.5.2. Мадальныя словы іх характарыстыка і семантычныя разрады...........299
2.5.3. Суадноснасць мадальных слоў з іншымі часцінамі мовы...................300
3. Пытанні да асноўнага тэарэтычнага матэрыялу.................................................301
4. Матэрыялы да практычных аўдыторных і самастойных заняткаў.....................302
4.1. Схема блок-сістэмы практычных заняткаў.................................................302
4.2. Практыкаванні для засваення тэарэтычных ведаў па модулі......................303
5. Дадатковая літаратура па модулі...........................................................................303
УМОЎНЫЯ СКАРАЧЭННІ.........................................................................................304